# Янка Сіпакоў



# *Янка Сіпакоў*

# Янка Сіпакоў

выбраныя творы
ў двух тамах

# Сад людзей

*том першы*

*лірычная проза*

*аповесці*

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1985

Бел 2
С 39

С $\frac{4702120200-127}{М 302(05)-85}$ 126—85

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1985.

# ДАВЕРЛІВЫ ТАЛЕНТ

Янка Сіпакоў — пісьменнік разнастайных творчых магчымасцей. Талент ягоны шчодры і шматгранны. Паэт, празаік, перакладчык, нарысіст. Хоць рэдка, але выступае і як публіцыст, крытык, эсэіст; выйшлі тры зборнікі гумарэсак — «Лысы юбілей», «Плюс на мінус» і «Ланцугі для мух». Ёсць значныя набыткі ва ўсіх галінах творчасці, ва ўсіх жанрах. Яны вядомыя. Кніга паэзіі «Веча славянскіх балад» адзначана ў 1976 г. Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Янкі Купалы; заняла сваё сталае месца ў беларускай прозе апошніх дзесяцігоддзяў кніга аповесцей «Крыло цішыні»; калі ідзе гаворка пра дасягненні нашай сучаснай нарысістыкі, абавязкова называюцца творы гэтага жанру Я. Сіпакова; а ягоныя пераклады, у прыватнасці, Уолта Уітмена і Хо Шы Міна з поўнай падставай адносяцца спецыялістамі да найбольш адпаведных духу і літары арыгінала, глыбокіх і паэтычных.

І ўсё ж асноўнае поле творчай дзейнасці, галоўная сфера пісьменнікавых клопатаў і турбот — арыгінальная паэзія і проза. Тут у яго ёсць ужо свае адметныя дзялянкі, пазначаныя арыгінальнасцю таленту і высокай культурай працы. І цяжка сказаць, на якой з гэтых творчых дзялянак больш значныя дасягненні пісьменніка, да чаго больш хінецца ягоная душа — да паэзіі ці да прозы, дзе талент знаходзіць больш арганічнае і поўнае ўвасабленне. Ды і ці трэба казаць?..

Пачаў Я. Сіпакоў як паэт. У 1960 годзе з'явіўся першы паэтычны зборнік «Сонечны дождж». Потым былі іншыя зборнікі. Лепшае з іх склала кнігу выбранай паэзіі «Вочы ў вочы» (1978). «Вочы ў вочы з Радзімай і часам, з мінулым і з сённяшнім днём, з прыродаю і з роднаю зямлёю, з каханай і з сябрамі» — так ёміста, метафарычна вобразна і дакладна быў вызначаны ў анатацыі ідэйны змест гэтай паэтычнай кнігі. У мінулым годзе чытач пазнаёміўся з новай кнігай вершаў «Усміхніся мне». «Кніга трывогі» — такое жанрава-змястоўнае вызначэнне даў ёй аўтар.

Да прозы пісьменнік прыйшоў некальні пазней, чым да паэзіі. Першая празаічная кніга, кніга нарысаў «Па зялёную маланг-

ку», з'явілася больш як праз дзесяць гадоў пасля паэтычнай — у 1971-м. Сапраўдны ж поспех Сіпакову-празаіку прынесла кніга аповесцей «Крыло цішыні» (1976). Цяпер прозвішча пісьменніка ўпамінаецца (ды не толькі ўпамінаецца) амаль ва ўсіх размовах пра сучасную прозу. Асабліва прозу, прысвечаную жыццю вёскі. Зборніку было дадзена жанравае вызначэнне «кніга вёскі». Пазней з'яўляюцца зборнікі аповесцей і апавяданняў «Жанчына сярод мужчын» (1980) і «Спадзяванне на радасць» (1983), а таксама кніга публіцыстыкі і эсэістыкі «Пяць струн» (1984). Яна пазначана як «кніга настрояў». Дарэчы, заўважаецца, Сіпакоў любіць даваць сваім кнігам своеасаблівыя жанравыя вызначэнні або падзагалоўкі. Як у гэтым двухтомніку: «Сад людзей». І гэта не проста імкненне да арыгінальнічання, да адметнасці ў што б там ні стала. То — характар, своеасаблівасць мастакоўскага мыслення — канцэптуальнага, мэтанакіраванага. Такія жанравыя вызначэнні ці падзагалоўкі, а таксама назвы кніг (яны амаль заўсёды метафарычна шматзначныя), па-першае, як бы задаюць для чытача пэўны эмацыянальны настрой, вызначаюць ідэйна-змястоўны ракурс успрымання твораў, па-другое, акрэсліваюць аўтарскую задуму, тое кола духоўных клопатаў і турботаў, якімі ён жыў у гэты час, па-трэцяе, дапамагаюць, хоць бы ў нейкай ступені, адчуць духоўную атмасферу грамадства пэўнага часу.

Чытаючы кнігі Сіпакова (і прозы, і паэзіі), бачыш, адчуваеш, што ў кожным канкрэтным выпадку пісьменнік вырашае свае ідэйна-мастацкія задачы, уласцівыя толькі гэтай кнізе. Арыгінальнасць, свежасць формы — для яго пастаянны клопат. Прычым формы не дзеля формы, а формы змястоўнай, якая як найлепш дазваляе выказаць пэўную ідэю, данесці да чытача думку як яго-нае адкрыццё і здзіўленне. Так, у прыватнасці, успрымаюцца кнігі паэзіі «Веча славянскіх балад» і «Усміхніся мне».

Сіпакоў жыве няўрымслівым творчым жыццём. Многа шукае, эксперыментуе. Ён уважліва сочыць за мастацкімі набыткамі, пошукамі сусветнай літаратуры, сам увесь час жыве ў пошуку. Апрабоўвае асобныя мастацкія формы, прыёмы, набытыя сусветнай літаратурай, на нацыянальнай эстэтычнай глебе, імкнецца іх укараніць у нацыянальную мастацкую стыхію. Амаль заўсёды гэта ўдаецца. Творы ўспрымаюцца натуральна, арганічна. Бо сама форма, нават калі яна трохі і нязвыклая, заўсёды напоўнена канкрэтным, адчувальным, знаёмым чытачу не толькі ў агульных абрысах, але і ў дэталях, падрабязнасцях — жыццём. Бо яна (форма гэтая) насычана, пранізана наскрозь чыстым, неяк асабліва блізкім душы лірычным пачуццём.

Як няўрымслівы, дбайны садоўнік, рупіцца пісьменнік пра тое, каб на нашай літаратурнай глебе прыжывалася, расло і пла-

даносіла як мага больш раслін розных краёў і народаў. Руплівасць гэтая дае свой плён.

Быццам саксаул з ранетам,
Перайшоўшы грэх мяжы,
Я хачу верлібр з санетам,
Як садоўнік, падружыць.

Хай сябруюць, спеляць одум,
Хай карэняцца ў траве.
Хопіць месца ім абодвум
І на нашай мураве.

Але пры ўсёй сваёй унутранай творчай пяўрымслівасці, пастаянных пошуках Сіпакоў застаецца верны свайму таленту, роднай зямлі, верны памяці — народнай, уласнай, застаецца пісьменнікам вельмі чулым да клопатаў і турботаў сучаснасці — жыццёвых і літаратурных. Нават там, дзе ён звяртаецца да падзей мінулага — далёкага ці больш блізкага,— сучаснасць актыўна пульсуе ў творах. Так здарылася з кнігай «Веча славянскіх балад», дзе гісторыя загучала неяк асабліва надзённа, усхвалявана.

Есць у Сіпакова, які вельмі неахвотна дзеліцца з чытачом думкамі пра сваю творчасць, успамінамі пра сваё дзяцінства і юнацтва, характэрнае прызнанне.

У гутарцы з карэспандэнтам газеты «Звязда» (14 кніўня 1983 г.) ён хоць трохі расказаў пра свае пасляваенныя дзіцячыя гады, пра сваю працу вясковым паштальёнам, якая малога хлопчыка асабіста прылучыла да бедаў і радасцей людзей роднай вёскі, бедаў і радасцей вялікага свету. «Мне чамусьці думаецца, што вось без гэтага дотыку — праз паштарства — да штодзённага клопату маіх Зубрэвіч, а ў той жа час і да ўсяго свету, не было б не толькі маіх вясковых аповесцей, але таксама і «Веча славянскіх балад».

Агульнавядомае сцверджанне наконт таго, што мастак вырастае з дзяцінства, у адносінах да пісьменніцкага пакалення, да якога належыць Сіпакоў, мае асаблівы сэнс. У кожнага з яго прадстаўнікоў вайна пакінула глыбокі балючы след на ўсё жыццё. Яе вялікія ахвяры і незагойныя раны, яе пякучы боль і глыбокі смутак, як і яе нечуваныя ў свеце гераізм і самаахвярнасць, высокія ўзлёты чалавечага духу і невычэрпная прага жыцця навечна ўвайшлі ў дзіцячую памяць і дзіцячае сэрца, прадвызначылі характар і пафас іхняй (пісьменнікаў гэтага пакалення) творчасці. Пра што б ні пісалі Барадулін ці Пташнікаў, Гілевіч ці Чыгрынаў, Вярцінскі ці Сачанка, іншыя іхнія аднагодкі, вайна так ці інакш прысутнічае ўсюды.

У свядомасці Сіпакова, у ягонай душы тыя ваенныя гады, як

і першыя пасляваенныя, якія да краёў былі перапоўнены болем жыцця папярэдняга, пакінулі, можа, асабліва адчувальны адбітак. У даведніку «Пісьменнікі Савецкай Беларусі» сказана: «Рана страціў бацькоў — у час Вялікай Айчыннай вайны за сувязь з партызанамі іх закатавалі фашысты. Выхоўваўся ў цёткі, бацькавай сястры».

У вершы «Неадасланы ліст да маці» паэт напіша:

Як вялі цябе ў горад пад вартай,
Зразумець я не мог анічога:
Слёзы... Слёзы...
Сястрычкі галосяць...
А мяне суцяшаюць, малога.
Мне ж і цётка-суседка сказала,
Што дамоў цябе пусцяць уранні...
І хоць слёзы ёй засцілі вочы,
Я не мог не паверыць Ганне...
А калі ўжо слязой перад смерцю
Ты сіроцтва маё абмывала,
Я дзівіўся, чаму гэта цётка
Не сваіх,
А мяне забаўляла.

Побач з болем, пакутамі, крыўдамі жыццё дае першыя ўрокі дабрыні, чуласці, спагадлівасці. Урокі гэтыя засвойваліся яшчэ паняк неўсвядомлена, сэрцам, але засвойваліся на ўсё жыццё. Пазней, у першыя пасляваенныя гады, урокі гэтыя памнажаліся і паглыбляліся.

Урокі жыцця заўсёды самыя эфектыўныя. Жыццё ж тых гадоў поўнае асабліва вострых, рэзкіх супярэчнасцей. Неабдымная радасць людзей, якія перамаглі і засталіся жыць, ішла побач з незагойным болем і горыччу страт, з пахаронкамі, што ўжо пасля заканчэння вайны прыносілі ўсё новыя і новыя смерці; высокі свет дабрыні лунаў над здратаванай зямлёю, разбуранымі вёскамі і гарадамі, сярод знявечаных і пакалечаных людзей. У гэтай складанай, выключна эмацыянальна насычанай атмасферы рос чалавек, фармаваўся як асоба. Адтуль, з тых незабыўных радасна-светлых і пякуча-горкіх гадоў народнага жыцця вырастаў Янка Сіпакоў як пісьменнік. Менавіта гэтым часам вызначаны характар ягонага светаўспрымання, эмацыянальны лад многіх і многіх твораў, духоўны пафас творчасці, шматлікія тэмы і ідэі, канфлікты і вобразы.

Талент Сіпакова пераважна лірычны. Лірычны пачатак з'яўляецца вызначальным ва ўсіх, па сутнасці, творах — незалежна ад таго паэзія гэта, нарысістыка ці проза. Не выпадкова напачатку была паэзія. Проза — таксама лірычная. Моцны лірычны струмень вызначае яе танальнасць. Асабісты пачатак адчувальны ва ўсіх празаічных творах: у першых асабліва моцны, у апош-

ніх — крыху паслаблены. Хоць, праўда, інтэнсіўнасць лірычнага пачатку носіць усё ж унутрана змястоўную абумоўленасць. У адных выпадках (аповесці «Крыло цішыні», «Даверлівая зямля») асноўныя падзеі звязаны непасрэдна з жыццём, з асабістым лёсам самога аўтара, прысутнасць ягоная надзвычай адчувальная; у іншых (кнігі «Жанчына сярод мужчын» і «Спадзяванне на радасць») сувязь аўтара з падзеямі даволі ўмоўная, адчуваецца калі-нікалі: героі — ягоныя адпагодкі, іх непакояць (такое адчуванне) тыя ж жыццёвыя пытанні, што і самога пісьменніка — як чалавека.

Зразумела, наяўнасць моцнага лірычна-асабістага пачатку, нават яго вызначальнасць, ніколі і ніколькі не прыводзіць да жыццёвай абмежаванасці і вузкасці, да суб'ектывізму, бо ў творах моцная прысутнасць складанага, драматычнага жыцця, бо выяўленне аўтарскай асобы арганічна спалучаецца з аб'ектыўным узнаўленнем падзей, з аналітычна-апавядальнай манерай іх падачы.

Пэўная эпічнасць, як істотны момант мастакоўскага светабачання, адчувалася ўжо ў першых паэтычных зборніках; яна рана ці позна абавязкова павінна была прывесці да прозы (няхай сабе спачатку і лірычнай), ёю абумоўлены зварот да балад, у нейкай ступені, магчыма, і да перакладаў з Уітмена. А свет пісьменнік успрымае рэчыўна-адчувальна, прадметна, у выразных, часам метафарычна завостраных дэталях і падрабязнасцях. Дастаткова хаця б звярнуць увагу на назвы вершаў са зборніка «Усміхніся мне» — «*** Конь, сівы ад гадоў...», «Дымок у збажыне», «Ялта, Максім, кіпарысы», «Дождж ля вёскі Шастакі», «*** Лятай, лятай, маленькі каралёк...», «*** Дываны выбіваюць — нібыта малоцяць...». Прыклады ўзяты выпадкова. Колькасць іх можна было б павялічваць яшчэ і яшчэ. Вельмі многія вершы ў Сіпакова сюжэтна-падзейныя. Пра балады ж і размовы няма. Лірычнае пачуццё выпрамецьваецца з даследавання (калі так можна гаварыць у адносінах да верша), асэнсавання канкрэтных рэальных падзей, з'яў, фактаў.

Як празаік Я. Сіпакоў пачынаў з нарысаў. Сёння ён іх называе «лірычнай прозай». Сапраўды, «Акно, расчыненае ў зіму», «Па зялёную маланку», «Там, дзе Сібір», «Даверлівая зямля» ўспрымаюцца менавіта так. Бо сам аўтар жыў у гэтых творах — шчыры, багаты і адкрыты душою, асабіста зацікаўлены ў тым, пра што пісаў, непасрэдны ў выяўленні сваіх адносін да ўсяго, у выказванні думак і пачуццяў. І тады, калі пісаў пра родную вёску Зубрэвічы, пра тых, з кім жыў, з кім дзяліў нягоды і радасці, дзяліў непароўну (бо дарослыя заўсёды імкнуліся засцерагчы дзіцячае сэрца ад зла і як мага больш аддаць увагі, сардэчнага цяпла),

пра тых, хто вывеў яго ў вялікі свет жыцця («Акно, расчыненае ў зіму»). І тады, ужо некалькі пазней, калі расказвае пра адзін год аднаго калгаса на Аршаншчыне, якім кіруеягоны зямляк і сябра, пра клопаты і турботы і старшыні, і брыгадзіраў, механізатараў, жывёлаводаў — усіх тых, хто дае народу хлеб, малако, мяса, хто сваёй самаадданай працай, разумнымі адносінамі да навакольнага творыць дабро і прыгажосць («Даверлівая зямля»). І нават тады, калі расказвае пра далёкі сібірскі край, пра землякоў-беларусаў, якія знайшлі там другую радзіму («Па зялёную маланку»).

Ды нарысы цікавыя, каштоўныя не толькі лірычным героем, чалавекам, шчырым, асабіста заклапочаным тым, што адбываецца навокал, чалавекам, што любіць, цэніць іншых людзей, умее ўбачыць і адкрыць у кожным добрае, жыццятворнае. Яны, нарысы, цікавыя, каштоўныя ўзноўленымі жывымі карцінамі жыцця, няпростага і нялёгкага, але творчага, прыгожага.

«Аповесці «Крыло цішыні» і «Усе мы з хат» маюць усе асаблівасці нарысаў, гэта зусім не шкодзіць мастацкаму ўспрыманню, а, наадварот, спараджае ў чытача асаблівы давер: так, усё гэта было. І ўсё гэта было так, як расказана і паказана Я. Сіпаковым. Нібы гаварыла само сэрца, застаўшыся з праўдай сам-насам» («Полымя», 1977, № 3, с. 235). Так пісаў у рэцэнзіі на кнігу «Крыло цішыні» пісьменнік П. Місько.

Гэтыя аповесці — даніна памяці аб перажытым, даніна тым клопатам самой літаратуры, якімі жыла яна ў сямідзесятыя гады, хварэла. Асабліва тая яе частка, што названа была вясковай прозай. Творы Сіпакова лірычныя сваёй танальнасцю. Прычым лірызм гэты, асабліва ў «Крыле цішыні» — выключнай інтэнсіўнасці і чысціні. Інакш і быць не магло: тут вельмі многа пісьменнікавага болю, удзячнай сынавай памяці — балючай і светлай. Пісьменнік нібы другі раз вяртаецца да таго, пра што ўжо пісаў у ранейшых нарысах, вяртаецца, каб з большай аналітычна-абагульняльнай сілай раскрыць драматычны лёс беларускай вёскі, паказаць вялікую жыццястойкасць яе людзей, уславіць іх душэўную прыгажосць і духоўную веліч.

І вось сёння, суадносячы аповесць «Крыло цішыні» з усім, што зроблена пісьменнікам за мінулыя гады, яшчэ раз пераконваешся, што твор гэты ў яго самы задушэўны і шчыры, самы асабісты. За лёсам вёскі Сябрыні і яе людзей, за лёсам хлопчыка Ясіка вельмі празрыста бачыцца лёс самога пісьменніка і ягоных родных Зубрэвіч.

Ва «Уваходзінах» да аповесці Сіпакоў піша:

«Тады, хаця іншоў ужо трэці год пасля вайны, над сцішанай і надзіва супакоенай зямлёю Сябрыні да болю ў вушах звінела ня-

звыклая цішыня. Людзі, нядаўнія партызаны і салдаты, удовы і сіроты, інваліды і вязні канцлагераў, усё яшчэ аглушаныя вайною, асцярожна абвыкаліся ў ёй, у гэтай мірнай цішыні. Ніхто пакуль не ведаў, што пройдзе і год, і дзесяць, і пяцьдзесят гадоў, а яна, вайна, усё яшчэ доўга і настойліва будзе ўмешвацца ў іхняе жыццё...» Тут — ключ да ўспрымання, разумення твора. Чытаючы, адчуваеш усёй існасцю цішыню, нейкую неабдымную, нібы ўсясветную і светлую, але ў якой нібы чакае зручнага часу трывога, у якой затаілася і не хоча адыходзіць вайна. Гэтай светлай цішынёю і прытоенай трывогай ахутана ў аповесці ўсё; яе нясуць у сабе героі: салдаты, партызаны, старыя, жанчыны, дзеці, параненыя, знявечаныя, калекі — у кожным з іх у душы, у памяці, у целе жыве вайна і кожны жыве радасцю перамогі, цішынёй міру. У аповесці створана цэлая галерэя запамінальных, не знешне, а сваёй дабрынёй, душэўнасцю, чалавечнасцю, вобразаў людзей вёскі 1947 года: гэта і аднарукі скалечаны Гарлач — Рагатун, і дзед Сянчыла, і вартаўнікі калгаснага саду Яўсей і Манах у Белых Штанах, гэта і цётка Еўка, і Тупьціха... Менавіта яны, такія людзі, перамаглі ў вайне, адолелі пасляваенную бясхлебіцу, аднавілі разбураныя гарады і вёскі, вырошчвалі хлеб і бульбу і, галоўнае, ажывілі, напоўнілі цеплынёй і дабрынёй пакалечаныя вайною дзіцячыя, наогул чалавечыя, душы. Такія людзі — жыццядайная сіла, духоўнае апірышча, крыніца дабрыні і чалавечнасці для народа, для чалавека. Адзін з герояў аповесці «Усе мы з хат» гаворыць: «...Мы ўсе... з хат. Толькі разышліся ў розныя бакі — на поўнач і на поўдзень, на захад і на ўсход, абараняем нашы рубяжы, будуем новыя гарады, пускаем новыя заводы, перавыконваем пяцігодкі, але ж не забываемся, адкуль мы родам, і помнім, што хлеб, які ўсе мы ядзім кожны дзень, хлеб, які трэба нам як паветра, вырас на дабрыні клапатлівых нашых бацькоў».

Сучасным імкненнем сказаць сваё турботнае слова пра вёску, удзячнай памяццю прадыктаваны вясковыя аповесці Сіпакова. Яны — яскравае сведчанне і таго, што на чалавечай дабрыні вырастае не толькі хлеб; на ёй вырастаюць таленты, на ёй вырастае сапраўдная літаратура.

У прозе Янка Сіпакоў ішоў ад сябе, ад жыцця свайго, ішоў ад прозы непасрэдна лірычнай да прозы аналітычна-філасофскай, да адлюстравання жыцця іншых. Вернасць сабе і жыццю — гэтыя істотныя моманты, у рознай ступені і характару іх узаемазалежнасці, вызначаюць адметнасць празаічных твораў, іх падзейную насычанасць, узаемаадносіны героя з навакольным светам, тон.

У аповесцях і нарысах, што склалі кнігі «Па зялёную маланку» і «Крыло цішыні», прысутнасць аўтара была непасрэдная, ча-

ста падзеі былі падзеямі ягонымі асабіста, лірычная стыхія ў тоне, настроі была вызначальнай. Па-іншаму ўспрымаюцца аповесці і апавяданні кніг «Жанчына сярод мужчын», «Спадзяванне на радасць». Лірычны настрой іх прыцішаны, непасрэдная прысутнасць аўтара адчуваецца зрэдку, відаць большая жанравая і сюжэтная акрэсленасць, прысутнічае момант рацыяналістычны ў іх структуры і ідэйнай накіраванасці, узмацняецца пачатак аналітычны, больш выразна вылучаецца праблемная ўстаноўка.

Асабліва значнае месца ў апошніх па часе кнігах прозы Сіпакова займаюць творы, прысвечаныя асабістым узаемаадносінам, усяму комплексу пытанняў, што ўзнікаюць сёння паміж Ім і Ёю, пытанняў, якія кожны час, кожны чалавек вырашаюць па-свойму.

Чалавек жыве сярод людзей. Ягоныя справы і ўчынкі, думкі і разважанні, пачуцці і перажыванні — яны заўсёды так ці іначш закранаюць іншых людзей. Той мікрасвет, у якім знаходзяцца Ён і Яна або толькі Ён ці толькі Яна, гэта не толькі свет іхні, але і свет іншых, больш таго, ён невідочна ўваходзіць у вялікі свет жыцця. Адчуванне, разуменне гэтага становішча чалавека ў сённяшнім жыцці з'яўляецца галоўнай прадумовай мастацкага спасціжэння рэчаіснасці, найперш такой яе сферы, як сямейна-бытавыя дачыненні людзей, дзе момант суб'ектыўна-асабісты асабліва адчувальны. Да таго ж узаемаадносіны асабістыя ўскладняюцца, абвастраюцца нават канфліктам «нецярплівай эмансіпацыі і стойкага патрыярхату» (Г. Наан, акадэмік АН Эстонскай ССР).

Унутраным адчуваннем гэтага канфлікту якраз і народжаны (ёсць такое адчуванне) многія творы Сіпакова. У яго канфлікт гэты ўзмацняецца дылемай узроставага характару. Вось што ў сувязі з гэтым гаварыў сам пісьменнік карэспандэнту газеты «Голас Радзімы» (12 сакавіка 1981 г.): «У кожнага чалавека, мусіць, бывае такая часіна, калі яму здаецца, што ён калісьці праскочыў міма чагосьці вельмі важнага і сур'ёзнага ў сваім жыцці, чаго зараз якраз не хапае. Чалавек шукае гэтае «штосьці»...» Найчасцей гэта ў каханні. Але тое, што прайшло,— не вяртаецца. Ды калі б і вярнулася, ці тое гэта было б? Мы ж не тыя, ды і жыццё не тое.

«Госць падчас сенакосу», «Жаночы вальс», «У гарадку, які называецца Учора», «Развітанне з пісьмом», «Сустрэча пасля сустрэч», «У ліфце», «Саната»... Ці не гэтая праблема ў самых розных яе праяўленнях хвалюе тут пісьменніка?!

А аповесць «Жыві як хочацца»...

У цэнтры твора гісторыя, тыповая для нашых дзён, калі назіраецца няўстойлівасць сямейных адносін, калі асабліва ўзрастае колькасць разводаў. Алега Жавейку, галоўнага героя аповесці, кінула жонка. Пайшла да другога, з дзіцем. Паехалі на Далёкі Усход. Праз тры гады вярнулася.

Тры гады Жавейка пражыў адзін. Шмат чаго за гэты час было ў ягоным жыцці. Былі вясёлыя, шумныя мужчынскія кампаніі, былі жанчыны. Але характэрна: гады, што прайшлі, былі для Жавейкі і доўгія, і нудныя, і цяжкія, «дні шамацелі нейкія бескалёрныя, амаль падобныя між сабою, і плылі яны, як у цяжкім і свінцовым сне». Усё, што адбывалася з ім у гэты час, не адпавядала сэнсу і мэце яго жыцця, а ўсяго толькі настрою, часоваму няўстойліваму душэўнаму стану.

Менавіта гэты стан і даследуе пісьменнік. Даследаванне своеасаблівае. Уся гісторыя пададзена як успамін-перажыванне. Тут важны настрой, агульная эмацыянальная атмасфера твора. Дарэчы, Сіпакоў заўсёды ўмее стварыць настрой, адпаведны таму, пра што ў творы гаворыцца, адпаведны ўнутранаму стану героя. У дадзеным жа выпадку, уласцівае для пісьменніка светлае, жыццесцвярджальнае светаўспрыманне напоўнена тугою, унутраным болем.

Настрой узнікае ўжо папачатку, яшчэ да таго, як нешта стане вядома пра жыццё галоўнага героя.

Жавейка едзе з камандзіроўкі: «Аўтобус не спяшаючыся прадзіраўся праз восеньскую непагадзь... Дождж са снегам сыпаў на разараныя на зіму палі, на голыя, пачарнелыя ўжо ад макрэчы кусты, што паныла праплывалі за акном.

У палях, дзе яшчэ толькі пачынала світаць, было шэра, мокра і таксама няўтульна. Тыя ж шэрань і няўтульнасць гусціліся і ў аўтобусе — у ім усё было, як і на вуліцы, і толькі, можа, адно не хапала ветру ці дажджу...» Крыху пазней як бы між іншым пра Жавейку будзе сказана: «Хмурна было і ў яго на душы».

Герой аповесці пасля здрады жонкі жыў нейкі час падуладны ўплывам абставін, асабліва неяк адкрыты для іх не заўсёды станоўчага ўздзеяння. Не ўсё ў гэты час рабіў ён як трэба, не ўсе ягоныя ўчынкі былі ўнутрана апраўданы. Жончын прынцып «жыві як хочацца» не прымаў, «нават ненавідзеў. Але той, як прытопленая ў вадзе крыга, зноў і зноў усплываў у яго думках і балюча цёрся аб іх сваімі абламанымі — вострымі і шурпатымі — краямі...»

Пісьменнік паслядоўна, псіхалагічна абгрунтавана даводзіць, што такія людзі, як Жавейка, не могуць па сваёй духоўнай і душэўнай сутнасці жыць толькі так, як ім хочацца. Не могуць, бо гэта шкодна адбіваецца на іншых, разбурае і іх чалавечую асобу.

«Прыватная гісторыя» нашага сучаснага жыцця, па-мастацку даследаваная і асэнсаваная, набывае агульназначнае гучанне. Усім пафасам твора, логікай унутранага разгортвання характараў аўтар рашуча адмаўляе жорсткі прынцып: «жыві як хочацца», сцвярджае такія адносіны да жыцця, да чалавека, сутнасць якіх

можна выказаць наступным чынам: жыві не так, як хочацца, а так, як трэба жыць сярод людзей.

Аповесць гэтая засведчыла, што пісьменнік, чый талент раней глыбока выявіў сябе ў лірычнай празаічнай плыні, здольны аналітычна распрацоўваць складаныя жыццёвыя сітуацыі, дакладна псіхалагічна даследаваць няпростыя чалавечыя характары.

Знаёмячыся з прозай Сіпакова апошніх гадоў, прозай кніг «Жанчына сярод мужчын», «Спадзяванне на радасць», «Пяць струн», яскрава бачыш, што пісьменнік цяпер, можа, больш, чым у ранейшыя, маладзейшыя гады, знаходзіцца ўвесь у пошуку, у напружанай творчай рабоце. Асвойвае новыя жыццёвыя «плацдармы» і «пятачкі», новыя жыццёвыя і чалавечыя глыбіні, апрабоўвае новыя падыходы і прынцыпы сацыяльнага і псіхалагічнага даследавання характараў, шукае свежыя апавядальныя і выяўленчыя прыёмы, шукае скрытыя моўныя і слоўныя магчымасці.

Пісьменнік з дарослай уважлівасцю і дзіцячай непасрэднасцю і даверлівасцю адносіцца да жыцця, здольны сур'ёзна і адказна думаць пра яго і з усёй адкрытасцю душы дзівіцца ім, захапляцца. Устойлівасць творчасці надае грунтоўная народная этычная і эстэтычная аснова, выверанасць (уласным нялёгкім жыццём і лёсам народа) сацыяльных і духоўных крытэрыяў, сумленнасць і чысціня творчых намкненняў.

Вынікі — і лепшае ў творчасці Янкі Сіпакова пра гэта неабвержна сведчыць — залежаць ад наяўнасці і арганічнай узаемазалежнасці гэтых асноватворных момантаў.

*Серафім Андраюк*

# *Лірычная проза*

# АКНО, РАСЧЫНЕНАЕ Ў ЗІМУ

Зімнымі студзеньскімі начамі, калі настылая поўня скочваецца на самыя гарадскія каменіцы і калі яе ўжо нельга адрозніць ад круглабокіх вулічных ліхтароў; калі ў снежных тунелях астываюць добра прытомленыя за дзень снегаачышчальныя машыны, якія так спяшаліся вывезці мяцелістую зіму за горад; калі заснежаны па самую шапку студзень, як стомлены чалавек, з крэктам укладваецца спаць на мяккія, узбітыя завеямі сумёты,— такімі зімнымі начамі (я ў гэта веру) у многіх гарадскіх кватэрах самі па сабе, нячутна расчыняюцца раптам вокны, і ў цёплых пакоях неяк па-новаму запахне халодны снег — ці то крохкімі ледзяшамі, ці то зябкім бярозавікам. Тады доўга варочаюцца на сваіх канапах і раскладушках вясковыя бабулькі, якія на зіму прыехалі ў горад, каб даглядаць сваіх унукаў (на лета яны забяруць іх з сабою), варочаюцца доўга, аж пакуль нейкі абноўлены сон не выведзе іх праз гэтае акно, расчыненае ў зіму.

І вось яны ўжо, здаецца, ідуць — кожная па сваёй вёсцы, і з імі па-свойску вітаюцца сцішаныя ў вялізных сумётах хаты — гэта Хадорына, гэта Аўдоткіна, гэта Хаўронкіна. А з комінаў — роўныя, белыя, нібы акораныя слупы, дымы: ага, значыць, раніца, значыць, трэба спяшацца (у людзей ужо даўно ў печы паліцца!), трэба рыхтаваць снеданак і карове, і парсюку, і курам...

Потым, як гэта бывае ў снах, раптам, нібы крыгі, разломяцца хмары, а ў гэтым праломе выяснее вясновае сонца і асветліць тыя ж хаты, якія выглядаюць цяпер ужо неяк па-святочнаму прыбранымі. І што гэта ў іх новае? Ага, гэта ж стрэхі са светлымі ледзяшамі, нібы хусткі з махрамі... Памаладзелі хаты, як і самі бабулькі, прыбраныя на свята ў свае новыя крамныя хусткі. А вось і яны, капяжы. Адзін, нібы дазволу пытаючыся, звініць: «Кап?» (Маўляў, пагаворым?) «Кап!» — адказвае яму згодаю дру-

гі, і вось ужо яны разам вызвоньваюць сустрэчу вясне. Трэці чамусьці ўпарціцца. «Каб... каб... каб...» — спрабуе ён выкласці сваю думку, што, каб не сонца, ён бы так лёгка не паддаўся. Але нічога не паробіш — вясны без сонца не бывае! І вось бабулькі ўжо разам з унукамі збіраюць леташні бульбоўнік і розны тлум на сваіх агародах, паляць яго — як прыемна пахне дым! Потым дрыготкімі рукамі адрываюць дошкі, якімі былі забіты на зіму вокны і дзверы, і з нейкім светлым заміраннем пераступаюць парог халоднай, нежылой хаты. Сваёй хаты, якая хутка насагрэецца і збярэ ў сабе зноў усе звычайныя вясковыя пахі — печанага хлеба, паранай бульбы, сырадою.

І не бяда, што, прачнуўшыся, яны разумеюць, што яшчэ самы разгар зімы і што далекавата яшчэ да таго прыемнага дыму вясновага ачышчэння. Усё роўна пасля такіх сноў бабулькі неяк святлеюць і, сабраўшыся на гарадскім двары, пачынаюць размову пра вясну, пра свае далёкія, заснежаныя вёскі.

Бывае, што і самому раптам нейкім мулкім стане твой любімы горад, куды звычайна з радасцю і нецярпеннем спяшаешся з усіх дарог, і ты ходзіш па ачышчаных ад снегу вуліцах, нібы той мядзведзь-шатун, і не ведаеш, дзе дзець сябе, такога злога, незадаволенага, вуглаватага. І хай сабе на дварэ гаспадарыць маленькі, элегічна настроены ветрык — незразумела, куды ляцяць маленькія снежкі-сняжынкі: ці то ўніз, ці то, як мячыкі, стукнуўшыся аб зямлю, зноў узлятаюць да хмар; хай сабе вецер аж гудзе ў голых дрэвах, а сняжынкі, як тыя ўзлаваныя авадні, бзыкаюць ужо каля цябе і ўпіваюцца ў шапку-вушанку,— хай сабе! Ты ўсё роўна бачыш толькі малюнак ціхага аснежанага лесу, дзе кожная яліна заклапочана шушукае калыханку і над мядзведзем, які храпе ў бярлозе, і над глушцом, што даў нырца ў гурбу снегу, і над перамёрзлым зайкам, што чуйна, стоена задрамаў на хвілінку ў кусце...

Тады кожнаму становіцца вядома: гэта заныла тваё карэнне, якое да самае мяжы моцна трымае цябе, нібы дрэва, на зямлі, поіць сілаю і мудрасцю жыцця.

Не могуць дрэвы жыць без карэння. Не могуць і людзі. Можа, таму і памірае ад настальгіі — самай чорнай і самай светлай хваробы — чалавек, які пры жывой радзіме топча чужыя травы, лашчыць чужыя кветкі, чуе чужую мову сваіх дзяцей. Таму кожнаму народу, мусіць, будзе зразумела тая вялікая і шчырая радасць, прыемная разгубленасць бурата, які, пасучы авечак, зрабіў раптам не-

чакапае для сябе, такое шчымлівае і такое простае адкрыццё: сонца, маўляў, заўсёды, пастаянна жыве ў яго краіне, а да іншых яно толькі ў госці ходзіць...

Маё карэнне — вёска Зубрэвічы, звычайная вёска на Аршаншчыне. Яна прытулілася да перасохлай Вулянкі, якая ўспамінае, што была некалі сапраўднай ракою, хіба толькі падчас дружнага веснавога разводдзя. Зубрэвічы з'явіліся ў гэтым наваколлі першымі. Гэта прызнаюць нават самі вёскі-суседзі: за Вулянкаю пазней вырасла Зарэчча, уверсе ракі — Вярхоўе, унізе — Панізоўе. Можа, таму добрыя суседзі не крыўдзіліся на маю вёску, што яна заўсёды была неяк навідавоку: раней тут званіла царква, гудзела карчма, весяліліся кірмашы. Пасля, пры Савецкай уладзе, з'явіліся школа, клуб, крама, а затым, аб'яднаўшыся ў калгас «Хваля рэвалюцыі», былыя набожныя паскідалі званы з былой царквы, а са смалістага царкоўнага дрэва пабудавалі кантору калгасу, і з таго часу мая вёска стала так званай «цэнтральнай сядзібаю», куды едуць на праўленні калгаса і з Зарэчча, і з Панізоўя, і з Ярак, і з Альхоўкі, і з Бярозаўкі.

Адна і тая ж вёска для розных пакаленняў — розная. Скажам, для старых зубраўцоў — гэта старое сяло з прыгорбленымі хатамі, з доўгачаканым гамапкім кірмашом, калі з'язджаюцца на свята з усіх навакольных вёсак і калі ў кожнай хаце пачуе многа чужых людзей, а з імі пачуюць і іхнія казкі, іхнія песні. І яны, яшчэ зусім маладыя дзяўчаты, убраныя ў самыя квяцістыя свае строі, ходзяць па рынку і купляюць то прыгожую хусцінку, то пернікі, то абаранкі, а хлопцы, цяперашнія сагнутыя гадамі і халоднаю сівізною дзяды,— пастухі і аратыя, падзяліўшы на пяцёх нейкую кварту гарэлкі, частуюць сваіх брыклівых абранніц цукеркамі, семкамі ці арэхамі-лусканцамі.

А потым — музыка званоў.

— Бывала, як зазвоняць, як запяюць у царкве,— неяк расказвала мне цётка Саша, старэйшая бацькава сястра,— дык на ўсё дрэннае тады забываешся. А ведаеш, і твой жа бацька яшчэ хлопцам у царкоўным хоры спяваў.

Так, умела рэлігія прымусіць чалавека забыцца і на галодныя пасты, якія цягнуліся ледзь не ўвесь год, і на рабочыя ўсяночныя, калі селянін маліўся на вузкім загоне свайму маўкліваму сялянскаму богу, назва якому — саха. Добра ўмела, бо яшчэ і сёння ўспаміны старэнькіх бабулек і дзядуляў аздоблены тужлівым неразвонам царкоўных званоў у стройнай аправе царкоўнага хору. А мо-

жа яшчэ і таму, што там — іх дзяцінства і юнацтва, там яны бачаць сябе стройнымі, прыгожымі, маладымі.

Маё дзяцінства адкрыла для сябе і назаўсёды запомніла сваю вёску. Гэта вузенькі (якраз на адны калёсы) ручаёк пыльнай вуліцы, а паабапал яе шырокія, як зялёныя загоны, берагі травы, якія сягаюць аж пад самыя хаты, заходзяць у двары і правулкі. Гэта наша «поле», дзе мы вучыліся калектыўна і жаць, і касіць, і малаціць: самай любімай нашай гульнёю была гульня ў калгас — разам мы вазілі маленькія снапы з травы, разам палолі «лёп», разам капалі «бульбу». І нам, як тагачаснаму калгасу, таксама не хапала тады трактароў, аўтамашын, касілак — вядома, цацачных. Ды і за сапраўдную палутарку, што зрэдзь калі ўзнімала пыл па нашай вуліцы, мы, як зачараваныя, беглі, аж пакуль яна не знікала з вачэй.

Недзе там, у маёй вёсцы, і сёння яшчэ асталася неймаверная радасць, якая запаланяе ўсяго цябе, калі толькі пачуеш, як каля школы неяк задумліва затуркоча рухавічок кінаперасоўкі. Тады з усіх ног бяжыш туды, каб дапамагчы што-кольвечы кінамеханіку: ці прынясеш посцілку, каб завесіць акно для дзённага кінасеанса, ці блізкі свет бяжыш з афішаю, каб паведаміць іншым вёскам, што ў Зубрэвічах сёння кіно. Калі ж гэта не ўдаецца, тады лезеш пад падлогу і некалькі гадзін сядзіш там у сырым заплесненым падполлі, аж пакуль «кіншчык» не пачне пускаць у залу гледачоў і калі ўжо можна вылезці са сваёй схованкі. Праўда, усё роўна незаўважаным рэдка калі ўдавалася астацца: безбілетнікаў кінамеханікі адразу назнавалі па павучыне, у якую тыя былі паўкачаныя, і выганялі на вуліцу. Але і пасля гэтага яшчэ аставалася надзея паглядзець фільм — вечарам, пад акном. Праўда, урыўкамі: кінамеханікі раз-пораз аббягалі клуб, і тады ад вокан, як спалоханыя вераб'і, мы разляталіся ва ўсе бакі.

Гэта ўжо крыху пазней. А спачатку — доўгія, асветленыя снежнымі сувеямі зімовыя вечары, калі, зашыўшыся ў куток на прыпечку Луковай ці Піліпёнкавай хаты, куды часцей за ўсё збіраліся мужчыны, з трапятаннем, нібы стварэння свету, чакаеш і баішся прапусціць тую хвіліну, калі нехта з дзядзькоў, наскробшы патыліцу, скажа: «Значыць, жыў-быў»... А потым слухаеш, баючыся нават паварухнуцца:

— А гэта было з маім бацькам. Ён сам мне пра гэта расказваў. Ішоў ён неяк з Вярхоўя. Ну, вядома, да знаёмых там зайшоў, чарку ў руках патрымаў — ідзе сабе, пес-

ні спявае, як усе добрыя людзі. Дайшоў да Самастаянавай гары, сеў на ўзрэччы, на саменькім-саменькім беражку Вулляпкі (а яна тады была ого якая глыбокая — і дна не відаць!) і — ратуй мяне божа! — пачаў распранацца: аборы свае разборсвае, лапці-атопкі скідвае, анучы на кусты развешвае. Здалося яму, што дома на сваёй печы сядзіць. А гэта яго чорт зачапіў. Ну і распрануўся бацька на беразе да самых споднікаў, а было гэта восенню, халаднавата ўжо, голаму на беразе ракі — тым болей. Вось ён і гаворыць: «Што гэта, Сцепаніда, у нашай печы вычаўрала ўсё? Мусіць, дрэнна паліла, што на чарэне і то холадна». А чорт матчыным голасам кажа: «Ідзі ўжо, кладзіся, цямцюр цара нябеснага. І ноччу няма на яго ўгамоння». А голас, як бацька потым гаварыў, якраз як у марцовай княгіні, так і заве, так і цягне. «Адкасніся ты ад маёй галавы,— згаджаецца бацька,— не вякай там. Іду ўжо»... І толькі гэта ён хацеў з беражка, нібыта з печы, ссунуцца ў вір глыбокі, куды чорт яго клікаў, а тут певень: «Ку-ка-рэ-ку!»...

— Жыла ў нашай вёсцы Матруна — вельмі сварлівая маладзіца. Дзяўчынаю яе не назавеш, калі ёй ужо недзе пад саракоўку, хоць яна яшчэ і не замужам была. Ды яна ж табе, Пятрок, яшчэ нейкай далёкаю раднёю даводзіцца: казалі, што твой бацька і яе брат пад адным сонцам анучы сушылі. Так і жыла адна. Хто ж рашыцца яе замуж узяць, калі ў яе язык, хоць ты на начапку надвязвай. Усіх у вёсцы абгаварыла, усіх абняславіла: і гэты не такі, і той не гэтакі. І вось неяк ёй закарцела пагадаць у ноч перад калядамі. Узяла яна два люстэркі, пайшла да поўначы ў лазню, зачынілася, запаліла свечку і давай шаптаць самлелымі ад страху вуснамі: «Суджаны мой, роджаны мой, пакажыся мне». І раптам роўна ў дванаццаць гадзін адно люстэрка засвяцілася, і там, недзе далёка-далёка, паказаўся маленечкі, з камара, чалавек. Вось ён бліжэй, бліжэй, яго ўжо і разгледзець можна... «Авохці мне,— аж ускрыкнула Матруна,— ды ён жа гарбаты! А хай цябе сырая зямелька возьме, мой ты суджаны!» А гэты суджаны развярнуўся ды як трэсне ёй па лбе нейкім брыжаватым паленам, аж Матруне цёмна ўваччу стала і нібы на цёмным небе іскаркі-зоркі заскакалі. Калі яна трохі аддыхалася, то зноў убачыла свайго суджанага, які яшчэ замахваўся. Але тут неўні на вёсцы: «Ку-ка-рэ-ку!» Ён і пабег зноў у люстэрка. А рубец той у Матруны на ўсё жыццё застаўся. Я ж сам бачыў яго. Толькі няславіць людзей Матруна

пасля гэтага перастала. Ды і замуж выйшла. Праўда, як і ў гаданні, за гарбатага...

— А ў майго дзеда конь быў. Белы такі, гладкі, адылі, як лялька тая. Але нешта не дагледзеў яго дзед — здох Вецер. Ну, рашыў тады дзед з яго помаччу хоць на ваўкоў папаляваць. А было гэта якраз у піліпаўку. Асмялелыя ваўкі тады, адылі, у самую вёску прыходзілі, сабак з будак выцягвалі. Ну, папрасіў дзед мужчын, дапамаглі яны адцягнуць каня за ток. А вечарам ён пайшоў туды, зачыніўся ў ёўні, дубальтоўку ў малюсенькае акенца высунуў. І чакае. Недзе туды к поўначы, бачыць, адылі, мільгаюць агеньчыкі — гэтак бліс-бліс, бліс-бліс. Ідуць, значыць, ваўкі. І толькі яны да каня пачалі бліжыцца, а Вецер раптам як падніме галаву, як заіржэ ды як падхопіцца на ўсе свае чатыры нагі. І кругом тока пабег. Адылі, чуе дзед: вароты зарыпелі — адчыняе, значыць, іх Вецер. Вось ужо ён праз падваротню пераступае — капыты стукаюць аб дошку. І потым — дыб-дыб-дыб — падыходзіць да ёўні і давай капытамі ў дзверы малаціць. Адылі, малоціць і чалавечым голасам гаворыць: «Дык што ж гэта ты, Тарас, мяне, твайго сябра, нават у зямлю не пакладзеш, ваўкам на з'яданне аддаеш!» А сам як не плача. І цапок, якім ёўню дзед заклаў, трашчыць ужо — вось-вось пераломіцца... Але тут, адылі, певень недзе: «Ку-ка-рэ-ку!» І адразу ціха-ціха стала. Дзед лахі пад пахі ды дахаты хутчэй. Вось з таго часу, адылі, ён і пачаў заікацца. А мужчыны потым бачылі, як на тым месцы, дзе Вецер ляжаў, адылі, сляды былі. Толькі конь як скрозь зямлю праваліўся — нідзе не знайшлі...

...Вось гэта мая вёска. Памятаецца, як потым, сцяты ўвесь, бяжыш дахаты, баючыся нават дыхнуць і азірнуцца назад, і лягчэй уздыхнеш на хвіліну тады, калі нейкі сонны певень, пераблытаўшы час, якраз дарэчы крыкне на ўсю вёску: «Ку-ка-рэ-ку!» А потым і ў хаце ўсё прыслухоўваешся, ці не ліжа сцяну, ля якой ты ўлёгся спаць, яго вялікасць Лізун, у якога і зубы, і язык жалезныя і ад якога нідзе нельга схавацца: ён можа пралізаць любую сцяну...

У цяперашніх дзяцей таксама свая вёска. Яна напоўнена аўтамашынамі, трактарамі, камбайнамі, сеялкамі, стагавальнікамі, якія штохвіліны снуюць па вытаптанай шырокай вуліцы. Іхняя вёска — гэта электрычнасць, тэлевізары, радыёпрыёмнікі, новыя хаты. І звычайная з'ява — кіно два-тры разы на тыдзень. Паспрабуйце неяк змяніць

іхнюю вёску, з якою цяпер звязана іхняе дзяцінства, і ім таксама захочацца ўбачыць яе, сённяшнюю, як мне зноў хочацца сустрэцца з маёй зялёнаю вуліцаю і вузенькім ручайком пыльнай дарогі пасярод яе.

Дзякуючы тэлевізару, модныя прычоскі і шэйкі, міні-спаднічкі і штаны з ланцужкамі на калашынні прыходзяць у вёску сёння адначасова, як і ў горад. Вясковую моладзь цяжка адрозніць на танцах ад гарадской. А вось старыя не хочуць скідваць бушлаты, якія аддаюць ім пасля арміі сыны; фуфайкі, якія зрабіліся такімі ж звыклымі, як і спрадвечная работа хлебаробаў; шапкі, выліпялыя на сонцы, пад якімі ва ўсе чатыры пары года завязваюцца і спеюць маленькія расінкі — кроплі поту.

— У міні-спадпічцы палоць, тым больш малаціць, не пойдзеш,— жартуюць у вёсках.— У ёй добра толькі цераз рэчку, дзе няма моста, пераходзіць: не трэба спадніцу падніімаць.

Час ёсць час... Памятаю, як яшчэ нядаўна мы, студэнты, уважліва слухалі выкладчыцу, якая расказвала пра сваё турысцкае падарожжа па Францыі, і здзіўляліся, як гэта там днём па вуліцы ходзяць хлопцы і дзяўчаты ў абдымку і цалуюцца перад усімі... Цяпер і ў нас гэтым ужо не здзівіш нават старых людзей.

Старыя не разумеюць маладых. Спрачаюцца, добра гэта ці дрэнна. Таксама спрачаюцца, якая вёска патрэбна сённяшняй вёсцы. Цагляная, з дамамі-пебачосамі, ці ўсё тая ж зялёная, аднапавярховая, з пеўнямі, якія прахопліваюцца штораніцы з адзінаю думкаю: «Мусіць, праспаў!» І, узрадаваўшыся, лопаюць крыллем і крычаць: «Не праспаў! Не праспаў!..»

Мне ж здаецца, што мы павінны пакланяцца і сёння — і закінутай некуды на гарышча старэнькай сяўні, якая беражліва рассявала па свежай раллі буйныя зярняты жыта ці ячменю — акурат як сялянскія слёзы;

і забытаму, пачарнеламу, з'едзенаму шашалем цэпу, які адзін настойліва і паспяхова замяняў і складаную малатарню, і цэлы завод на полі — камбайн, увішна расказваючы ўсім пра свае «тры цапы»;

і патрэсканым ступе і жорнам, якія як маглі дапамагалі людзям у цяжкія часіны сабраць гаршчэчак груцы ці спячы шорсткі блін;

і дзяжы, якая і ў дні голаду (хоць і моцна закрыўшыся бічайкаю) берагла макулінку рошчыны і заўсёды заставалася ў хаце, як нейкі выклік, нейкая пагроза любому го-

ладу: маўляў, голад усё роўна мінецца і ў хаце зноў запахне хлебам;

і печы, гэтай нястомнай працаўніцы, якая чарпела адна на папялішчы ў грозныя часіны пажараў і войнаў і ўсё роўна спраўна рабіла сваю звыклую работу — нібыта яна стаіць у хаце, а не пад адкрытым небам;

і калаўротам, і кроснам, якія напапралі, напаткалі ў свой час столькі перабіранак і ручнікоў, апдаракоў і сарочак, без якіх былі б больш цьмяныя, цішэйшыя на колеры і на радасць вяселлі, радзіны ды іншыя гаваркія застоллі.

Так, сапраўды, камвольныя камбінаты і хлебакамбінаты, сучасныя млыны і камбайны, сеялкі і веялкі — усё гэта вялікая заваёва нашага жыцця, якая стала ўжо даўно звыклаю. Але, мусіць, нам сорамна забывацца, хто дапамог нам дайсці да гэтай радасці. Калі мы не можам знайсці прыпатрэбнага цёплага слова пра наш пачатак, то хоць прымоўчым, калі захочацца здзекавацца з гэтых вялікіх працаўнікоў, даўніх, як, здаецца, і сама зямля: не здзекуемся ж мы і сёння, у светлы поўдзень вялікай цывілізацыі, з каменнага тапара першабытнага чалавека — маўляў, зірніце, які дурань: карыстаўся такою нязручнаю і такою прымітыўнаю прыладаю...

Пройдзе час, і нашы нашчадкі, я думаю, зусім не ўбачаць у рабоце ні сярпа, ні молата. І толькі наш савецкі герб не будзе саромецца гэтых сціплых прылад працы рабочага і селяніна.

Таму ў мулкія ночы падоўгу, натужліва спрабуеш успомніць, скажам, як называліся ўсе дэталі красён: навой, напажы, бёрда, ніты, цэўкі... І вось тады асцярожна ў прыціхлым да раніцы Мінску адчыняецца ў зіму і маё акно. Вось яна, мая дарога з Оршы, а па ёй я, залеплены з ног да галавы снегам — выкапаны навагодні Дзед Мароз. Я соўгаюся па сыпкім, як пясок, снезе, каля старых екацярынінскіх верставых слупоў (гэта ж даўняя царская дарога), пакуль не збочваю ў лес, дзе па-мудраму ціха і спакойна, дзе кожны пень выглядае нейкім дзіўным казачным баравіком са светлым брылем лёгкага пухкага снегу. А вось і поле. А вось і калгасны двор. Вось тут, ля канюшні, яшчэ нядаўна стаяла цесная «блыхарка» — маленькае збудаванне, зробленае ўсё з той жа царквы,— дзе на сценах віселі хамуты, сядзёлкі, лейцы, а на падлозе цёмнымі зімовымі раніцамі, хто як мог, сядзелі мужчыны — чакалі нарад на работу ці гутарылі, пакуль коні паядуць

авёс. І ўсё курылі. Нават дзіўна было, як гэта ў такой невялічкай пабудове можа ўмяшчацца столькі людзей і столькі дыму. «Блыхарка» ў такія часіны была падобна на нейкі паветраны шар-аэрастат, якому, здавалася, дай яшчэ крапельку дыму — і ён раптам адарвецца ад зямлі і паляціць.

Вечарэе. Выпражаныя коні, чувацъ, хрумстаюць у сваіх станках сена, а сані сабраліся ў гурт каля канюшні, каб пахваліцца, хто куды ездзіў. Людзям не дадзена пачуць іх размовы, але я і так добра пазнаю, дзе хто з іх быў: вось гэтыя, з паламанаю поручняй, з пакладзенаю ззаду папярак саней «лісою» — сасновым кругляком, з якога густа пасадрана кара, нібы скура — аж садпее,— гэтыя, вядома, былі ў лесе і потым цягнулі па снезе доўгае бервяно — некаму на хату ці на слуп электралініі; вось гэтыя, з накручанымі ў завірты шматкамі сена, перавозілі з пахкіх пунь, дзе сабраны ўвесь водар лета, у кароўнікі і канюшні ежу для коней і кароў; а вось на гэтых, акуратна засланых саломаю, утаптанаю людзьмі, пэўна ж ездзілі ў госці: у саломе яшчэ і цяпер, мусіць, не паспела адхлынуць рэха ад вясёлых песень — яно яшчэ доўга будзе шамацець у сухіх, як порах, саломінках, аж пакуль зусім не аслабне.

* * *

— Дзень добры, дзядзька Нікіпар!

Гэта наш сусед. Ён едзе адпрагаць каня — недзе затрымаўся даўжэй, чым іншыя. Ён адказвае на прывітанне, а потым жартам пытае:

— А можа і адпрагаць не трэба? Давай адразу ж паедзем табе ў дровы, га?

Гэта традыцыйны пачатак нашых размоў пры кожнай сустрэчы.

— Ты ж, можа, памятаеш, як мужчыны самагонку ў вас пілі, абяцаючы дроў прывезці, а самі тады — ані блізка. Хто ж тады вам дроў прывёз? Я, Нікіпар. Помніш, я прыйшоў раніцою, а ў вас вокны замураваліся, Паша на печы прымерзла да сцяны. Я тады і кажу табе: «Паехалі, Іванька, у дровы». А ты ж малы яшчэ быў — яй жа богу, тады, здаецца, ці не ў трэці клас хадзіў.

Я таксама памятаю гэта. Зіма той год была снежная. І мне, малому, было цяжка не толькі цягаць дровы, але і хадзіць самому: як правалішся ў снег, дык з галавою. І Нікіпар цярпліва выцягваў са снегу і мяне, і ссечаную алешыну, якую я цягнуў да саней. Менавіта ў той дзень,

здаецца, я, хлапчанё, адчуў нейкую сталую мужчынскую асалоду ад працы і яе непасрэдную сувязь з усім, калі потым, скінуўшы на двары дровы, з настылаю сякераю ў руках, з марозу зайшоў у хату, якая пахла варанаю капустаю. І ў халоднай хаце стала тады мне горача...

З дзядзькам Нікіпарам у мяне неяк вельмі ж ужо звязваецца прыход вясны, з'яўленне першай травы, першага лісця на дрэвах. Ён доўгі час быў пастухом. І яго пастухова труба, якая пачынала трубіць на голы лес і голы луг, здавалася нейкай чарадзейнаю: адразу ж пасля яе прыглушаных гукаў паспешліва пачынала разрываць пупышкі лісцё, пад босымі нагамі адчувалася, як варушыцца зямля,— гэта травінкі раскідвалі яе ў бакі і вылазілі наверх,— пэўна, каб зірнуць, хто гэта там іграе. А праз колькі дзён, нібы пaдуладная пастуховай трубе, зеляніна палала ўжо над усімі Зубрэвічамі.

З дзядзькам Нікіпарам у мяне, хоць і неяк ускосна, звязаны таксама розныя святы. Па натуры ён чалавек жартаўлівы, і нават тыя моманты ў сваім жыцці, якія іншыя маглі б залічыць у трагедыйныя, ён умее падаць так, што яны робяцца жартамі. «Няма ў нас ціятра, дык вось Нікіпар выдумляе»,— жартуюць з яго. Калі дзядзька Нікіпар вып'е чарку, тады ў яго «ціятры» працуе, здаецца, цэлы ансамбль. А на якое ж свята можна абысціся і не памачыць нават вуснаў у тое зелле, ад якога, як сцвярджае адна палова чалавечага роду, усе няшчасці на зямлі. І нават няшчасці дзядзькі Нікіпара, якія ў вёсцы завуць «ціятрам». Вось некаторыя сцэны з гэтых спектакляў.

## *На масленіцу*

Надвечар заходзіць да нас у хату дзядзька Нікіпар. Нейкі засмучоны і адначасова прасветлены. Пад пахаю трымае, прыціснуўшы локцем, звязаную вяроўку.

— Ну, Паша,— звяртаецца ён да маёй сястры,— бывай. Больш вы мяне ў Зубрэвічах не ўбачыце.

— А што такое, дзядзька, здарылася? Можа на цаліну збіраецеся ехаць?

— Што ты, Паша! Навошта мне ўжо тая цаліна, мне і ў Зубрэвічах зямлі хопіць.

— Дык а чаму ж развітваецеся?

— Пайду на загуменне, у таку засілюся.

— А што здарылася?

— Ды зноў са сваёй Дар'яй насварыўся.

Дзядзька Нікіпар — чалавек шчыры. Ён не хоча нікога пакрыўдзіць і таму зоїдзе як не ў кожную хату, каб развітацца з усімі і ўсім паведаміць пра сваё рашэнне. І потым ужо за ім на загуменне, як за царом, ідзе цэлая працэсія.

Ён ідзе ў ток, лезе пад саменькую страху, чапляе там вяроўку, робіць пятлю. І калі ўбачыць, што ля яго, на перакладзіне, стаяць ужо хлопцы, смела кідаецца ўніз, учапіўшыся рукамі за вяроўку,— праўда, пра пятлю цяпер ужо ён чамусьці забывае. Хлопцы перарэзаюць вяроўку, дзядзька Нікіпар падае на такавішча.

Цяпер можна разыходзіцца — спектакль скончаны. Ачышчэнне ад грахоў і дараванне жонкі атрымана. Дзядзька Нікіпар цяпер ужо слухаецца кожнага і спакойна ідзе дадому. А паспрабавалі б вы яго адгаворваць трошкі раней лагічнага завяршэння задуманага ім і здзейсненага спектакля!..

## *На дзяды*

У самую поўнач, калі дзяды з усёю раднёю, як кажуць, выходзяць з магіл і калі на могільніку робіцца так людна і гаманліва, нібы на кірмашы; калі дзяды разыходзяцца па сваіх дварах і, нячутна адшчапіўшы завалы і зашчапкі, заходзяць у хаты і рассаджваюцца ў покуце за сталамі, намацваюць упоцемку лыжкі і гаршкі з куццёю,— у такую поўнач у дзверы нашых сянец нехта настойліва пагрукаў.

Адчынілі. Вядома, гэта быў не нейкі там дзед, які рашыў далей не засакрэчвацца і спакойна, пры святле лямпы, засесці за куццю. Гэта, зразумела, быў дзядзька Нікіпар. Ён зайшоў у хату і папрасіў:

— Паша, дай мне, калі ёсць у цябе, запалак.

— От, дзед, не мог ужо не курыўшы ноч перачакаць.

— А мне, Паша, не прыкурваць,— нейкім хітраватым голасам сказаў дзядзька Нікіпар.

— Дык а навошта тады — у печы ж распальваць яшчэ рана.

— А я, Паша, хачу сваю хату падпаліць. Карасін у каністры знайшоў, а запалак — усе пячуркі абшукаў — няма!

— Дык а што здарылася?

— А зноў са сваёй Дар'яй пасварыўся.

Запалілі лямпу, падкруцілі кнот. Вясёлы язычок полымя падміргнуў сцішанай хаце.

— Дзед, а ў цябе ж запалкі ў руках...

— Што ты гаворыш? — як бы спалохаўся ён, падышоў да святла і пачаў, нібы ўпершыню ўбачыўшы, разглядаць карабок запалак — нават патрос ім ля вуха.— Вось дзіва... А я шукаю...

Праз колькі хвілін ён ужо грукаўся да Рыбачыхі, другой сваёй суседкі:

— Мар'я, адчыні! Дай мне запалак хату сваю падпаліць. А то ў Пашы няма...

І само сабою зразумела, што цяпер ужо ён карабок з запалкамі схаваў як можна далей...

## *На калядах*

Сонечны поўдзень. Па вуліцы Нікіпар вязе маленькія санačкі, на якіх звычайна возіць дадому ваду з калодзежа. На санačках ляжыць дзед Хведар, ці, як у нас яго завуць, Дода — Нікіпараў сябар, таксама пастух: ён скародзіць нагамі снег і спрабуе спяваць песні. Раптам Нікіпар, пакаўзнуўшыся, падае. Дода нейкі час прыслухоўваецца, потым пытае:

— Слухай, а чаму ты не вязеш?

Нікіпар маўчыць. Цяпер ужо Дода падымаецца, падвозіць санačкі ўперад, кладзе на іх Нікіпара, заварочваецца і едзе — толькі ўжо ў другі бок: трэба ж сябра дадому завезці. Цяпер ужо Нікіпар скародзіць снег нагамі і таксама спрабуе завесці нейкую песню: а што, едзе з камфортам! Раптам песня сціхае.

— Дода, чаму ты не вязеш?

Дзядзька Хведар таксама пакаўзнуўся. Цяпер ужо ўстае Нікіпар... Адным словам, яны, можа, з гадзіну спрабавалі завезці адзін аднаго дахаты. Але гэта ім так і не ўдалося.

Сабраліся мужчыны — Нікіпар жа новы «ціятар» паказвае. А гледачы — яны народ вясёлы, нават падказаць могуць, што і як рабіць:

— Схадзі, Нікіпар, па сваю пугу, каб Хведар менеї лепаваўся.

— А ты, Хведар, на плечы яго бяры, так лепей: ён жа лёгкі. У яго ж неўнева вага.

Потым, калі ўжо спектакль закончыўся і мужчыны разводзілі старых сяброў па хатах, у Нікіпара спыталі:

— Дзе гэта ты, як гразі, набраўся?

— А ў сваёй хросніцы. Зайшоў гэта я да Матруны Хве-

даравай, а яна мне адну шклянку... Я яе — раз! Потым другую... Потым трэцюю, чацвёртую... А гарэлка — па пальцы гарыць... Сінім такім полымем...

Потым, калі расказалі пра гэта цётцы Матруне, тая аж рукамі развяла:

— А калі б жа яго ваўкі не елі, гэтага Нікіпара. Зайшоў ён да мяне і кажа, што тоўстая каўбаса засела і прагнаць няма чым. Дык я яму паўчаркі — яй жа богу, не лгу — паліла, ён і пайшоў...

За апошнія гады дзядзька Нікіпар трохі аслаб. Нават у бальніцу неяк трапіў.

— Ведаеш, Іванька, нервы тыя, нібы вяроўкі, закруціліся. Доктар адкручваў іх, адкручваў — ледзь назад адкруціў. А я, ведаеш, лез на хату і з апошняй прыступкі лесвіцы ўпаў...

— Не слухай ты яго! — жартуюць мужчыны.— Ён жа з першай прыступкі зваліўся — адной нагою нават на зямлі яшчэ стаяў. А крыку нарабіў — не прывядзі ты бог! Усе ўжо думалі: чортведама што здарылася...

Дзядзька Нікіпар заўсёды помніў, ды і цяпер помніць, усе святы. Ён любіць святкаваць. Таму не абмінае ні дзяды, ні каляды, ні радаўніцу, ні спас...

Мне ж таксама здаецца, што ў некаторых з гэтых спрадвечных свят, якія прыносілі нямала радасці нашым далёкім і блізкім продкам, чалавечае часам перамагае рэлігійнае: людзі спраўлялі гэтыя святы, забываючыся, што яны пачынаюцца ад бога. У гэтай неўтаймаванай радасці свята, калі хоць адзін дзень можна забыцца на голад і неўраджаі, да нашага часу дайшло першабытнае, язычніцкае тлумачэнне сувязі чалавека і прыроды. Калі чалавек пакланяўся агню, які цёмнай, халоднай ноччу лашчыўся каля яго ног, як ласкавае сабачанё; калі ён хадзіў на сваё маленне да халоднай крыніцы, якая доўгімі, як жыццё, спякотнымі днямі вяртала сілу яму самому і яго пасевам; калі ён рабіў бога са свайго каня — такога ж пакутніка і гаротніка, як і ён сам, які таксама моўчкі пераносіў увесь цяжар нялёгкага жыцця хлебароба,— то тут, зразумела, чалавек пакланяўся сваім спрадвечным сябрам, да якіх яму хацелася сказаць цёплае слова. Не, тут у чалавека было не толькі набажэнства!

Я лічу, што папы страцілі сваю ўладу над вербніцаю, гэтым святам вясновага абуджэння, калі дазволілі набожным, устаўшы да сонца і наламаўшы тут жа, на ўзрэчны, галінак вярбы, на якіх расселіся цэлыя выраі коцікаў,

прасіць у звычайнай вярбы (у вярбы, а не ў бога!) здароўя:

Ішла вярба з замор'я,
Несла кораб здароўя.
Дала мне,
На й табе!
Дала мне,
На й табе!

Сёмуха... Духа... Колькі язычніцтва ў гэтых усхваляваных прыгатаваннях! Усе чыста мятуць свае двары, вуліцы каля хат, а потым толькі нядаўна зазелянелы лес, гэтая спрадвечная любоў чалавека, перасяляецца на некалькі дзён у вёску, каля варот і веснічак вырастаюць бярозкі, а ў хату — нельга зайсці: там стаіць такі старажытны паўзмрок такога пагудастага лесу — з гладышоў і збанкоў, якія, нібы кацяняты, пахнуць яшчэ малаком, п'юць халодную ваду вялікія бярозы, уся столь паўторкана галінкамі клёну і ліпы, а на белых, толькі што вышараваных масніцах — пахучы аер... І, здаецца, гэтаму лесу не стае толькі аднаго птушынага граю ды яшчэ спалоханага дзіцячага «агу!», што заблудзілася ў непралазным гусцяжы.

А шырокая па натуры сваёй масленіца — гэты разгул сялянскай весялосці перад вялікім пастом! Старажытнаславянскае свята провадаў зімы і сустрэчы вясны, якое потым папы сілком прымушалі спавядацца рэлігіі. Але яно так і не паверыла ў папоўскага бога, так і асталося бязбожнікам і ўсю сваю ўвагу аддавала толькі жыццёвым, толькі сялянскім рэчам.

На масленіцу ў маёй вёсцы ходзяць «трэсці падушкі» маладажонаў. Яшчэ загадзя робіцца дакладны ўлік, хто за гэты час — ад масленіцы да масленіцы — ажаніўся, а потым з песнямі і жартамі жанчыны ідуць да маладажонаў. Тыя, зразумела, рыхтуюцца да гэтага свята: збіраюць пітво і закусь... І хіба гэта дрэнна, калі старэйшыя прыйдуць і паглядзяць, як складаецца сям'я, як маладыя жылі цэлы год і ці няма дзе нейкай крыўды паміж імі, якая яшчэ не ўдаўнілася і якую пакуль што можна выправіць.

На масленіцу ў нас цягаюць (а правільней — цягалі раней) калодкі. Мужчыны і жанчыны ходзяць чародамі і то на ляйчыне, а то і на супоні,вышмаргнутай дзеля свята з хамута, цягаюць ладныя круглякі-калодкі. Каму прывяжуць да нагі ці начэпяць на шыю такую калодку, той павінен адкупіцца і ўчаставаць добрых гасцей.

Горы бліноў... Горы снегу — крыху надталага і крыху надмарожанага — нават і ён блішчыць, як добра намазаны лоем масленічны блін. І горы песень...

Масленка, масленка —
Каўзуха!
А чаму ты, масленка,
Не да духа?..
Адна нядзелька,
І тая карацелька,
Масленка,
Масленка...

І ўжо зусім неўтаймаванае, утрапёнае летняе свята — розгары, якое ў нас называюць яшчэ «шалёным святам». У гэтую ноч дазваляецца ўсё. Таму назаўтра раніцою, калі ўжо зноў каля хат у роўныя штабялі збярэцца раскачанае за ноч бярвенне, калі зноў вернуцца на сваё месца вынесеныя на вуліцу ганкі, калі адапруць падпёртыя дзверы, пачынаецца вясёлы фінал гэтага свята — расказы.

— Прачынаецца гэта Рыбачыха і кажа свайму Рыбаку: «Нешта яшчэ так цёмна, а я ўжо выспалася».— «І я, Мар'я, даўно ўжо ляжу, а раніцы ніяк не дачакацца». І зноў спяць. Прачынаюцца ўжо недзе к паўдню. «Глядзі ты, усё яшчэ цёмна». — «Але ж на вуліцы нешта вельмі многа гоману».— «Пайду зірну, хто гэта ў такую рань разбушаваўся». Падыходзіць да акна і толькі тады бачыць, што ўсе вокны замазаны гразёю і пазавешаны. «А калі б на іх — сёння ж розгары». Вы не бачылі — Рыбачыха ж во толькі карову ў поле пагнала, а Рыбак у печы паліць астаўся. А што, хоць полудзень свежанькі будзе — толькі што з печы...

— А Пасмарац устае і не можа дыхнуць — у хаце поўна дыму. Жонка ля печы бушуе. «І што гэта за навалач такая, і што гэта за дзіва гэткае — не гараць дровы, хоць ты трэсні. І дым увесь на хату ідзе. Уставай, гаспадар! У людзей дровы як дровы, а ў яго і летам адно гніллё ды сыр'ё, як з вады выцягнутае».— «Ганначка, што ты, дровы ж у нас, гэна, сухія, як цурачкі».— «Ну, дык тады ідзі ды сам падпалі гэтыя цурачкі». Устае Пасмарац — і так, і гэтак, але дровы не гараць, а дым — увесь на хату. «Можа хто комін заткнуў?» Глядзяць — не, ніхто не затыкаў: неба відно. І так да паўдня печ не могуць распаліць. Збіраецца, як заўсёды, многа дарадцаў. І тое радзяць, і гэта. Нехта прапаноўвае пачысціць комін. Пасмарац ідзе ў лес, высякае елачку, навязвае яе на жардзіну і лезе на

страху. І толькі тады бачыць, што зверху комін акуратненька прыкрыты кавалкам шкла.

— Ці бачылі вы, як учора Бадрацоў хлеў разабралі і па ўсёй вёсцы разнеслі,— адзін вянец аж пад Мукамола, а другі — пад Петрака Якубёнка. І казалі ж яму, як ён яшчэ будаваў, што гэты хлеў да першых розгараў толькі і пастаіць. Сашта — дык тоў аж бажыўся, што Бадрэц з пруточкаў будуе свой хлеў. Жартаваў нават, што яму буслы ў дзюбах бярвенне тое носяць, а ён толькі стаіць ды ніткамі звязвае. Таму дзеці і параскідалі той хлеў. Цяпер Пятрок сабраў малых і нанова хлеў збірае. Гэта ж па нейкага паўдня работы. Можа пойдзем да яго ў талаку, дапаможам?

Спрадвеку жыве ў нашых беларускіх вёсках вельмі шчыры і спагадлівы асілак. Як і ўсе моцныя людзі, ён ніколі не выхваляецца дарма сваёю сілаю. Ён ведае, што такое людское гора, і проста так, без усялякай платы, прыйдзе да хворага гаспадара, выкасіць яго луг, высушыць і складзе ў пуню сена; зазірне на загон да цяжарнай жанчыны, якая ходзіць з вялікай надзеяю, сажне і саставіць у бабкі даспелае жыта; аб'явіцца на папялішчы і адразу ж — праўда, не так хутка і не такія харомы, як у казках,— паставіць пагарэльцу звычайную сасновую хату, якая вельмі ж ужо засвеціцца на чорным фоне колішняга селішча. Ён ніколі не адмаўляе чалавеку ў горы, бо гэты асілак — талака. Ён прыйшоў да нас адтуль, з першабытна-абшчыннага ладу, перажыў многа фармацый і цяпер з надзеяй глядзіць у камунізм. Што ж, і ў камунізме гэты асілак таксама будзе не лішні, бо яго асноўны клопат — гэта калектыўны клопат пра чалавека.

Пачуццё калектывізму больш за ўсё развіваецца ў дзяцей — тут яшчэ няма тых вялікіх праблем, якія потым ужо нярэдка будуць муляць у людскіх адносінах і якія нават паміж далоняў, сціснутых у прывітанні, будуць шарсцець, нібы жарства. Можа, таму дзеці, мне здаецца, нават больш за дарослых, радуюцца дажынкам, калі жнеі з песнямі нясуць па вуліцы апошні сноп жыта і сплеценыя з каласоў вянкі:

А ў нас сёння вайна была:
Усё поле зваявалі,
Усё поле зваявалі,
Усё жыта пажалі...

Менавіта ад калектыўнасці працы нейкая сапраўды падсвядомая радасць ахоплівала нас, дзяцей, калі мы бачылі,

як зладжана працавала ўся калгасная вёска; калі мы на бахматых, як пчолы, вазах, з аксамітнага жнівеньскага сонца палінаванага першаю павучынаю, заязджалі ў халодны і пыльны, завалены снапамі ток, дзе гула малатарня; калі мы самі стаялі каля стала і радаваліся таму спрыту, з якім падавальшчык (запылены, не пазнаць — хто) надаваў у барабан; калі мы куляліся на стозе, рабілі тунелі ў яшчэ свежай, такой пахкай і такой светлай, як промні, саломе. А зборы і паездка на далёкія сенажаці, палахлівыя кастры, ад полымя якіх, здаецца, скачуць выхапленыя з цемры дрэвы!

Колькі радасці прыносіў пачатак касьбы, калі на калгасны луг выходзілі ўсе мужчыны вёскі! Менавіта ўсе, і ішлі да ракі — адзін за адным. А за імі — адразу дваццаць ці амаль столькі ж пракосаў. Ну, як тут не закружыцца галаве ад гэткай млявай радасці, калі і луг, і дрэвы, і хаты ў гэты час аж валяць з ног пахам прывялай травы!

Тады лазовыя пруткі, якія да гэтага былі нашымі хутканогімі коньмі, станавіліся ўжо вострымі косамі, і мы цэлымі днямі касілі пыл, а за намі наспешліва перабягалі вуліцу вузенькія пракосы, на якіх бялелі ланцужкі слядоў ад нашых босых ног.

* * *

А вось, якраз насупроць хаты дзядзькі Косці, паварот на Зарэчча. Гэты стромы спуск уніз, дзе пры з'ездзе ідуць юзам, а пры пад'ёме буксуюць машыны, мае сваю назву — Равок. Ён — пібыта рэчка ў высокіх берагах: з двух бакоў Равок абступаюць горы. Тут заўсёды бывае поўна дзяцей, тут яны крычаць і галёкаюць, плачуць і смяюцца. А сёння чамусьці ціха. Дзіўна... Нешта, пэўна, здарылася. І толькі калі ўбачыў, што мужчыны цягнуць на калгасны двор сані, я зразумеў усё. Дзеці звезлі калгасныя сані і, заклаўшы аглоблі, каталіся па Раўку. Вось дзе, на гэтых вялізных санях, была, мусіць, сапраўдная куча-мала!

— Бач ты іх, накольнікаў! А каб каторы пад машыну ці пад трактар з гэтымі санямі трапіў? Тут жа часта машыны розныя ездзяць.

Голас нязлосны. Але мужчыны, мусіць, добра насварыліся на дзяцей — вунь як тыя паразбягаліся: адзін аж ля школы стаіць, другі — на гары за Анюцінаю хатаю, а трэці — як не да моста зарэчанскага дабег...

— Дзень добры, дзядзька Косця!

Касьба часцей за ўсё пачыналася з дзядзькі Косці. Ён вельмі добра ўмее накляпаць касу — не будзе ні лапатух, ні зазубрын. Каса пасля рэжа, як брытва. Таму яшчэ задоўга да таго жаданага дня пачатку касьбы на яго двары азывалася каса, а потым да размовы, як і пеўні на вёсцы, пачыналі далучацца галасы спачатку з суседніх двароў, а потым і з самых крайніх у вёсцы. Косы пачыналі сваю, зразумелую толькі траве, размову:

«Добры дзень, добры дзень!» — «Добры дзень!» — «Сапраўды так, так». — «Чыя ты?» — «Петракова». — «Ну, а я — Лукова».— «Як жывеш?» — «Як жыву? Так сабе, так сабе».— «Мо скубла ты траву?» — «Не, не, бо мяне толькі знялі з сянец, толькі знялі кассё».— «Што, і ўсё?» — «Не, балюча дзяўбе...» — «Хто, клявец?» — «Не клявец, а дзяўбень!» — «Чуеш, побач каса вунь крычыць».— «Мусіць, першы раз клепяць яе».— «Ну, а першы раз дужа баліць, не сцярпець».— «Дзе там пець!» — «Завіселіся мы за зіму».— «Эх, хутчэй бы на луг нам, нам!» — «Там адчуем мы сілу сваю». — «Там...»

Дзядзька Косця яшчэ, мне здаецца, заўсёды пах сухімі стружкамі, свежымі сасновымі трэскамі, карою і смалою. Яшчэ і сёння многія зубрэвіцкія хаты ганарацца сваімі аконнымі рамамі, падаконнікамі, ліштвамі, дзвярамі, вушакамі і іншай абсадаю, якую з любоўю выслíжылі і выправілі служыць людзям рукі дзядзькі Косці. Яшчэ і сёння настойліва выбіраюцца з любой калдобіны, не баяцца ніводнага пня ці карча ў лесе многія калёсы, якім так любоўна, не спяшаючыся, даваў жыццё дзядзька Косця. Рыпяць на зімовых дарогах вясёлыя сані, дзе ўсё — ад капылоў да палазоў — зроблена яго ўмелымі рукамі.

Гады яго не сагнулі — ён такі ж падцягнуты, як і раней. Толькі галава яго выглядае цяпер вельмі па-зімоваму: белая ўся, нібы прыхопленая познімі восеньскімі замаразкамі. Ён жыве цяпер разам са сваёю жонкаю ў старэнькай, ператрэсенай нанава хаце. А быў у дзядзькі Косці і цёткі Аўдоцці вялікі ўжо сын Пеця — жартаўнік і весялун. Ён расказваў нам, меншым, цікавыя гісторыі, вучыў чытаць, вучыў спяваць песні. Памятаю, як аднойчы ён малоў жыта на Ягоравых жорнах, а мы памагалі яму — адраблялі за кожную новую вывучаную прыпеўку. З якою радасцю я пабег потым дахаты, каб перапець усе новыя прыпеўкі бацьку і маці. Я ўяўляў, як яны будуць рады гэтаму, як будуць хваліць мяне. Але перапець усе прыпеўкі мне не далі: як толькі я спеў адну, першую, маці чамусьці раз-

злавалася, перацягнула мяне аскарачом і паставіла ў кут. Я лічыў тады гэта найвялікшай несправядлівасцю, бо не ведаў, што прыпеўка расказвала пра такія рэчы, пра якія мне, малому, яшчэ ранавата было ведаць...

У вайну Пеці не стала. А мне яшчэ і сёння памятаюцца два выбухі. Адзін — гулкі і моцны, які аж скалапуў лес. Гэта Пеця з падлеткамі знайшлі недзе снарад і ўзарвалі яго ў лесе. Другі — ціхі, ледзь чутны... Гэта немцы, пачуўшы выбух, выехалі ў лес і злавілі там Пецю... І як моцна, гучней ад выбухаў вялікіх бомбаў, скалануў вёску гэты віптовачны стрэл. Бо ён, здаецца, быў першы.

Здаецца, у той дзень і насунуліся на дзядзьку Косцю і цётку Аўдоццю гэтыя белыя замаразкі, і не праходзяць яны нават і ў самыя сонечныя, самыя спякотныя летнія дні...

* * *

— Здароў быў, здароў быў! Ну, як ты жывеш-маешся?

Гэта — ён. Невысокі ростам, але затое шырокі ў плячах. Новая, нібыта святочная, фуфайка. Сам вельмі ж ужо шчыгульна наголены. Цягне з калодзежа ваду. Вось вядро паказалася над зрубам. Забразгатаў ланцуг. Ён лёгка, без напружання падняў вядро і пераліў ваду ў другое. Зноў апусціў вядро ў зруб — і калаўрот заверашчаў, пачаў набіраць хуткасць. Нават адчуваю, як смыляць яго мазалі — далоні стрымліваюць выслізганы калаўрот. Нарэшце вядро боўтнулася ў ваду.

— А як сям'я? Як дзеткі?

Голас такі ласкавы-ласкавы. На твары, здаецца, толькі адна радасць ад такой нечаканай сустрэчы. А ў маёй памяці адразу ўзнікае іншае.

Я, малы, сяджу на печы і з-за коміна цікую за сталом. На лаўцы сядзіць ён. Таксама вельмі ж па-святочнаму апрануты — для яго, пэўна, заўсёды свята. Побач стаіць бацька, які нядаўна вярнуўся дадому: за маці, якая была даяркаю, ён ратаваў калгасных кароў, але далей Смаленска немцы не пусцілі. У хаце гоніцца самагонка. Госць ужо выпіў ладнага — некалькі кубкаў. Ён нейкі стараста ці намочнік старасты. Я разумею толькі, што ён служыць немцам.

«Дык вось, Даніла,— асалавела радуецца ён,— бачыў, дзе твае бальшавікі падзеліся?! Шух — і няма. Як снег вясною: шух — і няма! І, бачыш, лепей стала без іх. Ты

ранейі мог бы вось так самагонку гнаць? А скулу не хацеў? Тут бы адразу міліцыянер — аць-два — пад казырок: «Грамадзянін!» Тут табе і пратакол, і штраф, а то і турма. А цяпер — свабода. Што хочаш, тое і рабі. За гэта германцаў паважаць трэба. А ўласці тваёй ужо няма і ніколі не будзе...»

Ён выцягнуў ужо другое вядро.

— Ну, як табе працуецца там, у Мінску?

Цікава, а што ён думае на самай справе? Яго думкі прыхаваны за гэтай празмернай ветлівасцю. Ён, пэўна ж, разумее, што дзіцячая памяць захавала ўсё: і як ён выганяў па работу людзей, і як забіраў па дварах жывёлу для немцаў, і як мітусіўся, калі партызаны ўзламалі былую кантору калгаса, куды немцы замкнулі сабраныя ружжы і абрэзы. Вядома, ён памятае, не забыўся, як забіралі паліцаі майго бацьку, а потым і маці.

Цікава, а што ён думае сапраўды, як бы ён гаварыў са мною па шчырасці?..

— Зайдзі, Іванька, вечарам, пасядзім, пагаворым з табою.

Ён начапіў ужо вёдры на каромысел і лёгенька так ускінуў на плячо — ні кропелькі не пралілося. І лёгенька пайшоў дадому.

Запрашаеш у госці? Цікава, а ці падумаў ты, пра што мы будзем гаварыць? Праўда, мы можам успомніць вельмі многае — гаварыць у нас ёсць пра што. Толькі ты не захочаш. Скажам, мы можам успомніць, калі да нас у вёску прыйшлі першыя немцы. Яны сабралі на рынку нас, дзяцей, і частавалі цукеркамі, нарабаванымі ў нашых савецкіх крамах. Памятаеш, ты тады вельмі ўжо неяк услужліва, бягом трусіў каля фашыстаў, нёс развязаную торбачку, адкуль валасатая рука немца даставала ледзяпцы, і за кожным крокам, нібы толькі навучыўшыся гаварыць, лапатаў адно старое, запоўнянае яшчэ да рэвалюцыі слова «пан». Пан, пан, пан... Бачыш, ты адразу ж з прыемнасцю прызнаўся рабом фашыста, каб потым, з яго дапамогаю, стаць панам над сваімі людзьмі. І гэта табе на імгненне ўдалося. І слухай, што я табе скажу: у той час, як ты вельмі ж ужо старатліва дапамагаў фашыстам наладжваць у маёй вёсцы «новы парадак», ад якога так і патыхала сярэдневякоўем, нашы мілыя беларускія дзеці( бачыш, нават дзеці!) накідалі свае дзіцячыя гульні і ішлі замятаць яловымі лапкамі сляды партызан, каб фашысты не маглі ўведаць, у які бок тыя пайшлі.

Маглі б мы да драбніц узнавіць і той дзень, калі ты, як звычайна, прывёў да нас цэлую хеўру немцаў. «Матка, яйка, матка, яйка...» Не, яны не рабавалі — яны патрабавалі яйкі ў абмен на сахарын. А яек у нас не было — ты ж ведаў, што перад гэтым іх забрала папярэдняя хеўра. І калі адзін з іх паставіў ужо нагу на прыступкі лесвіцы, каб лезці на гарышча, цётка Саша пабегла пазычаць яйкі да суседкі. Ты не ведаў, што там, на гарышчы, у сене, сядзеў мой дваюрадны брат Коля Кантроўскі, які лячыўся пасля блакады, каб, паправіўшыся, зноў наїсці дамоў, у партызаны. Ён расказваў пасля, што ўжо ўзяў на мушку немца, які хацеў лезці першым...

А жудасны, нейкі суцэльны крык адчаю, які раздзіраў вёску, калі прыязджаў «хапун» забіраць моладзь у Германію і калі людзі, як ашалелыя, беглі куды вочы глядзяць.

Можа, расказаць табе, як наша зубрэвіцкая паліцыя хадзіла ў Рацаўскія лясы на аблаву? Ды што табе расказваць — ты ж сам усё ведаеш. Ты правёў тады іх як не да ўзрэчча. А потым доўга яшчэ стаяў і махаў ім рукою. Як не праслязіўся, бедалага, ад радасці. Дзіва што! Твае сябры па зброі ідуць на партызан — тваіх непрымірымых ворагаў, якія чамусьці не хочуць усур'ёз прыняць, што ты «сапраўдны пан». Ты памятаеш, чым гэта скончылася? Назад вярнуўся толькі адзін Аркадзя — недарослы, з вялізнай галавою, крыху недапечаны паліцай, у якога заўсёды пры размове, нібы электрычныя лямпачкі, успыхвалі пад носам бурбалкі. Ён, задыхаўшыся,— бег жа ўсю дарогу! — як мог растлумачыў табе, асвятляючы размову «лямпачкамі», як усё было:

— Гэта во, ідзём мы з песнямі. Начальнік кажа: «Цяжка?» Мы кажам: «Ага, цяжка».— «Тады кладзіце ўсю зброю на калёсы, а самі пойдзем да лесу ўлегцы. А там узброімся». Мы паклалі. Прыйшлі, гэта во, мы ў лес. Начальнік кажа: «Давайце адпачнём». Мы, гэта во, спыніліся. А ён і кажа: «Хто за партызан, гэта во,— направа, хто за германцаў — налева». Я і пайшоў налева. А ўсе, нават і сам начальнік, гэта во — направа. Тады ён і кажа мне: «Бяжы, Аркадзя, да сваіх фашыстаў,— гэта во, не я, а ён так гаварыў,— і скажы ім, што іхняму прыдурку Гітлеру будзе капут,— гэта зноў не я, а ён так выразіўся, пан начальнік,— а мы, кажа, ідзём да партызан і хутка прыйдзем на аблаву паліцаяў».

Памятаеш, ты тады яшчэ спытаў у Аркадзі, ці стралялі

па ім, і ён, запаліўшы пад носам чарговую «лямпачку», адказаў: «Не, толькі свісталі і рагаталі».

Прозвішча гэтага начальніка зубрэвіцкай паліцыі было Новікаў. А ў паліцыю ён быў засланы партызанамі.

Праўда ж, ты пра гэта не захочаш са мною размаўляць. Дык што, мы будзем сядзець ды маўчаць? Не, не пайду я да цябе ні ўвечары, ні днём — ніколі. Нясі сабе ваду, паі карову, кармі парсюка. І толькі б мне хацелася, каб ты як найчасцей аставаўся сам-насам са сваёю памяццю — безабаронны перад узброенай фактамі памяццю. І гэта было б табе пакараннем.

Вядома, ты не ведаў тады ўсіх планаў фашыстаў. Не ведаў, што і цябе, гэткага толькі што спечанага «пана», чакаў у далейшым крэматорый, якімі фашысты хацелі «аздобіць» усю Беларусь.

Мусіць, многія яшчэ і сёння задумваюцца: што ж гэта за такое, апошняя сусветная вайна? Спачатку здаецца ўсё проста і лёгка: Гітлер — вар'ят, і ўсё тут тлумачэнне. Але ж, пэўна, не толькі вар'ят! Вар'ят не зможа амаль усёй краіне прышчапіць, як чуму, ідэю аб сусветным панаванні. Вар'яту так не паверачь. А можа Гітлер усё ж вар'ят, а сама ідэя вельмі прывабная? Дык тады што ж у ёй ёсць такога прывабнага? Можа прага стаяць з нагайкаю над рабом? Можа патрэба смачна жэрці не працуючы? Можа радасць забіваць? Адкуль яна можа з'явіцца, такая радасць?

Аказваецца, яе можна выхаваць. Гітлераўцы пачыналі такое са школы. Ад іхніх падручнікаў вельмі ж ужо несла жалезам, бранёю, порахам — яны былі густа населены танкамі, гарматамі, бамбардзіроўшчыкамі. Дзецям трэба было даведацца, колькі і чаго яны разбамбілі, спалілі, расстралялі, зруйнавалі... І колькі яшчэ пакуль што асталося.

Дзіцячыя ломкія галасы, якім бы толькі бесклапотна смяяцца, спявалі свае фашысцкія песні, дзе, між іншым, гаварылася:

> Калі ўвесь свет будзе ляжаць у руінах —
> К чорту, нам на гэта напляваць! —
> Мы ўсё роўна будзем маршыраваць далей,
> Таму што сёння нам належыць Германія,
> А заўтра — увесь свет.

Маленькім, прыгожанькім дзецям у школе давалі маленькіх, прыгожанькіх трусянят. Тыя іх кармілі і дагледалі і настолькі да іх прывыкалі, што нават у сне расчуль-

валіся, саспіўшы сваіх пушыстых сяброў. Тады іх, дзяцей, прымушалі забіваць самым жорсткім спосабам гэтых маленькіх, прыгожанькіх, цёпленькіх трусянят, якія даверліва лізалі нават лязо нажа, занесенага над імі дрыготкімі дзіцячымі рукамі. Пасля такога, калі не звар'яцее, чалавек пачынае высняваць у забойцу: у ім, у чалавеку, ужо забілі чалавека, назаўсёды аглушылі яго чуласць, давер'е. Цяпер ужо можна замяніць трусянятка, скажам, дзяўчынкай — ён і не заўважыць ніякай розніцы, не задумаецца і нават не дасць дзяўчынцы скончыць апранаць сваю ляльку...

Толькі вось гэтак выхаваны чалавек можа без агіды чытаць пісьмо, што, напрыклад, пісала маці Фрыцу Лерману, свайму сыну, на фронт: «Мы атрымалі добрую рабочую сілу. У нас дзеўка з Беларусі. Я глядзела яе мускулы на руках і на нагах. Нічога, будзе працаваць».

І сапраўды, як жа яшчэ павінен мысліць чалавек, калі іх фюрэр вельмі ж ужо самаўпэўнена пакідваецца такімі жудаснымі афарызмамі: «Культура, цывілізацыя, гуманнасць і г. д. ёсць выяўленне помесі глупства, баязлівасці і самаўзвышэння». І тут жа спахопліваецца: «Больш асцярожна давядзецца падыходзіць да прысваення дваранскага звання прадстаўнікам мастацтваў, вучоным і палітыкам».

Гэта ўжо будзе пасля, а спачатку, маўляў, у іх ёсць больш адказныя, больш надзённыя задачы. «Наша місія заключаецца ў тым, каб падпарадкаваць іншыя народы. Германскі народ прызваны даць свету новы клас паноў»,— піша Гітлер. О, недарэмна ж ён лічыцца сярод сваіх сяброў празарліўцам! Ён нават ведае, як гэта трэба рабіць: «Калі мы хочам стварыць нашу вялікую германскую імперыю, то мы ў першую чаргу павінны заняволіць і знішчыць славянскія народы — рускіх, палякаў, чэхаў, славакаў, балгар, украінцаў, беларусаў». І дзіўна, што прыкладна ў той час, толькі на другім канцы Еўразіі, другі вар'ят — японскі генерал Аракі — спавядаецца таксама гэтай ідэі. «Нашай краіне,— пісаў ён,— прадвызначана распаўсюджваць свае нацыянальныя ідэалы на ўсіх пяці кантынентах зямнога шара. Мы нашчадкі і спадчыннікі багоў, мы павінны ўладарыць на зямлі». Дзіўна, што і сёння сёй-той не адмовіўся ад гэтай ідэі і дакладна, па пунктах распрацоўвае планы, калі які кантынент яму завасўваць.

А людзі пакуль што нічога не ведаюць.

Нічога не ведалі яны і пра фашысцкую карту (яе пака-

жуць крыху пазней, на Нюрнбергскім працэсе), па якой каля кожнага еўрапейскага горада вельмі ж ужо акуратненька было намалявана па дзве невялічкія трубы: на белай было напісана, колькі людзей у гэтым горадзе трэба спаліць, забіць, павесіць (заўважце, дакладна, як у перапісе: колькі ўсяго жыхароў жыло тут да вайны), а на чорнай — што ўжо зроблена: колькі людзей забіта.

Людзі тады яшчэ вельмі многага не ведалі. Здаецца, што Еўропа яшчэ і сёння, хоць мінула столькі год, як яе ачысцілі ад фашысцкай навалачы, поўнасцю не ўсвядоміла, што б з ёю было, каб Гітлеру ўдалося ажыццявіць сваю ідэю сусветнага панавання...

Дзіўна, што жудасны чалавек, які павінен быць пудзілам усіх вякоў і народаў, яшчэ і сёння, часам нават і ў Еўропе, атрымлівае свой падарунак: «Хайль Гітлер!»

Вайна больш за ўсё запамінаецца сваім вонкавым выглядам. Цесна на палях танкам: яны, як магутныя жалезныя бізоны, труцца бакамі — аж іскры ляцяць; плачуць на неавабранцах, як на пябожчыках, вёскі і гарады: людзі ведаюць, што мала хто з іх вернецца на сваё поле, возьме ў рукі касу ці сякеру; а ў вясковых печах нечакана ўзрываюцца дровы: дзеці забываюць у плашках свае цацкі — зараджаныя патроны, разрыўныя кулі.

Пакуль што звычайнаму чалавеку няма калі аналізаваць — цяпер трэба змагацца. А пройдзе час — і чалавек выпадкова заўважыць, што жоўценькія пісклянкі вывеліся ў варожай касцы. І тады ён убачыць, што прыручыў даўно ўжо прылады вайны і прымусіў іх служыць свайму мірнаму жыццю: пасля вайны яго хату доўга асвятляла каптілка з гільзы; ён ужо даўно прывык (здаецца, так і заўсёды было), што на працу яго кліча звон з фашысцкага снарада; яшчэ і цяпер стаіць недзе ў сенцах каля цабэрка з вадою конаўка з гільзы, з акуратна абагнутымі беражкамі,— каб, п'ючы, не парэзацца; а калодзежы, якія выкапалі авіяцыйныя бомбы ці снарады, высыхаюць толькі ў самыя спякотныя гады, а так гаспадыні бяруць з іх ваду, каб паіць сваіх кароў...

І тады чалавек пачынае разумець, што і сёння вельмі многа бяроз усё яшчэ ідзе ў свеце па прыкла́ды...

* * *

Гэтая частка вёскі называецца рынкам. Тут хаты паступова, з двух бакоў адыходзяцца ўсё далей і далей ад

вуліцы, каб потым, каля Раўка, зноў сысціся блізка — так блізка, што можна ўвечары пераміргвацца вокнамі. Вуліцу расшырылі некалі кірмашы, якія збіраліся ў маёй вёсцы штогод; яны ж адпіхнулі ў бакі і хаты — каб тыя меней перашкаджалі. Сёння кірмашоў ужо няма, але расшырэнне гэта асталося, пэўна, назаўсёды...

Вось мая школа. Класы яе ледзь змяшчаюцца ў пяці школьных будынках. І ўсе яны — з царквы і папоўскага асабняка. Яшчэ не так даўно з разбуранай царквы, дзе мы на сараю заўсёды чапялялі арэлі (вышэйшага ж і больш прасторнага будынка ў вёсцы не было), пабудавалі добрую школьную залу, дзе цяпер адбываюцца ўсе ўрачыстасці.

Злева — нашы школьныя ліпы, якія надаюць своеасаблівую непаўторнасць маёй вёсцы і відны з усіх бакоў, адкуль бы ты ні ішоў дадому.

А гэта — кантора калгаса. Там яшчэ гарыць агонь. Мала што цяпер зіма і работы быццам бы не столькі, як у жніво. Старшыні, аграномам, бухгалтару ёсць над чым падумаць, падлічваючы плён мінулага года...

— Добры вечар, цётка Каця! Куды гэта вы спяшаецеся так?

— А, вечар добры, вечар добры! І трэба ж так: заседзелася ў Праскоўі — не заўважыла, як і сцямнела. А бягу я ў Панізоўе, там жа мае вячэры чакаюць.

— А што, вы там ужо жывяце, можа?

— Не, жыву я, як і даўней, у Зубрэвічах, а працую там па свінаферме. Цяпер жа нашу свінаферму ў Панізоўе перавялі.

І пабегла.

Вось такою заўсёды была цётка Каця. Увесь час подбегам, трушком, заўсёды ў яе няма часу, няма калі прыстояць, пагутарыць. Працавала яна заўсёды з радасцю, з асалодаю — нават і тады, калі пустыя працадні, як частакол, адгароджвалі яе ад надзённага, звычайнага хлеба.

Трэба было ствараць ільнаводчыя звенні, а звеннявымі ніхто не ішоў (маўляў, няма дурных толькі за «дзякуй» працаваць, калі есці хочацца) — яна знаходзіла на калгасным двары нейкую паламаную скрыню, збівала яе, акуратна, як тую лодку перад спускам на ваду, абтыкала пакуллем і ўжо, уплікнуўшы ў сані худзенькага коніка, ехала па заснежанай вуліцы — збірала попел пад будучы лён.

Трэба было ісці працаваць даяркаю (а тады яшчэ і даяркі не былі ў такой пашане — і іхнія працадні звінелі,

як пустыя вёдры) — цётка Каця абувала свае бліскучыя святочныя гумовыя боты, ішла на кароўнік, дзе каровы стаялі па калені ў гразі, і з нейкай апантанаю прагаю бралася за работу.

Калі ішла вялізная хмара, а калгаснае сена яшчэ не было складзена ў копы, яна кідала сваё і з граблямі пад пахаю, па бягу завязваючы пад бараду хусцінку, спяшалася на калгасны луг і звала суседак: «Матруна, Алена, хмара паўзе!»

Калі незаўважна і рапавата, як гэта заўсёды бывае восенню, насоўвалася цемень, якую неяк знутры падсвечваў першы рэдзенькі снег, а тут яшчэ асталося пару баразён нявыбранай бульбы,— яна аставалася на полі адна і не ішла дадому, пакуль, хукаючы на рукі, не заканчвала работу: а што, восені не вер — лёг снег, то ён можа паклікаць і мароз...

Калі... Зрэшты, гэтых «калі» было вельмі многа. Можа, таму пры ўсіх старшынях — а за пасляваенны час у нашым калгасе іх перабыло дзесяткі са два — яна заўсёды ставілася ў прыклад, заўсёды была членам праўлення. Кожны старшыня, вядома, падбіраў праўленне па-свойму, але без яе, цёткі Каці, не абыходзіўся. І колькі разоў у накуранай канторы калгаса (зімою па-хатняму сагрэтай печкаю, летам — з пахам нейкай нежылой застоенасці) чарговы старшыня чарговым голасам пытаў:

— А што скажа па гэтым пытанні Пуцькова Каця?

Яна ўставала з грубай пярэдняй лаўкі, папраўляла хустку і ціхім, але ўпэўненым голасам казала:

— З зямлёю трэба дзяліцца. Мы ў яе забіраем зерне, а ёй трэба аддаваць хоць салому. Салому мы ёй не аддаём, зямлю не ўгнойваем, таму яна і не дае нам нават таго, што насеялі.

Але з зямлёю ўсё роўна не дзяліліся. Не было чым! Салома? Яна патрэбна была на стрэхі кароўнікаў, канюшань, свінарнікаў, якія даводзілася крыць як не кожны год. Адзін час нават стрэхі ўваходзілі ў кармавыя запасы: вясною, калі сена канчалася недзе яшчэ да стрэчання і жывёлу не было чым карміць, старшыні хапаліся за стрэхі — і тое, што зімою ратавала ад холаду, цяпер павінна ўжо было выратаваць жывёлу і ад голаду.

Дзе тут будзеш дзяліцца саломаю з тым полем! Поле і так будзе жыва — гэта ж не конь, якому трэба пакласці тры разы на дзень. А поле і на птушыным угнаенні працягне...

Але птушкі стараліся штосьці слабавата. І ўсё горш і горш, у цяжкіх муках радзілі нашы палі — і Струнава, і Цітаўшчына, і Закаліпа...

Неяк у нашу «Хвалю рэвалюцыі» прыслалі з Оршы новага старшыню. Да гэтага ён працаваў машыністам на чыгуначнай станцыі, добра вадзіў паравозы, за што і быў узнагароджаны ордэнам. І вось у кагосьці дала сабе волю прымітыўная логіка: маўляў, паколькі ён добра вадзіў паравоз, то не горш павядзе ўперад і калгас; паколькі ён на паравозе атрымаў ордэн, то ў калгасе, узняўшы яго, можа стаць Героем Сацыялістычнай Працы. І вось гэты заслужаны ў Оршы чалавек сеў у старшынёўскае крэсла, якое добранька выслізжылі і зашмальцавалі яго папярэднікі. Вядома, і Струнава, і Цітаўшчына, і Закаліна сталі радзіць яшчэ горш, бо новы старшыня меў самае малае ўяўленне пра сельскую гаспадарку.

Але чалавек разумны, працавіты, ён рабіў, што мог, і часам іранізаваў са свайго становішча. Праўда, не афіцыйна, не за сталом у канторы, а дзе-небудзь у полі, на перакуры.

Глыбокай восенню каля тока, дзе дамалочвалі жыта, утульна ўсеўшыся на свежую салому, у якой паспеў ужо абжыцца холад першых замаразкаў, ён, скалупваючы пруткам гразь са сваіх кірзавых ботаў, расказваў сон:

— Ведаеце, і вярзлося мне нешта вельмі дзіўнае. Здаецца, я стаю недзе на шашы і бачу, што з-за ўзгорка машына паказалася. Хоць яна і далекавата яшчэ ад мяне, але бачу я, што вязе яна зерне ў кузаве. І — дзіва дзіўнае! — у кабіне нікога няма. Разумееце, шафёра няма, а яна сама сабе едзе. І тут, адкуль ні вазьміся, як з-пад зямлі вырас быццам бы міліцыянер... На руках вялізныя міліцэйскія рукавіцы і жэзл трымае, як у рэгуліроўшчыкаў. Спыняе ён машыну — а як жа, непарадак, калі машына сама сабе едзе,— затрымлівае нейкага чалавека, які крочыў па абочыне зусім у другі бок, і саджае яго ў машыну. Той, бачу, аднекваецца, паказвае, што не ўмее вадзіць машыну, але кабіна з трэскам зачыняецца за ім, і машына кратаецца з месца. І, разумееце, едзе так, як ходзіць дадому Коля Певень, калі перабярэ часам... Пятляла яна, пятляла, пакуль у тэлеграфны слуп не ўпёрлася. І тут зноў рэгуліроўшчык — зноў жа непарадак! Таго шафёра з кабіны выганяе і другога саджае, балазе што гэтаму ўжо хоць на дарозе з машынаю. Бачу, што гэты ўжо і не адмаўляецца: смела садзіцца за руль, хоць машына яшчэ болей

перастае яго слухацца — здаецца, што ўсе вузлы кіравання ў яе разышліся. Бачу, што нахабнік яшчэ і смяецца — яму што: маўляў, хоць трошкі пад'еду! І да таго, прайдзісвет, дакруціўся, што, крыху да мяне не даехаўшы, машына зусім развярнулася і назад пакацілася. Тут зноў рэгуліроўшчык. Падыходзіць да мяне, бярэ мяне пад руку, як сябра свайго самага лепшага, вядзе да машыны і на кабіну паказвае — маўляў, садзіся. Я яму тлумачу, што я не шафёр і машыны ніколі не вадзіў.

— А хто ты па прафесіі?

— Машыніст. Паравозы ваджу.

— Дык гэта ж цудоўна! Ты ж хоць аб'езджаны, прывык да руху, ведаеш хоць, дзе перад, дзе зад. А яны вось і руху не пераносяць, і напрамкі блытаюць.

І не паспеў я апамятацца — бачу, ужо ў кабіне сяджу. Так-сяк завёў, так-сяк развярнуўся, так-сяк паехаў. Еду, значыць, а машына яшчэ больш Пеўня капіруе. Я кручу руль у адзін бок, а яна едзе ў другі. І хуткасць усё набірае. А я не ведаю нават, як яе спыніць. І ўсё ўбок цягне, як конь натурлівы. З'ехала яна ў кювет і стала. Вылез я з кабіны, зірнуў і аж ускрыкнуў: у кузаве асталася нейкая жменька збожжа...

Дзядзькі хітравата ўсміхаліся і казалі:

— Глядзіце, каб ваш сон не спраўдзіў. Год канчаецца, хутка перавыбары... Мусіць, нам новага шафёра сасватаюць.

Смяяцца з сябе можа толькі разумны чалавек, які ведае сабе цану. Дурань з сябе не пасмяецца. І я цяпер разумею, які моцны быў гэта чалавек, што так смяяўся са свайго становішча.

А старшыні бывалі розныя. Адзін піў, як у тую бочку прадонную. Ён, як жартавалі, пазбіраў усю гразь і ўвесь снег з усіх узгоркаў, раўкоў і калдобін. Хадзіў заўсёды без шапкі: п'яны губляў іх і не спраўляўся купляць новыя.

Другі запомніўся па-свойму: за адзін год ён быў у камандзіроўках 389 дзён... Вось гэта сапраўды высакосны год! Пра гэта, чырванеючы, расказвалі рэвізорам авансавыя справаздачы... І найбольш камандзіровак было, вядома, у Оршу, дзе стаяў старшынёў дом, дзе жыла яго сям'я.

Трэці як не штодня біўся са сваёю жонкаю, і таму, калі ён адважваўся каго-небудзь накрытыкаваць, яго абсякалі: «Ты лепей раскажы, як табе жонка таз з памыямі на галаву ўздзела...»

Былі розныя ўпаўнаважаныя з раёна. Адны прымушалі сеяць толькі кукурузу, толькі ёй аддаваць усю ўвагу. Другія прыязджалі з канкрэтным заданнем: прасачыць, каб «траваполынчыкі» зааралі канюшыну,— і не выязджалі з калгаса да таго часу, пакуль трактар пераможна не накіроўваўся на канюшынішча — гэты страшны жупел, якім палохалі ўсіх старшынь калгасаў і які, здавалася на той час, быў прычынаю ўсіх бед сельскай гаспадаркі.

Адзін старшыня, стары чалавек, вялікі практык, разумны гаспадар, якога ведалі ў раёне і нават у вобласці як непаслухмянага кіраўніка, расказваў пра гэта:

— Выклікаюць, значыць, мяне ў раён. «Ты зааараў канюшыну?» — пытаюць. «Яшчэ не, але ўжо даў указанне»,— маню я ім, а сам думаю: «У каго ж гэта рука падымецца заворваць канюшыну, якая сёлета, на другі год, дасць самы харошы ўраджай і абароніць вясною ад скармлівання нашы стрэхі». Потым яны мне па тэлефоне яшчэ звоняць: «Заараў?» — «Заараў!» — ілгу, а сам як надумаю, што трэба заворваць, дык аж сэрца шчыміць. А крыху пасля інспектара з раёна прыслалі. Адчуваю, ён хоча праверыць, ці заараў я тую злашчасную канюшыну. Я яму і гэта паказваю, я яму і тое, і туды ваджу, і сюды — усё стараюся далей ад канюшыны адвесці. І ўсё ж пранюхаў ён, угледзеў. Выклікаюць мяне зноў у раён. «Ты што гэта нам ілжэш? Чаму канюшыну не заараў? Што, для цябе трэба асобныя законы нейкія? Усе заворваюць у раёне, а ты не. Самапраўца знайшоўся мне!» І вымову мне ўляпілі. Паабяцалі, што будуць судзіць, калі не заару. Але я ўсё роўна не заараў. Скасіў гэта я потым злашчасную канюшыну, нуні ёю набіў, стагоў панаставіў. І, ведаеце, вясною звоняць з раёна: «Слухай, Антон Пятровіч, прыедзе да цябе старшыня са «Светлага жыцця», дай яму сена трохі — у яго каровам есці няма чаго».— «Не дам,— кажу,— здыміце вымову, тады яшчэ падумаю». Бачыш, як атрымліваецца часам: для таго, каб зрабіць добрае, трэба лгаць, хадзіць з біркаю «траваполынчык», ды яшчэ і вымовы замест падзяк калекцыяніраваць.

І былі ў калгасах вось такія цёткі Кацi, якія згаладала, нібы пасля доўгага расстання, ірваліся да зямлі, накідаліся на любую работу, хоць у канцы года неслі дахаты пад пахаю невялічкую торбачку з жытам — узнагароду за шчырую працу. І ўсё роўна яны не крыўдзіліся ні на каго, а на чарговым праўленні ўставалі з грубых лавак і, як споведзь, як малітву, паўтаралі:

— З зямлёю трэба дзяліцца. Зямлі трэба аддаваць хоць салому...

Цётка Каця аддавала зямлі сябе ўсю. Муж яе працаваў у Оршы галоўным бухгалтарам на адным прадпрыемстве. Спачатку ездзіў усё ў Зубрэвічы, а потым, калі яму далі ў горадзе трохпакаёвую кватэру з усімі выгодамі, перавёз туды сям'ю — цётку Кацю і дзвюх дачок.

Але не прайшло і тыдня, як цётка Каця з'явілася зноў ля «блыхаркі» і сказала брыгадзіру:

— Чаго глядзіш? Давай якую-небудзь работу.

— Навошта табе тая работа? Ты ж ужо гарадскою пані стала, манікюр, мусіць, завяла сабе.

— А каб па цябе ваўкі, з тваім манікюрам! Давай работу, кажу, а то я табе зараз манікюр навяду.

Многія аднавяскоўцы асуджалі цётку Кацю за гэта:

— Ай, што вы з яе хочаце — ведама, прывыкла ў гразі калупацца, дык ёй, акрамя гною, нічога і не трэба. А ў горадзе было б чыста, цёпла — жыві сабе паня панаю.

Але цётка Каця не змагла падзяліць сваю любоў паміж горадам і вёскаю і назаўсёды асталася вернай сваёй першай і апошняй любасці — зямлі.

Засумаваў у Оршы таксама і яе муж: вельмі ж цесна было яго душы ў трох прасторных, гулкіх, пустых пакоях. Ён перажываў, што не ўдалося яму са сваёй жонкі зрабіць гарадскую пані, а таксама адчуваў, што і сам не зможа зрабіцца сапраўдным, такім, як яго Каця, калгаснікам...

Становішча ў калгасах цяпер ужо крута мянялася. Калгаснікам, старшыням калгасаў, праўленням пачалі больш давяраць. І цяпер на полі таксама расла кукуруза, але столькі, колькі можна было дагледзець, колькі трэба было для гаспадаркі. Ніхто не прымушаў заворваць канюшыну, але, нягледзячы на гэта, палі не зарасталі травою, чаго так ужо баяліся ўпаўнаважаныя...

— Ого, цяпер ужо што! Цяпер калгас — хвост трубою і пайшоў угору,— разважаў з гэтага выпадку наш вясковы філосаф, дзядзька Хрол.— Цяпер не тое, што раней. А бывала, глядзіш на карову — цыцак многа, хвост вялікі, а малака няма.

І сапраўды, кожны можа ўспомніць час, калі мы рабілі герояў і пісалі нарысы пра даярак, якія надойвалі па 900 літраў малака ад каровы... Цяпер гэта лічба нават у адсталых калгасах лічыцца вельмі нізкаю... За такія надоі дастаецца старшыням калгасаў.

Цяпер наша вёска не тая. Маці майго зубрэвіцкага сяб-

ра, які скончыў філасофскае аддзяленне Маскоўскага універсітэта, працаваў у сацыялагічнай лабараторыі і атрымліваў пакуль што нейкую сотню рублёў, казала:

— Хадзі лепей да нас у Зубрэвічы брыгадзірам. Вунь Сурган і ніякіх універсітэтаў не канчаў, а брыгадзірам працуе і сто дваццаць рублёў зарплаты кожны месяц мае.

І таму сяляне ў нашых савецкіх вёсках смяюцца, калі пачуюць, што яшчэ сёння за мяжою розныя адшчапенцы з наіўнай сур'ёзнасцю заклікаюць іх «захопліваць у бальшавікоў зямлю», ствараць аднаасобныя гаспадаркі. Гэтыя заклікі сапраўды выглядаюць сёння смешна. Мне здаецца, у сённяшняга селяніна вельмі ж ужо аслабла, ці, можа, зусім атрафіравалася, тая спрадвечная прага захапіць, прыкупіць, прыдбаць як мага болей зямлі, прага, якая заўсёды трымала вёску ў нейкім напружанні, якая нараджала сваркі, бойкі, пажары: бяднейшы заўсёды зайздросціў багацейшаму і стараўся навесці хоць нейкую справядлівасць, ураўняць сваё становішча хоць з дапамогаю свайго паслухмянага памочніка — агню.

І сапраўды, навошта нашаму калгасніку тая свая зямля, калі ён адвык ужо ўставаць да світання і ісці ў ток малаціць, калі ён не хоча ўжо быць у полі ад цямна і да цямна. Навошта? А так ён мае, як усе добрыя людзі, выхадны дзень у нядзелю. Навошта яму тая зямля, якую ён раней урабляў круглы год, калі цяпер камбайны сажнуць і змалоцяць усё за некалькі дзён? Цяпер ужо ён нават на сваім прысядзібным участку не можа абысціся без тэхнікі: і ячмень сажне-змалоціць камбайнам, і ўзарэ трактарам — балазе жвавы «Беларусь» можа развярнуцца і на яго ўчастку. Праўда, сёння ў вёску прыйшлі новыя клопаты, іншыя праблемы...

Сёння мы ўжо, мусіць, вельмі аддаліліся ад зямлі, страцілі тую непасрэднасць адносін, замяніўшы яе чыста спажывецкай цікавасцю. І сёння ўжо рэдка дзе знойдзецца чалавек (асабліва сярод моладзі), які б змог паўтарыць, давесці да канца следам за цёткаю Кацяю шчырую яе малітву:

«Поле, вось мой скарб — рукі. Ты лашчышся да іх, калі я гладжу цябе, і ад прыемнай асалоды выпростваеш кожную сцяблінку, нібы тое кацяня хвост. Ты любіш грэцца ў маіх руках. І калі нават зімою ў маіх далонях малавата цеплыні, ты не адпіхваеш іх, акрэплыя і скачапелыя, бо яны і такія ўсё роўна добрыя, ласкавыя. Ты ведаеш на

іх кожную шурпацінку, кожны мазоль і адчуеш кожную незнаёмую пушынку, што прыліпла да далоняў.

І мае рукі таксама ведаюць цябе. Яны заўсёды пачуюць, як парастак стукнецца сваёй кволаю дзюбаю ў каменьчык ці ў камлыжку, і дапамогуць яму абагнуць, мінуць гэтую перашкоду.

Ды і тады, калі ўраджай даручаецца ўжо аднаму толькі сонцу, калі рукі нічога не могуць ужо зрабіць, яны ўсё роўна не ведаюць спакою. Яны, як тая птушка каля свайго гнязда, якому пагражае небяспека, лунаюць над табою, поле, і тады, калі доўга шчыруе сонца, не падпускаючы да цябе ніводнай дажджавой хмаркі, і тады, калі тыя хмары чапляюцца за самыя вясковыя хаты, а ты нагадваеш балота — кожная раслінка высільваецца, цягнецца ўверх, каб не ўтапіцца ў моры дажджавой вады.

Затое з якою пяшчотаю лашчаць мае рукі колас, гэты створаны табою цуд, з якою асцярогаю качаюць яны на грубай шурпатай далоні зернетка — мусіць, так кожную крупінку золата пелягуюць ювеліры.

Поле, вось мой скарб — рукі. Вясною яны пахнуць адталаю зямлёю, першаю баразною; летам — краскамі і даспелым жытам; восенню — саломаю, бульбоўнікам, качанамі капусты і першымі замаразкамі; зімою — кастрою, торфам і рунню, што сцішылася да вясны пад снегам... А ўрэшце — мае рукі пахнуць табою, маё поле...»

* * *

Рынак — гэта своеасаблівы падзел вёскі. Менавіта адсюль, менавіта з сярэдзіны пачынаюцца два канцы вёскі. І калі хто-кольвек з нашых суседзяў зойдзе за рынак, то пра гэта ўжо будзе гаварыць так: «Быў у тым канцы», «іду з таго канца».

Гэты, другі канец, які, мусіць, злучыўся б з Папізоўем, калі б не рака і не нізіна паміж імі, яшчэ і сёння выглядае трохі маладзейшым за наш. Яго хаты — бялейшыя, стрэхі — навейшыя: ні на адной не ўбачыш зялёнага моху. Не вельмі даўно ён будаваўся нанава.

Гадоў дваццаць таму ўкінуўся сюды пажар. У самае лета, у самую сухмень, у самы руплівы час — калі ўсе былі ў полі. Аж цяпер робіцца вусцішна, калі ўспамінаеш, як траіпчалі ў агні сухенькія вокны, дзверы, сцены, як высока над крохвамі вірыла і гуло полымя. А суседнія хаты, з задранымі саламянымі стрэхамі, спалохана глядзелі на

агонь, які, пяглядзячы па мітуслівасць пажарных камапд, што паз'язджаліся з суседніх вёсак, настойліва цягнуўся да сцен касмылямі агню, белымі на сонцы.

Тады агонь выкаціў як пе ўвесь канец...

— Здароў быў! А я гляджу, хто гэта такі ідзе — белы ўвесь, нібыта ў млыне муку малоў.

— Добры вечар, дзядзька Хрол.

Ён высокі, плячысты. Вялікія валёнкі, падшытыя тоўстым лямцам,— відаць, што падшываў сам. Пад пахаю, загорнутая ў цёмную анучу, пэўна, кельма — я здагадваюся па плямах гліны і на анучы і на ватніках. Мусіць, ён папраўляў некаму печ (зімою ж печы не робяць — і хату паставіць, і печ скласці ўсе спяшаюцца летам, пакуль яшчэ цёпла). Дзядзька Хрол — цудоўны пячнік, і па яго прыязджалі і прыязджаюць нават з далёкіх вёсак. Праўда, цяпер панарасло трохі маладых печнікоў, але майстэрства дзядзькі Хрола ўсё яшчэ ў недасягальнай пашане. Хролава печ стала ў нашай вёсцы такою ж адзнакаю якасці, як Касцянцінавы дзверы, Цімкавы валёнкі, Марозаў касцюм... Дзядзьку Хролу, мусіць, вельмі многа ікалася: у нашай вёсцы яго ўспаміналі як не за кожным словам.

Набрала дзіця поўныя кішэні цвікоў, заклёпак, вінтоў — бацька ўжо гаворыць маці:

— Паглядзі, у яго ў кішэні зялеззя ўсялякага, як у Хрола па двары.

Трэба пахваліць суседа за гаспадарлівасць, і чалавек адзпачас, што ў яго, маўляў, як у таго Хрола, усё ёсць.

А ў яго сапраўды было ўсё. Спатрэбілася каму зрабіць міску ці лыжку, трэба каму абабіць жорны ці зрабіць для іх латок, спатрэбіліся каму завірта ў сані, клёц у барану ці цуглі для вуздэчкі, трэба каму банька для касы ці грузік для самаробнага бязмена — усе ішлі да дзядзькі Хрола. І ён спачатку якую хвіліну думаў (трэба ж было ўспомніць, дзе шукаць), а потым паволі ўставаў і ішоў туды, дзе павінна ляжаць патрэбная рэч. А патрэбная рэч у яго была заўсёды. У гэтым і ён, і тоі, хто па яе прыйшоў, ніколі не сумняваліся.

Хролава крыніца... Хролава балота...

Так, у яго ёсць сапраўды балота... Гэта ў Струпаве, за лесам. Калі ісці на Тумінічы — па правую руку.

Дзядзька Хрол, мусіць, пачуўшы нейкі ўдаўпены покліч мінулага, калі чалавек яшчэ жыў сам-насам з прыродаю, разбурыў сваю хату і перавёз яе з вёскі аж за лес,

у Струнава. Склаў яе там каля безымяннага балотца, выкапаў крыніцу і пачаў адзін у лясной цішыні наладжваць даўнюю абарваную сувязь з лесам, з птушкамі, з небам. Але ці то чалавек завельмі ўжо далёка адышоўся ад свайго пачатку, ці то ён не з таго боку ўзяўся за ўсё гэта — толькі наладзіць гэтую сувязь яму не ўдалося. Нейкі час абадраныя і галодныя яго дзеці (а іх імёны таксама былі нязвыклыя для маёй вёскі — Клаўдзя, Ярген, Аркадзя, Нора) з палатнянымі торбачкамі цераз плячо штодзень прыходзілі ў вёску жабраваць, а потым, праз некалькі год, мусіць, убачыўшы, што гэтая цяга больш складаная, чым спачатку думалася, дзядзька Хрол разабраў сваю хату, прывёз яе з лесу і паставіў у канцы вёскі. А ад яго эксперыменту асталіся толькі Хролава крыніца, да якой і сёння ў летнюю спёку трактарысты ходзяць прагнаць смагу, ды безымяннае балотца цяпер стала Хролавым балотам, дзе на сухіх мясцінах спее і цяпер многа буйной і сакавітай маліны.

Але гэтае няўдалае яднанне з прыродаю, мусіць, назаўсёды асталося ў яго нейкім цёплым успамінам, і ён пры выпадку хоць у размовах вяртаўся зноў туды, пад сваё Хролава балота... І што цікава, ён не крыўдаваў на прыроду — дзядзька Хрол не лічыў сябе пераможаным.

Мы ўсе прывыклі, што прырода,— чыстая, цнатлівая, шчодрая. І ўжо толькі адзін напамін пра яе заўсёды выклікае ў нас нейкае вельмі ж ужо цёплае, замілаванае, як ласка, пачуццё. Халоднай снежнай зімою, калі ад завірух не відно, дзе канчаецца зямля і пачынаецца неба, цёпла думалася пра зялёнае лета; мокрай, прастуджанай восенню, выхаджанай і вытаптанай наскрозь дажджлівымі вятрамі, хораша марылася пра сонечную вясну... І неяк не хацелася верыць, што можа быць яшчэ і іншая думка пра святыню твайго пакалення — раззлаваная, суровая, злосная.

Маўляў, прырода — бязлітасны вораг чалавека. Яна часта, вельмі часта прымушае «цара прыроды» плакаць ад сваёй бездапаможнасці падчас пажараў, ураганаў, мяцеліц, буранаў, тайфунаў, землетрасенняў, выняржэнняў, падчас нашэсця шкоднікаў, падчас чумы і голаду.

Маўляў, прырода нарадзіла чалавека недасканалым стварэннем. Ён прыйшоў у свет голы і безабаронны, у яго не было нават тых інстынктаў, што ў звяроў, не было іхніх сродкаў абароны і нападзення — рагоў, капытоў, ваўчыных зубоў. Таму і не дзіўна, што чалавек тысяча-

годдзямі пакланяўся жывёлам, якія былі падзелены ўсім гэтым і таму здаваліся больш любімымі дзецьмі прыроды.

Маўляў, наваколле прывячае варожыя нам сілы: зямля перапоўнена злосцю, неба цёмнае ад лютасці, і таму чалавек прыйшоў да будаўніцтва вялікага горада — адзінага пэўнага месца, якое ўратуе яго ад бесчалавечнасці, ад бессардэчнасці прыроды...

Гэтыя разважанні аб прыродзе належаць амерыканскаму сацыёлагу Эрыку Хоферу. Каго не ўразяць гэтыя словы, хто прачытае такую характарыстыку прыродзе! Але між іншым кожны, мусіць, адчуе, што тут ёсць добрая доля праўды, якую нам чамусьці ўжо дужа не хочацца ведаць.

Можа, таму, што гэта ўсё вельмі нечаканае, а можа, таму, што мала каму з чалавецтва даводзілася ўведаць тое акропнае пачуццё страху, калі чалавек астаецца сам-насам з джунглямі ці з ціхім белым бязмежжам ледавітай маўклівасці. І таму я спяшаюся ўпэўніць сябе, што прырода, абкачаная, як той камень, стагоддзямі і інстынктыўна перададзеная мне маімі продкамі, не можа быць бязлітаснай і варожай. Тым больш цяпер, калі з'явіўся новы від кентаўра — Чалавек-машына, які ўсё больш і больш засяляе зямлю і амаль кіруе чалавекам. Тым больш цяпер, калі мы, марачы купіць пад Новы год сапраўдную елку, купляем сінтэтычную, забыўшыся, што сапраўдная елка мае яшчэ пах і расце не на фабрыцы.

Прырода мне не можа быць ворагам. Яна ўсё ж чыстая, цнатлівая, шчодрая...

Менавіта такою была яна і для дзядзькі Хрола. Ён заўсёды пры выпадку любіў пагаварыць пра яе, па-своймy разабрацца ў некаторых яе закапамерпасцях.

Мне падабалася рыхтаваць з ім лазню. Ды і дзядзька Хрол заўсёды запрашаў мяне, хлапчука, да сябе ў кампанію:

— Хадзі да мяне на голы банкет. Хоць мы з табою пазюкаем трохі.

І вось па вуліцы гудзе завіруха, а тут у печы гудуць сухія тоўстыя плашкі, у лазні дым сцелецца зусім нізка, цячэ ў расчыненыя дзверы і, заломваючыся на вушаку, спяшаецца ўверх, з лазні. Мы сядзім з дзядзькам Хролам на падлозе, да якої прыліпла лісце ад венікаў, глядзім на каменны набор наката, які ўвачавідкі яснее, збіраючы паступова добрую пару для нас. Дзядзька Хрол спакойна, разважліва гаворыць:

— От ты глядзі сюды. Усё нам купіць трэба. А вось зямля, лес, поле — усё як быццам пехта так аддае: тамацька ягадзіну возьмеш, тутацька грыб падпімеш, а то арэхаў натрасеш — бачыш, ужо і сабраўся, наеўся. З дрэва дошак напіліш, а з дошкі — і на чым есці, і на чым сядзець, і па чым спаць змайструеш. А вазьмі паветра. Вось што, мусіць, самае смачнае з усіх страў, якія ведаюць людзі. Гэта табе не цукеркі, якіх, скажам, заманулася раз у год. А паветра кожную мінуту трэба.

А вось ужо час грэць ваду. Распаленае каменне — кожны камень нібы свяціла — качэргамі выкочваем з печы на заслапку ці проста па бляху і кідаем у бочкі, цабэркі з вадою. Яно там доўга грыміць, варочаецца, гагоча, пакуль не выб'ецца з сіл,— і тады толькі чуваць ціхія, прыглушаныя гукі, нібы раскаты грому, які толькі што тут стараўся, завіхаўся, а цяпер адыходзіцца ўсё далей і далей.

— А вот вы, мальцы, не ведаеце, што такое маладня, гром. А гэта ж хмара аб хмару цярпецца — вось вам і іскры і маладня. Якраз як крэсівам аб крэмень. Ці, скажам, паспрабуй бляхай аб бляху з разгону цярнуць. Во вам шуму будзе, во грому! А вы не глядзіце, што хмары здаюцца мяккімі, як кудзеля, у іх вунацька якая сіла.

Дзядзька Хрол па-свойму хацеў прыручыць прыроду. Недзе пачуўшы, што ад перуноў добра абараняюць громаадводы, ён адразу ж прывалок з лесу гопкую сасонку і ўкапаў яе на самепькім узмежку сваіго доўгага і вузкага загону — як не пад самым лесам, далёка-далёка ад сваёй хаты. Так далёка, што ў зону дзеяння громаадвода ўжо не ўваходзіла яго селішча. Але перуны чамусьці ў гэты канец вёскі пачалі біць часцей. Мужчыны зазлавалі на Хрола і яго громаадвод: маўляў, ён сцягвае перуны з усіх навакольных вёсак, а то, можа, нават і з самой Оршы. Громаадвод давялося спілаваць. Дзядзька Хрол атрымаў яшчэ адно паражэнне ў сваім прыручэнні прыроды.

Але, нягледзячы на гэта, ён усё роўна тлумачыў жыццё, карыстаючыся сваёй філасофіяй. Там усё ўспрымаецца з дзіцячай непасрэднасцю. Таму ўсё вельмі лёгка рашаецца. Нават такое складанае пытанне, як смерць. Памятаецца, як у дзяцінстве я вынайшаў свой спосаб унікнення смерці і вырашыў праблему даўгалецця. Смерць, маўляў, наступае тады, калі чалавек упадзе. Таму ў старым узросце, у такім, скажам, як дзед Стахван, трэба як можна бліжэй трымацца да дрэў. Прыйдзе па цябе смерць, а ты ўчэпішся за яблыню і не ўпадзеш. Ого, няхай паспра-

бус мяне тады адарваць тая смерць, калі я ўчаплюся за сукі! І так, абдумаўшы ўсё гэта да драбніц, я спакойна вяртаўся ў сваю гульню, упэўнены, што ніколі-ніколі не памру...

А дзядзька Хрол, ужо абдаўшы халадзёнкаю сцены лазні, уздае поўнаю копаўкаю на венікі. Каменне гагоча, ад пары аж смыляць вушы, і на ўсю лазню разносіцца прыемны пах разамлелага леташняга бярозавага лісця.

— Ну, лезьце, мальцы, на палок. Вы тамацька хутка паўжалееце, як тая бульба ў печы.

А потым, саскочыўшы з палка, як хараша ўздаваць на сябе прыгаршчамі з начовак халадзёнку, якая ў прымыльніку паспела ўжо зацягнуцца тонкаю плёнкаю лёду, і млосна радавацца прыемнаму наколванню — нават не ведаеш, ці гэта на самай справе колюцца льдзінкі, ці гэта толькі золкая вада... І як добра потым пастаяць за расчыненымі дзвярыма прымыльніка, не адчуваючы марозу.

— Не стойце тамацька на буі — прастудзіцеся! Ідзіце ў лазню. А то паўдзядзелі ўжо гэтыя хлопцы за дзеўкамі ўбрыкі бегаюць, а розуму — з камароў нос. Хоць твой дзед Іван, бывала, памыецца ў лазні, адхвошчацца венічкам, палатняную бялізну адзене, кажух пад паху і пайшоў сабе ціхенька босы па марозцу. Толькі снег пад нагамі, як пад валёнкамі, рыпіць. Здаровы быў чалавек. Хай яму лёгка там спіцца...

А потым, крыху пачакаўшы, але не расстаючыся са сваёю думкаю, казаў:

— Не можа ж быць, каб чалавек так і знікаў. Былі рукі — няма рук, глядзелі вочы — няма вачэй, хадзілі ногі — няма ног.

Было відаць, што ён хацеў бы згадзіцца, рады быў бы паверыць, што жыццё ідзе і там, куды ты дабіраешся толькі адзін раз, і то не на сваіх нагах. Ды хіба ён адзін хацеў гэтага? Чалавеку заўсёды падабалася думка пра тагасветнае жыццё. Можа, таму і ўзнімаліся вышэй за ўсё піраміды. Можа, таму і выстрэльвалі ў аблокі спічакі цэркваў. Можа, таму на востраве Корсіка, кажуць, і цяпер на кожнай магіле будуюць прасторныя капліцы, якія вельмі ж ужо нагадваюць сапраўдныя хаты. І таму здараецца, што недасведчаны падарожны, трапіўшы вечарам у такую тагасветную вёску, доўга і гулка малоціць кулакамі ў дзверы, інтымна барабаніць у шыбы і, нягледзячы на мёртвую цішыню, просіцца: «Адчыніце, людзі добрыя! Пусціце пераначаваць. Толькі на адну-адзіную ноч...»

У кожнага практычнага чалавека, які ідзе ад зямлі, які разумее змену вечных катэгорый, ёсць свой практычны падыход да праблемы жыцця і смерці. Хіба можна, напрыклад, астацца абыякавым да такога нечспадзяванага адкрыцця старэнькай, дзевяностагадовай бабулі? У той дзень у яе дачкі дакапалі бульбу, і, як звычайна робіцца ў нашых гасцінных вёсках, вечарам у хаце загудзела застолле: гэта ж трэба вачэй пазычыць, каб людзей, што гэтак завіхаліся, выправіць, не ўчаставаўшы. Старую чамусьці за стол не паклікалі. Яна прыйшла сама. «Што ж вы, дзеткі, па старую забыліся? А я ж многа не магу, а чарачку яшчэ вып'ю за ваша здароўе». Села за стол. Выпіла з усімі. Бабуля ўжо крыху загаворвалася, блытала імёны суседзяў і нават сваіх дзяцей. «Слухайце, дзеткі, а дзе ж гэта наша Мар'я? Чаму ж гэта яе не паклікалі?» — спытала. «Мама, ці ж ты не ведаеш — наша ж Мар'я даўно памерла».— «Ага, дзеткі, памерла. А як жа — помню. Помню, дзеткі, тады якраз і гаварылі: дачка, бачыце, памерла, а маці жыве. А як жа, дзеткі,— так яно і трэба. Я ж яе нарадзіла, я ж яе замуж аддала, я ж яе і там павінна ўладзіць, каб ёй і там добранька ды цёпленька было. А хто ж, дзеткі, яшчэ ўсё гэта зробіць, калі не маці? Як жа, дзеткі, маці першай паміраць?»

Бачыце, якое разуменне свайго практычнага абавязку!

...Пасля лазні ідзеш дахаты і ўжо неяк трохі па-іншаму глядзіш на гэты свет. Бачыш, як увагнуліся пад цяжарам снегу стрэхі, як па самыя вокны ўехалі ў гурбы хаты, і адчуваеш, як хочацца ім страсянуцца, нібы таму каню, які толькі што пакачаўся... І неяк вельмі ж ужо рэальна ўспамінаеш Хролавы словы: «Мароз адваліўся»,— нават бачыш, як ён ляжыць, раскінуўшы белыя рукі, і як вецер свавольна, нібы ўнук, варушыць яго белую бараду...

Дзядзька Хрол не ўмее чытаць. Можа, таму ён з такой урачыстасцю браў кнігу ў вялізныя, чорныя ад работы рукі, якія перад гэтым ён доўга мыў з мылам і злаваўся, што яны не адмываюцца. Потым вельмі ж ужо асцярожненька гартаў старонкі і з сапраўднай дзіцячай непасрэднасцю радаваўся кожнаму малюнку. А з якім непасрэдным захапленнем глядзеў ён на значкі літар: няўжо гэта яны, гэтыя значкі, складаюць тыя мілагучныя словы, якія па складах чытае яго сын?

У яго была даўняя павага да кнігі. Мусіць, яшчэ тая, калі, каб стварыць яе, не хапала часам і аднаго чалавечага жыцця, а каб купіць — не шкадавалі нават двух харо-

шых копей, якія і так былі не лішнія ў гаспадарцы. На якой вялікай датацыі, па нашым цяперашнім уяўленні, была тады кніга! Ці, скажам, крыж Ефрасінні Полацкай, зроблены, выпешчаны майстрам-ювелірам Лазарам Богшам у 1161 годзе: за яго ж плацілі аж 40 грывен! Гэта столькі, колькі плацілі за машчэнне 8 тысяч лакцей драўлянай маставой. Нішто сабе цана!

Гэта потым ужо, крыху пазней, прыйшла непавага да самага святога, што выпеставаў чалавек,— непавага да кнігі. Інквізітары розных стагоддзяў бачылі ў кнізе свайго самага найпершага ворага: яго трэба было зняважыць, спаліць... І тады ўспыхнулі ў розных месцах злавесныя чорныя кастры з кніг — гэта гарэла чалавечая памяць. Асабліва многа такіх кастроў аплакала Беларусь: яе прымушалі забыць на сваё мінулае, пахаваць яго ў попеле, каб ніхто не ўведаў, якой яна была...

Паслугачы рускіх цароў палілі ўсе беларускія кнігі, якія былі напісаны лацінкаю (маўляў, гэта ўсё спадчына каталіцызму), а польская шляхта знішчала ўсе беларускія кнігі, напісаныя кірыліцай, бачачы ў гэтым руку праваслаўя. Ім дапамагалі некаторыя беларускія магнаты, якія, пераходзячы ў другую веру і каб даказаць сваю шчырую адданасць ёй, самі добраахвотна палілі падазроныя кнігі. Гарэла памяць нашага народа на кастрах католікаў, кальвіністаў і сацыян у XVI, XVII і XVIII стагоддзях.

Калі Францішак Скарына цераз Польшчу вазіў у сваю родную Беларусь кнігі, якія ён друкаваў за мяжою, палякі арыштоўвалі гэтае багацце і асуджалі да спалення. На спаленне быў асуджаны імі і сам Скарына.

Гарэлі кнігі, надрукаваныя пад Оршаю ў друкарні старажытнай Пачайны, якая потым, каля 1630 года, была перанесена ў Куцейну, у манастыр.

Не перасядала снядание і ў тых французаў, якія ў 1812 годзе ўжывалі замест дроў пры гатаванні стравы рэдкія кнігі духоўнай семінарыі Троіцкага манастыра ў Слуцку. Смачная, разумная, інтэлектуальная была, пэўна, ежа!

У Оршы, пасля разграблення цэркваў і манастыроў, французы выкінулі на вуліцы хлам — кнігі, між якіх было і Аршанскае евангелле, пісанае на пергаменце ў XIII стагоддзі. Так загінуў і Турава-Пінскі летапіс, пачаты ў 1021 годзе і скончаны ў 1635 годзе. Апошнія запісы ў ім былі зроблены рукою апошняга пінскага князя Івана Фёдаравіча Яраславіча.

Знішчаліся кнігі, якія хацелі расказаць нам пра веліч Полацка і Турава, Оршы і Навагрудка.

Спальваліся кнігі, якія расказвалі, як кароль Вялікага княства Літоўскага Ягайла прыязджаў у Друцк (гэта паміж Оршай і Талачынам) высватаць сабе нявесту — яму трэба была, зразумела, прыгажуня.

Знішчаўся першы беларускі слоўнік, складзены ў 1596 годзе Лаўрэнам Куклем (Зізаніем).

Спальваліся кнігі ўсіх 15 старажытных беларускіх друкарняў — Віленскай, Магілёўскай, Куцеінскай, Супрасльскай, Нясвіжскай, Мінскай, Гродзенскай, Буйніцкай, Полацкай і інш.

Кнігі, старажытныя кнігі рвалі на цыгаркі, іх закопвалі ў зямлю, імі масцілі нават гразкія вуліцы. А ў асноўным іх палілі. Давайце ўявім сабе далёкі 1581 год, веснавую Вільню. І паслухаем, што расказваюць сведкі.

Перад вялікаднем ад самай раніцы звозілі смалістыя дровы і аблітыя смалою кулі саломы на рынак. Гэта ўсё акружала гарадская варта і ўсярэдзіну нікога не пускала. Пазней прыйшлі два драбіністыя вазы, паркаю коней запрэжаныя, з кнігамі. Замковыя галябарднікі добра пільнавалі гэтыя вазы. Казалі, што гэта кнігі не каталіцкія, а выклятыя і агню аддадзеныя. Выкапалі на рынку насупроць вісельні яму, невядома якой глыбіні, бо яе пільнавалі жаўнеры і ратушовыя служачыя. Складалі кнігі, перакладаючы іх дровамі і саломаю (заўважце, намнога пазней фашысты менавіта так перакладалі дровамі людзей). Тры локці над зямлёю ўзняўся гэты груд. Тут і кат — адміністратар юстыцыі. Прыехалі інстыгатар і ўраднікі. Загудзелі бубны і трубы. Пасля гэтага ягамосць ксёндз Фердынандус Капэцкі ўзышоў на груд. Тут бабы — семярніцы, што прадаюць семя, і перапечайкі, што прадаюць печыва,— у крык, у плач: ксяндза, маўляў, на грудзе паліць будуць. Ён сам супакоіў жанчын. Калі ён скончыў гаварыць, прынеслі паходню. Яе ўзяў кат-майстар Ігнат з Сабачай вуліцы і падпаліў груд. Груд гарэў дужа доўга.

А такіх катаў-майстроў, такіх «ігнатаў з сабачых вуліц» на маёй Беларусі было нямала. Быў кат-вешальнік Мураўёў, які яшчэ ў 1831 годзе выказаў свае думкі ў дакладной запісцы ўраду: маўляў, чыноўнікі ў Беларусь павінны набірацца толькі з цэнтральнай Расіі, якіх трэба вабіць сюды, прадастаўляючы ім выгоду «в чинах, званин и в содержании», а «туземцам» даваць пасады ў імперыі,

а калі тыя заслужаць давер'е — павышаць, вылучаць. Гэта запіска прадугледжвала ўвядзенне ў быт рускіх назваў устаноў, пасад, мясцовасцяў, вуліц, а таксама патрабавала забараніць ужыванне беларускай мовы...

І мову забаранялі. У 1697 годзе пастановаю сейма Рэчы Паспалітай было забаронена складаць дзяржаўныя дакументы па беларускай мове. А ў 1867 годзе ўжо царскі ўрад зусім забараніў усё тую ж беларускую мову.

І толькі дзякуючы Кастрычніцкай рэвалюцыі, Савецкай уладзе па-сапраўднаму расквітнела Беларусь, яе мова, яе культура. У гэтым можа ўпэўніцца кожны, чытаючы нашы газеты, часопісы, кнігі.

А дзядзька Хрол так і не навучыўся чытаць. Неяк не хапіла ў яго часу, ды, мусіць, і навука гэтая здавалася яму недасяжнаю.

...Ён, дзядзька Хрол, ужо развітваецца са мною:

— Спяшайся, якраз на свежыну пападзеш. Твой швагер якраз кабана толькі што апрастаў — вялізнага, як той конь. Удзень толькі што смаліў. Хіба не чуеш, што ўся вуліца свежынаю пахне? Мне ў Панізоўі і то нос казытала...

Аж не верыцца, што гэта была мая апошняя сустрэча з ім: калі нарыс быў ужо ў друкарні, мне паведамілі, што дзядзька Хрол раптоўна памёр...

* * *

Крама. Дзверы яе прычынены і, мусіць, зашчэплены з сярэдзіны на кручок. Праз аканіцы цэдзіцца на вуліцу святло. Ага, значыць, крама зачынена яшчэ не назусім. Проста, мусіць, вясковае начальства зайшло туды выпіць ля прылаўка па сто грамаў гарэлкі і закусіць «падушачкамі», што, зліпшыся ў камок, ляжаць на лістку, выдраным з нейкай кнігі. А каб не падрываць свайго аўтарытэту — зашчапіліся.

Таму і стаяць каля дзвярэй жанчыны. Чакаюць, калі выйдзе начальства, якое, асцярожна і паважна сыходзячы з ганка, будзе рабіць выгляд, што рашала там нейкія вельмі важныя, вельмі неадкладныя пытанні...

— Добры вечар!

Гэта цётка Люба. Яна перахоплівае мой погляд (маўляў, чаго так ужо прыспела ў краму?) і тлумачыць:

— Гэта ж мая Нэля прыехала. А тут хлеб, як на тое, выйшаў увесь.

Вось ужо і дачка на выданні... Хутка, мусіць, цётка Люба стане бабуляю.

А, здаецца, зусім жа нядаўна, перад самай вайною, прывёз яе сюды з Белева прыгожы хлопец Андрэй. А сам пайшоў на апошнюю вайну і ўжо ніколі не вернецца, каб, скажам, абсадзіць хату ці пературэсці хлеў, скасіць пожню ці прывезці дроў... Ці пацалаваць яе, сваю жонку...

Колькі жанчын і ў маёй вёсцы, і ў іншых вёсках і гарадах вайна сілком упіхнула з радаснага даваеннага дзявоцтва, яшчэ сарамлівага замужжа адразу ў халоднае і самотнае ўдаўство, так і не даўшы ім нацешыцца каханнем, наглядзецца ў замілаваныя мужавы вочы, пакінуўшы ім доўгі і тужлівы клопат удоў — чакаць.

І яны чакалі нават тады, калі чакаць ужо не было каго. Яны помнілі толькі мужавы рукі, мужавы вусны і па часе зусім забываліся, што гэта значыць — кахаць. Можа і не забываліся, але стараліся ўнікнуць выпадковай мужчынскай ласкі: баяліся, што яна разбудзіць крыху прыціхлае ў іх пачуццё. Яны не ведалі, чым тады стрымліваць сваё сэрца, калі тое раптам памаладзее нават ад адной ночы з мужчынам...

Таму мы, мусіць, робім часам вельмі ж ужо неразважліва, калі, не паспрабаваўшы нават разабрацца, што і да чаго, гнеўна асуджаем адзінокіх жанчын, якія ўсё ж не ўтрымаліся ад спакусы нацешыцца хоць выпадковым каханнем. Мы падыходзім да іх толькі з нейкага дабрачыннага боку. Хоць самі адчуваем (абавязкова адчуваем!), што гэтае пытанне куды больш складанае, чым нам здаецца...

Сучасная ўдава, зусім маладая жанчына, неяк наспешліва і ліхаманкава, па макулінках, якія хоць трохі нагадвалі ласку і пачуццё, пачала збіраць сваё каханне. Здавалася, што ў яе дзверы ўжо стукаецца сама старасць,— так яна спяшалася кахаць. Жанчыну асуджалі. А яна са слязьмі на вачах тлумачыла свае паводзіны:

— Усе маюць мужоў, маюць ласку, пяшчоту. Маюць пра каго клапаціцца. Ёсць каму клапаціцца і пра іх. А я ж таксама хачу ласкі, хачу клопатаў. Хачу, каб мяне цалавалі. Хачу нават, каб мне было з кім пасварыцца, ведаючы асалоду прымірэння. А ўсе бягуць дахаты, да сваіх жонак, дзяцей. І толькі я астаюся адна. А я таксама хачу мець мужа, мець дзяцей, сваю сям'ю, куды я буду таксама спяшацца пасля работы...

Можа быць, што яна збярэ сваё каханне. А тыя, што

адмаўляюцца ад яго назаўсёды, знаходзяць радасць спачатку ў дзецях, калі яны ёсць, а потым — ва ўнуках. І так пацiху, самі таго не заўважаючы, старэюць.

Памятаю, калі яшчэ школьнікам пасля ўрокаў я насіў пошту, аднойчы старэнькая жанчына, якую заўсёды бачыў толькі з кнігаю ў руках, паказала мне сваю дзявочую фотакартку. Я быў уражаны да неймавернасці: няўжо сфатаграфаваная прыгажуня, ад якой нельга адвесці вачэй, і ёсць вось гэта зморшчаная, як печаны яблык, бабулька? Але цяпер ужо ў мяне з'явілася таіна: цяпер я ў кожным старым чалавеку стараўся адшукаць рысы, якія б нагадвалі пра яго маладога.

Прызнаюся, гэтае маё дзіцячае захапленне чамусьці не знікла — яно ідзе са мною і ў маю сталасць. Бывае, што мне нясцерпна захочацца ўзнавіць, угадаць, убачыць старога сустрэчнага чалавека маладым і прыгожым... Бо кожны чалавек — прыгожы. Адзін прыгожы тварам. А ў другога твар не прыгожы, але ён неяк вельмі ж ужо цёпла асвятляецца ўнутраным святлом, ад чаго чалавек прыгажэе. Вось таму я і веру, што ўсе людзі прыгожыя. Трэба толькі ўлучыць той момант, калі чалавечы твар можна чытаць, як цудоўную займальную кнігу, не звяртаючы ўвагі на афармленне. Праўда, для гэтага трэба, каб і нашы душы былі таксама добрыя...

А ў вёсках і гарадах паціху старэюць у сваім восеньскім бабіным леце ўдовы. І, прачнуўшыся — ці вясною, калі поўня робіць нейкаю казачнаю начную хату, ці ўвосень, калі ў лісці, як мышы пад печчу, шамаціць дождж,— яны доўга не могуць заснуць і — хто ведае — можа, як тая біблейская Суламіф, сцяўшы зубы, ціха, нібы малітву, шэпчуць сваю песню песень:

— На ложку маім ноччу шукала я таго, каго любіць душа мая, шукала і не знайшла яго...

* * *

Хата Васіля Шуранава. Колькі ўжо часу мінула, як ён прыйшоў сюды ў прымакі, але хата ўсё роўна называецца Сцёпінай. І Маня, жонка яго, таксама ўсё яшчэ Сцёпіна.

Каля агарожы — лавачка. На ёй вялікая гурба снегу — зімою ж, на марозе вельмі не пасядзіш. Ды і летам тут, пэўна, бывае пуставата: і Сцепаніда, і Мар'я, дзядзіна мая, памерлі. А яшчэ ж нядаўна летнімі надвячоркамі

яны штодзень сядзелі на гэтай лавачцы і пры сустрэчы падхвальвалі нас (маўляў, вось былі дзеці — нікому вады не замуцілі), забыўшыся, што і мы лазілі ў іхнюю моркву, слівы ды яблыкі...

А вунь у вузенькі Нікіпараў правулачак з пілою ў руках (мусіць, пазычаў) не спяшаючыся патэпаў Дода. Ідзе, як усё роўна мае заданне ўтаптаць сцяжынку. Дода — гэта мянушка дзядзькі Хведара. Ён ужо да яе добра прывык — такое бяды: хай сабе і Дода! Не менш прывыклі і ўсе аднавяскоўцы. Мусіць, каб у некаторых спыталі, як яго сапраўднае імя, многія хутчэй за ўсё так і не ўспомнілі б. А гэтак зручней — Дода і Дода. Мусіць, ужо ніхто не ўспомніць таксама, чаму менавіта гэтая мянушка прыліпла да дзядзькі Хведара,— кожны аднавясковец мае па некалькі мянушак, а застаецца з ім назаўсёды толькі самая трапная. А ў маёй вёсцы з урачыстымі поўнымі тытуламі і прозвішчамі, з якімі цяжкавата суладаць у размове, спрадвеку пасьпяхова супернічалі так званыя рабочыя псеўданімы — вясёлыя, трапныя, поўныя гумару мянушкі. Скажам, навошта за кожным словам паўтараць доўгае — Мікалай Васільевіч Чарнашоў, калі можна сказаць кораценька — Лахмыда. Можна было б, скажам, зваць яго Мікалай Васільевіч. Але Мікалай Васільевіч у вёсцы не адзін. Можна было б спыніцца на «дзядзьку Мікалаю». А ў вёсцы дзядзькаў Мікалаяў — хоць ты гаць гаці. Заблытаешся. А вось Лахмыда — адзін. Мусіць, ці не таму і з'явіліся ў маіх Зубрэвічах Шлында і Пінька, Нацца і Вус, Стоп і Мукамол, Быська і Саўсэм, Певень і Некуромша, Хып і Вастустар, Лахмыда і Дода, Аці і Бадрэц, Вунацька і Тлятля. Адны звыкліся, як Дода, са сваёю мянушкаю, другія, як, скажам, Бадрэц, не змаглі змірыцца з ёю і злаваліся да самае смерці.

Гадоў каля дваццаці таму, калі нашы мужчыны на тыдні ці на цэлыя месяцы ездзілі ў Сафіёўку валіць лес, упадабаў там Жэня Вунацькаў прыгожую дзяўчыну і прывёз яе ў Зубрэвічы. І нешта хутка спатрэбілася Ніне надбіць туфлі. Ёй параілі схадзіць да Бадраца: маўляў, харошы шавец. Той якраз вячэраў. Яна яго і папрасіла: «Дзядзька Бадрэц, надбіце мне туфлі». Хто яго ведае, як там было, але Ніна вярнулася з туфлямі і як не са слязьмі на вачах расказвала: «Ён мяне выгнаў, ледзь міскай з бульбаю не запусціў. Навошта вы так пажартавалі з мяне?» А з яе ніхто не жартаваў, проста ніхто не ўспомніў, што ў Бадраца было сапраўднае імя — Пятрок.

А Дода не крыўдзіцца. Ён, як я помню, ніколі не крыўдзіўся. Нават тады, калі мы, галёкаючы, станавіліся на кончык доўгай пугі: ён таксама, як і Нікіпар, пастух.

Як помню, ідзеш з танцаў адкуль-небудзь з Вярхоўя і ўжо чуеш, што ў тым канцы вёскі будзіць гаспадынь яго ядраны ў ранішняй цішыні голас: «Выганяй!»

Як помню, калі прачнешся ад яго яшчэ далекаватага голасу, бачыш, што цётка даўно ўжо сядзіць каля акна, за якім ледзь-ледзь пачынае шарэць. Успамінаецца, як зябка было ўставаць з пасцелі, калі выпадала па радоўцы гнаць з ім у поле кароў: доўга яшчэ, аж пакуль не сагрэешся ў касых промнях сонца, якія здаюцца адсырэлымі ад расы, цябе будзе там, адчуваеш, злёгку трэсці.

Як помню, каровы ідуць з поля, і мы бяжым ім насустрач, каб убачыць, якая ідзе першаю. Гэта нам, дзецям, абавязкова трэба ведаць, бо калі ідзе першаю чырвоная — то заўтра будзе сонечны дзень, а калі чорная — давядзецца сядзець дома: будзе ліць дождж, будзе холадна, хмарна. Яшчэ і цяпер у роце адчуваю тонкі, як пытляванка, пыл, узняты капытамі кароў. Бачу, як роўненька цягнецца па вуліцы доўгая Додава пуга. Для нас самае важнае, каб знянацку скочыць на яе кончык, а калі таргане пугаўё, што вісіць на пастуховым плячы, хуценька адскочыць і адбегчыся на недасяжную адлегласць. Ды мы, мусіць, і так сваёй дзіцячай інтуіцыяй адчувалі, што добры дзядзька Дода хоць і робіць выгляд, што складаецца, каб уліць нам ляшча, ад якога нават на баках у кароў умомант набухаюць тоўстыя рубцы, будзе старацца, каб нас ніколі не дастаць. Затое як цікава, калі зусім недалёчка ад цябе раптам лясне, нібы выбух, яго пуга.

Як помню, пастух Дода ў мяне доўгі час атаясамліваўся са святымі на нашых абразах: у яго была такая ж доўгая і сівая барада, такія ж добрыя і трохі сумнаватыя вочы.

Потым ужо, калі са мною можна было гаварыць і пра такія сур'ёзныя рэчы, як каханне, цётка Саша расказвала мне пра Доду:

— А ён прыгожы быў малады. І дужа любіў Хімку. Ды і яна яго, мусіць, трохі любіла. Але ж сысціся яны ніяк не маглі — Хімка была ўжо замужам за нашым Ціцам, за дзядзькам тваім. І была ў іх ужо маленькая-маленькая дачушка Ганначка — маці твайго пляменніка Міці. Ты не смейся, не глядзі, што вы аднагодкі, ты яму ўсё роўна дзядзькам даводзішся. Гэта Ганна — твая сястра

дваюрадная. Але тады яна яшчэ, я ж кажу, малюсенькая была. З нялёнак яшчэ не вырабілася. І раптам, дзетка, вайна. Нашага Ціта адразу на вайну ўхапілі. А Дода яшчэ малады быў, гадоў яму не хапіла — яго і не ўзялі. Вось і падладзіўся ён неяк — зацяжарала Хімка без мужа. Але хто яго ведае, можа і дарэмна на чалавека казалі — можа ён тут і не вінаваты зусім. Ведама, вёска: адзін скажа — і пайшло. Праўда, пакуль што Ціту туды, на вайну, не пісалі пра гэты прыбытак, што чакаецца ў яго сям'і. Мы таксама маўчалі: навошта, дзетка, яго засмучаць —яму ж і так там нялёгка, на гэтай вайне. А Хімка тут зусім забедавала.

Толькі неяк раніцою карова ў яе ацялілася. Схапіла яна цэбар вялікі з поілам і панесла ў хлеў перад сабою. Там, дзетка, у хляве і абрадзілася...

Ды хутка і памерла сама: кроў у яе, кажуць, заразілася. А дачушка яе новая — байстручка, значыць, Додава — жыве сабе. Праўда, кволенькая, але нічога — патрошку ножкамі стрыжэ. А глядзець жа няма каму яе асабліва. І сабраліся тады суседзі на сваю сходку, каб рады даць гэтаму немаўляці. Пачалі Доду гаварыць мужчыны — умеў, маўляў, як у вёсцы кажуць, бацькам стаць, умей і гадаваць сваё дзіця: бяры дачку ды шукай ёй новую маці, а сабе — жонку. Але іншыя разважылі: дзе там яму, неўгамоннаю гэтаму, бацькам станавіцца — у яго яшчэ гульні дзяцінныя ў галаве. Аддалі гэтае беднае дзіця Хімчынай радні. Яно там пажыло трохі ды і памерла: вельмі ж змучанае і кволенькае было.

А наш Ціт таксама, дзетка, з вайны не прыйшоў. Потым, па вайне ўжо, хадзіў твой бацька аж у Галошаўку, гэта куды малоць усе ад нас ездзілі, бо там вадзяны млын быў,— яй жа богу, і ты, калі маленькі быў, туды з бацькам ездзіў. Мне ж здаецца, што ты расказваў пра каменную бабу, якой бог сказаў не азірацца, а яна азірнулася, ды так яшчэ і сёння ля Галошаўкі стаіць. Дык вось туды і хадзіў Даніла, бо даведаўся, што ў гэтую вёску вярнуўся чалавек, які разам з Цітам ваяваў. Той трохі і расказаў твайму бацьку. Кажа, іхняга камандзіра забіла, а тут германцы на нашы акопы наступаюць. А нашы сядзяць у акопах, і няма каму іх падняць. Тады, кажа, узнімаецца Ціт. «За цара, за ацечаства!» — крычыць. Выскоквае сам з акопа, а за ім і астатнія. У штыхавую, кажа, пайшлі. Кажа, што сам ён бачыў, як Ціта два германцы на штыхі паднялі...

Ай, дзетка, а які ж ён смелы быў, дзядзька твой Ціт. Ніхто ў вёсцы не мог перамагчы яго. І ніхто прыгажэй, як ён, танцаваць не мог. Бывала, дзед твой Іван і кажа маёй маці, а тваёй бабулі: «Ты ведаеш, Васюта, не нагледзецца, як наш Ціт скача ці б'ецца,— усё ў яго так складна неяк выходзіць».

А памятлівы які быў. Галошаўскі поп, які дружыў з тваім дзедам, увесь час казаў: «Аддавай, Іван, свайго сына вучыцца — з яго вялікі толк будзе». І ведаеш, дзетка, Ціт адну толькі зіму павучыўся ў гэтага папа і ўжо сам дзяцей вучыў — поп адразу ж даручыў яму цэлы клас. Разумны быў чалавек, хай яму там лёгка ікнецца.

Ага, а пра што гэта мы? А, пра Доду. А то я ўжо на другое пераскочыла, а пра што расказваю — забылася. Старая ўжо, дзетка, забыўлівая стала.

А Доду што? Ён любіў дзяўчат. Ты ж Стопіху ведаеш? Дык ён за ёю аж паміраў. У Гілі ў карчме ўсе цукеркі, казалі, параскупляў ды ёй перанёс. А яна Стопа любіла. Ды ўсё ж Дода яе неяк пералашчыў на свой бок. Згадзілася яна за яго замуж выйсці. І толькі гэта пачалі яны запоіны гуляць, аж тут прыбягае, не памятаю хто, ды і кажа: «Хведар, ідзі Лукірку ратуй — атруцілася».

А Дода з ёю хадзіў трохі раней. І ведаеш, як пачула Лукірка, што ён запоіны гуляе, дык адразу і рашыла на сябе рукі накласці. Разумееш, яна ўжо ўцяжку была, хоць пакуль што яшчэ асабліва не відно было. Праўда, мы-то, таварышкі яе, трохі заўважалі, што яна з неахвотаю, неяк баязліва вельмі кажух здымала. Але не дужа думалі пра гэта — ці мала чаго ёй хочацца сядзець у кажуху: можа перамерзла, дык холадна.

На тым Додавы запоіны і скончыліся. А Лукірка стала пасля гэтага, як бачыш, Додзіхаю, а Стопіха — Стопіхаю...

Дода ўжо схаваўся ў Нікіпаравым двары. Ужо чуваць адтуль яго голас:

— Ты што, Нікіпар, тут ужо і начаваць будзеш? Усё сякераю ляскае, усё двор свой абтыкае, круглы робіць. Пэўне, баішся, каб Дар'я на двары не прастудзілася...

* * *

А вунь па вуліцы паволі пасунулася вялізная, як воз, ношка з сенам. За ёю не відно ні галавы, ні рук, ні спіны — толькі адны ногі. Але нават і па іх кожны зубравец пазнае, што гэта пайшоў дзядзька Сашта,— вельмі ж

у яго свая, адметная хада. Цікава, няўжо ў яго так рана, у самай сярэдзіне зімы, скончылася сена і ў пуні стала вельмі ж прасторна? Не можа быць. Гэта ён хутчэй за ўсё ўбачыў, што да вясны не дацягне нават і са струшанкаю (а вясною таго сена не дакупішся!), і рашыў цяпер спакваля папаўняць свае запасы.

Насустрач яму грукоча трактар. Дзядзька Сашта саступіў з дарогі ў снег і чакае, калі той праедзе. А трактар едзе павольна — не спяшаецца.

Можна было б найсці крыху хутчэй, дагнаць дзядзьку Сашту і пра ўсё распытаць. Але ён ужо мінуў нашу хату, зайшоў ужо за Лахмыдаву. Далекавата даганяць.

А то я ўяўляю, як бы ён спакойна павярнуўся да мяне, павярнуўся б з сенам, а потым паціху, крыху сагнуўшыся набок, спусціў бы рэзгіны на снег, узняў бы свае добрыя, сур'ёзныя вочы, у якіх (гэтага ніяк не схаваеш) так і скачуць вясёлыя іскрынкі-чорцікі, што толькі таго і чакаюць, каб рассмяшыць цябе:

— Здароў, мінчанін! А я толькі ўсё думаю, у каго б спытаць. Не памятаю, хто гэта прыязджаў з горада, дык казаў, што там дактары злуюцца, што іх часта без патрэбы выклікаюць старыя пенсіянеры. Скажам, вось такая старая, як Тарасоўка, выкліча сярод ночы машыну з доктарам і кажа: «Доктар, я хачу ў вас спытацца, на якім баку лепей спаць — на правым ці на левым?» А іншыя, кажуць, у горадзе вельмі баяцца ўсяго, нават у сваіх кватэрах. Не памятаю, хто гэта расказваў, як у адной сям'і на кватэры жыў. Кажа, званілі ім рэдка, але ўжо калі пазвоняць вечарам, дык у хаце, не дай ты бог, які перапалох узнімецца: загудуць усе, як патрывожаныя пчолы ў вуллі. «Ай-яй-яй, а хто ж гэта ідзе, ай-яй-яй, а хто пойдзе адчыняць яму, ай-яй-яй, што ж гэта цяпер будзе!» Як не праўленне цэлае збіраюць, каб вырашыць, каму ісці адчыняць завалы, зашчапкі ды замкі розныя. Адчыняць — а гэта ўсяго толькі іхняя суседка пазваніла. «Ці можна, кажа, у вас пасядзець, пагаманіць, а то нешта адной сумна стала». А ў нас што — заходзь любы ў хату, заходзь ці днём, ці вечарам — ніхто не баіцца, ніхто не зашчапляе дзвярэй. Наадварот, чужому чалавеку рады. А калі ў хаце нікога няма, тады дзверы будуць трэскаю заторкнуты ці галлець да іх прыслонены. Праўда, і ў нас пачынаюць ужо трохі завалы ў моду ўваходзіць: разумееш, адзін багаты стаў, баіцца, каб грошы не пакралі, а другі тэлевізар купіў, дык баіцца, каб у хаце не наслядзілі...

Дзядзька Сашта адразу ж забывае, што спачатку яму хацелася пра штосьці спытацца. А запытальную форму ён выбраў таму, што з яе лягчэй пачынаць любую размову. Для яго перш-наперш важна расказаць, што сам ведае, а тады, пасля ўжо, і цябе распытаць.

— Слухай, а ці праўда, што пчалаводы, бывае, ставяць каля сваіх вулляў місачку з цукрам, а туды падліваюць гарэлкі. Пчолы нап'юцца, звіняць, шумяць тады, нібыта наш чалавечы «Шумеў камыш» пяюць. І, галоўнае, такія смелыя робяцца: ляцяць у суседаў вулей і ўсіх пчол там наразганяюць — паспрабуй спраўся з п'янымі! А яны потым увесь мёд у свой вулей панераношваюць.

Расказваў ён ужо мне, як маладыя настаўнікі куплялі карову:

— Спадабалася яна ім — лялька, а не карова. Грошы заплацілі. А я і кажу ім жартам: «А вы ёй у рот глядзелі? У яе ж ужо і зубоў нават цэлага раду няма». Пагледзелі яны — і праўда няма. Які вэрхал справілі, не прывядзі ты бог! Аддавай нашы грошы назад, ды і ўсё. Яны ж не ведалі, што ў кароў ніколі не бывае верхніх зубоў.

Расказваў, як Рыбак купіў быў яшчэ да вайны веласіпед. Я і сам памятаю, як ён адзін на ўсю вёску вечарамі вучыўся на ім ездзіць.

— Ведаеш, Рыбачыха хацела карову купіць. А ён сваё гне — толькі «лісапету». «Гары ты гарам, злыдзень,— раззлавалася жонка,— купляй ужо лісапету, каб ты хваробу сабе купіў». Ён і купіў. Але гэтая «лісапета» нешта вельмі часта ў яго псулася: то цэпка зваліцца, то штаны ўкруціць. Калі ні ідзеш, а ён усё з гэтаю «лісапетаю» возіцца. Спытаеш: «Грыша, што ты робіш?» А ён і адказвае: «Што, хіба аслеп? Не бачыш — карову даю...»

Але любіць ён не толькі расказваць. Любіць і слухаць. Калі б дагнаў дзядзьку Сашту, пра што б я мог яму расказаць? Ён жа любіць нешта смешнае, незвычайнае. Ага, вось, скажам, пра тое, як мне давялося наведаць турму — дзякуй богу, экскурсантам! Памятаю, як мяне здзівіла, што там ёсць свае падхалімы, свае прыстасаванцы. Разумееце, цікава бачыць забойцу і падхаліма ў адной асобе або злодзея — найлепшага спевака ў турэмным хоры. Цікава было слухаць, калі начальнік атрада дакараў зладзеяў, забойцаў, праїдзісветаў за тое, што тыя бачылі, як адзін зняволены закурыў не там, дзе можна, але ніводзін не сказаў пра гэта сваім начальніку. Ён звяртаўся да іх

сумлення. І потым жартаваў, што самыя лепшыя падхалімы выходзяць тут чамусьці з забойцаў.

У турме людзі раскрываюцца да канца — тут жа кожны навідавоку. Нейкі былы кіраўнік з нашага рыбнага ўпраўлення пабіўся нават са сваім сябрам за тое, што таму далі крыху большы кавалачак селядца.

З цікавасцю пагаварыў я там з адным не вельмі старым, але ўжо і не маладым чалавекам. Мілы, задушэўны дзядзька. Жартаўнік! Нават здзіўляешся, як ён сюды трапіў,— ці не памылка гэта? Але не, усё правільна — ніякай памылкі няма. І трапляе сюды ён вельмі часта.

На гэты раз усё было так. У райцэнтры на базары стаяла машына. Грузавая. Каля яе тапталася многа жанчын: сонца ўжо нізка, і ім трэба хутчэй спяшацца ў свае вёскі. Ён адразу скеміў, што трэба рабіць. Падышоў. Пабухаў ботам па адным коле, па другім, з заклапочаным выглядам паглядзеў пад машыну, а тады ўжо спытаўся: «Што, кабеты, ехаць хочаце?» — «Ага, сынок, хочам».— «То сядайце, зараз паедзем». Бабкі загалакалі, як тыя гусі, усе разам, залопалі сваімі спадніцамі ды андаракамі, зашкрабалі кашолкамі: абляпіўшы з усіх бакоў барты машыны, яны няўмела драбаліся ў кузаў. Ён таго-сяго падсадзіў, таму-сяму кашолку падаў. А потым кажа — і зноў спакойна так: «А цяпер давайце разлічымся». Бабкі павымалі са сваіх схоў рублі і аддалі яму. «Ну, добра. Пасядзіце крыху — я пайду толькі папярос куплю, і паедзем». Бабкі сядзелі-сядзелі, чакалі-чакалі, а яго ўсё няма. Нарэшце прыходзіць шафёр. Толькі не той, а сапраўдны: ён у сталоўцы палуднаваў.

Не, пра гэта я ўжо, мусіць, расказваў дзядзьку Сашту.

Тады можна было, скажам, успомніць, як нам з Анатолем Клышкам надарылася пабываць на экскурсіі ў Жыровіцкім манастыры. Гаваркі, разумны манах цудоўна выконваў ролю гіда. Ён паказаў нам і зімовы, і летні храм, паказаў келлі, расказаў, чым яны, манахі, харчуюцца тут і што ім забаронена есці, звадзіў на манастырскі прысядзібны ўчастак, дзе з гонарам паказваў плён працы сваёй, скардзіўся, што ім забаранілі хадзіць на могілкі з харугвамі... А потым па-змоўніцку запытаўся: «Ці хочаце святой вады напіцца?» Дзіва што! А хто гэта адмовіцца ад такой нечаканкі? «Тады пайшлі за мною!» І мы паслухмяна патэпалі за ім, думаючы пра залатую пасудзіну, дзе захоўваецца гэтая святая вада, пра залатыя каўшы, з якіх мы будзем піць яе. А манах прывёў нас да звычайнага

ацынкаванага бачка, якія раней стаялі ўсюды на невялічкіх станцыях. Да бачка тоўстым бразгатлівым ланцугом была прыкавана вялізная алюмініевая кварта. Добры манах зачэрпнуў нам «святой» вады, як кажуць, з контурам, і хоць піць нам не хацелася, мы выпілі па поўнай кварце і яшчэ пахвалілі гэты напітак — дзе там будзеш крыўдзіць добрага старога, які хацеў нам зрабіць такі сюрпрыз! Але потым, у келлях ужо, мы зразумелі, што не толькі святую ваду «даже монаси приемлют». Калі адзін з іх палез чагосьці за сваю тумбачку, то адтуль пачуўся такі прыгожы, пераліўны звон пустых бутэлек, які бывае на прыёмных пунктах пасуды...

Толькі не, гэта я, мусіць, таксама расказваў ужо дзядзьку Сашту. Нашы сустрэчы звычайна праходзяць так.

Ён мне:

— Слухай, ты не чуў, прыязджаў тут Даляй у водпуск, дык не мог мыцца нашай калодзежнай вадою — увесь час сабе ў кварце саліў. Казаў, так прывык да марской салёнай вады, як некаторыя курцы да табакі. Ён жа марак, капітан ужо...

Я яму:

— А я быў у камандзіроўцы ў раёне, і вось што там мне ў міліцыі расказвалі. Прыходзіць да іх бабулька і просіць знайсці яе кватарантку, якая грошы ўкрала. Знайшлі кватарантку, знайшлі грошы — у хусцінку акуратненька на ўсе чатыры рагі завязаны. Пытаюць, ці ўсе грошы. «Не, дзеткі, не ўсе, бо ў мяне тужэй ражкі былі завязаны — ледзь сыходзіліся... А цяпер, бачыце, як слаба завязаны».

Ён мне:

— А ці чуў ты, што з нябожчыкам Бадрацом (хай яму добра ікнецца там) было ў голад. Квактуха, жонка яго, сала ў куфар замыкала. Адзін раз ноччу чуе Пятрок: захрапла жонка. Ён і пайшоў шукаць сала. І знайшоў. Укусіў, адцягнуў, каб перакусіць, а сала — лясь! — яму па губах. Што за навалач — не кусаецца, ды і ўсё. Аж да світання прамучыўся, і толькі пры святле разгледзеў, што гэта не сала, а мачалка.

Я яму:

— Кажуць, гэта ў Скрыні было. Нейкі аршанскі пан прыязджаў сюды на паляванне. І адзін раз мядзведзь яму адну палавіну мяккага месца выдраў. Але пан палявання не пакінуў. Аднойчы прывезлі яго ў Скрыню на санях. Мядзведзя з бярлогі падпялі. А той Міхайла ні на каго не

звярнуў увагі, хто і бліжэй стаяў, а адразу да папавых саней кінуўся: рашыў, мусіць, выправіць сваю памылку і другую палавіну выдраць.

Калі дзядзька Сашта пад'язджаў на санях са скрыняю, у якую збіралі попел, то пасля гэтага такі від транспарту ніхто і не называў інакш, як «таксі»; калі дзядзька Сашта бачыў, што камбайн жне яшчэ недаспелае жыта і зерне пачынае гарэць ужо нават у бункеры, то пасля гэты камбайн усе пачыналі зваць «хлебапякарняю».

У адну з пасляваенных вёснаў, калі многія мае аднавяскоўцы хадзілі паапухлыя з голаду, хату дзядзькі Сашты ў дадатак да ўсяго затапіла паводка. На калгасным двары ён расказваў пра гэтую бяду так:

— Ведаеце, сяджу гэта я на печы, грэюся. На хату ж не злезеш — вада па самыя вокны. І раптам бачу, вялізазны шчупак — плясь! — хвастом аб падаконнік ды як скокне — і адразу на стол. А потым так пачаў хвастом па тым стале біць — аж дошкі трашчаць: ведаеце, зноў хоча ў ваду. Бачу я, скора зваліцца ён са стала, а тады паспрабуй яго дагані. Я хуценька з печы пырца, ды да стала, ды шчупака таго за хвост — хапец! Вялізны, халера, быў — на ўсіх хапіла. Нават Valaдзюк прыйшоў, дык я і яму хваста добрага адрэзаў. І сам, бачыце, як паправіўся, які спраўны з твару стаў...

У дзядзькі Сашты тады твар сапраўды быў спраўны — поўненькі, кругленькі: вы ж яшчэ, мусіць, памятаеце, якімі паўпатварымі бываюць людзі, апухлыя ад голаду?

* * *

За мною на дарозе нешта зашамацела, зашкрэбалася. Я азірнуўся. У прыцемках убачыў малога хлапца, які, сагнуўшыся і сапучы, разганяў санкі, каб потым, паваліўшыся на іх, хоць крыху праехаць.

— Хто гэта тут мяне падбіць хоча?

Санкі праехалі паўз мяне і спыніліся: па свежым снезе яны далёка не паедуць — гэта табе не ў марозік! З санак падняўся мой пляменнік — увесь у ліпучым снезе і ўжо ўвесь мокры, як з вады выцягнуты.

— А, гэта ты, Дзімка?

Ён вяртаецца з коўзанак. І, мусіць, ужо адчувае і рыхтуецца да ўшчування бацькоў, якія будуць зноў сварыцца, што і сёння ён прыйшоў мокры, увесь у снезе. Мы ўсе не мінулі гэтага. Сёння праз гэта праходзяць нашы дзеці, а

потым не мінуць такога і іхнія дзеці, але, мусіць, заўсёды будзе так: бацькі будуць сварыцца, што дзеці вяртаюцца з коўзанак у снезе, а тыя ўсё роўна будуць прыходзіць дахаты белыя, як маленькія дзяды-марозы, мокрыя, як вадзянікі, але радасныя, як багі.

Памятаю, як Дзіма ўпершыню прыехаў у Мінск. Ён доўга азіраўся па баках: хацеў, мусіць, усё-такі разабрацца, куды ж, у які бок едуць машыны, а потым, убачыўшы каміны трактарнага завода, спытаў у бацькі:

— Тата, а чаму гэта са слупоў дым ідзе?

І памятаю, як мой сын, з якім мы кожную нядзелю гулялі ў парку, прыехаўшы да бабулі і ўпершыню трапіўшы ў лес, доўга хадзіў між дрэў, усё прыглядаўся — нечага шукаў. А не знайшоўшы, здзівіўся і спытаў:

— Тата, а дзе ж тут лаўкі?

Ён прывык да парку — акультуранага лесу — таму і сапраўдны лес спачатку не мог прыняць без лавак.

Гарадскія дзеці, трапіўшы ў лес і захацеўшы справіць невялікую патрэбу, доўга шукаюць такога, як у парку, туалета. А збіраючы суніцы ці маліну, дапытваюцца ў бацькоў, колькі каштуе тут шклянка ягад. Ягады прыносяць ім заўсёды з базару, і таму для іх ніяк незразумела, чаму тут ягады можна есці, не плоцячы грошай. Яны ўсё разумеюць па-свойму. Ім абавязкова трэба ведаць, ці балела цару, калі яго скідвалі з трона (а як жа — з вышыні і аб паркет), ці холадна зімою ножкам дрэў (яны ж стаяць у снезе, у мёрзлай зямлі).

Дзе ты, мой непасрэдны свет высокай-высокай травы, далёкага неба і вельмі блізкіх кузюрак?!

Там трава настолькі высокая, што ты хаваешся ў ёй з галавою і, каб убачыць, куды адышлася маці, узнімаешся на дыбачкі, а мяцёлкі слёзак і цімафееўкі, таўкачыкі трыпутніку і шчаўлюку, чырвоныя, вялізныя мячыкі канюшыны, нагрэтыя сонцам, прыемна так казычуць твар, пакідаючы надоўга пах пылку, мёду, зялепіва і цеплыні.

Там далёкае неба здаецца куды большым, бо кругагляд у нас яшчэ вельмі малы (толькі тое, што мы можам разгледзець з нейкай паўмятровай вышыні), а таму неба займае ў дзяцінстве ўсё наваколле: куды ні зірнеш — толькі неба, неба, неба...

Там вельмі ж ужо блізка мы стаім да кузюрак, і нам не трэба нагінацца, каб убачыць іх жыццё — паспешлівае і хапатлівае, як і ў людзей: мы стаім побач з імі і можам радавацца кожнай іхняй, нават маленькай, радасці (глядзі

ты — такую ігліцу ўдалося падняць мурашцы!) і засмучацца кожнай няўдачай (божая кароўка ўпала з ліста на спіну — трэба ёй дапамагчы перавярнуцца!). Бо тут мы ўсе жыхары аднаго непаўторнага свету, імя якому — дзяцінства.

І дзе б мы ні былі, якія б краіны нас ні паклікалі, мы ўсё роўна будзем сніць адну-адзіную дарогу, якая вяртае нас у гэты непаўторны свет, якая ласкава так вядзе нас да нашай вёскі, да нашай хаты, да нашай калакалушыны. У свет высокай травы, далёкага неба і блізкіх-блізкіх кузюрак...

* * *

Роўненька, нібы салдаты ў страі, стаяць па ўсёй вуліцы слупы электраліній. Прагінаюцца ад снегу правады. А вось тут снег з іх абтрэсены. Гэта, мусіць, чародка вераб'ёў, што мітуслівa корпалася ў снезе, шукаючы чаго-небудзь перакусіць, спалохана ўзляцела перад самым носам у каня і ўселася на правады.

Ва ўсіх хатах зырка гараць лямпачкі Ільіча. Снапы святла вырываюцца з вокан і, нібы пражэктары неба, асвятляюць вуліцу.

— Добры вечар! Чаму гэта ты ў водпуск зімою надумаўся ісці?

— Ды не, Міця, проста мне захацелася паглядзець на зімовыя Зубрэвічы.

— А я Сямёна Матрункіна праводзіў. Ён жа, ты ж, можа, ведаеш, жыве цяпер у Вярхоўі — у прымы туды зайшоў! Ваду, казаў, штодзень посіць, але вось кошку на «вы», як гэта ад прымакоў патрабуецца, толькі па святах называе.

З Ягоравым Міцем мы аднагодкі. У нас усё было агульнае: і цацкі, і гульні, і бойкі, і казкі, і школа. Цяпер ён — калгасны шафёр, у яго трое дзяцей. Сёння Міця — ужо дзядзька Міця.

Вось так незаўважна становімся мы дзядзькамі, хоць усё яшчэ, нават на чацвёртым дзесятку, цешым сябе развагаманнямі пра сваю маладосць і думаем пра сябе толькі як пра юнакоў. І таму, калі нас называюць «дзядзькам», мы ніякавата азіраемся — спяшаемся падумаць, што гэта не да нас звяртаюцца, а калі ў чарзе дзяўчаты кажуць, што стаяць вось за гэтым мужчынам,— упэўнена шукаем мужчыну: ён жа абавязкова павінен быць намнога старэйшы

ад нас. Нашы сябры па школе, па універсітэту незаўважна вырастаюць у кіраўнікоў, узначальваюць установы, а заадно аўтаматычна робяцца Віктарамі Андрэевічамі, Юрыямі Мікалаевічамі, Леанідамі Іванавічамі. І нам пры выпадковых сустрэчах бывае цяжкавата. Скажам, у Юрыя Мікалаевіча ідзе нейкая нарада, і, каб не падарваць яго аўтарытэту, нам трэба назваць яго не толькі па імені, але не забыцца і імя па бацьку — так жа яго называюць нават сівыя яго падначаленыя. Але зрабіць гэтага мы не можам, бо ведаем сваіх сяброў толькі як Юркаў, Віцькаў ды Лёняў...

Вось так, дзядзька Міця. Мы асабліва не заўважаем бегу часу і ўсё хочам прымірыць нас ранейшых з намі цяперашнімі. Памятаеш, як адзін час нам вельмі ж добра было гуляць з Сямёнам Матрункіным, якога ты толькі што прагулядзіў: мы гулялі ў хованкі, у жмуркі, у фанты, бегалі, мітусіліся, нават спрабавалі курыць. І не адчувалі, што ён гадоў на пяць старэйшы за нас. І раптам нам стала сумна: Сямён пайшоў у армію. Як мы чакалі яго вяртання! Як мы марылі, што нашы старыя гульні вернуцца зноў, і ўжо загадзя радаваліся той шумнай весялосці, якая таксама вернецца. І вось Сямён прыйшоў з арміі.

Мы ўвесь час раўнавалі яго да радні, якая доўга частавала Сямёна самагонкаю, запрашала ў госці, і цярпліва чакалі заканчэння гэтых афіцыйных прыёмаў. Нам карцела астацца з Сямёнам сам-насам. Нарэшце нам удалося зацягнуць яго ў «блыхарку», якая раней аж ходарам хадзіла ад нашага галасу. Паспрабавалі гуляць у фанты. Не, нешта не тое... Хоць мы і стараліся ўсё рабіць, як і раней. Паспрабавалі аднавіць нашы вясёлыя хованкі. Не, нецікава... Хоць мы і стараліся крычаць нават болей, як раней. Згарнулі па вялікай цыгарцы, селі на лаўцы, зацягнуліся — не, не так смачна, як раней. І памятаю, тады нейкі цень шкадавання, цень нечага назаўсёды страчанага прабег між намі. Гаворка таксама не клеілася. Сямён, памаўчаўшы, сказаў: «Пойдзем, хлопцы, на танцы да Сопі Цімкавай». Сказаў ён гэта няўпэўнена, бо, мусіць, разумеў, што нам яшчэ пакуль на танцах няма чаго рабіць...

Неяк на зімовых канікулах мне заманулася паездзіць па тых горах, дзе раней кіпела ў снежных віхурах наша дзяцінства. Я ўзяў у школе харошыя лыжы, бамбуковыя палкі, добра апрануўся. Спачатку паехаў за пагробні, з'ехаў з акопа. Памятаю, які цудоўны гэта быў трамплін, як далёка кідала — рэдка хто мог устаяць на нагах. З'е-

хаў — ціха, спакойна. Нават азірнуўся — ці той гэта трамплін. Не, трамплін той, акоп той. З'ехаў яшчэ раз — ніякай радасці. Ну, думаю, гэта тут. Паеду-такі я на ўзрэчча, на Самастаянаву гару.

Самастаянава гара заўсёды была абляплена, як мурашкамі, дзецьмі. З яе ехалі, сунуліся, куляліся, каціліся, на яе ўзбіраліся на лыжах, лезлі на каленцах, паўзлі на жываце задаволеныя, радасныя, чырванашчокія карапузы. Спортінвентар, так сказаць, таксама быў своеасаблівы: лыжы доўгія, з аполкаў, насы ледзь-ледзь загнутыя — так і дзяўбаліся ў снег; лыжы карацейшыя, з клёпак ад бочкі; канькі драўляныя, абагнутыя знізу палоскаю жалеза, выразанай з вядра; «каза» з толькі што падмарожаным пузам, якую ты, перавярнуўшы на рогі, вельмі ж ужо акуратненька паліваў на марозе вадою — каб, крый бог, не было гурбакоў... І, бывала, як толькі забярэшся на гару, зірнеш уніз — аж страшна робіцца: мамачкі, якая вышыня! Стаіш доўга, пакуль не адважышся адпіхнуцца кійкамі сам ці пакуль цябе нехта не падштурхне. Ну, тады ўжо трымайся! Паветра, як вата, набіваецца ў рот, вецер аж звініць, адкідваючы назад вушы шапкі. А калі ўжо не ўтрымаешся і гухнешся ў мяккі сумёт, узняўшы цэлае воблака снежнага пылу, то доўга будзеш выграбацца са снегу пад дружны рогат сяброў.

Я ўз'ехаў на Самастаянаву гару. Маленькі, заснежаны ўзгорак. Каб разагнацца, ад'ехаўся нават назад, аж да самага калгаснага саду. Разагнаўся і з'ехаў. Не, няма ўжо таго ветру, які звініць у завязках ад шапкі і набіваецца ў рот, як вата... Няма той вышыні, няма той хуткасці... І няма радасці, што з'ехаў і не ўпаў у сумёт...

Доўга не сустракаючыся са знаёмым, раптам пры сустрэчы заўважаеш, што ён пастарэў. Калі доўга не бачыў малога, адразу заўважыш, як ён вырас, змяніўся. Так і з гарою. Калі ты доўга з ёю не сябраваў, не імчаўся з яе на лыжах, яна здаецца ўсё той жа, якой ты яе запомніў у дзяцінстве. У цябе астаюцца ўсё тыя, ранейшыя прапорцыі: ты малы, а яна вялікая-вялікая. А вось пры новай сустрэчы раптам да болі ўражвае нечаканае адкрыццё: горы, як і людзі, старэюць і ніжэюць. Праўда, толькі адносна — у прапорцыях. І калі б ты заўсёды быў з імі, са сваімі гарамі, са сваім дзяцінствам, ты б не заўважыў гэтага, яны б для цябе заўсёды былі аднолькавыя. Не заўважыў бы, як не заўважаеш у штодзённай завірусе таго, як расце твой

сып і старэеш сам і як першыя белыя промні пракідаюцца ў валасах тваёй жонкі...

Можа, на той жа самай прычыне шчымліва хвалююць змены пор года. З прыходам вясны нам радасна, але і крышачку шкада аснежаных дрэў, завей, сумётаў. Мы радуемся лету, але пачынаем шкадаваць, што ўжо не будзе ў ім клейкіх маленечкіх макулінак-лісточкаў, што асцярожна вылузваюцца з пупышак. Прыходзіць восень — і нам ужо не стае птушак, красак, жытоў... А ў халодныя зімовыя дні мы будзем тужліва сумаваць па жоўтым, цёплым пажары лясоў, які астаўся палаць недзе там, у ласкавым бабіным леце...

Змена дня і ночы, развітанне яшчэ з адным старым годам... І тут ёсць сваё шчымлівае хваляванне. І ўжо, мусіць, зусім страшнавата чакаць змены стагоддзяў — не ўсім жа выпадае жыць у двух стагоддзях адразу!

Для нас з Міцем аднолькава канчаліся адны і пачыналіся другія поры гора. Скажам, яшчэ ўчора мы бегалі па гулкай грудзе вуліцы, грукаючы, здавалася, на ўсю вёску сваімі дзеравяшкамі, і слухалі, як у тым канцы тарабаняць калёсы па мёрзлых камлыжках, нібыта па бруку. А назаўтра прачыналіся і дзівіліся нейкай казачнай сцішанасці, заспакоенасці. Хата была ўжо асветлена роўным белым святлом, якое пасля цемені апошніх дзён восені аж кідалася ў вочы. Па вуліцы ледзь чутна слізгалі сані, галасы людзей таксама гучалі неяк цішэй — здавалася, людзі гавораць пошапкам. А ўсё наваколле, як глянеш у акно, выглядала святочным сталом, які заслапы бялюткім-бялюткім абрусам. Значыць, пакуль мы спалі, да нас у Зубрэвічы прыйшла, нарэшце,

## *зіма*

Дзяцей чамусьці, як і тых дрэнных гаспадарнікаў, яна часцей за ўсё заставала знянацку. Мы прынцыпова недаацэньвалі вядомай прымаўкі: «Рыхтуй сані летам, а калёсы — зімою», таму самы напружаны час прыходзіў з першым снегам: трэба было адрамантаваць альбо зрабіць новыя і санкі, і канькі, і лыжы, і «казу»...

Зіма была таксама жаданай парою казак. У гэты час меншала работы ў маёй бабкі Васюты, і мы з Міцем доўга паддобрываліся да яе, пакуль, нарэшце, не чулі: «Ну, добра, слухайце...» Мы забіраліся з ёю на печ і ціхенька, каб не збунтаваць, падарожнічалі па невядомых краінах,

радаваліся за асілкаў, бралі ўдзел у іхніх бойках са страшыдламі, спрабавалі нават падымаць цяжкую булаву. Бабка Васюта была нашым няспешным гідам па гэтай непаўторнай краіне казак. Мы слухаліся яе заўсёды, а калі ўсё ж парушалі гэты закон, бабка Васюта пакідала нас без казак. Гэта было вялікім пакараннем, бо патрабавалася потым некалькі дзён угавораў і задобрванняў, пакуль зноў вярталася яе былая прыхільнасць.

Гэта з яе казак прыходзілі да нас упершыню мудрыя думы народа. Наш народ сваімі казкамі, прымаўкамі, прыкметамі заўсёды вучыў людзей быць добрымі. А тое, што ведаў народ, пераказвала сваёю нетаропкаю гаворкаю бабуля:

— Ну, што языкі павысалаплівалі? Ніколі нікому язык не паказвайце. А то жыў даўней у Зубрэвічах такі чалавек. Як малы быў, усё язык людзям паказваў. І дарослы стаў, а язык у роце не месціўся. Усё вісіць і пыл з усёй вуліцы змятае. А як памёр, дык яго закапалі, а з магілкі язык усё роўна тырчыць. Што ні рабілі, што ні прыдумвалі — нічога не дапамагло.

— Ну, што, накольнікі, недзе ўжо гняздо разбурылі? Зараз жа занясіце яйкі і ў гняздо пакладзіце. Бачыце, якія раны шэрыя? Вось і вас, калі не пакладзяце яйкі, такое рабацінне паабсядзе. Усе адразу ўбачаць, што вы гнёзды разбураеце...

Бабка Васюта вучыла нас ніколі не пускаць струмень у раку — бо тады памрэ той, каго ты вельмі-вельмі любіш; на вялікдзень мыцца з кварты, дзе ляжыць чырвонае яечка,— каб твар быў чырвоненькі, здаровенькі; прыглядацца, як ты ўпершыню бачыш бусла: калі ён ляціць — значыць, ты пяройдзеш у наступны клас, калі стаіць — то засядзеш яшчэ на год.

Зімою ў нашай хаце было вельмі холадна. Хата старая, дзіравая, як рэшата (мужчыны ж няма), таму нават невялічкі вецер і маленькі мароз дужа выстуджвалі яе, не звяртаючы ўвагі на тое, што наша ласкавая печ з усяе сілы старалася хоць трохі папраўціць становішча і абагрэць нас, дзяцей: праз нейкую гадзіну пасля таго, як закладалі юшку, у хаце ўжо зноў было холадна, як у лядоўні,— хоць ты ваўкоў ганяй. Вокны так замуроўваліся, што ў хаце рабілася цёмна нават у сонечныя дні.

І таму я любіў гуляць вечарам у Міці. У іх вокны былі заўсёды адтаўшы, у хаце — цёпла. Пасярод хаты задумліва гаварыла сама з сабою невялічкая жалезная печачка,

з якой па склёнах прасочваўся дымок. Які ён быў прыемны, гэты дымок! Вельмі цікава мне было глядзець, як белым пушыстым сабачкам у расчыненыя дзверы ўбягаў з сянец мароз і тут жа, у парозе, рассейваўся, адчуўшы цеплыню печачкі, і знікаў, чапляючыся за вілачнікі, венікі, цэбры.

І як хацелася, каб вечар ніколі не канчаўся, каб не трэба было пакідаць гэтую гаваркую печачку і гэты прыемны пах дымку, на які чамусьці злаваліся Міцевы бацькі.

Потым пад вясёлы перазвон капяжоў прыходзіла

### *вясна*

Яна прыносіла заўсёды свой мікраклімат. З паўднёвага, сонечнага боку хаты капяжы аж заходзяцца ад сонца і цеплыні, прызба адтала — на ёй можна пасядзець, пагрэцца, нават зняць шапку і расшпіліць кажух. А на паўночным баку капяжы аж сцяліся ад марозу, там яшчэ гурбамі ляжыць снег, а зіма настойліва лезе пад шапку — шукае твае вушы. Гэта трохі пасля вада пойдзе пад снегам, і тады ўжо збоч дарогі трэба ступаць асцярожна — так і глядзі, ускочыш у ваду па самыя калені. Потым загамоняць ручаі: на ноч яны будуць перасыхаць, як, скажам, горныя рэкі, калі няма ў гарах дажджоў, а раніцою прачынацца і паціху-паціху запаўняць свае рэчышчы — аж пакуль не загамоняць сапраўдныя віры. А пасля ўжо разыдзецца і Вуллянка. Яна робіцца шырокай, сапраўднай ракою, не месціцца нават у сваіх берагах і залівае луг па самыя акопы. Яна цэлы дзень шуміць, бурліць, на штосьці злуецца пад зарэчанскім мостам і не супакойваецца нават на ноч. І тады, засынаючы, усё яшчэ ўслухоўваешся, як яна варочаецца ў берагах, і імкнешся зразумець, што Вулляпка хоча сказаць і на каго яна так раззлавалася, разбушавалася...

А як толькі сонца згоніць снег з высокіх лапінак на лагу, яны становяцца нашымі стадыёнамі.

Мы гуляем там у лапту, у масла, у гарадкі, і ўжо многа даводзіцца накрычацца маці ці бацьку, пакуль даклічуцца нас палуднаваць ці вячэраць. У нас сваё вымярэнне часу — паставіў на палец вялізны кіёк і лічы, пакуль не ўпадзе: «Калечына-малечына, колькі гадзін да вечара — раз, два, тры...» Колькі налічыў, столькі і ёсць. І чаго там маці крычыць, што позна ўжо, калі да вечара яшчэ па «калечыне-малечыне» цэлыя тры гадзіны! Ды і дзе там пойдзеш вячэраць, калі ў прыцемках сама пачынаюць лятаць хру-

шчы, ад іх аж гудуць кроны дрэў, і варта толькі лёгенька натрэсці бярозку, як з яе зашпокаюць, як пераспелыя жалуды, хрушчы. Дзе там пойдзеш вячэраць, калі цяпер толькі што пачынаюць збірацца на «вішні» хлопцы і дзяўчаты. Вось яны зараз пасядуць на бярвенне, а потым дзяўчаты нераспяваюць многа песень, а хлопцы параскажуць столькі цікавага і смешнага. Аж да поўначы будуць перакатвацца з аднаго ў другі канец вёскі песні, аж да поўначы не будзе сціхаць малады смех. Пасля ўжо ўсё, здаецца, супакойваецца. Але гэта сапраўды толькі здаецца. На кожнай лавачцы аж да самай раніцы будзе чуваць сцішаны шэпт, які перапыняецца хіба што толькі пацалункамі ці выпадкова ўзрываецца смехам — прыглушаным, стрыманым, радасным.

А над сцішанымі Зубрэвічамі будзе трымцець цішыня цёплай вясновай ночы — з поўняю, з пахамі маладой травы і лісця. З пахам нядаўняга снегу, які яшчэ не паспеў вывстрыцца. З новымі пахамі, якія здалёку напамінаюць нам пра

## *лета*

Цёплы, спорны летні дождж. Для кожнай хаты ў яго свая, адметная мелодыя. У нас ён пацiху шапоча па зялёнай ад старасці страсе — нібы шукае штосьці ў саломе. Услухаешся, закрыўшы вочы,— здаецца, шумяць над хатаю вяршаліны дрэў. І толькі ў сенцах гулкае лопанне кропель, якія праз дзіравую страху падаюць на дошкі і па-свойму інструментуюць гэтую мелодыю, зноў напамінае пра дождж.

Для Міцевай хаты мелодыя дажджу была іншая. Дах у іх быў з гонты, і таму кроплі, падаючы, гулка лопаліся. Уявіце сабе, як лапоча дах, калі на ім адразу грымяць мільёны маленькіх, большанькіх і нават вялікіх выбухаў! А мы з Міцем любілі ў такі час па стромкай лесвіцы забірацца на гарышча, дзе гэтае лапатанне адбівалася кожным закуццем, драбілася на новыя сотні гукаў, дзе кроплі барабанілі як не над самым вухам.

Злазілі мы ўніз быццам аглушаныя, а зайшоўшы ў хату, стараліся яшчэ больш прытварыцца, што нічога не чуем.

Для некаторых хат барабанілі над акном начоўкі, пастаўленыя над канеж: дажджавой жа вадою вельмі добра мыць галаву. Некаторыя стрэхі стаялі ледзь не сухія —

над імі шчодра, нібыта полаг, раскінулі свае кроны дрэвы, і кроплі, не дайшоўшы да страхі, разбіваліся аб лісце і асыпаліся незаўважнымі пырскамі.

Лета для мяне яшчэ там, у дзяцінстве, назаўсёды прапахла альховай карою, з якой мы рабілі лубкі для ягад; суніцамі, малінаю ды чарніцамі, якімі пахлі нашы рукі, вусны і нават шапкі, у якіх назаўсёды аставаліся пачарнелыя крапінкі ад ягад: калі мы траплялі на ягадную паляну, а браць болей не было куды, добрымі кошыкамі рабіліся тады гэтыя шапкі, а для грыбоў — сарочкі з завязанымі рукавамі. Лета пахне для мяне печанымі на кастры каласамі, у якіх зерне яшчэ мяккае і салодкае; свежым сенам, якое яшчэ зусім нядаўна было травою і яшчэ не паспела ў пунях запыліцца.

Лета — гэта ціхая паляна ў лесе, уся прагрэтая паўдзённым сонцам. Ты ляжыш на імху ці на мяккайігліцы, заклаўшы за галаву рукі, і чуеш, як крэкча ля самага твайго вуха мурашка, выцягваючы з-пад тваёй галавы ігліцу і потым перацягваючы яе праз вялікую перашкоду — доўжанькі сучок. Ты глядзіш, як высока-высока ўгары абмятаюць неба пышныя кроны сосnаў. А над табою зацята лётае і звініць-звініць, то адлятаючыся, то падлятаючы зусім блізка, авадзень — дзыс-дзыс-дзыс, дзыс-дзыс-дзыс... А навокал, у парным паветры паляны, стаіць густы настой жывіцы, разагрэтай шчодрым летнім сонцам.

Лета — гэта воз казытлівага непаслухмянага сена, збольшага ўвязаны і ўціснуты жэрдзю: ехаць жа недалёка, неяк давязём,— а на гэтай высокай і няўстойлівай капе-вышаконе, моцна ўчапіўшыся за вяроўкі,— ты. Ты адчуваеш нават самую маленькую няроўнасць каляіны, адчуваеш кожны невялічкі каменьчык, які трапляе пад колы, бо воз пачынае тады вельмі ж ужо шырока калыхацца, гайдацца — так і чакай, што вось-вось абернецца. І як жа замірае ад страху сэрца (а можа нават і не паспееш спалохацца), калі воз, вельмі ж ужо нізка нахіліўшыся, не зможа зноў цвёрда стаць на ўсе чатыры колы. Апамятаешся ўжо толькі на зямлі — засыпаны, прыціснуты духмяным сенам.

Лета — гэта яшчэ і пах свежай, падварушанай зямлі. Ты ідзеш па баразёнцы за акучнікам, моцна трымаючы яго за ручкі, а твае паабдзіраныя, пасунутыя конскімі капытамі ногі радуюцца халаднаватаму, мяккаму дотыку зямлі. А зямля ў дзяцінстве лечыць усё: залепленыя ёю хутка загойваюцца і праколы, і парэзы, і апёкі...

## *Восень*

падкрадвалася заўсёды ціха, як кошка. Спачатку заўважаеш, што пастухі не прыганяюць ужо кароў на абед: дзень стаў маленькі, ды і няма той спёкі, якая раней бывала ў поўдзень і якую лепей за ўсё каровам было перачакаць у хляве. А вечарам, услухоўваючыся ў дружны брэх сабак, заўважаеш, што ён робіцца ўсё гучнейшы: вечары на пачатку восені бываюць звонкія, гулкія і ў ядраным паветры ўсё вельмі далёка чуваць!

Потым заўважаеш, як пад цяжарам пладоў апусцілі на падпоры сваё зялёнае крылле сады — кожная яблыня выглядае квактухаю, якая захінае пісклятак ад дажджу. Сарвеш антонаўку, правядзеш па ёй даланёю, каб абцерці. Божа мой, як свежа яна зарыпіць,— здаецца, чуваць на ўвесь свет! Бывае, упадзіцца ў сады моцны вецер. Пашастае, паходзіць, паносіцца між яблынь. Выйдзеш ноччу на двор і адразу заўважаеш змену: раней было светла ад яблык уверсе, дзе кроны дрэў, а цяпер быццам нехта пераварнуў яблыні — яблыкаў аж бела на зямлі, а кроны нязвыкла палохаюць халоднаю, нейкай трагічнаю чарнатою.

Ды нават і без дапамогі ветру ў сады прыходзіць той час, калі дрэвы, вызваліўшы галіны з-пад цяжару, шумяць усё роўна невясёла, нібы сумуючы па яблыках, якія цяпер ляжаць на зямлі ў вялізных грудах. Пройдзе час, плады вывезуць з саду, і тады ён здасца яшчэ больш сумным. Зірнеш — і зрэдзь дзе ўбачыш адзінокі яблык, што блішчыць між лісця на апошнім сонцы. Ды хіба яшчэ вунь той, таксама адзінокі і хітраваты, што прыкрыўся лістам, ды так і астаўся на яблыні,— яго ж не адусюль відно.

Спачатку высока-высока ў небе з'яўляюцца шэрыя, нават адчуваеш — халаднаватыя ўжо! — воблакі, якія ў нас называюць шэрымі коньмі восені. Потым яны паступова зніжаюцца, пакуль імжою не павіснуць над самымі хатамі, над коньмі, якіх мы пасём, скажам, у Цітаўшчыне ці ў Лазняку. І якое збавенне ад гэтай назоллівай, падакучлівай морасі — вясёлае цяпельца, якое так і падміргвае табе, пазябламу смаркачу, сваім жыхлівым полымем! Каля агню — свае казкі, свае бойкі. Старэйшым хлопцам так і карціць звесці нас, малых, біцца: «Глядзі, які Міця моцны. Ты ж баішся нават пальцам яго крануць».— «А вот і не баюся — вот і зачаплю».— «Глядзі, Міця, ён жа табе вымазаў тваю паддзёўку — палец у яго быў у гразі». Вось

тут Міця ўжо і натапырыўся. «Глядзі, а Іван цябе не баіцца». Як гэта не баіцца? Трэба, каб баяўся! І бойка пачынаецца. Такія бойкі цягнуцца вельмі доўга, таму што хлопцы не даюць ім скончыцца. Самі ваякі даўно ўжо рады былі б заключыць мірнае пагадненне, але іх з усіх бакоў паддражніваюць, падбухторваюць: «Ой-ёй-ёй, як ён яго абадраў — увесь твар у крыві».— «Ай-яй-яй, а ў гэтага ўся штаніна падраная — а штаны ж такія новыя былі». І бойка, нібы касцёр, у які падкінулі сухіх сучкоў, усчынаецца з новаю сілаю.

А прычын звесці нас біцца ў большых хлопцаў было вельмі многа. Або самі закінуць шапку на дрэва, а скажуць, што гэта, напрыклад, Міця зрабіў, або расшчэпяць падэшву-дзеравяшку ў Міцевым чаравіку, забіваючы ў зямлю калок, каб навязаць каня, а чаравік потым пакладуць ля калка, на які навязаны мой конь...

Потым ты, размазваючы горкія слёзы крыўды, прытуляешся да цёплай конскай галавы, нібыта шукаеш нейкай спагады, а конь стаіць ціха — слухае цябе і глядзіць такімі вялізнымі і разумнымі вачыма, што ты патроху супакойваешся, упэўнены, што Клык цябе разумее, што ён таксама асуджае старэйшых «байбусаў». І неяк цёпла робіцца табе ад гэтай нечаканай супольнасці, ад гэтай новай, нікому, акрамя цябе, не вядомай тайны.

Коні для нас, вясковых дзяцей, былі такія ж знаёмыя, як і людзі. Мы добра ведалі іх характары, разумелі, што ім падабаецца і чаго кожны з іх не любіць. І таму нават па самым нязначным руху галавы, вуха ці хваста мы ведалі, што далей будзе рабіць Падрэз ці Шкворка.

А характары ў іх сапраўды былі розныя — у кожнага свой: аднаму не падабалася, калі да яго ідзеш з аброццю, другі хмыліўся, калі яго путаеш, а трэці аж закрываў ад асалоды вочы, калі яго ласкава гладзілі па зялёнай ад травы пысе.

Таму мяне неяк уразіла размова двух карэнных гараджан, якім толькі недзе на пятым дзесятку давялося «адкрываць» коней:

— А ведаеш, калі конь прыклаў вушы — значыць, ты яму не падабаешся. Уцякай, бо зараз брыкацца пачне.

І яны так радаваліся гэтаму адкрыццю, быццам бы разгадалі сакрэт невядомай для іх машыны...

Восень — гэта яшчэ школа, пачатак заняткаў. Устаеш раненька і выганяеш карову на паранкі: пастухі восенню гоняць у поле пазнавата, а таму трэба рагулю папасвіць

раніцою. Бегаеш босы па зябкай і густой восеньскай расе і ўсё пазіраеш: ці не ідуць ужо ў школу вярхоўцы ці зарэчанцы? І потым, прыгнаўшы карову дамоў, скідваеш абрэшаныя штаны, на калошыны якіх наліплі маленькія лісточкі, травінкі, пялёсткі позніх красак. Насуха выціраеш азалелыя ногі, абуваеш новыя, цёплыя, нядаўна купленыя чаравікі і, павесіўшы праз плячо палатняную сумку з кнігамі, важна ідзеш па вуліцы, загадзя адчуваючы, як незвычайна прыемна пахнуць пасля лета адрамантаваныя, чыстыя класы.

З якою ахвотаю садзішся рабіць першыя ўрокі! Раскладаеш на акне — шырокі падаконнік доўга быў для мяне пісьмовым сталом — новыя кнігі, новыя сшыткі (усё новае!) і садзішся на лаўку. Радуешся цеплыні падаконніка — ласкавае сонца на пачатку восені добра грэе; адчуваеш, як густыя промні ласкава торкаюцца ў твой нос, перабягаюць са шчакі на шчаку, забаўляюцца з валасамі... Побач лена, нібы засынаючы на зіму, гудзе муха: спрабуе пераадолець незразумелую перашкоду — балонку акна, праз якую і ўсё відно і не вылеціш...

Новыя кнігі і сшыткі прыходзілі да нас, праўда, потым, ужо ў старэйшых класах. А спачатку — адзін буквар на тры вёскі. І мы, не ведаючы яшчэ ўсіх літар і не ўмеючы пісаць, мусілі кожны дзень перапісваць урокі («уа — ау»), каб потым ужо вучыцца чытаць. А які экзатычны выгляд мелі нашы сшыткі! Мы самі рабілі іх са старых газет, са шпалераў, з лошчанай паперы, у якую сёння загортваецца масла, з рознакаляровых кавалкаў абгортачнай паперы... Даўкі, рэзкі пах мелу і наша бурае, падобнае на зямлю, чарніла, якое мы самі варылі з ваўчыных ягад — крушыннiку...

І для нас не было тут нічога дзіўнага. Так, як тады, у цяжкія пасляваенныя гады, не было дзіўна, што настаўніца (а гэтае званне ў вёсках заўсёды ставілася высока) хадзіла ў бурках, а не ў модных чаравічках. У той час, калі ўсе хадзілі босыя, гэта было нават нейкім шыкам: нашу настаўніцу таму і празвалі «Бýрак». А мы з Міцем, убачыўшы яшчэ здалёк, што яна ідзе па вуліцы, беглі насустрач, каб сказаць: «Добры дзень», а потым, пакружыўшы агародамі, зноў выскачыць у яе наперадзе і зноў сказаць: «Дзень добры!..»

Занятыя вучобаю, мы і не заўважалі, як з доўгага вясенне-летне-восеньскага адпачынку вяртаўся ў сваёй белай і цёплай шубе дзядзька Мароз...

* * *

А вось і яна — наша сяліба. Сюды засмучаныя і ўзрадаваныя, пакрыўджаныя і суцешаныя, заўсёды вярталіся мае продкі. Ішлі пехатою — і паслухмяна, даючы ім дарогу, рыпелі весніцы; ехалі на кані — і шырока расчыняліся вароты, запрашаючы ў круглы двор ці сані, ці плуг, ці воз дроў.

Круглы двор сялянскай сялібы заўсёды быў гасцінным месцам, дзе збіраліся вясковыя рамёствы, дзе таленавітыя рукі нашых прашчураў мудравалі тое, што неабходна гаспадарцы. Круглы двор — гэта і кузня, дзе можна навастрыць сякеру, назубіць серп; гэта і стальмашня, дзе робяцца драбіны для калёс, палазы для саней, абсада для вокан; гэта і бандарня, дзе нараджаецца бочка, каб саліць агуркі, дзяжа, каб сяляць хлеб, кадаўбец, каб трымаць у ім жыта; гэта і светлая майстэрня, дзе бацька, расчуліўшыся, з ласкаваю ўсмешкаю цэлага паўдня поркаецца каля ліповага палена, пакуль яно не зарадуецца прыгожаю, цудоўнаю цацкаю...

Хата — цэнтр круглага двара. Потым ужо, за ёю, ідуць хлявы, каморы, клеці, паветкі, яшчэ далей — лазня, гумно... І ўсё гэта з трох бакоў атуляе вялікі сад, вясною — белы ад кветак, восенню — белы ад пладоў, якія, здаецца, наскрозь прасвечвае сонца. Перад хатаю, ад вуліцы — звычайна невялікі гародчык, дзе жоўта ад вяргіняў, дзе буяюць бэз і калакалуша, дзе расце выносістая бярозка, у лісці якой, на ганачку шпакоўні, нібы той дзед на прызбе, кожную вясну сядзіць шпак і насвіствае сабе націшэньку, пераймаючы свіст людзей і птушак, думаючы пра нешта сваё.

А ў хаце — печ, гэтае ўгрэтае, цёплае гняздо, дзе ў лютыя зімовыя маразы збіраюцца ўсе: тут хапае месца і старым і малым. І нават кошка, якая, толькі што высунуўшыся ў сенцы, мільгатнём ускочыла на печ і соладка расцягнулася на чарэні. Тут жа стаіць і дзяжа, у якой падыходзіць заўтрашні хлеб, недзе ў кутку абсыхаюць валёнкі і буркі розных памераў, якія і заўтра будуць зноў спрачацца з марозам. На шастку вісяць пляцёнкі цыбулі і часнаку — каб, не дай бог, яны не захаладалі і не пайшлі потым на градах у стрэлкі...

Вось і яна, наша хата. Не, гэта ўжо не мая хата. Той, ранейшай, з павыскубленай ветрам страхою, з гнілымі вугламі, са сцяною, якая крута выперлася на хату, няма ўжо

даўно. Яна саступіла месца новай пяцісценцы, якая вось цяпер, у вечаровых прыцемках, так ужо весела запрашае ўсімі ярка асветленымі вокнамі. Праз вокны відно, што пасярод хаты стаіць стол, а на ім — усё, што яшчэ асталося ад кабана, што яшчэ не параскладзена па кублах. У акно другой хаты відно, як зырка паліцца ў печы — полымя яркім дрыготкім святлом чырваніць супрацьлеглую сцяну. А калі паліцца ў печы — значыць, на шырокай скварадзе сквірчыць свежына. Ля печы ходзіць сястра, апошнія ўказанні дае гаспадар, сястрын муж. Памагае парадчыць сала і цётка Саша.

— Добры вечар, цётка!

Як толькі я помню, вы заўсёды былі вось такою. Заўсёды завязаная пад бараду (ну якраз як ручнікі на нашых абразах!) хустка — ці мала чаго гаспадыні можа спатрэбіцца выбегчы ў хлеў ці ў сенцы. Я не помню, каб вы ішлі калі-небудзь з парожнімі рукамі. Вярталіся з лесу — заўсёды неслі на сабе цяжкую вязанку дроў (дзе там таго каня дапросішся!), палолі ячмень ці лён — неслі з поля мяшок травы...

Я добра памятаю, як забіралі паліцаі майго бацьку, цётчынага малодшага брата. Была самая вясна. Мы, дзеці, сядзелі на нашым бярвенні (бацька збіраўся ставіць новую хату і таму навазіў ужо многа лесу) і рабілі сабе свістулькі з вярбовых пруткоў — у галінах сама бушаваў сок, і таму кара з іх вельмі лёгка здымалася.

— Гляньце, па некага паліцаі ідуць!

Не памятаю, хто іх заўважыў першы. Толькі мы ўсе выбеглі на самую вуліцу — паглядзець, да каго яны пойдуць.

Паліцаі завярнулі да нас...

Пакуль яны рабілі вобыск, бацька стомлена сядзеў на табурэце і паступова аглядаў хату, нібы назаўсёды хацеў запомніць яе: бацькавы вочы, ласкава абмацаўшы кожны сучок на стале, зачапіўшыся за крук, на якім звычайна вісела калыска, пераводзілі позірк на вокны, затым на абразы ў куце, адкуль вельмі ж ужо абыякава глядзелі на хату багі, пасля ў апошні раз адчынялі клямку нашых дзвярэй... Сэрца, пэўна, вельмі добра ўсё адчувае: бацька, як я цяпер успамінаю яго ў той момант, ведаў, што яму не вярнуцца ў хату, якая памятае яго першы крык, дзіцячыя гульні, хлапечыя таямніцы і вясельныя песні, калі ён прывёз сюды з Тумініч усмешлівую Вулляну, маю маці...

— Ты ўжо глядзі тут, Вулляна, разам з Ліксашай дзя-

цей... — сказаў ён на развітанне і пайшоў наперадзе паліцаяў туды, дзе яго чакалі жудасныя дні гестапаўскіх катаванняў.

А праз нейкі тыдзень раніцою паліцаі прыехалі па маці. Яе не было ў хаце. Яна была ў полі — разбівала гной па сваёй палосцы, бо ўжо час быў сеяць. Яна прыбегла з поля і адразу ж кінулася да нас, быццам не ёй, а нам пагражала небяспека. Маці ўсё старалася нас, дзяцей, узяць адразу на рукі і ўсё цалавала, мітусілася, супакойвала, каб не плакалі:

— Супакойцеся, дзетачкі, не плачце, я ж хутка вярнуся — можа і сёння, а можа і заўтра. І тады мы з табою, Іванька, паедзем у Воршу і купім табе ножык складаны.

І ад таго, што маці сама не верыла сваім словам, слёзы, з якімі яна ўвесь час змагалася, не давалі ёй гаварыць.

Час для развітання ў нас быў. Паліцаі прынеслі з сабою бутлю самагонкі, прымусілі цётку засмажыць яечню і цяпер пілі, закусвалі, смяяліся — адным словам, весяліліся. Час ад часу злаваліся на нас: «Цішэй вы, парасяты! Верашчаць тут, ажно нячуцца — нават выпіць культурна не даюць!»

Паліцаі скончылі свой вясёлы банкет, запрэглі нашага каня ў калёсы, а маці ўсё ніяк не магла адысціся ад нас, выпусціць нас са сваіх абдымкаў.

— Ліксаша, Даніла прасіў нас з табою дзяцей глядзець, цяпер ужо глядзі пакуль што адна...

І паліцаі з п'янымі песнямі павезлі маці туды, адкуль яна ўжо ніколі не ўбачыла такой жаданай дарогі дадому.

А мы чакалі маці кожны дзень. Кожную раніцу я прачынаўся і, агледзеўшы хату, перш за ўсё пытаў:

— Ці прыйшла мама?

У вайну і пасля вайны ў нашых вёсках вельмі многа гадалі. Вайна параскідала людзей па свеце — бацька разлучыўся з дзецьмі, жонка з мужам, сын з маці. А ўсім вельмі хацелася калі не ўбачыць, дык хоць нешта ведаць пра сваіх родных. І людзі гадалі. Яны, як тапелец за саломінку, хапаліся нават за тую падманлівую надзею, якою дражнілі іх карты. Галадаючы самі, многа хлеба і сала прагадалі таксама мая цётка і старэйшая сястра Ніна. Многа радасных падзей прыносілі карты: яны абяцалі, што «чырвоная дама» і «бубновы кароль» хутка вернуцца.

Але маці і бацька так і не вярнуліся.

Памятаю, якія тужлівыя былі для мяне летнія надвячоркі, калі вярталіся з поля жанчыны. Усе беглі іх сустра-

каць. І толькі я адзін аставаўся каля рассыпаных палачак ці кінутай лапты — мне не было каго сустракаць. Гэта насля ўжо я прывык, што мне таксама ёсць каго сустрэць, і, узнімаючы пыл, праставаў туды, адкуль вярталіся жанчыны, а з імі — цётка Саша.

Усялякую бяду нельга перажыць ні ў якім уяўленні, якое б моцнае яно ні было. І той боль, што бывае толькі пры страце самага дарагога ў жыцці — бацькоўскай ласкі і пяшчоты, якая можа заключацца толькі ў адным замілаваным дотыку шурпатай бацькавай далоні да тваіх валасоў і ад якога радасна сцішваецца сэрца,— ты адчуваеш пэўна, толькі тады, калі зразумееш, што такі дотык ужо ніколі-ніколі не паўторыцца. Мае аднагодкі часам расказваюць, як ім крыўдна было глядзець, калі сіротам давалі ў школе на вялікай перамене кубак чаю, лустачку чорнага хлеба, намазанага павідлам. Але яшчэ цяжэй было, пягледзячы на голад, есці: дзеці добра ведалі, за што ім усё гэта даюць, і тая скібка хлеба не лезла ў галодны рот. І з якою радасцю аддалі б яны ўвесь гэты хлеб і павідла за адно толькі ласкавае слова «сынок!», і як бы памчаліся на гэты кліч, каб хутчэй узабрацца на матчыны рукі ці прытуліцца да калючай, няголенай бацькавай шчакі...

Цётка Саша замяніла нам маці і бацьку. Яна чакала, што хутка прыедуць і па нас, а таму, як толькі ў вёсцы з'яўляліся немцы (у Зубрэвічах яны не стаялі), цётка цалавала нас і гаварыла: «Дзетачкі, гэта прыехалі, мусіць, па нас ужо». Яна не адмовілася ад нас, не кінула нас, хоць гэта ёй і пагражала смерцю. Іншая сваячка, напрыклад, калі мая старэйшая сястра Ніна зайшла да яе папрасіць хоць якой парады, не пусціла яе нават на парог — маўляў, ідзі, а то падумаюць, што і я звязана з партызанамі, і маю сям'ю таксама расстраляюць. І дзіўна было б яе вінаваціць за гэта — яна, маці, таксама ратавала сваіх дзяцей...

Мусіць, на нашай яшчэ не зусім дасканалай зямлі існуе вельмі дасканалы закон раўнавагі. Каб ніколі зло не магло перамагчы дабро, на кожнага дрэннага чалавека нараджаецца ладны дзесятак добрых, шчырых, душэўных. Гэта, мусіць, дзейнічае ўсё той жа закон раўнавагі, які не дае, скажам, у адзін год нарадзіцца ва ўсім свеце толькі адным хлопчыкам ці адным дзяўчынкам.

Да гэтага дзесятка добрых і шчырых людзей належыць і мая цётка Саша. А можа нават і замяняе ўвесь дзесятак.

Яна рэдка калі садзілася за стол, не памаліўшыся наперадзе нашым абразам, якія віселі ў куце. Спачатку яна,

хаваючыся ад мяне і неяк трохі саромеючыся, станавілася перад абразамі і доўга нешта шаптала ім, то ўсміхаючыся, то прымаючы вельмі сур'ёзны выгляд — здавалася, што яна расказвае гэтым маўклівым субяседнікам, што так уважліва слухаюць яе, пра сваё жыццё ці пра нейкія апошнія зубрэвіцкія навіны: маўляў, гэты памёр, гэты нарадзіўся, а гэты на дзяды так напіўся, што на могілках і заначаваў... Потым, убачыўшы, што я не смяюся з яе «рэлігійнага пачуцця» і не імкнуся перавыхоўваць яе, цётка мяне болей ужо не саромелася. А як я мог перавыхоўваць яе і даказваць, што бога няма, калі бачыў, што цётка моліцца не таму міражнаму святому, за якога прымушаюць біць ілбы святары, а сваіму, канкрэтнаму, які заўсёды з ёю і імя якому — Дабрыня. А ў такога бога веру і я! Так, як веру ў танец сонца, і не толькі на вялікдзень, а пры кожным яго новым ускоце. І такой бяды, што гэта ўсяго толькі «нейкае змяшчэнне ранішніх паветраных пластоў ці своеасаблівасць праламлення ў чалавечым воку!» Галоўнае, што сонца на ўсходзе іграе, скача...

Веру я і ў магічную сілу цётчынага мяшэчка з нагрэтым ячменем, які няблага замяняў антыбіётыкі і, прыслонены да пятак, выганяў кашаль, прыкладзены да шыі, вылечваў горла, а сагрэўшы жывот — супакойваў адразу ўсе болі...

А цётчын агарод, які вельмі ж ужо мужна змагаўся з насляваенным голадам. Устанеш ранічою і на спяданне спяшаешся ў грады: за стол жа няма чаго садзіцца — на ім ужо даўно не было і макулінкі хлеба. А там ёсць чым паласавацца! Асцярожна рассунеш халаднаватае і яшчэ мокрае ад начной расы лісце агурэчніку, адшчыкнеш зялёны крамяны агурок, рукавом абатрэш з яго зямлю і чорныя, як мачыны, крапінкі і тут жа, зажмурыўшыся ад сонца, хрумстаеш яго, адчуваючы, як кропля расы скацілася на босыя ногі ці як загула ў жоўтых агурэчных кветках раняя пчала, што абрасіла крылле і цяпер чакае, калі яно высахне. Потым, сагнуўшы адну-другую галоўку маку, якія чамусьці здаваліся мне вельмі ж падобнымі на літару «о» з цітлам з царкоўнаславянскай кнігі, натрасеш з іх цэлую далонь чорненькіх мачын, усыплеш усё гэта ў рот і доўга-доўга смакуеш, стараючыся раскусіць кожнае зернетка. Пасля за зялёныя хвасты нацягаеш морквы, знойдзеш недзе ля хаты шкельца, сядзеш на ганку, угрэтым сонцам, і будзеш скрэбсці і есці не спяшаючыся моркву, думаючы, што на полудзень зноў варацца забеле-

ныя казіным малаком гарбузы, якія вупь, у градах, так ужо і паўзуць па ўзмежку і потым лезуць аж на самеські частакол.

Гэта ўжо будзе пасля, калі цётчын агарод убярэцца ў сілу. А на пачатку вясны, як толькі зганяла снег, мы, дзеці, высыпалі на поле. З кошыкамі і вёдрамі (нібы ў грыбы) ішлі мы выбіраць гнілую бульбу з непадсохлай яшчэ зямлі. Там, у гэтай глейкай твані, заставаліся то нашы бахілы, то старыя парваныя галёшы, то вялікі, не па назе, бурак... А здаралася, што, нібы ў балотнай дрыгве, завязаў па самы пуп і сам і выбіраўся на сушэйшае месца толькі з дапамогаю сяброў. Затое дадому цягнуў поўнае вядро бульбы — і сняданак, і полудзень, і вячэру адразу! Цётка распальвала ў печы, і ўжо па загнеце ўлагоджвала, сліжыла льняным семем скавараду старая і сухая подмазка, якая даўно ўжо забылася, як пахне сала ці здор.

А потым у алюмініевую міску ссоўваліся чорныя з белымі плямкамі крухмалу аладкі з гнілой бульбы. Якія яны былі смачныя, гэтыя аладкі! Іх трэба было есці адразу — пакуль цёплыя, бо калі яны астывалі, непрыемны пах сур'ёзна папамінаў, што бульба ўсю зіму праляжала ў зямлі, а не ў пограбе.

Стравы ў голад не ходзяць разам. Як толькі паспее адскочыць шчаўе на лузе ці крапіва пры плоце — можна варыць першыя стравы. Але як хочацца, каб да шчаўя ды хоць маленечкая лустачка хлеба! Потым, калі на лузе з'явяцца папкі канюшыны,— ёсць ужо хлеб, сяк-так зляплены з малюсенькіх зернетак канюшыны, высушаных на печы: яго ніяк не данясеш да рота — хлеб зноў рассыпаецца на зерні, якія, нібы шрот, дзяруць горла.

А калі даспявала ў калгасе жыта, галодныя людзі ішлі ноччу ў поле, рэзалі каласы, выжыналі лапікі ў жыце, хоць ведалі, што робяць блага і што, калі іх зловяць, будуць непрыемнасці. На поле ў гэты час назначаўся не адзін палявы вартаўнік — дзіўна нават цяпер успомніць, што поле, звычайнае жытняе поле, ахоўвалася, як той казачны сад з залатымі яблыкамі. Іванаў-царэвічаў лавілі, штрафавалі, сарамацілі, а яны ўсё роўна ішлі і зноў рэзалі каласы: голад перасільваў страх.

Па ўсіх беларускіх вёсках (і ў маіх Зубрэвічах таксама) з'явілася пасля вайны новая вячэрняя мелодыя: украдзеныя каласы і снапы трэба ж было неяк абмалаціць. Чалавек рассцілаў у сенцах ці ў пуні перабіранку, садзіў свой украдзены «пасад», зачыняўся і пачынаў працу: грук-

не адзін раз прапікам, пачакае крыху, а потым зноў — маўляў, ці мала што спатрэбілася яму направіць у гаспадарцы. І, крый божа, не думайце нават, што ён малоціць! Малоцяць жа (усе добра ведаюць!) у тры ці ў чатыры цапы. А так нешта забіваюць, падганяюць, насаджваюць...

У тыя цяжкія пасляваенныя гады вельмі многа ў нашых вёсках сядзела фінагентаў ды розных упаўнаважаных: краіна ж наша, разбураная і абрабаваная фашыстамі, галадала.

І я, убачыўшы, што па вуліцы ад хаты да хаты ходзяць гэтыя ахрыплыя ад крыку валачобнікі, не ішоў дадому, а стараўся дзе-небудзь затрымацца. Хадзілі яны часта, і таму я ведаў, як усё гэта бывае...

— Чуеш, не злуй нас лепей. Плаці нядоімку, а то апісваць будзем.

— Апісвайце сабе. Толькі што вы апісваць будзеце?! Можа, вось гэтыя гнілыя вуглы, гніллё гэта?!

— І хату апішам.

— Во-во, тады, можа, гэтым сіротам хоць новую пабудуеце.

— А што ў яе там у хляве ёсць?

І, убачыўшы ў хляве казу, радаваліся:

— Ага, казу апішам.

Але каза, апісаная і перапісаная ўжо многа разоў, усё роўна аставалася ў нашым хляве. Упаўнаважаныя, сярод якіх былі і мае настаўнікі, звярталіся і да мяне:

— Ты ж піянер, угавары сваю цётку заплаціць нядоімку.

Але я ведаў, што грошай у нас, як і хлеба, таксама няма. І таму дапамагчы ўпаўнаважаным я не мог, хоць яны і запрашалі мяне ў свае памочнікі, намякалі на маю дарослаць.

А пасля вайны дзеці вельмі рана станавіліся дарослымі. Яны рана замянялі сваіх бацькоў, што не вярнуліся з вайны,— і ў касе, і за плугам, і ў талацэ. Па радоўцы, якая вызначала вартаўніка вёскі (хто яго ведае, ад чаго трэба было вартаваць пасляваенную вёску — ці то ад зладзеяў, ці то ад пажараў), і я таксама, як адзіны мужчына ў хаце, выконваў гэтую дарослую ролю. Яшчэ з раніцы, убачыўшы прыслоненую да вугла нашай хаты прыбітую да калка дошчачку, на якой было напісана «Вартаўнік», я адчуваў ужо нейкі ўздым. Дзеці гулялі, як і звычайна, а я ўжо не мог супакоіць сваё хваляванне: дзіва што — мне, смаркачу, на ўсю ноч давяралі людзі ўсю вёску. Надвечар

я апранаўся цяплей і да поўначы (на ўсю ноч мяне не хапала) горда хадзіў на сваім канцы вёскі.

Праўда, гэты сюжэт сёння ўжо гучыць банальна. Адзін пісьменнік даўно расказвае, як ён, малы, быў на радоўцы старшынёю сельсавета (і, маўляў, казалі, што лепшага старшыні і не трэба), хоць, як высветлілася, сельсавета ў іхняй вёсцы ніколі не было.

Мы незаўважна станавіліся дарослымі, а цётка Саша з намі старэла: яна недаядала, абы мы былі сытыя, недасыпала, абы мы былі дагледжаныя.

Неяк летам — гэта было зусім нядаўна — цётка Саша прысела на лавачку каля нашага палісадніка, а я ж ніколі перад гэтым не памятаю, каб яна сядзела вось так, нічога не робячы. Па вуліцы з кійком у руках ішоў стары з сівоюсівою барадою — я ведаў, што жыве ён у Зарэччы. Дзед пастаяў крыху і завярнуў да нашай лавачкі. Сеў побач з цёткаю, абапёрся на кій.

— Яй жа ж богу, гэта Ліксаша. А я ледзь пазнаў — усё думаў, ты гэта ці не ты. А памятаеш, як мы з табою кадрылю выбівалі? Недатрогаю ты, Ліксаша, была. Ну, а што, хіба ты выйграла, што за мяне замуж тады не пайшла?

Не будзем, дарагія сябры, слухаць, што яму адкажа цётка Саша. Не будзем ім перашкаджаць: хай пасядзяць, пагамоняць — яны разам многа чаго могуць успомніць. А я вам давайце раскажу лепей казку.

Жыла-была не ў трыдзесятым царстве, а ў нашай вёсцы, якая называецца Зубрэвічы, прыгожая і сціплая дзяўчына Алеся. Неяк, вяртаючыся з гульні, заўважыла яна, што яе даганяе хлопец — таксама прыгожы і сціплы. «Во яшчэ не хапала,— падумала яна.— Яшчэ з хлопцам пад ручку ісці давядзецца». І набегла хутчэй. І хлопец за ёю бяжыць. Дагнаў ён дзяўчат, што ішлі дадому не спяшаючыся, і пытае:

«Ці не бачылі вы Алесю?»

«Ага, во толькі што прабегла!»

Хлопец яшчэ шпарчэй пабег. А дзяўчына таксама капыціць, не азіраючыся. «Хоць бы не дагнаў»,— думае сама сабе. Прабеглі яны колькі часу, а тады чалавек і пытае сустрэчных жанчын:

«Ці не бачылі вы Алесю?»

«Во толькі што прайшла. Спяшайся, зараз дагоніш».

І чалавек далей пабег. Не ведаю, многа ці мала ён бег, толькі ўжо і сам адчувае, што трохі стаміўся. Выламаў

па дарозе кій добры і зноў ідзе. Сустракае бабулек сівенькіх, якія яму насустрач надарыліся, і пытае:

«Ці не бачылі вы Алесю?»

«А чаму ж не бачылі? Бачылі — вось яна з намі ідзе, Алеся твая».

Пaглядзеў чалавек на бабульку, бараду сваю сівую пагладзіў:

« Яй жа ж богу, гэта Алеся. А я ледзь пазнаў... Усё думаў, ты гэта ці не ты...»

* * *

— Добры вечар, ласкавая хата!

Абмёўшы гальнём снег з чаравікаў, абтросшы шапку і паліто ў сенцах, бяруся за клямку і заходжу ў цёплую хату. Пакуль распрануўся, памыўся з дарогі — стол ужо аж увагнуўся ад ежы: чаго толькі на ім няма!

Табе, шчодры сялянскі стол, хочацца сказаць ласкавае слова. Я памятаю кожную метку на тваіх дошках: вось гэтыя шрамы ад вострага нажа асталіся з таго часу, калі дзед крышыў на ім табаку, а бабуля — капусту; гэтыя кругленькія ямачкі — сляды ад моцных арэшкаў, якія не тое што раскусіць, але і разбіць малатком было цяжкавата; а вось гэтыя зарубкі на тваіх ножках расказваюць, як растуць, падымаюцца ўверх дзеці — на адзін сантыметр, на два, на тры...

Ты, моцны вясковы стол, заўсёды вытрымліваў вялікія перагрузкі заручын, вяселляў, радзін, хрэсьбін. І не адзін госць, паддаўшыся шчодрасці медавухі, седзячы на лаве, міжволі схіляў да цябе сваю зацяжалелую раптам галаву, клаў наголеную дзеля свята шчаку на твае халаднаватыя выслізганыя міскамі ды кубкамі дошкі.

Ты пранах куляшом, аўсяным кісялём, капустаю, блінамі, талакном, бабкаю, клёцкамі ды бульбаю з грыбамі. І хоць сёння ўжо ў вёсках не пякуць свайго хлеба (павошта, калі штодзень у краму прывозяць свежы), я веру, што ты ўсё яшчэ памятаеш цеплыню і пах загарэлых, насаджаных на кляновы ліст і ўкрытых бялюткім ручніком караваяў, якія толькі што вынялі з печы. Стол пэўна ж яшчэ не забыўся, як мой бацька пачынаў новы каравай — нейкая ўрачыстасць прасвятляла ў тую хвіліну бацькаў твар, ён доўга, старатліва абціраў нож, спрабаваў пальцам, ці добра навостраны, потым браў круглы бохан левою рукою, прыціскаў яго да грудзей, а праваю абганяў кругом

ладны акраец. У сялян была спрадвеку вялікая павага і пашана да хлеба, які ім не так ужо лёгка даваўся, а таму, пэўна, нават такая звычайная, будзённая работа, як пячыванне новага каравая, узнімалася імі на вышыню абраду.

Стол, ты памятаеш і галодныя дні нашы, калі ў хаце, здавалася, халадала ад бездапаможна парожняй печы. Ты ж ведаеш, як наша мама старалася хоць нечым скрасіць гэты час. Ёй было дастаткова аднаго зубка часнаку і малюсенькай макулінкі здору, каб у нашай хаце запахла, як на каляды: патоўчанае ўсё гэта разам так добра здобрывала суп, дзе крупіна за крупінаю ганялася, што мы ніяк не маглі адарвацца ад міскі. А калі заходзіў з вуліцы нехта чужы, дык абавязкова пытаўся:

— Дзе гэта ты, Вулляна, каўбас панабрала? На ўсю вуліцу пахне.

А ты ж, мусіць, памятаеш, калі мы, перажыўшы самы голад, нарэшце, варылі маладую бульбу-скараспелку. Як сядзелі мы вакол цябе, вакол чыгунка з бульбаю, з якога валіла пахкая пара. Памятаеш, і не наеўшыся як след, мы клалі лыжкі — кожны пакідаў іншаму: цётка пакідала Пашы, Паша — Ніне, Ніна — мне, а я — зноў цётцы.

І цяпер вось мы можам сабрацца ўсе ў госці, пасядзець за тым жа сталом, успомніць, як дружна мы жылі, але тое, ранейшае, ужо ніколі не зможа вярнуцца. І нічога не паробіш — птушкі, што вылецелі з аднаго гнязда, вярнуцца ўсе ў яго зноў не змогуць: ім трэба рабіць новыя, свае гнёзды.

І я, пагасцяваўшы, таксама паеду ў свой Мінск, дзе мяне чакае маё гняздо, каб потым, як толькі заные карэнне, зноў і зноў вяртацца на наша селішча, у Зубрэвічы, да шчырых і добрых людзей...

Над вёскаю з учарашняга шчыруе вецер. У лютым гэта не навіна. Люты — апошні месяц зімы, а таму вецер, як у нас кажуць, аж якоча, аж заходзіцца, спяшаючыся прайсціся па ўзрэхах і дарабіць тое, што ўпусціў, забыўся зрабіць за ўсю зіму. Ды і які б ён у д'ябла быў люты без лютага ветру, што аж сцелецца ад раз'ятранасці.

Нашы машыны збіраліся сёння ў Оршу. Але ўсе дарогі перамяло. І пакуль Сяргей Стопаў ходзіць ля свайго бульдозера (ён заўсёды чысціць дарогі), хлопцы паспрабавалі завесці свае машыны. Не заводзяцца — салярка замярзае. Сяргееў бульдозер таксама не завёўся. Ды калі б нават ён і завёўся, што толку чысціць тыя дарогі — іх жа следам і замятаць будзе.

І вось ужо жвавая кабылка Маруся, бухматая ад ветру і марозу, мусіць, спяшаючыся хутчэй скончыць гэтую непрыемную работу, наспешліва грабецца з сумёта па сумёт, правальваючыся па самае пуза і адварочваючы галаву ад ветру. Мы з Толем таксама захінаемся, але вецер у нашых санях дужа круціць. Ён усё роўна, як ні захінайся, сыпле, мяце ў нашы твары калючым снегам, ад якога аж гараць шчокі...

У полі — нічога не відно. Снег, снег і снег... Белыя пасмы бягуць па ўсім полі, збіраюцца ў віхры, з шумам ламаюцца аб сцяну лесу.

У лесе — ціха. Можна прабегчы за санямі, пагрэць ногі.

— Глядзі ты, і Маруся ладна бяжыць,— нібы нешта ўспомніўшы, гаворыць Толя.— А Харун мне казаў браць Васю, каб не памарозіцца. Але я збаяўся: яшчэ растрасе, чорт.

Я ведаю гэтага каня. Ён ніколі не ходзіць — увесь час бягом, бягом: і з гары, і на гару. Пра яго расказваюць як не легенды. Напачатку гэта быў няскладны, лянівы конік. Яго рашылі здаць на мясакамбінат. Давялі ўжо амаль да самай Оршы, але ён уцёк. Вазілі Васіля на той мясакамбінат яшчэ разы са тры. І ўсё ён уцякаў. Тады і пастанавілі: не чапаць яго болей — хай жыве, калі яму ўдалося перажыць сваю смерць, калі ён так настойліва змагаўся за жыццё.

І Вася, нібы зразумеўшы ўсё гэта, змяніўся. Цяпер яму не трэба ні пуга, ні прут. Ад аднаго толькі ціхага «но!» ён, як ашалелы, зрываецца з месца і імчыць што ёсць сілы — толькі моцна трымайся за сані ці за калёсы, бо ніякае «тпру!» тады ўжо табе не паможа.

Лес скончыўся. Голая Ленькаўская гара, на якой вірыць дуйка...

Я еду з дому дамоў...

І потым, седзячы ў цёплым вагоне, слухаючы аднастайнае татаканне колаў, я раптам вельмі ўзрадуюся, убачыўшы лёгкае трымценне электрычных агнёў Мінска: там жа недзе свеціць і маё акно. Тады можа ўспомніцца, як я «зайцам», на даху вагона ўпершыню ехаў у Мінск — вёз дакументы ва універсітэт. Мяне некалькі разоў ссаджвалі з вагонаў міліцыянеры, але калі я казаў ім, што еду вучыцца, і паказваў атэстат сталасці, яны расчульваліся і рабілі не па ўставу — падсаджвалі зноў на вагон. І як сціснулася ад невядомасці сэрца (невядомае заўсёды палохае чала-

века), калі я ўбачыў упершыню агні Мінска, агні чужога яшчэ, незнаёмага горада, дзе мяне ніхто не чакае...

Вось і зачыняецца маё акно, расчыненае ў зіму. Недзе там, далёка за акном, асталася аснежаная вуліца маёй вёскі, па якой я зусім нядаўна ішоў: там асталіся, занятыя сваімі клопатамі, мае аднавяскоўцы — і тыя, з кім я толькі што вітаўся, і тыя, хто на гэты раз не сустрэўся мне.

Я пабываў у сваёй вёсцы. Такою сёння яе ўжо ніхто не ўбачыць — вёска стала другая, багатая: з новымі хатамі, з тэлевізарамі ў хатах, з магутнаю тэхнікаю, са штомесячнай выплатай заработку — тут ужо ніхто не ведае, што такое голад. Я люблю нашу сучасную вёску, але няхай даруюць мне чытачы, калі тут адчуюць нейкі сум па ранейшых маіх Зубрэвічах. Гэта, мне здаецца, натуральна.

І вось сёння, калі я пішу гэтыя радкі, вясна ўжо настойліва напамінае пра сябе: паласкавелае пасля зімовых марозаў сонца напаўняе вясёлым святлом мой пакой, а неба сінее ўвачавідкі, усё больш і больш нагадваючы колер першых пралесак.

Мой дзевяцісотгадовы Мінск сустракае вясну.

Сустракаюць вясну і мае Зубрэвічы.

Развітаўшыся з маёю вёскаю, я ведаю, што абавязкова вярнуся ў новыя Зубрэвічы. Бо я люблю іх, як і новую, светлую, прасторную пяцісценку на нашым селішчы, што вырасла замест старой маёй, урослай у зямлю бацькоўскай хаты.

*Аршаншчына.*
*Зіма 1968 г.*

# ПА ЗЯЛЁНУЮ МАЛАНКУ

СІБІРСКІЯ СШЫТКІ

## *Слова перад дарогаю*

Мусібыць, кожнаму даводзілася бачыць, як маладзенькі, беленькі, чысценькі снег, які толькі што папападаў, сцішанымі зімовымі прыцемкамі бывае сіні-сіні — нібы святочнае вясновае неба.

Мусібыць, не толькі рыбакі ведаюць, што светлая вада ўначы здаецца чорнаю, і калі ты, седзячы ў лодцы, зачэрпнеш яе далонёю, у руцэ будзе нешта густое і вязкае, нібы дзёгаць.

А якая бывае сібірская маланка — там, у тайзе? Ды і наогул, што гэта за край такі — бела-зялёны Сібір?

Сібір, якім здаўна, горш чым турмою, палохалі нашых дзядоў і прадзедаў, якім усё яшчэ спрабуюць палохаць і нас нашы ворагі за мяжою.

Сібір, куды на тры гады, нібы ў глухую адзіночную цэлю, быў кінуты Уладзімір Ільіч Ленін.

Сібір, які сёння выгадаваў цэлую сям'ю электрастанцый, новабудоўляў, гарадоў, заводаў.

Сібір, куды пехатою і на ламаных калёсах амаль цэлае стагоддзе ішлі і ехалі беларусы — ішлі ўсяго толькі па кавалак хлеба.

Я таксама ледзь не зрабіўся сібіраком. Я мог бы нарадзіцца ўжо ў Сібіры — бацька, калі мой бусел яшчэ не збіраўся мяне шукаць, канчаткова вырашыў перасяліцца туды і ўжо нават пачаў быў распрадавацца...

Вось таму мяне і цягне зірнуць на той край, які ледзь не стаў маёй другою радзімаю.

Давай мы з табою, чытач, па нашым даўнім звычаі, сядзем перад дарогаю на сабраныя чамаданы, пасядзім, падумаем — ці не забыліся што-кольвек патрэбнае, чаго потым так будзе не ставаць у далёкай дарозе?

Нашага стомленага Пегаса давядзецца расцугляць і часова пусціць на расяны луг да статка, дзе слухмяна па-

суцца пегаскі і падбрыкваюць пегасяняты. А мы з табою перасядзем на машыны, цягнікі, параходы, самалёты.

Прабач, мой знаёмы і незнаёмы субяседнік, што я кажу табе «ты». Я мог бы цябе клікаць, скажам, Пятром Пятровічам. Але тады б стварыліся не тыя адносіны — маўляў, ці то я прыйшоў да цябе прасіць нечага, ці то ты таксама пакуль што, да часу, хаваеш нейкую сваю просьбу. Ты ведаеш, што ў такім выпадку зніклі б давер і сама непасрэднасць, а таму многае я тады б не паказаў табе, пра многае змоўчаў бы...

Ну што ж, пасядзелі, а цяпер час ужо і ў дарогу...

## БЕРАГ ТАЙГІ

*Змест сшытка. Тайга зверху і збоку. Дрэвы, якія спатыкнуліся. Хвост зялёнага каня. Шышкаванне ў Саянах. Чым пахнуць жалезныя звяры. Казкі сляпой Пляткаркі. Хто ўнадзіўся ў цётчыны гарады. Памылка Брэма. Што пакрыўдзіла егера. Агонь замест ганчака. Міні-спаднічкі, пашытыя з лісця. Дзе хаваецца зялёная маланка. Асмялелы ЗІЛ. Тайговы сувенір.*

Гэтай сустрэчы з тайгою я чакаў даўно. Яшчэ на Далёкім Усходзе ўсё збіраўся хоць па колькі гадзін астацца сам-насам з усурыйскімі кедрамі, але нейкі звычайны, будзённы клопат заўсёды апярэджваў гэтае маё жаданне, увесь час адсоўваў яго надалей — я вяртаўся тады дадому, так і не пабыўшы ў сапраўднай тайзе. Ды і потым былі выпадкі, калі я мог бліжэй пазнаёміцца з сібірскім лесам, але тайга заўсёды аставалася сама па сабе, я — таксама сам па сабе: калі і, здаралася, бачыў яе, то ўсё не так, як хацелася,— то зверху, з самалёта, то збоку, з вагона, а то яна, нібы тая казачная жар-птушка сваё пяро, пакідала мне нейкі адзінокі, абшарпаны вятрамі кедр — глядзі, маўляў, любуйся...

І вось цяпер, ад'ехаўшы з паўсотні кіламетраў ад Шушанскага (дзякуй Васілю Ціханавічу Лугавому, рэдактару шушанскай раённай газеты, які прывёз мяне сюды), я стаю высока на ўзгор'і паміж буралому, ламачча, ягадніку і задаволена азіраюся.

Саяны. Тайга. Яна ляніва спаўзае з аднаго хрыбта, няспешна, спатыкаючыся (вунь нават яшчэ не падняліся тыя дрэвы, што спатыкнуліся), узбіраецца на другі, паволька пераважваецца цераз яго вяршыню. Унізе булькоча, шушукае гаваркая шапятуха Шуш — яна пад невя-

лічкімі, наспех скіданымі масткамі часта перабягае вузенькую тайговую дарогу: надакучыць ёй гарэзаваць на адным баку — адразу ж спяшаецца пад масток, і вось ужо дрэвы на тым баку слухаюць яе гаману.

Піхты. Выносістыя, гонкія, стройныя. Яны, як громаадводы, тырчаць з тайгі. Без сукоў — адны голыя ствалы. Толькі высока-высока на самай макавіне дзе-ні-дзе рэдзенькія кароценькія лапкі.

Каржакаватыя кедры з пышнай цёмна-зялёнай кронай. Лапкі — як у нашай сасны. Толькі іголкі задужа доўгія і мякенькія-мякенькія — сабраныя разам, яны нагадваюць зялёны хвост нейкага зялёнага казачнага каня. А можа нават і Пегаса...

Шышкаванне. Павымазаныя ў смалу шышкоўнікі з поўнымі мяшкамі шаргатлівых кедравых шышак падаюць чорныя ліпкія рукі, да якіх, як да ліпучак, прыліпаюць мае далоні, здароўкаюцца і, гледзячы на маё зусім нетайговае апранне, здзіўлена пытаюцца:

— Што, і ты шышкоўнічаеш? У белай сарочцы? Ну, давай, давай!

Не, што ні кажыце, а ўсё ж прыемна адчуваць, што ты бачыш сапраўдную тайгу. Толькі мне ўсё роўна чагосьці не стае: і піхты, здаецца, не такія ўжо высокія, як мне думалася, і кедры — не такія магутныя, як увесь час я ўяўляў іх. Пачынаю нават злавацца на сябе: «Якога табе д'ябла трэба? Вечна ты нярады, вечна табе здаецца, што ўбачыў не ўсё, не тое, што хацеў. Табе ж кажуць, што гэта тайга, самая сапраўдная тайга, а ты замест таго, каб любавацца ёю, усё штосьці выдумляеш».

Думалася — можа такое ад непрывычкі да гэтага незнаёмага лесу. Так бывае часам і з вёскамі. У сваёй — усё, здаецца, стаіць там, дзе трэба, на месцы: і вось гэта сасна, што адважылася пакінуць узлессе, выбегла аж на поле і цяпер, у жыце, спалохана азіраецца; і вось гэты пагорак, які закрывае вёску — з дарогі адно толькі коміны ды дымы відаць; і нават вось гэты гразкі ручай, цераз які ўвосень і ўвесну не праехаць — там не сціхае покание і лаянка. А ў чужой усё не так, усё недарэчна: і рэчка, здаецца, бяжыць чамусьці не ў той бок; і платы пазагароджваны не там, дзе трэба; і дарога не з таго боку ўбягае ў вёску; нават сонца і тое ўзыходзіць дужа дзіўна — якраз там, дзе ў нас яно заходзіць...

Але з тайгою было трохі не так. Потым, калі мы вярнуліся ў пасёлак Майскі і сядзелі ў новай, жоўценькай,

як яечка, хаце дырэктара леспрамгаса Івана Апанасавіча Анохіна, я пахваліўся:

— Вось, нарэшце, і я пабываў у Саянах, пабачыў сапраўдную тайгу.

Іван Апанасавіч уважліва паглядзеў на мяне, усміхнуўся:

— Саяны, кажаце? Э, не — да Саянаў яшчэ ўга колькі трэба ехаць. А гэта ўсяго толькі адгор'і Саянаў. І тайга тут не сапраўдная. Сапраўдная была яна да таго, як наш леспрамгас сюды прыйшоў. А цяпер мы яе павывалілі і павывезлі. Тут толькі маладняк астаўся. А сёння мы вунь там працуем ужо...

Я паглядзеў туды, куды паказваў Іван Апанасавіч: на доўгім хрыбце рэдзенька стаялі дрэвы — як усё роўна валасы на палыселай галаве.

Значыць, і на гэты раз мне не давялося пабыць у сапраўднай тайзе. Значыць, нездавальненне маё ўсё ж такі было не без дай прычыны. Значыць, і цяпер нечапаная тайга асталася недзе там, вунь за гэтымі хрыбтамі: зусім зялёнымі зблізку, сінімі — трохі далей і шэрымі — самымі далёкімі.

Над гэтай вясёлкаю хрыбтоў вісяць хмары. Там грыміць гром. Здаецца, што пехта бурклівы злуецца, раўніва аберагаючы сапраўдную тайгу ад лішняга сурочлівага вока. Там жыхае таёговая маланка — незнаёмая, неспазнаная мною маланка.

Таму жаданне ўбачыць сапраўдную тайгу, хоць трохі спазнаць, калі ўдасца, вось такую хапатлівую, схаваную за сямю хрыбтамі маланку доўга вадзіла, насіла і вазіла мяне па Сібіры. Яно прывяло і ў Завусоўку — ціхі пасёлак лесарубаў.

З начальнікам лесаўчастка Толем Наседкіным едзем у тайгу на лесапарыхтоўкі. Толя — малады спецыяліст, ён толькі нядаўна скончыў Краснаярскі тэхналагічны інстытут. Гады са два працуе на ўчастку. Мяккі, нават дужа сарамлівы чалавек.

Вось ужо дзве гадзіны едзем мы з ім на машыне па былой тайзе. Колькі кіламетраў — а ўсё адзін і той жа малюнак: пустэча, захламленая, адкрытая ўсім вятрам і дажджам. Нават не дае спакою нейкая вельмі прэтэнцыёзная думка — маўляў, гэта зніклая лясная цывілізацыя: уздыхнуўшы, упалі дрэвы; вывелі птушанят і паспешліва паляцелі, каб больш не вярнуцца ў гэтае бязлессе, птушкі; перанеслі ў іншае месца (туды, дзе ёсць будаўнічы ма-

тэрыял — ігліца) свае хаты мурашкі: вы бачылі, як на ўсіх тайговых сцяжынках было аж бела — гэта мурашы цягнулі белыя яечкі ў свае новыя мурашнікі... А тут стала ціха. Тайга зарасла высокай травою, дзікім быльнягом. Так зарастае разбуранае, пакінутае чалавекам селішча, тое месца, дзе некалі стаяла печ. І амаль нішто не нагадвае, што тут некалі была непраходная, дзікая тайга. Толькі зрэдку дзе махне галінаю неяк абыдзены, цудам ацалелы кедр, ці ўбачыш, як закрасуецца прыгожы астравок высачэзных сосен, пакінутых спецыяльна на натуральнае ўзнаўленне лесу, і здзівішся, што нават іх, каму даручана радзіць новае, моцнае і здаровае пакаленне будучай тайгі, не пашкадавалі — на іх, як пядаўнія раны, усё яшчэ смалатачывяць стрэлы, падсочкі. А вось тут вецер кружыць дымок. Нібы хоча звіць з яго вяроўку. І зялёненькія маладзенькія бярозкі ў дужа кароценькіх зялёных мініспаднічках адхінаюцца ад яго, адмахваюцца галінамі. Тайга, выразаная і вывезеная, тут, у дадатак да ўсяго, нядаўна яшчэ гарэла...

Я, думаю, не перабольшу, калі скажу, што ў кожнага з нас на ўсялякі выпадак недзе глыбока-глыбока прыхавана яшчэ з дзяцінства патаемнае і шчымлівае жаданне — убачыць Афрыку, пра якую столькі незвычайнага чыталі мы і чулі: маўляў, гэта ж той край, дзе зіма — самы спрыяльны час на выспяванне пладоў.

Здаўна грэюся ля гэтага жадання і я. Упэўнены, што некалі ўсё ж пабываю там. Пабываю абавязкова. Толькі з гадамі мне ўсё больш і больш нецярплівіцца — пачынаю ўжо нават сам сябе прыспешваць. А часам зробіцца і боязна — а што, калі спазнюся? У наш час інтэнсіўнай, неабвешчанай вайны з прыродай усё можа быць. А што, калі раптам гэты край, які і сёння ўяўляецца мне як нечапаныя джунглі з напалоханымі звярамі, а што, калі раптам ён расчаруе мяне і я з болем зразумею, што і тут, у Афрыцы, ніяк не даехаць да сапраўдных джунгляў, а каб, скажам, толькі ўбачыць нейкую антылопу куду — трэба хадзіць некалькі дзён, а то і тыдняў? Знікаюць нечапаныя джунглі. Радзее густая тайга. Перасыхаюць блакітныя ніткі рэк, і толькі лужыны, падчас летніх і восеньскіх дажджоў, як пункціры на карце, пакуль што паказваюць, дзе нядаўна было рэчышча. Моўчкі (да стрэлу моўчкі!) бягуць штосілы па дрыготкім сляпучым промні ачмурэлыя зайцы — уцякаюць ад «газікаў», што гоняцца за імі на ралі, ад незнаёмага паху бензіну, якім пахнуць гэтыя

жалезныя звяры. Колькі іх на свеце, змеханізаваных бракан'ьераў! Яны, пэўна ж, лічаць сябе паляўнічымі, сцвярджаюць, што паляванне ўмацоўвае нервы. І, мусіць, між іх няма сапраўднага паляўнічага, які мог бы хоць зразумець думку Хемінгуэя — маўляў, наколькі прыемней вярнуцца з палявання без ільва, чым забіць яго з машыны, з-пад фар.

І таму ўжо як нешта вельмі неверагоднае, як цікавая прыдумка нашых беларускіх казак успамінаецца гісторыя зубрыхі, якую я пачуў у Белавежы.

Яшчэ зусім нядаўна жыла-была ў нашай пушчы зубрыха. Як ва ўсіх добрых людзей, было ў яе імя. Хто ведае, як звалі яе зубры (зубраняты, дык тыя клікалі ці мама, ці цёця), а ў людзей была яна Пляткарка. Хто яго ведае, чаму так назвалі яе, але калі ўжо назвалі, то прычына, мусіць, была. І вось састарылася яна. Спачатку клікалі яе цёткаю, а потым і бабкай Пляткаркаю пачалі зваць. І трэба ж ёй да ўсяго яшчэ аслепнуць. Бывала, як пакліча яе егер да кармушкі, каб паснедала: «Пляткарка! Пляткарка! Дзе ты, хадзі сюды!» — яна наўздагад ідзе на яго кліч, на дрэвы натыкаецца, аб пні спатыкаецца. Ведаеце, аж глядзець шкада. Але ні ў каго рука не падымалася, каб, як раілі некаторыя, выбракаваць яе па старасці і застрэліць.

Наадварот, усе Пляткарку дужа любілі. І даглядалі, як дзіця ўсё роўна: ёй і корм лепшы, і догляд таксама. І зубраняты з ёю сябравалі, як і раней. Табуном за ёю хадзілі. Мусіць, яна добра ўмела расказваць зубрыныя казкі, якія так любяць слухаць усе малыя... А яна збярэ ў гурт зубранят, тыя палягуць ля яе, і Пляткарка расказвае ім пра добрых зубрыных асілкаў, ды можа і пра тое, як раптам лёд на іх травы насунуўся, як холадна адразу стала — не так, як у даледніковую пару...

Скажыце, а хіба не для сенсацыі ці паляўнічых небывáліц вось такое газетнае паведамленне.

«БАРАЦЬБА З ЗУБРАМІ»

У апошні час у агародах пушчанскіх вёсак пачалі лавіць незвычайных свавольнікаў, якія ўнадзіліся лазіць у цётчыны грады. Імі аказаліся зубры. Зубры цяпер ужо не ядуць жыта ці аўса. Праўда, авёс яны часам яшчэ могуць і ўважыць — прыйдуць, пакачаюцца там (а што ж зробіш, калі заедзь падакучае!) — і пойдуць. Асабліва спадабаліся зубрам морква і буракі: ядуць яны іх і аблізваюцца. Ад памідораў і салаты толькі плююцца — не спадабаліся.

Павырываюць іх, паклычаць, пакідаюць, ды потым, мусіць, і абураюцца: «Ну і дзівакі ж гэтыя людзі, няўжо ім такая дрэнь можа падабацца, што яны яе нават на сваіх градах разводзяць».

Людзі не спяць цэлымі начамі, пільнуюць свае грады. Калі прыходзяць «зладзеі», мужчыны паляць вогнішчы, бубняць у бляхі і заслонкі, розныя тазы і місы, крычаць. Зубры не любяць чалавечага крыку, цярпець не могуць вісклівага сабачага брэху і таму спакойна, паважна, як усё роўна яны і не красці збіраліся, паварочваюць назад і з пачуццём уласнай годнасці хаваюцца зноў у пушчы...

Але гэта не прыдумка. У зуброў тут не страляюць. У пушчы наогул рэдка калі чуецца сёння стрэл. Бо асновай кожнага запаведніка павінна быць чалавечнасць.

Павінна быць... Але часцей за ўсё, як мы ведаем, таго, што павінна быць, не бывае. Колькі стралялі ў зуброў у Белавежы! Мусіць, вельмі цяжка было царам і каралям, цешачыся сваёй неабмежаванай уладаю, стрымацца ад спакусы пастраляць ва ўпор у гэтых магутных лясных асілкаў, якіх паслужлівыя падхалімы прывязвалі як не за ногі і потым калаціліся ад нецярпення і страху, каб, крый божа, не спазніцца і таргануць за вяроўку адразу ж пасля стрэлу — нават калі ў яго і не пацэлілі, зубр абавязкова павінен упасці: перад царамі і каралямі ўсе становяцца на калені. Але часцей за ўсё цалялі — стралялі ж дужа зблізку, і не пацэліць у шырокі зубрыны лоб было проста немагчыма.

Восень, 27 верасня. 1752 год. Жоўтая Белавежа. Усе пушчанскія сарокі не паспяваюць расказваць пра лясныя вяселлі — тут самая пара ўтрапёнага кахання. І раптам сарокі папярхнуліся — зуброў і аленяў, напоўненых, як дынамітам, пачуццём і жаданнем, загоншчыкі чамусьці зганяюць у адно абгароджанае месца. Нічога не разумеюць і зубры. Цікава — што здарылася? Хіба, акрамя жадання кахаць, у гэтыя дні ў каго-небудзь ёсць яшчэ іншыя жаданні? Аказваецца, яго каралеўская вялікасць кароль Аўгуст III палюе. Разам са сваёю жонкаю — вялікай каралеваю. Гэта ім пабудавалі ўмацаваную, узнятую на дубовых слупах альтанку, а зубрам парыхтавалі загоны, па якіх падганялі пад самыя-самыя рулі. Каралева ў перапынках паміж чытаннем, нехаця адрываючыся ад нейкага сентыментальнага рамана і трымаючы беленькі пальчык на тым радку, да якога яна дачытала, амаль не гледзячы,

не цэлячыся, націскала на спуск. І, заўважце, ніводнага разу яна не прамахнулася — зуброў было так многа, і яны былі так блізка... Бывала, што развіццё падзей у кнізе (ён ёй здрадзіў, здрадзіў, бессардэчны) так захапляла каралеву, што яна забывалася пра паляванне. І тады панадгнаны пад альтанку зубр знепавідна чакаў стрэлу, чакаў, калі яна дачытае да абзаца ці перагорне старонку. Яго вочы, тужлівыя і разумныя, былі зусім блізка. І яна, адарваўшыся ад кнігі, магла б убачыць, колькі нянавісці і спакойнай, нашай чалавечай годнасці было ў яго вачах. Але ёй не было калі (падумаеш, нейкія там зубрыныя вочы!) — трэба было хутчэй даведацца, як да здрады паставіцца гераіня рамана.

У той дзень яе вялікасць каралева забіла 20 зуброў і прачытала каля 50 старонак сентыментальнага рамана...

А вось ужо 1860 год. Таксама верасень. Палюе цар Аляксандр II. З усёй пушчы пад яго стрэлы было сагнана 117 зуброў, 100 зайцаў, 3 ласі, 23 дзікі, 36 коз, 14 ланяў, 17 ваўкоў, 15 ліс, 14 барсукоў. Усяго 339 галоў.

І зноў зубр — цар пушчы — мужна глядзеў у халаднаватыя пакуль што рулі царскіх стрэльбаў.

Кажуць, што зубр п'е толькі самую чыстую ваду — ніхто яго не прымусіць напіцца з балота. Ён лепей пойдзе далёка-далёка, туды, дзе шумяць чыстыя ліўні,— а зубры чуюць дождж за дзесяткі кіламетраў.

Кажуць, што самы моцны боль зубр цярпіць без адзінага гуку — моўчкі. Менавіта так, як і трэба цару пушчы. Таму браканьеры стралялі яго ахвотней — ён хоць не ніпічыць так, як заяц, і не трывожыць нервовую сістэму.

Кажуць, што зубр пакідае тыя лясы, дзе яго перамагаюць ашуканствам. Ён прызнае толькі сумленныя паядынкі. І таму, каб яго перамагчы, сіла і адвага паляўнічага ці яго суперніка павінны быць большыя за ягоныя. Ці, у крайнім выпадку, хоць бы роўныя.

Але зубр, нягледзячы на здзек і ганьбаванне, не пакінуў сваю Беларусь, сваю Белавежу. Вучоныя нават рабілі вывады, што пушча захавалася толькі таму, што ў ёй былі зубры, а зубры захаваліся таму, што была пушча.

Каранаваныя браканьеры выбівалі ў пушчы ўсё. Некаранаваныя таксама не вельмі сароме́ліся. І толькі зубра баяліся чапаць. Яны былі ўпэўнены, што той, хто заб'е зубра, гэтага ляснога прыгажуна, якім цікавіцца сам цар і дзеля якога ахоўваецца цэлая пушча, аддаецца пад суд. Цікава, што нават вядомы прыродазнаўца Брэм быў упэў-

нены, што за зубра чалавека ссылаюць у Сібір на пасяленне, а то і зусім на катаргу. Можа, такая легенда і ўратавала нашага даледніковага асілка. І хто ведае, як бы ўсё склалася, калі б, скажам, браканьеры XIX стагоддзя ведалі, што за забойства зубра накладаўся ўсяго толькі штраф — ад 50 да 150 рублёў, які потым наогул знізілі да 25 рублёў. Гэты штраф можна было ўнесіць адразу і потым кіравацца ў пушчу і забіваць зубра: за мяжою толькі адна яго галава каштавала 500 рублёў золатам.

Але ўсё ж пушча выжыла. Сёння гэта адзін з найцікавейшых запаведнікаў свету. Сёння гэтую зялёную краіну берагуць дзесяткі вопытных егераў. Праўда, трапляюцца сярод іх часам і выпадковыя людзі.

Калі з Анатолем Клышкам мы працавалі над сцэнарыем фільма «Белавежская пушча», некаторы час жылі мы ў Хвайніцкім лясніцтве — хадзілі па пушчы з егерамі, прыглядаліся. Леснікі будзілі нас яшчэ на досвітку, і мы, хуценька сабраўшыся, спяшаліся з імі на абход. Аднаго разу пабарабаніў у акно лясніцтва, дзе мы жылі, і ён — назавём яго Васілём Сямёнавічам. Імжэў-пакрапваў надакучлівы дождж. Ён быў ціхі, бязгучны: мы нават спачатку і не заўважылі яго. Але ў пушчы падалося, што дождж пабольшаў — там ён загаварыў, залопаў па лісці асін, зашумеў у бярозах і ялінах. Мы доўга хадзілі па лесе, вымаклі да ніткі, але пакуль што яшчэ нічога цікавага не ўбачылі. Тады мы папрасілі егера:

— Васіль Сямёнавіч, можа, вы хоць якое гняздо ў сваім абходзе ведаеце?

Васіль Сямёнавіч лаўчэй узяўся за рэмень двухстволкі, што вісела на яго плячы, і, як здалося нам, трохі пакрыўджана адказаў:

— Я ж, мілыя мае, егер, а не смаркаты шалапут, каб шукаць нейкія там птушыныя гнёзды. Гэтым хай дзеці займаюцца. Птушыныя гнёзды ў мае задачы не ўваходзяць. Лес — вось мая задача.

Хацелася запярэчыць яму — маўляў, лесу без птушыных гнёздаў не бывае, але мы змоўчалі. А ён, таксама памаўчаўшы трохі, зноў паўтарыў — толькі ўжо больш настойліва:

— А я, мілыя мае,— егер...

І пайшоў шпарчэй. Але ўсё ж нам пашанцавала. Зусім выпадкова, калі ўжо здавалася, што Васіль Сямёнавіч начыста заблудзіўся і не ведае, у якім баку лясніцтва, мы выйшлі да невялічкай лясной рэчкі. І якраз у той час, калі

з другога боку, з папрабіванага дажджом туману, сцяронка (здаецца, трэснi сучок — і адразу гэты палахлівы вісдзеж знікне) ішлі да вады ласіха з ласянятам — мусіць, напіцца. Потым яшчэ, вылазячы з гушчару на трохі вальнейшае месца, мы (таксама выпадкова) убачылі чорнага бусла, які, нібы манах, глыбакадумна стаяў у сваім гняздзе і дужа добра быў відзён на фоне нізкіх мурзатых воблакаў.

А ў Броўскім лясніцтве (таксама пушчанскім) быў такі выпадак. Егер Іванюк, малады хлопец, прывёў як не ў самую вёску ваўка. Потым ён расказваў:

— Я іду і раптам бачу — за мною нейкі сабака крокаў за трыццаць следам валачэцца. Бач ты яго, думаю, і ваўкоў не баіцца — адзін у лесе хадзіў. Усё глядзеў, хацеў пазнаць, чый ён. Але так і не пазнаў — у нашай вёсцы падобных не было. А тут дзед Міхаль насустрач ідзе. Бачу — яшчэ здалёку чагосьці рукамі махае. А я не разумею, што ён хоча сказаць. Калі толькі параўняліся — пачуў: «Страляй,— кажа,— воўчае мяса! Хіба ты не бачыш, хто за табою ідзе!» Я яшчэ азірнуўся ды спакваля, спакойна так яму і адказваю: «Як хто? Сабака. Застрэліш, а тады ад бяды не абярэшся — гаспадар у суд падасць». А ён аж злуецца: «Страляй,— кажа,— гэта ж воўк». Я — шату-бату! — стрэльбу з пляча, а ваўку гэта, відаць, толькі і трэба было: ён з дарогі — адно хвост яго, як змяя, у кусты нырнуў. Я шарахнуў з двух ствалоў па кустах, аж лісце, як у лістапад, пасыпалася. А яго і след прастыў — лаві ваўка ў лесе.

Адрозніваць ваўка ад сабакі, мусібыць, таксама не ўваходзіць у задачы егераў. А мне ж здаецца, што егер павінен любіць не толькі лес, гэтую зялёную дзяржаву дрэў, але перажываць і за кожнага растаптанага мураша, і за кожную няспетую птушыную песню.

Сёння свет захапіўся дакладнымі навукамі. Гуманітарныя сціпла адышліся ўбок, у цень, і адтуль насцярожана сочаць, як людзі гуляюць у лічбы. Спалохаліся нават вучоныя. Захапленне дакладнымі навукамі і непавага да гуманітарных... А ці не значыць гэта, што розум перамагае душу, сэрца? Ці не значыць гэта, што халодная разважлівасць робата, якога хтосьці вельмі трапна назваў поўным ідыётам, надзеленым фенаменальнай здольнасцю запамінаць лічбы, з цягам часу назаўсёды блакіруе сэрца і не дасць яму магчымасці выпраменьваць дабрыню, захапленне, здзіўленне і нават лёгкі чалавечы смутак, які таксама

патрэбен паўнацэннаму здароваму арганізму, як і радасць? Колькі стагоддзяў ішоў да гэтага чалавек?

Калі чалавек упершыню заспяваў? Мусіць, ніхто не ведае дакладна, калі гэта здарылася, але кожны разумее, што адбылося такое вельмі даўно. Хутчэй за ўсё тады, калі чалавек не ўмеў яшчэ гаварыць. Толькі я ўпэўнены, што першая песня прыйшла да яго абавязкова раніцою.

Давайце ўявім сабе першабытны лес. І яго, нашага далёкага продка, у гэтым лесе. Сёння ў яго было дужа ўдалае паляванне. Ён наеўся мяса, закусіў смачным карэннем, запіў халоднай — аж зубы заходзяцца! — вадою з ляснога ручая, пад раніцу яшчэ больш халоднай ад апалых рос.

Ён ляжыць на палянцы, на высокім лясным узгорку (толькі не чапайце яго, калі ласка,— бачыце, чалавек задумаўся) і шырока раскрытымі вачыма глядзіць на гэты дзівосны свет: здаецца, ён толькі вось цяпер убачыў яго прыгажосць і спрабуе разабрацца ва ўсім, звесці ў адно гэты рознакалёрны цуд.

Над палянаю шасціць верхні вецер. Ён, дурэючы, хапае за жоўтыя чубы бярозкі і клёны. А тут, на паляне,— ціха. Зрэдзь калі вецер прарываецца сюды, пад лісцё, пакудлаціць валасы на грудзях. А то, жартуючы, пераверне на другі бок фігавы лісток, які яшчэ потым (дужа няскора!) стане фігавым,— цяпер гэта ўсяго толькі выпадковы кляновы ліст, што выпадкова ўпаў на тое месца, якое пазней будзе прынята хаваць. А паміж гэтымі двума вятрамі — пара яркіх мятлушак, якія, мусіць, захапіўшыся сваім танцам кахання, нічога не бачаць навокал сябе.

Раніца. Шалёнасць колераў. Ласка сонца. Пераразвоньванне ручаёў. Мяккі туман над дальняй ракою. І раніішняя шматгалосая малітва птушак. А небяспечных звяроў (розных там дыназаўраў) паблізу няма. Ну, як тут не заспяваць!

І ён заспяваў. Няўмела, баязліва, ціха. Заспяваў сабе. Але мне здаецца, што ўся прырода на гэты час змоўкла: свет здзівіўся і ўзрадаваўся новаму, незнаёмаму да гэтага, голасу, які па часе адшліфуецца, пасмялее і з якім пасля пялёгка будзе цягацца нават самым галасістым птушкам.

Можа ў такую ж самую раніцу, убачыўшы пад самым носам дзіўны карэньчык, які невыразна нагадваў маленькага дыназаўрыка, чалавек зубамі паспешна пачаў абгрызаць усё лішняе. А калі фігурка стала зусім падобная да сапраўднага маленькага звера, ён, узрадаваны, пабег да

сваіх суродзічаў. Майстра не крычаў «эўрыка!». Ён не ведаў яшчэ, што адкрыў скульптуру. Але суродзічы радасна глядзелі на дыназаўрыка. І тут было не толькі мастацтва: цяпер ужо людзі не так палохаліся дыназаўраў — і сапраўды, чаго ж іх баяцца, калі іх можна выгрызаць зубамі са звычайнага кораня...

Потым былі пошукі. Захацелася паспрабаваць свае здольнасці ў новым матэрыяле — у камені, але зубы камень не бралі. Новы матэрыял патрабаваў новага інструмента... Пакінем яго, дарагія чытачы, аднаго — хай падумае. Не хвалюйцеся, ён знойдзе адпаведны інструмент. Ён яшчэ створыць сваіх маўклівых каменных ідалаў, якімі будзеце захапляцца, здзіўляцца і вы, многа да чаго раўнадушныя ў сваім XX стагоддзі.

Яшчэ ў сваім першабытным дзяцінстве дзікун некалі пазайздросціў птушцы ў палёце. З таго часу ён мысліцель. З таго часу яго думка настойліва працуе над тым, каб абавязкова навучыцца лятаць. Навучыць свае рукі быць крыламі. Што ён толькі не рабіў дзеля гэтага: і прывязваў крылы да рук, і ўзвіваўся ў неба на паветраным змеі, і падаў са званіц, і разбіваўся насмерць. І ўсё ж дамогся свайго, перамог птушку — сёння ён лятае лепей за яе.

Наогул, мне здаецца, чалавек у сваіх адкрыццях часта ішоў ад казак. Спачатку ў сваіх казках ён выдумляў нешта нерэальнае, але вельмі патрэбнае яму, а потым настойліва шукаў, каб спраўдзіць свае мары, ажыццявіць надсвядомыя прароцтвы: асядлаць вецер, падпаліць ваду, замарозіць полымя... А калі яму ўдавалася на самалёце, скажам, асядлаць вецер — божа мой, колькі было радасці і пахвальбы!

Чалавек спрадвеку любіў пахваліцца і перабольшваў часам свае сціплыя дасягненні. Скажам, навучыўся браць у рукі палку, навучыўся махаць ёю — і закрычаў: маўляў, вось ён, век розуму, высокая ступень развіцця, пра найвялікшую цывілізацыю нават успомніў. І, захоплены сваім дасягненнем, нават бажыўся, што ўсё ўжо адкрыта і ніхто нічога болей не вынайдзе. Потым вынайшаў кола — век розуму, паравоз — найвялікшая ступень развіцця, электрычнасць — небывалая цывілізацыя... А што ж тады такое космас, высадка чалавека на другой планеце? Многа гэта ці мала? Многа, але мала. Бо, мне здаецца, некалі на фоне найвялікшых адкрыццяў будучыні і гэта будзе выглядаць як колішняе радаснае асваенне палкі першабытным чалавекам.

А пакуль што чалавек адкрыў сабе палку — як працяг свае рукі, як сродак працы. І яшчэ не паспеў ён нацешыцца гэтым адкрыццём, як адчуў, што яна балюча выцяла яго па спіне: гэта хітрэйшы суродзіч, які цішком падглядаў за ім, паспеў выкарыстаць ужо яго першае вынаходства і гэтым самым узвысіўся над вынаходнікам.

Часта да адкрыццяў (і вялікіх і малых) падсуседжваліся змрочныя Мефістофелі. Першы друкарскі станок Гутэнберга, вялікае дасягненне чалавецтва, адразу ж пасля вынаходства быў абняслаўлены, зганьбаваны — на ім пачалі друкаваць індульгенцыі на дараванне грахоў.

Вучоныя спрабуюць спазнаць жывую прыроду. Навучыцца разумець, як і пра што размаўляюць паміж сабою рыбы, птушкі, мурашкі. І часцей за ўсё недзе побач круціцца свой Мефістофель. Тады, запісаўшы, скажам, усхваляваныя галасы рыб, мы зазываем цэлыя касякі ў трал ці ў сетку. Зазываем запісанымі на магнітафон крыкамі любоўнай страсці ці радасным і спакойным голасам — маўляў, смела плывіце сюды, тут усё добра. Вось так мы і абрываем даўнія добрыя сувязі чалавека з прыродай. Хаця, мусіць, такіх ідэальных сувязяў ніколі і не было. Нават у сваім дзяцінстве чалавек часам варагаваў з прыродай. Галодны, ён, з найвялікшай цяжкасцю выгадаваўшы, выспеліўшы невялікі агонь, падпальваў лес, каб выгнаць адтуль звяроў, жывёл, птушак,— яму хацелася есці, а ў лес ісці было боязна, ды і паляваць там нязручна. Калі ўсё жывое, уцякаючы ад пажару, выбягала з лесу, ён лавіў, можа, толькі якога-небудзь аднаго зайца, а дрымучы лес гарэў тады вельмі доўга...

— І ўсё яшчэ дыміцца...

Я здрыгануўся, як на спірытычным сеансе. Мне здалося, што Толя Наседкін, з якім мы сядзім разам у кабіне, увесь час ішоў следам за маімі думкамі і вось цяпер прадаўжае перапыненыя разважанні. А можа я, задумаўшыся, загаварыў нават сам з сабою ўголас?

— Што дыміцца? — насцярожана спытаў я.

— Тайга дыміцца... Два тыдні ўжо, як патушылі пажар, а яна ўсё куродыміць. Гэтулькі кубаметраў гатовага лесу згарэла. І выратаваць не змаглі. Як пыхне штабель — нібы карабок запалак. Мы толькі вывозіць збіраліся, але дождж крыху затрымаў. А такія хлысты былі! Па 25—30 метраў кожны, у некаторых нават кубаметраў па 12 драўніны было. Вы ж ведаеце наш сібірскі лес? Станеш паміж кедраў — як усё роўна паміж калон магутных стаіш.

Разумеецца, неяк мы адправілі ў Грузію кедровы камель (мусіць, метра паўтара ў дыяметры быў) і напісалі на ім: «Прывітанне ад сібіракоў!» Вярнуўся назад вагон, і камель таксама вярнуўся — не змаглі выгрузіць.

Потым, разумеючы, што мяне, чалавека, які ўпершыню трапіў у тайгу на лесараспрацоўкі, павінна зацікавіць, Толя расказвае, як складаюцца брыгады лесарубаў:

— У кожнай брыгадзе ў нас па 5 чалавек — вальшчык, памочнік вальшчыка, трактарыст, чыкіроўшчык (гэта той, хто хлысты чапляе) і сучкаруб...

Але тут нечакана з тайгі выбег пастаўлены на невысокія кедровыя круглякі вагончык, з бляшанага камінка якога ўздымаўся дымок. Лесарубы якраз палуднавалі. З вагончыка смачна пахла смажанаю бульбаю.

Пачаў накрапваць дождж. Сцішна, спакойна загагатаў гром. Мы ўсё ж пайшлі ў тайгу — адсюль, ад вагончыка, да яе таксама трэба яшчэ ісці. Толькі паспелі ўбегчы ў палац выносістых сасновых і кедровых калон, накрытых шумлівай зялёнаю страхою, як дождж вырас у лівень, чохнуў, што з вядра. Тайга зашумела, зашастала, залопала, загула. Пасур'ёзнеў гром. Ён лопаўся, здавалася, над самай галавою, гулка рассыпаўся і потым, задаволены, ва ўсе бакі каціўся па тайзе, падскокваючы на купінах, спатыкаючыся аб пні — гох, гох, го, го, го...

А над усім гэтым — тайговая маланка.

Я веру, што сцішанымі зімовымі прыцемкамі чысценькі, беленькі, маладзенькі снег, які толькі што нападаў, бывае сіні-сіні — як усё роўна святочнае вясновае неба.

Я ведаю, што ноччу светлая блакітная вада здаецца чорнай, як дзёгаць,— седзячы ў лодцы, зачэрпнеш яе рукою, і яна табе здасца нават вязкай.

А маланка ў тайзе бывае зялёная. Яна зялёна шуршала недзе над намі ў зялёных кронах, атрасаючы на нашы галовы зялёнуюігліцу, як зялёная вавёрка, пераскоквала з дрэва на дрэва... Яна таропка жыхала па зялёнай тайзе — здавалася, шукала, дзе б схавацца ад зялёнага грому. І, мусіць, усё ж знаходзіла такую схованку, бо, калі ляскаў гром, яе ўжо не было відаць. Яна хавалася недзе ў кронах. А там маланку не знойдзеш — яна, як і кроны, таксама зялёная...

З тайгі я рашыў выбірацца на лесавозе. Ноччу ішоў цягнік, на які мне трэба было паспець. Толя Паседкін паехаў у Завусоўку, а я астаўся чакаць, калі нагрузяць лесавоз.

Дождж сціх. Лесапагрузчык асцярожна браў са штабеля па адным доўгія хлысты, а здаралася — і па два нават, асцярожна падымаў над сабою — бервяно, нібы вялізная гнуткая рыбіна ў ката ў роце, спрабуючы выслізнуцца, трывожна выгіналася і спружыніла,— а потым, пад'ехаўшы да лесавоза, далікатна, нават ювелірна, клаў на прычэп гэты хлыст, які, і ўлёгшыся, доўга яшчэ спружыніў тонкім сваім хвастом.

Нарэшце шафёр, драбнаваты з твару мужчына сярэдніх гадоў, запрасіўшы мяне ў кабіну, цяжкавата скрануў з месца лесавоз. Выехалі з тайгі на асноўную дарогу — мокрую, гразкую пасля дажджу. Прайшоў ужо той ніякаваты момант маўчання, якія звычайна бываюць, калі незнаёмыя людзі не ведаюць яшчэ, з чаго пачаць размову, і хапаюцца то за надвор'е, то за машыны, але гаворка ўсё роўна, хоць ёсць мноства тэм, абрываецца пасля двух-трох нязначных пытанняў ці адказаў.

А мы ўжо трохі разгаварыліся. Стала цёпла і радасна — едзем...

Раптам невялічкі пагорак падпіхнуў наш лесавоз, і той пабег уніз трохі хутчэй. А набраўшы хуткасць, не паспеў убачыць павароту (таксама невялічкага) — і вось мы ўжо сядзім у кювеце. Мне падумалася, што вінаваты я (загаварыў, маўляў, чалавека), але, вылезшы з кабіны, упэўніўся, што гэта не так,— колы метраў трыццаць сунуліся як не ўпоперак: шафёр даўно выкруціў амаль усю баранку, але лесавоз не слухаўся. Машыну цягнула ў кювет цэлых трыццаць кубаметраў лесу. Мы паспрабавалі падкласці пад колы галля. Дзе там! Паспрабавалі таўхануць плячом — два асілкі знайшліся!.. Стаіць як укапаны.

Шафёр выключыў матор. На дарозе стала ціха-ціха. Здалося, што ў тайзе ў гэты час былі толькі адны мы.

Вечарэла. На небасхіле спела новая навальніца. А тут яшчэ не прасохла ад папярэдняга дажджу — на чаравікі наліпала столькі гразі, што іх ніяк нельга было адарваць ад зямлі: з імі, здавалася, падымаецца ўся дарога. Узрадаваны, прадчуваючы добрую вячэру, звінелі ля нас камары.

І якраз у той момант, калі я зразумеў, што тут, пэўна, давядзецца і начаваць, калі ўжо такім далёкім і недасягальным здаўся мне цягнік, якім сягоння ноччу я думаў ехаць, пачуўся далёкі прыглушаны бас машыны. Неўзабаве з-за ўзгорка паказаўся ЗІЛ-157. Ён ішоў смела — што яму, у яго ж усе тры масты вядучыя! Ён падчапіў наш ле-

савоз, лёгенька выцягнуў, і той паспешна пабег за ім, віхляючы задам і ўвесь час з'язджаючы з дарогі на абочыну. Скора мы ўбачылі яшчэ адзін лесавоз — ён, нібы шлагбаум, перагароджваў дарогу, пярэднія яго колы былі ў правым кювеце, заднія — у левым. ЗІЛ адчапіў і наш лесавоз: з ім далей не паедзеш. Я перасеў у кузаў, і ЗІЛ цераз кюветы, напралом па тайзе, ломячы дрэўцы і кусты, падскокваючы на пнях, аб'ехаў лесавозы і памчаў у Завусоўку.

З Завусоўкі я ехаў на гэтай самай машыне. Па ўсёй дарозе ў кюветах, нахіліўшыся набок, драмалі лесавозы — яны чакалі, калі прасохне дарога, калі загрукоча побач цягач, выцягне іх, словам, чакалі, калі можна будзе, паддаўшы хуткасці, паспяшацца дадому.

На свой начны цягнік я ўсё ж паспеў. Сеў у вагон, і адразу такімі далёкімі-далёкімі, як у сне, здаліся і сама тайга, і навальніца над ёю, і дарога з лесавозамі ў кюветах...

Падумалася, што і на гэты раз я не пабачыў сапраўднай тайгі. Такой, пра якую я думаў. Што ж — значыць, у мяне яшчэ наперадзе радасць новай, сапраўднай сустрэчы з ёю. Але ж тайга падарыла мне сваю зялёную маланку. Пройдзе час, многае забудзецца, некаторыя ўражанні стануць цьмянейшыя, а вось гэты мой тайговы сувенір — зялёная маланка — заўсёды будзе радаваць і асвятляць часам і не зусім светлыя мае дні і клікаць у новыя падарожжы...

## САМАХОДЫ

*Змест сшытка. Цягнік ідзе па пракосах. Чаму беларусы пахнуць тайгою. Са сваёй царквою на калёсах. Мядзведзевы дзесяціны. З кім Цярэшкава жонка спала. Пярэпалах у мерлагу. Каго Алёшка за вуха ўкусіў. Віно з пукой. Дзве Усцінні ў адной хаце. 18—2. «На чорта табе той конь». Ці дояцца пчолы. Ці можна «абманіць» кулаком поле. «Добрай раніцы» на пеўневай мове. «Хто прыйшоў?» Песні на сняданне. Жыццяпіс дзеда Аляксея. «Ты» ці «вы». Беларускія сібіракі.*

Асцярожна, нібы чайка на хісткія хвалі, на вялікі, выкруглены спаміж тайгі востраў бела-зялёнай, схвалячанай і ўскудлачанай ветрам травы нячутка садзілася жоўтая мятлушка. Яна доўга вісела над самай высокай травінкаю і неяк паспешліва, хапатліва трапятала крыльцамі, пакуль не адважылася сесці. І нават сеўшы, нават моцна ўчапіў-

шыся тоненькімі ножкамі за зялёны травяны кasнічок, які аж загайдаўся над ёю, усё яшчэ махала напятымі крыльцамі, усё яшчэ баялася іх скласці. Так і ўпала яна разам з травінoю ў халаднаваты густы пракос.

Быў сенакос. Поўдзень Сібіры касіў. Нават лёгенькі вецер-тайгавік замест вечнага паху кедровай смалы водарыў сенам. Вецер дыхаў роўна, спакойна, як сонны чалавек: удыхне паветра — і халадок, аблашчыўшы твой спатнелы твар, прашапаціць у адзін бок; выдыхне — і ён паспяшаецца ў другі бок, а ты да наступнага ўдыху адчуваеш, як сёння горача,— аж задыхаешся.

Па Сібіры ішоў ліпень. Ён ішоў паспешна, высока падымаючы ногі, бо не па-сібірску шчодрае сонца так нагрэла зямлю, што босаму можна было апячыся. Ліпень абіраўся ад дзяркатых сяпінак (а яны віселі і на кустах, і на платах, і на дрэвах), вельмі ж ужо ўважліва глядзеў сабе пад ногі, каб, крый бог, не зачапіцца за пракос ці за якую копку сена.

Цягнік, які вёз мяне з Краснаярска ў Ніжні Інгаш, здавалася, сышоў з рэек і ідзе па сене. Ён вельмі спяшаўся — мусіць, разумеў, што сярод пасажыраў многа людзей, якім не цярпіцца хутчэй даехаць да сваіх вёсак, якім рупіць хутчэй выйсці на свой луг ці дабрацца да нагледжанага раней астраўка травы ў тайзе.

Усю раніцу цягнік татахкаў па саміх пракосах — яны з шоргатам клаліся, здавалася, аж пад самыя колы. Потым, крыху пазней, калі спала раса, з акна вагона было відно, як жанчыны растрасаюць пракосы і складзеныя ўчора копкі прывялай травы. Недзе пад полудзень за акном ужо варочалі сена, а яшчэ пазней, пад самы вечар, складвалі зноў у копы — каб не адсырэла.

І ўсюды прыкметы сенакосу. То сустрэнеш чалавека на веласіпедзе: да рамы прывязана каса, ля самай дзюбачкі якой асталіся травінкі (як акуратна ні абціраў яе гаспадар, усё роўна асталіся!); то ўбачыш, як муж з жонкаю цягнуць калёскі з травою, а наверсе, як на сёмым зялёным небе, сядзіць малое; то размінешся з матацыклам, на люльку якога навалены цэлы воз накошанай травы, трохі запыленай ужо ззаду, а зверху яшчэ ўскінуты мяшок з сенам — мусіць, нехта папрасіў падвезці...

Па Сібіры ішоў сенакос.

Нават у вёсцы Стрэценка, у канторы калгаса «Рассвет», куды я прыехаў з Ніжняга Інгаша, стаяла цішыня — усе былі ў тайзе, на сенакосе. Толькі адзін чалавек настойліва

дамагаўся кудысьці дазваніцца і ўсё ўгаворваў неўгаворлівых тэлефаністак:

— Вы Кавалеўскага далей адсуньце, ён наспее яшчэ нагаварыцца. А мне во на накос трэба ехаць.

І па тым, як гэты чалавек гаварыў, я зразумеў, што трапіў якраз туды, куды даўно спяшаўся і што так настойліва шукаў у Сібіры.

Я быў у Беларусі. У Беларусі, якая ў стаптаных лапцях прыйшла сюды, у нечапаную тайгу, прынесла сюды сваю мову, песні, звычкі і абрады, а сама назаўсёды прапахла тайгою кедрачоў, лісцвяжніц ды няласкавых сібірскіх маразоў. Тут жыве Беларусь-перасяленка, якая самаходам доўга ўцякала сюды ў халады — ад голаду. Прытэпаў, скажам, сюды некалі дзядзька Тамаш, ушчаміўшыся неяк з дапамогаю вострай сякеры ў гушчар, паставіў там хату — і ўжо назаўсёды тут, у Сібіры, з'явілася Тамашова тайга; высек сабе па хату магутныя лісцвяжніцы дзядзька Каваль, паставіў пяцісценку на высокім узгорку (усё ж адсюль далей відна дарога дадому), і ўжо гэтая мясціна назаўсёды стала Кавалёвай гарой; вялікі кедрач, упершыню пакладзены цераз маленькі ручаёк дзядзькам Казаком, пакінуў назаўсёды назву гэтаму месцу — Казакоў мосцік.

— А вунь у Нова-Пакроўцы Кур'яновіч Хама жыве. Спытайцеся Хаму — ніхто не ведае, а Тамаша кожны, нават дзіця малое пакажа.

Паступова ў канторы прыбаўлялася народу — у вёсцы заўсёды любяць пагаварыць з незнаёмым чалавекам. Праз нейкі час я ўжо ведаў, што Стрэценка раней называлася Кукліна, а новае імя ёй далі пазней, па просьбе нейкага вельмі набожнага чалавека, які хадзіў з прашэннем кудысьці дужа далёка — аж дзве пары лапцей стаптаў. Тут жа, нібы на імправізаваным канцэрце мастацкай самадзейнасці, я праслухаў на беларускай мове (цудоўныя пераклады!) «Інтэрнацыянал» і «Марсельезу». Дзіўна было тут, за тысячы кіламетраў, чуць «Інтэрнацыянал» па-беларуску:

Ніхто не дасць самохаць волі,
Ні бог, ні цар, ні багатыр...

Мне расказалі, што ў Кукліне жывуць адны беларусы (маўляў, «здаецца, толькі адна сям'я руская, ды і тая ці не з-пад Віцебска»); што большасць перасялілася яшчэ да рэвалюцыі («а пасля вайны хто ж гэта прыехаў да нас, ці памятаеце,— яй жа богу, толькі Сядніха, Каптурыха ды

Віталіха?»); што ўсе перасяленцы вельмі любілі ранейлапці («а што — мякенька сабе; і, бывала, па печапаным снезе як напаходзім — здасцца, што гусі яго натапталі...»); што ўсе тут пішуцца рускімі («мала што гаворым, але ж якія мы беларусы, калі чытаць па-свойму не ўмеем!»)...

Яны, беларусы-перасяленцы, ці самаходы, як іх называлі чалдоны — ранейшыя перасяленцы з Чала і Дона, абжывалі тайгу і ў Байкалове, і ў Нова-Аляксандраўцы, і ў Раманаўцы, і ў Гарэлым Барку, і ў Малінаўцы, і ў Іванаўцы, і ў Плашкіне, і ў многіх іншых дзікіх мясцінах, якія потым ужо сталі вёскамі. Гэтыя вёскі амаль поўнасцю заселены беларусамі, і таму няма ніякага дзіва, калі людзі, сабраўшыся разам на вяселле ці на хрэсьбіны, нейкім далёкім, вельмі шчымлівым і падсвядомым інстынктам, мусіць, якраз такім, які восенню ні з таго ні з сяго пачынае раптам трывожыць і непакоіць птушак, нават тых, што яшчэ ніколі не былі ў выраі,— такім інстынктам людзі ўспамінаюць сваю радзіму, і тады ў бяседу прыходзяць нашы беларускія песні, прывезеныя дзядулямі і бабулямі з-за той далёкай дарогі, песні, ад якіх вельмі ж ласкавее кожнае застолле.

А такіх вёсак у Ніжне-Інгашскім раёне вельмі многа, бо ўвесь раён — амаль поўнасцю беларускі. Многа іх і ў самім Інгашы. То раптам у гасцініцы дзяжурная раскажа табе:

— Мы ж таксама адтуль, ад вас. Наша мама і цяпер бліны любіць пячы. Устанем раніцою, чуем, што скварада ляскае,— ну, вядома, зноў бліны пячэ. Мы-то неяк да бліноў вялікай ахвоты не маем, а яна ўжо смачна есць іх са скваркамі ды ўсё падхвальвае. Пад'есць, а потым кажа: «Ну во, як усё роўна дома пабыла, у хаце бацькавай паснедала».

То потым ужо ў вёсках даведаешся, што маці першага сакратара Ніжне-Інгашскага райкома партыі Хведара Казлова, цётка Марына, вельмі ж хораша спявае беларускія песні (а ведае яна іх многа — можа цэлы тыдзень спяваць). А калі пачуеш, што сын дужа цікавіцца гэтай матчынай радасцю і запісвае яе песні на магнітафон, пашкадуеш, што не можаш сустрэцца з гэтым чалавекам,— сакратар райкома партыі цяпер якраз у адпачынку.

А то трэці сакратар райкома Васіль Камовіч, з якім мы ехалі ў Кукліна і якому я прызнаўся, што засумаваў па маладой бульбе з маласольнымі агуркамі, узрадаваўся:

— Вось яно што! А я ўсё думаю, адкуль гэта нашы

яду такую выдумалі. Разумеецца, наліе місу вялізную расолу, накрышыць туды агуркоў маласольных, а ў другую місу чыгунок бульбы маладой адваранаї аберне, масельцам яе залагодзіць ды ўкропам падсвяжыць — і тады сёрбае, што аж нос угінаецца. Разумееце, а мая маці, колькі я ні вучыў, не адвыкла — усё і цяпер гаворыць «а чаго?», «а куды?». А калі я яшчэ малы быў і на сенніку спаў, то ўсё думаў — чаму гэта матрац называецца сеннікам. Ён жа набіты не сенам, а саломай. Аж гэта дзед прывёз, пэўна, з сабою гэтае слова.

Так, разам з пяхітрым скарбам, узятым у далёкую дарогу, людзі везлі з сабою ў невядомы край сваё спрадвечнае, звыклае, як штодзённы ўсход сонца, абжытае, як свая маленькая хатка, слова. У дарозе людзі захіналі яго лайном ад дажджу і ветру разам з галапузымі малечамі, якія дурэлі на возе; адаграваалі ад ранніх сібірскіх замаразкаў разам з курамі і кацянятамі, якіх вельмі ж шкада было пакідаць ля апусцелай хаты. Песцілі разам са сваімі марамі пра новае, лепшае жыццё ў тайзе.

Таму і сёння ў беларускіх сібіракоў (ці сібірскіх беларусаў — якая розніца!) парэчкі называюцца толькі парэчкамі, журавіны — толькі журавінамі, бульба — толькі бульбаю, а хата (ну, вядома ж, як яшчэ можа называцца рубпа складзеная, хоць сабе і з кедрача, пяцісценка!) — толькі хатаю...

А тады, у канцы мінулага стагоддзя і ў пачатку гэтага, па ўсім Сібірскім тракце рыпелі беларускія калёсы. Рыпелі ад перагрузкі — на кожным жа возе ехала па дзесяць, а то і ўсе пятнаццаць душ сялянскай сям'і. Не лічачы лёгенькіх кацянят ды цяжкіх дум гаспадара. Таму не ўсе калёсы дацягвалі да таго месца, якое «самаходы» ехалі абжываць,— многіх з іх хапала, скажам, толькі да Омска ці Томска.

Тады трэба было купляць новыя. Але ж дзе ўзяць таго купіла? Воз і так ужо дужа палягчэў. Усё, што можна было, ужо даўно распрададзена. Што ж прыдумаць яшчэ? Ага, боты... Падумаеш, калі яшчэ тая зіма! Цяпер босы пайду, а там і ў лапцях можна будзе патэпаць зіму-другую. Вось прыедзем на месца, надзяру лыка, а анучы і з палы світкі зробім. Што ж яшчэ? Хіба вось святочныя жончыны ўборы... Але ж крыку-плачу будзе, не дай ты бог... Нічога, нічога, абыдзецца. Паплача ды сціхне. Мы з табою, маці, не на свята едзем. Там працаваць трэба будзе, а не гулямі займацца. А калі абжывёмся — не такія табе, На-

лагея, уборы справім: увесь Сібір залюбуецца... І яшчэ ў жонкі недзе там нейкая капейка на чорны дзень прыхавапая. Развязвай, Палагея, вузялок — той чорны дзень прыйшоў... Вось на калёсы як бы і хапае ўжо. Праўда, на колы яшчэ вобад не зашкодзіла б узбіць. Ды і швораня жалезнага няма... Што б гэта яшчэ прадаць? Не, няма чаго! І хоць сабе шкрабі за вухам ці не шкрабі — ні да чаго ты, Цімахвей, не дашкрабешся. Чакай, а хіба вось тапор? Э, не — не дуры ты, стары! Як выдумае што, дык няма чаго слухаць. Тапор — гэта ж як і рукі. Без яго ў тайгу няма чаго ехаць, няма чаго і рыпацца.

Бывай, Томск! Новыя калёсы зноў рыпяць па Сібірскім тракце коламі, на якія так і не ўзагнаны шыны, драўляны шворан ламаецца на кожным пагорку, і яго часта даводзіцца замяняць новымі, выструганымі на папярэднім прыпынку, а ля калёс, трымаючыся за драбіны, задумліва і цяжка тэпае босымі нагамі па захаладалых лужынах сам гаспадар.

А недзе там, да пярэдніх калёс абозу, прымацавана маленькая драўляная каплічка з абразочкам і маленечкім званам, якая замяняе ў дарозе царкву. Дай божа яму, рабу божаму Цімахвею, і ёй, рабе божай Палагеі, удачы! А то, можа, і ён, як той чалавек з вядомай карціны, не дацягне да месца, дзе можна надраць лыка і сплесці лапці, і не ўстане аднойчы з-пад калёс, пакінуўшы сцішэлых дзяцей і сплаканую жонку на гэтай чужой і пустой дарозе, між аглабель, якія здаюцца без каня нейкімі доўгімі, лішнімі, непатрэбнымі. А абоз з маленечкай цэркаўкаю на пярэднім возе, зацалаванай просьбамі і малітвамі, пойдзе далей і далей... Хутка ўжо, як ні ўслухоўвайся, нават чуйнае вуха не зловіць і самага далёкага рыпу калёс...

Але большасць самаходаў усё ж, здарожыўшыся, стомлена і асцярожна, нібы ў халодную ваду, уваходзіла ў гэты невядомы край. І атрымлівала свой надзел тайгі — з тайговымі ягадамі, якія ўжо асыпаліся ў траву, з птушкамі, якія раіліся, куды лепей ляцець у вырай, з зайцам, які, пятляючы, пастойліва ўцякаў ад ваўка, а то і з самім мядзведзем, які знайшоў тут куст запозненай маліны і цяпер, абіраючы ягады, засяроджана і задаволена мармытаў нешта сабе пад нос,— словам, атрымлівалі надзел з усім тым, што пад той час было на гэтых пятнаццаці тайговых дзесяцінах. Праўда, ягаднікі хутка жухлі, птушкі адляталі ў вырай, воўк выганяў зайца з гэтай дзялянкі, а мядз-

ведзь, абабраўшы маліну, ішоў далей у тайгу. І чалавек тады аставаўся сам-насам з шумлівым векавым лесам.

Праходзіў час, радзела тайга, а на месцы, аблюбаваным пад вясковыя могілкі, з'яўляліся першыя дрэвы без лісця і карэння — першыя крыжы. Радзела тайга, шырэў гэты крыжасты бор...

— А дзяцёнак ты мой! Як мы ў гэтую Сібіру прыехалі, тут жа яшчэ нікога не было. Праўда, як ехалі сюды, зусім не памятаю — я ўжо тут першы раз вякнула. Мама мая ў дарозе растрэслася (а яна мною якраз хадзіла, на саменькім россыпе была), і як толькі прыехалі — адразу ж і абрадзілася. А тут няма каму ні прыпяць мяне, ні хрысціць. Нікога няма — ні свата, ні брата. І хаты няма, дзе б можна было хоць калыску пачапіць...

Я з завучам мясцовай школы Надзеяй Сямёнаўнай Грахоўскай сяджу ў хаце Зінкевічаў. Мне параілі падысці да Міхала Несцеравіча — ён, маўляў, тут вельмі даўно, яго бацькі прыехалі як не першыя. Яму самому тады было гадоў чатырнаццаць. Цяпер дзед Міхал пачаў ужо дзевяты дзесятак. Але ён яшчэ сёе-тое робіць у калгасе — даводзіць да ладу вупраж: ці хамут падрамантуе, ці сядзёлку паправіць. Самога Міхала Несцеравіча я не заспеў — ён зранку павёз калоды сваіх пчол у тайгу.

— І пчолку, сынок, як тую кароўку, напасвіць трэба. Вось мой старычок узяў пугу і пагнаў нашых пчолак на пашу. А вечарам зноў дадому прыгоніць: даіць будзем. Тады і прыходзь. Пагамоніце,— супакоіла мяне бабка Марына.

Самой Марыне Кляменцеўне ўжо семдзесят гадоў. Але яна вельмі жвавая, рухавая — тут ёсць, тут няма. Мне вельмі ж не хацелася пакідаць гэтую хату. Я разумеў, што бабка Марына многа можа наўспамінаць.

***Расказвае бабка Марына:***

— Цяпер ужо лацвей жыць: і пад табой мякенька, і на табе крамнае. А даўней — нашыеш посцілкі-дзяругі, дык кастрына як дзеране, бывае, што хоць ты крычма крычы. Ды і падушкі былі мулкаватыя — ведама, з мякіны аўсянай. А дзе ж тады было што ўзяць? Сваё хватаем-хватаем, а нажнём — тады ў падзёншчыну на заробкі ідзём. Заробім троху, а потым самі сабе якую ватовачку пашыем і ходзім. Во як было. Я ў свайго дзеда Лукаша малаціла, коней яму паганяла, дык ён даў мне на падкладку. Занес-

ла я гэта, Надзя, твайму бацьку (а ён жа так добра шыў), а сама і думаю: «Пагадзі-тка, Марына, зажыла ты цяпер». Што і казаць, Надзя,— ты ж і сама гадоў у шэсць усё бегала мельніцу абмятаць і па хатах хадзіла прасіць. А што ж зробіш? Поїдзеш, калі есці няма чаго. Ды і я не ад дабра замуж у семнаццаць лет выскачыла. Алі добра, што такі чалавек хоць папаўся — пражылі век, а ён мяне ні збадзяў, ні скараў.

А Міхал за мной дужа ганяўся. А я ўсё ўцякала — дайжа і не думала за яго замуж ісці. Я ж, Надзя, з Алёшкам вашым любілася. А Міхал як толькі прыйшоў з вайны (я ў іх у той дзень малаціла), як увідзіў мяне, так адразу і пытаіць: «А гэта чыя?» Так і прыліп да мяне. Мы ж рапей Цярэшку жапілі. Ты ўжо, мой ты сынок, пе ведаеш, што гэта такое. Дык вось на танец Алёшка ні з кім не становіцца. А Міхал прыказаў — калі толькі стане са мною, дык увесь час будзе з вячоркі яго праганяць. А Алёшка, хоць і маладзейшы быў, усё ж пе паслухаўся — са мною стаў. І вось мы пяём:

Цярэшка жаніўся,
Пад лаўку зваліўся.
У Цярэшкі бяда стала:
З кім мая жана спала?
У полі пад ліпкаю
Спала з Піліпкаю,
А пад ёлкаю, ды пад горкаю,
Спала з Ягоркаю.

А Міхал, бачу, аж губы ад злосці кусае. Усё нешта з Міхеем Далідовічам гаворыць. А мы ж рапей усё ў Міхея гулялі. Хата прасторная, кругом лавы вялікія. Лавы старыкі займаюць — ну, і на здароўе: нам жа лавы не трэба, мы скачам усё. А потым мы ўжо, дзяўчаты, закуску нясём, а мальцы — водку, і хто з кім «ажаніўся», той з тым і сядзіць за сталом. І яшчэ наш дзявочы клопат быў — у тую хату, дзе гуляем, лучыны панапесці столькі, каб яе на цэлы вечар хапіла. А хлопцы ўжо музыку прывядуць. Тады ж гармонікаў яшчэ пе было — усё пад іскрыпку гулялі. Ці ў жалейку ігралі. Мой хросны, Губарпатарам яго звалі, дужа ў жалейку ўмеў іграць.

А я ад Міхала ўсё ўцякала. Неяк спалі мы з Арынай Міхалкавай у пас у пупі. Толькі гэта мы ўлягліся, чуем — сена шастае. Аж гэта Міхал з Міхеем мяне шукаюць. Мы знайшлі дзірку ў сене — акурат каля сцяны пе закладзена было — ссунуліся ціхенька туды. А яны ўсё шукаюць.

І бацьку майго дражняць — мол, што б ён гаварыў, калі б увідзіў іх: «Эй, быкі гэтыя, лазяць тут па сене, больш ім дык і дзелаць няма чаго». А мы сядзім і аж кіснем ад смеху, адна аднэй нават рот затыкаем, каб не рассмяяцца. Пашукалі яны, пашукалі — і пайшлі. А назаўтра вельмі дзівіліся, адкуль мы ўсё ведаем, калі мы ім пра «быкоў» расказалі.

А другі раз дык ён мяне на свіней узагнаў. Я яму каторы раз і сёння раскажу, дык смяецца. Ляжалі гэта мы ўжо ў Міхалкі на сенавале. А Міхал мяне шукаць лезе. Арына кажа: «Не лезь, яе няма тут». А ён усё роўна лезець. Я тады ў мярлог да свіней так і ссунулася. Свінні тыя як зарохкаюць, як надзелаюць віску на ўсё Кукліна. А Міхалка ж не знаіць, што мы там начуем. Во, думаю, выбежыць! Я тады ціхенька, ціхенька ды дадому. А месяц такі ўжо кругленькі, і так ужо ён стараецца свяціць, што мне аж боязна: увідзіць, думаю, Міхал мяне. Але ж не, прыбегла дадому, ціха на хату ўзабралася (каб жа і свайго бацьку не разбудзіць) і ў дзірачку ў франтоне гляджу. Чую — ідуць яны з Міхсем, а мой ужо і будзе казаць: «Во, ядры яе непь, увесь сенавал аблазілі — нідзе няма. Відаць, з Алёшкам некуды ўцякла».

Маладая была, дык і хлопцы бегалі. І яшчэ за мяне адзін чалавек дужа чапляўся. Змітра — быў такі хлопец у нас. Алі, ці паверыце, у мяне дайжа і душа да яго не ляжала. А ён у сваты да мяне прыходзіў. Гарэлку прынёс, на стол наставіў.

А тут яшчэ мой брат Пятрусь надвярнуўся. «Дурная,— кажа,— давай гарэлку нап'ём, а яму насля сплоцім». І што ж вы думаеце — напілі гарэлку. Гляджу, Зміцер мой вясёлы, смяецца ўсё, нібы смачны блін з'еў. На вячорках ён ужо ідзець, бацькам маім рукі цалуіць — дачку ж высватаў! А я на танцах з Алёшкам танцую, ён у мяне на каленях сядзіць. Падругі мне ўжо і гаварыць пачалі: «Цябе, сястра, за такое набіць мала». Што рабіць? Трэба ж плаціць за гарэлку. А ў мяне ж плаціла таго няма. Я тады да дзеда Лукаша: «А дзедачка, а міленькі, дай ты мне грошай, я хоць за бутылкі заплачу». Дзед, праўда, даў. Я яму адмалаціла за гэта: зноў копей паганяла.

І ўсё ж за Міхала замуж пайшла. Хоць і ведала, што яго маці скупярдзяйка несусветная. Няўжо я, думаю, Несцерысе не ўладжу? Бабе Лукашысе і то ладзіла, ужывуся і тут.

А мы ж дужа блізенька жылі. Вось насадзіў мяне ста-

рык мой у начовачкі і перацягнуў цераз вуліцу. А за ім і свадзьба пайшла. Мы, значыць, гэтае вяселле гуляем, а Алёшка дасадзіцца. А мы з Алёшкам увесь вечар перад вяселлем прасядзелі разам — усё цалаваліся, усё расставаліся і ніяк разысціся не маглі. Яно і цяпер калі-небудзь Алёшка возьміць ды і пашуціць. Во неяк, калі імяніны ў Зінкі былі, дык ён ішоў і за вуха мяне ўкусіў. Каб вы зналі, як Лісавета, жонка яго, прыраўнавала! А я толькі смяюся сабе — нам, старым качэргам, ужо трасца якая-небудзь нада, а не любоў тая.

А Алёшка тады ж у скорасці і ажаніўся на Лісавеце. Яна ж багатая была. Матка берагла яе, каб дайжа не загарэла.

Наплакалася я, мой ты сынок, ад сваёй свякроўкі. Масла і тое ад мяне хавала. Бывала, картошачку ачысціць, а масла збоку на ўслон паставіць. Калі мы адвернемся, памакне борздзенька ў масла, каб мы не бачылі, і тады ў рот, і есць гэту бульбіну як бы ўсухамаць.

Затаўку, бывала, выцягне, сама з'есць ці Арсею аддасць (гэта дзевер мой, пісарам працаваў, дык Несцерыха яму і паесці лепшае сабярэць, ды і ў крамнае ва ўсё адзеніць), а мы так сабе, на зацірцы жылі. І дзеткі мае ў бабы Несцерыхі на зацірцы выраслі. Каровы ж не было, а дзеці, ведама, малака просяць. А яна на лаве сядзіць ды і кажа мне: «Сучку падаі ды і дай ім». Во якая скупая была. А то заходжу я ў хату, а Маруся бяжыць (у мяне ўжо іх трое было) і як не плача: «Мама, есці хачу». Я і кажу ёй: «Ідзі, дачушка, вунь дзед з бабаю яешню ядуць, папрасі — яны і табе дадуць». Я кажу ёй так, каб яны чулі. А яны маўчаць, моўчкі ядуць, у скавароду абое глядзяць.

Несцер, свёкар — той, няма чаго бога гнявіць, нядрэнны быў чалавек. А Міхал мой дужа ціхі быў, слова не скажа. Усё маўчыць. Я ж ведаю, што яна табе матка, ты яе не карай, не бадзяй, а толькі скажы. А то, да слова, вужынаем мы, а яна на печы сядзіць і будзіць казаць: «Вы маю часць адсыпайце, а потым мне плаціце купіце». Я так зажалела, аж слёзы на вочы навярнуліся, ды і кажу: «Мама, мама, няго табе гэтай бульбіны нішчымнай шкода?»

А Несцерыха ўсё намячала. Неяк мне затаўкі дужа захацелася. Так замапулася — аж пахніць яна мне. Палезла я ў кубел і маленечкую-маленечкую (аж свіціцца) лісцінку гэтага сала адрэзала. Няго, думаю, пазнаіць? І што б вы думалі — пазнала!

Потым, думаю, дай-тку, я цябе хоць раз абхітру. Мы з

ятроўкаю, яе таксама Марынаю звалі (Васіль, другі дзевер мой, узяў яе ў мясаед і пажыў акурат да тройцы, а потым сам паехаў у Іланскае, а за ім і Аўгіння, ранейшая яго любоў, паехала), а мы, значыць, з Марынаю даведаліся, што ў пограбе ў Несцерыхі віно стаіць. Так лагушку, дзе гэтае віно было, не нагнеш — адразу свякруха пазнаіць, ды і паднімаць цяжка. І мы дадумаліся праз пукі яго піць. Ранічкаю спусцімся па вочарадзі адна за адной у пограб, пасмокчам трохі праз гэты пук, і так ужо нам захарашэе. Вясёлыя тады печ топім. Свякроў падазрона на нас паглядзіць, збегае ў пограб, каля лагушкі пакруціцца — не, усё ў парадку, знакі не парушаны. Ды і супакоіцца.

А мы як аддзяліліся, з амбара хату сабе здзелалі. Вось тады ўжо мы і зажылі. Несцерыха пасля зноў хацела, каб разам жыць, але я ўжо не згадзілася — на чорта мне нанава ў пекла лезці.

Ды і цяпер, слава богу, ёсць што з'есці. У нас і мядок, у нас і сала. Толькі ўжо есці няма каму. А як толькі мёд выкачалі, дык за дзень, яй жа богу, не лгу, чалавек дваццаць дзяцей пакарміла. Гляджу ў акно — ідзець Сярожа Вольчын і будзіць казаць Сашку: «Давай спросім, ці ёсць у бабы Марыны мёд». Я адчыніла акно ды і кажу ім: «А мае вы дзеткі! Ёсцека, ёсцека мёд. Хадзіце-тку ў хату». Наліла я ім па місачцы новага мёду, дык яны ўзялі гэтыя місачкі за беражкі і выпілі адразу — ведама, первіна!

Вунь, бачыце, і цяпер дзеці ўжо ля хаты табуняцца. А то неяк яны правінаваціліся. Убачылі ўдзень, што ў маіх градах парэчкі чырвоныя-чырвоныя, ды вечарам узялі і перакуліліся ў агарод цераз частакол. Мы б не зналі, але Ігналька ішоў якраз і заспеў. Потым і мёду хочуць, але ў хату зайсці сцісняюцца. Сядзяць там вунь, дзе равочак, быццам бы і гуляюць у неўшта, а самі ўсё па вокны ды на дзверы мае паглядаюць. Пасля яны ўжо мне прызналіся: «А парэчкі, мусіць, на ноч хаваюцца пад лісце. Мы ж днём відзілі, іх было аж чырвона, а ноччу ніводнай не знайшлі». Тады я іх сама паклікала: «Хадзіце ў хату, мёду дам. І ты, Саша, хадзі, не сцісняйся, ну — перакуліўся ў агарод, бывае ж такое гора. А ты ж такі беленькі, акурат як наш Саша, унучак мой».

Сынок мой у Краснаярску жыў. Неяк прысылаіць ён ціліграму: «Мама, прыязджай, хачу на цябе паглядзець». А мой ты дзяцёнак, як жа тут не паедзеш! Сабралася, села на поезд і еду. Зайшла ў уборную. Гляджу, аж туды такая старая, як я, заходзіць. Усе ж крашаныя едуць, а гэта аку-

рат як я. Я пытаюся ў яе: «А дзе ты будзеш злазіць?» Маўчыць. Мусіць, глухаватая, думаю. Старая ж ужо. Я тады з другога боку заходжу. «Ты можа ў Краснаярску сходзіш?» Зноў маўчыць. Гляджу, а на ёй мой жэмпер і хустка мая. Пагладзіла я рукою — аж гэта зеркала. Выходжу я ў калідор, мужчыны стаяць, кураць. Во, недзе, думаюць — дурная баба, дзеравеншчына, сама з сабою гаворыць.

Якраз як тая Нюшка. Прыехала гэта яна першы раз у Інгаш, стаіць на вуліцы, за рукаў кожнага, хто ідзе, хапаіць і ўсіх пытае: «Ці знаеце вы маю цётку Лёксу і дзядзьку Змітру?»

Няма ўжо майго сыночка, пяць гадкоў, як няма. Я Валі, нявестцы сваёй, і кажу: «Выхадзі другі раз замуж». А яна: «Хіба я, мама, знайду другога такога добрага чалавека, як наш Коля».

А яшчэ ў пазапрошлы год на стрэчанне выдумалі наша залатое вяселле гулядь. Я дужа не хацела — яшчэ ж толькі год і сем месяцаў прайшло, як Колі не стала,— але мяне ўгаварылі: «Ты ж, кажуць, нічым гэтаму не паможаш, хоць і сама ў магілку лажыся». Угаварылі, хоць мне і нявесела было. Але ж людзі прыйдуць, трэба ж ім даць нешта і выпіць, і закусіць. Мы самагонкі нагналі, два яшчыкі казёнкі купілі. Восем сталоў было. Гулялі ў нас два дні і яшчэ на трэці пахмяляцца прыходзілі. Калхоз машыну сціральную мне купіў. Хацелі буфет прывалачы, а старшыня, Жураў, кажыць: «Лучшы асвабадзіця старухін труд».

А мае ж вы дзеткі! Загаварылася з вамі і забылася свінням даць — чуеце, як вішчаць?..

Гэтую непасрэдную, шчырую споведзь бабкі Марыны я запісаў так, як яна вылілася,— мне не хацелася мяняць тут ніводнага слова. І, мне здаецца, кожны заўважыць, як натуральна, нягледзячы на многія рускія словы, гучыць у Сібіры яе беларуская мова — мова чалавека, які нарадзіўся ўжо тут і ніколі не быў у Беларусі.

Бабка Марына пабегла даваць свінням, заспяшалася дадому і Надзея Сямёнаўна Грахоўская (хоць у яе і канікулы цяпер, але ж работы і дома хапае — на ёй жа ўся гаспадарка ляжыць), а я пайшоў удоўж шырокай вуліцы, пасярод якой калгас насыпае яшчэ адну — добрую, нягразкую — дарогу. Дзве вуліцы, якія і ўтвараюць Кукліна, ра-

зам нагадваюць літару «Т». Але ж такоі бачаць гэтую вёсачку, мусіць, толькі буслы ды самалёты — зверху. А тут, на зямлі, мне трэба дайсці спачатку да праўлення калгаса, а там павярнуць направа, на другую вуліцу, і недзе ўжо за магазінам шукаць хату Усцінні Ляўданскай — цётка Усцiння, як мне сказалі, таксама даўно нерасялілася ў Сібір.

Вось і магазін. Вось і тая хата з блакітнымі аканіцамі, на якую мне наказалі. Жанчына старатліва фарбуе ганак.

— Ці тут жыве Усціння Ляўданская? — пытаюся.

Жанчына хуценька выпрасталася, тыльным бокам рукі, у якой быў пэндзаль, адхінула з твару пасму валасоў, направіла касынку і, нібы засаромеўшыся, адказала:

— Я Усціння Ляўданская.

Я здзівіўся. Гэтая маладая жанчына — даўняя перасяленка, якая прыехала сюды аж у 1899 годзе? Заўважыўшы гэта, жанчына супакоіла мяне:

— Але ў нас дзве Усцінні. Маці мая таксама Усціння Ляўданская. Калі вам трэба маці, то вунь яна якраз ідзе з магазіна.

Гэтую бабульку я толькі што на дарозе абагнаў. Вось як бывае, калі не ведаеш чалавека. А яна дайшла да канавы і паклікала:

— Усціння, хадзі праз гэтую канаву неравядзі, а то я сама няўздолею. Панакапаюць, чэрці, ямак, а ты тут ногі ламай. Калі яшчэ тая дарога будзе, а па вуліцы ўжо нельга прайсці.

Бабка Усціння доўга ўсё глядзела на мяне, прызнаючы ва мне сваю радню, але, так і не прызнаўшы, спытала:

— Дык чый ты ўсё ж будзеш, скажы. Радні многа, дык я ўжо і не пазнаю, мусіць.

Доўга растлумачваў (бабка Усціння ўсё не верыла), што я ніякая не радня, а прыехаў, каб зірнуць, як яны, перасяленцы з Беларусі, жывуць тут. Калі наверыла, загаварыла:

— Прыехалі сюды мы даўно ўжо. Мне тады толькі чатыры гадкі было. А цяпер ужо, бачыш, семдзесят чатыры. А маёй старшай сястрыцы наогул на сотню палезла, нятошта. Ды і маёй дачцы першай пяцьдзесят пяты пайшоў — во толькі нядаўна імяніны спраўлялі. А Усціннюю вы ж самі бачылі — яна ў мяне дзесятая нарадзілася. А ўсяго, добры чалавек, васемнаццаць дзяцей было. А як бачыш — асталіся толькі дзве дачкі, а ўсе тыя паўміралі. Схопіць малога жывоцік — і ўсё. Дахтароў жа не было,

бальніца толькі ва Усціянску. А гэта аж за дваццаць восем вёрст. Паспрабуй завязі яго туды хуценька... Акыш, каршуны праклятыя! Толькі для вас тут і красілі!

Певень і курыца, якія стаялі на поручнях ганка і ўжо збіраліся саскочыць на толькі што пафарбаваныя прыступкі, спалохана залопалі крыламі і неяк бокам зляцелі ў гародчык пад вокнамі.

— Першы сюды прыехаў Сямён, бацькаў родны брат. Ды і хросны ўсё пісаў, каб ехалі. Вось мы і сабраліся — бацька, маці і нас шасцёра. Я помню толькі, як плакалі ўсе, калі нас праводзілі. А ехалі мы з вёскі Заскавічы Вілейскага павета Віленскай губерні. Едзем мы сюды (гэта з Іланскага ўжо), а на дарозе і чалавека не сустрэць. Ды і дарога такая, што толькі адна пазва — як калёсам прайсці, а то ўсё такая гушчэць, што і рукі не ўсунуць у тайгу, нятошта... А тутака во, прама на вуліцы, бярозы стаялі вялізныя — і ўдвух не абхапіць. А я, як толькі мы прыехалі, у той вечар і заблудзілася. На пяць крокаў у тайгу адышлася — і ўжо ніяк дарогі не знайду. Плачу і крычу, плачу і крычу. Але ніхто мяне не чуе. Сплакалася я, скрычалася ды і прылегла пад кустом. Ці не заснула нават, бо не чула, як крычалі, мяне клікалі. Прачнулася, а нада мной светла, як днём ці як пры пажары ўсё роўна. Людзі нейкія вялізныя з галавешкамі запаленымі ля мяне стаяць, ад агню страшныя-страшныя. Агонь палахліва мітусіцца па тварах. Ледзь пазнала татку і мамку, нятошта... Ты ж, Усціння, пэўна, гусянятам малым асобна не давала? Глядзі, як гэтыя разбойнікі іх адганяюць. Пайду я ім асобна насыплю.

Яна ідзе на прасторны шырокі двор. Я — за ёю.

— Вось так, добры чалавек, мы тут і абжываліся. Тут сяліліся, тут радніліся, тут, у гэтай тайзе, і першыя магілкі свае абжывалі. А тайгі спачатку наразалі колькі хочаш — колькі ўрабіць зможаш, столькі і бяры, нятошта... Гэта потым пачалі ўжо мераць. А пасля і калгасы прыйшлі. Мой гаспадар спачатку ўвайшоў быў у калгас, а потым (што яму ў галаву ўроілася) узяў і выйшаў. І, як на тое ліха, яшчэ і конь сам дамоў прыйшоў — ведама, прывык. Майму трэба было яго на агульны двор зноў завесці, а ў яго сілы не хапіла — расчуліўся і накінуў каня нанач у сваім хляве. Прыехаў міліцыянер, нятошта... А мой не даў каня і міліцыянеру: ён сабе повад цягне, а міліцыянер — сабе. А я якраз у царкве была. Прыходжу дамоў, а мне і кажуць... «На чорта табе быў той конь! — злуюся я на свай-

го.— Аддаў бы ты яго ды і жыў спакойна». Хутка майго і забралі. Дзесяць гадоў далі...

— Цётка Усцiння,— пачулася раптам з суседняга агарода,— колькі гэта трэба ўкропу ў агуркі класці?

— А ты што, ужо агуркі выбрала? Саліць нават будзеш? Відаць, многа павыбірала?

— Ды не! Капу нейкую пуплоў панашчупала. Мой жа маласольныя агуркі дужа любіць.

Неба паступова абкладала. Яно пачарнела спачатку з аднаго боку, там зажыхала маланка і завуркатаў гром. Потым хмары пасунуліся і з другіх бакоў. Бабка Усцiння ўважліва паглядзела на неба.

— Мусіць, загрыміць. Пайду хоць юшку закладу. Баюся я гэтай навальніцы.

Старанна закрыўшы юшку, яна села на ўслон і, нібы не было ніякага перапынку, казала далей:

— Але мой адседзеў толькі два гады. Потым уцёк. Пасвіў непадалёку тут скот, хлеба заробіў многа, нятошта... Вот я неяк запрагла каня, паклала кашалу на калёсы, у кашалу Усцiнню пасадзіла — ёй жа тады гадкі са тры яшчэ было — і паехала па той хлеб. А ў дарозе нас дождж дагнаў. Навальніца прыспела. Ды такая, што страх гасподні. Гром хляхоча не сціхаючы, пярун толькі і б'е, дождж як з вядра лье, а тут маланна як смаляне, як пекане недзе зусім побач! Кабылка мая — хоп! — і павалілася ў аглоблях. Я аж спалатнела ўся. Потым абслухалася — здаецца, жывая! Устала з кашалы (а ногі як ватныя сталі — аж трасуцца), узялася за аглоблю ды: «Кося, кося...» — кажу. Устала кабылка — жывая, значыць! Гэта ж яна ад страху ўпала, нятошта... Я толькі цяпер заўважыла, што ў нас поўная кашала вады. Гляджу, дзе там малая мая — а ў лесе цёмна, як усё роўна ноччу,— і пытаюся: «Ці жывая ты, Усцiнічка?» А яна з кашалы, як цяпер помню, ціхенька так шэпча: «Жывая, мамка». Ну, слава табе, божа, думаю...

— Мама, дык мы пайшлі ўжо.

— Куды вы ў самы дождж паедзеце? Хоць плашчы вазьміце. У тым жа баку якраз грыміць, нятошта...

Калі Усцiння-маладзая са сваёй дачкою, пераапрануўшыся ў спартыўныя касцюмы, выйшлі з хаты, бабка Усцiння ўсё не супакойвалася:

— Ну і дасць ім дождж — павымакнуць усе. Прыедуць мокрыя, хоць ты выкручвай. Але ж што паробіш — і ў дождж трэба ехаць каровак даіць. Яны ж даяркі. Праў-

да, Томка пядаўпа даяркаії работае. Яна ж цехпікум закончыла па асемяненні кароў. Але пакуль што гэтай работы няма, дык Жураў кажа: «Паработай, Тамара, сёлетні год даяркай, а тады ўжо за сваю работу брацца будзеш. І грошай трохі заробіш». Але якія сёлета ў даярак заробкі? Трава павыгарала, каровы надта малака не даюць. А нам жа капейка трэба. Мужчыны няма ў хаце — які гвозд забіць, і то прасіць трэба. Праўда, вунь наш мужчына. Міша, хадзі сюды! Але ж самі вы бачыце, што з яго возьмеш. Праўда, быў ва Усціпні муж — Мішаў бацька. Потым ён паехаў у Валгаград. Кажа, абжывуся там, тады і вас забяру. Пісьмы пісаў добрыя, нятошта... А тады Томка, малая яшчэ была, напісала яму запіску — захацелася расказаць ёй, як вучыцца. Адтуль свякроў піша ўжо: «Усціння, мы ж не ведалі, што ў цябе яшчэ адна дачка ёсць. Навошта ж ты нас абманіла». І сам тады ён напісаў: «Хопіць ужо нам, Усціння, паперу псаваць...» Ажаніўся там, потым усё аліменты прысылаў. А то неяк няма і няма. Мы — у розыск. Аж нам паведамляюць, што яго ўжо і ў жывых няма — засіліўся ў сваёй хаце. Гэта ўсё, напэрна, яго бацькі жыць яму не давалі. Ён жа сам харошы чалавек быў. І каб не паехаў у той Валгаград, то і жылі б тут у Кукліне з Усціпняю.

У хаце цёмна — як быццам шараю гадзінаю. Я выйшаў на вуліцу. Там ужо трохі пасвятлела, хоць хмары ўсё яшчэ пагрозліва клубіліся навокал і нехаця, нездаволена, буркліва распаўзаліся ў розныя бакі — нібы злаваліся, што нехта так і не даў ім абдажджаваць вось гэтыя хаты, гэтае Кукліна. Па-ранейшаму парыла. Але па ўсім ужо было відаць — дажджу не будзе. Нават тыя хмары, што так ваяўніча грымелі і бліскалі над тайгою, адыходзілі ўсё далей і далей.

На вуліцы зноў весела сакаталі куры. Яны павыходзілі са сваіх сховішчаў, пазляталі з седалаў, куды перад гэтым толькі што, спяшаючыся, хаваліся: ці то яны гэтую цемнату прынялі за ранні вечар, ці то адчувалі блізкую навальніцу і ўцякалі ад яе.

Іду зноў да хаты Зінкевічаў. Дзед Міхал, мусіць, ужо таксама прыгнаў свой «статак» з тайгі. Цяпер бабка Марына, мусіць, доіць сваіх пчолак.

Нават уявіўся нейкі несур'ёзны, жартоўны малюнак.

Сядзіць бабка Марына на маленечкім-маленечкім услончыку — такая далікатная і такая ласкавая —і пчалу ў соты доіць. А тая ад здавальнення толькі хабатком во-

дзіць ды крыльцамі трапеча. А каб яна, як кароўка, крыў божа, не брыкалася капытамі, якіх у яе няма, не махала хвастом, якога ў яе таксама няма (а то ж можа перакуліць соты ці пылу ў мёд натрэсці), бабка расказвае ёй розныя цікавыя гісторыі — ці тую, як дзедка яе цекалі ў свінячы мярлог загнаў, ці тую, як яна са сваёй ятроўкаю ў Несцерыхі віно праз пукі піла... Надоіць поўненькую, як вока,— аж выліваецца — ячэю, накрые маленечкай накрыўкай-лістком і ў наступную цыркае...

Міхал Несцеравіч быў ужо дома. Яшчэ з сянец я пачуў, што ён сварыцца з бабкаю Марынаю. Спакойна так, ласкава нават:

— Зноў ты, Марына, маімі нячытанымі газетамі гарлачыкі панакрывала. А во гэту, раённую, чуць знайшоў. Пад скварадою ўжо ляжала...

— А дзядок ты мой родны, а яна ж дужа ўдобная. Маленькая такая, пад сквародку пакладзеш — дык і кляёначка не гарыць,— таксама спакойна адказвае бабка Марына.

І я ўспомніў, як яна мне расказвала, чаму не дае Міхалу Несцеравічу чытаць:

— Ён жа вока адно ўжо страціў. Дахтары кажуць, што наменей чытаць трэба. А яго не адарваць ад кнігі ці ад газеты. Я і хаваю, я і сваруся ўжо. А толькі выйдзеш з хаты — ён кнігу барзджэй у рукі. Бразну клямкай — эх, хуценька закладзе ці лучынаю, ці нажом (што пад рукі нападзецца) — і ляжыць, як ні ў чом не бывала. «Ці не чытаў ты ўжо, старычок?» — пытаюся. «Ды не, не чытаў. Проста думаю, што трэба ісці падтопы з карча пашчапаць...» Хітруе так, бачыце.

Дзеда Міхала я якраз такім і ўяўляў сабе: у палатнянай кашулі з драўлянымі гузікамі-гуркалкамі, сівыя валасы вакол лысіны, вусы — белыя-белыя, як усё роўна пабылі ў малацэ, цёплы ласкавы позірк. Дзед Міхал сядзеў на самаробным табурэце, хамут ладзіў. Паглядзелі б вы на яго натхнёны твар! Можна было б падумаць, што ў гэтую хвіліну ён нават стварае свет. Мусіць, няма нічога прыгажэйшага ад таго, калі чалавек з радасцю, з асалодаю працуе — ці то ладзіць хамут, ці то сячэ дровы, ці то проста забівае патрэбны цвік.

***Расказвае дзед Міхал:***

— Паработалі тут мужычкі нашы, ой, паработалі. Увечары, цёмна ўжо, не відно нічога, а тапары стучаць. І ўран-

ні, яшчэ не развіднела, а тапары зноў стукаць. Увесь дзень на нагах. А лес які прыгожы быў! Сосны красівыя-красівыя. Сонцам, як золатам усё роўна, нацягнутыя. Як купалы тыя царкоўныя, блішчаць. Стройныя такія, гонкія, як званарні. Прыедзеш у лес — каб табе хоць адзін ніюшоначак: усе дрэвы стаяць, як у садзе ўсё роўна. Глядзі ды любуйся. Але любавацца асобенна не было калі. А пасля тайга зашумела: увойдзеш у лес, а тут, як на базары, шум стаіць — мужыкі на коней крычаць, ругаюцца, пілы шоргаюць, тапары звіняць. Прайшоў нейкі час. Перабылі зіму, перацёрлі лета. Глядзіш — у мужыкоў ужо і хаты з'явіліся, і стайкі для жывёлы, і пра свае лазні думаць пачалі.

А мы прыехалі сюды ўвосень 1903 года з Барысаўскага павета Тамілаўскай валасці. Можа чуў такія? Жылі там на футары, у памешчыка Масальскага работалі. Спачатку бацька прыехаў адзін сюды, як быццам на агледзіны. Пахадзіў, папаглядзеў, сена нават накасіў. А потым паехаў, распрадаўся там, нас з сабою забраў — і зноў сюды. Нейк гэта быстра ўсё ў яго палучылася — мы яшчэ тое сена зграблі, што ён накасіў. А тут у Іланскім нас яшчэ далей хацелі паслаць. Пісар кажа: «Можна і тут, але трэба пяцёрку». Далі яму тую пяцёрку — давіся ты ёю, злодзей! Ён нам і адпісаў тут тайгу. А тады ж ужо яе мерадь пачалі — цар даваў толькі па пятнаццаць дзесяцін на кожнага мужчыну. І па 150 рублёў грошай яшчэ. Але ж цар Мікалай дужа хацеў, каб мы на футарах сяліліся. А нашы мужыкі не саглашаліся — у дзярэўні жыць хацелі. Тут жа табе і паскоціну гарадзіць лягчэй, тут табе і яшчэ што якое іншае. Два тыдні сходка ішла. Землямер дужа заставуляў, аж турмою пагражаў. Казаў — яшчэ далей сашлём, але ўсё ж мужыкі перамаглі. Так вот Кукліна і радзілася.

А тут жа ўсё расло так, што аж, здавалася, зямлю рвала. Як станем жаць: дзве жмені — і сноп, дзве жмені — і сноп. А выкапалі бульбу, стаім ды дзівуемся: адна бульбіна — і ўжо вядро цэлае, другую і накласці няма куды. Не тое што нашы нарочкі.

Але і тут таксама гора хапіла. Спачатку чалдоны дужа недавольныя былі, што самаходы сюды прыязджаюць: ім жа прыходзілася пацяснішца. А яны тут тайгі напахапалі, заімак панаставілі, а ўжо раз заімка стаіць, то значыць, што навокал і тайга і зямля твая — што хочаш, тое і рабі з імі. Таму чалдоны ўзлаваліся: «Приехали, паря,

самоходы и все наши фрукты потопталн». А якія ў іх там хрукты — толькі назва адна: пукі, чаромхавыя ягады ды чарамшына яшчэ. Ты ці знаеш, што такое чарамшына? Яе сібірскім салам называюць. Гэта ж пер'е дзікага часнаку. Сёння з'ясі, а праз месяц яшчэ з рота пахне. А чалдоны нават нашых перасяленцаў забівалі, здаралася: «Чо, паря, подвезу»,— а тады і заб'ець.

Але ж і ў Сібіры было — каму як павязе. Адзін б'ецца-б'ецца, як рыба аб лёд, а ў яго нічога не палучаецца — і пашаніца вымакне, і капя мядзведзь задзярэ, свінні — і тыя не ядуць, а толькі бурзоняцца ў карыце, жыжачку адну хлебчуць, праз зубы цэдзяць. А другі, глядзіш, шустры такі (яго і ў мяшку не зловіш), праз год-другі — на табе — ужо і разбагацее.

А вунь тут недалёчка самаход адзін жыў — Рыгор Парцяпкін. Дык ён усё хлеб з булкаю, нібы з салам, еў. Бывала, жуе сухі блін-цадзень, а сам давольны такі і ўсё прыгаварвае: «Блін не клін — жывот не расколе». Усё яму неяк не ручыла. Праўда, ён і сам быў трохі гультаяваты. Поле сваё ўспашыць адзін раз — і ўсё. А потым сеіць шкадуючы — па дзве зерніны ў руку з сявалкі бярэць, а робіць выгляд, што пашаніца аж праз пальцы цэдзіцца — у кулаку не месціцца. Мой бацька казаў яму: «Ты, Рыгор, кулаком поле не абманеш, нада ў жменю ўзяць ды ўзяць».

Затое ва ўсіх на полі колас у чэцверць — можна быка забіць. Зерне ў чатыры рады, ды буйное-буйное. А ў яго і жаць няма чаго. І няма чым. Потым ужо яны жнейку купілі. Пацягаюць яе, бывала, па сваіх абугонях абы-як, дзелігадзіся, каласы пасасморгаюць троху, ды і ладна. Ці сноп звяжуць, дык ён як баба тая лахматая на полі стаіць.

А дзеці наогул не ведалі канфет. Неяк Рыгор прывёз пару канфетак ім, дык яны пагулялі-пагулялі, як усё роўна з цацкамі, ды і пакідалі іх — не ведалі, што з імі далей рабіць трэба.

А нашы мужыкі доўга не маглі да хлеба сібірскага прывыкнуць. Хай сабе ён і беленькі, і мякенькі — можна ў кулаку цэлую булку сціснуць,— а ўсё ж хацелася кісленькага, аржанога. А тут жа ў Сібіры хлеб не пахніць. Дзе ж ён тых пахаў набярэцца, калі за два месяцы і ўзыдзе, і ў трубку яго выганіць, і адкрасуе, і налле, і выспее.

Потым і да нас калхозы прыйшлі. Некаторыя нашы мужыкі не хацелі ўступаць у іх — такіх нават і адсюль высылалі. Ды яшчэ ўсіх страшылі багацеі — маўляў, прыедзе жалезная печ і ўсіх тых, хто пойдзе ў калхозы, туды

кідаць будуць. А тут у Эстоніі (вёска так называлася, дзе адны эстонцы жылі) купілі свайму калхозу трахтар. І вось гэты трахтар тарабаніць калёсы драбіністыя, за аглоблі прычэпленыя, а людзі ўцякаюць ад яго. Мой бацька і то спалохаўся. Кажа: «А ядры ж тваю маць, во ўжо тая жалезная печ едзе». А пасля, праўда, папрывыкалі. Потым ужо гэты трахтар на свята — на маі ці на акцябарскую — людзей нават катаў. Прычэпяць якія лепшыя калёсы, насадзяць баб, мужыкоў і дзяцей поўны воз — і возяць па вуліцы. А людзі смяюцца, спяваюць сабе. Яй жа богу, раней народ нейкі весялейшы быў. Бывала, збяруцца на якое свята, вып'юць, потым пасядзяць, павесяляцца, песні паспяваюць. А цяпер — дык абавязкова каб напіцца. Даўней калі хто нап'ецца, дык хаваецца, каб ніхто не відзіў, бо назаўтра ж сорамна будзе. А цяпер, калі выпіў, дык абавязкова паказацца ўсім трэба. Ды і спяваць неяк развучыліся. Маладыя, дык тыя толькі хрыпяць — як кажухом па печы шоргаюць. І малы табе часам такое скажа, што хоць ты галаву адварочвай.

Я ж дык малы слова баяўся старэйшаму сказаць. Бывала, мы з нашым Васілём усё кароў пасвілі. Напасвім іх, потым агню ад машкары накладзём. Каровы палягуць, ты галаву на карову — а бок такі мякенькі, цёпленькі: поўсць гэтак ужо сонца ўгрэла! — і дрэмлеш сабе. Карова дыхае, бок то падымаецца, то апускаецца, як усё роўна закалыхвае цябе. І не боязна, што праспіш: будзе падымацца карова — і абавязкова цябе разбудзіць...

Мы павячэралі ўжо. Белым хлебам, які не пахне, я намакаўся пахучага тайговага мёду, з'еў сытную яечню з салам, запіў усё гэта добрай квартай цёпленькага сырадою. Дзед і бабка клаліся спаць. Я здалёку пачаў размову, што, маўляў, давядзецца мне ў іх пераначаваць.

— А пра што ты гаворыш! Канешне, начуй. Ты ж хаты за сабою, можа, не возіш.

На круглым, туга набітым саломаю сенніку, пад бабчынымі перабіранкамі спалася вельмі добра. Звечара, засынаючы, чуў, як спрасоння гаўкнуў на дворы сабака — мусіць, сасніў, што хтосьці знайшоў тую костку, якую ён яшчэ ўдзень закапаў на выгане. Недзе за сцяною, пад самым акном, уздыхала карова. Чуваць было, як ля канторы неяк інтымна, даверліва шэпча радыё.

Прачнуўся я ад ласкавага сціплага голасу:

— Старычок ты мой даражэнькі, уставай, пара ўжо. Ды і пчолкі застояліся, іх трэба на пашу выганяць.

Бабка Марына ўжо тупала ў пярэдняй хаце. На вуліцы дружна спявалі пеўні — мусіць, пыталіся адзін у аднаго, ці добра спалася, распытвалі, ці не прыходзіў сёння да чыйго-небудзь седала які тхор. А можа «кукарэку» — гэта ўсяго толькі «добрай раніцы» па пеўневай мове?

У пярэдняй хаце задырчэў ланцужок — дзед Міхал падцягваў гіру. Гадзіннік на хвіліну сціх, а потым заціктакаў весялей — мусіць, дзедаў палец, надпіхнуўшы маятнік, пераганяў стрэлкі.

— А старычок ты мой, ты ж малачка не п'еш, то трэба табе мёду з сабою чацвяртушку наліць.

І мне ўспомнілася, як бабка Марына яшчэ ўчора гаварыла:

— Сколькі ўжо нам жыць асталося разам. Скора ж трэба дадому збірацца. Дык чаго ж мы будзем той ругнёю піхацца. Міхал, бывае, і вып'іць. Заходзіць у хату вясёлы такі і будзіць казаць: «Старушка, я троху выпіў». А я яму: «Ну і харашо, што выпіў. Во цяпер садзіся ды закусі яшчэ, дык і зусім добра будзіць». Там жа нам ніхто ўжо не паднясе.

Кукліпская вуліца, залітая халаднаватым ранішнім сонцам, кукарэкала і сакатала, рыкала і рохкала, бразгатала вёдрамі і смяялася. Вечар, хай сабе і вясёлы, заўсёды меланхалічны. А раніца — гэта як свята. Усход сонца. Яно ўзыходзіць кожны дзень. І кожны дзень — трывожна, урачыста, шчымліва. І, галоўнае, гэта не надакучае. Як хлеб і бульба на сялянскім стале.

Мне здаецца, што нават хворыя, захапіўшыся агульнай мітуснёй шчаслівага абуджэння і весялосці, клопатаў, забываюць пра сваю хваробу і шчыра, разам з птушкамі, дрэвамі і мятлушкамі, радуюцца ўзыходу сонца.

І ўсё ж адчуваеш, што бабка Марына казала праўду. Ніхто не зможа тут, у гэтым бясконцым свеце радавання, астацца назаўсёды — ні птушка, ні чалавек. Прыйдзе час, калі кожны апошні раз правядзе за небасхіл сонца, а ўсходу яго ўжо не ўбачыць — чалавек жа наіўна, але настойліва верыць, што раніцою ніхто не памірае. І ніхто ўжо, скажам, не будзе так бачыць дрэва, адчуваць ласкавы прамень ці размаўляць з пчалою, як гэта робіць дзед Міхал; ніхто не будзе менавіта так радавацца вясёлкам на перабіранках, якімі засланы ўсе ложкі і нават падлога, як радуецца бабка Марына.

Праўда, іх наступнікі будуць радавацца і сонцу, і вясёлцы на перабіранках. Але рабіць гэта яны ўжо будуць

па-свойму. Так, як па-рознаму глядзяць людзі на могілкі. Маладых гэта месца яшчэ не хвалюе — яны часам заходзяць сюды, каб схавацца ў гушчэці ад лішняга вока і пацалавацца. А дзядулі і бабулі часта прыходзяць сюды ўжо як дамоў. Выберуць сабе месца на ўсялякі выпадак, агледзяць, каб і бяроза побач стаяла, каб яна і сонца не засланяла. Пасядзяць тут, паслухаюць, як шуміць лісце (гэта ж бяроза і потым шумець будзе!), палюбуюцца, як промень качае на лісціне расіну, узрадуюцца, што нехта добры ўзнёс шпакоўню якраз на аблюбаванае імі дрэва...

Кажуць, што старым людзям дужа падабаецца лятаць у сне. Можа таму, што гэта шчымліва-ляклівая радасць напаўняе іх стомленыя рукі той ранейшай сілаю, якая, нібы шырокія крылы, лёгка трымае ў небе іх зацяжэлае цела. А можа і таму, што той, хто лятае ў сне, кажуць, усё яшчэ расце...

Іду па вуліцы і ўсё гляджу, каб не мінуць хаты Віталёвай Матруны.

— Віталіха? — казалі мне.— О, яна многа песень беларускіх знае. І цяпер яшчэ на заоінах спявае: «Праліла маці дачушку, напіўшыся скача, прачнуўшыся плача». Яна ж пасля вайны сюды прыехала, усё нам пра яе, страшную, расказвае.

Вунь якраз і крайняя хата. Ага, правільна іду — побач абгароджаная магілка. Мне ж расказвалі, што тут пахаваны дваццаць адзін партызан, якіх расстралялі калчакоўцы — некаторых нават мёртвых на варотах вешалі.

Ля крайняй хаты стаіць самазвал. Валодзя, сын цёткі Матруны, шафёр, з сённяшняга дня ў адпачынку, і таму самазвал стаіць ля варот, як адпрэжаныя калёсы.

Жураў учора ў канторы жартаваў з Валодзі:

— Прыходзіць, значыць, Уладзімір Віталёў дадому. Выпіўшы. Стаіць на парозе, далей у хату не заходзіць. І пытае, значыць:

— Хто прыйшоў?

— Ты, Валодзя, прыйшоў,— адказвае Матруна.

— А я пытаю, хто прыйшоў?

— Ты, сынок мой, прыйшоў...

— Не, я пытаю, хто прыйшоў? — і да Нінкі, жонкі сваёй: — А ты скажы, хто прыйшоў?

— Хіба ты сам не бачыш? — гаворыць тая.

— А я пытаю, хто прыйшоў?

— Ты, мой муж, гаспадар...

— А я гавару — Уладзімір Андрэевіч Віталёў, вот хто прыйшоў.

Валодзя смяецца разам з усімі.

— Гэта ж дзед мой так рабіў, вось і мне захацелася,— тлумачыць ён, смеючыся.

— А то яшчэ было,— расказвае Жураў.— Прыходзіць Валодзя аднекуль з вяселля. Вядома, таксама выпіўшы. Дастае чыгун бульбы з печы і есць. Потым, калі там ужо на дне асталося, раптам кідае чыгунок у парог. Нінка падбегла: «Валодзенька, можа, мала табе, можа, яшчэ дабавіць?» А ён: «Сама еш. Я толькі цяпер разабраўся, што там цыбулі мала было».

Я разумею, што гэтыя жарты ўсе ў Кукліне ведаюць даўно, і расказваў Мікалай Сідаравіч, напэўна, толькі для мяне.

Вось і Віталішына хата. Ля двара ляжыць рыжая карова. Каля яе немаладая, худзенькая жанчына — мусіць, сама Віталіха.

— Ага, яна самая і ёсць,— адказвае цётка Матруна.— Толькі што ж я вам сёння спяю? Прыходзілі б учора, я была пад градусам, вот бы і наспявала. Выпіла. І прычына знайшлася. Вун, кажуць, дзве бабы качэргі мянялі, і то магарыч пілі. А сёння ж і печ тапіць нада, снеданне варыць, а то Валодзя вернецца з рыбы, а есці не гатова, то і ўсердзіцца.

— А вы можа печ топячы...

— Ну, хіба толькі во гэтую, пакуль каровы пройдуць. Жаласная яна троху. То слухайце:

Скрыпкі — пя рыпкі,
А дудкі — пя гудкі,
Вяселле не вясёла.
Пазпаць Волечку па вяселлейку,
Што не родная маці.
Пашлём, пашлём салавейчку
На тэй свет на мамачку.
Салавейчка не далятаіць,
А мамачка атвячаіць:
— Рада б я ўстаці
Ды к свайму дзіцяці —
Парадачак даці...
Грабавыя доткі
Сціснулі ножкі,
Нельзя мне шавальнуцца.
Сырая зямля дзверы запёрла,
Дзверы затварыла.
Жоўтыя пясочкі
Засыпалі мне вочкі —
Нельзя мне прагляпуць.

— Або! А калі б цябе ваўкі не злі, скаціну гэтую! Кароў прагналі, статак ці цяпірся прайшоў, а яна ляжыць сабе і не варухнецца дайжа. Цясю ў поле, раўгеша!

Карова нехаця падиялася, спачатку на заднія погі, потым на пярэднія, страсянулася, нібы толькі што накачаўшыся, настаяла, як быццам думаючы, ці варта ёй ісці, і потым нациху пайшла за каровамі.

— Пачакайце-тку, можа, вам я яшчэ во гэтую прымацкую спяю:

Вішанька, чарэшанька
Ягадак не мае,
А хто ў прымах не бывае,
Тоіі гора не знае.
А я ў прымах усё бываю,
Усё гора знаю.
А я раю, а я раю,
На сонца паглядаю.
А ўсім людзям нясуць есці,
А мне — не маю.
Нясець жынка абедаці
Хлеба з лебядою.
Сеў, паабедаў з няволі
І сказаў: «Даволі!»
Кулачэнькі пад бачэнькі
І спаці лягаю.
Прыйшоў дамоў,
Ня ўспеў сесці —
Застаўляе мяне цешча:
«Нясі свінням есці!»
Каб і свінні паздыхалі,
І хата згарэла,
Як мне ета прымацкая
Жызня надаела!

— Гэта ж неяк наш Хведзя з матафонам прыязджаў у Кукліна. Ты ж, сынок, у Ігнашы быў? Там наш Хведзя першым сакратаром. Дык я спявала, ён усё запісваў. Потым паехаў, уключыў гэты матафон, а Марына, мама яго, і кажа: «Яй жа богу, гэта наша Матруна пяець». А яна сама столькі песень нашых знаіць! І мы ж і яны са Слаўгарадскага раёна, з вёскі Бярозаўкі прыехадшы. У мяне дык раней тут толькі бацька і матка жылі. А я і не думала пераязджаць. А пасля вайны пераехала.

***Расказвае цётка Матруна:***

— Муж мой усю вайну прайшоў. І на табе — у самеп(ь)кім канцы знайшла яго куля. А мы ж з ім да вайны ўсё пра хату сваю думалі, бёрнаў ужо насабіралі. І неяк над

канец вайны выходжу я на двор — нашы ўжо наступалі, немца гналі,— а салдаты мае бярвенне качаюць, зямлянкі з яго дзелаюць. Я нешта, не памятаю ўжо што, сказала ім. А яны і адказваюць: «Брось ты, мамаша, мы галоў сваіх не жалеем, а табе бярвення жалка». Так і парэзалі нашу хату. А пасля вайны я задумалася, што дзелаць: у Бярозаўцы ж ні кала ні двара няма. Тады я ўзяла ды бацьку сюды во напісала — ці прыязджаць, мол, мне да яго. Прысылаіць ён мне пісьмо ды і кажыць: «Глядзі, дачка, сама...» Тады надумала я, надумала ды і не паехала. Рашыла там хату ставіць. І пачала бярвенне цягаць. А ўсё ж на сабе і на сабе. Валодзя ж тады які памочнік быў. Мы з дачкой старшай жэрдзе вязём на калёсках, а ён яшчэ сядзіць зверху ды і пад'едзіць. Так-сяк пабудавалася гэта я, падлогу заслала. А хата такая ўжо вясёлая, такая вясёлая ўдалася — як клуб усё роўна. А тут бацька пішыць: «Прыязджай, дачка, сюды. Маці памерла, дык што я цяпер буду тут адзін рабіць». А мне так не хочацца ехаць! Я і адпісваю бацьку: «Татачка, родненькі, прыязджай ты ў Бярозаўку. У мяне ж цяпер і хата ёсць, я табе на печы засцяклю і, як на абразы, глядзець толькі на цябе буду». Але бацька не паехаў: «Тут жа ў мяне, дачка, гаспадарка немудраная, куды ад яе ехаць». Паехала я. Зразу не магла ніяк прывыкнуць — плачу, і ўсё. Тут і вуліца шырокая, нейкая не такая, як у нашай Бярозаўцы. Тут і людзі незнакомыя — няма з кім дайжа словам перакінуцца. Тут і машкара жыць не дае. Дачка мая таксама пойдзіць жаць, а дамоў прыходзіць і плачыць-плачыць горкімі слязьмі: «У нас жа і снапочкі як снапочкі дзелаюць, а тут жа такія, што не падняць ніяк».

І я дужа цяжка прывыкала. Я ж люблю, калі скоранька жнуць. А то, бывала, толькі пачнём жаць, а жнеям, яшчэ не жаўшы, піць засмылела. Пойдуць піць ды і палягуць там. Гляджу — храпуць ужо. А мяне як якія чэрці точуць — не сціцца, усё хочацца па паласу бегчы. Але ж бацька мне прыказваў: «Ты, дачка, не адставай ад астальных, але і дужа ўперад не выпрыгвай». А аднаго разу і я заснула. Горача было, а я ў цяньку сцішылася каля ўсіх. Прачнулася, працёрла вочы — хапу-лапу! — няма ўжо нікога. Аж спалохалася — ну, думаю, пабеглі ўсе жаць... Потым агледзелася, а яны ўсе троху воддаль ляжаць. Сонца павярнула, цяню не стала, дык жанкі ў другое месца перасунуліся. Так, значыць, паспяць, а потым яшчэ адна ў адной у галаве наглядзяць. А я ўсё падганяла іх. А то,

бывала, адна пабягу ды і жпу сабе ціхенька — усё роўна ж мне не ляжыцца...

Ай-яй-яй, вот-вот Валодзя прыйдзіць, а я табе басні расказваю. Ведаю, што ты яшчэ песень чакаеш. Тады, можа, вот гэтую і ўспею.

Аддаў мяне бацька
Маладую замуж...

Прыйшоў з возера Валодзя. Ён прынёс бліскучых, спружыністых плотачак ды карасёў, якія падскоквалі ў рэшаце. Ды так эфектна, што аж кот нашатырыўся, надзьмуўся ад напружанасці і ўсё мякенька, падняўшы ўгору хвост, хадзіў ля стала, цёрся аб ножку табурэта — выбіраў момант, калі ўсе адыдуцца і калі можна будзе незаўважна схапіць рыбку...

Валодзя ўчора ў канторы мне здаўся гаваркім і смелым. Сёння ж ён ужо быў нейкі іншы — завельмі сціплы, ціхі і нават сарамлівы.

— А сынок ты мой, во і ты ўжо, бачыш, управіўся, а я яшчэ ні бульбы не начысціла, ні ў печы не затапіла і дайжа вады не злеціла... Апсік, куды лезеш, змей ты!

Кот, які ўжо ледзь не схапіў плотку, са страху зваліўся са стала і кульнём кінуўся ў дзверы.

Я сказаў Валодзю, што ва ўсім, пра што казала маці, вінаваты я, і папрасіў прабачэння, што праз мяне трохі запозніцца яго сняданне.

— Нічога, нічога. Я ж цяпер у водпуску, магу і ў полудзень паснедаць. А я на возеры думаў — чаго гэта матка распелася.

— А людзі таксама, мусіць, думаюць — што гэта з Матрунай стала, ці не здурнела мо, што з самай раніцы за песні ўзялася,— падтрымала сына цётка Матруна.

Апошнім часам людзі чамусьці адвыклі пець проста так, для сябе. Ці многа вы дзе чулі сёння, каб жанчыны, вяртаючыся з поля, раптам заспявалі жніўную песню? Без дай прычыны, проста так — каб лягчэй ступалася (што вы кажаце — гэта ж няёмка!); а ці сустракалі дзе, каб дзяўчаты, сабраўшыся на лавачцы ці на бярвенні, выпусцілі ў вячэрнюю цішу, як птушку ў неба, сваю дзявочую песню (навошта — у нас жа даўно не пяюць); ці каб жанчына — усё роўна, маладая ці старая — раптам, заюшыўшыся на працы, узрадаваўшыся, што ў яе ўсё так ладна выходзіць, раптам адна, сама сабе, заспявала сваю любімую песню (не смяшыце людзей — цяпер жа адной спяваць таксама дзіўна, як і галасіць!).

Цяпер калі і пяюць песні, то толькі ў клубах. Але гэта ўжо называецца — самадзейнасць. Выступленне. Работа. Песня напаказ, дзеля другіх. А не дзеля сваёй узрушанай душы, калі хочацца пець проста так, калі песня, як у таго салаўя, выліваецца ў сонечную раніцу сама сабою, калі не думаеш, ці спадабаецца яна слухачам.

І дрэнна, калі мы часам раку ўспрымаем толькі як ваду, па якой на лодцы можна перавезці на той бераг сена, а на плыце — грузавую машыну. Шкада, калі мы, расклаўшы цяпельца, бачым у ім толькі жар, на якім можна згатаваць нейкі крупнік. Нядобра, калі лес патрэбен нам, толькі каб падняць, скажам, баравіка ці зваліць елку-сухастоіну на дровы. Сумнавата, калі дождж для нас — проста кроплі, якія абавязкова вымачаць да ніткі. І страшна, калі мы ўжо не ўспрымаем і раку, і цяпельца, і дождж як раку, цяпельца і дождж і не ўражваемся, што яны проста так ёсць побач з намі.

Я і сам часта заўважаў: любуючыся чым-небудзь, увесь час ловіш сябе на тым, што думаеш, як пра гэта лепей напісаць. І потым злаваўся, што, гледзячы на тое, як шуміць крыгалом ці як лашчацца адзін да аднаго коцікі на веснавой вярбе, я не мог проста так, для сябе, для душы радавацца вясне. І мне здаецца, што гэтая злосць не аднаму мне, бывае, не дае заснуць і ўсё муляе, як тая гарошына пад пярынаю капрызнай прынцэсы.

Трошкі адышліся мы неяк (і не дужа аглядваемся) ад казкі, ад народнай песні. А яны ж спрадвеку, як краўцы ці пастухі, хадзілі па Беларусі, пераходзілі з хаты ў хату. Стомленыя вандроўнікі, лірнікі, божыя людзі ішлі ад вёскі да вёскі, мясілі лапцямі снег узімку, гразь увосень, прасіліся пераначаваць. І ўдзячныя добрым людзям, якія ніколі не выганялі іх з хаты, якія давалі ім цёплы акраец хлеба, налівалі ў місу сыраквашы з гладыша ці даставалі з печы кіславатай і ўжо трохі астылай пад вечар бульбы, а потым слалі на шырокай лаве нейкую лайніну, дзе чалавек, перахрысціўшыся, клаўся спаць — абавязкова галавою да абразоў,— удзячныя за ўсё гэта, вандроўнікі расказвалі гаспадарам казкі, спявалі песні, загадвалі загадкі.

Так, ва ўсёй сваёй прыгажосці, у шчырай цеплыні сялянскай хаты распускалася беларуская песня ці казка. І тое, чым ворагі думалі знішчыць нашу культуру, яшчэ больш развівала яе — дзякуючы гэтаму мы маем, як сцвярджаюць многія вучоныя, найбагацейшы ў свеце фальклор...

Багаты ён і тут. У сяле Старая Ювала Кажэвенскага

раёна загадчыца клуба, руская жанчына, пабываўшы з перасяленцамі на жніве і сенакосе, адкрыла для сябе цудоўныя беларускія песні. Яна стварыла беларускі хор, які з поспехам выступаў нават і ў Томску.

У вёсцы Плашкіна, дзе я чакаў старшыню калгаса, мы з дзедам Цімафеем сядзелі на яго прызбе. На высокіх жэрдках каля хаты пакалыхваліся апусцелыя шпакоўні — шпакі павывелі дзяцей, павучылі іх карыстацца такімі непаслухмянымі крыламі і паляцелі ў тайгу на ліпоўку. Потым, недзе пад восень, яны вернуцца сюды зноў, стабуняцца і паляцяць шукаць цяпла.

На двары надакучліва, як зубны боль, звінела электрапіла «Дружба» — сын дзеда Цімафея папраўляў стайку, падбаўляў яшчэ некалькі вянцоў. У сібірскіх вёсках цяпер у кожным двары ёсць «Дружба»: ёю і лес валяць, і дровы рэжуць, і вуглы заразаюць. Без яе не абыходзіцца тут сёння і самы нядбайны гаспадар.

Цімафей Качан сам з Віцебшчыны, з Лепельскага павета. Ён ужо больш як шэсць дзесяткаў гадоў асвойвае тайгу.

***Расказвае дзед Цімафей:***

— Усяго, брат, хапала тут. Мой бацька зрубіў хату ў тайзе. Ужо, наверна, кругоў восем гатова было. Прыходзіць ён неяк уранні дарубліваць (а яшчэ ж цёмна, хоць ты вока выкалі), лезіць па зруб, глядзь — а ў зрубе мядзведзь ходзіць. Паважна так, як хадзяін, куткі аглядае — нібы правярае, ці добра зрублена. Мой бацька скаціўся са зруба ды дадому бягом. Так і кінуў той зруб — так і згніў ён, брат, у тайзе.

А зладзеяў было тут болей, чым мядзведзяў. Адзін байкалоўскі мужык у Расею сабраўся ехаць. Там яму нада было нейкія грошы з памешчыка сыскаць. Запрог сын жарабка, ружжо з сабою ўзяў, пасадзіў бацьку ў вазок — ды і паехалі яшчэ прыцемна. А мароз-мароз — аж вожкі ламаюцца. А ў гэтую ноч зладзеі абакралі магазін у вёсцы Каха. І якраз дадому ехалі з награбленым. Нашы байкалоўскія іх і дагналі. Бачаць — нейкія мужыкі ўперадзе едуць, і свайго жарабка падганяюць, каб дагнаць — усё ж разам весялей ехаць будзе. Бачаць — і тыя спыніліся. Стаяць, чакаюць іх. Мужыкі як мужыкі. У іх жа на лбе не напісана, хто яны такія. Пад'язджаюць да гэтых людзей. Трое адразу да іх. Адзін гужы — шах! — і перарэзаў. А другі за

цантралку, ствол — круць! — уверх. Трэці кажыць: «Раздзявайся!» Пазнялі яны кажухі (а што ж, брат, будзеш дзелаць!), грошы аддалі. А тыя яшчэ і катанкі ў іх удабавак забралі. Дык мужыкі босыя ў Каху прыбеглі.

А то, як, бывала, па базар у Іланск ці ў Абан ездзілі — паджыдалі і грабілі. У Тамале — тайга такая ёсць пад Іланскам. Дык ужо мужыкі нашы па аднаму з базара не вярталіся, ждалі, пакуль усе распрададуцца, а тады ўжо ўсім абозам і ехалі...

А то вунь у нас тут дзед Аляксей, ссыльны чалавек, жыў...

На вуліцы загула машына. Яна пад'ехала да хаты дзеда Цімафея і спынілася. З кабіны высунуўся старшыня і паклікаў мяне. Гісторыю пра ссыльнага Аляксея дзед Цімафей так і не паспеў мне расказаць. Але пра гэтую гісторыю я дужа многа чуў. Таму я ўсё ж паспрабую расказаць жыццяпіс дзеда Аляксея, злучыўшы ў адно многія паасобныя расказы.

Ён прыехаў сюды даўно і, само сабою зразумела, не дзедам — на той час Аляксей быў малады і прыгожы. Прыехаў ён сюды, у Сібір, не па сваёй ахвоце: яго саслалі аднекуль з Аршаншчыны за тое, што спаліў у памешчыка некалькі кладзяў жыта. Не так даўно ён памёр. Усё жыццё жыў адзінока, такім жа самотным і памёр. Хату яго забілі дошкамі, на яго магіле з'явіўся крыж, а людзі ўсё яшчэ не забыліся «Ляксееву гісторыю». Да самага свайго апошняга часу ён на некалькі дзён, а то і на тыдзень, сыходзіў у тайгу і вяртаўся адтуль стомлены, згаладалы, зарослы. Адны казалі, што ён шукае раку ў тайзе, дзе яшчэ малады мыў золата, другія былі ўпэўнены, што раку гэтую ён знайшоў (столькі ходзіць — за гэты час можна было б нават іголку ў стозе сена знайсці, на сяпіне яго перакідаўшы), а, маўляў, шукае ён глячок з золатам, які схаваў недзе ў беражку, пад карчом. І ніхто не ведаў, хто тут казаў праўду. Але ўсе былі ўпэўнены, што глячка таго дзед Аляксей так і не знайшоў — ці то рака падмыла бераг і забрала з сабою гэты дзедаў скарб, ці, можа, хто іншы, шчаслівейшы, выпадкова падняў корч, ці то ён сам, колькі ні хадзіў, так і не змог знайсці таго месца. Але глячок з золатам усё-такі быў.

Сасланага Аляксея адразу ж аддалі ў парабкі да чалдона, прыпісалі да чалдонавай сям'і. Але хлопец працаваў на яго нядоўга — ён, згаварыўшыся з такім жа ссыльным,

як сам, уцёк далёка ў тайгу. Там яны знайшлі залатаносную раку, паставілі на яе беразе хатку, мылі золата і жылі сабе спакойна. Але маладому чалавеку, калі ў ім сама буяе сіла, без жаночай ласкі цяжкавата. Яны прывялі да сябе дзвюх нейкіх галодных дзяўчынак, накармілі іх, абагрэлі і любілі па-мужчынску многа і да самазабыцця.

Праз колькі дзён дзяўчынкі ўцяклі, а сюды з'явіліся стражнікі. Яны арыштавалі сяброў, прыбавілі ім тэрміну і аддалі зноў чалдонам у парабкі.

Новы гаспадар Аляксея быў злы, маўклівы — нікому слова добрага не скажа. Чалдон ведаў, што яго парабак нядаўна меў справу з золатам,— не можа ж быць, думаў ён, каб залатыя парушынкі не прыліплі да яго рук. І ўсё прыглядаўся да Аляксея, усё сачыў — ці не будзе ён перахоўваць скарб. І, мусіць, высачыў усё-ткі.

Аднаго разу да Аляксея, усхваляваная і напалоханая, прыбегла Кацярынка, дачка чалдона:

— Лёшанька, міленькі, хавайся — мой бацька збіраецца цябе забіць, каб забраць тваё золата.

Бацька не дужа хаваўся ад дачкі. Ён жа не ведаў, што яго Кацярынка як не штоночы бегае да парабка і той шурпатымі ад мазалёў далонямі гладзіць яе падатлівае, белае (аж блішчыць у цемры) цела...

І вось уявіце сабе — мароз, зіма... Аляксей ляжыць у хаце на тапчане, грэецца. А чалдон усё нешта тупае — то з хаты, то ў хату. Пойдзе, на двары нешта паляскае тапаром, ля стаек паходзіць і зноў у хату вяртаецца. Паглядзіць на работніка — незаўважна так, адным вокам, і зноў пойдзе. Потым раптам ні з таго ні з сяго нож вайстрыць возьмецца. А Аляксей жа ведае, чаму чалдон супакоіцца не можа. Потым дзед і кажа яму:

— Можа б ты на заімку схадзіў. Трэба там сёе-тое направіць. Можа жэрдзя пацясаў бы...

А Аляксей думае сабе: «Няўжо я з ім, старым чортам, не спраўлюся? Мне будзе лягчэй троху, бо я ж ведаю пра яго намер». Пайшоў на заімку. Чэша сабе тое жэрдзе — навошта яно зімою трэба! Прыязджае чалдон на парцы коней. А коні-коні, стаеннікі — на месцы і хвіліны пастаяць не могуць.

— Ты, паря, плохо чешешь!

— А як трэба? Пакажы, гаспадар, я павучуся...

Вось тут і адбылося тое, што на мове крымінальнага закону называецца наўмысным забойствам: была доўбня, была кроў, былі шырока раскрытыя вочы, у якіх

апошні раз хістанулася тайга. Аляксей сеў у вазок і паехаў да другога чалдона, які даўно пераманьваў яго да сябе,— а з такімі коньмі, вядома, любы прыме!

Абжыўся Аляксей на новым месцы. Прывык трохі. Толькі без Кацярынкі сумнавата было — як не кожную ноч снілася яна Аляксею.

Неяк сын гэтага чалдона паехаў на базар у Іланск. І Аляксея з сабою ўзяў — за фурмана. І вось, кажуць жа, што ў жыцці часам такое здарыцца, што напішы ўсё, як было,— не павераць. На базары сын чалдона сустрэўся з сынамі таго дзеда, якога Аляксей на заімцы пакінуў. Аказваецца, яны былі даўно знаёмыя і сябравалі нават. Аляксей і так круціцца, і гэтак — усё адварочваецца, баіцца, каб не пазналі. А тыя стаяць, рагочуць — вясёлыя такія, задаволеныя. Потым, калі яны адышліся да сваіх коней, падыходзіць да Аляксея гаспадар і кажа:

— Давай-тку, Аляксей, запрагай коней ды едзь за тымі вунь мужыкамі, з якімі я стаяў,— яны мяне ў госці запрасілі.

Аляксей аж увагнуўся ад гэтай навіны. Але што ж ты зробіш: нідзе не дзенешся, трэба ехаць. А сам думае: «Харашо, што гаспадар хоць тых дзедавых коней не даў запрэгчы. А я ж, дурань, усё рваўся і ўгаворваў».

Выехалі яны з Іланска, едуць па тайзе — тыя першыя, Аляксей з сынам гаспадара за імі. Едуць, а Аляксей усё адварочваецца назад — пазнаюць жа, чэрці, абавязкова пазнаюць!

— Што з табою, Ляксей? — пытае гаспадароў сын.

— Дык во, каб на яго пярун, зуб нешта схапіла, дык я ад ветру затуляюся. Можа б ты, гаспадар, пакіраваў трохі коньмі.

Хлопец узяў у рукі лейцы, а Аляксей, лёгка ўздыхнуўшы, перавярнуўшыся на санях, усеўся ямчэй, выставіўшы сваю спіну ў новым чырвоным кажусе,— хай глядзяць, хай пазнаюць!

Але ўсё роўна яго калоціць — ці то ад страху, ці то ад холаду — зуб на зуб не пападае: а як там у двары ўсё зрабіць, каб не пазналі?

Прыехалі. Гаспадарскі сын пайшоў у хату, а работнік не ідзе.

— Хадзі, хоць нагрэешся там трохі, укусіш чаго-небудзь. Ды і гарэлка на хворы зуб — лякарства.

— Не, я тут коней лепей пачышчу.

— Ну і дзівак...

Але хутка нявесткі выбеглі зваць парабка. І пазналі:

— Лёшанька, гэта ты?!

Аляксей бачыць, што яны ўзрадаваліся, яго пазнаўшы, але яшчэ не верыць гэтаму.

— Хадзі ў хату, Лёшанька.

— Дык я ж баюся. Яны ж ведаюць, што бацьку...

— Не бойся, дурненькі. І мы і яны былі рады, што ты гэтага чорта старога забіў. Ён жа ні нам, ні нашым мужчынам ходу не даваў. Толькі вось коней тых, што ты забраў, і сёння забыць не могуць — усё яшчэ іх шкадуюць: дужа ж ладныя былі коні.

І Аляксей пайшоў у хату. Потым сеў і за стол. Разам яны і пілі і гулялі. Ён усё хацеў спытацца neяк пра Кацярынку (яе ў хаце не было, і, абвёўшы вачыма ўсе крукі, Аляксей не знайшоў нічога з яе вопраткі), але так і не адважыўся. Потым ужо, калі яны ад'язджалі, жонка старэйшага сына шапнула яму на вуха:

— А Кацярынка рукі на сябе налажыла. У той жа дзень, як прывезлі бацьку. Пайшла ў стайку і там...

Кацярына, відаць, добра адчувала, што ў смерці бацькі ёсць і яе немалая віна...

А Аляксей так і пражыў усё сваё жыццё бабылём — кажуць, не мог забыць Кацярынкі. Усё, колькі жыў, ён шукаў той гляк з золатам і не ведаў, што яго, вымыты ракою, злавілі недзе ў пізоўі ракі дзеці, золата здалі дзяржаве, а гляк — у музей: каб людзі маглі ўбачыць, як і куды клалі, дзе хавалі раней золата...

Гэтую гісторыю я запісаў пазней, мне яна здалася вельмі ўжо экзатычнай. Якраз такой, якімі здзіўляюць турыстаў малыя афрыканскія народы — маўляў, раскажуць ці пакажуць нешта такое знарок экзатычнае, чаго чакаюць ад іх нецярплівыя падарожнікі, а потым, адчапіўшыся, займаюцца сваім будзённым жыццём, якое не мае нічога агульнага з той паказной экзотыкай.

У кабіне грузавой машыны (старшынёў «казёл» на рамонце) мы ўтрох — шафёр, Жураў і я — трасёмся па калдобістай дарозе. Мяне ўжо не дзівіць, што шафёр называе свайго старшыню на «ты», бо перад гэтым я заўважыў, што так звяртаюцца да Журава як не ўсе куклінцы («Слухай, Мікалай, даў бы ты мне машыну — гасцей у Інгаш нада завезці»). Але гэтае натуральнае абыходжанне са старшынёй нічога агульнага не мае са страчаным аўтарытэтам. Проста Мікалай Сідаравіч тут нарадзіўся, тут вырас, і таму ўсе называюць яго, як і раней, да старшынёў-

ства, — толькі на «ты». Не можа ж так быць, каб чалавек, які да самага перавыбарчага сходу быў «Мікалай, ты», раптам адразу ж пасля сходу зрабіўся «Мікалай Сідаравіч, вы»...

У вёсцы нават чалавеку з усімі задаткамі падхаліма такая перамена далася б нялёгка.

Машыну здорава трасе: у лесе — на тоўстых вузлаватых каранях дрэў, у полі — на глыбокіх калдобінах. А Мікалай Сідаравіч расказвае пра тое, як жывуць у Сібіры тайговыя беларусы...

Ага, так і жывуць тут Ігналькі і Петрусі, Аўхімы і Рыгоры, Тамашы і Зміцеры. Носяць тыя даўнія імёны, якія прывезлі сюды з Белай Русі іх дзяды і бабулі, а таксама даюць такія імёны сваім дзецям, унукам — і ў тайзе з'яўляюцца маленькія крыкунцы Міколкі, Аўхімкі, Петруські... Яны гавораць на мове сваёй бацькаўшчыны, якая не растрэслася за даўгую такую дарогу і ацалела разам з цёплымі ўспамінамі пра свае вёскі. І па іх мове можна адразу пазнаць, хто з якой вобласці прыехаў: «самаходы» з Віцебшчыны гавораць «вароты», «мяшок», у магіляўчан гэта ўжо будзе «коўраты», «кайстра», а ад мінскіх наогул толькі і чуеш: «кажа», «будзе», «трэба». Але часам (у адной жа вёсцы жывуць перасяленцы з розных абласцей) дыялекты перамешваюцца, і тады віцябляне дзіўна так выгаворваюць — «будзя», «ходзя», «прося», а мінскія пачынаюць націскаць на «ц»: «будзіць», «кажыць», «бярэць»...

Колькі нашчадкаў беларусаў — і тых, хто некалі прыйшоў сюды ў кайданах, і тых, хто прыехаў у Сібір па сваёй ахвоце,— сталі ўжо за гэты час сапраўднымі сібіракамі! Яны аруць і сеюць, разведваюць сібірскія нетры і будуюць электрастанцыі, даўно ўжо ва ўсіх перапісах значацца рускімі, але сяды-тады і яны ўспомняць беларускую песню...

Самалёт ляцеў над тайгою. Невялічкі цень ад яго здаўся мне ўвішнай мятлушкай, якая ляціць над лугам, выбіраючы зручнейшую травіну, дзе можна спакойна прысесці і перасушыць крыльцы.

## ВУЛІЦА З ТАЙГІ Ў ТУНДРУ

*Змест сшытка. Навошта дрэвам вецце. Вечар, які прапах вясною. Сула, Юла і Колька. «Пакажы, што ты заказаў?» Геолаг без барады. Хто прычапіўся да Палярнай зоркі. Жаркі грэюць снег. Рабінзоны ў тундры. Дзяўчына, якую слухаюцца мядзведзі і медзвяжатнікі. Белы асфальт. Каму даваў дарогу цеплаходзік...*

На адным канцы гэтай вуліцы даўно ўжо млее ад спёкі сібірскае лета, пахне падпаленым лісцем; у дрэў і кустоў, здаецца, урадзіла купчастае вецце толькі дзеля таго, каб спрытней было адмахвацца ад камароў і гарачыні! А другім канцом вуліца ўпіраецца ў Ледавіты акіян; яна яшчэ зацярушаная снегам, над ёю кружаць халодныя вятры, там зіма і зябка пахне пакуль што льдамі.

Над адным канцом гэтай вуліцы звычайна, як і ўсюды, чаргуюцца дзень і ноч, раніца і вечар, а над другім — не заходзячы, шчыруе сонца. Вуліца злучае поўдзень і поўнач Сібіры, яна спяшаецца з густой тайгі ў голую, без адзінага дрэўца, тундру. З зеляніны — у снег, з лета — у раннюю вясну.

Па гэтай вуліцы толькі што, ломячыся, прайшлі крыгі. На гэтай вуліцы нейкі час буду жыць і я: па ёй паплыву ў Дудзінку — сталіцу Таймыра.

Вуліца гэтая — Енісей.

Адтуль, куды мы плывём і дзе цяпер сама буяе вясна, вецер прыносіць пах калакалушы, маладога бярозавага лісця і нейкай клейкай свежасці, якая бывае толькі вясною. За ноч і мы самі, і карабель, і нават поўня, якая, нібы лоцман, усю ноч бяжыць наперадзе электрахода, прапахлі гэтай запозненай паўночнай вясною, да якой мы яшчэ і не даплылі. Уяўляецца, як там сцішылася лесатундра, і ў гэтай цішыні, здаецца, кожны пачуе, як неспакойна варушыцца ў зямлі разбуджанае вясною семя; як, нібы заведзеныя міны, выразна ча̀каюць пупышкі і гулка лопаюцца адна за адною; як вецер з налёту, здзівіўшыся, ліпне да першых клейкіх лісточкаў там, дзе ён яшчэ нядаўна пралятаў без усялякай перашкоды.

На караблі плыве многа салдат, якія, адслужыўшы свой тэрмін, вяртаюцца дадому. А каля іх — цэлы табун дзяцей. Дзеці і салдаты заўсёды разам — у іх нейкая спрадвечная ўзаемная сімпатыя. Не паспела яшчэ наша «Латвія» адплысці ад Краснаярска, а па палубе, горда выставіўшы ўперад жываты, захадзілі ўжо завельмі сур'ёзныя карапузы ў вялікіх салдацкіх фуражках, якія, коль-

кі іх ні папраўляй, усё роўна насоўваюцца на вочы; жоўжыкі, падняразаныя шырокімі салдацкімі рамянямі, што трэба рукамі трымаць, каб не спадалі; жыгуны, якія ўсе свае пінжакі і кашулі паабчаплялі салдацкімі значкамі. Адзін вунь ужо дапытваецца: «Юла, а хто такі малсал?» А другі пытае: «Сула, а ты стлаляў з алудзія?» І як утульна і радасна адразу зрабілася на караблі!

Дзіўная гэта рэч — чалавечы настрой! То раптам ні з таго ні з сяго засумуеш і колькі ні будзеш дакопвацца, не дакапаешся — чаму. А то нечакана, без дай прычыны, стане весела і лёгка, светла і радасна. І потым ужо, калі пачнеш перабіраць у памяці ўвесь дзень, успомніш, што, калі ты ішоў раніцою на працу, дарогу табе перабег вось такі смяшлівы карапуз, якога, здаецца, толкам ты і не разгледзеў. І як непрыемна бачыць, калі дарослы і малы, бацька і сын, ідуць побач і маўчаць: быццам малы так ужо ўмудроны вопытам — маўляў, ён усё, што можна было, уведаў, а даросламу няма пра што яму расказваць.

— Юла, глядзі, палаход ідзе!

Юра прыглядаецца да сустрэчнага цеплахода.

— Дык гэта ж «Барадзін!» На ім жа Нінка правадніцай працуе!

Ён паспешліва пачынае аглядаць людзей на «Барадзіне», што стоўпіліся ля борта, мітусліва кідае позіркам то на карму, то на нос цеплахода — здаецца, ён вось-вось саскочыць і па вадзе пабяжыць туды. Калі цеплаход прайшоў, Юра, так і не ўбачыўшы Нінку, расчаравана ўздыхнуў:

— От д'ябал — размінуліся! Цяпер яшчэ тыдзень не ўбачу яе — пакуль з рэйсу вернецца.

Другі салдат, якога малыя завуць «Сула», правёўшы рукою па шпанічных вусах, скептычна заўважыў:

— Занадта хвалюешся, Юра. Дзяўчаты не заўсёды чакаюць нас, салдат. Вось мая на другім годзе маёй службы прысылае раптам ліст: «Пісем пакуль што не шлі, я сама табе паведамлю, калі можаш напісаць». І па сённяшні дзень чакаю...

Юра вельмі хвалюецца — дома ж не ведаюць, што ён едзе.

— Я не пісаў. Бо, як напішаш, маці так і забегае, так і забегае. І пакуль не прыеду — спаць усё не будзе: «Юрачка едзе, Юра едзе...»

Салдаты вяртаюцца дамоў. Яны і радасныя, і трошкі разгубленыя. Там, у арміі, усё было зразумела, усё вядо-

ма — куды ісці і што рабіць. А тут, «на грамадзянцы», трэба пачынаць новае жыццё, і яшчэ не зусім зразумела, як складзецца твой лёс — чым ты будзеш займацца, дзе працаваць. Але, вядома, гэта не можа засланіць сабою радасці ад чакання сустрэчы з роднай хатаю, з бацькамі.

На другі дзень на караблі ўжо ў цябе многа знаёмых. У поўдзень, калі ўсе збіраюцца ў рэстаране, ты з многімі вітаешся.

Вунь сядзіць за сталом Колька, які з плачам не дае маці зняць салдацкую фуражку нават і ў рэстаране. Колька просіць усіх задаваць яму арыфметычныя прыклады. Ён іх вельмі любіць рашаць.

Дзяўчынка. Сядзіць за сталом вельмі важна, па-сталаму. Дзяўчо якраз у такім узросце, калі ёй верыцца, што яна ўжо вельмі дарослая, а ўсім здаецца, што ад яе яшчэ пахне матчыным малаком. Яна вельмі злуецца, калі з ёю пачынаюць гаварыць як з маленькай, і здзіўляецца, калі вечарам хлопцы не запрашаюць яе танцаваць.

Спелая, яўная саміца. І каля яе, за сталом, нібы алені ў час самага гону, вядуць славесную баталію два хлопцы. Пераможаны ў гэтым славесным турніры змушаны будзе адысціся, а з ёю астанецца той, хто больш нагаворыць ёй прыемных банальнасцяў.

Дзядзя Міша. Маленькі, худзенькі, маўклівы мужчына. Ён сядзіць на крэсле, як на гарачым вуголлі, і нецярпліва пазірае то на шырмачку, з-за якой павінна паказацца афіцыянтка Валя, то на дзверы, з якіх... Дзядзя Міша вельмі перажывае: «Ну, калі ўжо яна прынясе заказ?» Нарэшце Валя нясе на яго стол графінчык. Ай-яй-яй — позна! У дзвярах паказваецца тоўстая, шырокая жанчына. Гэта жонка дзядзі Мішы...

— Я яго па ўсім караблі шукаю, а ён во дзе сядзіць. Я і туды, я і сюды — няма. А чаго ты тут сядзіш, калі ж мы з табою ўжо ў каюце паабедалі?

Яна хуценька падыходзіць да стала.

— Пакажы, пакажы, што ты тут заказаў?

З булькатам вылівае ў шклянку гарэлку і выпівае.

— Мог бы хоць закускі ўзяць! — злуецца яна і выходзіць.

Сумна ўстае дзядзя Міша і ідзе за ёю: каб паўтарыць заказ, грошай у яго няма... Ён плыве ў Дудзінку, каб арганізаваць там аленевыя рогі і 500 кілаграмаў аленіны для повара кафэ «Таймыр».

Валя, афіцыянтка:

— Калі я выйшла замуж, то вазіла дадому, у Оршу, свайго мужа напаказ. Бацькі ж мае там на вуліцы Заслонава жывуць. Ну, мама бяседу сабрала, сваякоў назвала цэлую хату. А я ўзяла ды за сталом закурыла. Мама паклікала мяне ў сенцы ды і гаворыць: «Што ты, дачка,— хочаш мяне на ўсю Воршу абнясlaвіць? Кінь зараз жа папяроску!»

Алег, геолаг. Гадоў каля сарака. Мне здавалася раней, што Сібір — гэта край барадатых людзей. І асабліва я не ўяўляў без барады геолага. Геолаг без барады быў для мяне такім несапраўдным, як матрос без цельняшкі, жулік без фіксы, пірат без звыклай чорнай павязкі на адным воку. А тут сапраўдны геолаг, нават начальнік геалагічнай партыі — і вельмі ж акуратна паголены!

*Расказвае Алег:*

— Ты разумееш, на Поўначы чалавека вельмі цягне чамусьці на сентыментальнасць. Уяві сабе, маленечкі-маленечкі аэрадром сярод снягоў... Адна назва «аэрадром» — так сабе хатка на курыных ножках. На сасне зонд, нібы панчоха, лопае ад ветру. І ніякага раскладу руху няма: захоча — прыляціць самалёт, захоча — не прыляціць.

Спачатку, калі мы з Рытаю толькі пажаніліся, яна за мною таксама ўсюды ездзіла. Рыта мая добрая, ласкавая была. На вось, пісьмы пачытай. Ці, можа, давай я сам пачытаю: «У Хібінах выпаў снег. Там цяпер, мусіць, дужа холадна. Я гляджу на белыя горы і думаю, як табе холадна,— бр-р-р!.. У нас таксама халаднавата. Калі б я не замыкала дзверы, то яны б былі ўвесь час расчыненыя — вецер так і ходзіць па хаце. Олік, мілы, беражы сябе — ты вельмі-вельмі патрэбен і мне і дзвюм нашым дачушкам».

Гэта яна тады ў Цік-губе жыла. А я з партыяй быў у Хібінах. Рыта тады ў кожным пісьме паведамляла мне, як будуецца наш дом, дзе мне паабяцалі кватэру.

А потым... Потым, мусіць, надакучыла ёй з малымі дзецьмі бадзяцца за мною па халодных паўночных кутках. Цяпер яна ў Маскве, у дзіцячым садзе працуе. І ўсё піша мне: «Отцепись от Полярной звезды».

Я ўжо казаў табе пра палярную сентыментальнасць. Разумееш, часам на цябе ўсё гэта так навaліцца, так захопіць усяго... Вось пачытай, што я ў Эвенкіі ў дзённік запісаў у такі дзень: «Калі б сёння са мною была Рыта, то я быў бы такі добры да яе, як 12 мая 1954 года. (Гэта быў

дзень нашага вяселля.) Сёння я папрасіў бы ў яе прабачэння за ўсё дрэннае, што я калі-небудзь рабіў ёй».

Толькі «отцепиться от этой Полярной звезды» я ўжо ніяк не магу... Ага, вось фота Нарыльска палярнай ноччу. А гэта Рыціна фота. Яна добрая ў мяне. І дочкі на ёй. Вось сам паглядзі... Памятаю, як яшчэ ў Цік-губе я накрыўдзіў яе. Уяві сабе: вялікі-вялікі каток, ледзь асветлены нейкай параю лямпачак. Катаюся. Клікаў Рыту — не пайшла. «Дзяцей,— кажа,— купаць трэба». Позна ўжо, а мы з інструктарам спартыўным (прыгожая такая дзяўчына!) толькі ўдваіх на катку катаемся. І раптам я адчуў, што нехта сочыць за намі. У далёкім неасветленым кутку заўважыў маленькую шэранькую фігурку ў знаёмым дэмісезонным паліто. Стаіць, здаецца, нават дрыжыць ад холаду, у полы паліто ўсё захутваецца. Вярнуўся — нічога не сказала. Толькі ў дзённіку пасля майго апошняга запісу выказалася: «Глупое сердце, не бейся — он уж не любит тебя».

А вось гэты нож эвенк мне падараваў. Бачыш чатыры зарубкі на ім? Гэта колькі ён мядзведзяў перамог. За што падараваў, пытаеш? Разумееш, я якраз праз іхняе стойбішча праходзіў. Бачу, яго сям'я галадае — эвенк паехаў на факторыю, п'янствуе там, аленяў папрапіваў. Ну, я яго сям'і прадуктаў трохі пакінуў, накарміў іх. Дык ён, вярнуўшыся, дагнаў мяне і вось гэты нож аддаў. «На,— кажа,— і ведай, што цяпер у Эвенкіі ёсць у цябе сябры».

А гэта фота бачыш? Мой сябра. Доўга быў на Поўначы, і жонка хацела ўжо кідаць яго. Я ж прыехаў, нагаварыў ёй і пра цяжкасці і пра прыгажосць краю гэтага — памірыліся. Вось — мы п'ём за іх прымірэнне...

Я адчуваю, што і Алег таксама некалі памірыцца з Рытаю. Мне здаецца, што яны, нягледзячы на развод, усё яшчэ жывуць сваёй агульнай радасцю — каханнем.

Ля Ворагава заўважаеш, што сібірскія вёскі вельмі ж ужо аднолькавыя з выгляду. Падплываеш і здзіўляешся — ці не вярнуўся электраход назад: да гэтай вёскі мы ўжо, здаецца, прыставалі! Не, вёска іншая. Толькі ўсё такое ж, як і ў папярэдняй. Вось палоса пяску ля берага, а на ёй, нібы на старце, перад самай лініяй вады пасабраліся розныя лодкі: маленькія і вялікія, старыя і новыя, з вёсламі і без вёслаў. Як і там, трактар цягае да вады новыя лодкі — чорныя, прасмоленыя звонку і жоўценькія, нібы жаўто-

чак, усярэдзіне. На беразе — тоўстыя бёрны, павылаўленыя пасля крыгалому. Некаторыя парэзаны ўжо, некаторыя наколаты нават. Плашкі тоўстыя — круглякі колюць на чатыры часткі, а то і зусім толькі напалам: мароз тут вялікі, і таму трэба, каб палена гарэла доўга. Колькі клетак жоўтых, смалістых дроў сушыцца на сонцы — цэлая вялізная дрывотня на беразе! А далей, на высокую кручу, дзе расселася вялікае сяло, чапляючыся за бераг, узбіраецца многа ўсходцаў (мусіць, у кожнага гаспадара свае) — тут табе і ганачкі з поручнямі, і дошкі з папрыбіванымі папярэчынамі, і нават звычайныя лесвіцы, прыстаўленыя да берага, як да сцяны.

І толькі заўважаеш, што ў гэтай вёсцы ўжо няма ніводнага дрэва — блізка Палярны Круг, вечная мерзлата.

Казачанскі парог, пра які я столькі наслухаўся, мы праходзілі дужа рана раніцою. Баючыся праспаць, я ўстаў зарана і гадзіны са дзве ў халаднаватай ранішняй ядранасці чакаў гэтага дзіва. Але дзіва не было: карабель спакойна мінуў звужэнне, утворанае палосамі каменя, цераз якія бурліла вада,— і ўсё. Потым ужо, калі на караблі даведаліся, што мы прайшлі Казачанскі парог, многія пыталіся:

— Ну і як — страшна было?.. А на колькі метраў мы падалі ўніз з гэтага парога?

Чалавек часам, наслухаўшыся пра што-кольвек і стварыўшы ва ўяўленні нейкі ўжо свой вобраз, потым, убачыўшы ўсё гэта на свае вочы, расчароўваецца.

Кажуць, у Амерыцы сляпы ад прыроды чалавек, якому зрабілі аперацыю і які пачаў бачыць, астаўся незадаволены, расчараваны: ён зусім іншымі, больш радаснымі ўяўляў сабе колеры і ніколі не думаў, што чалавечыя вочы могуць быць такія няшчырыя і такія хітрыя — тое, з чым мы даўно звыкліся, яму вельмі крыўдна было бачыць.

Кажуць, што стражнікі, упершыню ўбачыўшы палымянага італьянскага камуніста Антоніо Грамшы, калі ён трапіў у турму, ніяк не маглі даць веры, што вось гэты маленькі, гарбаценькі чалавек і ёсць той Грамшы, якога баіцца нават урад. Камуніст уяўляўся ім гэтакім самавітым асілкам...

А на берагах, у заслоненых ад сонца мясцінах, мы пачалі заўважаць лапікі шэрага, як леташнія газеты, снегу.

Туруханск. Невялічкі драўляны раённы цэнтр. Кволае маладое лісце на рэдкіх дрэвах. Хлопцы з карабельнай каманды, жартуючы, папярэджваюць:

— А за Туруханскам камары такія — як коні. З капытамі нават. Некаторыя, мусіць, падкаваныя. Не кусаюцца, а брыкаюцца... Нават шыбы ў каютах выбіваюць — як дасць па шкле, аж зазвініць...

Курэйка. Вось тут, па рацэ Курэйцы, праходзіць Палярны Круг. Сонца ўжо тут не заходзіць. Яно, знізіўшыся, адскоквае ад небакраю, як каменьчык-пліска ад вады, і зноў пачынае ўзбірацца ўгору.

Ігарка. Вялікі порт, які гандлюе пілаваным лесам. На берагах ляжыць пачарнелы лёд: тут толькі што прашумеў крыгаход. Плылі льдзіны з умёрзлымі бёрнамі, плылі нават трактары і машыны, якія не паспелі выбавіцца з лядовага палону ды так, скаваныя, і паплылі на крыгах у Ледавіты акіян.

А ў Мядзведжым Лагу, куды рачнікі схавалі каля 50 суднаў — увесь дробны флот порта, у канцы чэрвеня адбылося сапраўднае лёдавае пабоішча.

Уваход у бухту тады закрылі баржаю. Каля яе сталі на лёдавую вахту ледакол «Палярны» і параход «Барэц». Але нават і праз такі заслон асобным ільдзінам усё роўна ўдалося праскочыць у Мядзведжы Лог. І тады маленечкі цеплаходзік «Север» смела кідаўся на іх і ўсё ж, крэкчучы і сапучы, выпіхваў з бухты крыгі намнога большыя за сябе. З якой цеплынёй і добраю ўсмешкаю ўспамінаюць сёння ў Ігарцы, як апантана змагаўся «Север» з крыгамі.

На чацвёрты дзень з правага боку блакітнай вуліцы з'явілася Дудзінка. Як зайцы на востраве, ратуючыся ад паводкі, на высокім месцы збіліся ў цесны гурт партовыя краны: каб не зацерла крыгамі ці не знесла ў акіян, іх зачалілі далёка ад ракі. Крыгалом некалькі дзён таму скончыўся, Енісей паспеў назелянець ужо ад вясны, а яны ўсё яшчэ не адважваюцца пакінуць гэтае высокае месца. Хутка ім памогуць людзі — пасля паводкі ў Дудзінцы заўсёды праводзяцца нядзельнікі, каб упарадкаваць прычал.

«Латвія» далей не поїдзе — там, у нізоўі, яшчэ бушуе ледаход.

Збочваю з хвалістай вуліцы і на цягніку, на вузкакалейцы, еду ў Нарыльск. Цягнічок слабаваты — нават на невялікіх пад'ёмах буксуе. Каб адолець перашкоду, ён дае назад, разганяецца і тады толькі, свішчучы і чохкаючы, узбіраецца на ўзгорачак. Тропкі зводдаль, амаль паралельна чыгунцы, як дзве круглыя бліскучыя рэйкі, па тундры цягнуцца трубы першага ў Запаляр'і газаправода

Мясаяха — Нарыльск. Летам, калі я быў у Нарыльску, якраз прадзімалі трубы, а цяпер газаправод, зразумела, здадзены ўжо ў эксплуатацыю.

Рэйкі ніколі не памыляюцца: яны добра ведаюць сваю дарогу. Хутка і беспамылкова яны знаходзяць Нарыльск — самы паўночны ў свеце горнарудны і металургічны цэнтр.

Сучасны, звычайны горад. Незвычайнае толькі тое, што вырас ён, узышоў, прабіўшы вечную мерзлату тундры — як падснежнік лёдавую корку.

У Нарыльску горача, парыць — як перад дажджом. У тым самым Нарыльску, дзе 300 дзён у годзе ляжыць снег, 270 дзён гуляюць па тундры вятры, 60 дзён людзі не бачаць сонца, мароз пад 40— 50 градусаў лічыцца нармальным, рабочым. У Нарыльску, на вуліцы якога паўночнае неба абвальвае да 100 мільёнаў кубаметраў снегу.

Але, нягледзячы на гэта, Нарыльск і зімою мае сваю свежую гароднiну: у горадзе ёсць добрыя грады — звыш 15 тысяч квадратных метраў цяпліц.

А цяпер вакол Нарыльска апантана цвіце тундра: каля 200 назваў кветак уплялося ў яе прыгожы вясновы букет.

І ўсё гэта на вечнай мерзлаце, на 69-й паралелі!

Мы з сакратаром парткома горнаруднага ўпраўлення Мікалаем Хведаравічам Андрэевым у бурнай рацэ Хараелах ловім харыуса. На вадзе, трымаючыся за бераг, дзенідзе ляжыць лёд; навокал узрадавана, а можа нават і трохі здзівіўшыся такой раптоўнай цеплыні, буяюць кветкі. Не, гэта зусім не падобна на спакойнае, разамлелае, зліпялае цвіценне Поўдня. Гэта няўрымслівае шаленства колераў: калі ўжо бэзавыя ці жоўтыя пялёсткі — дык абавязкова яркія-яркія, калі адна кветка — дык вялікая-вялікая, калі маленькія кветачкі — дык іх цэлы рой: гронка аж згінаецца долу. А побач з сумётамі гараць ярка-аранжавыя нестулы паўночных кветак — жаркі: гэта, мусіць, ад іх гарачыні паступова падтае снег...

Убачыўшы, што я любуюся кветкамі, якія саграваюць снег, Мікалай Хведаравіч гаворыць:

— А я пятнаццатага чэрвеня во тут яшчэ на лыжах хадзіў...

Прыгожа вясной у тундры! Але ўсё ж раней неяк не ўяўлялася, што можна адпачываць тут, на Таймыры. Усе ехалі абы-куды, абы толькі далей адсюль — ці на поўдзень, ці на захад, ці на ўсход. Але ў апошні час вакол Нарыльска з'явіліся дамы адпачынку, прафілакторыі, турбазы — «Валёк», «Рабінзон», «Бярозавы гаі», «Факел»...

Быў я і на Талнаху. Мы ехалі на добрай асфальтаванай дарозе, а я ўяўляў, як дабіраліся сюды геолагі. Мне расказвалі, што хлопцы станавіліся ў ланцужок, перадавалі адзін аднаму вёдры з вадою, палівалі ёю пушыстую, узбітую пургою будучую дарогу — снег, схоплены вадою і марозам, рабіўся белым асфальтам і не праламваўся пад машынамі.

Бачыў падземную здабычу руды. А талнахская руда вельмі багатая — у ёй ёсць ледзь не ўсе элементы з табліцы Мендзялеева. Алег, геолаг, на электраходзе гаварыў мне:

— Кожны геолаг марыць пра свой Талнах...

А на рудніку «Мядзведжы Ручай» Мікалай Хведаравіч пазнаёміў мяне з адкрытым спосабам здабычы руды. З дыспетчарскай, што стаіць высока па гары, вельмі ж добра відна панарама рудніка: унізе капаюцца маленькія экскаватары, бегаюць маленькія нашы МАЗы, дзяўбуць пароду такія самыя цацачныя буравыя ўстаноўкі.

— Зімою тут цяжкавата,— уздыхае Мікалай Хведаравіч.— Як задзьме пурга, дык тады дні са тры «Мядзведжы Ручай» адкопваем ад снегу. Людзі на працу і за паўдня дабрацца не могуць. Стаяць машыны на гары, а ехаць нельга — дарогу перамяло. А экскаватаршчыкі тады па дзве змены працуюць. Перададзім па рацыі ім, што дабрацца на Мядзвежку ніяк нельга,— і працуюць.

— І метал нават марозу не вытрымлівае,— дадае дыспетчар, дзяўчына, якой тут, кажуць, слухаюцца ўсе «мядзведзі» і «медзвяжатнікі».— Пачнуць шафёры хуткасць пераключаць, а рычагі, як сучкі сухія,— хруп! — і зламаліся. Нават і не падумаеш, што гэта жалеза. Гайку іншы пачне завінчваць, а яна, як цацачная, адломваецца. Во які крохкі метал на марозе робіцца!

Але людзі змянілі гэты край. Часам нават алені не могуць пазнаць тых мясцін, па якіх хадзілі спрадвеку.

Той вясной у канцы сакавіка і ў пачатку красавіка дзікія алені па левым беразе Енісея, звыклай дарогаю, ішлі на Поўнач — да заўсёдных мясцін сваіх ацёлаў. І раптам дарогу ім перагарадзіла траса газаправоду, якую будаўнікі зрабілі толькі зімою. Алені разгубіліся. Больш за 50 тысяч сабралася іх усцяж трасы. Але тут... Пра гэта пісаць не вельмі прыемна. Тут на іх, як калісьці на мамантa, хто з чым пайшлі браканьеры: з нажамі і палкамі, з сякерамі і камянямі, са стрэльбамі і нават на ўсюдыходах. Тэрмінова сабралася пасяджэнне Нарыльскага гарвыканкома. Быў

забаронены рух цягнікоў уночы, забаронены выхад усюдыходаў у гэты раён. Для грамадскіх інспектараў былі выдзелены верталёты. За некалькі дзён інспектары злавілі каля 40 браканьераў.

І ўсё ж людзі памаглі аленям адолець гэтую перашкоду — яны дайшлі да сваіх мясцін ацёлаў...

Я вярнуўся да Енісея. Перасеў у другую, не такую прасторную, як «Латвія», хату — маленькі цеплаходзік — і паплыў далей на Поўнач гэтай шырокаю вуліцаю.

Малая Хета — пасёлак геолагаў і рыбакоў. Наш цеплаходзік выйшлі сустракаць усе з пасёлка: дарослыя і дзеці, цяжарныя жанчыны і маці з немаўляткамі на руках, сабакі і камары. На беразе віск, гамана. Сустрэчы.

— Толька, д'ябал,— прывет!..

І Толька, хлопец у зімовай шапцы, сінім світэры і ў доўгіх ботах, лезе на борт цеплахода, зграбае ў абдымкі Колю Зварыцава, з якім я перад гэтым трохі пазнаёміўся:

— Колька! А я цябе ў акулярах не пазнаў! Ты ж у нас гэты веласіпед не насіў.

— А чаму ты не ў тундры?

— Дык я ж учора толькі вярнуўся.

Колька працаваў тут у геалагічнай партыі. Таму і сустрэў знаёмага.

Але большасць людзей, што сабраліся ля ракі, нікога не сустракаюць. Мужчыны і жанчыны стаяць на беразе, жартуюць. Ля самай вады, рагочучы і пырскаючыся, бегаюць малыя. Але чаму ўсе сюды так беглі, спяшаліся?

Тут толькі пачалася навігацыя. Наш цеплаходзік зазірнуў сюды адным з першых — адразу ж за крыгамі. І таму людзі, пачуўшы яго гудок, выбеглі на бераг — выйшлі сустрэць нас проста так, без асаблівай прычыны, добра ведаючы, што ні сваякі, ні знаёмыя на ім не плывуць.

Трошкі ў баку ад усёй гэтай мітусні я заўважыў чалавека ў нейкім брызентавым плашчы з башлыком замест шапкі. Чалавек, трошкі пахіліўшыся наперад, стаяў на адным месцы і ўсё, не паварочваючы галавы, толькі вачыма разглядаў пасажыраў. Мы адплылі ўжо, людзі палезлі ўверх, у пасёлак, а ён усё яшчэ стаяў у той самай паставе і ўсё глядзеў на цеплаход...

Насустрач плывуць калёсныя параходзікі са сваімі запчасткамі на палубе — тоўстымі дошкамі для лопасцяў.

Ад самай Дудзінкі ўсе берагі завалены лесам. Гэты лес, мусіць, сплаўлялі ў Ігарку, але не змаглі вылавіць. Думаю, колькі тут прападае чалавечай працы, і раптам чую:

— А Усць-Порт астаўся сёлета без дроў. Увесь лес пайшоў неяк бокам, ніводнага бервяна не дасталося ім...

Успамінаю дрывотні на беразе Енісея.

Успамінаю, што яшчэ ў тайзе я сустракаў цэлыя мёртвыя пасёлкі. Леспрамгас павыразаў блізка ўвесь лес, пераехаў у другое месца, пабудаваў там пасёлак, а гэты так і пакінуў з парасчыненымі веснiцамі, дзвярамі, вокнамі...

І раптам пасярод Енісея мы ўбачылі цэлы статак дзікіх аленяў — яны якраз пераплывалі на другі бераг. Плылі важна, спакойна, злёгку пакалыхваючы сваімі прыгожымі рагамі — здавалася нават, што тут неглыбока і яны ідуць па самым дне.

— У іх што,— заўважыў нехта з пасажыраў,— важак ідзе, і ўсе за ім ідуць. Топяцца, гінуць, але ўсё роўна ідуць. Адзін раз яшчэ большы статак пераплываў Енісей (тут жа ён пяць кіламетраў шырынёй), а на тым беразе сабакі — гаў-гаў-гаў... Дык важак, не адпачыўшы, назад павярнуў. І ўсе за ім паплылі, хоць былі дужа стомлены. Многа тады іх патапілася: паспрабуй дзесяць кіламетраў без перадыху праплысці. Але ж важак паплыў — няма чаго і ім думаць...

Каб не спалохаць аленяў, наш цеплаходзік спыніўся і даў ім дарогу — хай сабе плывуць!

## НЕБА НА ЗЯМЛІ

***Змест сшытка.** Нерашучы самалёт. Пасярод замарожаной спёкі. Статак туманоў з туманяткамі. Аляксей Пятровіч ці Пётр Аляксеевіч. Шашаль каменю. «Ціві-ціві-ціві». Свята караблёў. Загадка ЗФІ. Спроба пабываць на востраве Вікторыі. «Хадзем начальніка біць». Гурманная манная каша. Гром на лядовым купале. Ці балей у дзеда кіпцюр. Каму холадна без Поўначы. Ацёл леднікоў. Каго ўбрыкнуў д'ябал. У якім баку Полюс. Лёд, накрышаны ў начоўкі. «Цік» без «так». Дарога, паламаная на кавалкі. «Дзядзя Вася прыехаў». Камарыныя зайцы.*

Самалёт, мусіць, шукаў востраў Дзіксан. Пад крылом то бледнавата зелянела трохі адталая, усыпаная лужынкамі, мацерыковая тундра Таймыра, то, як першы нечапаны снег, бялеў кідкі лёд Карскага мора з рэдкімі азярцамі зеленаватай вады, то раптам самалёт доўга падаў уніз праз злямчаныя, шэрыя воблакі над востравам. Але і знайшоўшы Дзіксан (нават мы ў круглыя акенцы, блізенька-блізенька, бачылі ўжо лётнае поле), ён чамусьці зноў пачынаў набіраць вышыню.

Так самалёт падаў на востраў разы са тры. Нас, пасажыраў, гэта нават крыху забаўляла: бач, які нерашучы і асцярожны трапіўся нам самалёт — ніяк не адважыцца сесці. А калі ён, абтросшыся ад туману, зноў кружыў над плямістай, як алені, тундраю, над улёдзянелым Карскім морам, мы ўжо гатовы былі нават паверыць, што самалёт не сеў і кружыць ля вострава, толькі каб яшчэ раз паказаць нам з вышыні суровую прыгажосць гэтага краю.

Мы жартавалі, нам было весела. Лётчыкам было не да жартаў. Потым, ужо ў гасцініцы Дзіксанскага аэрапорта, хлопец у акулярах (як потым я даведаўся — настаўнік з пасёлка па мацерыку) тлумачыў, чаму мы так доўга садзіліся,— ён якраз ляцеў сюды на востраў і ў верталёце чуў усю размову па рацыі нашага самалёта з аэрадромам. Вось як, прыкладна, гэта было:

— Ну куды ж ты, куды ж ты ідзеш, як сляпы ўсё роўна! Трэба ж было трошкі лявей узяць,— злаваўся аэрадром.

— Панапускаюць тут самі туману, а потым яшчэ злуюцца,— жартаваў самалёт.

Гэта першы заход.

— Ну вось, а цяпер ужо зусім залявіў. Паласа ж у цябе, бачыш, дзе асталася — далёка справа.

— Бачу, але паспрабуй тут у вас разбярыся, дзе права, дзе лева!

Гэта другі заход.

— Пераляцеў, далібог, пераляцеў! Што — ты думаеш, можа, на каменне садзіцца, га?

— Ну, хопіць. Іду на чацвёрты заход. Калі не сяду, палячу назад.

Востраў доўга не прымаў нас. Сцішаны самалёт рэйсу Краснаярск — Дзіксан перад гэтым цэлыя суткі стаяў крыху воддаль узлётнай паласы па аэрадроме, і кожнаму (асабліва тым, хто павінен быў ляцець) кідаўся ў вочы сваім ярка-чырвоным, як у паўліна, хвастом палярнай авіяцыі. Прыемны, але такі абыякавы жаночы голас зноў дражніўся з пасажырамі, якія хто як (хто падклаўшы пад шчаку чамаданчык ці кулак, хто закінуўшы, нават перакуліўшы — аж страшна! — галаву назад, некуды аж за спінку лаўкі) спрабавалі спаць на нязручных аэрадромных крэслах і тапчанах: «Рэйсы на Дзіксан, Ціксі з-за метэаралагічных умоў адкладваюцца».

Дзіўнае гэта, прыемнае і неадольнае пачуццё — прага падарожнікаў забрацца як мага далей. Ужо ў дарозе ты

выпадкова даведваешся, што недзе побач жывуць сваім звычайным, невядомым табе жыццём незнаёмыя гарады, горы, бухты, і табе, нягледзячы па «метэаралагічныя ўмовы», раптам пясцерпна захочацца туды. Твой маршрут вельмі хутка разрастаецца, разбухае, як тоії кашэль з рыбаю, а ты ўсё спяшаешся дадаваць туды новыя і новыя жаданні, аж пакуль не спахопішся, што ўсюды, дзе хочаш, пабыць табе так і не ўдасца.

Азарт падарожніка мне здаецца чымсьці вельмі блізкі азарту грыбнікоў: вось адзін баравік, а вунь — другі, а там — трэці... І ўсё далей і далей, глыбей і глыбей у лес.

Ці, скажам, азарт жмінды запасіць грошы: спачатку, маўляў, адну сотню пакладу, потым — другую, а там — як ужо і ўтрымацца, каб не пакласці трэцюю...

Дудзінка паклікала Нарыльск, Нарыльск — Дзіксан. А вось цяпер Ціксі... Паспрабуй без шкадавання адмовіцца ад гэтых запалярных гарадоў на беразе Ледавітага акіяна, якія сваімі неспазнанымі імёнамі гіпнатызуюць цябе!

І вось ён, Дзіксан. Сярэдзіна лета. Павінна быць самая сярэдзіна спёкі. Я ж выйшаў з самалёта ў зіму, у самую сярэдзіну холаду. Пасінелы ад ветру і марозу ліпень зусім быў не падобны на летні месяц.

Цяжкое, халоднае, свінцовае неба Дзіксана, здавалася, назаўсёды ўпала на зямлю, прыціснуўшы ўсё, што было на востраве,— нават не падумаеш і не ўспомніш, што цяпер вось тут, недзе за хмарамі, як і ва ўсім Запаляр'і, кружыць, не заходзячы, сонца. Нібы пасмы снежнай вей, з шоргатам чапляючыся за бадыллё леташняй травы на абочыне, перабягаюць цераз дарогу ці то аблачынкі, ці то маленькія туманяткі, што адсталі ад статка старых туманоў. Недзе недалёка ў праліве крэкча, мусібыць, асядаючы, тоўсты летні лёд. Дзьме халодны вецер. Зямля яшчэ не адтала (з яе тырчаць умарожаныя, пасохлыя мінулагоднія кветкі). Пад нагамі прастуджана бухае, грыміць груда.

Вось ты які, Дзіксан, востраў, што вярнуўся да мяне адтуль, з дзяцінства. Яшчэ са школьных гадоў, з маіх падручнікаў! Тады ты быў для мяне проста назваю, толькі словам, і ніяк не ўяўляўся нечым матэрыяльным, жывым, аб'ёмным. А цяпер я нават чую тваё дыханне — у кожнага, хто размаўляе, грэюцца ля рота маленькія, як птушаняткі, хукаўкі: пагрэецца — і паляціць, пагрэецца — і паляціць...

Усе тут яшчэ апрануты па-зімоваму. Цёплыя шапкі-вушанкі, зімовае паліто, валёнкі ці боты. І я, перамёрзшы ў сваім летнім адзенні, яшчэ па аэрадроме, ледзь уціснуўшыся ў маленечкі настылы аўтобусік, які вёз мяне ў гасцініцу, пачынаў ужо сам сябе нават дакараць — маўляў, навошта табе, неабачнаму дурню, спатрэбілася ехаць сюды, за блізкі свет,— што ты тут не бачыў, што забыўся, і якой табе рамантыкі захацелася? Але потым, праз колькі дзён, калі я паспеў пазнаёміцца з многімі людзьмі вострава, калі ўжо нават пачынаў блытацца ў калейдаскопе імёнаў (з Іванамі Фёдаравічамі, Васілямі Пятровічамі, Аляксеямі Анісімавічамі мне даводзілася знаёміцца многа і так хутка, што не паспяваў нават як след запомніць іх імя і імя па бацьку), калі, толькі выйшаўшы з гасцініцы, ужо сустракаў знаёмых, якія, нібы я жыў з імі цэлую вечнасць, віталіся са мною,— тады востраў для мяне пасвятлеў і пацяплеў.

Тады я заўважыў, як прыгожа, роўным матавым святлом падсвечвае сонца туман, які, нібы ватаю, абклаў востраў — у ім засядаюць і цішэюць самыя рэзкія гукі, крыкі, шум. Тады мне адкрыўся рытм, элегічная і велічная музыка астраўнога каменю: то вялізныя каменныя глыбы, пліты і блокі, роўныя, нібы спецыяльна абчасаныя і пасцяганыя ў адно месца на будаўніцтва нейкага свайго храма сонца; то замшэлыя, у шэра-зеленаватых плямінах лішайнікаў, круглабокія, заінелыя аграмадзіны, якія вельмі ж ужо напамінаюць байніцы некалі магутных і грозных крэпасцяў, што потым, паточаныя вадою, ветрам і марозам — гэтым адвечным шашалем каменю, ціха асыпаліся ў рэдкую траву; то панаскіданае, наварочанае абы-як і немаведама дзеля чаго каменне — чамусьці здаецца, што тут ці то злаваўся, ці то забаўляўся нейкі казачны асілак.

Яшчэ больш цёпла зрабілася мне, калі я ўбачыў нарэшце пуначку, невялічкую шэрую птушачку са светлай грудкаю, гэтага нястомнага паўночнага жаўранка. Пуначку, пра якую з такою ласкавасцю і з такім замілаваннем гавораць дзіксанчане, якая, пашатырыўшыся, і ў снег і ў холад вельмі ўжо весела цівікае аднекуль з туману: ціві-ціві-ціві, ціві-ціві-ціві...

Дзіксан жыў чаканнем першага каравана караблёў. Ён даядаў і даношваў тое, што было завезена год таму назад. Навігацыя ж яшчэ пакуль што не пачыналася — паўтараметровы лёд, хоць і крэкчучы, але моцна стрымліваў пад

сабою пругкія, як рыбіны, марскія хвалі, якія, мусіць, ужо адчулі запозпепую паўночную вясну і спрабавалі страпянуцца, каб узняцца высока-высока і, размяўшыся пасля доўгай зімы, адчуўшы свабоду, з вялікай асалодаю, з шумам ударыць у бераг. Два ледаколы — «Мурманск» і «Уладзівасток» — даўно ўжо вялі сюды першы караван. І калі раптам яны паказаліся далёка на гарызонце, на востраве толькі і гаварылі пра іх:

— Бачылі? Караблікі ідуць! — забыўшыся нават павітацца, замест «добры дзень» гаварылі адны.

І ім, таксама як прывітаннем, адказвалі:

— Шэсць караблёў. З ледаколамі. Першы караван.

Калі я сядзеў у пакоі Барыса Сямёнавіча Бродкіна, начальніка ўсёй астраўной авіяцыі (дарэчы, ён з Бабруйска), то яму ўвесь час звапілі:

— Барыс Сямёнавіч, караблікі паказаліся! Гэта не да нас?

— Не, браце, не да нас. Яны ідуць у Дудзінку. З Архангельска.

Адчувалася, як той, хто трымае на тым баку трубку, трошкі расчараваны і зайздросціць у гэты момант Дудзінцы. Нават я, захапіўшыся агульным радасным настроем чакання караблёў, таксама шкадаваў, што яны ідуць не «да нас», не на Дзіксан...

На Поўначы, у запалярным календары, у дадатак да ўсіх нашых свят, мусіць, трэба ўпісаць яшчэ два вельмі жаданыя святы, якіх з асаблівым няўсцерпам чакаюць людзі.

Першае — гэта ўзыход сонца пасля двух месяцаў суцэльнай ночы. Давайце мы з вамі паспрабуем уявіць, як гэта можа расчуліць і ўзрадаваць чалавека, калі вочы, якія стаміліся ўжо ў цемені пазнаваць і свае хаты і нават сяброў на неасветленых вуліцах, раптам убачаць, як на ўсходзе, нібы адмытае, трохі пабялее неба, а потым з-за небасхілу пакажацца маленечкі-маленечкі кіпцюрык сонца, які з кожным днём будзе выглядваць усё больш і больш, аж пакуль поўнасцю не ўскоціцца на лінію гарызонту.

А другое свята — гэта прыход першага каравана. Ледаколы паламаюць лёд у праліве, мацерыковы вецер і енісейскае цячэнне адгоняць яго далей у акіян, а тут, на чыстай вадзе, збяруцца караблі. Адны прывязуць непаседлівых турыстаў, дзеля якіх бюро райкома пасля доўгага адмаўлення нарэшце ўгаворыць быць гідамі па сваім востраве звычайных рабочых людзей, у якіх яшчэ, на вялікае шчас-

це, не будзе прафесійнай бойкасці і запмальцаваных штампаў экскурсаводаў: «Зірніце направа, зірніце налева...» Другія — зноў на цэлы год прывязуць харчы, адзенне, абутак. Трэція... Ну, а трэція, можа, якраз не прывязуць нічога, апрача радасці, што вось цяпер востраў злучаюць з мацерыком не адны толькі самалёты...

На Дзіксане ўсяго дзве асноўныя арганізацыі, якія, як і трэба добрым суседзям, жывуць у згодзе: штаб мораперацый, ці, як яго яшчэ называюць, штаб праводкі марскіх суднаў, і РМЦ — радыёметцэнтр заходняга раёна Арктыкі. Штаб мораперацый працуе толькі ў часе навігацыі, толькі чатыры месяцы, але затое кругласутачна: яму ж трэба ведаць, дзе ў Ледавітым акіяне які карабель. А чым займаецца РМЦ?

— Арктыка, дарагі мой,— гэта кухня надвор'я,— гаворыць начальнік цэнтра Леў Сямёнавіч Таргунскі.— Так што мы кухары, мы робім надвор'е.

Пакуль ён адказвае на тэлефонны званок, я тое-сёе запісваю, а самому дужа ж карціць спытаць, як ён ставіцца да мноства жартаў пра іх — маўляў, калі метэаролагі божацца і клянуцца, што дзень будзе сонечны, абавязкова бяры з сабою плашч.

— Нашы палярныя станцыі ёсць і ў моры Лапцевых, і ў Карскім, і на Таймыры, і на Паўночнай Зямлі, і на ЗФІ,— паклаўшы трубку, казаў далей Таргунскі і, мусіць, адчуўшы, што я не разумею, што значыць ЗФІ, растлумачыў: — Так палярнікі называюць Зямлю Франца-Іосіфа. А на востраве Хейса ў нас працуе абсерваторыя «Дружная». Паглядзеў бы ты, дарагі мой, як там прыгожа, на Хейсе гэтым! Навокал астравы, а на астравах леднікі, у моры айсбергі, пейзаж суровы такі, а ў добрае сонечнае надвор'е блішчыць усё, пераліваецца...

— Мы збіраем гідралагічныя, тэлеметрычныя, іпнічныя звесткі,— дадаў намеснік начальніка РМЦ Генадзь Пятровіч Ільчапка, які незаўважна зайшоў у кабінет.— Потым складаем карты надвор'я. Выкарыстоўваем тут, а пасля перадаём у эфір. Іх прымаюць і, каму трэба,— выкарыстоўваюць.

І мне вельмі ж ужо заманулася на палярную станцыю. Куды-небудзь на самы Паўночны полюс. Ці хоць бы на востраў Рудольфа — самы далёкі востраў са станцыяй. Ці ўжо, на крайні выпадак,— на Вікторыю.

— Э, дарагі мой,— астудзіў мой азарт Таргунскі,— каб патрапіць хоць на якую палярную станцыю, трэба

прыязджаць у сакавіку, калі мы палярнікам пошту скідваем.

— Пачакай, Леў Сямёнавіч,— перапыніў яго Генадзь Пятровіч Ільчанка,— а што, калі вось зараз, у ліпені, паспрабуем пабываць на станцыі?

Ільчанка — вопытны палярнік. Ён многа зімаваў на розных палярных станцыях. І мы накіраваліся з ім у Ледавіты акіян. Спачатку — на Вікторыю.

***Расказвае Генадзь Ільчанка:***

— Значыць, Вікторыя. Я трапіў туды выпадкова, недзе ўжо ў сярэдзіне зімоўкі. Там быў начальнікам станцыі Арлоў. Але нешта не паладзіў ён з калектывам. Пасыпаліся скаргі, тэлеграмы: начальнік станцыі на калектыў піша, калектыў — на начальніка. Выклікалі мяне і кажуць: «Давядзецца табе Арлова замяніць». Параілі, пакуль будзе стаяць на востраве самалёт, правесці сход, распазнаць завадатара і разам з Арловым адправіць на мацярык. Але дзе там за якую гадзіну паспееш той сход правесці. Я і так ледзь паспеў толькі паперкі прыёму-здачы падпісаць, якія мне Арлоў падсоўваў. Падпісаў, не гледзячы, не разбіраючы, што дзе ляжыць: станцыю як ката ў мяшку прымаў.

І вось самалёт узняўся, памахаў нам крыламі на развітанне і паляцеў сабе. З Арловым на борце. Я сабраў калектыў. А таго калектыву кот паплакаў — са мною ўсяго толькі пяць чалавек. Хлопцы і кажуць: «Вам ужо, мусіць, нагаварылі многа пра нас — мы і такія, мы і гэткія». Бачу — глядзяць насцярожана. Чакаюць, як я павяду сябе. «А хто пра вас павінен быў гаварыць мне? — пытаюся.— Я нічога не чуў, нічога не ведаю. І ведаць не хачу. Мне не цікава, як у вас тут было раней, а ў нас будзе цяпер вось так».

І расказаў усё, як мы будзем дазімоўваць на Вікторыі.

А быў на станцыі радыст — Гена Папенка. Бацьку яго, вядомага лётчыка-выпрабавальніка, у свой час рэпрэсіравалі, а Гену ў дзіцячы дом аддалі. Цяпер, праўда, бацька рэабілітаваны, ён нядаўна прыязджаў сюды, лятаў да Гены на «палярку», а потым і зусім забраў яго з сабою.

А тады Гена быў з намі. Мілы хлопец. Але як трохі перабярэ — кулакі ў яго свярбяць. Трэба яму пабіцца, ды і ўсё. Ледзь што — «Хадзем начальніка біць!» Арлоў дзе толькі не хаваўся ад яго — і за таросамі, і на гарышчы до-

міка. Усё роўна знаходзіў. Гэта ж не ў горадзе, дзе хавацца добра. А тут жа, у лядовай пустыні, далёка ідаць. Ды і ў міліцыю не назвоніш, каб забралі, 15 сутак далі. Пры мне, праўда, не перабіраў. Адпекваўся. «Не п'ю»,— казаў. Але адзін раз было. «Пайду, кажа, з Пятровічам пагавару». А Валерка, сябар яго, не пускае да мяне. Я чую — за сценкаю тузаюцца. Я туды. «Пятровіч, сыдзі!» Але ўсё абышлося. Валерка супакоіў. Назаўтра прачынаецца і пытае ў мяне: «Пятровіч, я тут нічога не рабіў?» — «Не чуў,— адказваю,— па-мойму, ты спаў». Я, праўда, ніякіх арганізацыйных вывадаў з гэтага не рабіў.

А тут пад канец зімоўкі скончылася неяк у нас мяса, асталіся толькі адны манныя крупы. І, разумееце, настолькі ўсім нам гэтая манка збрыдзела — ніхто і глядзець на яе не хоча. Хлопцы ўжо і на сняданне не прыходзяць (ай, чаго туды ісці, там жа зноў, як і ўчора, адно манная каша будзе), і на полудзень таксама ніяк не даклікацца. Спяць сабе, ды і ўсё. Добра, што ўмовы ёсць — вокны і ў поўдзень завешваць не трэба: над востравам жа цёмная палярная ноч вісіць. Яно чалавеку звыкламу і то цяжкавата гэтую ноч пераносіць. Усё цёмна і цёмна — адно спаць хочацца. А навічкі, якія ўпершыню зімуюць, дык тыя наогул мучацца: дзе ні сядзе такі — ці ў сталоўцы, ці ў чытальні, ці ля рацыі — глядзіш, ужо і задрамаў. Аж захрапе іншы. Ды так, што белыя мядзведзі і тыя ад нашай станцыі ўцякаюць.

Бачу я — худнеюць хлопцы. Дзіва што — нічога ж не ядуць! Трэба мне нейкія меры прымаць. І я загадваю ўсім тры разы на дзень прыходзіць у сталоўку. Абавязкова. Не хочаш, маўляў, есці — не еш, але прыйдзі, пасядзі за сталом, паглядзі, як іншыя есці будуць. «Няпраўда, думаю, усё ж нехта лыжкаю нешта калупне, хоць нейкую шклянку чаю вып'е». А сам, разумееце, сяджу за сталом, ем тую манную кашу, а яна ў мяне ў роце расце, у горле перасядае. Але я раблю выгляд, што дужа смачна, і ўвесь час падхвальваю: «Ну і каша, ну і каша! Гэта ж не каша, а манна нябесная! Гэта ж ежа багоў. Ну і каша! Дай-ка мне яшчэ дабаўку»,— прашу кухара. Ен, хоць і здзівіўшыся, мне яшчэ міску накладае. Я зноў ем і хвалю: «Ну і каша!» Усе сядзяць, глядзяць на мяне, плячыма паціскаюць. Глядзіш — захапіўшыся маім азартам, і хлопцы на пары лыжак незаўважна ў рот укінуць. А я і дабаўку з'ем. А потым ужо, чую, гавораць: «Ніколі б не надумаў, што можна гэтак любіць манную кашу». Ужо трохі пасля я даведаў-

ся, што па ўсіх суседніх зімоўках разнеслася, нібы Ільчанка — вялікі гурман: ён да смерці любіць манную кашу.

Так і неразімавалі. Нашу работу ў РМЦ на «выдатна» ацанілі. І вось чакаем мы ўжо змены. Лёдавыя таросы расчысцілі. Пасадачную пляцоўку падрыхтавалі. На Дзіксан паведамілі — маўляў, туману няма, чакаем самалёт. І тут, ці паверыце, раптам бачу: з аднаго боку ляціць самалёт, а з другога — густая хваля туману засцілае нашу паласу. І нічога не зробіш — хоць ты сам сябе за локаць укусі. Праз мінуту ўжо туман схаваў і нашу пасадачную паласу, і нашы домікі, і нас саміх. Чуем, недзе ў тумане над намі пратарахцеў самалёт, потым нешта загрымела — і раптам усё сціхла. Ціха-ціха стала на востраве, нібы мы ўсе паглухлі. А я дык і спалохаўся: а што, калі лётчыкі канец нашай пасадачнай пляцоўкі ў тумане прынялі за пачатак і ўрэзаліся ў таросы? Паспрабуй тады даказаць, што ў той час, калі мы прасілі самалёт, туману над пасадачнай пляцоўкай не было. Я — да Гены. Прашу яго звязацца па рацыі з самалётам. Але экіпаж маўчыць. Ну, думаю,— усё. Пабеглі шукаць у той бок, куды паляцеў самалёт. Прайшлі трохі — чуем, людзі размаўляюць недзе недалёка. Потым і іх саміх убачылі. Дзіўныя такія ў тумане, ненатуральныя. І не ідуць, здалося, а ўсё роўна як плывуць у вадзе. Бачым іх, усе разам гаворым, што людзі ідуць, але паасобку кожны сабе не верыць яшчэ, думае — а што, калі гэта галюцынацыя. На Поўначы ж нярэдка такое бывае: раптам выразна-выразна ў блакітна-белым прасторы Ледавітага ўбачыш характэрны айсберг ледакола. Нават пачуеш, як ён з хрустам крышыць лёд. І потым доўга яшчэ ніяк не хочаш змірыцца, што карабля ўсё ж такі не было, і ўсё пераконваеш сябе — ён быў, быў, быў... Але на гэты раз мы неўзабаве абдымалі сваю змену — не міражных, а жывых і здаровых людзей. Аказваецца, лётчыкі пасадзілі самалёт на лядовы купал. Там якраз туману не было...

Вы сабе нават і ўявіць, мусіць, не можаце, што значыць на палярнай станцыі ўбачыць самалёт! На мацерыку мы яго бачым як не штодзень, ён там ужо такі звыклы, як трамвай ці тралейбус, і таму не выклікае ніякіх асаблівых пачуццяў. На палярцы ж гэта цэлая падзея. Колькі радасці выклікае ўжо нават адно яго далёкае нагугукванне — гу-гу-гу, гу-гу-гу... А потым з лётчыкамі ніяк не нагаварыцца. Нават трошкі дзіўнавата бачыць незнаёмыя твары.

Разумееце, да гэтага было ўсё толькі звыклае. Раніцою

паднімаемся, робім фіззарадку — пяць чалавек. Ідзём у сталоўку снедаць, садзімся за стол — усе сядзяць супроць усіх — таксама пяць чалавек. Вечарам збіраемся разам, расказваем анекдоты, цікавыя гісторыі — таксама, як ні круці, зноў пяць чалавек. Мы ўжо даўно вывучылі, дзе ў каго на твары якая маршчынка, як у каго прычасаны валасы, і адразу ж заўважым, калі хоць адзін волас будзе ляжаць не на сваім месцы. Мы ведаем адзін пра аднаго, здаецца, усё. Нават ведаем, у чыйго бацькі расла вельмі моцная лапушыстая табака, а ў чыйго дзеда (і на якім пальцы!) балеў некалі кіпцюр. Таму і дзіўнавата бывае з непрывычкі бачыць незнаёмы твар.

Жанчыны гэта пераносяць яшчэ горш. Мы спрабавалі дзеля эксперыменту браць па станцыю дзвюх жанчын. Але яны, месяц пажыўшы між сабою ў такой дружбе, што, здавалася, і вадою не разальеш, потым перасварыліся і адна з адной і з усімі членамі экспедыцыі — давялося раней часу прасіць самалёт, каб як найхутчэй адправіць іх з зімоўкі.

А мы, значыць, дачакаліся самалёта.

Па дарозе на Дзіксан завярнулі да сваіх сяброў, на бліжэйшую палярную станцыю. Яны наладзілі нам сапраўды боскі прыём: стол аж ламаўся ад пачастунку. Усе радасныя і задаволеныя паселі за сталы. Бачу, нешта начальнік гэтай станцыі ўсё мнецца, усё не пачынае — ніяк не адважыцца выдыхнуць першы тост. Просіць чамусьці паклікаць кухара. А я сабе думаю: «Ну і прыдзірлівы ж ён, д'ябал, калі нават на такім стале бачыць нейкія недахопы!» А калі кухар прыйшоў, начальнік і пытае ў яго:

— Слухай, Міша, а манная каша ў нас ёсць?

Той здзіўлена пазірае на начальніка, націскае плячыма:

— Ёсць, вядома, але хіба на стале мала закусі? Навошта яна тут?

— Як навошта? Гэта ж той Ільчанка, які без маннай кашы жыць не можа...

Усе маўчаць, згодна ківаюць галовамі — а як жа, маўляў, калі гурману Ільчанку хочацца гэтай гурманнай маннай кашкі, то чаму б яе і не паставіць на стол.

Вось тут мяне і прарвала:

— Знайшлі гурмана! Манная каша! Яна ў мяне і цяпер яшчэ поперак горла стаіць!

І расказаў, адкуль узялася легенда пра Ільчанку і манную кашу. Усе, вядома, рагаталі. Першы тост выпілі за

манную кашу. І потым яшчэ за яе, салодзенькую, пілі. Але часам і цяпер хто-кольвек возьме і спытае:

— Намеснік начальніка РМЦ? Ільчанка? А гэта не той, што манную кашу вельмі любіць?

Той, той Ільчанка! Люблю манную кашу! Яшчэ не тое будзеш любіць, калі спатрэбіцца. А ў нас, у Запаляр'і, усё можа здарыцца.

Поўнач дужа да сябе цягне. Я сам пасля зімовак ужо ў Маскве быў прыжыўся. Працаваў там ва ўпраўленні, дачу меў, машыну таксама. І раптам сустракаюся са сваім сябрам даўнім, палярнікам. Слова за слова — разгаварыліся. «Хадзі,— кажу,— да мяне дадому. Па чарцы зробім, пасядзім, пагамонім. Поўнач успомнім». Ну, значыць, выпілі па чарцы, сядзім, успамінаем знаёмых, Ледавіты, станцыі, на якіх некалі зімавалі.

— А ведаеш, давай мы яшчэ па разу з'ездзім, і тады ўжо — усё,— прапаноўвае Іван.

— Ну што ты, Ваня! Цяжкавата ўжо будзе — сям'я, дзеці, Масква...

Выпілі яшчэ па чарцы.

— А ўсё-такі давай...

— Пачакай, трэба падумаць...

А ў самога сэрца, адчуваю, зашчымела. Выпілі яшчэ па адной.

— Ну што?

— А, было не было — паедзем. Яшчэ па разу адзімуем — і тады ўжо ўсё. Гэта будзе апошні раз. І кропка.

Ну, разышліся мы, я і забыўся пра гэта. Цвярозаму ж цяжэй зноў рашыцца на такое. Праўда, жонка назаўтра ўспомніла: «А ты ведаеш, пра што вы ўчора дамаўляліся?» А потым і яна забылася. А тут звоніць Іван:

— Гена, дык ты сабраўся?

— Куды сабраўся? Ці мала што п'яныя мы з табою рашылі! — кажу, а сам адчуваю, што адпеквацца не хочацца.

— Ты разумееш, пяёмка неяк атрымліваецца. Я ўжо і хлопцам сказаў, яны чакаюць цябе. Кажуць, няхай Ільчанка любую, якую захоча, станцыю выбірае.

І я зноў трапіў на Поўнач. Адзін раз адзімаваў, другі, трэці... А цяпер вось у РМЦ засеў. І ўсё думаю яшчэ неяк паразімаваць на станцыі. Ужо самы-самы апошні раз...

Ільчанка змоўк... Маўчаў і я. Паступова, паціхеньку, не спяшаючыся, вяртаўся я на Дзіксан, неахвотна пакідаючы

ўбачапую і да драбніц абжытую, дзякуючы Генадзю Пятровічу, палярпую станцыю. Вось мы ўжо і адламаліся ад Вікторыі, нібы невялічкі кавалачак ад вялікага айсберга, і згубіліся недзе ў акіяне — шэрая льдзіна сярод белых лядовых гор і ўзгоркаў. Плывём, а навокал з астравоў спаўзаюць усё новыя і новыя льдзіны — цяпер жа ў акіяне самы ацёл леднікоў: меншапькія льдзіны ссоўваюцца вельмі ўжо асцярожна (так і трэба поваnароджаным немаўлятам!), а большыя — тыя трохі смялейшыя: з разгону, як цюлені, плюхаюцца ў ваду — аж пачынае калыхацца Ледавіты...

А вось і зноў ужо Дзіксан — чуецe, як узрадавана загуў цеплаход? Значыць, я на востраве, значыць, вярнуўся з далёкага падарожжа, у якое мяне браў з сабою Ільчанка...

Над Дзіксанам раскашуецца сонца, і ў РМЦ ніхто сёння не працуе — кожны сонечны дзень на востраве абвяшчаецца днём здароўя, і ўсе, хто як можа, стараюццаназагараць: чалавек упіхчваецца між валуноў, знаходзіць нагрэтае, зацішнае ад ветру месца, радуецца прыемнаму пакалванню рэдкіх прамяў і па-свойску ўсміхаецца маленькай кветцы, якая дзівам прабілася вось тут, побач, між каменне.

Так, гэтыя мясціны толькі для мужных людзей. Хоць часцей за ўсё здараецца наадварот — самыя звычайныя людзі становяцца сапраўднымі палярнікамі. Яны прыязджаюць сюды з адзінай думкаю — ай, маўляў, вось папрацую год-два, трохі збяру грошай, а тады і махну на мацярык. Але праходзіць і год, і другі, і трэці, а яны астаюцца тут. Спачатку мяркуюць напрацаваць да першай паляркі (дабаўка да заробку на Крайняй Поўначы), да другой, да трэцяй, а потым і самі не заўважаюць, што палучаюць ужо і восьмую і што, апрача ўсяго, у іх з'явілася яшчэ нейкае новае пачуццё да гэтага суровага краю. І раптам зусім нечакана для сябе выяўляюць, што яны захварэлі на Поўнач — на дзіўную, неадольную хваробу.

Напачатку яны зараблялі тут грошы, а недзе там, на мацерыку, уступалі ў кааператыў, будавалі сабе кватэру і, нават развітаўшыся з востравам, спрабавалі пачынаць новае — спакойнае і цёплае — жыццё. Але многія вярталіся сюды зноў — без гэтага свінцовага неба, без гэтага заляпнага холаду, без гэтых самотных кветак між валуноў, без гэтай радасці, калі выпадае адзіны сонечны дзень, без гэтага шолаху і шыпення паўночнага ззяння ім цяпер усюды было ўжо неяк халаднавата і пяўтульна... Ім усюды

патрэбен быў Дзіксан, пасёлак, які я за пару гадзін абышоў увесь, агледзеў і пасля не ведаў, што далей рабіць...

Гэта потым даведаўся ўжо я, што штаб мораперацый пасылае ў акіян самалёты на разведку льдоў. Але каб паляцець з імі, абавязкова трэба мець спецыяльны дазвол. А каб мець дазвол — трэба з вострава цераз праліў ісці ў пасёлак на мацерыку. Менавіта ісці, бо чакаць верталёта няма сэнсу: ён можа прыляцець толькі тады, калі збярэцца поўны камплект пасажыраў.

Ільчанка даў мне свае вялізныя, як лодкі, боты і паказаў прыблізна, у які бок ісці. Спачатку я ішоў вельмі ж ужо асцярожненька — адной нагою доўга мацаў лёд, покуль цвёрда не адважваўся стаць на яго, потым павольна падсоўваў другую: перад гэтым мяне так напалохалі праліваў (маўляў, там і тыя, хто яго добра ведае, топяцца), што мне здаваўся ненадзейным нават і лёд у паўтара-два метры.

Пасля ўжо я зусім асмялеў. Любаваўся зеленавата-блакітнымі вымоінамі на лёдзе, весела пераскокваў цераз невялікія лужыны чыстай, як сляза, вады. І нават змог дазволіць сабе памурлыкаць пад нос нешта накшталт песенькі пра капітана.

А па лёдзе праліву плылі сапраўдныя рэкі. Адны з іх пераразалі наезджаную ўсюдыходамі зімовую дарогу, другія пачыналіся якраз з каляін. Каб пераскочыць цераз іх, я пакрэплымі ад ветру і марозу рукамі (ліпень жа ўсё-такі, д'ябал яго ўбрыкні!) цягаў нейкія скрынкі, зваленыя недалёка на лёдзе, тапіў іх адна на адну ў раку, але яны, так і не дастаўшы дна, вылузваліся і выскоквалі на паверхню. Пасля ўжо, убачыўшы, як людзі абыходзяць такія рэкі, я здагадаўся, што ў іх часцей за ўсё не бывае ні пачатку, ні канца — яны пачынаюцца непрыкметна, з маленькіх ручаінак, і канчаюцца таксама непрыкметна: рака раптам пачынае вузець і вузець, пакуль не зацíхне недзе пад тоўстым пластам зялёнага лёду.

Абышоўшы яшчэ адну такую раку, я нечакана ўбачыў пасёлак: аказваецца, ён не так далёка ад вострава. Нават няёмка стала за свой жарт, калі я, збіраючыся ісці цераз праліў, не ведаючы, ці далёка бераг, не бачачы ў тумане пасёлка, гаварыў Ільчанку:

— А што, калі я зблытаю напрамак, заблуджуся і пайду ў бок Паўночнага полюса?

Ён-то ведаў, што пасёлак вось тут, побач — за туманам...

Невялікі драўляны пасёлак. Высокія дашчаныя тратуары. Трубы паравога ацяплення ляжаць на паверхні, абшытыя дошкамі: у зямлю іх не закапаеш — тут жа вечная мерзлата! Іду, прыглядаюся. І раптам чую:

— Привет, дорогой! Ты уже приехал?

Спачатку думаю, што гэта вітаюцца не са мной. Азіраюся. Не, са мною. Прыгожы малады мужчына. Прыблізна маіх год.

— Как хорошо, что ты приехал! Наконец-то я тебя дождался. Что? Не знаешь? Как это ты меня не знаешь? Я обознался, говоришь? Вот дает! Да брось ты, Лёха, шутить! Это ты просто забыл. Мы же с тобою на Сумгаите вместе работали. Ты инженером... Что, ты на Сумгаите не был? Тогда, может, в Снежногорске. Или на Талнахе...

На Талнаху-то я быў, думаю, можа, недзе і сустракаліся. Устаўляю свае тры грошы:

— Талнах-то я ведаю, але...

— Никаких «но», дорогой. Значит, мы с тобой на Талнахе работали. Ты — инженером, я — сварщиком. А теперь я здесь сварщик-водолаз. Суда варю. Я сам цену устанавливаю. Хочешь — вари, хочешь — так, с пробоиной, плыви. Я здесь единственный специалист. Это вымогательство, скажешь? Но мне же тоже надо заработать. Я уже институт имени Патона окончил. Но пока места инженера нет. Машина у меня есть. «Чайка». Но здесь же она мне совершенно не нужна, я пока ее у тещи в Одессе оставил. Она права получила и пока соседей катает, в магазины иногда их возит. Иногда в баню — потом в машине вениками долго пахнет. Да что мы с тобою здесь стоим? Пошли, Саня, ко мне в гости. У меня жена есть, двое детишек. Видишь, все есть. Но иногда, понимаешь, какая-то грусть найдет, сидим, я на пианино Чайковского играю — да, у нас и пианино есть,— а сами картошку сушеную едим. Пойдем, пойдем ко мне в гости. Жена будет рада. У нее очень хорошая настойка клюквенная есть — клюкву нам с материка присылают. Как это ты не можешь? Спешишь? Да перестань ты! Столько не виделись мы с тобой, а он «спешит»... Неужели не зайдешь? А у меня сын растет. Уже десять месяцев ему. Некоторые говорят, что на вечной мерзлоте дети плохо растут — чего-то им не хватает. Пойдем, посмотришь, какой крепыш. Щечки розовенькие, ручки пухленькие, как ниточками перевязанные у ладошек и локотков, глаза веселые-веселые, да и говорит уже сразу басом. У меня и кинокамера есть. Я филь-

мы делал, посылал в «Мосарктикфильм», даже премии давали. Рассказы я тоже пишу. Правда, посылал в «Известия», так назад вернули. Ошибок много, говорят... Зарабатываем мы здесь, Толька, прилично. Я бы мог еще машину купить, да вот только жена не дает. Говорит, куда ты на ней ездить будешь — вездеходы, что ли, вытаскивать. А так уже привыкли. Шестая полярка идет. Правда, оперного театра нет. Но ничего. Я не очень-то и люблю оперу. А насчет того, что я тебя знаю, что мы с тобой на Талнахе работали, я, друг, просто выдумал. Просто увидел, что ты незнакомый, нездешний человек, и — дай, думаю, поговорю. Понимаешь, всех своих мы уже давно знаем, а тут вдруг незнакомый человек. Слушай, а в гости ты серьезно приходи. Давай хоть познакомимся — меня зовут Коля Демченко. У жены есть наливка. Клюквенная. Клюкву нам с материка присылают...

Пасля ўсяго, што ў час выпадковай сустрэчы нагаварыў мне Коля Дземчанка, я сумняваюся, што імя і прозвішча сваё назваў ён таксама правільна. І толькі ў адно абавязкова веру: у яго сапраўды ёсць дзесяцімесячны сын (шчочкі ружовенькія, ручкі пухленькія, вочкі вясёленькія-вясёленькія), бо так чулліва і радасна гаварыць пра дзіця можа сапраўды толькі шчаслівы бацька...

Чалавек, ад якога залежала, ляцець мне на лядовую разведку ці не, пачаў крыху расхалоджваць, адгаворваць:

— Што вы не бачылі ў тым акіяне? Там жа нічога цікавага няма. Асабліва цяпер. Акіян — гэта ж пачоўкі, у якія нехта накрышыў лёду. Вось і ўсё ўражанне. Такі акіян вы і ў сябе ў Мінску ў кватэры зрабіць можаце. Галоўнае — каб былі пачоўкі і лёд. А вось людзі...

— Дык я ж з людзьмі якраз і лячу.

— Ну, добра, а калі самалёт на Дзіксане сесці не зможа з-за метэаралагічных умоў? Калі яму давядзецца сесці недзе на востраве, у глыбіні акіяна? А вы ж так лёгка апрануты — змерзнеце там...

Але турботы гэтага таварыша былі дарэмныя: лядовы разведчык шчасліва ўзляцеў і шчасліва, нягледзячы на туман, сеў — для сапраўдных, вопытных палярнікаў гэта перашкода не дужа сур'ёзная.

Мы ляцім зусім нізка — туман прыціскае наш самалёт як не да самых ільдоў. Вышыня — 50—100 метраў. Часам здаецца нават, што самалёт яшчэ не ўзляцеў і, мінуўшы ўзлётную паласу, усё коціцца па лёдзе. Прыкідваю, колькі часу пры такой хуткасці трэба, каб сустрэцца з ільдзінай.

Па маіх падліках выходзіць недзе каля паўсекунды — гадзіннік зможа сказаць толькі «цік», а на «так» у яго ўжо не хопіць часу.

Караблям, нават і з ледаколамі, цяжкавата бывае прабіцца праз тоўстыя льды, і тады ім на дапамогу прыходзяць самалёты — палярныя разведчыкі. Яны вывучаюць лядовыя абставіны — дзе лёд больш за ўсё разбураны, дзе ён менеш за ўсё трывалы,— складаюць у час палёту карту і скідваюць яе на ледакол: выбірайце, маўляў, дзе лепей вам ісці!

Я гляджу ў акно і сам ужо сяк-так стараюся разабрацца ў лядовых абставінах. Вось светла-зялёныя плямы па ўсім лёдзе — вялікія і маленькія, круглыя і прадаўгаватыя. Тут разбуранасць лёду невялікая — усяго два балы. А вось цёмна-карычневыя азёры. Гэта прамоіны да самай вады. Тут лёд менеш трывалы: тры балы разбуранасці. Пяць балаў — лёд ужо разбураны зусім. А потым ідуць «карункі» — прыгожыя белыя ўзоры, якія вельмі хараша, як усё роўна на нейкай падкладцы, глядзяцца на цёмнай вадзе. Тут ужо ледаколу няма чаго рабіць.

Таросістасць нуль — лёд чысты, гладкі, як белае футбольнае поле.

Трывалы прыпай. Вецер, мусіць, доўгі час дзьмуў з акіяна, а таму лёд узлез аж на самы мыс. Уяўляю, як ільдзіны з трэскам, ломячыся, напіралі на голае каменне. Калі вецер пераменіць кірунак, пачне дзьмуць з мацерыка, прыпай злезе з берага, і льдзіны патроху, але таксама з крэктам, пасунуцца ў акіян, пакінуўшы палоску чыстай вады ля берага, ды дзе-нідзе лядовыя абломкі на мысе.

— А вось і мыс Шайтанны,— паказвае мне Юры Бартановіч, гідролаг, які гаворыць з беларускім акцэнтам і ўсё спявае «Чаму ж мне не пець».— Вунь хатка, дзе жывуць два хлопцы, якія маяк абслугоўваюць.

Маленькая (тым больш зверху), самотная хатка. Да яе наўпрасткі па тундры спяшаецца доўгі — не відно, дзе ён пачынаецца — карычневы след ад усюдыхода.

— Усё збіраюся да іх на паляванне з'ездзіць. У хлопцаў лодка ёсць, усюдыход свой. А на Шайтанным зайцоў багата.

На гэтым голым мысе — зайцы? А дзе ж яны хаваюцца, калі тут ніводнага кусточка няма? Дзіўна — мне

ўвесь час здавалася, што зайцоў без лесу, без кустоў не бывае...

— А яны ў скалах хаваюцца,— тлумачыць Юры Анісімавіч.— Прыляжа за каменем ад ветру і дрэмле сабе. Тут жа ім баяцца асабліва няма каго. Яны ж, лічы, тут непалоханыя. Толькі мы зрэдзь калі і выберамся на Шайтаны, паганяем іх трохі.

Пад левым крылом самалёта паўзе дарога паміж ільдоў — палоска чыстай вады. Ага, значыць, недзе недалёка і сам караван. Значыць, ледаколы толькі што прайшлі. Раней мне здавалася, што дастаткова адзін раз прайсці ледаколам, а потым ужо ў любы час па гэтай дарозе могуць ісці караблі: палоска заўсёды будзе чыстая. Але ж акіян па натуры сваёй вялікі свавольнік: то раптам ён так сціспе пераламаныя льдзіны, што на месцы былой дарогі высока ўзнімуцца таросы; то, забаўляючыся, ільдзіну з цэлым праёмам дарогі аднясе далёка ўбок (паспрабуй яе знайдзі!) і паставіць яе ўпоперак асноўнага праходу; а то і наогул паламае дарогу на кавалкі і параскідае яе ў шахматным парадку.

Кожнаму каравану, пакуль не ачысціцца Паўночны марскі шлях, трэба новая, менавіта свая дарога.

А вось і караван. Першы ледакол (не відно, «Мурманск» ці «Уладзівасток») ламае льдзіны, як кавалкі тоўстага шкла. Зверху гэта асабліва добра відно: вось ён разагнаўся і з сілаю ўдарыўся носам у льдзіну — і нешырокая трэшчына-раскепіна хуценька пабегла на лёдзе; а гэтая льдзіна завельмі моцная — не раскалолася, і ледакол ускочыў на яе так, што ніякай рады не могуць даць нават усе яго конскія сілы: трэба прасіць, каб сцягнуў сябра.

Карта лядовай разведкі ўжо гатова. Але скідваць яе на борт ледакола сёння няма патрэбы: абодва капітаны цяпер у штабе праводкі марскіх суднаў — калі мы адляталі, бачылі, што на аэрадроме стаіць іх маленькі верталёт.

Караван падыходзіць да Дзіксана. А мне час ужо развітвацца з востравам. Толькі туман, які так не хацеў мяне пусціць сюды, цяпер ужо не хоча выпусціць: каторы дзень краснаярскі самалёт сядзіць недзе ў Туруханску, але аэрадром з Дзіксана ўвесь час яму адказвае — не, не і не...

Мы з Васем Шаўцовым сядзім у гасцініцы і гаворым. Гаворым ціпіана, бо мой сусед па пакоі ўсё яшчэ спіць,

хоць ужо недзе блізка к полудню; ён прыйшоў позна ноччу, я нават і не чуў калі.

Вася — зямляк. Ён з Магілёўшчыны, з вёскі Саматэвічы. Капітан. Служыць у пасёлку Каравул — гэта на Енісеі, паміж Дудзінкаю і мысам Насок. І вось мы сядзім з ім і ўспамінаем пра Беларусь. Правільней — успамінае ён, а я толькі слухаю.

*Расказвае Вася:*

— А я нядаўна дома ў водпуску быў. Праўда, нядоўга. Бацька мой сказаў: «Во прыехаў, як усё роўна жару ўзяць. Нават і месца на лаве за сталом не наспееш сагрэць!» А мне трэба было ў Касцюковічы адскочыць. Дык мама ўсё наказвала: «Ты ж глядзі толькі там не баўся дужа, зрабі што трэба і хуценька дамоў. А то яшчэ я і не нагледзелася на цябе як след». А колькі ў мяне пляменнікаў! Толькі ў адной маёй сястры (яна за кавалём замужам) аж васьмёра. Не наспееш яшчэ ў хату ўваліцца, а яны ўжо як тут і былі: «Дзядзя Вася прыехаў, дзядзя Вася прыехаў!» А ўсе такія крэпенькія, тоўсценькія, як камёлкі. І з рук не злазяць.

А ты сенакос любіш? Мне дык вельмі падабаецца агульны сенакос, калі косяць у тры, а то і ў чатыры разы спарней, чым у звычайныя дні. Ну, старшыня, вядома, чарку паабяцае. Мужчыны кухараў добрых выберуць. Баб да катлоў і блізка не падпусцяць — што вы, яны ўсё сапсуюць! Часцей за ўсё за кухараў становяцца тыя мужчыны, якія ў вайну кухарылі. І вось ужо скончаць касіць, тут табе перадавікоў зачытаюць, узнагароды тым, хто лепей стараўся, дадуць. А потым, вядома, чарка абяцаная. Ужо цёмначы вяртаюцца. І з песнямі.

А ў лесе скора грыбы пойдуць. Мой жа бацька ляснік. Бывала, выбежыш на хвілінку ў лес — і ўжо цэлы кош баравікоў цягнеш. А потым і па другі збегаеш. А ўвечары ніяк не заснуць: усё чорнагаловікі перад вачыма кружацца.

На Таймыры ж я на рыбу на Енісей хаджу. Таксама цікава. У нізоўі — тут адлівы і прылівы бываюць: Енісейская ж губа вунь якая шырокая, што тое мора! Бывае, прыплывеш у такое ўжо зручнае месца, лодку паставіш ля берагу. Пакуль сёе ды тое — глядзіш, а лодка ўжо на сухенькім стаіць, нават абсохнуць наспела. Вось тады што хочаш, тое і рабі — ці волакам яе цягні метраў з пяць-

дзесят да вады, ці чакай, пакуль той прыліў будзе. А ў час прыліву бывае, што вудачкі, якія ля берагу стаялі, акурат пасярод ракі апынуцца. Паспрабуй іх дастаць, калі і клюе нават...

І вось ужо — над Дзіксанам сонца. І самалёт.

Шчыра кажучы, ужо неяк не хочацца пакідаць гэты сціплы востраў — родны дом палярнікаў. Стала неяк ніякомка, што раней трохі скептычна ўспрымалася яна, іхняя праца — падумаеш, нейкія там метэазводкі! І прыйшло на памяць недзе чытанае, як у час апошняй вайны немцы палявалі на нашых савецкіх палярнікаў, нападалі на зімоўкі на Таймыры — іх цікавілі толькі звесткі пра надвор'е, толькі ўсё тыя ж метэазводкі...

У Падкаменнай Тунгусцы, дзе самалёт, вяртаючыся, пачаваў — збаяўся вялізнай навальнічнай хмары, якая, заняўшы ўсё неба, ішла насустрач,— раніцою не адбіцца ад камароў. Сцюардэса стаіць у дзвярах самалёта і адганяе іх галінкаю бярозы.

— Вы і камароў толькі па білетах пускаеце? — жартуе нехта.

— А як жа! Інačай яны вашы месцы пазаймаюць,— адказвае дзяўчына.

— Як на Дзіксан ляцім — ніводнага няма, а назад — дык пешчом у самалёт лезуць,— падтрымліваюць размову лётчыкі.

— А што ім там рабіць, на Дзіксане вашым?! Там жа холадна, ды і палярак ім ніхто не плаціць.

Калі зачыніліся дзверы, усім стала зразумела, што ў самалёт ўсё-такі набілася поўна камароў — ім, мусіць, захацелася пракаціцца зайцамі. І пакуль не былі запушчаны рухавікі, у салоне стаяў тонкі, дакучлівы звон — гэта, мусіць, маленькія крылатыя безбілетныя пасажыры хваліліся адзін перад адным, як ім удалося перахітрыць сцюардэсу і заляцець у дзверы вялізнага камара — самалёта.

## СОНЦА ЎНАЧЫ

*Змест сшытка. Чайнік чаю ў тундры. Смажаныя панты. Хлопчык з Драўляным Тварам. Чым саграецца бацькаўскі чум. Ці трэба сеяць снег. Што значыць «нюнеў»? Як ненцы кармілі каня. Зоркі ў мярзлотніку. Знаёмства з жывымі каўнярамі. Хто паляціць у тундру. У чуме Яптунэ Намтасі. Рагатлівыя намтасяняты. Дзіўнае беларускае непаразуменне. Ці ёсць у нас свой Енісей. Пра што думаў Тэседа. Табакерка прызнаецца ў каханні. Пурга, рассечаная на дзве часткі. Іван — Гусіная Лапка. Што робіць бабка Нечы з дрэннымі словамі. Напарстак — важак у запрэжцы. Ці вярнулася дарога Сангачы. Нумадзі ў кубе. Як абсыпаецца арнамент. Вораг, які прыкідваецца сябрам. Ці можна прымяняць песні ў медыцыне.*

Была самая-самая ноч. Сонца свяціла ярка — тут, за Палярным кругам, летам яно шчыруе і ўначы. Нават калі вясною, у канцы красавіка, сонца і скочваецца на якую хвіліну за белую, як паўночная мядзведзіца, тундру, усё роўна святло, сабранае снягамі за доўгі дзень, не паспявае рассейвацца: яно з канца ў канец будзе хадзіць па Таймыры, нячутна ламацца аб чумы і балкі, будзе прасочвацца ў самыя цёмныя мясціны, аж пакуль там, куды толькі што зайшло, нібы ўпала, сонца, зноў не пачне залачаць.

Была звычайная сонечная ноч доўгага палярнага дня. «Омік» — чысценькі рачны цеплаходзік, заякарыўшыся трохі далекавата ад берага (бліжэй падысці ён не мог — там мель і бёрны-тапельцы), прарэзліва зваў на дапамогу якую-небудзь лодку. Ён, маленькі, гуў басам. Аж было трохі ніякавата — як усё роўна ад падлетка чуць грубы мужчынскі голас. На маленькі пасёлачак, што ўзлез на круты енісейскі бераг, гэтага басу было аж задужа — здавалася, ён бы мог разбудзіць нават вялізны сучасны горад.

Мыс Насок. Пасёлак Насок. Цэнтр ненецкага калгаса «Зара Таймыра». Абжыты куток таймырскай тундры. Мы, асцярожна трымаючыся за борт «Оміка», ссунуліся ў хісткую лодку, на беразе асцярожна ўзлезлі на слізкія, мокрыя, прытопленыя ў вадзе камлі лісцвяжніцы і памахалі на развітанне цеплаходзіку — ён паплыў далей, да Варанцова.

Насок, хоць свяціла такое поўнае сонца, моцна спаў. Толькі вялікія калматыя ездавыя сабакі абыякава споўзаліся на пасёлку, не звяртаючы ніякай увагі ні на сваіх наскоўскіх людзей, што прыплылі на «Оміку», ні нават на мяне — чужака, прыхадня. Уяўляю, як бы зайшліся ад

брэху, як бы заскаталі нашы сабакі, убачыўшы чужога чалавека!

Сакратар партарганізацыі калгаса Вера Міхайлаўна, з якой мы разам плылі з самай Дудзінкі, завяла мяне ў хату для гасцей. У невялікім пакойчыку, застаўленым ложкамі і раскладушкамі, спаў толькі адзін чалавек. Спрасоння, незадаволена (а хто ж будзе задаволены, калі яго разбудзілі ноччу, у самы сон) ён буркнуў нешта, адначасова падобнае і на «добры дзень» і на «добрай ночы», і павярнуўся да сцяны.

Потым, раніцою ўжо, мы з ім пазнаёміліся, а пасля нават і пасябравалі. Гэта быў Коля Бальшакоў, далганін па нацыянальнасці, які таксама нядаўна прыехаў у калгас. Колю тут узялі на пасаду заатэхніка, і цяпер ён на ўсё лета збіраўся ў тундру, да аленяводаў. А пакуль прыляціць верталёт, ён жыве тут, у хаце для гасцей. Але верталёта пакуль што не было. Яшчэ ў Дудзінцы сакратар Таймырскага акругкома партыі Аляксандр Панфілавіч Раслякоў, калі я заікнуўся, што мне хацелася б пабываць у аленяводаў, расказаў:

— Толькі ўчора мы са старшынёй «Зары Таймыра» ажно сем гадзін ганялі над тундраю верталёт. Спалілі ўсё гаручае, але да аленяў так і не дасталі: яны ўжо зайшлі вельмі далёка — пэўна, аж пад самае Карскае мора. Разумееце, нашы аленяводы працуюць па вельмі дакладным графіку, як на чыгунцы ўсё роўна. Алені ж на поўнач ідуць — спяшаюцца за вясною. А за імі — цэлыя плоймы заедзі, аваднёў. Разумееце, корм і аваднi — гэта Сцыла і Харыбда territories аленегадоўлі. Прыйдзеш на новае месца раней — а там яшчэ зіма, няма выпасу. Значыць — алені галодныя. Прыйдзеш пазней — выпас ёсць, але там ужо столькі заедзі пасецца! Усё роўна аленяў не накорміш. Збіўшыся ў цесную кучу, яны будуць ратавацца ад аваднёў, ногі сабе пасатруць. Іх ужо тады не карміць, а лячыць трэба...

Вось таму і збіраецца ў тундру Коля Бальшакоў. Па ўсёй хаце — і ў кутках, і ля ложкаў, і пад ложкамі, і пад сталом — клункі розных памераў, дзе сабрана ўсё самае неабходнае ў тундры: пліткі чаю, бляшанкі згушчанага малака, цукар, спірт у бутэльках, спірт сухі, лякарствы.

Коля — хлопец гаваркі, знаходка падарожніку. Праз нейкі час я ўжо ведаў, што калі ў тундры ўкусіць камар, то самае лепшае лякарства — маленечкае лісцейка

карлікавай бярозы (патрэш ім тое месца, дзе ўкушана,— і не свярбіць); што ў тундры вельмі цяжка сагрэць нават чайнік чаю (дроў няма: збярэш вялізную гару тоненькіх, як саломінкі, пруткоў карлікавай бярозы, але не паспее нават вада закіпець, а той гары ўжо няма — згарэла); што днём аленяў пасуць шырока (днём жа не так ваўкі нападаюць), а нанач збіраюць іх пасярод спашанага за дзень — так ямчэй сачыць за імі.

Ведаў ужо, якая гэта смаката — падсмажаныя маладзенькія аленевыя панты. Нават да драбніц вывучыў, як робіцца гэты боскі ласунак тундры. Спачатку ловяць маладога аленя — ён яшчэ не прывык да людзей, дрыжыць і ўсё спрабуе вырвацца. Яму, каб не цякла кроў, ціткаю туга перавязваюць маладзенькі пант ніжэй таго месца, дзе будуць рэзаць. Потым вострым нажом адным махам ссякаюць яго — алень нават спалохацца не паспее, ён толькі ўздрыгне ад нечаканасці. Потым насаджваюць пант на ражончык (якраз як у нас сала) і на лёгенькім агні абсмальваюць, падсмажваюць. А калі ножыкам акуратненька з чатырох бакоў разрэжуць скуру і, нібы з банана, спусцяць яе доўгімі палосамі ўніз, далікатны, тонкі пах маладога панта нагоніць сліну нават у негалоднага чалавека. А каўбаса са свежай аленевай крыві! А свежая печань!

— Афіцыйна лічыцца,— тлумачыў мне Коля,— што пастухі-аленяводы за год з'ядаюць 500 аленяў (разумееш, у тундры ж ніякай другой ежы не зноўдзеш!). Але так толькі лічыць наш галоўны заатэхнік. На самай справе аленяў з'ядаюць намнога болей. Сам падумай: у кожнай брыгадзе па 6 пастухоў. А яны ж ідуць за аленямі з жонкамі і дзецьмі — з сем'ямі. Значыць, ужо ў брыгадзе будзе недзе каля 40 чалавек. А ўсяго ў калгасе шэсць брыгад. Бачыш, якое стойбішча збіраецца. Што ім тыя 500 аленяў!

Наша ж гасцініца пакуль што пахла толькі адною рыбаю. Зранку Коля ненадоўга некуды знікаў, а калі вяртаўся, у хаце з'яўляўся пах вады, пах рачнога дна, пах ціны — Коля прыносіў з сабою свежую рыбу. Ён садзіўся яе чысціць, а я выходзіў на двор і тут жа, ля ганка, шчапаў смаляныя карчы, а потым распальваў у печы. Увесь час, тры разы на дзень, мы елі толькі рыбу: на халодную закуску — юкала, насечаны і своесаблівa высушаны сіг (як нукі з кменам ці травамі, юкала сохне на сценах ледзь не кожнага балка́), на першае — навáрыстая юшка з нель-

мы ці чыра, на другое — сцярлядка (свежая, маласольная ці вяленая).

Тундра неахвотна адпускае ад сябе чалавека. Нават калі чалавек, здавалася, назаўсёды пакінуў стойбішча, калі ён пра сваіх бацькоў, якія асталіся ў звыклым для іх чуме, гаворыць толькі як пра чужых людзей — «яны», «у іх», «тыя» — усё роўна ў сваіх цёплых снах, у якіх пакуль што ніхто нічога не можа перайначыць, ён не-не ды і ўбачыць то кволенькі дымок, які адразу ж над чумам зрывае пурга, то ўзрадуецца паўночнаму ззянню, якое пераліваецца над яго стойбішчам, то раптам вельмі выразна адчуе, як залопае аленевая шкура, якою абцягнута жэрдзе бацькоўскага жытла. Тады чалавек вяртаецца ў свой чум, у сваю тундру. Тады бацькі доўга прыглядаюцца да яго, пачужэлага, доўга спрабуюць убачыць у ім таго, ранейшага Пясю Лабочу — Хлопчыка з Драўляным Тварам, ці Нярку Вапно — Прыгожы Карань, ці Пахаку Нумадзі — Самы Ніз Неба. І як узрадуюцца, калі раптам з-пад напластавання новых звычак, як тундра з-пад снегу, прагляне даўняя, такая знаёмая і такая звыклая сынава ўсмешка.

У чум вяртаюцца нават людзі з вышэйшай адукацыяй. Хоць рэдка, але ўсё ж вяртаюцца. І што ты зробіш, калі яны не могуць астацца абыякавымі да пакліча тундры, не могуць перасіліць яе прыцягнення.

Коля Бальшакоў працаваў у Нарыльску на металургічным заводзе. Атрымліваў добрую зарплату, жыў у добрай сучаснай кватэры з усімі выгодамі, спяваў у хоры. І раптам — зноў тундра... Недзе тут, на Таймыры, яшчэ і сёння яго бацькі саграюць родны чум і робяць яго гэтакім утульным, як у дзяцінстве. Яшчэ і сёння тут, недзе пасярод тундры, здалёку відаць невялічкі калок, забіты на тым месцы, дзе ён нарадзіўся,— у вандроўнікаў-далган ёсць такі даўні звычай: забіваць калок на тым месцы, дзе нарадзіўся чалавек. І колькі такіх калкоў ведае ўжо яго тундра: там нарадзіўся брат, там — дзядуля, а вось тут — маці...

У праўленні калгаса, што побач з хатай для гасцей, старшыня Іван Хведаравіч Самарскі распякаў невысокага ненца:

— Дык што ж гэта мы, Васіль Іванавіч, будзем рабіць? Разумееш, далей так ісці нельга. Ты ж камуніст, а рыбка ў цябе не ловіцца... План свой ты не выконваеш. А што іншыя скажуць? Маўляў — зірніце, як Ямкін працуе.

Вунь, глядзі, Яр Сапгачы па плане павінен быў 14 цэнтнераў рыбы здаць, а здаў ужо 23. І Тэседа Вэйтора замест 16 планавых 19 цэнтнераў здаў. А вунь Тэседа Лэма ўзяўся 23 цэнтнеры здаць, а здужаў падняць толькі 13. Тое ж і ў Яптунэ Нюкі, і ў Сінгунея Пысю.

Васіль Іванавіч Ямкін маўчаў. Спачатку быў нешта заікнуўся пра дрэнную лодку, дрэнны матор, дрэнную сетку, а потым змоўк і, гледзячы ўніз, слухаў старшыню.

*Расказвае Іван Хведаравіч Самарскі:*

— На тэрыторыі нашага калгаса магло б размясціцца некалькі невялікіх еўрапейскіх краін. Мы маем 3 мільёны 500 тысяч гектараў тундры. Бачыце, якімі багаццямі мы тут жывём: зімою — больш за 3 мільёны гектараў снягоў маем (усё наша — бяры і што хочаш рабі з гэтымі снягамі), летам — усё тыя ж мільёны гектараў заедзі. Ну, гэта, так сказаць, наша непрадукцыйная, няпланавая гаспадарка. Снег жа сеяць не трэба, заедзь таксама гадуецца сама. Дык а чым жа мы тады займаемся, можаце вы спытаць.

Асноўны наш клопат — гэта аленегадоўля. Наш статак аленевы сягае аж за 12 тысяч. Штогод мы забіваем і здаём па 2 тысячы галоў. Нашы аленяводы — людзі спрактыкаваныя: вунь Вэнга нават ардэнаносец. Ордэнам Леніна дзяржава ўзнагародзіла яго.

Потым ідзе паляванне. Нашы паляўнічыя здаюць да дзвюх-трох тысяч пясцоў. Але тут год на год не прыходзіцца. Тут усё залежыць ад мышэй: захочуць яны — дадуць нам план выканаць, не захочуць — так і астанёмся ні з чым. Не здзіўляйцеся, усё тут правільна. Пясец жа харчуецца мышамі. А мышы, скажам, пройдуць недзе бокам, мінуць нашы землі — ну, і пясец за імі пайшоў, наспрабуй яго знайсці. Вось так мышы наш план і з'ядаюць. Яшчэ ў нас звераферма ёсць, блакітнага пясца гадуем. Праўда, яна пакуль што нашаму калгасу толькі адны страты дае.

Ну, і апошняе — гэта рыба. Каля 20 тысяч цэнтнераў за год здаём. Нам бы сорамна было, калі б мы, жывучы на Енісеі, ды рыбалоўствам не займаліся.

Але мне, як старшыні калгаса, не толькі за гаспадарку нападае ад начальства. Адзін сподняй бялізны не носіць — я вінаваты, у другога ў чуме брудна — таксама Самарскі дрэнна працуе. Выклікаюць у раён, у Караул, а то і ў Дудзінку, і даюць пытлю — маўляў, у «Зары Таймыра»

не займаюцца пытаннямі культуры. А што я часам магу зрабіць? Вось перасяляем, скажам, сям'ю з чума ў кватэру ў пасёлку. А яны пажывуць трохі, а летам усё роўна ў двары чум ставяць. Пытаю: «Навошта вы гэта робіце?» — «А нам у хаце паветра не хапае. У столі дзіркі няма, куды б яно заходзіла»,— адказваюць. Надумаеш-надумаеш ды і сам згодзішся. Сапраўды ж: калі чалавек увесь век жыў у чуме, не затыкаўся, як мы ў хаце (каб, божа барані, нідзе — ні ў вокнах, ні ў дзвярах — ні шчылінкі не было), калі ён прывык заўсёды, каб у чуме было свежае паветра, то яму цяжкавата адразу прывыкнуць да хаты. Таму некаторыя, перасяляючыся, бяруць з сабою ўсё з чума — і нізенькія свае ўслонікі, і столікі, і шкуркі. І ў новай хаце рассцелюць ля сцен шкуры — і ўсё. Абжывацца па-сучаснаму не хочуць. Гэта таксама звычка. А звычку ламаць заўсёды цяжкавата.

Не памятаю, я недзе чытаў жудасныя факты пра абарыгенаў Аўстраліі. Дык там іх ніхто не лічыць, затое вядзецца самы дакладны ўлік авечак, якіх яны гадуюць. Агонь у іх раскладаецца ў такой ямінцы, дзеці кладуцца спаць каля агню, а ноччу скочваюцца ў полымя ці па вугалле. Мы ж сваіх дзетак дужа глядзім. А недзе пад 20 жніўня заказваем верталёт і з далёкіх стойбішчаў, адзінокіх чумаў і часовых стаянак оленяводаў збіраем у школу дзяцей. Часам бацькі не хочуць аддаваць — ведама, бацькі: каму гэта хочацца разлучацца са сваімі віхрастымі нагольнікамі. Але мы ўсё роўна забіраем. Цяпер ужо ў нашай Наскоўскай школе каля 250 дзяцей вучыцца. А спачатку прывозім і ў нулявы клас іх залічваем. Вучым, як спаць на ложку, як лыжку правільна трымаць, вучым па-руску гаварыць. Спачатку яны ні слова не разумеюць — толькі па-свойму і размаўляюць.

Доўга настаўніца паўтарае кожнае слова па-руску і па-няпецку — пакуль не запомняць. Калі ідзеш увосень ля школы, толькі і чуеш: «Мерчар — дождь, до-о-ождь. Ханоў — унеси, у-не-си. Унеси дождь — мерчар ханоў. Нюпеў — гагара, га-га-ра. Гагара, гагара, унеси дождь. Нюпеў, нюпеў, мерчар ханоў...»

Стараемся ўсіх па аселасць перавесці. Але гэта задача цяжкаватая. Аленегадоўля — гэта ўсё-такі пастаянная змена месца, бесперапынныя пошукі корму, вечны рух за аленямі. Я і сам яшчэ не ведаю, як можна прымірыць аленегадоўлю і аселасць. Мне здаецца, што трэба ісці шляхам стварэння лепшых умоў у балках і чумах, лепей за-

бяспечваць алепяводаў. Бо, мне здаецца, аселасць пачыста выключае алепегадоўлю, і наадварот. Але паспрабуйце вы ў пенца забраць аленяў! Алепь для жыхароў Поўначы — гэта жыццё. З алепем яны на «ты». Як там у вам па Беларусі, ды і ў нас па Украіне, да апошняга часу было з коньмі. Ёсць конь — будзеш і сыты, і адзеты, і абагрэты.

А тут — памятаю, як да нас у Насок першага каня прывезлі. Знайшлі мы хляўчук, паставілі яго туды, а вось угаварыць каго, каб карміў каня,— не можам. Усе адмаўляюцца. Бачым, што пенцы яго, як нячыстай сілы, баяцца: пікол ж не бачылі такой дзіўнай жывёліны. Мы і так, мы і гэтак, мы і расказвалі, мы і паказвалі, якое гэта рахманае стварэнне — і грыву часалі, і за хвост таргалі, і ў роце зубы глядзелі — слухаюць, згаджаюцца, усміхаюцца, захапляюцца нашай смеласцю. Ківаюць у знак згоды галовамі, а калі зноў напомніш, што пекаму трэба яго дагледаць,— ані блізка. Потым усё ж строга загадалі двум конюхам карміць яго. Дык яны што? Прадралі ў страсе дзірку і, узлазячы наверх па лесвіцы, скідвалі ў тую дзірку сена і на вяроўцы спускалі вядро з вадою. Я, убачыўшы гэта, кажу ім: «Каня вы баіцёся, а вось алепя, у якога такія страшныя рогі і такія моцныя пярэднія ногі, якімі ён наскрозь прабівае ваўка,— не баіцёся».— «А,— адказваюць яны,— алень жа наш, а конь чужы».

Алень для пенца — усё: ежа і адзенне, жыллё і транспарт, забава і нават прысмакі, калі хочаце. Ёсць у цябе алені — значыць, ты самы багаты чалавек, значыць, табе не страшна ніякая пурга. Алень — гэта духмянае варанае ці смажанае мяса; гэта цёплыя сакуі, маліцы, шапкі, бакары; гэта цёплы чум, рупна накрыты аленевымі шкурамі; гэта і хуткія нарты, якія робяць блізкімі самыя далёкія стойбішчы ў тундры; гэта вясёлыя спаборніцтвы ў спрыце і смеласці, скокі цераз запрэжкі, што імчаць на ўвесь дых; гэта яшчэ і прысмакі — пра пах палярных аленевых пантаў ты ўжо, мусіць, паслухаўся ад Колі Бальшакова. Ненец у перакладзе на пашу мову значыць — чалавек. Свабодны чалавек у тундры. Цяжкавата ён прывыкаў да калгаса, да пейкага патрэбнага парадку. Раней што — я сам сабе, маўляў, гаспадар, калі захачу ўстаю, куды захачу еду. Надакучыла ехаць — з паўдарогі назад вярнуся: маўляў, я толькі прагуляўся ў тундру, выязджаў прасвяжыцца крыху. Не надакучыла — паеду далей у тундру, пясцоў пасачу. А то і наогул захочацца паглядзець — а як вунь за тым узгоркам глядзіцца паўночнае ззянне... А вярнуў-

ся дамоў — распрог аленяў, пусціў іх (гэта ж не коні — іх ні паіць, ні карміць не трэба, алені самі ўсё знойдуць) — і таксама што хочаш, тое і рабі: хочаш — зноў спаць кладзіся, а хочаш — торбу са скуры ментуза рабі, з таго, што ўчора з пролубкі выцягнуў.

У іх, ненцаў, вельмі развіта пачуццё справядлівасці. І нейкае надсвядомае адчуванне ўзаемасувязі чалавека і прыроды. Яны вельмі асцярожныя ў абыходжанні з прыродаю. Скажам, начавалі двое нашых наскоўскіх ненцаў у тундры. Чум там паставілі, ля яго ездавога алешку прывязалі. І потым, пад раніцу ўжо, яны чулі, як да чума падышоў мядзведзь, задраў аленя, паеўся сабе не спяшаючыся і, здаецца, нават і ў тундру не пайшоў — тут жа і адпачываць прылёг. А яны нават не стрэлілі, хоць у іх ружжы былі. Пехатою ў Насок вярнуліся. «Што — спалохаліся? Ад страху не знайшлі нават, дзе ў стрэльбе курок?» — пытаемся ў іх. «Чаму спалохаліся? Чаму не знайшлі? — аж злуюцца яны.— Мы ўсё знайшлі, але навошта ў мядзведзя страляць? Ён жа нічога дрэннага нам не рабіў. Ён толькі снедаў. А хіба гэта добра — страляць у каго-небудзь, калі той снедае? На нас бы пасля гэтага тундра ўзлавалася, вялікі б Нум пакрыўдзіўся. Па нас жа ніхто не страляе, калі мы нельму або сцярлядку ядзім»...

Бачыце, якім нечаканым, на першы погляд, здаецца такі вывад. А для мяне ж тут нічога нечаканага няма — на Крайняй Поўначы, сярод ненцаў, я жыву ўжо больш за 30 год, і іхняе жыццё стала ўжо і маім жыццём.

Потым Іван Хведаравіч паказваў мне сваю калгасную гаспадарку. З намі хадзіў і Коля Бальшакоў.

Было душна. Нават па-паўднёваму густа і ліпка прыпарвала. Тундра, толькі што сагнаўшы снег, цяпер патроху адтавала і прасыхала — над ёю ад выпарэнняў трымцела паветра. Тундра звінела ад камароў: ад гэтага дзвынькату нідзе нельга было схавацца. Ездавыя сабакі, якія напачатку здзівілі мяне сваёй рахманасцю і пасіўнасцю, цяпер, як ашалелыя, учадзела кідаліся па пасёлку, качаліся па зямлі, то з правага, то з левага боку хапалі сябе за доўгую поўсць і з екатаннем пішчыліся ў любую дзірку, абы ўцячы ад гэтага дакучлівага звону.

А ў калгасным мярзлотніку было холадна. Недзе глыбока-глыбока ў тунелі цьмяным святлом хліпае невялічкі агарак свечкі. Над ім стаіць цёпла ўхутаная ненка і над

яго мізэрным полымем грэе рукі. Святло палахліва мітусіцца па вечнай мерзлаце скляпення, выхоплівае з цемры крышталікі лёду, ад чаго яны свецяцца рознакаляровымі кранінкамі. Над нагамі грукаціць марожаная рыба. І варта толькі трошкі адысціся ад кагапца — нічога не відно: цёмная і доўгая пячора. І мімволына, нейк само сабою, гэтак ужо дыхнула на мяне старажытнасцю, даўніной, ды такой, што ўсё навокал адразу перасунулася на некалькі стагоддзяў назад — аж у даледніковы перыяд. Вярнуў мяне ў наш век голас Івана Хведаравіча:

— Вось гэта наш вечны халадзільнік у вечнай мерзлаце. Тут жа зямля ніколі не адтае. Высек пячору, павесіў на яе дзверы — вось табе і мярзлотнік гатовы. На ўсё жыццё хопіць. І рамантаваць не трэба.

Колю Бальшакова хвалюе іншае:

— Нешта, Іван Хведаравіч, рыбы малавата ў мярзлотніку. Гэта ж толькі на некалькі дзён звераферме. А наш галоўны заатэхнік не клапоціцца.

Калі мы па размяклай тундры (зямля тут адтае толькі зверху, і то сантыметраў на 20) хлюпаем на ферму блакітных пясцоў, гарачыня трохі спадае — аднекуль з-за Енісея пачынае дыхаць ветрык. А вось і яна, ферма. Хаткі пясцоў стаяць высока над зямлёю на тоненькіх слупках — акурат шпакоўні на жэрдках. Не вельмі зграбныя на выгляд блакітныя пясцы (мусіць, яны лепей глядзяцца ўсё-такі ў каўнярых!) павыйшлі са сваіх схованчаў на адкрытае месца, што збольшага прадзьмувае вецер,— так яны ратуюцца ад камароў, якія ў зацішным месцы іх заядаюць.

— Летась вось гэтыя прыгожыя каўнерыкі далі нам 11 тысяч рублёў страт. Але ж фермы мы не ліквідоўваем. Што тут паробіш, калі жанчынам вельмі ж да твару блакітныя пясцовыя каўняры!

А ў Колі Бальшакова свае клопаты:

— Казаў жа я галоўнаму заатэхніку, што трэба пясцам уколы рабіць. А ён усё сваё — паспееш ды паспееш. А цяпер вось, калі ў тундру паляцю, так і астануцца без уколаў.

Калі вярталіся, на дарозе сустрэлі шчуплага, худога, невысокага мужчыну, які спяшаўся на ферму. Ён абедзвюч, нейк вельмі ж ужо асцярожна, трымаўся за жывот. Мяне з ім пазнаёмілі. Гэта быў якраз галоўны заатэхнік калгаса. Ціхі, спакойны, сарамлівы чалавек.

— Ну, як твой жывот? — спытаўся Іван Хведаравіч.— Можа, ужо наладзіўся?

— Дзе там наладзіўся, бюлетэнь во сёння ўзяў.

— Глядзі мне, а то, можа, якую дзізенцярыю падхапіў?

Заатэхнік пайшоў на ферму. Калі мы трохі адышліся, Коля, нібыта сам сабе, пачаў расказваць:

— Дзіўны ён нейкі чалавек. Неяк мы з ім разгаварыліся. Я і кажу: «Запусціў ты, браток, справы. Больш пра сваю гаспадарку дбаеш, чым пра калгасную. Відаць, ты не хочаш працаваць па-сапраўднаму». Ах, як ён раззлаваўся спачатку, нават лаяцца пачаў. А потым нам давялося разам чарку падымаць. Выпілі мы, а ён мне і кажа: «Ты, Коля, праўду тады казаў. Але вось сам ажэнішся, гаспадаркай абзавядзешся, дзеці з усіх бакоў паабсядуць, тады і і ўбачыш, ці можна на тую гаспадарку не звяртаць увагі — там нешта направіць спатрэбіцца, там укапаць, там прыбіць». А мне здаецца, аспоўнае — гэта калгас. Не, мяне сям'я не сагне. Я і жанаты на калгаснай рабоце гарэць буду.

Расказваючы гэта, Коля ўвесь час пазіраў на старшыню.

Яшчэ мы былі ў школе. Потым у яслях, дзе маленькія ненчаняткі яшчэ не блытаюць рускія і ненецкія словы — яны яшчэ пакуль што гуляюць у свае ненецкія гульні. Потым у калгасным клубе, праз няшчыльныя аканіцы якога паласуюць паўзмрок сонечныя промні, мы глядзім нейкі насрэдны фільм, здаецца, Адэскай студыі. Ачмурэламу ад сонца, мне быццам і падабаюцца банальныя думкі накшталт: «Час ужо не абяцаць чалавеку, а выконваць гэтыя абяцанні» ці «Бачыш — як стаў начальнікам, дык па-нашаму і балакаць развучыўся». А на экране, як сімвал Поўначы — маленькая карлікавая бярозка. Голая, без лісця — адны сукі. Можа, падрапалася лінза праектара, а можа, сабраўся ў складкі палатняны экран, але што б ні паказвалі — ці то выстаўку польскіх мод, ці то дзяўчатак у як толькі можна кароценькіх міні-спаднічках, ці то малюнкі дзяцей — усюды, як куст у заснежанай тундры, на белым палатне чарнела гэтая карлікавая заналярная бярозка...

Скончылася кіно. Выйшлі з клуба. Коля — зноў за сваё.

— Адзін герой — копія нашага заатэхніка. Якраз такі цяльпук.— І, трошкі счакаўшы, дадаў:— А ў тундры ж цяпер камароў-камароў!

А ў маленькай цеснай хаце старшыні (навошта яна тут вялікая — яе ж тады не абагрэеш: дроў спатрэбіцца цэлая

процьма), калі мы выпілі па кропельцы спірту і Коля перасапяваў увесь свой нарыльскі рэпертуар, Іван Хведаравіч сказаў:

— Я ўжо даўно да цябе, хлопец, прыглядаюся. Правільна ты бярэшся — з ахвотай, з жаданнем. І галоўнае — моцна. Ды і навошта табе ў тундру лятаць? Хопіць табе і тут работы. Заатэхнік у нас сапраўды не вельмі... Можа, ён злятае? А ты і хор тут арганізуеш, і ўколы зробіш...

І вось толькі цяпер я зразумеў, што Колю вельмі ж ужо не хацелася ляцець у тундру, да камароў.

У хату ўбегла Вера Міхайлаўна:

— Гудзе нешта, можа, верталёт. А вы тут папапіваеце-ся, і ў тундру некаму ляцець будзе. От гэтыя мужчыны!

— Не бойся, Вера Міхайлаўна, няхай ляціць твой верталёт. Усё будзе добра.

Але верталёт праляцеў міма.

Назаўтра дзень быў ветраны. Як адразу пахаладала! Вецер павыдзьмуў ваду з енісейскіх пратокаў, і лодкі, нават велікаватыя караблі, умомант апынуліся на сухім — не паспелі і пацерціся аб пясок кармою, каб злезці з мелі. Цяпер яны, як выкінутая на пясок рыба, ляжалі, прыпаўшы набок, абсыхалі і чакалі таго моманту, калі пад днішчам зноў забулькоча вада, калі пругкая хваля асцярожна ўдарыць у вінт. А па ўсім Енісеі паспешліва беглі баранчыкі хваль — белымі аленямі іх называюць ненцы.

«Омік» вернецца няскора — цяпер ён, мусіць, схаваўся куды-небудзь у зацішнае месца і чакае, калі наладзіцца надвор'е.

Я, па-ўсходняму падкурчыўшы пад сябе ногі, сяджу ў чуме старога Яптунэ Намтасі. Сам Яптунэ сядзіць справа ад мяне. За ім, з-пад цёплых аленевых шкур, выглядаюць такія цікаўныя і такія смяшлівыя тварыкі мурзатых намтасянятаў. Бліжэй да ўваходу — там, дзе святлей,— свежую аленевую шкуру шкрабе іх маці. Злева хлопчык гадоў дванаццаці, Юкала, самы старэйшы сын Намтасі, плявце рыбалоўную сетку. Пасярод чума — маленькая грубка. У ёй весела гарыць агонь. Дым паволі падымаецца ўверх і праз ладную дзірку ў тым месцы, дзе сыходзяцца разам закуродымленыя жэрдкі чума, выходзіць на двор, на вецер. За грубкаю — маленькія столікі, услончыкі. На іх міскі, лыжкі, кніжкі, чыгункі. Тут жа на тоўстым дроце надвешаны адрыўны каляндар.

Што такое нянецкі чум? Гэта звычайны кавалачак таймырскай тундры, атулены з усіх бакоў цёплымі аленевымі шкурамі. Перанясеш чум у другое месца — і ўжо гэты конус паветра, які толькі што быў цёплым жытлом, зноў назаўсёды злучаецца з усёй тундраю і тады ўжо нічым не адрозніваецца ад астатняга наваколля. Летам уваход у чум раскрыты насцеж, і калі ў тундры пахнуць кветкі — пахнуць яны і тут; калі ў тундры звіняць камары — звіняць яны і тут; калі ў тундры, аж захліпаючыся ад пачуцця, увосень равуць алені — гэтым ровам напоўнены і чум. На пачатку зімы чуваць, як пад чумам паступова замярзае зямля — яна робіцца ўсё больш і больш гулкая. А ў самую зіму чуваць, як аб бакі чума колкімі сняжынкамі трэцца пурга, як шуміць там, куды выходзіць дым, доўгая зімовая ноч, як, цяжка сапучы, прабяжыць недзе побач, зусім недалёчка, галодны воўк...

Яптунэ Намтасі распытвае пра маю Беларусь:

— А алені ў вас ёсць?

— Ёсць,— кажу,— але вельмі мала. Аленяў у нас у звярынцах паказваюць.

— А што вы ў ім, у алені, знайшлі цікавага, каб паказваць? Звычайная жывёліна. А ў вас таксама аленькаў ядуць?

— Не, у нас няможна іх забіваць. За гэта штрафуюць. Нават у турму могуць пасадзіць.

— За аленя ў турму? Не смяшы ты мяне.

Зарагаталі, нешта загаварылі па-свойму малыя намтасяняты. Перастаў плесці сетку Юкала.

— А пясец у вас ёсць?

— Не, вось пясца ў нас няма. Я толькі тут, на ферме ў вас, убачыў яго.

— А мышы ёсць?

— О, мышэй хоць ты гаць гаці. Бывае, калі зімою які стог забіраем, дык іх там процьма.

— У вас ёсць мышы — павінен быць і пясец...

— Не, дзядзька Яптунэ, няма. На нашых мышэй ёсць кот.

Стары пасядзеў, памаўчаў — мусіць, усё думаў над гэтай нашай дзіўнай беларускай няўвязкай, а потым, нібы сам сабе, сказаў:

— Цікава: мышы, значыць, ёсць, а пясца няма. Дзіўна, дужа дзіўна. А мора ў вас ёсць? Карскае?

— Не, Карскага няма. Ёсць штучнае, мы самі яго зрабілі.

— А дзе вы панабралі столькі вады, каб наліць цэлае мора?

— А ў іх жа Енісей таксама ёсць,— падказаў свайму бацьку Юкала.

— Не, Юкала, Енісея ў нас няма. Енісей — гэта ваша рака. А ў нас ёсць свае — Дняпро, Нёман, Бярэзіна, Сож, Прыпяць... Праўда, яны намнога вузейшыя за ваш Енісей.

— А яблыкі ў вас у лесе растуць?

— Не, яблыкі растуць у садах, ля хат.

— А на чым яны трымаюцца?

— На дрэвах. На вялікіх кунчастых яблынях. Між зялёнага лісця чырвоныя, жоўтыя, белыя яблыкі. Круглыя, як сонца. Чырвоныя — як сонца, калі яно заходзіць, жоўтыя — як сонца ў самы поўдзень, белыя — як сонца ў марознай, снежнай тундры.

— А як яны трымаюцца ў пургу?

— Яблыкі растуць летам, калі пургі няма. У нас больш за ўсё бывае зялёная пурга — лета. І такіх, як у вас, маразоў таксама не бывае.

— Дык тады ў вас зімою горача?

— Не, не горача. Гэта ўсё адносна. Вось сённяшні дзень для вас звычайны, цёплы. А мне ўжо халаднавата. А ёсць такія краіны, дзе ўжо нават пры пяці градусах цяпла людзі не ведаюць, як сагрэцца. На вуліцы тады ставяць жароўні з вуголлем, раскладаюць агні. І чалавек, каб не змерзнуць, бяжыць ад жароўні да жароўні, ад агню да агню. Пяць градусаў — гэта цёпла, але яны прывыклі да гарачыні.

Ненцы ж прывыклі да халоднай тундры, па якой вельмі часта, грэючыся, гойсае, кідаецца з канца ў канец белая пурга; да маразоў, якія раз'ятрана накідваюцца на ўсё жывое, радуючыся, што ў гэтым ціхім і маўклівым бязлюддзі, нарэшце, знайшоўся чалавек, на якім можна апрабаваць сваю моц; да белых снягоў, якія па дзевяць месяцаў у годзе хаваюць ад чалавечага вока нават чэзлыя лішайнікі.

·

У тундры няма дарог. Тундра — белая, не чапаная дарогамі снежная роўнядзь. І ў той жа час у тунды — мільёны дарог. Куды не настаўіш нерадам свае нарты — на поўдзень ці на поўнач, на захад ці на ўсход, куды набяжыць ад тваіго чума аленевая ці сабачая запрэж-

ка — там, лічы, і дарога. Твая дарога. Тут кожны пракладае сам сабе менавіта сваю дарогу. У тундры ўсе яны пачынаюцца ад чума. І вяртаюцца таксама да яго. Праўда, здараецца, што дарога — вузенькія доўгія сляды ад нартаў — назад не вяртаецца. Яна вядзе толькі ўперад і недзе далёка-далёка абрываецца, знікае ў пурзе. Гэта ўжо няшчасце. Гэта гора таго чума, ад якога яна пачыналася.

Але звычайна дарогі вяртаюцца. Пурга хутка зноў замяце іх, араўняе, і на другі дзень ты зноў можаш выбіраць сабе любую дарогу: куды паставіш нарты перадам — туды і паедзеш. І пурга, як і во цяпер, зноў будзе замятаць сляды.

Ён, Тэседа, што значыць Безаленевы, вяртаецца дамоў з тундры. Пурга не ўціхамірваецца. Тэседа ўяўляе, як рыпяць жэрдкі яго чума: здаецца, што вецер вось-вось адарве жытло ад зямлі, паваліць набок і пакоціць-пакоціць па снезе. Чум, мусіць, хоча пайсці разам з ветрам. А ў адтуліну яго, кружачыся, заходзіць пурга. Тэседа, здаецца, нават чуе, як на разагрэтай дачырвана жалезнай грубцы шыпяць сняжынкі, што сыплюцца зверху.

— Добры шлях чалавеку!

— І табе добрага шляху!

Тэседа толькі і паспеў адказаць на прывітанне — алепевая запрэжка прамільгнула паўз яго нарту. Пачакай, а хто ж гэта такі паехаў? Голас жаночы... А, дык гэта, мусіць, бабка Нечы. Яна жыве ў суседнім стойбішчы і часам прыязджае ў госці да сваёй сяброўкі Саўрынэ. Шчаслівага табе, толькі не збіся з дарогі, Нечы!

### *Пра што думаў Тэседа, сустрэўшы бабку Нечы*

«Старэю, мусіць. А што ж зробіш — шэсцьдзесят гадоў пералічыў ужо, час і дадому збірацца. Ды і Нечы вунь як згорбілася. А здаецца ж, зусім нядаўна яна выходзіла замуж за першага мужа. Брат яе аддаваў. Малая яшчэ была — з нартаў не відно. Каб трохі лепей было відаць, пасадзілі яе на куль з івовымі стружкамі. Здаецца, таксама зусім нядаўна было, калі я, вось так, пасярод тундры, сустрэўся з дзяўчынаю — цяперашняй маёй жонкаю Тэнэ. Здаецца, зусім нядаўна. Але тады не было пургі. Тады над тундраю весялілася паўночнае ззянне. Я яшчэ і сёння чую, як яно лопала, нібы дзверы чума на ветры, як

шыпела — мусіць, у фалдах гэтай гарачай вясёлкі раставаў снег. Я, Тэседа, памятаю, спытаў тады ў Тэнэ, ці чуе яна, як шыпіць і лопае ззянне. А яна адказала:

— Я ніколі не прыслухоўваюся да гукаў майго ачага — паўночнага ззяння.

Бачыце, паўночнае ззянне яе ачаг! Але гэта было пасля. А спачатку мы ехалі насустрач адно аднаму, а калі параўняліся запрэжкі, я загаварыў:

— Пасярод сваёй вялізнай зямлі я астаўся без табакі.

Маўляў, доўгая ў мяне была дарога, доўга я ехаў, усю табаку выкурыў. Я ж ведаў, што так часцей за ўсё знаёміліся з дзяўчатамі мае продкі. Так пазнаёміўся і мой бацька з маці, і мой дзед з бабкаю. Просьба табакі — гэта толькі зачэпка дзеля знаёмства.

Але мая незнаёмая маўчала. А сама прыгожая такая — апуха яе белага сакуя вакол маладзенькага твару, нібы тое ззянне, пераліваецца. Не тое што я — худы, тонкі, нібы той пясец вясновы.

— Ці няма ў цябе табакі? — запытаўся я тады больш настойліва.

Яна трохі падумала, потым дастала сваю табакерку, зробленую з мамантавай косці, і кінула на мае нарты. Я ўзяў яе і не вяртаю — цягну колькі магу. А потым і кажу:

— Давай памяняемся табакеркамі, а табаку напалам падзелім.

Бачу я — мая прыгажуня раскрыла вусны і гэтак ласкава ўсміхнулася. Ну, а я-то ведаю, што калі дзяўчына не пашкадуе сваёй табакеркі, і асабліва калі яна ўсміхнецца — значыць, хлопец ёй падабаецца.

Так і пажаніліся мы тады з Тэнэ.

Тэнэ мая яшчэ і цяпер прыгожая. А тады была якраз як тая кропля дажджу, што падае з шаста чума. Я яе тады нават і празваў Нігу Тэсраха — кропелька дажджу. А паглядзелі б вы на яе, калі яна ў суседні чум ідзе! Якраз як гадавалае аленяня, што вясною праталінак шукае: ідзе наважна — і не спяшаецца, але і не марудзіць. Словам, адразу відаць, што ідзе жанчына, якая знае сабе цану.

Ды і я тады не ўломак быў. Ніколі ля сваіх ног і сам над сваім носам не круціўся — далёка хадзіў, усё даставаў, што Тэнэ трэба было, што майму чуму трэба было. Я яшчэ і сёння працавіты, як тундравы пясец. Чатыры даўганогія алені ў маёй запрэжцы рассякаюць тугі паўноч-

ны вецер, разразаюць самую страшную пургу на дзве часткі. І далёка чуваць стук аленевых капытоў.

Я яшчэ і сёння рыбу лаўлю. Вось мы, пяцёра мужчын, невад свой за два вухі ў лодку пагрузілі. Спусцілі на ваду чатырохвёсельную лодку. А па баках лодкі — хвалі. Нібы лятаюць, нібы смяюцца. Чацвёра асілкаў вёслы ў рукі ўзялі. Чуеце, як вёслы з хвалямі размаўляюць,— нібы алені-хары хоркаюць. А я ля руля сеў, бо я гаспадар лодкі — я звеннявы. А хвалі як стаяць усё роўна. Невад зрабіўся падобны на вяроўку — так яго скруціла хвалямі. А хвалі так расхадзіліся — здаецца, вышэй мяне глядзяць, за мяне глядзяць. Нашы чумы на беразе маленькія-маленькія, як сядзяць усё роўна над вадою. І нібы прысядаюць: уверх-уніз, уверх-уніз.

Але пры ўсялякім надвор'і матня майго невада, як страўнік сытага пясца, заўсёды поўная — яна аж раздаецца ад рыбы.

Вось так і жыву я. Так незаўважна і праходзяць мае месяцы. Здаецца, толькі нядаўна быў *яра іры*, студзень,— месяц перакульвання года. Потым незаўважна прабег і *пі нядалава,* красавік,— месяц, калі нават ноччу можна знайсці аленевую пашу. Прабулькатаў, прабушаваў *сава іры*, чэрвень,— месяц вялікай вады. Празвінеў усе вушы *ненянг іры,* ліпень,— камарыны месяц. Адроў сваё *хор іры*, кастрычнік,— месяц аленяў-самцоў. А вось ужо і зноў упаў над чумам *пэўдзя іры*, снежань,— месяц цемені і сумётаў...

Блізка ўжо і маё стойбішча. Вось гэтыя вялізныя пудзеры — гурбы снегу — таксама стойбішча. Але тых, хто ўжо споўна пералічыў усе свае месяцы, паслалыя яму вялікім Нумам, і назаўсёды развітаўся са сваім чумам. Іх новыя чумы — цесныя, збітыя з дошчак і пастаўленыя адразу на зямлю скрынкі — замяло снегам. Не відно нават званочкаў, якія на папярочынках прымацоўваюцца над скрынкаю і праз якія мёртвыя размаўляюць з намі, жывымі: падзьме вецер, зазвініць званочак — значыць, твой родзіч ці радуецца твайму поспеху, ці засмучаецца тваёй няўдачай. Цяпер зіма, і званочкі пад сумётамі маўчаць. Але прыйдзе вясна, і яны зноў загавораць. Перакажуць усё, што там у іх новага адбылося за зіму. А пачне сыходзіць снег — ён спачатку пакажа лісцвяжныя нарты з палазамі, падобнымі на бабровыя бруікі; абернутыя на магіле, яны пакрыліся ўжо нават мохам (зна-

чыць, чалавек памёр даўно). Тут жа потым вызваляцца з-пад снегу і харэі, якімі некалі кіравалі сваімі запрэжкамі людзі, і чыгункі, з якіх яны елі, і ўслонікі, на якіх сядзелі і бакары, у якіх хадзілі. Памірае чалавек — і ўсё, чым ён карыстаўся, аддаецца яму назаўсёды: маўляў, мы можам набыць новае, а табе там усё спатрэбіцца. А так, калі раптам табе ўдасца перахітрыць вялікага Нума,— уставай і едзь куды вочы глядзяць, у тундру: усё, што табе трэба для гэтага, ёсць тут, ля тваёй магілкі. Толькі пакліч сваіх верных сабак ці аленяў...

А вунь тая гурба — гэта магіла майго бацькі. Я, Тэседа, памятаю, як яго хавалі. Мы везлі бацьку на могілкі. Справа на нарты дзяды ўторкнулі сухую галінку, злева — зялёную: маўляў, ты, калі так ужо здарылася, ідзі сваёю дарогаю (яе табе сухая галінка пакажа), а мы пойдзем сваёю — вось гэтай, зялёнай. На могілках самы старэйшы ў стойбішчы чалавек дзед Вэнга ціхім голасам, якім размаўляюць толькі з сябрамі, прасіў продкаў, якія раней абжывалі могілкі:

— Мы назаўсёды аддаём вам Найваседу. Прыміце яго такога, які ён ёсць. Глядзіце яго, не сварыцеся з ім, дружныя будзьце заўсёды. Мы тут, у стойбішчы, усе яго любілі. Добры быў ён чалавек. Умеў папрацаваць, умеў і павесяліцца. Яго чум заўсёды быў дагледжаны, жонка — заўсёды радасная. Дзяцей ён падгадаваў — харошыя дзеці ў яго. Мы думаем, што і тут, сярод вас, ён будзе такі самы добры чалавек, які быў сярод нас.

І я ўжо сваіх дзяцей таксама падгадаваў: хто ў горадзе вучыцца, хто тут у школе. А малы Яптунэ — Гусіная Лапка яшчэ ў гульні гуляе. Вось і некалькі дзён таму назад, калі пургі не было, іду гэта я ў свой чум і бачу: мая Гусіная Лапка сабраў каля сябе такіх самых малечаў, як і сам, і кіруе. Падышоў бліжэй, прыслухаўся. Чую — у магазін гуляюць. Як жа абмінуць гэты магазін, калі з яго і цукеркі салодкія, і булкі смачныя!

Мой, значыць, за прылаўкам стаіць. А на прылаўку і каменьчыкі, і гліна, і снежкі. А ля яго — цэлая чарга.

— Іван, дай мне пяць буханак хлеба, дзесяць плітак чаю, пяць кілаграмаў цукру і пятнаццаць сукенак маёй бабе.

А мой Іван — Гусіная Лапка ўсё адкладае і ўпакоўвае. А за гэта грошы бярэ — паперкі рознакаляровыя. Калі ж грошы скончацца, ён камандуе:

— Хадзіце зарплату атрымліваць.

І ўсе зноў у чаргу становяцца. І ўсе яму расказваюць, хто дзе працуе:

— Я ў школе прыбіраю.

— Я кухар у сталоўцы.

— Я рыбак, звеньявы.

І так радасна было тады маім нагам, што яны ўсё яшчэ ходзяць па тундры — дужа белай у месяцы ловаў і дужа зялёнай у камарыны месяц. І мне было прыемна, што я яшчэ магу даць вось такую звычайную радасць сваім нагам — хадзіць...»

## *Пра што думала бабка Нечы, размінуўшыся з Тэседа*

«Тэседа паехаў дадому. Бачыла, Нечы, не так ужо лоўка сядзіць ён на партах, як некалі. Гады, што ні кажы,— гады. У чуме ўжо, мусіць, яго зачакалася Тэпэ. Прыгожа яны жывуць, дружна. Я ж памятаю, як яны пажаніліся. Тады ў стойбішчы гаварылі: «Глядзіце, якую прыгажуню прывёз у свой чум Тэседа! А якая яна ладная ўся. Адны грудзі — як тыя два чумы багацеяў, накрытыя шасцю нюкамі». Няхай сабе гавораць. Ці мала што каму падабаецца. Аднаму падабаецца худы, нібы той схуднелы шчупачок, чалавек, а другому — румяная, пухленькая дзяўчына. А сам Тэседа... Як любіў ён пагаварыць! Яго апошнія словы заўсёды абганялі пярэднія. Але з Тэседа хоць пагаварыць прыемна. А іншыя толькі і абгаворваюць. Усялякія дрэнныя словы да іх чапляюцца.

Памятаю, як я ўцякла з чума майго першага мужа. Колькі мяне тады няславілі! Але я пустыя словы пад сваімі нагамі тапчу, у свае сляды затоптваю, за галаву закідваю. А навошта ж з ім жыць буду, калі ён мне не падабаўся ні кропелькі: ці ў чуме сядзіць, дык з яго і слова не выцягнеш, ці па стойбішчы ідзе, дык усё пад ногі сабе глядзіць.

Затое на майго Сангачы я наглядзецца не магла. Усё ў яго ў руках аж гарэла. Пойдзе зімою на лёд лункі даўбсці, дык ля гэтых яго лунак такі шум стаіць, быццам цэлы статак хораў хоркае. А, бывала, калі ідзе па тундры, дык яго ногі цэлую пургу ўзнімаюць — во як хутка хадзіў мой Сангачы. А калі ён на сваіх любімых аленях ехаў, каменныя мысы аставаліся для мяне незаўважнымі.

Я не паспявала за імі сачыць — во як хутка ехаў. Ястрабы ўперадзе яго ляцяць, зірк — а яны ўжо ззаду Сангачы ляцяць.

Памятаю, ён усё марыў на Ямал з'ездзіць. Усё казаў мне:

— Калі я прыеду на Ямал, то неба ад радасці будзе апускацца над Ямалам, снег будзе правальвацца, зямля аж заскача, бо мая запрэжка будзе звінець тысячамі званочкаў бомаў, бо ўсе людзі Ямала выйдуць мяне сустракаць.

Вось пра які шумны поспех на Ямале марыў мой Сангачы.

А вясёлы які ён быў! Пра яго ўсе гаварылі:

— Паміж трох жанчын заўсёды ў бяседзе вісіць яго галава.

І сапраўды, мой Сангачы ўсіх весяліў. Ён адразу мог гаварыць з трыма жанчынамі: толькі і круціў галавою — то сюды, то туды.

Сем дзён мяне сваты яго сваталі. Сем дзён у час вялікага сватаўства яны бегалі ў наш чум. А на сёмы дзень брат мне і кажа:

— Даставай-тка, Нечы, усё са свайго вандака, дзе ляжыць тваё самае лепшае ўбранне.

І тады я зразумела, што мяне Сангачы высватаў.

Падрыхтавалі, узасобілі людзі доўгія аргішы аленевых запрэжак. Мяне пасадзілі ў прыхарошаную жаночую нарту, засланую тонкім чырвоным сукном. Запрэжкі ўбралі чырвонымі каснікамі з аленевай шкуры, званочкамі галасістымі іх задобрылі. Маю нарту да самага стойбішча жаніха вяла сваццця. Мяне закрылі з галавою — нявесце ж няможна глядзець па баках, бо тады ўсё жыццё дрэнна будзе жыць з мужам. І мне жаніха не паказваюць. Яны-то не ведаюць, што мы з Сангачы даўно ўжо зналіся. Мяне ў чум яго ўвялі. А ля чума вяселле рыхтуецца. Там забіваюць аленяў. Хлопцы скачуць цераз нарты, цераз разагнаныя запрэжкі, там — шумна, весела. І мне весела. Не тое што ў дзень майго першага замужжа.

І заўсёды потым для нашага з Сангачы чума кветкі распускаліся — усё было на нашым стале. Мой жалезны напарстак і сёння корміць мяне, а здарыцца чорны дзень — і чарку паднясе, і важаком у запрэжцы будзе, і ўкрые ад лютай сцюжы. А тады ж я зусім маладая была і працавітая. Таму перада мною ўсе шкуры слалі, нічога не шка-

давалі і не шкадуюць мне, бо я шыць умею. Надарыцца голад — я сшыю што-кольвек, пракармлюся, мне і чаркі не пашкадуюць, дадуць харошага важака-аленя, цёплая вопратка выратуе мяне ад пургі.

А вось майго Сангачы нішто не выратавала. Шэсць доўгіх дзён тады пурга шалела. Ды такая, што руку выцягнеш — рукі не відно. А ён быў якраз у тундры. Са стогнам чакала я вяртання Сангачы. Усе шэсць дзён чакала, калі пакажуцца вочы яго. Нават уяўляла, як аб снежныя паўночныя гурбы кідае пурга яго нарту, як пераскоквае яна з сумёту на сумёт — аж палазы рыпяць трывожна, нібы настылыя званочкі ад ветру халоднага заходзяцца.

Але злосны Нум не даў мне нацешыцца маёй радасцю — не вярнуўся дамоў Сангачы: яго дарога так і не дайшла да нашага цёплага чума.

А ад Сангачы асталася толькі добрая памяць. І вочы. Ды яшчэ голас. Я і цяпер помню, як ён прасіў, каб я праспявала яму песню. Вельмі любіў ён маю, што я тады яшчэ сама склала.

Давай-ткі, Нечы, спяём яе — пурзе спяём. Можа і ён, Сангачы, пачуе...

Доўгімі аргішамі,
што здалёк падобны
на чародкі качак у лёце,
мы па тундры зімой і летам
вандруем.
І няма ў нас стомы,
а сіла і маладосць
ніколі не пакідаюць нас.
А ў мяне, прыгажуні паўночнай,
дзве тугія касы дзявочыя, чорныя —
як дзве моцныя жэрдкі чума майго.
І з цела я спраўная — як азёрная рыбка,
і душа мая чыстая, нібы сняжынка.
Я хаджу па зямлі,
што пакрыта жоўтымі травамі,
тальнікам рэдкім,
і радуюся, што нарэшце знайшла
сваё шчасце...

І яшчэ ад Сангачы астаўся падарунак — Нумгыка, наша дачушка. Яна цяпер жыве ў вялікім горадзе: за рускага замуж выйшла. Яе там усе завуць Ніна Сідараўна. І ў яе ўжо дачушка ёсць — Танечка, мая ўнучка. А нядаўна і ўнук з'явіўся, Аляксандр. Цяжкое слова. Мне, старой, цяжка яго выгаворваць. Сама сабе я называю яго Явыка.

Так зручэй і неяк цяплей. Не ведаю, можа прывыкну калі і да Аляксандра.

А мая Нумгыка, як я помню, дужа ў школу хацела. Бывала, рыбу ля ракі чысціць, а сама ўсё глядзіць у той бок, адкуль кацер павінен прыйсці, каб дзяцей у школу забраць.

І вось кацер кінуў якар ля нашага стойбішча. Пачакай, Нечы, а калі ж гэта было? Здаецца, у сярэдзіне жніўня. Неба тады было нейкае як падранае — з яго, не перасціхаючы, сыпаўся дождж. Дзеці бегалі ля ракі і крычалі:

— Нюнеў, нюнеў, хэпёр тангей! Гагара, гагара, прынясі добрае надвор'е... Мерчар ханоў, сарор ханоў! Забяры дождж, забяры вецер...

А калі з'явіўся кацер, усе кінуліся хто куды. Адны за чумы свае пахаваліся, другія — аж у тальнік сіганулі. А мая Нумгыка да кацера кінулася. Аж я зазлавала. Дужа ж не хацелася мне яе ў тую школу аддаваць. Гляджу, а ўжо рускі — белы такі, у акулярах, адразу пазнаеш, што настаўнік,— пасадзіў на плечы маю Нумгыку і нясе да чума. Так і паехала дачка. Назаўсёды паехала...

Загаварылася ты, Нечы, задужа. Глядзі, каб з дарогі не збіцца. Адчуваеш — вецер па-другому пачаў у твар дзьмуць. Можа, збілася? Не, еду правільна. Гэта толькі пурга павярнулася другім бокам. Ды і халаднавата ўжо трохі стала. Мусіць, гэта старасць, бо апранута я цёпла, як заўсёды. Пачакай, Нечы, а як жа апранаўся ў той чорны дзень мой Сангачы? Пачакай, пачакай... Здаецца, ён апрануў тады свой святочны сакуй з белых аленяў. І яшчэ маліца... І яшчэ...»

Грунтоўнае пісьмо пра ненецкае адзенне прыслала мне загадчыца аддзела акругкома партыі Любоў Пракопаўна Сарокіна. Ненка па нацыянальнасці. У чуме бацькі і суседзі называлі яе Непянгы.

У ненцаў сёння пашыраны рускія імёны. Асабліва сярод дзяцей, моладзі. Бягуць у школу і старанна там вучацца Каці Северныя, Алёшы Ямкіны, Колі Камаровы, а дадому ў свой чум вяртаюцца з заняткаў усё тыя ж Нюкі, Енкі, Вэйтора.

Часам мяняюцца імёны і пры атрыманні пашпарта. Скажам, заходзіць ненец да начальніка пашпартнага стала.

— Як тваё прозвішча? — пытаюцца ў яго.

— Нумадзі.

— А імя?

— Нумадзі.
— А імя па бацьку?
— Нумадзі.
— Дык вось што, дарагі мой Нумадзі,— гаворыць яму начальнік пашпартнага стала,— я Васіль Іванавіч, будзь і ты Васілём Іванавічам. І прозвішча мы табе таксама прыдумаем не горшае, як у людзей. Скажам, чым дрэнна — Сонечны? Бачыш, сёння ж якраз сонца першы дзень не паказалася. А свяціць жа некаму трэба. Значыць — будзь здароў, Васіль Іванавіч Сонечны. Ідзі і свяці!

Любоў Пракопаўна хоць збольшага спяшалася памагчы мне зразумець лёс свайго маленькага (на Таймыры ненцаў каля 2 тысяч), але такога мужнага і такога працавітага народа. Яна вельмі часта выязджае ў тундру, яна — свой чалавек і ў зімовых і ў летніх чумах.

— Бывае, калі абвесцяць, што ў чырвоным чуме я лекцыю чытаць буду,— спачатку не вельмі спяшаюцца: усе занятыя, ва ўсіх работа. А як даведаюцца, што лекцыя на нашай мове,— прыходзяць. І, сумеўшыся, апраўдваюцца: «Ой, прабачце, што спазніліся, гэта ж гадзіннік, ведаеце, адстаў». А потым слухаюць — вельмі ўважліва слухаюць. І пытанні задаюць. Часцей за ўсё жанчыны і часцей за ўсё адно: «Чаму няма ў продажы харошага бісеру?» Ведаеце, нашы жанчыны вельмі ўмелыя майстрыхі. Яны любяць аздабляць пацеркамі і адзенне і абутак. Як упрыгожаць унтайкі, дык ад іх вачэй не адвесці. А тут з бісерам цяжкавата. Не ўсміхайцеся, гэта сапраўды для нас, ненцаў, вялікая праблема. Не стае бісеру, няма яго ў магазінах. Праўда, часам бывае, але шкляны. А шкляны ніткі рэжа. Толькі закончыш, бывае, работу, толькі пакрасуешся ў новай адзежыне крыху, а тут ніткі пацеркамі перарэжуцца — і ўвесь арнамент так і абсыплецца. Вось таму і хвалюе гэтае пытанне нашых жанчын. Таму яны і пытаюцца ў мяне: «Чаму няма бісеру? А чаму ў купцоў быў?»

Так, у рускіх купцоў было ўсё. Быў бісер. Былі цікавыя дзіцячыя забаўкі — для дарослых дзяцей. І каштавалі яны таксама нейкую дробязь — усяго некалькі пясцоў. Былі ў купцоў і медныя катлы. Харошыя, начышчаныя — аж бліщчаць. І цана не бог ведае якая. Нават без грошай аддавалі іх ненцам купцы-дабрадзеі: усяго толькі яго трэба было напоўніць шкуркамі пясца. Поўненька напоўніць — укоптур. Можна было і сабалямі. Напоўні — і бяры на здароўе. У купцоў таксама заўсёды была улька —

гарэлка. Вось яе купцы сапраўды не шкадавалі. Зусім без грошай аддавалі: ні колькі хочаш. Бачыце, якія добрыя. А што ненец назаўтра, працверазеўшы, недалічваўся мноства і пясцоў, і рыбы, і аленевых шкур — гэта ўжо дробязі. Што ж яны, купцы, могуць зрабіць, калі ў споенага ненца такая шырокая і шчодрая натура, калі ён сам усё аддае. Вось так улька, прыкінуўшыся самым вясёлым, самым шчырым сябрам ненца, хутка станавілася яго ворагам. А тундравік гарэлку, здавалася, абагаўляў, як Нума. І што самае крыўднае — гарэлка прасачылася нават у фальклор. «Гэтую песню я знайшла на рыльцы бутэлькі»,— во як часта пачынаюць свае песні ляпецкія жанчыны.

Народы Сібіру плацілі рускаму царызму вялікую даніну — ясак. Раскладка ясаку ўлічвала кожны лук, кожнага мужчыну. Акрамя гэтага раскладнога ясаку паляўнічыя і аленяводы абавязаны былі плаціць яшчэ гасударовы і ваяводскія «памінкі» — а як жа, людзі Сібіру павінны былі хоць раз у год успамінаць і ўсцешваць падарункамі таго, хто абіраў іх (маўляў, для іх жа радасці гэта і робіцца). А дзе насельніцтва палічыць было цяжкавата, там ясак быў неабкладны: «Кто что ясаку и какою мягкою рухлядью даст, то у них и емлют». Асноўнай жа адзінкай вымярэння ўсіх сібірскіх футраў быў собаль. Нішто сабе «мягкая рухлядь»! Толькі з-за гэтай «рухляди» людзей сілком прымушалі прысягаць. Шэрць (так называлася гэтая прысяга) заўсёды суправаджалася магічнымі абрадамі, дзе шаманілі не толькі свае шаманы, але і рускія купцы. А часцей за ўсё найбольш распаўсюджаным метадам было вымаганне праз заложнікаў. Купцы бралі заложнікаў і потым рабілі абмен — так званы абмен «вуха на вуха». Але хто памятае, колькі сабаліных вушэй трэба было аддаць, каб вызваліць аднаго заложніка. А потым самі бедпякі збіраліся па дзве-тры сям'і, складалі што ў каго было і ставілі чум — адзін на ўсіх: хто аддаваў жэрдкі, хто шкуры, хто жалезную трубку...

Часта падкуплялі знаць плямёнаў падарункамі. Прыклад у гэтым паказвалі нават цары. Яшчэ і сёння ў Краснаярскім музеі вісіць прыгожы каптан з чырвонага сукна і блакітны пояс з залатымі маіхрамі. Мікалай I 21 сакавіка 1837 года ўсё гэта падарыў багацею-аленяводу Ока. За «усердие» — Ока ахвяраваў сотню аленяў на перавозку ўсё той жа «мягкой рухляди».

Царызм планамерна і няспынна праводзіў абрусенне

малых народаў Сібіру. І радаваўся, калі з яго дапамогаю гінула нейкая мова. Цар, нібы кат, які толькі што зрабіў забойства, задаволена пацірaў рукі — добра, ай, як добра! Але светлыя галовы Расіі думалі зусім не так, як цар. Прыкладна ў гэты час, калі многія народы адвучалі ад сваіх моў, вялікі рускі педагог Канстанцін Дзмітравіч Ушынскі, мусіць, адчуваючы, што вельмі многа рускіх усё больш пнецца гаварыць толькі па-французску, пісаў:

«Калі знікае мова — народа больш няма. Вось чаму, напрыклад, нашы заходнія браты, выцерпеўшы ўсё разнастайнае насілле ад іншаземцаў, калі гэты гвалт, нарэшце, зачапіў мову, зразумелі, што цяпер ужо гаворка ідзе пра жыццё і смерць самога народа. І няма здзеку, больш недаступнага розуму, чым той, які хоча адняць у народа спадчыну, створаную незлічонымі пакаленнямі яго аджылых продкаў. Адбярыце мову, і ён ніколі больш ужо не створыць яе; нават новую радзіму можа стварыць народ, але мову — ніколі; вымерла мова ў вуснах народа, вымер і народ. Але калі чалавечая душа можа скалануцца перад забойствам аднаго недаўгавечнага чалавека, то што ж павінна адчуваць яна, замахваючыся на жыццё шматвяковай гістарычнай асобы народа — на гэта найвялікшае з усіх стварэнняў на зямлі».

Сёння на Таймыры жывуць далганы, ненцы, нганасаны, эвенкі, энцы, якуты. Усе яны, дзякуючы Кастрычніцкай рэвалюцыі, дзякуючы Леніну, робяць сваю нацыянальную культуру. Сярод дактароў, настаўнікаў, вучоных, партыйных работнікаў, сярод ардэнаносцаў, дэпутатаў (ад раённага Савета да Вярхоўнага Савета СССР) многа і ненцаў, і далганаў, і нганасанаў, і іншых народаў Таймыра.

— Гэта наша ява,— казаў мне Аляксандр Панфілавіч Расlякоў.— За намі ўвесь свет сочыць. Вось, скажам, у мінулы перапіс нейкім чынам выпала ў нас цэлая народнасць — энцы. Хоць і не шматлікая, але ўсё ж народнасць. І адразу ж з Брытанскага каралеўскага інстытута ў нас запыталіся — маўляў, «па перапісе 1939 года на Таймыры жылі энцы. Згодна апошняга перапісу, іх ужо няма. Дзе яны падзеліся? Можа вымерлі?» Яшчэ што выдумалі — вымерлі... Паехалі туды паўторна, яшчэ раз апыталі — знайшлі. Так і жывуць на Таймыры малыя народы Поўначы. Кожны жыве сваім жыццём. Кожны спявае свае песні.

Многа сваіх песень і ў ненцаў. Ненец без песні — дрэ-

ва без кораня. У няпецкіх стойбішчах песняю даўней лячылі хваробы. І памагала. Здорава памагала. Хворыя зноў станавіліся на погі — слова, калі ў яго паверыць, мае магутную сілу. Тым больш — праспяванае.

У ненцаў ёсць кароткія і доўгія песні. Кароткія спяваюць усе. А вось доўгія могуць спяваць толькі вельмі таленавітыя спевакі. А калі ненец спявае — трэба ўважліва слухаць. Ён раскажа табе ўсё — і дзе быў, і што бачыў, і што ўпаляваў, і што ён збіраецца рабіць заўтра. Можа нават песняю расказаць табе, што было на яго дзедзіне ў даўніну.

## Слова пасля дарогі

І вось, дарагі чытач, мы вярнуліся з табою з майго падарожжа. Увушшу ўсё яшчэ гудуць самалёты, туркочуць маторныя лодкі, татахкаюць цягнікі, лапочуць цеплаходы і маленькія кацяркі, фыркаюць аўтобусы. Вочы ўсё яшчэ памятаюць слёзы, абдымкі, пацалункі блізкіх між сабою людзей — на вакзалах жа заўсёды нехта некага праводзіць, нехта некага сустракае. Яшчэ і цяпер, трапіўшы ў шумную мітусню вакзалаў і аэрадромаў, якая, мусіць, ніколі не можа стаць чалавеку звыклаю, я міжволі спахапляюся: трэба ж хутчэй даставаць білет, трэба ж спяшацца, каб не прапаў лішні дзень, трэба некуды ляцець, плысці, ехаць...

Наездзіліся мы. Трохі і стаміліся. Ты памятаеш, як часцяком у сібірскіх гасцініцах, калі мы бралі з табой у рукі газету і, лежачы ў ложках, спрабавалі чытаць, яна, лёгенькая, як пушынка, рабілася цяжкою — нібы шматпудовы груз, падала ўніз, і ўжо не ставала сіл, каб утрымаць яе, адапхнуць ад сябе ці хоць бы адхінуць з твару,— мы так і засыналі, накрыўшыся газетнымі старонкамі.

І ўсё ж мы многа дзе не пабылі, многа чаго не пабачылі.

Так і астаўся неспазнаны полюс, Ледавіты акіян, дзе, як сцвярджаюць тыя, хто ўсё ж дапяў туды, спрэс усё белае-белае — ад айсбергаў да мядзведзяў.

Таксама непазнаныя асталіся на Таймыры нянецкія аленяводы і тысячы аленяў — столькі рагоў, сабраных разам у статак, вельмі ж ужо нагадваюць голыя восеньскія кусты, якія раптам пачынаюць ісці на цябе.

Незнаёмаю асталася таксама дзікая тайга — тая тайга, якою бачаць яе толькі паляўнічыя, мядзведзі, ды яшчэ, можа, геолагі.

Але ўсё ж, я думаю, сёе-тое мы пабачылі...

Я веру, што сціснанымі зімовымі прыцемкамі чысценькі, беленькі снег, які толькі што нападаў, бывае завельмі сіні — нібы святочнае веснавое неба.

Я ведаю, што светлая блакітная вада ўночы бывае чорная, і калі ты, седзячы ў лодцы, зачэрпнеш яе даланёю, у руцэ будзе нешта густое і вязкае — як дзёгаць.

А цяпер я ўпэўнены, што сібірская маланка, якая шастае летам у зялёнай кроне тайгі, бывае толькі зялёная...

*Сібір.*
*Чэрвень — ліпень 1969 г.*

# ТАМ, ДЗЕ СІБІР...

І вось ён, той зімны край, які не ўяўляецца без марозу і снегу. Я думаў, што сустрэнуся з яго холадам, а стрэўся з утомнай спёкаю: як не ад самай вясны над Сібірам гаспадараць апалы, гарачыня.

Аўтобус, весела пафыркваючы, выбягае з Мінусінска. У аўтобусе душна. І ціха — каму ахвота ў такую задуху язык варочаць!

Не спяшаючыся, перабегла дарогу спакойная, задумёная Оя. Колькі я наслухаўся пра гэтую раку — кажуць, што ў вытоках яна можа ўразіць самага раўнадушнага чалавека.

Удалечыні, дзіўнавата выгінаючыся, блішчыць танюсенькі Енісей. Адсюль ён здаецца невялічкаю, гэткай, як Оя, рэчкаю. Над самым небакраем у блакітнай смузе груваспяцца тасхылы — снежныя вяршыні Саянаў.

Шушанскае... Тысяча дзён сібірскай ссылкі Уладзіміра Ільіча Леніна. Тысяча дзён, як ён сам казаў, змушанага сядзення.

Ён прыехаў сюды маладым чалавекам. Яму было тады ўсяго толькі 27 год. Ён яшчэ не правадыр. Ён — проста ссыльны рэвалюцыянер. Але ў «Саюзе барацьбы за вызваленне рабочага класа» яго ўжо ведаюць як вопытнага кіраўніка. Для ўсіх ён пакуль што яшчэ Уладзімір Ульянаў — псеўданімам «Ленін», які пазней будзе ведаць увесь свет, ён падпішацца ўпершыню толькі пасля гэтай ссылкі, у 1901 годзе.

Ганна Сямёнаўна Сяродкіна, дачка сялянкі Пятровай, дзе Ленін жыў на кватэры, калі яе сёння распытваюць пра Уладзіміра Ільіча, гаворыць:

— Каб жа я ведала, што ён такі вялікі чалавек, дык я б за ім увесь час хадзіла, кожнае слова яго запамінала б. А нам тады ён быў проста ссыльны, проста Ульянаў.

А што ж я змагу напісаць пра Леніна? Што новае, не-

вядомае пра Ільіча змагу я расказаць, калі пра яго ўжо столькі напісана да мяне?

Я ж выдумляць тут нічога не збіраюся. Паспрабую толькі па пісьмах, успамінах, гутарках з людзьмі, якія ведалі ссыльнага Ульянава, узнавіць, як жыў і чым займаўся ў Шушанскім Ленін.

Геніі — часцей за ўсё простыя і сціплыя людзі. Геніяльнымі яны робяцца ў сваіх творах, у сваіх адкрыццях, у сваёй рабоце. А ў жыцці — гэта звычайныя, як і ўсе мы, людзі. Але ад іх кожную секунду — ці яны вячэраюць, ці разборсваюць чаравікі, ці дурэюць з дзецьмі — чакаюць толькі геніяльных думак. Леў Талстой у час свае найвялікшае сусветнае славы, разумеючы, што многія дзівакі глядзяць яму ледзь не ў самы рот, чакаючы геніяльных думак ці высноў, знарок іншы раз гаварыў нейкае безнадзейнае глупства і потым смяяўся ў душы, назіраючы збоку, як гэта дзівіць яго інтэлектуальных субяседнікаў. Ды і звычайныя чалавечыя размовы і клопаты іх не задавальнялі — такое здавалася ім завельмі простым для генія...

Ленін таксама быў вельмі просты. Пра гэта напісана многа — ленінская прастата стала ўжо сёння легендарнай. Уладзімір Ільіч хутка сыходзіўся з людзьмі. «Калі я ўпершыню сустрэўся з Ільічом,— успамінае Ленашынскі,— то ўсе мае ўяўленні аб ім як аб «генерале», аб насмешлівым і жорсткім чалавеку (а менавіта так гаварылі пра яго некаторыя сябры) развеяліся ўшчэнт пасля першых жа хвілін знаёмства з ім».

Сярод шматлікіх ленінскіх здымкаў мяне больш за ўсё кранае той, дзе ён сарамліва ўзняў руку — ці то для прывітання, ці то для развітання,— а ў яго ласкавым паглядзе, ля маршчынак, што праменяцца ад вачэй, столькі цеплыні, шчырасці, дабрыні...

Вось я і хачу як льга болей даведацца, распытаць пра Чалавека — адміністрацыйна-ссыльнага Ульянава, які вясною 1897 года ўпершыню, не па сваёй ахвоце, прыехаў у Шушанскае.

«...Я адчуваю... сябе вельмі спакойна: сваю нервознасць пакінуў у Маскве. Прычынай яе была няпэўнасць становішча, больш нічога. Цяпер жа няпэўнасці значна менш, і таму я адчуваю сябе добра»,— пісаў Ленін яшчэ з дарогі.

Цяпер сапраўды становішча ў яго было пэўнае.

Недзе там, далёка ў Еўропе, у настылым Пецярбурзе, астаўся яго халодны пакойчык, дзе за тоненькай, як мембрана, сценкаю брынькае па балалайцы сусед. Адсюль за

чатыры дні да арышту, у снежні, ён пісаў пісьмо маці і супакойваў яе: маўляў, пакуль што надвор'е тут добрае, і таму яго лёгкае паліто якраз па сезоне... Яго пакойчык, мусіць, гаспадары здалі ўжо некаму іншаму, і той, іншы, можа, во цяпер раззлавана слухае брынькание непаслухмянай балалайкі... А можа яму, іншаму, гэта якраз падабаецца...

Недзе таксама там асталіся цэлыя плоймы вымуштраваных шпегаў, якія добра ўмеюць прыкідвацца — яны могуць цэлымі гадзінамі вельмі ж уважліва разглядаць нешта ў выпадковай вітрыне альбо цэлага паўдня, не гартаючы, спакойна чытаць адну і тую ж газету. А як яны заварушацца, як замітусяцца (акурат — мурашнік, у які ўторкнулі палку), калі зразумеюць, што Ульянаў, той, хто павінен быў, не падазраючы гэтага, прывесці на канспіратыўную кватэру, перахітрыў іх і незаўважна знік.

Там асталіся пецярбургскія дворнікі, якія амаль усе тайна служылі ў паліцыі і, прыжмурыўшы адно вока, хітравата сачылі, хто да цябе ідзе і куды ходзіш ты. Там асталіся цяпер ужо, мусіць, задобраныя ўладамі правакатары, якія, прыкідваючыся рэвалюцыянерамі, выкарыстоўваючы даверлівасць рабочых, прыжываліся ў іх гуртках.

Недзе там асталіся арышты, турма, цэля, дзівакаваты наглядчык, які, зазіраючы ў акенца, усё дзіўіўся і ніяк не мог даўмецца, чаму гэта арыштант Ульянаў, які ніводнага разу не набываў у турэмнай царкве, зрабіўся такі набожны — адбівае столькі зямных паклонаў. Наглядчык, мусіць, так і не зразумеў, што ў самыя моцныя маразы, калі цэля выстывала, як ваўкаўня, такія гімнастычныя практыкаванні саграваλі і памагалі хутчэй заснуць.

Хваляванне і чаканне, чым скончыцца суд, таксама ўжо былі далёка ззаду. Цяпер усё ўжо было зразумела, усё ясна: перад ім была тысяча аднастайных дзён у глухім сібірскім сяле — уся Шушанская воласць выпісвала тады толькі сем газет... І гэтыя дні трэба было нечым запоўніць.

Якім убачыў Шушанскае Ленін?

«Шу-шу-шу,— так ласкава называў яго Уладзімір Ільіч,— сяло нядрэннае. Праўда, знаходзіцца яно на досыць голым месцы, але непадалёку (вярсты паўтары — дзве) ёсць лес, хоць і вельмі высечаны. Да Енісея праходу няма, але рака Шуш цячэ каля самага сяла, а затым досыць вялікі прыток Енісея недалёка (адна — паўтары вярсты), і там можна будзе купацца. На небакраі Саянскія

горы або адгор'і іх; некаторыя зусім белыя, і снег на іх наўрад ці растае калі-небудзь. Значыць, і ў галіне мастацкай сёе-тое ёсць, і я нездарма складаў яшчэ ў Краснаярску вершы: «У Шушы, ля падножжа Саяна...», але далей першага верша нічога, на жаль, не прыдумаў!»

І яшчэ:

«Сяло вялікае, у некалькі вуліц, досыць брудных, пыльных — усё як мае быць! Стаіць у стэпе — садоў і наогул раслінпасці няма».

Зялёнае, чыстае Шушанскае! Я хаджу па тваіх прыгожых вуліцах і любуюся, радуюся, як ты змянілася. Хоць зразумець і адчуць твае змены я не магу: я ж не бачыў цябе іншым, такім, якім ты было да рэвалюцыі. А вось той, хто, нягледзячы на прымусовае знаёмства, палюбіў цябе назаўсёды, той бы наўрад ці пазнаў гэтае новае сібірскае сяло. Ён бы, мне здаецца, доўга ўглядаўся ў твае вуліцы, нібы ў твар харошага свайго сябра, якога даўно не бачыў, каб адшукаць хоць якія ранейшыя рысы. Але наўрад ці ўдалося б нават яму знайсці іх. Ты, Шушанскае, сёння зусім іншае сяло.

Вось адміністрацыйны цэнтр. Прыгожыя, сціплыя будынкі райкома партыі, Дома культуры, пошты, гасцініцы. А вось яшчэ навейшае Шушанскае — новыя, сучасныя, пяціпавярховыя дамы, вялізная школа, новая гасцініца. Усё новае. Гэта падарунак шушанцаў стагоддзю з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча — горад-помнік.

А гэта — таксама своеасаблівы юбілейны падарунак. Валасная ўправа, кутузка, карчма...

Гэтая карчма ніколі не чула п'яных песень шушанскіх мужыкоў і адчайнага плачу іх жонак, якія, што ўсё роўна па нябожчыку, галасілі некалі па кожным рублі, пакінутым тут, па мокрым ад разлітай гарэлкі драўляным стале.

Кутузка таксама не будзе ведаць бунтарскага духу сібірскіх мужыкоў, якія па пасланай саломе, да болю сціснуўшы кулакі, доўга варочаюцца і ніяк не могуць звесці вачэй ад крыўды і бездапаможнасці.

Не бойцеся, шаноўныя экскурсанты, смялей заходзьце і сюды... Грозная валасная ўправа толькі спрабуе напусціць на сябе сур'ёзнасць і злосць — гэта ж ад яе патрабуецца, як кажуць, па штату. Тут вас ніхто не абразіць, як гэта было раней, не прымусіць таптацца ў парозе, ніякавата ламаючы ў руках шапку. Нават самы маленькі пісарчучок, які некалі любіў паказаць сябе дужа вялікім начальнікам, сёння ўжо не зможа вас зняважыць — яго

тут проста няма. Няма тут і самой яго светласці — валаснай лысіны. Даўно ўжо няма. А што на яго стале ляжыць ручка з пяром, толькі што памакнутым у чарніла,— не звяртайце ўвагі. У музеях, паверце, так заўсёды бывае.

А гэта сапраўдны музей. Мемарыяльная зона «Сібірская ссылка У. І. Леніна», дзе ўзнаўляецца ў пачатковым выглядзе частка сяла,— яна будзе выглядаць менавіта так, як выглядала ў той далёкі час.

Лёс сялу выпаў шчаслівы — яно нараджалася другі раз. Улетку, калі мне давялося там быць, старое Шушанскае сама будавалася. Навокал грукалі сякеры, звінелі пілы. Рытм зладжанай працы радаваў кожнага. Такі радасны і ўзнёслы настрой напаваў некалі пасля вайны ў нашых беларускіх вёсках, спаленых фашыстамі, калі нядаўнія салдаты ў палінялых на вайне гімнасцёрках, засумаваўшы па звычайнай рабоце, напава рубілі цэлыя вёскі...

З Пракопам Тарбаковым, брыгадзірам цесляроў, якія будуюць валасную ўправу, стаім ля новага зруба. Пахне свежымі трэскамі, стружкамі, пілавіннем, смалою — мусіць, кожны зможа сабе ўявіць, які водар дрэва стаіць навокал, калі адразу ставіцца столькі новых зрубаў! Нам не даюць размаўляць: то бібікае «Беларусь» — вязе свежапапілаваныя дошкі; то нас просяць адысціся троху ўбок — сюды трэба прыкаціць толькі што абчасанае бервяно; то прыходзяць параіцца з брыгадзірам, дзе заразаць кроквы.

Пракоп Аляксеевіч, невялікі, прысадзісты мужчына, ссунуўшы шапку як не па самую патыліцу, выцірае рукавом спатнелы твар і гаворыць:

— Многа ў нас работы для сякеры. Гэта ж старое сяло, зрублена яно было толькі сякераю. А сёння ўжо моладзь не дужа ўмее цяслярыць. Старых жа, умелых цесляроў малавата і ўсё меншае і меншае...

Руцэ трэба добра любіць сякеру, рука адразу павінна пазнаваць тапарышча, каб рубіць свае Кіжы. Руцэ цесляра трэба практыка. Тады ў ёй сякера — гэты цяжкі інструмент — стане лёгкай і паслухмянай, як пэндзік гадзіннікавага майстра.

І тады я зразумеў турботу шушанскай раённай газеты, яе клопаты, якія напачатку мяне здзівілі. Газета, рупячыся пра Ленінскі мемарыял, пісала:

«Цесляры тых далёкіх гадоў працавалі бездакорна. І трэба вытрымаць дакладнасць, зберагчы іх майстэрства».

І будаўнікі Шушанскага мемарыяла, не саромеючыся

таго, што ім многа даводзіцца працаваць, каб не ўступіць цяслярнаму майстэрству сваіх напрактыкаваных продкаў, не спяшаючыся, выпястоўваюць кожны новы вянец, кожны новы будынак — хай сабе гэта будзе карчма ці хата бедняка Ракунова.

Ляскаюць, гахкаюць сякеры ў Шушанскім. І ў зоне мемарыяла вырастаюць усё новыя і новыя будынкі. Некаторыя складзены, узноўлены са старых хат. У іх паўстаўляны «пратэзы» — там, дзе вугал адваліўся, дзе згніў падаконнік. Другія — жоўценькія, чысценькія, новенькія. Яны аж блішчаць пад ласкавым летнім сонцам — па бёрнах, нібы ясвы па вадзе, мітуслівa скачуць сонечныя зайчыкі. Нават шкада, што праз некалькі дзён іх прымусяць пачарнець.

— Сяло павінна мець стары выгляд. Вось таму мы потым і будзем уводзіць у кожнае новае бервяно антысептыкі. Хаты адразу ж пачарнеюць. Бачыце вунь тую бядняцкую хатку? Бачыце, якая ўчарнелая стаіць? А была ж такая самая жоўценькая. Мы яе ўжо здалі. А пакуль не састарым, камісія не прымае.

Каля хаткі стаяць старыя жанчыны. Глядзяць у акно, паказваюць пальцамі, смяюцца:

— Глянь-ка, погляпь-ка, Катерина! Да ты чё — не видишь? Зыбка-то вон висит. И качается еще. Как все равно ребёночка только что взяли, чтобы мокрые пеленочки заменить. И туески на печи стоят. Чё? Знамо дело, из берёсты! Раньше в таких мы сметану да дрожжи держали. Поварёшка вон даже висит. А погляпь-ка чё на столе — ложки деревянные! Даже обгрызённые. Где они только их подобрали? А вон и скалка — утюг наш давний. Возьми, Катерина, будет чем твоего из гостей встречать...

Дом Зырапава, заможнага селяніна, дзе спачатку жыў Ленін. Узноўлены, таксама прыняты. Пакойчык Ільіча. Невялікі, але які светлы — ён глядзіць на свет аж пяццю шырокімі вокнамі!

А гэта круглы зырапаўскі двор. Менавіта такім (і колькі разоў на дзень!) бачыў яго, пэўна, і Уладзімір Ільіч.

Хатка батрака, што працаваў на Зырапава.

— Барзджэй глядзі сюды, унучак,— чую я побач.— Вуньдзека і прасніца, і кудзелька,— унук глядзіць зусім у другі бок.— А мамачкі мае, вунь жа і красёнцы, такія, як у маткі маёй былі!

«Вуньдзека», «барзджэй...» Трохі дзіўнавата чуць гэтыя глыбінныя беларускія словы тут, у Сібіры...

— Ага, сынок, з Беларусі я,— адказвае на маё пытанне бабулька, якая толькі што паказвала свайму ўнуку кросны.— Гэта ж дзевер быў тут, і ўсё піша: «Прыязджайце ды прыязджайце»... Цяпер я ў саўхозе «Сібір» жыву. Багаты саўхоз — усяго хапае... А там жа ў вас, можа, і цяпер яшчэ ў лапцёх ходзяць, га?

Цётка Хвядора даверліва слухае мой расказ пра сённяшнюю Беларусь, а потым кажа:

— Запішыце, што з вамі гаварыла цётка Хвядора, Хвядора Ягорава, якая жыла даўней у вёсцы Цітаўка Касцюковіцкага раёна. Гэта ж каб бліжэй, ды ў другі час, дык дайжа б заехалі да мяне, пасядзелі б. А то ж я тут сама ў гасцях.

Мілая наша беларуская ветлівасць і гасціннасць! Бабулька шчыра перажывае, што сама ў гасцях, што не можа прывеціць і ўчасціць незнаёмага чалавека, з якім толькі і паспела абмяняцца некалькімі словамі...

У Шушанскім сустрэўся я і яшчэ з адным земляком. Гэта сам дырэктар Шушанскага музея Мікалай Данілавіч Гарадзецкі. Ён ужо даўно расстаўся са сваёй Бабруйшчынай, але ж змякчаць «ч» у сваёй гаворцы так і не навучыўся.

Мікалай Данілавіч вельмі любіць дрэвы. Яшчэ студэнтам ён на сваю стыпендыю панакупляў саджанцаў яблынь і пасадзіў там, у сваёй вёсцы, вялікі сад.

— І сёння з майго саду пасылкі прысылаюць. Яблыкі даходзяць, а грушы — не: наспяваюць згнісці за дарогу.

У сваёй вёсцы ён некалі пасадзіў паабапал вуліцы ліпы, клёны, ясені, бярозы.

— Каб вы ведалі, як цяпер там у нас зелена!

Не развітаўся са сваёй радасцю ён і тут, дзе садоў няма. А ў яго ёсць!

Я зайшоў у яго агарод і здзівіўся — а дзе ж сад?

— Вось ён,— паказваючы на маленькія, як кусты агрэсту, дрэўцы, сказаў Мікалай Данілавіч.— Мой сад сланцавы: без ценю, без шырокіх зялёных крон. Яблыні я саджаю пад вуглом у 45 градусаў. Калі яны распускаюцца, дунрыгінаю да зямлі спецыяльнымі кручкамі. Клопатаў дужа з імі многа — на зіму трэба закрываць добра, каб не намерзлі, вясною адкопваць. Але ж затое яблыкі сібірскія нават смачнейшымі здаюцца.

І, трохі памаўчаўшы, уздыхнуў:

— Шкада, што мой сад якраз у мемарыяльнай зоне.

Сёлета давядзецца з ім развітацца. Мне ўжо новую кватэру ў няціпавярховым доме далі...

Мінаю здадзеныя ўжо камісіі старэнькія хаткі Шушанскага, спакойпую Шуш, дзе весела цялёпкаюцца дзеці (вада, мусіць, цёплыя, як сырадой, і трапляю на востраў, дзе любіў адпачываць Ленін. Цяпер тут турбаза, стадыён. Па вузенькай, выбітай, як ток, сцяжынцы ў траве іду да Енісея. Нібы падвешаныя на промнях, мільгацяць перад самым носам мятлушкі. Непадалёку пасвяцца каровы. Адна, мусіць самая зброддлівая, з балабонам: нагне галаву, каб да травіны дастаць,— балабон звініць; падніме галаву, каб паглядзець, хто там ідзе,— таксама звініць.

Нада мною кружыць кнігаўка і ўсё дапытваецца: «Чый ты? Чый ты?» А калі ўжо я падышоў, відаць, пагрозліва блізка да яе гнязда, яна, мне здаецца, спалохалася і шпарчэй замахала крыллем, нібы спрабуючы адагнаць прыхадня: «Куды ты! Куды ты!»

І ўсё гэта мне здалося такім знаёмым, нібы я іду сваім лугам.

Уладзімір Ільіч, прабыўшы ў Шушанскім два гады, пазываў гэтыя мясціны сібірскай Італіяй і на лета клікаў сюды сваю маці:

«Як дача, Шуша нішто сабе, мала чым горш, я думаю (калі горш), за іншыя дачы. Справа толькі ў дарозе».

Вось як? Шушанскае — дача? Дык а што ж тады ссылка, у якую ён так пехаця ехаў? Чым жа яна ўсё-ткі страшная, гэта ссылка?

Перш за ўсё — адзінотай і цішынёю. Да гэтага ён увесь час быў заняты небяспечнай работай па стварэнні «Саюза барацьбы», і таму нават самы доўгі дзень здаваўся завельмі кароткім — як летняя ноч. А тут ён удоўжыўся, пабольшаў, разышоўся ў берагах: колькі ні глядзі, засланіўшы рукою ад сонца вочы,— з аднаго берага, які называецца Ранішай, ніяк не ўгледзіш далёкага другога, які называецца Вечарам. І табе ні сяброў, ні звыклай работы.

Царскі ўрад ведаў, што робіць: ён паспяшаўся адарваць небяспечнага рэвалюцыянера ад рабочых і такім чынам пазбавіць іх кіраўніка.

Па пісьмах Уладзіміра Ільіча адчуваеш, што ў ссылцы ён больш за ўсё асцерагаўся суму, маркоты, хандры, пустога баўлення часу. А тут яшчэ, як на грэх, да яго даходзяць непрыемныя навіны пра ссыльных сяброў: нехта з некім пасварыўся, нехта звар'яцеў, нехта застрэліўся. «Не, не жадай мне лепей сяброў з інтэлігентаў: гэтыя звадныя

гісторыі — самае горшае ў ссылцы»,— пісаў ён сваёй сястры Ганне Ільінічне пасля самагубства Федасеева.

З'ездзіўшы ў сяло Цесь, дзе адбывалі ссылку Базіль Старкоў і Глеб Кржыжаноўскі (перад гэтым Ільіч пісаў: «З Цесі атрымаў учора паведамленне, што там мае быць вяселле — Базіля з А. М. Завуць мяне ў шаферы»), ён убачыў, што цесінцы засумавалі: Кржыжаноўскі прыхворвае, хандрыць, Старкоў таксама выглядае кепска, сумна. І ён, з характэрнай яму аддана сцю, імкнецца разварушыць сяброў, навучыць — як некалі з каменя здабывалі агонь — здабываць радасць жыцця нават з гэтага аднастайнага становішча.

А сам Ільіч стараўся быць спакойным, ураўнаважаным — ён ніколі не адпускаў далёка ад сябе смех. «Пан Ульянаў заўсёды вясёлы»,— гаварыла пра яго пані Тэкля, жонка ссыльнага польскага рэвалюцыянера Яна Праміньскага.

Ён жартуе нават і ў пісьмах. Вось як ён просіць, скажам, прыслаць яму лайкавыя пальчаткі: «Ніколі я іх не насіў ні ў Піцеры, ні ў Парыжы, а ў Шушушу хачу паспрабаваць — летам ад камароў. На галаву ж сетку надзенеш, а рукам дастаецца аж занадта. Глеб запэўнівае мяне, што тутэйшыя камары пракусваюць пальчаткі,— але я не веру...»

Пісьмы і кнігі... Гэта адзіная надзейная пупавіна, якая ўсе тры гады звязвала яго з далёкім светам, з усім тым, што асталося па-за Сібірам. Затрымаецца пошта, не прыйдзе паштар — і ўжо табе здаецца, што ты тонеш, нібы ў вадзе, табе не стае паветра, і ты задыхаешся, хоць побач усё тое, што было і раней: і луг у красках, і рэчка, дзе купаюцца дзеці, і лес — увесь у птушыных гнёздах.

І як радасна робіцца, як падкоціцца да сэрца ласкавы камячок, калі ўбачыш у акно, што да хаты Зыранава (а цяпер ужо і тваёй хаты) ідзе паштар, калі пачуеш, як клямкнуць веснічкі, і, мусіць, не ўседзіш, не ўцерпіш — і, пакуль ён будзе абтрасаць снег з катанак, выскачыш на ганак і забярэш з яго рук тоўсты пакунак з кнігамі і ладны пачак пісем.

Дзіва што Уладзімір Ільіч так чакаў аўторка ці пятніцы — паштовых шушанскіх дзён! Чакаў як найвялікшага свята.

Як толькі з'явіўся ў Зыранава ссыльны кватарант, у Шушанскае пайшлі кнігі. У насылках і бандэролях, на конях, у цягніках і на параходах, нагрэтыя летнім сонцам,

змочаныя талай вадою, прамёрзлыя ў далёкай дарозе — яны ўсё ж знаходзілі сцежку ў гэтае сібірскае сяло.

Кнігі, кнігі, кнігі... І няма ніводнага пісьма, дзе б ён пра іх не ўспомніў. У лістах толькі і чытаеш: пісьмы прыходзяць рэдка, цягнікі ідуць марудна...

«Пры надзвычайнай працягласці часу, з якою ідуць нашы пісьмы, адказы на пытанні прыходзяць так няскора, што на многае адказваць бывае лішнім»,— скардзіцца Ленін сваёй маці.

І ў выніку гэтай маруднасці здараюцца непаразуменні: маці непакоіцца пра грошы, якія яна паслала даўнавата ўжо і не ведае, ці дайшлі яны; а сын таксама даўно паслаў пісьмо (яно пакуль што не дайшло), дзе паведамляў, што атрымаў іх. Зараз ён пачынае хвалявацца, чаму да маці не дайшло пісьмо (можа яго заарыштавалі?). А маці, нарэшце атрымаўшы той запознены ліст, піша сыну супакоены адказ і намнога пазней атрымлівае ўсхваляваны ліст сына (той, які быў пасланы даўно), дзе Уладзімір Ільіч нервуецца, ці не згубілася тое пісьмо, у якім ён пісаў пра грошы.

Але ўсё ж, хоць і запознена, пісьмы прыходзілі і асцярожна, намёкамі расказвалі пра сяброў. Кнігі памагалі разнастаіць жыццё.

«З упутранага ж боку,— піша Уладзімір Ільіч,— адзін дзень ад другога адрозніваецца толькі тым, што сёння чытаеш адну кнігу, заўтра — другую; што сёння ідзеш гуляць направа з сяла, заўтра — налева; сёння пішаш адну работу, заўтра — другую».

Ад'ехаўшыся так далёка ад Пецярбурга, набітага, як бочка селядцамі, шпегамі, ён спачатку спадзяваўся, што тут можна будзе адпачыць ад іх пільнага, халоднага вока. Але гэта ўсяго толькі спадзяванні. Кум Зыранава, стражнік Заусаеў, адразу ж папярэдзіў гаспадара:

— Ты, Аполлон Долмантьевич, с ним ухо остро́ держи. Ты же знаешь, кто твой квартирант? Бунтовщик! Он же под гласным надзором.

Штодзень на кватэру Зыранава прыходзіў засядацель, мясцовы заможны селянін, які выконваў ролю паліцэйскага. Ён бесцырымонна, не вельмі саромеючыся, заходзіў у пакой Уладзіміра Ільіча, не пытаючы дазволу (уладам дазвол не патрэбен!), садзіўся за стол і ў тоўстай спецыяльнай кнізе непаслухмянымі пальцамі, якія не прывыклі трымаць аловак, рабіў запіс — маўляў, усё ў парадку: палітычны паднаглядны Ульянаў знаходзіцца ў Шушан-

скім. Гэты селянін-паліцэйскі выконваў сваю ролю вельмі ж ужо старанна: ён ніколі не спазняўся, не прапускаў ніводнага дня — запіс у кнізе рабіўся своечасова. І ўсё роўна, хоць ён гэтак стараўся, парадак часам быў толькі ўяўны. Не паспяваў яшчэ засядацель, вярнуўшыся, скінуць кажух, як Уладзімір Ільіч быў ужо на дамоўленым месцы, дзе чакаў яго Аляксей Мезін. Коні ў Аляксея былі спраўныя, хуткія, сам ён чалавек акуратны і не балбатлівы: вечарам, калі добра ўцямнее (каб, крый бог, не ўбачыў урадпік!), завязе Леніна ў Мінусінск да сяброў, а раніцаю зноў прывязе — калі ласка, правярайце, спраўнікі... Ды і сам Апалон Далмантавіч Зырапаў трымаў коней, на якіх вазіў пасажыраў у Мінусінск і Абакан.

А цёмнымі асеннімі вечарамі, калі над Шушанскім гула «пагода» — халодны і моцны, як віхор, сібірскі вецер з-за Енісея,— здаралася, над акно Уладзіміра Ільіча, якое самотна свяцілася ў цемры вёскі, нячутна, асцярожна, прытрымліваючы рукою шаблю, каб яна выпадкам не зазвінела, падыходзіў стражнік. Ён доўга ўглядаўся ў асветлены пакойчык, дзе, як здавалася (асабліва адсюль, з асенняй золі, з вуліцы), было так цёпла і ўтульна.

Вунь ля акна невялікі стол, на ім медны падсвечнік. І нейкія паперы. Вялізная драўляная паліца з кнігамі... Цікава, а навошта аднаму чалавеку столькі кніг? Побач з паліцаю, у самым кутку — драўляная канторка. На ёй лямпа з зялёным абажурам. А гэта — ён. Вялікі лоб, задуменыя вочы...

Бач ты яго — не спіць яшчэ...

І стражнік, задаволены, адыходзіў ад акна:

«Усё піша... Ну-ну, пішы, галубок. Паглядзім, да чаго ты дапішашся...»

Стражнікі не любілі ссыльных — ім гэта быў лішні клопат. Нічым не адрозніваўся ад сваіх саслужыўцаў і гэты. Ён ніяк не мог зразумець, навошта ссыльнаму Ульянаву кожны месяц даюць 8 рублёў дапамогі — амаль столькі, колькі атрымлівае ён, верны абаронца ўлады. А гэта ж злачынца! Ссыльны выступае супроць цара, бунтуе супроць айчыны, а цар яму яшчэ грошы дае — вазьміце, маўляў, Ульянаў, ды хутчэй спіхайце мяне з трона...

Калі бунтаўшчыкоў аддавалі салдатам пад ружжо, пад іх нагляд, і калі тыя даведваліся, што за кожнага рэвалюцыянера, застрэленага пры спробе ўцячы, плацілі па 10 рублёў, знаходзіліся вылюдкі, што стралялі ў гэтых

безабаронных людзей нават тады, калі яны елі ці спалі і не думалі ўцякаць...

У хаце Зырапава часцяком збіраліся павесялелыя пасля карчмы шушанскія мужыкі. Часам выпівалі і тут — сам гаспадар быў не супроць перакуліць з суседзямі чарку, другую. Тады Апалон Далмантавіч рабіўся гаваркі і ўсё дапытваўся ў свайго кватаранта:

— Слышь, Ильич, дедко мне имечко дал, язви его в бок,— сам отец Иоан в святцах никак найти не может. А ты не скажешь, что это значит?

Уладзімір Ільіч, вядома, хутка знаходзіў, што адказаць свайму гаспадару.

Ленін вельмі дружна жыў з шушанскімі сялянамі. Ён памагаў ім бараніцца ад царскіх чыноўнікаў.

«Калі я быў у Сібіры ў ссылцы,— успамінаў сам Ільіч на XI з'ездзе РКП(б),— мне даводзілася быць адвакатам. Быў адвакатам падпольным, таму што я быў адміністрацыйна-ссыльным і гэта забаранялася, але паколькі іншых не было, то да мяне народ ішоў і расказваў пра некаторыя справы».

У ссыльнага адваката была добрая слава. Часам варта было каму-кольвек толькі сказаць, што будзе скардзіцца Ульянаву, як крыўдзіцель спяшаўся хутчэй замірыцца.

Ленін сам складаў усе судовыя дакументы, а потым дыктаваў іх пісьменным і надзейным сялянам, а тыя перапісвалі. І строга наказваў, каб ні самі «пісары», ні тыя, хто панясе дакументы ў суд, не прагаварыліся, што складаў іх ён, ссыльны адвакат.

## *Белая карова*

Неяк увечары, калі Уладзімір Ільіч стаяў за сваёй конторкаю, сарамліва зайшла немаладая ўжо сялянка. Яна дала «добры вечар» і ніякавата спынілася ў парозе. Ільіч запрасіў яе прайсці, пасадзіў на крэсла. Жанчына, не ведаючы, дзе схаваць свае рукі (яна клала іх то на фартушок, то пад яго), пачала расказваць пра сваю бяду:

— Вы прабачце ўжо мне, старой, што вас патурбавала. Гэта ж мой усё — ідзі ды ідзі. А сам не хоча. Як раней, дык усё мая матка хадзіла, а ён — ані блізка. А маці ж мая такая добрая ды такая ласкавая была.

— З ёю што-небудзь здарылася?

— Ды не, з ёю ўжо нічога не можа здарыцца: яна даўно ўжо там, дзе нас яшчэ чакаюць. А дзяцей маіх падгадавала. Во і апошняя мая замуж пайшла. Вы ж, можа, чулі, як вяселле ў нас гулялі? Дык вось дачка...

— Няшчасце з дачкою?

— Якое там няшчасце! Шчасце. Жывуць сабе мілуючыся ды цалуючыся. Ім што, маладым,— гэта ж не мы, старыя...

— Дык, а якое ж гора ў вас?

Але сялянка яшчэ доўга расказвала пра сваякоў, пра сваю хату, пахвалілася нават, што ў яе ёсць у куфры, нават суседзяў збольшага закранула, пакуль дайшла да свае бяды:

— Няма ўжо яе, мае карміцелькі. Царства ёй нябеснае. А так яна ела, так ела! Бывала — ідзе па вуліцы, дык яе толькі ціхенька паклічаш — бяжыць, родная, з усіх ног...

— Хто яна?

— А хіба я яшчэ не сказала? Белая карова мая. А столькі малака давала, царства ёй нябеснае, што мы са старым ні папіць, ні паесці не маглі — хоць ты заліся. Няма маёй радасці. Забоў яе кулак...

«Але самае цяжкае,— успамінае пра гэту гісторыю Уладзімір Ільіч,— было разабрацца, у чым справа. Прыйдзе баба, пачынае, вядома, са сваякоў, і неймаверна цяжка было дабіцца — у чым справа. Я кажу: «Прынясі копію». Яна расказвае пра белую карову. Ёй кажаш: «Прынясі копію»,— тады яна адыходзіць і кажа: «Не хоча слухаць без копіі пра белую карову...» Але маленькі прагрэс мне ўдалося ажыццявіць: прыходзячы да мяне, неслі копію, і можна было разабрацца, у чым справа, чаму скардзяцца і што баліць».

Прынесла копію і гэтая сялянка. Хоць, праўда, не абышлося без абраз, кпінаў — у царскіх судах гэта лічылася як не нормаю паводзін.

— Якую табе копію? — здзекаваўся судовы чыноўнік.— З белай каровы, ці што? Такую копію няхай бык дае. Мы не можам.

З копіі стала вядома, што справа гэтая была простая: бык мясцовага кулака «забоў» белую карову сялянкі-беднячкі. Валасны суд прысудзіў кулаку заплаціць сялянцы ўсяго толькі 10 рублёў.

Уладзімір Ільіч склаў адпаведныя дакументы. Сялянка падала на кулака скаргу, і гэтая справа вырашылася на карысць сялянкі.

## *Чацвёртая частка віны*

Быдла шушанскага кулака зламала паскоціну — загарадку, куды заганяюць кароў, і, улезшы ў шкоду, параскідала бабкі і парастрэсла на полі снапы багацея Зацэпіна. Хоць Зацэпін быў і дужа заможны чалавек, але даравацъ такую шкоду ён не мог. Падаў у суд. Там завялася маленькая, як моль, судовая справа. Супроць быдла? Не! Супроць кулака? Не! Справу пачалі супроць селяніна-бедняка Пропнікава, які гарадзіў гэты ўчастак паскоціны. Кажуць, на судзе Пропнікаў, здзіўлены і разгублены, казаў:

— Паны суддзі, хоць я ў гэтай справе і не вінаваты, але згодзен сплаціць Зацэпіну чацвёртую частку шкоды. Толькі пры адной умове: калі саўдзельнікі гэтага злачынства таксама заплацяць астатнія часткі — кожны за сваю віну.

— Цікава,— заўсміхаліся суддзі,— хто ж гэта быў тваім саўдзельнікам? Расказвай, Пропнікаў!

— Першым маім саўдзельнікам было жардзё. Гэта ж яно вінавата, што не ўтрымала быдла, што паддалося і зламалася. Значыць, жардзё сплачвае адну частку.

У зале нехта прыглушана засмяяўся, але, спахапіўшыся, хуценька задушыў смех у кулаку.

— Другую частку хай плаціць зямля. У тым, што пад націскам быдла павывернулася колле, я лічу, вінавата толькі яна. Хіба не магла зямля ўтрымаць нейкага звычайнага коліка?

У зале ўжо зарагаталі.

— І асноўную частку павінен усё-такі сплаціць бык. Гэта ж ён быў завадатарам, бунтаўшчыком — гэта ж бык першы пачаў ламаць паскоціну. А хіба я вінаваты, што быдла не асудзіла яго за гэта, а само палезла ў зацэпінскія снапы? Яно, калі разабрацца, дык гаспадар павінен падзяліць віну з быком — кулак жа тут сам вінаваты: навошта ж ён нагадаваў такіх быкоў-хуліганаў? Ну, а астатняе магу ўжо сплаціць і я.

Але суд не прыслухаўся да выступлення Пропнікава. Суддзі абавязалі яго, невінаватага, заплаціць Зацэпіну вялікую суму грошай.

Дачуўся пра гэтую справу Ленін. Яна яго вельмі абурыла. Уладзімір Ільіч склаў доказную скаргу на рашэнне суда. У выніку Пропнікава поўнасцю вызвалілі ад матэрыяльнай адказнасці.

## *Уцёкі з суда*

Уладзімір Ільіч сябраваў з шушанскім бедняком Сасіпатычам — Іванам Восіпавічам Ермалаевым. Хадзіў з ім на паляванне, любіў паслухаць гэтага разважлівага селяніна. Па жонцы ён нават даводзіўся кумам гэтаму бедняку — Надзежда Канстанцінаўна была хросная маці сыну Ермалаева. А які гаварун быў гэты Сасіпатыч, які весялун! Яго запрашалі па ўсе бяседы, бо ўжо неяк аддаўна павелася, што, калі на вяселлі ці на хрэсьбінах ёсць Сасіпатыч, такую бяседу не можа сурочыць нават самае дрэннае вока.

Ермалаеў паскардзіўся ў суд на вялікія паборы царскіх чыноўнікаў. У судзе гэтай скаргі спалохаліся: там разумелі, што яна вельмі абгрунтаваная, але вырашаць яе на карысць Ермалаева было нельга. Калі б гэтую справу выйграў бядняк — колькі б такіх скаргаў пасыпалася з усіх воласцяў! Трэба было неяк адмовіць. Але як?

У судзе вырашылі запатрабаваць у Ермалаева шматлікія судовыя дакументы, скласці якія мог толькі дужа вопытны юрыст. Яны ведалі, што такога чалавека не толькі ў Шушанскім, але і ў самім Мінусінску няма. І памыліліся.

Усе гэтыя дакументы склаў Уладзімір Ільіч. У Мінусінску адразу ж заўважылі: за амаль непісьменным селянінам Ермалаевым, які нават распісацца і то ледзь можа, стаіць вопытны юрыст. Там пайшлі на хітрасць.

— Ай, як хораша складзены ўсе паперы,— пахвалілі Ермалаева ў судзе.— Хто ж гэта табе іх складае?

Звычайна Сасіпатыч у такіх выпадках памятаў просьбу Леніна не казаць, хто вядзе справу, і гаварыў:

— Сам пісаў. Трохі з пісарам параіўся.

А тут, мусіць, яго так расчуліла і ўзрадавала пахвала, што ён, забыўшыся на ўсе перасцярогі, весела адказаў:

— А гэта пісаў наш Уладзімір Ільіч Ульянаў.

І спахапіўся. Але ўжо было позна. Ласкавы судовы чыноўнік аж пазеляпеў.

— Хто? Ульянаў?! Ды ты ведаеш, маць тваю за нагу, што я цябе пад суд аддам? Пад суд! Ульянаў яму піша! А ты ведаеш, хто такі Ульянаў? Ды гэта ж палітычны ссыльны, якому законам забаронена займацца судовай практыкай!

Ермалаеў не на жарты перапалохаўся. Схапіў свае прашэнне — і дай бог ногі! Потым ён расказваў Ільічу:

— Тутай он, поперёк ему дышлом, как закричит! Вижу — надоть убегать, пока еще не в кутузке.

Уладзімір Ільіч спачатку зазлаваў, што Ермалаеў, забыўшыся на перасцярогу, выдаў яго, а потым, успамінаючы ўсё новыя і новыя падрабязнасці паспешлівых уцёкаў Сасіпатыча з суда, весела смяяўся разам з ім.

## *Ядры яго ў корань*

Былі і дзіўнаватыя хадакі.

Гэты прыйшоў у Шушанскае аж за дваццаць вёрст. Прыйшоў да Уладзіміра Ільіча параіцца і скласці адпаведныя паперы, каб засудзіць зяця.

— А чым жа ён правінаваціўся, ваш зяць?

— Правінаваціўся, ядры яго ў корань, дужа правінаваціўся. Пакрыўдзіў мяне, старога. Разумееш, Ільіч, спраўляў вяселле сваёй дачкі, а маёй, значыць, унучкі, а мяне не паклікаў. А на вяселлі ж, кажуць, дужа здорава гулялі...

— А ў зяця ёсць яшчэ дзеці?

— Ёсць. Дзяцей у яго хапае...

— Вось і новыя вяселлі будуць.

— Будуць-то будуць. Але ж на гэтым, ядры яго ў корань, здорава гулялі! Давай усё-ткі засудзім яго.

— Ну, а вам не шкада дачкі свае будзе? Дзяцей яе? Ды і самога зяця?

— Яно-то шкада, ядры яго ў корань. Але ж на вяселлі без мяне так здорава гулялі...

— А цяпер, калі прыедзеце да яго, зяць вам чарку падпясе?

— Паднясе! Ды яшчэ якую паднясе! — разышоўся быў стары, але тут жа спахмурнеў: — Але ж гэта будзе не на вяселлі, ядры яго ў корань...

«І Уладзімір Ільіч ледзь не гадзіну патраціў, пакуль угаварыў мужыка з зяцем памірыцца»,— успамінае пра гэты выпадак Надзежда Канстанцінаўна.

Іду па пасёлку, кіруюся на Жураўліную горку, дзе бываў Ленін. Рашыў не чакаць чарговага аўтобуса з экскурсантамі і пехатою прайсціся дарогаю, па якой у той далёкі час хадзіў Ільіч.

Вуліца носіць імя Леніна. Так, гэта вуліца, сярод іншых, мае большае права называцца яго імем: па ёй Ленін

хадзіў на паляванне, па ёй вяртаўся дадому, праблукаўшы цэлы зімовы дзень, але так нічога і не застрэліўшы. Гэта вуліца часта вадзіла Ільіча на Жураўліную горку — яго ўлюбёнае месца адпачынку, дзе вельмі ж ужо хораша думалася, марылася, успаміналася.

Хаты пасёлка, якія ў цэнтры пазбіваліся ў кучу (мусіць, каб зімою было цяплей), на ўскраіне паступова адсоўваюцца адна ад адной, разбягаючыся ўсё далей і далей — тут адна, там другая,— а вось ужо і апошняя хата, нібы з разбегу, спынілася на невялічкім пагорку і, бліскаючы шыбамі, здзіўлена глядзіць у поле.

Гарадская вуліца незаўважна перайшла ў палявую дарогу. Паўз мяне з песнямі прабег аўтобус — раннія экскурсанты вярталіся ўжо ў Шушанскае. А вось і лес... Можа гэта якраз той лес, пра які часта ўспамінаў у пісьмах Ленін і які мясцовыя жыхары ўрачыста звалі борам?

Жураўліная... Па сыпкім белым пяску, паміж соснаў, па агаленым і адтаптаным карэнні, якое вельмі ж хораша замяняе прыступкі, узнімаюся на вяршыню. Як далёка відаць адсюль! Вось гэта разлегласць! Тут і напраўду кожны можа паверыць, што ў чалавека некалі былі за спіною крылы...

Будан ля возера Пярова. Аж тут бываў Уладзімір Ільіч на паляванні. У першы год яго ссылкі восень стаяла цёплая, ласкавая. Светлыя дні, цешачыся апошняй сонечнай цеплынёй, лашчыліся, нібы кацяняты, да кожнага дрэва, да кожнай травіны. Уладзімір Ільіч прывучыў зыранаўскага сабаку хадзіць з ім на паляванне. І той аддана служыў паляўнічаму, злосна паглядаючы на маладзенькага Пегаса, якога Ленін гадаваў сабе. Часам і гырчаў, калі яму здавалася, паляўнічы завельмі многа ласкі аддаваў гэтаму шчанюку.

Уладзімір Ільіч купіў сабе стрэльбу. Колькі было валтузні, паперак, прашэнняў, пакуль яму, адміністрацыйна-ссыльнаму, улады дазволілі купіць стрэльбу! Ды і нацешыцца ёю Ільіч не паспеў: стрэльба выпадкова выслізнула з рук, ударылася аб лёд — і руля раскрышылася: мусіць, несумленны майстар зрабіў яе з чыгуну. На паляванне Ленін хадзіў з чужою стрэльбаю — сяляне з ахвотаю давалі яму сваё паляўнічае начынне. Потым, ужо ў кастрычніку, Ільіч пісаў:

«Надвор'е прыходзіць зімовае, даўно ўжо мы закупорыліся за падвойнымі рамамі, палім у печах і г. д. Між іншым, вялікія халады яшчэ наперадзе, а да гэтага часу

пераважалі асенція дзянькі, калі можна з прыемнасцю пабадзяцца са стрэльбаю па лесе. Я і зімою, мусіць, не пакіну гэтага занятку».

І зімою ён хадзіў па лесе, грузнучы вышэй каленяў у шчодрых сібірскіх сумётах — так, што аж стрэльба за плячыма станавілася прыкладам на снег. Вось у гэткім будане ён, здарожыўшыся, засоўгаўшыся, адпачываў. Вось тут гарэла цяпельца. На гэтым таганку вісела вядро, у якім булькаў чай. А ён ляжаў на саломе, адчуваючы, як радуюцца спакою ногі.

Ля будана многа людзей. Экскурсанты, да якіх далучыўся і я з дзецьмі, выбіраюць месца бліжэй да экскурсавода, засяроджана заглядаюць у будан, мацаюць рукамі таганок і задумліва адыходзяць.

Экскурсантам, наогул, як дзецям, можна гаварыць выключна ўсё, і яны выключна ўсяму верацць.

І якая гэта добрая чалавечая рыса — даверлівасць! Як сумна было б без яе.

Лесам іду да возера Пярова. Вунь яно стомлена блішчыць у тумане. Возера памірае. У яго не стае ні сілы, ні вады, каб змагацца з асакою, якая так настойліва напірае — дайшла ўжо да самай сярэдзіны. Яшчэ ў той час, калі кукуруза раскашавалася нават на сібірскіх гонях і, нібы пані, патрабавала да сябе выключнай увагі, сяляне змушаны былі запрудзіць рэчку Ермалаеўку, каб напаіць кволыя парасткі гэтай культуры. А Ермалаеўка паіла возера Пярова, і без яе вады яно пачало задыхацца. І як добра, што ёсць ужо рашэнне зноў павярнуць Ермалаеўку на яе даўняе рэчышча і выратаваць возера.

На самым беразе цвіце, гайдаецца вельмі ж прыгожая кветка. Ды нават і не кветка — адразу цэлы букет: доўгую сцяблінку паабселі жоўтыя і карычневыя, блакітныя і белыя, чырванаватыя і зялёныя кветкі. Працягваю руку, каб сарваць яе. Кветкі адрываюцца ад сцябліны і, паспешліва замахаўшы крыльцамі, разлятаюцца ў розныя бакі.

Гэта былі мятлушкі, якія выпадкова сабраліся на адной сцябліне...

Зноў у Шушанскае я вяртаўся пехатою.

Можа якраз вось такою ляснoй сцяжынкаю, якраз адсюль, з-пад Пярова, вяртаўся ён з палявання і ў той халаднаваты яшчэ дзень на пачатку мая 1898 года. Здалёку Уладзімір Ільіч убачыў, што ў яго пакоі гарыць святло, і здзівіўся: што здарылася? Звычайна, калі яго не было дома, на стале кватаранта ніхто не запальваў лямпу, і шы-

бы заўсёды сустракалі яго халаднаватай цемнатою. А тут пакой нібы нечаму ўзрадаваўся — ярка свеціць усімі сваімі пяццю вокнамі.

Ільіч пайшоў хутчэй. Апалон Далмантавіч, сустрэўшы яго ля веснічак, хітравата ўсміхаючыся, сказаў:

— А гэта прыйшоў Аскар, п'яны-п'яны, усе вашы кнігі параскідаў па падлозе, а цяпер ляжыць на іх і песні спявае.

Уладзімір Ільіч зазлаваў — гэтага яшчэ не хапала! Няўжо Аскар Энгберг, фін, пуцілаўскі рабочы, таварыш па ссылцы, сапраўды так напіўся?

Уладзімір Ільіч хуценька ўзбег на ганак, узяўся за клямку...

«Тут я яму насустрач выйшла»,— успамінае пра той вечар Крупская. А гэта якраз яе прыезду радаваўся ўсімі вокнамі Ільічоў пакойчык.

Елізавета Васілеўна, маці Крупскай, убачыўшы Леніна, які тут крыху паправіўся, заўважыла:

— Ну і разнесла ж вас! На вуліцы б не пазнала...

Уладзімір Ільіч пазнаёміўся з Надзеждай Канстанцінаўнай чатыры гады таму назад на сходзе рускіх марксістаў, які праводзіўся пад выглядам святкавання масленіцы. Крупская была яго нарачонаю. І таму, калі Уладзімір Ільіч у пісьме прапанаваў стаць яго жонкаю, Надзежда Канстанцінаўна жартаўліва адказала: «Ну што ж, жонкаю дык жонкаю».

Яшчэ перад гэтым, калі Ленін сядзеў у «прадварылцы», яна па яго просьбе падоўгу прастойвала на марозе на рагу Шпалернай вуліцы: Ільіч спадзяваўся, што, калі яго будуць весці на прагулку, ён хоць мімаходзь, праз калідорнае акно зможа ўбачыць яе. Але гэтае незвычайнае спатканне так ніводнага разу і не адбылося. Аказваецца — якраз таго рога вуліцы з акна не было відаць. Ільіч тады так і не ўбачыў Надзежду Канстанцінаўну, хоць яна штодзень, у час, калі павінна быць прагулка, акуратна прыходзіла на рог Шпалернай вуліцы.

Арыштаванаму Ільічу не трэба было шукаць для рэвалюцыйнай сувязі падстаўной нарачонай, як гэта рабілі тым таварышам, у каго не было сваякоў: у Леніна была сапраўдная нарачоная — Надзежда Канстанцінаўна.

Здаралася, у некаторых рэвалюцыянераў падстаўныя нарачоныя потым рабіліся добрымі, мілымі жонкамі. Як

гэта, скажам, было з Анатолем Ванеевым, сябрам Леніна па «Саюзе барацьбы», суседам па ссылцы — ён адбываў тэрмін непадалёк ад Шушанскага, у сяле Ермакоўскім.

Анатоля арыштавалі. У яго не было сваякоў, і таму Крупская ўгаварыла Дамініку Трухоўскую, дзяўчыну, якую Ванееў зусім не ведаў, назвацца нарачонай, каб хадзіць да яго на спатканні. І вось першая сустрэча.

— Толя, добры дзень. Бачыш, твая нарачоная Ніка (трэба ж было абавязкова сказаць сваё імя) нарэшце знайшла цябе. А які ж ты бледненькі стаў! Як хацелася б мне цябе смачна, як некалі раней, пакарміць...

Дзяўчына хвалявалася, што Ванееў не зразумее, не здагадаецца. Але Ванееў, вопытны канспіратар, усё зразумеў:

— Дзень добры, Ніка! (Як цудоўна, што яна здагадалася сказаць сваё імя!) Як я цябе чакаў! Як ты мне патрэбна! Добра, што, нарэшце, ты атрымала пропуск. Ну, расказвай, што ў вас новага...

Яны так проста і натуральна гаварылі, што нават стражнікі, якія да ўсяго ставяцца падазрона, не заўважылі ў размове гэтых зусім незнаёмых людзей ніякага фальшу. Потым Дамініка Трухоўская стала жонкаю Ванеева і прыехала разам з ім і ў Сібір, у ссылку.

Надзежда Канстанцінаўна з'явілася ў Шушанскім разам са сваёю маці Елізаветай Васілеўнай — стомленай, але не зломленай жыццём жанчынай, якая прывыкла ўжо да свайго незайздроснага лёсу. Муж яе, Канстанцін Крупскі, усё сваё жыццё змагаўся з самавольствам і дэспатызмам царскіх улад, не хацеў праводзіць русіфікатарскую палітыку, выступаў супраць прыгнёту палякаў. Яго, начальніка Горацкага павета Варшаўскай губерні, звольнілі са службы і аддалі пад суд. У абвінавачанні нават гаварылася, што Крупскі апалячыўся — маўляў, гаворыць з падначаленымі па-польску і нават (якая небяспека для ўлад!) танцуе мазурку. Праўда, сенат апраўдаў яго. Але апраўдаў тады, калі ўжо яго можна было не баяцца — пасля дзесяці год блуканняў без работы разам з жонкаю і малой Надзечкай ён, былы асэсар, змучаны і хворы, так і памёр непадзейным і быў пахаваны на могілках для самых бедных... І вось цяпер дачка... Таксама ссыльная, таксама непадзейная.

Колькі ім, маткам рэвалюцыянераў, даводзілася перажыць за сваіх неспакойных сыноў і дачок! Здавалася б, пасля стольніх арыштаў і турмаў матчына сэрца павінна

было б прывыкнуць да гэтага, але яно кожны раз як бы зноў абрывалася, пачуўшы пра новую сынаву ці даччыну бяду.

А Марыя Аляксандраўна, маці Леніна! Здараліся дні, калі яна, маючы такую сям'ю, аставалася адна-адною, бо ўсе дзеці былі ў руках у паліцыі: адны былі арыштаваны, другія — сасланыя, трэція — сядзелі ў турме...

Сёння для нас Уладзімір Ільіч настолькі вялікі, што ўжо неяк не верыцца, што родным ён быў проста Валодзя, Валодзечка. А ў маці ён быў толькі Валодзечка — якую б пасаду ні займаў чалавек, які б вялікі ні быў ён для іншых — для маці і правадыр і геній заўсёды астаецца толькі сыночкам, пра якога трэба клапаціцца.

Валодзечку трэба этапам дабірацца ў Сібір, і яна ўжо бегае, дабіваецца, каб яму дазволілі ехаць у Шушанскае за свой кошт, цягніком. І засмучаецца, дазнаўшыся, што сын не хоча вылучацца сярод таварышаў і збіраецца ехаць толькі этапам, толькі з сябрамі. Яна чула, як нехта са знаёмых старых рэвалюцыянераў, які хадзіў ужо так у Сібір, казаў: «Ссылку мог бы паўтарыць, этап — ніколі...» І як яна радуецца, калі пасля яе ўгавораў сын усё ж едзе ў ссылку цягніком...

Валодзечка ў Стакгольме. Яна спецыяльна едзе туды, каб пабачыцца з ім. Пасля сустрэчы сын праводзіць маці толькі да прыстані. На палубу парахода ўзысці ён не можа: параход належыць рускай кампаніі, параход — гэта ўжо Расія, а там, у Расіі, яго могуць арыштаваць. І колькі невыказнай тугі зноў хаваецца за сумысле падвяселенаю ўсмешкаю ў глыбокіх матчыных вачах!

А даведаўшыся, што па ўсіх рэвалюцыйных справах Ленін гаварыў з маці як з роўным, шкадуеш, што яна памерла ў 1916 годзе, так і не дачакаўшыся таго часу, калі яе Валодзечка — Уладзімір Ільіч — стане на чале новай дзяржавы.

Але пакуль што яе Валодзечка другі год у ссылцы. Пасля прыезду Надзежды Канстанцінаўны дні сталі весялейшыя, хоць клопатаў напачатку пабольшала. Крупскай дазволілі адбываць ссылку ў Шушанскім, але папярэдзілі, што, калі яна зараз жа не возьме шлюб з Ульянавым, яе зноў адправяць ва Уфу, куды па прыгавору яна і павінна была ехаць.

Трэба было тэрмінова браць шлюб.

А каб шлюб лічыўся сапраўдным, трэба было абавязкова вянчацца ў царкве.

А каб вянчацца ў царкве, патрэбны былі шлюбныя заручальныя пярсцёнкі — без іх поп Іаан пра вянчанне нават і слухаць не хацеў.

А каб дакласці губернатару, што шлюб узядзены, трэба было абавязкова запісаць у царкоўнай кнізе, як усё гэта адбывалася.

А каб зрабіць гэты запіс, патрэбен быў артыкульны спіс — асабовая справа ссыльнага.

«Наконт нашага вяселля справа трохі зацягнулася,— піша Уладзімір Ільіч маці.— Прашэнне аб высылцы неабходных дакументаў я падаў амаль месяц назад і ў Мінусе сам хадзіў даведацца ў спраўніка аб прычынах валакіты. Высветлілася (сібірскія «парадкі»), што ў Мінусе няма да гэтага часу майго артыкульнага спісу,— хоць я ўжо другі год у ссылцы!! (Артыкульным спісам называецца дакумент аб ссыльным; без гэтага дакумента спраўнік не ведае пра мяне нічога і не можа выдаць мне пасведчанне)...»

Нарэшце прыйшоў артыкульны спіс. Былі гатовы і пярсцёнкі — тут маладым памог былы токар Аскар Энгберг, якому Надзежда Канстанцінаўна прывезла набор ювелірных інструментаў. Ён зрабіў тыя два просценькія медныя пярсцёнкі, якія захоўваюцца ў Маскве ў музеі Леніна і якія да стагоддзя Уладзіміра Ільіча абяцаюць перадаць Шушанскаму мемарыялу.

І вось нарэшце ў «Метрической книге, данной из Енисейской Духовной Консистории причту Шушенской Петро-Павловской церкви для записи родившихся, браком сочетавшихся и усопших в 1898 году» з'яўляецца наступны запіс:

«10 июля 1898 г. сочетались браком Владимир И. Ульянов, первым браком, 28 лет, административно-ссыльной, с Надеждой К. Крупской, административно-ссыльной, 29 лет. Кто совершил таинство: священник Иоан Орестов и псаломщик Паркис Тыжнов. Кто был поручителями: у жениха — Томский мещанин Иониккй Иванов Завёрткин и крестьянин Шуши Симон Афанасьев Ермолаев; по невесте — крестьянин из Шуши Степан Николаев Журавлёв».

Гартаю метрычную кнігу. Якой даўніною павявае ад яе! Хочацца пабачыць тую шушанскую царкву, пабыць там і ўявіць, як стаялі пад вянцом двое гэтых непапраўных бязбожнікаў, а святар Іаан «совершал таинство»... Але царквы няма — даўнавата ўжо, як яе разбурылі. Ха-

целі з царкоўнай цэглы пабудаваць сельскагаспадарчы тэхнікум. Разбіць-то сцены разбілі, але аддзяліць цагліны не змаглі — так і вывезлі гэтыя сцэментаваныя глыбы за горад... Шкада, што царквы няма. Як бы сёння яна была дарэчы ў мемарыяльнай зоне старога Шушанскага!

— А ці варта яе шкадаваць, царквы той,— гаварылі мне ў Шушанскім.— Уладзімір жа Ільіч прымусова ў ёй вянчаўся.

І мне здалося, што сёй-той нават ці не саромеецца гэтага факта ў біяграфіі Ільіча і не ведае, што з ім рабіць: маўляў, як гэта — правадыр, атэіст, і раптам вянчанне ў царкве?

А што тут дзіўнага? Смешна было б каго-небудзь пераконваць, што прымусовае вянчанне ў царкве не зрабіла ніякага ўплыву ва антырэлігійныя погляды Леніна. Таксама як і тыя абразы, якія віселі ў хатах Зыранава і Пятровай, дзе жыў Ленін у ссылцы. Як і такое даскапалае веданне закону божага, па якім заўсёды ў час вучобы ён атрымліваў адны пяцёркі...

Вось ужо маладыя і згулялі вяселле. Уладзімір Ільіч прасіў спраўніка дазволіць яму запрасіць на ўрачыстасць сваіх сяброў — ссыльных, што жылі ў Цесі і Ермакоўскім. Але той катэгарычна адмовіў:

— Ніякіх ссыльных! Ведаем мы вашага брата. Вунь Райчын у Мінусе, таксама з ссыльных, папрасіўся ў вёску на месяц, а мы яшчэ і сёння ніякіх слядоў знайсці не можам, дзе ён...

Маладыя згулялі вяселле без сяброў. Скончылася адзінота — з Надзеждай Канстанцінаўнай Ленін хадзіў у грыбы, на паляванне, разам яны адпачывалі на Жураўлінай горцы. Разам яны перакладалі з англійскай мовы кнігу Сіднея і Беатрысы Веб «Тэорыя і практыка англійскага трэд-юніянізму».

Дарэчы, Крупская напісала адсюль многа пісем, якія вельмі ж ужо хораша расказваюць пра той час.

«Мы з мамай удзвюх ваявалі з рускай печчу. Спачатку здаралася, што я абарочвала вілкамі суп з клёцкамі, якія рассыпаліся на сподзе. Потым прывыкла».

Гэта пра першыя крокі маладой гаспадыні.

«Валодзя спачатку заявіў, што не любіць і не ўмее грыбы збіраць, а цяпер яго з лесу не выцягнеш, прыходзіць у сапраўдную «грыбную раз'юшанасць».

Гэта пра захапленне Уладзіміра Ільіча. Крупская пі-

сала, што ён аддаваўся канькам, паляванню, лыжным прагулкам з запалам юнака.

«Налета збіраемся заводзіць агарод. Валодзя падахвоціўся ўжо грады капаць».

Гэта пра планы.

«Тут усе захапляюцца гаспадаркаю, нават і мы былі завялі паўканя (адзін з тутэйшых абываталяў узяў у воласці пад распіску каня, мы хацелі купляць яму корм і за гэта маглі б карыстацца канём колькі трэба), але нашы паўканя аказаліся такім з'езджаным канём, які тры вярсты вязе паўтары гадзіны, давялося вярнуць яго назад, і гэтае наша гаспадарчае мерапрыемства пацярпела фіяска».

Гэта пра рэалізацыю некаторых «планаў». Колькі гумару ў гэтым пісьме. А вось як тонка Надзежда Канстанцінаўна расказвае пра паляванне:

«Пасля зімовых маразоў бурна абуджалася вясною прырода. Моцнай рабілася яе ўлада. Заход сонца. На вялізнай вясновай лужыне ў полі плаваюць дзікія лебедзі. Ці стаіш на ўскраіку лесу, бурліць рэчка, такуюць цецерукі. Уладзімір Ільіч ідзе ў лес, просіць патрымаць Жэньку. Трымаеш яе, Жэнька калоціцца ад хвалявання, і адчуваеш, як цябе захоплівае гэтае бурнае абуджэнне прыроды»...

Ссылка пераваліла за палавіну. Цяпер ужо ў ссыльным календары ўсё таўсцеў і таўсцеў стос адбытых тут дзён і прыкметна меншала дзён, якія трэба было яшчэ адбыць. Цяпер ужо Уладзімір Ільіч з ахвотаю разглядаў карты, на якія яшчэ нядаўна не мог глядзець: тады было балюча, што вось гэтыя чорныя кропачкі — Пецярбург, Масква, Парыж — так далёка адсюль. А цяпер раптам гэтыя кропачкі напоўніліся гарадскім шумам, цоканнем конскіх капытоў, людскімі «дзень добры!» — адным словам, напоўніліся сапраўдным жыццём, у якім хутка зможа растварыцца і ён.

Уладзімір Ільіч многа піша. Нярэдка ён чытае напісанае Крупскай — маўляў, ці даступна выкладзена. Надзежда Канстанцінаўна спрабуе быць самым някемным чытачом, але асабліва прыдзірацца няма да чаго — усё проста, зразумела.

А напісаўшыся, стаміўшыся, Ленін адпачывае. Скажам, майструе шахматы з сасновай кары. І тут кліча на дапамогу Надзежду Канстанцінаўну:

— А якую галаву зрабіць каралю?

— Ну, вядома, страшную. Ці можа такую з бародкаю, як у нашага цара?

— Не, калі рабіць нашага Мікалая, то толькі безгаловым.

Ён можа зрабіць любога караля з якой хочаш галавою. Можа адразу ж і пакараць карапаванага — зняць пожыкам з яго галавы шурпатую карону. А можа выпадкова замест каралеўскай галавы выйдзе галава стражніка, які, здараецца, падыходзіць пад яго асветленае акно.

— А якую талію зрабіць каралеве?

— Ну, каралеву трэба рабіць прыгожай. І талію — тонкую-тонкую. Жонка ж часам не вінавата, што яе муж кароль...

Ленін сустракаўся з ссыльнымі сябрамі. Дзіўна, але Уладзімір Ільіч, будучы пад строгім паліцэйскім наглядам, змог пабываць амаль ва ўсіх мясцінах, дзе і па адным, і цэлымі калоніямі жылі сасланыя рэвалюцыянеры. Для сустрэч выдумляліся самыя разнастайныя прычыны — часам нават і неверагодныя.

Для паездкі ў Ермакоўскае, куды, каб заявіць свой пратэст эканамізму, сабраліся 17 ссыльных (цэлы невялікі з'езд!), прычына знайшлася якраз добрая — дзень нараджэння дачкі Лепяшынскага.

Каб з'ездзіць у Цесь і пагаварыць з Глебам Кржыжаноўскім і Базілём Старковым, Ленін жартам напісаў спраўніку, што ў гэтым сяле ёсць цікавая ў геалагічных адносінах гара, якую ён хоча, маўляў, даследаваць — а што, калі ссыльны на карысць цару і айчыне адкрые там карысныя выкапні? Спраўнік спецыяльным пасланцом прыслаў дазвол, а заадно падказаў узяць сабе ў памочнікі яшчэ і жонку...

Дазвол наведаць Краснаярск Уладзіміру Ільічу памог атрымаць хворы зуб. Але не толькі дантыст цікавіў Леніна. Ён чакаў сустрэч з сябрамі, спрэчак, дыскусій, кніг, навін. Таму і зразумела, што ў апошнія перад ад'ездам дні ён быў увесь у клопатах. Вярнуўся адтуль радасны і вясёлы — нагаварыўся, наспрачаўся, наслухаўся на цэлы год!

Усе рады былі яго ному вяртанню. Асабліва Мінька, шасцігадовы сын катаннічыка — латыша Кудума, батрака, які жыў у флігелі Пятровых. Ён успароўся ні свет ні зара і, пачуўшы, што прыехаў Уладзімір Ільіч, хуценька схапіў матчыны боты, бацькаву шапку і бягом кінуўся з хаты.

— Куды ты ў такую рань? — хацела стрымаць яго маці.

— Як — куды? Уладзімір жа Ільіч прыехаў!

— Дык яшчэ ж рана. Няхай адаспіцца з дарогі. Пазней сходзіш.

— Э не! Дзядзя Валодзя мяне любіць. Ён хоча са мной пагаварыць. Адаспіцца потым.

Уладзімір Ільіч прывёз яму цацачнага каня. Мінька ўзрадаваўся гэтаму падарунку, увесь час хваліўся ім перад Жэнькам (на, сабака, паглядзі), нават спрабаваў пасадзіць калматага на каня і пракаціць па хаце. А потым, расчулены і ўдзячны, нават і ўвечары не пайшоў дадому і ўлёгся спаць на палавіку — паміж канём і Жэнькам.

Маці Мінькі не пускала сына — думала, што ён перашкаджае Ільічу працаваць. Але Мінька яшчэ прыцемкамі ўмудраўся вышмыгнуць з хаты — у дзядзі Валодзі ён бываў амаль штодзень.

Шэрая зімовая раніца. Праз замураваныя вокны ледзь прабіваецца і так рэдкае яшчэ святло. Пад печчу, адчуўшы раніцу, засакаталі гаспадынiны куры. І раптам настойлівы стук у дзверы:

— Паша, адчыняй!

Паша Мезіна, чатырнаццацігадовая сялянская дзяўчынка, якая жыла ў Леніна і Крупскай, спрабуе адгаварыць ранняга госця:

— Чаго ты грыміш? Уладзімір Ільіч яшчэ спіць.

— Адчыняй, кажу! Я прыйду і дзядзю Валодзю разбуджу. Уладзімір жа Ільіч мяне любіць.

— Не затрымлівай госця, Паша, пусці яго ў хату,— са свайго пакоя гаворыць Уладзімір Ільіч.

Расчыняюцца дзверы, і на парозе з'яўляецца бледнаваты тварык і ясныя, вясёлыя вачаняты, якія пераможна глядзяць на Пашу — маўляў: «А што я табе казаў? Бачыш, як мяне Уладзімір Ільіч любіць». Ён у цёплай матчынай кофце, захутаны вялікім шалікам, на адной назе — бацькаў бот, на другой — матчын валёнак. Мінька радасна паведамляе ўсім:

— А вось і я!

Яшчэ да паездкі ў Шушанскае, чытаючы пісьмы і ўспаміны Крупскай, я настолькі палюбіў Міньку, гэтага маленькага жэўжыка, што вельмі ж хацелася даведацца, кім ён стаў, калі вырас, дзе жыве і што робіць. Але тут ужо мне расказалі, што Мінька праз паўтара года пасля ад'-

езду Леніна і Крупскай з Шушанскага памёр. У Кудума да гэтага памерла 13 дзяцей. Мінька быў чатырнаццаты, апошні...

У Шушанскім жыве яшчэ дачка Пятровай, якая добра памятае Леніна. Ганне Сямёнаўне Сяродкінай ужо 88 гадоў.

Вялікая кашміровая хуста, завязаная пад бараду, доўгая спадніца, сукаваты кіёк у маршчыністых старэчых руках. Ганна Сямёнаўна сядзіць на лаўцы пад сваімі вокнамі і расказвае:

— Гэта ўжо многа гадоў таму, як Уладзімір Ільіч і Надзежда Канстанцінаўна са сваёй маці пераехалі да нас на кватэру. Рэчаў у іх было мала, затое вельмі многа кніг. Хоць даўно гэта было, але як цяпер помню Уладзіміра Ільіча — малады ён яшчэ быў, хадзіў хутка. Надзежду Канстанцінаўну ўспамінаю таксама маладой, тонenькаю, з прыгожаю доўгаю касою, з яснымі ласкавымі вачыма. Такая ветлівая і сціплая. Заўсёды пры сустрэчы з намі ўсміхалася, і ўсмешка ў яе была добрая. Уладзімір Ільіч рэдка да нас заходзіў — усё быў заняты работаю. А калі сустрэнемся, бывала, у двары, то абавязкова павітаецца, пагаворыць пра гаспадарку, пра нашы справы распытае.

Вельмі многа яны працавалі. Заўсёды можна было бачыць Уладзіміра Ільіча і Надзежду Канстанцінаўну ля акна — увесь час яны чыталі ці пісалі, днём і ноччу. Жылі яны проста і сціпла. Мы далі ім кухонны посуд, сваю простую вясковую мэблю. Зрабілі драўляныя ложкі, сеннікі свае яны самі набілі саломаю.

Каля двух гадоў пражылі яны ў нас і паехалі, калі скончыўся тэрмін ссылкі Уладзіміра Ільіча. Шкада было расставацца з імі. Кватарантамі сваімі мы ганарыліся перад усім сялом. Ды і людзі ўсе вельмі паважалі і любілі іх...

Гэтыя ўспаміны Ганны Сямёнаўны Сяродкінай былі некалі запісаны і надрукаваны на машынцы. Але нядаўна студэнткі ўзялі іх ды і забыліся аддаць. Таму Ганна Сямёнаўна цяпер ужо трохі недаверліва ставіцца да экскурсантак.

Потым яшчэ я гаварыў з Рыгорам Андрэевічам Блахіным. Ён толькі на адзін год маладзейшы за Сяродкіну і таксама памятае Леніна.

— Праўда, ён нам, маладым, дужа не адкрываўся. Ну, толькі ўсё казаў: «Вучыцца нада».

І дзед Рыгор, падпеазаўшы сваю шэранькую картовую кашулю шырокай папругаю, расказвае толькі тое, што ведае:

— Ульянаў першы пачаў катацца на каньках. Да яго ж у нас ніхто не катаўся. Нават ніхто і канькоў тых не бачыў. А ён расчысціў лёд на Шушы, каток там зрабіў. Сам рукі ў кішэні — і ездзіць. Ды быстра так — аж лёд шыпіць. Крупская, дык тая спачатку не ўмела, вучылася толькі. Бывала, упадзе, засмяецца ды і кажа: «Я на коньках па-курынаму хаджу». А дзеці, бывала, са ўсяе Шушы збяруцца, каб паглядзець на гэтую навіну, бегаюць вакол, галёкаюць. А з імі і сабака Уладзіміра Ільіча — здаецца, Жэнька яго звалі,— вішчыць ад радасці, то падае, паслізнуўшыся на лёдзе, то торкае пысу ў снег, нібы цецерука хоча адтуль выпараць. А нашы мужыкі ды бабы таксама пазбяруцца ля катка, глядзяць, як на дзіва нейкае, кедравыя арэхі лускаюць, шалупінне на лёд кідаюць. Доўга ўсё глядзелі. А потым і самім заманулася пакатацца. Уладзімір Ільіч паказаў, як рабіць канькі-самаробкі. І тады нашы хто старую касу-літоўку паламае напал, а кавалкі па самыя абадкі ўваб'е ў калодачкі, хто серп стары ўгоніць — і катаюцца...

Ссыльны Ян Праміпскі — сын Лукаша, яго жонка Тэкля, шасцёра іх дзяцей часта бывалі ў Леніна і Крупскай. З самім Янам Праміпскім Уладзімір Ільіч хадзіў на паляванне, спяваў песні, ладзіў маёўкі. Вельмі клапаціўся Ленін і пра дзяцей рэвалюцыянера: то ён турбуецца, што ў іх няма дзіцячых кніг; то, збіраючыся ў Краснаярск, плануе купіць яго дачцэ крамніны на кофтачку... Соф'я і Яніна Праміпскія, якія і сёння жывуць у Іркуцку, помняць яркую навагоднюю ёлку ў Шушанскім і радасныя гульні на катку, якія наладжваў ім вясёлы дзядзя Валодзя.

Уладзімір Ільіч не забыўся і пра свайго сябра нават у цяжкія гады грамадзянскай вайны. Ён прыслаў у Іркуцк тэлеграму: «Прашу аказаць усялякую дапамогу майму таварышу па ссылцы ў Сібіры Івану Лукічу Прамінскаму, змазчыку вагонаў пры Інакенцеўскім дэпо... Затым прашу перадаць яму па тэлеграфе мае прывітанне і, нарэшце, прашу перавесці яго па Алтайскую чыгунку на лепшае месца. Ён ужо стары. Тэлеграфуйце, што зрабілі».

У Іркуцкім губрэўкоме здзівіліся: старшыня Саўнаркома, і так клапоціцца пра нейкага змазчыка вагонаў? Паслалі свайго чалавека, які перадаў прывітанне Леніна, а потым, выдзеліўшы трохвосны службовы вагон, перавезлі сям'ю Праміпскага на Алтай.

А цяпер давайце зноў вернемся ў Шушанскае. Там у апошнія дні студзеня 1900 года панавала нейкая мітусня. «Ракою па начах разлівалася Паша, якая за два гады стала сапраўднай прыгажуняй, Мінька мітусіўся, перацягваючы да сябе дадому паперу, якая асталася, алоўкі, малюнкі і інш., прыходзіў Аскар Аляксандравіч, садзіўся на краёк крэсла, мусіць, хваляваўся... Заглядвалі ўвесь час у пакой гаспадыня ці суседка, ніяк не мог зразумець наш сабака, што ўвесь гэты перапалох павінен азначаць, штохвіліны адчыняў носам усе дзверы, каб упэўніцца, ці ўсе на месцы; кашляла мама, поркаючыся з укладкаю, дзелавіта звязваў кнігі Уладзімір Ільіч»,— піша пра той час Надзежда Канстанцінаўна.

Нарэшце ссылка скончылася. Тэрміну, чаго вельмі баяўся Ленін, не прыбавілі, дазвол атрыманы — можна ехаць.

Бывай, Шушанскае! Тут за тры гады ссылкі Ленін напісаў звыш трыццаці твораў, сярод якіх і такая класічная праца, як «Развіццё капіталізму ў Расіі». Тут у дэталях прадуманы план стварэння марксісцкай партыі, тут упершыню з'явілася думка пра стварэнне сваёй палітычнай газеты — «Іскра». Тут напісаны працы «Задачы рускіх сацыял-дэмакратаў», «Наша праграма», «Надзённае пытанне» і іншыя. Тут Уладзімір Ільіч змагаўся з народнікамі, эканамістамі, легальнымі марксістамі. Менавіта тут ён упэўніўся, што без яснай рэвалюцыйнай тэорыі не можа быць і гаворкі пра рэвалюцыйную практыку. Таму даследчыкі і сцвярджаюць, што ў канцы XIX стагоддзя цэнтр кіраўніцтва рэвалюцыйнай барацьбой разам з Леніным пераехаў у Мінусінскі павет — у Шушанскае.

Складзены кнігі — іх сабралася аж 15 пудоў! Наварана ў дарогу пельмені — шушанскія жанчыны раілі браць толькі іх: усё астатняе змерзнецца.

Уперадзе доўгая дарога з Сібіры.

Ва Уладзіміра Ільіча яшчэ многа чаго наперадзе.

Яшчэ там і барацьба з гора-рэвалюцыянерамі, якія ледзь не на кожным перакрыкаванні будуць крычаць: «Хопіць ужо інтэлігенцыі намі кіраваць! Цяпер мы ёю накіруем! А то і без яе абыдземся!» Яны забываліся, што

і сам Ленін з сям'і інтэлігентаў, і залічвалі да буржуяў настаўнікаў, дактароў і нават кваліфікаваных рабочых — слесараў і сталяроў — толькі за тое, што яны насілі белыя сарочкі.

Недзе яшчэ там, пасля рэвалюцыі, з'явяцца ў яго запісках і прамовах словы: «архиинтересное», «архиспешная», «архиаккуратность», «архиважно», «архитакт» — што ж, становішча тады сапраўды будзе архіскладанае.

Там, у снежні 1917 года, Ленін, задумаўшыся, запіша: «Рэвалюцыі — лакаматывы гісторыі. Разагнаць лакаматыў і ўтрымаць яго на рэйках».

Ды і сама рэвалюцыя, сама радасць і ўрачыстасць перамогі — таксама яшчэ далёка ўперадзе...

Тры гады таму назад плыў ён у Шушанскае. Параход, кажуць, часта спыняўся. Спыніўся ён і там, дзе сёння ласкава глядзіць на навакольныя горы і ўважліва слухае Енісееву гаману новы горад Дзіўнагорск. А тады там стаяў манаскі скіт. Уладзімір Ільіч Ленін, кажуць, сустракаў тут разам з Кржыжаноўскім і Старковым дзень Першага мая.

Цеплаход «Святы Мікалай» прыткнуўся тады да енісейскага берага навдечар: ён ішоў толькі ўдзень, а ўвечары разам з пасажырамі адпачываў — баяўся, каб ноччу дзе не спатыкнуцца. Ленін сышоў з сябрамі на бераг. Расклалі агонь. Водбліскі полымя ўзрадавана замітусіліся па рацэ: мусіць, гэтае цяпельца ў цёмнай вясновай ночы было відно вельмі далёка...

Сябры ціха, каб не пачулі на «Святым Мікалаі», спявалі рэвалюцыйныя песні, а Уладзімір Ільіч марыў, калі Сібір, гэты глухі край, які спрадвеку не запальваючы святла клаўся спаць, асветліць чалавек, калі, нібы зямныя сузор'і, з'явяцца на зялёным небе тайгі новыя гарады, электрастанцыі.

А сёння толькі ў адным Краснаярскім краі колькі гэтых электрастанцый! Нядаўна пачата будаўніцтва яшчэ адной — Саяна-Шушанскай ГЭС.

Успомнілася Дзіўнагорская ГЭС, дзе я быў якраз перад гэтым. Я яшчэ і цяпер бачу, як цяжка ўздымаюцца ў неба магутныя афрамадзіны гор Шуміхінскага створу, у якія ўрублена ГЭС. Якой маленечкай, хочацца нават сказаць — мініяцюрнай, здаецца яна на фоне гэтых высозных гор! І толькі спусціўшыся ў прасторную турбінную залу, адчуваеш, якая гэта «мініяцюрнасць»: тут калі ўжо болт, дык важыць ён 340 кілаграмаў, калі падпятнік, дык у яго залі-



8 Зак. 1045

ваюць аж 24 тоны масла, калі ротар, дык яго не можа падняць нават ладнай сілы кран — ён важыць 900 тон.

Калі я быў у Дзіўнагорску, там якраз здалі ў эксплуатацыю сёмы агрэгат. Каб здзівіцца сіле гэтай станцыі, варта толькі ўведаць, што адзін яе агрэгат амаль роўны па магутнасці ўсяму Днепрагэсу — самай магутнай нашай станцыі, пабудаванай у гады першых пяцігодак. А ўсяго ГЭС будзе мець дванаццаць такіх агрэгатаў. Гэта электрастанцыя намнога магутнейшая нават за Брацкую, якой дзівіліся і дзівяцца сёння замежныя спецыялісты.

Але і Дзіўнагорская ГЭС, якая вырасла сёння на месцы былога манаскага скіта, тады яшчэ была таксама наперадзе.

Перад ім цяпер — толькі дарога ў Расію...

З Шушанскага, цёпла развітаўшыся з сялянамі, Ільіч выехаў 29 студзеня 1900 года — якраз у дзень заканчэння ссылкі.

Коні весела беглі па лёдзе Енісея — даўняй зімовай дарозе. Каля дарогі чарнелі палонкі, над якімі клубіўся туман,— гэта дыхаў Енісей.

Да Ачынска — бліжэйшай чыгуначнай станцыі — 300 вёрст трэба было ехаць на конях. Чацвёра сутак язды.

На небе шчодра свеціць поўня. Ціхая марозная ноч падатліва адклікаецца на звон бомаў. Здаецца — нават рып палазоў можа разбудзіць наваколле.

Дарога павярнула налева — нарэшце яна расстаецца з енісейскім лёдам. Коні стомлена падняліся на высокую Яноўскую гару. Уладзімір Ільіч апошні раз зірнуў на Енісей: «Бывай, волат!»

Ленін вяртаўся ў Расію.

У царскіх пакоях гэтая раніца, як звычайна, была спакойная. Цар Мікалай II спакойна снедаў...

*Шушанскае.*
*Лета 1969 года.*

# *Аповесці*

# КРЫЛО ЦІШЫНІ

## УВАХОДЗІНЫ

Тады, хаця ішоў ужо трэці год пасля вайны, над сцішанай і надзіва супакоенай зямлёю Сябрыні да болю ў вушах звінела нязвыклая цішыня. Людзі, пядаўнія партызаны і салдаты, удовы і сіроты, інваліды і вязні канцлагераў, усё яшчэ аглушаныя вайною, асцярожна абвыкаліся ў ёй, у гэтай мірнай цішыні. Ніхто пакуль не ведаў, што пройдзе і год, і дзесяць, і пяцьдзесят гадоў, а яна, вайна, усё яшчэ доўга і настойліва будзе ўмешвацца ў іхняе жыццё...

## СЦЕЖКА

Калі з нешырокага шляху, раз'езджанага калясьмі, дзе, пяглядзячы на восень, у мяккім, як мука, і цёплым, як ачахлы прысак, пыле тонуць босыя ногі, ступіш раптам на бойкую, вытаптаную, нібы ток, сцяжынку, адразу адчуеш, як холадна зрабілася падэшвам, і здзівішся, што верасень у свае доўгія, расяныя і золкія ночы паспеў ужо так выхаладзіць зямлю, што і ласкавае пакуль яшчэ сонца не спраўляецца награваць нават вось гэтую вузкую сцяжыну за пакарацелы, скупавата адведзены яму перадзім'ем, дзень. Летам, у які-небудзь спякотны поўдзень, калі хочацца хутчэй боўтнуцца ў ваду, такі халадок радасна ўсцешыў бы загарэлыя ногі, якія ад сонца і пылу пачалі ўжо лушчыцца, а цяпер, увосень, гэта было не зусім даспадобы.

І я пабег хутчэй. Але неўзабаве прыцішыў крок і перайшоў на звычайную хаду, якою да гэтага звыкла таптаў пыльны шлях,— ні шпарка ісці, ні тым больш бегчы подбегам па сцежцы было нельга, бо па ёй, выслізганай як не да бляску, кожны малепечкі камепьчык ці нават якое каліва засохлай зямлі балюча калоліся ў ногі.

Навокал сцішана, стоена радавалася цеплыні і сонцу поле.

Даўно павыгаралі, павыліналі кветкі, трава, дрэвы, наблякла нават неба, і ўсё гэта, здавалася, было зараз аднаго рыжага колеру — як сонца. Рыжы быў нядаўна і ржэўнік, і невялікія, не звезеныя яшчэ стажкі саломы, але цяпер яны паспелі пачарнець і не так свяціліся ў апусцелым полі. Толькі ўперадзе, на самым узлоб'і пагорка, на буі, дзе зімою заўсёды круцілі завірухі і дзе я, штодня ідучы ў Новыя Вербы, назначаў сцежку яловымі лапкамі, каб потым, вяртаючыся, не збіцца з дарогі і не завалачыся куды-небудзь у Лапысіцу, якая схавалася вунь за тым маладым сасоннікам,— толькі там, уперадзе, светла, як мая стрыжаная галава, бялела аўсяпішча: авёс зжалі нядаўна, дажджоў гэтыя дні не было, і таму яно не паспела пачарнець.

Гэтаю сцежкаю мне падабалася хадзіць — асабліва летам, калі па-чалавечы задумліва шуміць каласамі поле. Як збочыш на яе са шляху, пройдзеш крыху ўперад — і ўжо за табою, за сцяблінамі, схавалася дарога, і ты адзін сярод густой збажыны, задраўшы галаву ўгору, глядзіш на каласы, якія, нахіліўшыся над сцежкаю, ціха хістаюцца недзе ўверсе. Ідзеш — і адною рукою лёгенька вядзеш па рабрыстай сцяне жыта, і табе чамусьці робіцца вельмі радасна і спакойна, што жыціны падатліва і пругка выпростваюцца пасля тваё далоні і яшчэ доўга шапатліва шумяць там, дзе ты прайшоў.

Я шкадаваў, што ў мяне была вольная толькі адна рука. Але, змірыўшыся з гэтым, налаўчыўся і адною рукою сашморгваць каласкі, а пасля, памагаючы сабе ротам, лушчыць іх. Другая рука была ў мяне заўсёды занятая — я нёс у сваю вёску акуратна звязаныя шпагатам газеты, лісты і пераводы, якія атрымліваў у сельсавеце. Вось чаго я штодзень хаджу ў Новыя Вербы: я нашу пошту.

На пачатку лета, калі каласы ўжо добра наліваліся, але яшчэ не цвярдзелі выспеўшы, я зрываў іх цэлы пук і, дайшоўшы да ручая, які вунь хаваецца за ўзлоб'ем, у лагчыне, і там, у алешніку, раскладаў цяпельца — пражыў іх. Многія зялёныя саломінкі перагаралі раней, чым паспявала сасмажыцца ўсё пражмо, і тады каласкі адзін за адным падалі ў цяпельца. Я выграбаў іх з агню, з попелу, а потым, вылушчыўшы на чорную мурзатую далонь, смакуючы, еў цёплыя набухлыя салодкія зярняты.

І сёння многа іх, летніх маіх цяпельцаў, чарнеецца ў ручаі.

Праўда ж, смешна слухаць пра вогнішчы ў ручаі?

Але нічога дзіўнага тут няма: проста ручаі, які ідзе аднекуль з-за Лапысіцы і калісьці быў, можа, нават ракою, зусім перасох. І ніякай вады ў ім зараз не бывае, акрамя толькі вясновага разводдзя, калі мне ніяк не перайсці новую раку, ды, можа, яшчэ пасля ладнага летняга ліўня, калі ў ніжэйшых мясцінах ручая, у траве, збіраюцца невялічкія лужынкі цёплай, лепай і белай ад пены вады...

Дарога дамоў заўсёды карацейшая, чым з дому. Нават і не заўважыў, як прайшоў узлобак, дзе свежа пахла яшчэ саломаю, спусціўся да ручая — з гары ж заўсёды ногі бягуць як не самі.

У нізіне было ціха і сонечна, цёпла і сонна — ветрык крыляў недзе ўверсе, і яго павевы сюды не даходзілі. Тут, у густым паху апалага і ўгрэтага лісця, было нават крыху душнавата.

Па самотнай красцы канюшыны, якая, відаць, зацвітала ў другі раз, паспешліва паўзла пчала — нібыта круціла сваімі лапкамі гэты клубочак. Па тым як краска падатліва спружыніла пад ёю і слухалася яе чэпкіх, бы ваўчкі, лапак, узнікала нейкае пачуццё іх супольнасці: здавалася нават — кветка ведае, што трэба пчале...

Я акуратна паклаў звязаныя газеты ля свайго цяпелішча, якое з краёў паспела ўжо зарасці травою (даўно не палілі на ім каласкоў!), скінуў шапку, лёг на аблюбаванае месца, дзе заўсёды перадыхаў, і ўглядзеўся ў далёкае, высокае неба. Цяпер яно ўжо было не такое далёкае і блакітнае, як, скажам, улетку альбо ўвесну, калі аж сэрца заходзіцца ад яго бясконцай і страшнаватай нават глыбіні, калі таму ж сэрцу бывае аж цесна ад яго блакітнага бяздоння і бязмежжа. Цяпер неба, хоць на ім усё яшчэ раскашавалася сонца, было нейкае па-восеньску абыякавае, цьмянае, а ў ім воблакі — высокія, шэрыя, пакручастыя — нібы барозны, якія араў нехта крыху п'янаваты.

Неба было сумнае. І таму доўга глядзець у яго не хацелася.

Я сеў і правёў рукою па голай галаве — нібы спрабаваў зачасаць чуб. А калі адчуў, як яршыста і казытліва спружыняць пад далонёю кончыкі валасоў, да мяне зноў вярнулася балючая крыўда, што паспела ўжо была крыху

аціхнуць. Яшчэ ўчора ў мяне, як і ва ўсіх хлопцаў нашага класа, быў добры чуб. Колькі мне даводзілася яго прыгладжваць, змочваць вадою, завязваць па ноч хусцінкаю, каб прывучыць добра ляжаць валасы. І ўжо, здасцца, удалося гэта зрабіць: калі не лічыць некалькі віхроў, што вытыркаліся ў розныя бакі, чуб ляжаў добра — праўда, не зусім угору, троху набок, але ж усё роўна лепей, чым у Клёцкі. Можа б, яно ўсё і было б добра, каб не гэты Клёцка ды яшчэ не настаўніца матэматыкі Алена Пятроўна, якую мы, вучні, звалі Бусліхаю. Бусліха прыйшла ўчора ў клас чамусьці не ў гуморы, шумна пацягнула паветра сваім доўгім, амаль заўсёды прастуджаным носам і здзіўлена, нібы ўпершыню ўбачыла нас, сказала:

— Ого, дык у вас у класе кавалерамі запахла. Чубы паадгадавалі, хоць ты не ў школу, а на ігрышча ідзі. А можа, і праўда я трапіла на вечарынку, а не ў шосты клас? Ну, паглядзім, як кавалеры «двойчы два» ведаюць. Давай, Хведзя, рашы мне вось гэтую задачу.

Клёцка вучыўся вельмі дрэнна і, вядома, рашыць задачу не змог. Ён стаяў ля дошкі, разгублена круціў галавою з непаслухмяным чубам на ёй і адно толькі дзіўнавата ўсміхаўся.

— Ну што, Хведзя,— здзекавалася Бусліха,— чуб-то ў цябе во які, з такім чубам можна смела на агарод ставіць — ніводная птушка не толькі побач не сядзе, але і блізка не праляціць. Вось каб да гэтага чуба ды яшчэ што-кольвек...

Усё гэта скончылася тым, што нас, хлопцаў, Бусліха выгнала з урока — каб падстрыгліся — і рашала задачы з адными дзяўчатамі. У Алены Пятроўны гэта здаралася нярэдка: то ёй не спадабаемся мы, то раптам не спадабаюцца прычоскі ў дзяўчат, і тады яна выганяе іх, а вядзе ўрок толькі з намі, хлопцамі.

Стрыгчыся мы асабліва не спяшаліся. Урок матэматыкі быў апошні, і таму мы сноўдаліся ля класа, пад вокнамі, спрабавалі нават за вуглом курыць, спадзеючыся неяк перабыць гэты час да званка. «А заўтра ўсё забудзецца»,— наіўна думалі мы.

Але назаўтра з першага ж урока нас паклікалі ў настаўніцкую. Андрэй Іванавіч, завуч школы, увесь час тыльным бокам далоні папраўляючы акуляры, злаваўся:

— Кавалеры, чуеш, мне знайшліся! Танцоры! Ды на вашы чубы глядзець, чуеш, страшна. Вароніны гнёзды на галовах, а не чубы!

І пакуль Чуеш крычаў, гаварыў з намі як «мужчына з мужчынамі», дырэктарка школы Паўліна Раманаўна глядзела на нас і ўсё стрымлівалася, каб не засмяяцца...

Сёння Паўліне Раманаўне ёсць пісьмо. Я ўзяў пошту, знайшоў яго. Цяжкое, тоўстае. Адраса таго, хто насылаў, чамусьці няма. Можа, школьнае, а можа, і не. Лепей за ўсё несці яго не ў школу, а дахаты ёй. А то, можа, хто яшчэ возьме ды прачытае. Навошта, бо гэтае пісьмо можа быць і ад таго вясёлага лётчыка, які вельмі часта наведваецца да Петрака і Петрачыхі, дзе стаіць на кватэры Паўліна Раманаўна. Яна ж не тутэйшая, аднекуль аж з-пад Замошша, а бяздзетныя дзядзька Пятрок і цётка Петрачыха любяць яе, як родную дачку.

Нарэшце, ёсць сёння грашовы перавод і цётцы Еўцы. Гэта пенсія за сына, які загінуў пад самым Берлінам. Усю вайну праваяваў на перадавой, і ўсё кулі яго абміналі, і, на́ табе, пад самым Берлінам знайшла Юрку, гадаўка. Я добра яго памятаю: Юрка быў худзенькі, шчуплепькі і вельмі сарамлівы. Усё ўсміхаўся, як і сама цётка Еўка.

З ласкаваю ўсмешкаю амаль кожны дзень сустракала мяне цётка Еўка — то ля хаты, то ля свайго насцеж расчыненага акна, а то, выпрастаўшыся над бульбоўнікам, пытала з агарода:

— Можа, ты мне ўжо што нясеш? А то ўсё хату маю абмінаеш.

— Вам, цётка, пішуць яшчэ! — неабачліва аднойчы адказаў я і заўважыў, як яна пасумнела, пацямнела з твару і, перасмыкнуўшы вуснамі, адвярнуўшыся ад мяне, пачала без патрэбы чубіць бульбоўнік.

Я зразумеў, што сказаў глупства. Хто ж ёй напіша, калі яна засталася адна-адною ў сваёй хаце: Юрка загінуў у Германіі, а муж памёр ужо дома — ад ран.

Цётка Еўка вельмі ж ужо чакала гэтага пераводу. Я ўяўляў, як яна ласкава запросіць у хату, пасадзіць на лаўку і, як у тыя папярэднія разы, будзе хадзіць ля мяне і, радая, усё пытацца:

— Чым жа мне, Ясічак, цябе пачаставаць? Быў бы сад — хоць бы яблычак сашчыкнуў. Была б карова — дык хоць бы сыраквашы паставіла. Ці хоць бы які бухоны блін быў. Аж нічога гэтага ў мяне няма. Тады во на хоць паспрабуй праснака бульбянага, які я сёння спякла.

Мне нецярплівілася хутчэй аддаць грошы цётцы Еўцы, хацелася ўзрадаваць яе і ўбачыць, як яна, вясёлая, засмя-

сцца. Бо нават учора, калі я занёс пісьмо Туньцісе, яна лагодна так мяне ўшчувала:

— Вось бачыш, Ясічак, Туньцісе і то ты пісьмо даў, хоць яна і чытаць не ўмее. А я і прачытала б збольшага — але ты не нясеш.

І, шкадуючы, уздыхнула.

А навошта было шкадаваць? Туньціха адразу, след за мною, пабегла з ім да цёткі Еўкі — балазе ж яны суседкі і іхнія сядзібы разгароджвае толькі нейкі ламаны плот, які яны ўдзвюх, хаваючыся адна ад адной, спальваюць за зіму, а вясною новяць зноў.

Цётка Еўка прачытала тое пісьмо, і к вечару пра яго ведала ўжо ўся вёска. Яно было сапраўды дзіўнаватае. Там строга было напісана: перапішы, маўляў, гэтае пісьмо чатыры разы і пашлі новыя лісты сваім чатыром вельмі блізкім ці добра знаёмым людзям. Перапішы яго яшчэ чатыры разы, расчыні хлеб, запячы лісты ў чатырох боханах і аддай іх дужа надзейным, дужа знаёмым табе людзям — каб яны зрабілі тое ж самае. Калі ж ты не паслухаешся пісьма і не зробіш таго, што ў ім напісана, цябе сустрэне цяжкая кара, і ты будзеш пакутаваць усё жыццё. І ў канцы, пасля кропкі, было прыпісана: «Сучка ты!» — відаць, той, хто перапісваў пісьмо, дадаў гэта ад сябе.

«Святое» пісьмо напалохала не толькі Туньціху, але і многіх жанчын з нашае вёскі. Бо звычайна, калі прыходзілі ў вёску такія пісьмы, іх было заўсёды пяць ці сем, а то — адно.

Хоць Туньціха і так пакутавала ў сваёй зямлянцы, але большага пекла, ведама, ніводзін чалавек не хоча — усё ж думаецца пра лепшае.

Туньціха ўстрывожылася. У пісьме так строга загадана чатыры разы перапісаць яго, а як зрабіць гэта ёй, непісьменнай жанчыне? У пісьме гаворыцца, што трэба спячы чатыры боханы хлеба, а з чаго іх спячы, калі двух мяшэчкаў ячменю, што наабівала яна працікам са свае палоскі, ёй з двума дзецьмі і самой не хопіць да каляд?

Жанчыны з абодвух канцоў вёскі хадзілі да Туньціхі, нешта раілі ёй, але што раілі, я пакуль яшчэ не ведаў.

У стосе трохкутнікаў было яшчэ адно пісьмо, якое мяне вельмі непакоіла. Пісьмо гэтае пісаў бабцы Хадоссі яе старэйшы брат, які на старасці год нечакана пайшоў у прымы ў нейкую далёкую вёску аж за Орпу і зараз жыў там са сляпою жонкаю. Ён не ўмеў асабліва пісаць, а таму ў пісьме звычайна было два-тры словы, намаляваныя

вялізнымі, як друкаванымі, крывымі-крывымі літарамі: «Жывы. Пажаў. Мацвей».

Я ведаю, як доўга разбірае гэтыя тры словы бабка Хадосся. Хоць, шчыра кажучы, разбіраць даводзіцца толькі адно слова — сярэдняе, дзе заўсёды будзе нейкае новае паведамленне («накасіў», «змалаціў», «ацялілася», «пасеяў»), а два астатнія — «жывы» і «Мацвей» — ніколі не мяняюцца. Але бабка Хадосся ўсё роўна сядзіць над імі як не наўдня, усё шэпча вуснамі — нібы пацеры чытае, паволі складае літары ў словы, аж пакуль не вычытае ўсё пісьмо. Бабка Хадосся таксама амаль непісьменная. Тут заўсёды было цяжка не толькі таму, хто пісаў пісьмо, але і таму, хто яго чытаў.

Мяне ж непакоіла іншае. Учора ўвечары мы паштурхаліся крыху на «мурашніку», папылілі босымі нагамі па выгане, а калі нашы дзяўчаты, падражніўшыся, пабеглі дадому, мы з хлопцамі пайшлі ў Хадосчыны слівы. Я стаяў якраз на згародзе, калі яна закрычала:

— Ах ты, шклязнёнак! Што робіш, урвіцель!

Я хуценька хацеў саскочыць са згароды, але ў калашыну ўлезла частаколіна, і я апамятаўся толькі на зямлі, калі ўжо на мне ляжала ўся згарода — нават і не чуў, як яна храснула. Хоць і ўцёк, але быў упэўнены, што Хадосся мяне пазнала: дзіва што пазнае, калі такая месячная і светлая ноч ціха шапацела ўчора над садамі!

Як мне аддаць пісьмо? І што рабіць, калі яна загаворыць пра слівы? Я ж пачырванею і выдам сябе — засаромеюся, апушчу вочы. Я і ў школе, калі ў каго прападзе аловак і настаўніца пытае, хто ўзяў, апускаю вочы і густа чырванею: мне здаецца, усе думаюць, што зрабіў гэта я. Пасля такога ўсе глядзяць на мяне насцярожана і padaзрона: «Глядзіце, Ясь пачырванеў», а той, у каго ўкралі, прыстае ўжо да мяне з кароткімі гужамі: «Аддавай!», хоць я таго алоўка і ў вочы не бачыў. А ў слівах жа я быў, напраўду быў!

І трэба ж гэтаму Мацвею якраз сёння прыслаць сваё: «Жывы. Пажаў. Мацвей»!

Сонца было ўжо нізка. Яно, падалося, села на прыгнутую, далекаватую ад мяне травіну, якая спружыніста сагнулася ад гэтага яшчэ болей. Я, нібы зачараваны, глядзеў, як цяжка і няспешна коціцца яно па гэтым кволым касцічку-лістку, і нават, дзівак, чакаў, што ж будзе далей: абломіць яно травіну ці не? Але нічога асаблівага не здарылася: чырвоны каток паволі, плаўна скаціўся з

травіны, тая выпрасталася і, здаецца, аж захісталася... А мо яна захісталася таму, што да яе дайшоў павеў ветру, які ўсё яшчэ шастаў недзе ўверсе...

Ля кустоў пачынаў ужо завязвацца туман. Відаць, таму, што ў гэтай нізіне заўсёды бывае мала ветру, сівы туман раней за ўсё пачынае кудзеліцца менавіта тут і раніцою пазней разыходзіцца. Калі цёплым і парным летнім вечарам з душнай сцяжыны ўваходзіш у гэтае ручаінішча, адразу адчуваеш, як робіцца холадна, як туман бярэцца за твае голыя рукі, чапляецца за валасы, і нават праз саколку чуеш, як ходзіць ён па целе. А выберашся з туману — і цёплае, ласкавае паветра зноў прыемна дыхае павокал — лашчыць твае рукі і твар, якія паспелі ўжо крыху завільготнець, захаладаць...

Я хуценька падняўся — трэба ж да заходу сонца паспець разнесці газеты і пісьмы.

Перада мною, як павучынае тканне, у розныя бакі разбягаліся сцежкі. Чамусьці менавіта тут, у перасохлым ручаі, яны сустракаліся і потым, відаць, троху прыстоіўшы адна з адною, а то і прайшоўшы крыху побач, абмяняўшыся навінамі, развітваліся і разыходзіліся да дарог у розныя вёскі. Сцежкі — гэта тыя ж ручаі, якія нюхліва выбіраюць самы кароткі і лепшы шлях, упадаюць у рэкі. Дарэчы, а куды ўпадаюць сцежкі? Пэўна ж, у дарогі: пятляюць, пятляюць, аж пакуль не ўткнуцца носам у якінебудзь пыльны шлях.

А дарогі — гэта рэкі, і ўпадаюць яны, відаць, у гарады. Не, спачатку ў вёскі. Пыляць з вёскі ў вёску — як з возера ў возера. А ці канчаюцца дзе дарогі? Відаць, не. Проста, увайшоўшы ў горад, яны выходзяць з другога боку — іншымі дарогамі. Дарогам нельга канчацца. Гэта ўжо дрэнна, калі сцежка ці дарога, нікуды не ўпадаючы, перасыхае недзе ў полі, у лесе, у лузе. І зарастае травою, як вунь тая сцежка да хаты дзеда Сянчылы, які жыве адзін і, хворы, амаль ніколі не выходзіць на вуліцу. Мне здаецца, кожнаму балюча бачыць некалі ўтаптаную, уезджаную сцежку ці дарогу, па якой хадзіла столькі ног, утравелаю, зарослаю — трава прабіла нават утрамбаваную, бы ток, зямлю.

І чаго толькі зарастаюць сцежкі, перасыхаюць, як рэкі, дарогі?

Незаўважна дайшоў да шляху, з якога за самымі Новымі Вербамі збочыў на сцежку. Так ісці прамей і хутчэй:

шлях доўга і цярпліва абыходзіць ручай, а сцежка ідзе напрасткі — нібы спяшаецца.

Як толькі на стромай сцежцы выбраўся з ручаінішча і выйшаў на шлях, адразу ўбачыў буліпскія хаты. Буліна — вялікая вёска, якая стаіць на паўдарозе ў маю Сябрынь. Вёска доўгая і выгінаецца дугою: адзін канец ледзь не сыходзіцца з другім, замыкаючы ў сабе вялізны буліпскі сад. Зрэшты, Буліна выгінаецца не проста так сабе. Яна стаіць на беразе рэчкі Вужыцы, і таму вуліца паўтарае яе згіб.

Па Буліне я ніколі не хадзіў — навошта рабіць такі крут! Спускаўся да Вужыцы і, перайшоўшы яе, праз сад, выходзіў амаль у самы канец вёскі, адкуль было рукою падаць да Сябрыні.

Але сёння ісці гэтаю сцежкай я баяўся. Ужо нават угаварыў сябе, што лепей даць кругаля па Буліне, чым ісці праз сад.

І ўсё гэтая нешчаслівая ўчарашняя пятніца! Нават не верыцца, што ў адзін дзень можа сабрацца гэтулькі непрыемнага.

Гэта ж учора Бусліха прычапілася да майго чуба, і вось сёння валасы, ужо абстрыжаныя, шорстка колюцца ў шапку. Потым, ідучы са школы, я пабіўся з Клёцкам, і той схапіў з мае галавы шапку і закінуў яе ў Васяпкоў агарод. А ўвечары, калі мы сабраліся на выгане на «мурашнік», дзе Клёцка іграў пад язык, а яму памагаў Рагатуноў Раман, падыгрываючы на алюмініевым грабянцы, абкладзеным паперою,— новая бяда. Спачатку, праўда, усё было добра, весела: мы смяяліся і абы-як кружыліся, няўмела цягалі босыя ногі па зямлі, узнімаючы цэлае воблака пылу — хоць яго ў цемнаце і не было відаць, але кожны адчуваў, як ён, гэты пыл, густа набіваецца пад калашыпне. У сваёй забаве мы і не заўважылі, як аднекуль з цемры ўзнік Чуеш. Ён увайшоў у наш пыльны круг і ўсё прыглядаўся, каб спазнаць каго з вучняў:

— Во дзе яны, чуеш, урокі вучаць. Малайцы, вучаняткі мае. Чуеш, малайцы! А назаўтра да дошкі каторага вызавеш — чуеш, стаіць і як баран на новыя вароты лыпае...

Мы паразбягаліся. Андрэй Іванавіч таксама пайшоў дадому, узяўшы за руку Альку, сваю дачку, якая вучылася ў нашым класе і сяды-тады ўцякала з хаты на «мурашнік». Ішоў і доўга ўсё бубнеў:

— І ёй, чуеш, ужо танцулькі наўме... І ёй...

Пасля зноў мы збегліся, але ўжо «мурашнік» распаўся. Дзяўчаты заспяшаліся дамоў, і мы іх праводзілі. «Мая» Лена ішла пад руку з Дзямідзькавай Клаваю, брыгадзіравай дачкою. Раман, той адразу прыстроіўся да дзяўчат, узяў пад руку «сваю» Клаву і ішоў побач. Клёцка, якому сёння не было каго праводзіць — яго ж Альку, за якой ён упадаў ужо даўно, павёў дадому бацька,— ішоў ззаду і толькі падсмейваўся. А я, асмялеўшы, захацеў адарваць Лену ад дзяўчат і пацягнуў яе за рукаў. І не паспеў я разабрацца, што здарылася, як, нават сам не заўважыўшы гэтага, ускрыкнуў ад болю: Лена ссадзіла мне ўсю руку — во, кошка, відаць, кіпцюры доўгія пагадавала! Пасля гэтага ўсе дзяўчаты гулка закапыцілі па вуліцы, з рогатам разбегліся па сваіх дварах. А мы, хлопцы, засталіся адны. Вось тады і падаў Пехта думку схадзіць да Хадоссі ў слівы. А калі і гэты паход скончыўся няўдала, пайшлі ў яблыкі — у булінскі сад.

Па дарозе я ўсё махаў рукою, якая дужа балюча саднела,— так мне было троху лягчэй. Хлопцы з гэтага пасмейваліся:

— Во пацалавала цябе Лена дык пацалавала! Нездарма ж у яе губы такія.

У булінскі сад мы хадзілі ўжо колькі разоў: ён вельмі вялікі, і двух вартаўнікоў з бярданкамі на яго малавата. Мы незаўважна падыходзілі да саду, хаваліся ў кустах і чакалі, калі пройдуць Манах у Белых Штанах і Яўсей. Яны звычайна па крузе абыходзілі сад. І як толькі вартаўнікі хаваліся ў лагчыне, мы мільгатнём кідаліся пад яблыні. Адзін раз, калі летніх яблыкаў было ўжо вельмі мала, а антонаўкі яшчэ не даспелі, нават пад самым носам у вартаўнікоў мы налаташылі цэлыя пазухі. Але рабілі гэта вельмі асцярожна — як мінёры: намацаеш яблык, ціхенечка адкруціш яго і пакладзеш за пазуху, а потым шукаеш у лісці другі...

І ўчора мы дачакаліся, калі на сцежку выйшлі Яўсей з Манахам. Тыя, закінуўшы за спіны бярданкі, ішлі і паціху размаўлялі:

— Яны думаюць, гэта нам нада. А па нас дык гэтыя яблыкі хоць з яблынямі вывозь. Але нас паставілі, значыць, мы і пільнаваць павінны.

Пехта з хлопцаў не вытрымаў і пырснуў у кулак. Нам здалося, што вартаўнікі прыцішылі крок і паглядзелі на куст. Але не спыніліся. Прайшлі побач і схаваліся ў лагчыне.

Мы — пад яблыні.

У садзе быў яшчэ не зжаты позні ячмень. Ён холадна і росна чапляўся за босыя ногі, халадзіў мокрае калашынне, даставаў нават да сарочкі. Бралі дрыжыкі, што аж ляскалі зубы — ці то ад холаду, ці то са страху. Балела рука, калі да яе дакранаўся халодны ліст.

На яблыні светла і кідка свяціліся ў месячным святле белыя вялікія антонаўкі — на іх сёлета быў ураджай. Мне здавалася нават, што бачу, як прасвечваюць цёмныя зярняты — можа, таму, што гэтак стараецца свяціць поўня, а можа, і таму, што так выспелі яблыкі.

Я загледзеўся на яблыкі і таму спачатку ніяк не мог сцяміць, што робіцца, калі недзе зусім непадалёк бабахнуў стрэл і з яблыні пасыпалася лісце, зашпокалі антоны. А калі зразумеў — ірвануўся ўбок. Бегчы было дужа нязручна: ячмень блытаўся ў нагах, чапляўся за калашынне, трапляў між пальцаў, і я, як спутаны, падаў потырч. Узнімаўся і зноў бег. Перада мною, бы навязаны мячык, скакала над небакраем поўня. А за мною (зусім побач!) чуўся крык:

— Лаві іх, лаві!

І зноў бахаў стрэл.

Калі выбег з саду, калі ўпэўніўся, што вартаўнікі далёка (яны ўсё яшчэ ўзбуджана і гучна штосьці там расказвалі адзін аднаму), я ачомаўся і спрабаваў разабрацца, куды трапіў — ніяк не пазнаваў вёскі. Са страху думаў нават, што патрапіў у нейкую чужую — і хаты чужыя, і вуліца не свая, і дрэвы незнаёмыя,— аж пакуль не ўбачыў вербы і не зразумеў, што прыбег у Сябрынь з другога боку.

Потым хлопцы сабраліся разам — у вёску ўсе прыбеглі з розных канцоў. Перабіваючы адзін аднаго, узбуджана абмяркоўвалі паход:

— А ён як бабахне!

— А мне яблык па галаве, а я думаў, што застрэлілі!

— А Ясь так бег — аж ад ног сваіх адставаў!

— А я паваліўся, ногі ў ячмень укруціліся — ляжу, як спутаны. Дрыгаў, дрыгаў нагамі, а ячмень не рвецца — і ўсё.

— Відаць, яны пачулі.

— Пачуеш, калі Клёцка абедзвюма рукамі як пачаў латашыць яблыкі — з лістамі, з сукамі. А яны толькі — шпок! шпок! шпок!..

— Не, відаць, яны тады, як пехта пырснуў, усё ж здагадаліся, але не падалі выгляду: няхай, няхай лезуць, падумалі,— апраўдваўся Хведзя.— А потым хуценька вярнуліся...

І вось цяпер мне трэба рашыць: даваць кругаля і ісці па Буліне ці ўсё-ткі прабегчы ля саду. А раптам не сустрэну вартаўнікоў? «Вядома, не сустрэну»,— падбадзёрыў я сябе і пабег.

Спусціўся да ракі. Падкасаў штаны і, зайшоўшы ў ваду, адчуў, як яна захаладала. Падумалася, што хутка ўжо зіма, золка стане нагам і трэба будзе ці збіваць дзеравяшкі, якія расшчапіліся вясною, ці рабіць новыя драўляныя падэшвы і прыбіваць да іх верх ад якіх старых чаравікаў. Але і гэтая думка была нядоўга: перад вачыма зноў паўсталі Манах у Белых Штанах і Яўсей. З бярданкамі.

І калі ўжо я праскочыў як не ўвесь сад, з-за невялікіх кустоў пачуўся раптам кашаль. Гэты кашаль я ведаў — так кашляе толькі Манах у Белых Штанах. Ён павярнуўся ў мой бок і нейкім пагрозлівым голасам сказаў:

— А хадзі-тку ты сюды, малец!

Першае, што хацелася мне зрабіць,— гэта сігануць (і як мага хутчэй!) назад. Але ж вельмі блізка я быў ад іх — дагоняць. Ды і бярданкі вунь ля іх... Цяпер жа дзень. Складзецца, як некане каторы соллю, дык і заякочаш...

І я, нібы на ватных нагах, якія зусім не слухаліся, пайшоў да кустоў, дзе, паклаўшы бярданкі ў высахлую траву, ляжалі вартаўнікі. Манах у Белых Штанах падняўся і сеў.

— Сядай,— паказаў ён па траву побач з сабою і доўга моўчкі глядзеў на мяне: дзядзька, наогул, быў маўклівы і ваўкаваты. Я зірнуў на чорны злосны твар Манаха, на чорную яго бараду, і мне зрабілася страшна: сядзеш, а тады, калі пачне біць за яблыкі, не ўцячэш... Але ўсё ж я сеў непадалёк ад куста і пачуў, як зашамацелі цёмна-бурыя, пакурчаныя ад сонца, лісты, якіх ужо многа нападала ў траву. Чамусьці падумалася, што вось такая атава, дзе столькі сухіх лістоў, дужа дрэнна косіцца — каса толькі слізгае па версе.

— Пакажы, што там у газетах пішуць,— сказаў вартаўнік і, памаўчаўшы, дадаў: — А сам ідзі ў сад, адшчыкні колькі яблыкаў...

У мяне адлегла ад сэрца: значыць, учора ён мяне не пазнаў! Радасны, я падбег да самай бліжняй яблыні, адшчыкнуў тры аж белыя ад наліву антонаўкі і вярнуўся

пад куст. Манах у Белых Штанах чытаў Яўсею загалоўкі ў «Звяздзе». Чытаў паволына, па складах:

— «Дош-ка го-на-ру. Пе-ра-да-ві-кі збож-жа-на-рых-то-вак».

За ім аднымі вачыма чытаў і я: «Асноўныя паказчыкі сацыялістычнага спаборніцтва для калгасаў БССР на 1947 год за ўздым грамадскай жывёлагадоўлі».

Потым дзядзька сціх і доўга моўчкі глядзеў у самы куток старонкі — адно толькі мыляў губамі, чытаючы сам сабе. А калі прачытаў, павярнуўся да Яўсея:

— Глядзі ты, а тама яшчэ аднаасобнікі ёсць...

І ўжо для Яўсея зноў пачаў чытаць:

— «Поразава. Кар. «Звязды». Калгаснікі і сяляне-аднаасобнікі Поразаўскага раёна ўсенароднае свята, 800-годдзе Масквы, адзначылі датэрміновай здачай збожжа дзяржаве. Гадавы план збожжанарыхтовак выканан на 106,4 працэнта. Прадаўжаецца здача збожжа звыш плана».

Манах у Белых Штанах чытаў заметку марудна, хоць ён перад гэтым прашаптаў яе сабе пад нос. Даслухаўшы да канца, Яўсей усміхнуўся:

— Ну і чытака з цябе, Манах. Дай, можа, я...

І разгарнуў «Звязду». Зацікавіўся заметкаю «Па 108 пудоў з гектара».

— Во тут і Гапанькоў, брыгадзір з нашай Аршаншчыны, хваліцца...

І, шырока раскінуўшы рукі, каб лепей разгарнулася газета, чытаў:

— «Члены маёй брыгады рашылі сёлета сабраць стопудовыя ўраджаі. Падпісваючы пісьмо таварышу Сталіну, мы далі слова, што стопудовы ўраджай будзе заваяваны. Трэба сказаць, што аснову для такога ўраджаю мы заклалі яшчэ ў мінулым годзе...»

Так удвух яны прагледзелі і іншыя газеты.

Вяртаючы пошту, Манах у Белых Штанах нібы мімаходзь спытаў:

— Дзе гэта ты, малец, руку так ссупуў?

Я схаваў руку за спіну, здароваю ўзяў газеты і зачырванеўся: а калі ён падумае, што гэта я садраў учора ў садзе?

— Ды, відаць, конь капытом,— выручыў мяне дзядзька Яўсей.

— Ага, конь,— згадзіўся я і хуценька пабег у Сябрынь.

Адсюль да вёскі было ўжо недалёчка. Вось тут, злева, будзе невялікае Яшкава балота, дзе шмат маладых бяро-

зак і дзе кожнае лета мы з дзядзькам Мікітам, Ленчыным бацькам, рэжам вепікі. Злева таксама будзе вялізная булінская адрына, куды буліпцы звозяць снапы і дзе заўсёды пахне збожжам і холадам — туды ў самую гарачыню хаваюцца коні і, паклаўшы адзін аднаму галовы на шыі, сапліва стаяць, памахваючы хвастамі, і чакаюць, калі крыху пахаладае, каб можна было скубці траву. А пройдзеш яшчэ — і ўжо ля самай дарогі, за пагоркам, Тупьцішына зямлянка. Праўда, адразу зямлянкі не бачыш. Спачатку відзён толькі комін, абы-як скляпаны з бляхі,— відаць, кляпаў Лёнька, старэйшы Тупьцішын сын. Зямлянкі здалёку не відно, бо яна ўкапана ў пагорак з таго боку, які павернуты да вёскі.

Гэтую зямлянку Туньцісе памог выкапаць караткапогі і лупаты бежанец аднекуль аж з-пад Дрыбіна, які ціха і непрыкметна з'явіўся ў Сябрыпі і, пражыўшы ў вёсцы да вызвалення, адразу ж па вызваленні таксама ціха і незаўважна знік. Ніхто не ведаў, адкуль ён прыехаў сваім канём у бежанцы, ніхто не ведаў, якое меў імя: усе ў вочы і за вочы звалі яго Дрыбінцам.

Дрыбінец араў сваім канём агарод Туньціхі, на абед навязваючы яго ля зямлянкі, і, не маючы ў вёсцы свайго прытулку, нярэдка начаваў у Туньцішынай зямлянцы і сам.

Сёння з бляшанага коміна густа ішоў дым — раней у гэты час Туньціха ніколі не паліла грубкі: вячэру заўсёды варыла ля зямлянкі, на груду. Як смачна здалёк пахла тады бульбаю з кропам! «Можа, пячэ чатыры бохапы, як сказана ва ўчарашнім пісьме?» — падумаў я.

Непадалёк ад зямлянкі, туды, бліжэй да згароды, якая размяжоўвае двары Туньціхі і цёткі Еўкі, даўно ўжо, гады са тры, стаіць зруб новае хаты. Прыйшоўшы дадому пасля вайны, яго пачаў складаць дзядзька Змітра, Туньцішын мужык. Але ён давёў зруб толькі да трох вянцоў, а потым кінуў-рынуў усё — і дзяцей, і зямлянку, і сваю Туньціху — і перабраўся на другі канец, да гаварлівай, языкатай і састарэлай у дзеўках Матруны, якую ўсе ў нашай вёсцы звалі Векавухаю і з якой падсмейваліся як не ўсе жанчыны: Матруне ўсё не ўдаваўся хлеб — ён у яе заўсёды быў ацеслівы, заўсёды ў ім адставала скарынка — сабака пад ёю мог схавацца.

З таго часу зруб сіратліва так і стаяў пад дажджом і снегам — недагледжаны, пакінуты. Ён ужо за гэтыя гады паспеў пачарнець, а падлогі — драўляныя круглякі, што

ляжалі пад вугламі пачатай хаты,— тыя, неакораныя, знізу падгнілі нават і пачалі трухлець.

Гэты ўчарнелы зруб, які стаяў побач з цеснаю і цёмнаю зямлянкаю, вельмі ж ужо непрыемна кідаўся ў вочы — і, зрэшты, відаць, не толькі аднаму мне, а кожнаму, хто ўязджаў ці ўваходзіў у вёску з гэтага канца, дзе Туньцішына зямлянка была першаю хатаю ў Сябрыні.

## ХАТЫ

І вось сёння на пачарнелым ад часу зрубе сядзеў дзядзька Змітра і задумліва курыў. Побач у бервяно верхняга вянца збоку была ўдзёўбнута сякера, стаяла прыслоненая да пізкай сцяны піла.

Пад нагамі ляжала бервяно, якое, агледжанае і абчасанае з двух бакоў, радавала вока белым смалістым колерам здаровага дрэва. Побач валяліся свежыя трэскі — адзін бок чорны, другі белы. Наноў зарубленыя альбо крыху папраўленыя ўсе чатыры вуглы таксама светла бялелі на верхнім вянцы. Словам, там, дзе дакранулася да пачарнелага зруба сякера, свяціліся на сонцы яркія зачосіны.

Калі я ішоў на пошту, нічога гэтага яшчэ не было: стары зруб панура і абыякава правёў мяне аж за ўзгорак. А цяпер дзядзька Змітра сядзеў на зрубе і курыў.

Петрык, самы меншы сын Туньцісі, на маленькіх калёсках вазіў ад зруба да зямлянкі свежыя трэскі — там ужо ля ўвахода бялеўся невялікі грудок падпалу. Калёскі на маленечкіх каточках зробленыя, відаць, сёння. Доўга, пэўна, пацеў ля іх дзядзька Змітра! Я толькі не разумеў — навошта: за гэты час, які корпаўся ля іх, Туньцік мог бы пакласці нейкі лішні вянец зруба...

Дзядзька Змітра быў яшчэ болей маўклівы, чым нават булінскі Манах: з яго, здавалася, слова не выцягнеш. Я ж ведаў яго трошкі іншым. Калі скончылася вайна і застаўся жывы, пакуль не дэмабілізавалі, дзядзька Змітра пісаў жонцы такія ласкавыя і шматслоўныя пісьмы, на якіх можна было падумаць, што ён вялікі гаварун. Я ведаў гэтыя пісьмы, бо непісьменная Туньціха, як толькі я аддаваў ёй канверт, хуценька разрывала яго і падавала мне:

— Прачытай, Ясік.

І я чытаў. Калі даходзіў да слоў: «Родная мая, любая мая Верачка, як я па табе засумаваў, як я ўспамінаю твае

вочы, губы, якія так хочацца пацалаваць», Туньціха чырванела, закрывала рукою пісьмо і прасіла:

— Гэта прапусці, гэта, Ясік, не чытай...

Потым, перачакаўшы крыху, торкала пальцам некуды ў сярэдзіну пісьма і казала:

— Вось адсюль пачні.

— «Дарагая мая Верачка, я ўсё ўспамінаю наша перадваеннае лета, калі мы спалі з табою на сене ў адрыне, усё да драбніц успамінаю, як ты абдымала мяне, як цалавала такімі гарачымі...»

— Гэта таксама прапусці,— закрывала яна зноў пісьмо, і зноў чырвань залівала яе твар.— Вось адсюль чытай.

Многа яшчэ разоў мне даводзілася прапускаць такія словы, пра якія павінны былі ведаць толькі яны з дзядзькам Змітрам удваіх. Не магу сказаць, ці яны, гэтыя словы, так і заставаліся тады непрачытанымі, ці, можа, гэтыя мясціны чытаў ёй хто-кольвек з жанчын, каго яна, можа, меней саромелася.

Вось так, чытаючы пісьмы дзядзькі Змітры, я даведаўся, што Туньціха мае сваё прыгожае імя, што завуць яе Верачкаю, пра што, відаць, аднавяскоўцы забыліся — усё Туньціха ды Туньціха.

З-за таго, што яе хата крайняя ў вёсцы, цётцы Веры было вельмі многа клопатаў. Прыходзяць у вёску партызаны — перш чым куды, заходзяць да яе ў хату і пытаюцца: «Ці ёсць у вёсцы немцы?» Прыходзяць немцы — таксама заходзяць спярша да яе і таксама пытаюцца: «Ці ёсць партызаны?»

Хата была новая — дзядзька Змітра паставіў яе перад самаю вайною. Хату спалілі немцы. Зімою сорак трэцяга ў самыя маразы. Яны акурат ішлі тады з аблавы на партызан, пазамярзалі, паазалелі, а тут пехта (многія кажуць, што гэта Васянок) падказаў, што ў Туньціхі начавалі перад гэтым партызаны. «О, тады трэба тут пагрэцца!» — зарагатаў рыжы і высокі немец, падышоў да страхі і паднёс запалку пад салому. Хата так і ўспыхнула. І згарэла, нібы свечка,— ні галавешкі не засталося.

Дзядзька Змітра, калі вярнуўся з вайны, доўга сядзеў на папялішчы, якое пачало ўжо зарастаць, і зацята курыў. Потым кінуў недакурак, акуратна затаптаў яго пяткаю бота — каб не было пажару: нібыта гэты попел, які і так перагарэў датла, зноў мог ухапіцца полымем. Рашуча ўстаў

і ўзяўся за тапарышча. А неўзабаве на старым хацішчы ўжо стаялі вось гэтыя тры вянцы новага зруба...

— Вера, ці скора там яешня твая сасмажыцца? — павярнуўшыся да ўвахода ў зямлянку, крыкнуў дзядзька Змітра.

— Ідзі ўжо еш! — прачыніўшы дзверы, адказала цётка.

Дзядзька Змітра паціху злез са зруба, няспешна патузаў тапарышча, дастаў уцюкнутую ў бервяно сякеру і, узяўшы яе з сабою, пайшоў у зямлянку.

А я, заглядзеўшыся на зруб, які сёння гэтак памаладзеў, прайшоў ужо быў правулачак цёткі Еўкі. Вярнуўся назад і як не бягом ускочыў на сцежачку.

Ля сенечак, пад страхою, ляжалі парэзаныя і пакалатыя дровы — складзеныя, відаць, ужо на зіму. Адзін бок іх аб'ехаўся і абурыўся — ці то куры абсунулі (яны і зараз сядзелі на плашках), ці то дровы дрэнна былі складзены і разваліліся самі.

Ні па двары, ні ў градах цёткі Еўкі не было відаць. Я адчыніў рыплівыя дзверы і ў цемнаце сенцаў ледзь намацаў клямку.

— Цётка, а вам сёння перавод! — яшчэ не зайшоўшы ў хату, яшчэ з парога радасна грымнуў я.

Цётка Еўка ляжала на палку тварам да сцяны. Ля яе галавы, сюды, бліжэй да акна, стаяла ў кадушцы вялікая, аж пад столь, пальма, з запыленым, доўгім і вузкім, як у шаўковай травы, лісцём. Цётка павярнула галаву, і праз лісцё я ўбачыў заплаканы твар.

— Чаго ты крычыш, змей? Чаго?

— Вам грошы прыйшлі,— ужо ціха і нясмела паўтарыў я.

— Анямей ты са сваімі грашамі! Не паказвай мне іх. Нясі іх хутчэй з мае хаты. Куды хочаш нясі...

Цётка Еўка загаласіла.

— Дык вы ж усё чакалі іх,— вінавата пачаў я.

— Анямей, я табе кажу! Не хачу бачыць тваіх грошай!

І цётка, закрыўшы мокры твар рукамі, заплакала наўзрыд і адвярнулася да сцяны.

Я кінуў перавод на суднік, дзе стаялі неприбраныя і непамытыя міскі, і хуценька выбег з хаты. Пакуль бег па правулку, усё чуў, як галасіла і прычытала цётка Еўка, як некага кляла.

Я не мог зразумець, што здарылася. Так чакаў чалавек гэтага пераводу: не давала прайсці, усё — «калі прыня-

сеш» ды «калі прынясеш», а як прынёс — толькі насварылася.

Што здарылася з цёткаю Еўкаю?

Я выбег на вуліцу і хацеў незаўважна праскочыць ля хаты Ігната Халадзёнка. Дзядзька Ігнат — старэйшы брат Манаха ў Белых Штанах — прыйшоў сюды з Буліна ў прымы. Худы і доўгі, як жардзіна, ён перажыў сваю паўнатварую Палагею і цяпер таксама жыў адзін у не старой яшчэ хаце-пяцісценцы. Сваіх дзяцей яны з Палагеяю не мелі, а адзіны сын, які быў ужо ў жонкі, калі Ігнат сышоўся з ёю, і які нібы да роднага бацькі прывык да айчыма, не вярнуўся з вайны — яшчэ і зараз пад бэлькаю, між сухіх галінак леташняга маю, тырчыць акуратна складзеная ў чатыры столкі пахавальная, якая балюча напамінае, што хлопец загінуў смерцю харобрых недзе між Невелем і Гарадком.

На свайго брата Халадзёнак зусім быў не падобен. Толькі барада, такая ж густая, як і ў Манаха, здалёк нагадвала пра іх сваяцтва.

З гэтым дзядзькам Ігнатам у мяне была цэлая бяда. Ён заўсёды, зімой і летам, у спёку і ў мяцеліцу, сядзеў на лаўсёды, зімой і летам, у спёку і ў мяцеліцу, сядзеў на лавачцы ля хаты, адхінуўшыся спіною на частакол, і падазрона глядзеў на мяне:

— Што, і сёння ты маю хату абмінаеш?

— Дык вам жа, дзядзька, нічога няма.

— Ну ладна, хай сабе пісьма няма. А чаму ты мне газэтку рэдка носіш? Вунь Рагатунам дык кожны дзень...

— Дык вы ж, дзядзька, такую выпісалі. А Рагатуны — большую.

— Большую не большую, а ты і гэту кожны дзень насі. А то ў мяне вунь курыць няма чаго. Пакуль новую прынясеш, дык я тую ўжо скуру. Дый папера таўставатая — пыхкае, як зацягнешся.

— Дык вы, дзядзька, выпішыце большую, каб кожны дзень хадзіла. А раённая рэдка ходзіць.

— Не знаю, як яна ходзіць, але ты, відаць, малец, маёю газэткаю ўсе сцены ў хаце выклеіў. Трэба неяк сабрацца ды прыйсці паглядзець. А то ты нешта вочы ў зямлю хаваеш, бягом ля маёй хаты прабегчы спяшаешся.

Гэтага я баяўся. Бо хата ў нас сапраўды была выклеена газетамі — хоць не Ігнатавымі (я купляў іх на пошце), але ж потым паспрабуй дакажы яму, што тут няма той, якую ён чакае штодзень.

І абмінуць яго хату было цяжка. Бо побач, амаль стра-

ха ў страху, на гэтым жа баку вуліцы, стаяла хата Рагатуноў, якія выпісвалі «Звязду». Таму на другі бок вуліцы не пяроідзеш і ідзе не дзенешся — мусіш штодзень прабягаць ля Ігнатавай лавачкі.

Сёння Халадзёнка на лавачцы не было. Я, радасны, амаль праскочыў ужо ля яго хаты, як адчыніліся сенцы і дзядзька Ігнат паслаў наўздагон мне сваё звыклае пытанне:

— Што, зноў маю хату абмінаеш?

І потым, ідучы на лавачку, доўга бубнеў нешта сабе пад нос. Многія прывыклі да такіх дзівацтваў Халадзёнка. Але мяне, прызнаюся, яны крыўдзілі.

Вось гэтую хату і ўсё, што рабілася, гаварылася і пяклося ў ёй, я любіў шчыра і даўно — у гэтай хаце жылі Рагатуны.

Я неяк даўно заўважыў, што амаль усе людзі, зрэшты, нагадваюць птушак, звяроў, сваю хатнюю жывёлу, а тыя па-свойму падобныя бываюць на гаспадароў. Вунь хоць бы сабе ўзяць Туньціху. Поўная, круглая, свежая з твару, хоць усе ведаюць, што яна, як казаў дзед Сянчыла, жыве адным святым духам. І каб каго іншага пасадзіць на тыя харчы, якімі жыве Туньціха, то, відаць, праз месяц-другі ў таго б адна скура ды косці засталіся. І карова якраз такая ж поўная і сытая, хоць есць як не адну толькі салому. І ў Лабатай (так заве Туньціха сваю карову) такая ж, як і ў гаспадыні, пакора і спакой, такая ж сарамлівасць у вачах...

Цётка Еўка падобна на сваю хату — такая ж згорбленая і самотная.

Ігнат Халадзёнак, калі глядзець толькі на яго вочы, вельмі нагадвае пугача: вочы раскрыты шырока-шырока, не міргаюць і глядзяць на цябе, але нічога, здаецца, не бачаць перад сабою — усё праз цябе, за цябе, паўз цябе. А ў вачах ці то нейкі сум, ці то нейкая насцярожанасць, ці то падазронасць. А калі глядзець на Халадзёнкавы вушы — ну, выкапаны заяц. Вушы вялікія і доўгія — здаецца нават, вышэй галавы вытыркаюць, калі чалавек без шапкі. Ды і з-пад шапкі тырчаць з двух бакоў, як вушкі ў цэбры.

А вось Рагатуны былі падобны на рэчы, якія меліся ў іхняй гаспадарцы. Сам дзядзька Грышка — невысокі, аднарукі, кругленькі, на кароценькіх нагах — вельмі ж ужо нагадваў гарлачык, якімі пазастаўляны ўсе паліцы, сталы, лаўкі ў хаце. У гэтых гарлачах было і малако, і бяро-

завік, і квас — нават самагонка стаяла часам у іх, накрытая якою-небудзь фанеркаю. Асабліва дзядзька Грышка быў падобен на гарлачык з ручкаю тады, калі ён у якой бяседзе, расчырванеўшыся ад выпітай чаркі, упёршыся адзінаю рукою ў бок і ўзяўшыся ёю за шырокі салдацкі рэмень, круціўся пасярод хаты між танцораў, прытупваючы кароценькімі нагамі — акурат гарлачык на ганчарным крузе. Таму ў дзядзькі Грышкі акрамя мянушкі Рагатун была яшчэ і другая, не менш важная — Гарлач.

Рагатуніха, цётка Прося, дужа нагадвала мне жорны. Такая надта ж круглая, падзеленая на дзве часткі чорнаю спадніцаю і сіняю кофтаю. Але, нягледзячы на сваю абойсцаю, яна была рухаваю — тут ёсць, тут няма,— што здавалася часам, нібыта ў цёткі Просі не дзве, а, як у сапраўдных жорнах, цэлых чатыры нагі.

Доўгаю і сухою была бабуля Домна — маці цёткі Просі, якая жыла з Рагатунамі, і зімою і летам, укруціўшыся ў хусцё, ляжала на печы і, здавалася, абыякава глядзела з-за коміна на хату.

Але гэта толькі здавалася — бабуля Домна бачыла ўсё. Калі яшчэ дадаць, што ў яе былі вельмі тонкія губы, то будзе зразумела, чаму яна нагадвала мне чапялу.

Акрамя гэтага ў хаце было поўна малых Рагатунят, іх, як жартаваў сам дзядзька Грышка, яго цешча не магла ўжо нават пералічыць — збівалася недзе на сёмым ці на восьмым. Яны ўсе былі ў бацьку — тут бегалі і гладышыкі, і гарлачыкі, і жбаняткі...

У гэтую хату я вельмі любіў заходзіць і таму радаваўся, што дзядзька Грышка выпісаў «Звязду». Я ведаў, што Рагатун і сёння, як заўсёды, сустрэне мяне вясёлаю ўсмешкаю:

— Канешне — напу яешня. Вось і пошта палявая прыйшла.

Ён адною рукою браў газету, весела падміргваў мне і, пакасіўшыся на печ, ціхенечка шаптаў:

— Бяжы ў сад.

— А пошта? — шаптаў і я.— Мне ж пошту трэба разносіць.

— Пошта не ўцячэ,— зноў шаптаў дзядзька Грышка.— Бяжы ў сад, кажу, пакуль Домна не пачула.

— Што вы ўжо там шэпчацеся, злыдні? — раптам чулася з печы: баба Домна скідала хустку, мелася злазіць.

Я ведаў, што дзядзька Грышка не баяўся сваёй скнараі цешчы, але не любіў звягі. Баба Домна лічыла, што

Просі, яе адзінай дачцэ, не пашанцавала ў жыцці — яна выйшла за ветраніка, які не дбае пра хату, і каб не яна, рупны чалавек, што адно толькі і думае пра гаспадарку, зяць даўно б ужо ўсё да ніткі параздаваў чужым людзям. І таму калі бабка Домна бачыла, як Рагатун частуе каго-небудзь яблыкамі ці чым іншым, яна пачынала галасіць і прычытаць, успамінала нават пра зямельку, якая яе чамусьці не бярэ, ды так, што дзядзька Грышка моршчыўся і выходзіў з хаты.

— Чуў? — пытаўся ён.— І радзіва не пада. Толькі і розніцы, што ў радзіве спяваюць, а яна, бачыш, галосіць...

Цётцы ж Просі Рагатун падабаўся. Яны жылі дружна і весела.

Калі ён паліў у лазні і калі ўжо нават бабуля Домна, якая любіла мыцца самаю апошняю, расчырванелая і пачысцелая з твару, зноў ляжала, ухутаўшыся ў сваю хусту, ля коміна на печы, дзядзька Грышка браў у мяне з рук пошту, клаў на лаўку і падміргваў:

— Ідзі ў лазню.

— Дык а пошта?

— Канешне — папу яешня. Пошта не ўцячэ. Бяжы, пакуль вада не прастыла.

— Ён жа ўсю ваду выллe,— чуў я ў сенцах.— Нават твае штаны не будзе Просі ў чым памыць.

І заўсёды, калі я выходзіў з хаты Рагатуноў, то ў кішэні, то ў шапцы, якую, здаецца, і знімаў толькі на нейкую хвіліну, то за пазухай знаходзіў ці агурок, ці жменю арэхаў, ці якую грушу — не толькі бабка Домна, але і я нават сам не мог заўважыць, калі дзядзька Грышка ўсё гэта паспяваў уторкнуць ці ўкінуць.

Мы вельмі зайздросцілі Рагатунятам. Іх было многа. Сам дзядзька Грышка жартаваў:

— О, у мяне такая грамада — разам як плюнем, дык і ката затопім.

У Рагатунят якраз было вельмі многа таго, чаго заўсёды не хапала нам — волі. Яны гулялі колькі хацелі, рабілі ўрокі калі хацелі, ішлі вячэраць, таксама калі хацелі самі — есці іх ніхто і ніколі не клікаў. Не тое што ва ўсіх нас — толькі разгуляешся, скажам, у лапту ці ў масла, а тут: «Віця, ідзі еш!», «Толя, колькі разоў я буду табе крычаць — ідзі еш, бо капуста стыне».

Іх жа ніхто не прымушаў есці, ніхто ім не наліваў.

Яны самі нікалі па жбанках і чыгунках і, калі што знаходзілі, налівалі ў місы. Калі ж не знаходзілі, самі бралі

вілкі ці чапялу і вымалі альбо проста так, качаргою, з попелам, гарнулі чыгунок на загнет.

Баба Домна адно толькі сварылася з печы:

— Паразліваюць, зладзеі. Далібог, паразліваюць. Прося, Грышка, дзе вы там: дзеці вымерхаліся, есці захацелі. Памажыце ім хоць шчаўлю паліць...

Сёння акрамя газеты дзядзьку Грышку было яшчэ і пісьмо. Ад франтавога сябра з Украіны. Яны разам ваявалі, і цяпер хоць і рэдка, але ж раз ці два на год з Украіны прыходзіла ў нашу Сябрынь пісьмо. Сябар пісаў па-украінску, і спачатку чытаць Рагатуну было цяжкавата, але потым, калі прызвычаіўся, гэта яму нават падабалася. Дзядзька Грышка адною рукою спрытна разрываў канверт, даставаў пісьмо, чытаў яго і каторы раз расказваў:

— Мы тады з ім якраз з разведкі вярталіся. Языка вялі. І як той шалёны снарад прыляцеў — не ведаю. Памятаю толькі, што ён нізка шлопаў недзе над намі — шлоп-шлоп-шлоп... Нібыта Домна па лужынах у атопках ідзе... І ўсё. Апрытомнеў, гляджу, а зразумець нічога не магу. Ляжу бачком я на зямлі, бачу, крыху зводдаль на карачках сядзіць аслупянелы Грыцай, трымае аберуч маю руку і, вылупіўшы вочы, нібы вар'ят, глядзіць на яе, акрываўленую. Потым падпаўзае да мяне і торкае гэтай рукою ў маё пляччо — нібыта прыклеіць збіраецца. І да мяне таксама пакуль што яшчэ не дайшло, што ўжо гэтую руку нанова не прыставіш,— я таксама памагаю Грыцаю, хоць гэта і дужа балюча, прыціскаць яе да акрываўленага пляча. Пакуль мы прыстаўлялі маю руку, немец, язык наш, паціху-паціху адпоўзся і ўцёк да сваіх...

Сцежка да хаты Рагатуноў ішла праз добры стары сад — якраз пасярод яго. Яна, нібы расхінаючы лісцё, спяшалася між кустоў агрэсту; згіналася пад разгалістымі яблынямі, адводзячы ўбок галіны, якія нізка навісалі над зямлёю; абыходзіла вялікія, нібы сапраўдныя дрэвы, слівіны, па якіх сінеліся і чырванеліся не аб'едзеныя яшчэ слівы — нават такая сям'я, як у Рагатуноў, не магла справіцца з сёлетнім ураджаем у садзе. Гэты сад быў яшчэ большы, але ў фінскую вайну, калі раптам цісканулі нечуваныя маразы, многія дрэвы павымярзалі, і цяпер на тых месцах, дзе раней яны заступалі градам сонца, усё яшчэ шэра тырчалі нізка пазразаныя пянёчкі — я толькі дзівіўся, чаму дзядзька Грышка не выкарчуе іх, бо яны замінаюць ўрабляць гарод.

Рагатуноў сад, падсаджаны і перагледжаны, раскаша-

ваўся зараз не толькі перад хатаю, але і за ёю, сягаў нават пад гумны. І дзіва дзіўнае! Хоць сад зусім не быў абгароджаны — у яго можна было зайсці з якога хочаш боку,— ні ў яблыкі, ні ў слівы ніхто да Рагатуноў не лазіў. А ў тыя сады, дзе былі самыя высокія агароджы і якія вартавалі самыя злыя сабакі,— лазілі. Храпалі агароджу, прывязвалі сабаку — і абтрасалі яблыні.

Вунь у Халадзёнка летась нават сучачку спаілі — далі хлеба, намочанага ў самагонку, дык тая і заснула. Халадзёнак ледзь раніцою дабудзіўся — храпла, кажуць, як чалавек, а пасля ўсё чаго кісленькага шукала. А мальцы тады самую смачную яблыню абабралі. Хоць побач стаяў разгароджаны Рагатуноў сад.

Можа, да Рагатуноў ніхто ноччу не хадзіў у яблыкі, бо не было азарту, таемнасці і тае рызыкі, ад якой аж халадзеюць вушы,— якая там рызыка лезці ў разгароджаны сад! Кожны мог зайсці сюды ўдзень, нашчыкаць колькі трэба яблыкаў і пайсці не хаваючыся — ніхто б на яго за гэта не крычаў, не лаяўся. Зразумела, апрача толькі старої Домны.

Яна, як кажуць, зусім загрызала зяця за тое, што ніяк не збярэцца абгарадзіць сад:

— Ва ўсіх людзей сады як сады, а ў гэтага гультая рыжага нейкая вырваньская вуліца — хто ідзе, той і заходзіць. Колькі ўжо яму кажу: «Грышка, абгарадзі ты хоць ад статка, хоць у якую адну жардзінку»,— а ён быццам і не чуе. Грыбы свае тоўстыя адставіць і смяецца. А якая дзе ёсць свіння паршывая ці карова шалудзівая, абавязкова прыйдзе ў яго сад, стане пад яблыню самую лепшую і трэцца бокам аб кару — чухаецца са смакам. Далібог, усе дрэвы так папаломяць, злыдні. А яму адны смешыкі...

У хаце Рагатуноў было ціха. І неяк цемнавата — можа, гэта здалося адразу з вуліцы, а можа, хату сапраўды цямнілі вялізныя кусты бэзу, якія даставалі аж да самых апошніх балонак ва ўсіх вокнах і скрэбліся па шкле. Здалося, што ў ціхай хаце нікога няма. Толькі восеньскія мухі спакойна гулі над папакрыванымі рознымі накрыўкамі місамі і гарлачыкамі.

Але баба Домна, укруціўшыся ў цёплую хусту, ляжала на сваім улежаным за гады месцы — за комінам, на печы.

— А дзе гэта дзядзька? — спытаўся я.

— Няма твайго дзядзькі. Ого, ён табе сёння ў хаце сядзець будзе! Яго ты сёння ў хаце і па вяроўцы не ўтры-

маеш. Вунь бульбы на заўтра не пакапана, у вёдрах вады апі кроплі, дроў не насечапа — пад загнетам пуста, хоць ты ў схованкі гуляй, а ён падпеэразаўся сваім рамянём і нікнуў з хаты. На вяселле пабег, злыдзень. Ого, яму, бачыце, там нада быць, яго, бачыце, там чакаюць. А што ты, д'ябал рыжы, там забыўся? Што там табе нада? Паглядзець, як Цыца жэніцца? І паскакаць? Дроў у хаце няма, а яму скакаць заманулася. Во гультай дык гультай...

Я ведаў, што зараз даслухаць бабу Домну, каб і схацеў, не змагу — яна рада, што ў хату зайшла жывая душа, якой можна расказаць свае крыўды на зяця, і таму будзе гаварыць і гаварыць не перадыхаючы. Ды і наогул ёй цяпер усё роўна — слухае яе хто ці не, згаджаецца з ёю ці не. І я, стараючыся не бразнуць клямкаю, не рыпнуць дзвярыма, ціхенька выйшаў у сенцы, а баба Домна і ў пустой хаце ўсё яшчэ лаяла свайго «гультая», свайго «лайдака» — зяця, які не слухаецца яе парад...

Гэтай бабе Домне абы толькі сварыцца: я ж ведаў, ды, пэўна, ведала і яна сама, што будзе прынесена і вада і што печ у іхняй хаце таксама не застанецца не паленая — цётка Прося знойдзе раніцою пад загнетам сухія дровы.

Ужо на вуліцы ўспомніў, што забыўся пакласці пісьмо ад Грыцая, але вяртацца назад не хацелася. Газету я-то аддаў — знайшоўшы вольнае месца на лаўцы, усунуў яе між гарлачоў. «Ну, а пісьмо аддам на вяселлі»,— падумаў я і шмыгануў між яблынь.

Халадзёнак сядзеў на лаўцы — нібыта знарок чакаў мяне.

— Дык што, ты маёй газэткі так і не аддасі? Відаць, Гарлачам занёс яе? — крыкнуў ён мне насустрач.

— Не, дзядзька, я Гарлачам іхнюю занёс...

Халадзёнак усё яшчэ падазрона вывучаў мяне. Потым задраў галаву ўгору, нейкі час глядзеў у неба, пасля адвёў вочы ўбок, зачапіўся за вільчык Рагатуновай хаты, за апусцелае ўжо буслінае гняздо на сваёй ліпе і раптам ні з таго ні з сяго спытаўся:

— Ты не чуў, ці знайшлі тых зладзеяў, што ўчора ў булінскі сад лазілі?

— Не ведаю,— адказаў я.— А чаго гэта вы ў мяне, дзядзька, пытаецеся?

— Во ўбачыў тваю руку дый думаю, ці не быў і ты там?..

— Што вы, дзядзька! — адчуваючы, як чырванею, як

ад страху закалацілася сэрца і пачалі слабець ногі, пясмела пачаў я.

— Вось табе і «што вы»... А то вунь Малах казаў, што ўчора на іх напад быў. Быццам бы многа зладзеяў прыязджала. На машынах нават. Ледзь адстраляліся ад іх. Малах казаў, што павінны з Воршы вучаных сабак прывезці — сляды будуць пюхаць.

У нашай вёсцы ды і ў Буліне звалі Халадзёнкавага брата Манахам у Белых Штанах, і толькі адзін Ігнат настойліва зваў брата правільна, так, як запісалі яго яшчэ ў царкве — Малахам.

— О, сабака — гэты, брат, след возьме і любога злодзея зловіць,— перавёўшы позірк з бусліпага гнязда на мяне, нібыта сам сабе, заўважыў Халадзёнак.— Дык ці злавілі іх?

— Не ведаю,— паспешна адказаў я і пабег далей.

— Глядзі, каб гэты след да вашай хаты не прывёў,— кінуў ён наўздагон і засмяяўся.— Вось тады ты мне газэтку прынясеш...

Той страх, які пасля сустрэчы з вартаўнікамі ў садзе быў ужо крыху аціх, зноў пачаў варушыцца, разрастацца, шырыцца, і, здаецца, праз нейкі час ён, калматы і пругкі, запаланіў усяго — не было як нават дыхнуць, каб не адчуць яго халоднае цела.

Ладны кавалак вёскі выпадаў — ні пісем, ні газет у гэтыя колькі хат не было, і я хутка бег па сцежачцы ля самых платоў. Сустрэў Рагатуновага Рамана — той праставаў дадому.

— Адкуль ты?

— З вяселля,— адказаў ён не спыняючыся.— Сёння ж Цыца жэніцца. Я яшчэ б там пабыў, але татка папрасіў, каб накапаў бульбы і вады прынёс...

Я паспеў ухапіць яго за футболку:

— Пачакай. Вунь мне Халадзёнак казаў, што па сабак паехалі, у сад іх прывядуць — каб сляды панюхалі.

— Слухай ты свайго Халадзёнка! Мне татка казаў, што Манах у Белых Штанах сапраўды крык усчаў, каб па сабак ехалі. Бажыўся, што зладзеі на машынах былі. А потым пайшлі ў сад, паглядзелі, а сляды нашы маленькія — ты ж сам ведаеш. Дык толькі з Манаха пасмяяліся, ды і ўсё; а ты кажаш — нюхаць...

І невялікі ростам, рыжанькі і тоўсценькі гладышок, вельмі ж падобны да свайго бацькі, пабег дадому.

Я ўспомніў пра пісьмо і гукнуў Рамана. Той спыніўся:

— Чаго ты?

— Вазьмі во бацьку пісьмо аддасі, а то твая баба як пачала сварыцца, дык я на яго і забыўся...

Мой страх пасля сустрэчы з Раманам зноў пачаў змяншацца — так асядае надзьмутая паветрам гумовая цацка, калі з яе вымеш раптам заткала. Цяпер ён, страх, які толькі што быў падобен на калматага і вялізнага мядзведзя, зрабіўся такі маленькі і пушысты, бы кацяня,— з ім нават захацелася падурэць, пазабаўляцца! Ці нават пагладзіць яго...

У мяне заўсёды гэтак бывае, калі страх праходзіць...

Перабег на той бок вуліцы і па захаладалай надвечар сцежцы пайшоў да хаты дзядзькі Мікіты — трэба перадаць позву. Хоць яна і была напісана ад рукі, усё ж мела строгую форму — позва загадвала яму ў панядзелак з'явіцца ў суд.

Неяк перад гэтым дзядзька Мікіта прывёз сабе цэлы воз бярэзніку, а тут нечакана нарваўся п'янаваты ляснік Мацуль. Той хацеў выпіць яшчэ, але ні ў самога дзядзькі Мікіты, ні ў каго з суседзяў акурат на той час не знайшлося самагонкі. Так яны з лесніком слова за слова і схапіліся, дасварыўшыся да таго, што Мацуль склаў нават акт. Ніхто не спадзяваўся, што ён перадасць яго ў суд, але пакольні ў панядзелак выклікаюць дзядзьку Мікіту ў Оршу — значыць, перадаў.

З Ленкаю сустракацца не хацелася — мне ўсё яшчэ было крыўдна, я ўсё яшчэ злаваўся, што яна так садрала мне руку, якая хоць троху і зацягнулася, але пакуль саднела. Калі ж гаварыць шчыра, дык гэта я толькі сам сябе ўгаворваў, што мне зусім не хочацца бачыць яе, а папраўдзе мяне міжволі цягнула ў гэтыя расчыненыя насцеж веснічкі.

Колькі і раней я прыдумляў розных прычын, абы толькі зайсці ў хату да дзядзькі Мікіты! То зманю, што забыўся заданне па літаратуры, то прыбягу папрасіць цыркуля — ці мала ёсць тых прычын у вучняў аднаго класа!

А калі ўжо бачыў курыцу ў іхнім гародзе, тады ўсё было проста. Улятаў у хату, спяшаючыся крычаў: «Дзядзька Мікіта, куры вашы грады дзяруць!», а сам заставаўся ў іх гуляць да вечара.

На двары ў дзядзькі Мікіты нікога не было — толькі курыцы са дзве граблося ў пыле,— відаць, усё спрабуючы дагрэбціся да цяплейшай зямлі.

Пужнуўшы курэй, я ўзбег на высокі ганак і хуценька

ўскочыў у расчыненыя сенцы. І аж спыніўся ад неспадзяванкі і, сумеўшыся, апусціў галаву: як не нос у нос сутыкнуўся з Ленаю. Яна была ў сенцах і, асцярожна, далікатна перабіраючы лісток за лістком — усё ніжэй і ніжэй,— мыла фікус. Лена таксама, як мне здалося, сумелася, але не падала выгляду. Яна адною рукою хуценька апусціла паркалёвую сукенку, якая доўгаю, расклёшанаю палою была падторкнута пад паясок, і адразу ж зірнула на свае ногі — ці не відаць яны лішне, ці добра закрыла іх сукенка?

— Ці ў хаце бацька? — сярдзіта, не гледзячы на яе, спытаўся я, хоць ведаў, што дзядзькі Мікіты ў хаце не можа быць — ён жа пастух і зараз яшчэ ў полі.

— А навошта ж табе, Ясічак, мой бацька? — знарок ласкава адказала Лена — мне нават падалося: яна рада, што я зайшоў.

— Яму позва прыйшла...

— Дык я ж магу перадаць яму. А бацька ж мой, Ясічак, у полі яшчэ. А мамка — на вяселлі. Ты ж хіба не ведаеш, што сёння Цыца жэніцца? А гэта ж наша радня.

Я і сам ведаў, што сёння вяселле Лаўрэнавага Жэнькі, хлопца, да якога з маленства яшчэ прыклеілася мянушка «Цыца» — малы, ён доўга не даваўся адняць сябе ад грудзей і на ўсё круглае гаварыў «цыца»: бульбіна — цыца, яйка — цыца, яблык — цыца і нават вялікі круглы камень, што ляжаў за іхняю хатаю, для яго таксама быў цыцаю.

Лена нагнулася над фікусам і дамывала ніжнія лісты. Ласкава яна сцірала далонёю пыл з кожнага ліста, і яны адразу пасля вады пачыналі зелена кідацца ў вочы.

Гэты фікус быў мне знаёмы. Нярэдка, калі ў Мікітавай хаце заспяваў мяне дождж, Лена ласкава прасіла:

— Ясічак, паможы вынесці на дождж фікус.

І мы з ёю, з двух бакоў узяўшыся за вазон, неслі яго з хаты. На парозе апускалі як не да самае падлогі і нагіналі макаўкаю ўперад: фікус быў вельмі высокі, аж пад столь, і так у дзверы не праходзіў. А цётка Юлька, Ленчына мама, толькі крычала:

— Лена, пастаў зараз жа фікус! Або, ці гэта ты ашалела, на такі лівень выносіць: ён жа ўсё лісце паабаб'е...

Але мы ўсё ж выносілі фікус на ганак і самі, падставіўшы твары дажджу, нейкую хвіліну задаволена фыркалі пад ліўнем, пакуль не пачынала прыліпаць да цела лёгкае летняе адзенне...

Мне не хацелася так хутка выходзіць з сенцаў. Я таптаўся, Лена гэта заўважыла і сказала:

— А позву пакладзі на ўслон. Яна ж нідзе не дзенецца...

Я пачаў корпацца ў пісьмах, каб дастаць паперку.

— А Ясічак ты мой! — пачуў я над самым вухам.— А хто ж гэта табе ўсю руку абадраў? А якая ж гэта ваўчыца так укусіла?

Я ўзняў галаву. Ленка стаяла побач (калі яна толькі падышла!) і глядзела на мяне такімі вялікімі, такімі шчырымі і такімі невінаватымі вачыма, што можна было нават і самому ўсумніцца: пэўна, яна і праўда тут ні пры чым — ніякай маёй рукі яна не чапала, а тое, што было ўчора, мне толькі здалося...

Ну і хітрая ж яна, брыкуля, круцёлка гэтая! То ж трэба, так распаласавала руку, а зараз яшчэ прыкідваецца, што нічога не ведае!

Лена ўзяла маю далонь у сваю руку, ласкава-ласкава дакранулася доўгімі пальцамі і лёгенька правяла па ране.

— А Ясічак, хто ж гэта быў такі злы?..

Яна ўзняла маю руку яшчэ вышэй і дакранулася да раны сваімі цёплымі і мяккімі вуснамі. Мне было казытліва, нават крыху балюча, але як, ліха на яго, прыемна!

— А я маме сказу, сто ты Ясю луку цалавала...

Гэта Волечка, малая Ленчына сястра. Яна была тут жа, у сенцах, і непадалёк ад услона садзіла сваю ляльку, зробленую са старой мамінай хусты, на кансервавую бляшанку з-пад амерыканскай смажаніны. Лялька ўсё валілася з бляшанкі на бок, нявіннымі вачыма, якія намалявала Ленка чарнілам, глядзела на сваю дужа строгую «гаспадыню». А тая ўсё сварылася на яе, ушчувала ляльку, нават біла яе (ды моцна — з лялькі аж пыл ішоў) і, здавалася, на нас не глядзела. Аж не, яна ўсё бачыла, хоць і займалася са сваёю «дачкою».

— Луку, луку,— перадражніла Волечку Лена і сцебанула яе аскарачом — і, відаць, моцна зачапіла махрамі, бо малая аж заплакала і дражнілася ўжо са мною:

— А я ўсё лоўна знаю, сто ты насу Лену любіс... Во... І заніцца з ёй будзіс... Во...

— Змоўкні зараз жа! — прыгразіла ёй Ленка, а мне сказала: — Давай, Ясічак, тваю руку завяжам, каб хутчэй гаілася.

Я адняквўся, але Ленка, не слухаючы мяне, пабегла

ў хату — пашукаць які шматок матэрыі, каб завязаць руку.

Малая зноў садзіла сваю «непаслухмяную дачку», лаяла яе, што не просіцца: «Эх ты, бессаромніца, бальсуха». Хоць лялька была сухая, а ў самой Волечкі падазрона прылiпала сукеначка...

Лена прынесла каснічок ад свае колішняе сукенкі, у якой яна мне вельмі падабалася. Сукенка была зялёная, а па ёй лятали невялічкія, як белыя матылі, кветкі. Лена перавязвала мне руку.

*Божа мой! Якое гэта было непаўторнае і не зраўнанае ні з чым — ні да гэтага, ні пасля гэтага — шчасце! У мяне кружылася ад радасці галава... Прызнаюся, што потым былі ў маім жыцці і больш ласкавыя, і больш значныя падзеі, але такога настрою, такога адчування болей ужо мне не сустракалася. Тая радасць, тое шчасце былі наіўнымі і апантанымі, яны здаваліся самым невялікім і таму ўжо ніколі не змаглі і, я ўпэўнены, не змогуць паўтарыцца...*

Потым мы стаялі ў сенцах і глядзелі на сонца, якое было ўжо зусім нізка, на яблыню, што аж бялела ад антонавак.

— А помніш, як у цябе таксама рука балела?

— Ага,— адказала яна і ўсміхнулася.

Мне вельмі падабаецца, як Лена смяецца. Яе вусны тады неяк крывяцца, нібыта яна вось-вось заплача, і ў гэтай усмешцы міжволі з'яўляецца штосьці журботнае, задумлівае — дарослае.

Пра тое, як у Ленкі балела рука, ведае не толькі наш клас. Гэта разышлося вельмі шырока — смяяліся з яе нават дарослыя. Ды і зараз, здараецца, сёй-той з нашых сябрынцаў пры нагодзе скажа: «Нешта ты, як Лена Мікітава,— не ведаеш, чаго хочаш».

А гэта было яшчэ ў першым класе. Тады ў Ленкі на правай руцэ села болька. Ды такая, што дзяўчынка не магла пісаць — ручку не было як трымаць. Ленка сядзела на ўроку і плакала. Настаўніца, а ў першым класе нас вучыла Бусліха, цярпліва яе ўгаворвала:

— У цябе ж баліць рука — ідзі дадому.

— А я хачу пісаць.

— Дык пішы.

— А ў мяне баліць рука.

— Дык сядзі так.

— А я хачу пісаць.

І гэтае «а я хачу пісаць» цягнулася вельмі доўга, да таго часу, пакуль настаўніца не раззлавалася:

— Дык скажы ўсё ж, Лена, чаго ты хочаш?

— А я хачу, каб болька з гэтай рукі перасела на гэтую,— шчыра праз слёзы прызналася Лена. Нават Бусліха, якая рэдка дазваляла сабе такую раскошу, як усмешка на ўроку, засмяялася сама і доўга потым ніяк не магла супакоіць нас.

Лена наогул часта плакала ў школе. Аднаго разу Бусліха, выправіўшы з класа Лёшку, малодшага Ленчынага брата, які з кнігамі прыйшоў у школу («Чый ты?» — «Ленчын Лёшка».— «А дзе ты жывеш?» — «У новай хаце».— «А чаго ты прыйшоў?» — «Вучыцца»), папрасіла Лену паказаць рашэнне задачы. Ленка заплакала:

— А я сшытак дома забылася.

— Схадзі прынясі.

Ужо і ўрок канчаецца, а яе ўсё няма. Бусліха падпімае мяне і Клёцку і кажа:

— Схадзіце і паглядзіце, што яна там робіць.

Мы пайшлі. Падышлі да сенцаў, тарганулі за дзверы — не адчыняюцца: сенцы адтуль зашчэплены. Клёцка знайшоў трэсачку і праз шчыліну падняў ёю крук. Зайшлі ў хату і бачым: Лена сядзіць за сталом, над сшыткам, румзае і задачку рашае — яна заданне не зрабіла і схлусіла, што сшытак забылася.

Клёцка пабег першы. Я — за ім. Клёцка ўсё расказаў Буслісе. А Лена тады доўга не гаварыла са мною...

— Чаму ты тады не з Клёцкам, а са мною не гаварыла? — пытаюся я ў яе, успамінаючы той выпадак з задачкаю.

— А я на цябе ўсердзілася. Чаго ты тады з Клёцкам прыйшоў? Яшчэ мне Клёцкі твайго не хапала.

— Дык нас жа настаўніца паслала.

— Няхай сабе. А ты б ад Клёцкі ўцёк.

Лена заўсёды такая. Калі мы з ёю ўдваіх, яна добрая, ласкавая — як вось і сёння. Мы мірна можам гаварыць пра ўсё. Як толькі ёсць нехта побач, тады яе лепей не чапай: а то такім ужо карпуном пакінецца, што толькі і беражыся, каб вочы не павыдзірала. Калючая-калючая робіцца. І ў школе заўсёды смяецца з мяне, і так во па «мурашніках», як учора, вырываецца. То ж трэба руку мне ссадзіць. І чаму яна гэтак мяняецца адразу? Спачатку я, не

разумеючы, дужа крыўдзіўся, а зараз, хоць таксама не ўсё разумею, троху зміры́ўся, прывык.

А калі мы малыя былі, старэйшыя хлопцы пасмяяліся неяк з яе:

— Ай-яй-яй, зірніце, як Лена Яся любіць.

Яна расплакалася і праз слёзы даказвала:

— А вот і не люблю я яго. А вот і не люблю...

— Любіш. Любіш — не мані. Каб не любіла, дык зараз бы распранулася і вакол хаты дзесяць разоў абабегла. Тады б мы, можа, яшчэ і паверылі.

Яна расплакалася яшчэ болей — ёй не хацелася распранацца і бегчы вакол хаты, але і прызнаць, што любіць мяне, яна таксама не магла.

Усё ж пабегла. Я не бачыў, а хлопцы мне расказвалі, што бегала і адно пыталася: «Ці скора ўсё?»

А хлопцы, гэтыя байбусы, яшчэ нават лішнія кругі прыбавілі — яна і не заўважыла, як і іх прабегла. А потым усё пыталася:

— Ну, а цяпер верыце? Верыце, што не люблю?..

— Ясічак, ты ўжо трошкі пабудзь, пакуль я фікус дамыю — паможаш мне яго ў хату ўнесці.

Я прысеў на ўслон. З сенцаў, праз асветлены праём дзвярэй, адкуль светлая палоса надбягала аж да Вольчыных лялек, было відаць, як за яблыняю ў Мікітавым садзе чырвана заходзіць сонца. Яно вісела ўжо так нізка, што на яго можна было глядзець не заплюшчваючыся. Лісце варушылася, і таму чырвоны круг сонца пераліваўся, як вадзяныя ясвы пад ветрам, адкрываючыся то ў адным, то ў другім месцы. Ветру тут у сенцах не было чуваць, і таму здавалася, што лісцё гартаюць, пераварочваюць то адным, то другім бокам сонечныя промні.

На яблыні ўсё яшчэ густа калыхаліся, стукаючыся адзін аб адзін, яблыкі. Усе ў вёсцы здзіўляліся, як гэта Мікіту, маючы столькі дзяцей, удавалася даберагчы яблыкі да позняй восені: ва ўсіх ужо дзеці даўно нават з лісцем, нават зялёныя, паабскубуць, а ў яго адна яблыня і тая стаіць нечапаная.

Я ж ведаў сакрэт дзядзькі Мікіты. Ён, калі адлучаўся куды, наказваў дзецям:

— Яблыкі не шчыкайце. Калі хоць адно хто з'есць, я даведаюся. Я ж палічыў.

І дзеці баяліся, не чапалі яблыкаў — бацька ж, вярнуў-

шыся, верылі яны, пералічыць і, не далічыўшыся хоць аднаго, возьмецца за пута... А путаў у іхняй хаце было вельмі многа — дзядзька Мікіта апрача калгасніцкіх кароў пасвіў іншыя гады і калгасных коней. Куды толькі іх, гэтыя путы, не хаваў Лёшка, шустры сын дзядзькі Мікіты — той, што некалі прыходзіў малым вучыцца,— але, калі трэба было якое, дзядзька Мікіта лёгка яго знаходзіў.

Вярнуўшыся адкуль-небудзь, дзядзька доўга стаяў на ганку ці нават над яблыняю і, задраўшы галаву ўгору, глядзеў на яблыкі — нібыта і праўда лічыў іх. Аднойчы я падгаварыў Лену:

— Дурная, давай сашчыкнем па яблыку.

— Баюся, бацька пазнае.

— Не бойся, не пазнае — гэта ж ён вас толькі страшыць. Хто гэта столькі яблыкаў пералічыць!

Адшчыкнулі і жахнуліся: па тым месцы, дзе да гэтага віселі яблыкі, вельмі ж ужо зазеляпелі, зазеўралі дзве густалістыя дзіркі. Мы трымалі яблыкі ў руках, спалохана, як прычараваныя, глядзелі на дзіркі і не маглі адвесці ад іх вачэй. Я спрабаваў захінуць іх яблыкамі, якія віселі на суседніх галінах, але толькі адпускаў руку — тыя вярталіся на свае месцы.

— Ый, а яшчэ казаў, што бацька не пазнае...— заплакала Лена.

Я супакойваў яе, але і сам не вельмі верыў, што дзядзька Мікіта не ўбачыць зялёных дзірак на яблыні. Я ўжо ведаў, дзе мы памыліліся. Трэба было адшчыкнуць яблыкі недзе збоку — можа, ад хлява, можа, ад логу,— а мы выбралі самыя спелыя, самыя вялікія, самыя прыгожыя. Тыя, якія былі навідавоку, якія добра відаць нават з ганка: выйдзеш з сянец і адразу ж убачыш — дзірка!

Мы трымалі яблыкі ў руках і не ведалі, што з імі зараз рабіць — есці ўжо іх не хацелася.

Да вечара Лена хадзіла заплаканая, насцярожаная. Калі бацька прыгнаў кароў, уцякла некуды на лог і доўга не ішла дадому. А дзядзька Мікіта заўважыў прапажу: ды і як тут не заўважыш, калі тыя дзіркі ў вочы кідаюцца! Праўда, калі ён, стомлены за дзень, ішоў у хату, то нічога не ўбачыў, а як, павячэраўшы, выйшаў на двор, адразу і ўзяў за вуха Лёшку, які круціўся побач:

— Хто адшчыкнуў два яблыкі?

Лёшку, хоць і з чырвоным вухам, усё ж удалося вырвацца з бацькавых рук. Але пасля гэтага выпадку ўжо ніхто з Мікітавых дзяцей не адважваўся без спросу ад-

шчыкнуць які яблык — верылі, што бацька іх сапраўды лічыць...

Толькі цяпер я заўважыў, што пад яблыняю сядзіць і ціха поркаецца ў зямлі Лёшка. Вось ён хуценька ўстаў, абтросся ад пылу і, як вецер, уляцеў у сенцы. З гудам, які навінен быў, відаць, азначаць, што ён ляціць на самалёце, адставіўшы ўбок руку — як крыло,— Лёшка шуснуў у хату, не зачыніўшы нават за сабою дзвярэй, і праз нейкую секунду выбег зноў,— але ў яго руках ужо, бы злоўленая рыбіна, трапятаўся кавалак бульбянога праснака. З тым жа гудам Лёшка выбег у гарод і, як да гэтага, усеўся пад дрэвам.

За яблыняю, трохі ўлева і далей ад вуліцы, туды, аж пад самы лог, з Мікітавых сенцаў добра відаць Настаччын прагончык і невялікая яе хата. Дзверы парасчыняны, і ў сенцах спакойна, непалохана ходзяць белыя куры — кудахчуць, сакочуць: адны ўзляцелі на лаву, дзе стаіць вядро з вадою, і, закідваючы аж назад дзюбы, п'юць; другія паўзбіраліся на чыгун, дзе, відаць, натоўчана свінням бульба, і, спяшаючыся, дзяўбуць з яго. Прарэзліва зарыпелі веснічкі, якія адгароджваюць ад вуліцы Настаччын вузкі, толькі на адну сцежачку, правулак. Па сцежцы вельмі ж ужо хуценька прабегла згорбленая Шаўковіха — яна заўсёды бегае толькі з кіёчкам і глядзіць заўсёды, здаецца, толькі сабе пад ногі: я ніколі не бачыў, каб яна глядзела перад сабою. Шаўковіха ўбегла ў сенцы, паразганяла там курэй: «Акыш-кыш-кыш, непажэры гэтыя! Угамоння на вас няма. Усе чыгункі павыграбалі». Павыганяла курэй на двор і зачыніла за сабою рыпучыя дзверы.

Без Шаўковіхі ў нашай вёсцы не абыходзіцца ні адна парадзіха. Яна ўжо гадоў сорак, як гаворыць, доўга падлічваючы перад гэтым, дзядзька Гарлач, бабіць дзяцей у Сябрыні.

— Нешта да Настачкі Шаўковіха пабегла,— сказаў я.

— А ты хіба не чуў? Настачка ж раджае сына.

Цікава, усе ў нашай вёсцы чамусьці верылі, што Настачка абавязкова народзіць сына. Пра дачку ніхто і не думаў.

Настачка, тоўсценькая, круглая (таму ўсе за вочы звалі яе Ступаю), пухленькая даярка, жыла ў сваёй хаце без бацькоў. Жыла з дзецьмі Алеськам і Генькам. Яна, хоць і мела ўжо двое дзяцей, не была яшчэ замужам. А дзяцей сабрала без мужа — Алеську нарадзіла ад немца Ганса,

які стаяў у вайну ў Клёцкавай хаце, а Генька знайшоўся ад салдата-мінёра, які жыў у Настачкі: адразу пасля вайны іх цэлы ўзвод доўга быў у нас — яны размініравалі міны, што і на дарогах, і ў полі, і ў лесе панастаўлялі немцы.

Ганса я добра памятаю — амаль штодня тады я хадзіў да Клёцкі і часта бачыў гэтага немца. Ганс быў вясёлы, светлы і зусім не страшны, хоць і немец. Недзе пад Новы год ён частаваў нас, дзяцей, смачным пірагом з белымі салодкімі завіткамі на скарынцы, пірагом, што прысылала яму ў пасылцы яго маці, якую звалі амаль па-нашаму — Анна. То ж ледзь не наша Ганна. Вось ужо цётку, якая прысылала яму адны паштоўкі, звалі па-іхняму — Клерхен. Пра гэта нам расказвала Настачка. Да вайны Ганс рабіў недзе ў цырку, і таму тут, у Клёцкавай хаце, ён, здаралася, хадзіў на руках. Стане насярод хаты галавою ўніз і — пайшоў па адной маснічыне. Ідзе і спявае сабе. Каб вы толькі бачылі, як тады смяялася Настачка — відаць, яна закахалася ў гэтага немца. І калі Саўкаў Паўлік ноччу прыйшоў да Клёцак і, звязаўшы, забраў з сабою Ганса, Настачка нават плакала і злавала на Паўліка. А Паўлік расказваў, што потым з Ганса выйшаў добры партызан-разведчык. Ён хадзіў нават у Оршу, і там яго самі немцы высачылі і павесілі. А іншыя дык кажуць, што ўсё гэта лухта і што Паўлік забраў Ганса і ў лесе расстраляў яго,— так нібыта ён помсціў Настачцы, якую яшчэ да вайны праводзіў дадому з ігрышчаў і да якой спрабаваў нават сватацца. І хоць сябрыньскія партызаны ўспамінаюць, што ў тым атрадзе, дзе ваяваў Паўлік, сапраўды быў немец-разведчык, але і пасля гэтага нават Рагатун, наслухаўшыся ўсяго, чухае сябе адною рукою за вухам і кажа:

— Канешне — папу яешня. Тут, брат, і сам чорт ногі паломіць, пакуль разбярэцца...

Адным словам, з'явіўся тады ў нашай вёсцы першы немчык. Русенькі такі, віхрасты — гэткі, як і ўсе мы. Толькі Алеськам ніхто яго амаль што і не зваў, усе — Немчык ды Немчык. Сёй-той нават думаў, што ён па-нашаму гаварыць не навучыцца. І ўсё Настачку палохалі: а што, калі ён раптам па-свойму загергеча, што ты з ім рабіць будзеш? Спачатку — «мутэр, мутэр», а пасля — «швайн райн», а потым і «матка, яйкі». Мы ж напраўду верылі, што Алесь будзе гаварыць напалавіну — слова нямецкае, слова наша. Ігнат Халадзёнак, на што ўжо стары чалавек,

але і той, мусіць, з год прыходзіў са свайго канца вёскі пад Настаччыну хату, каб першым пачуць, ці па-нашаму загаворыць хлопчык. Прыйдзе, сядзе на лавачцы перад палісадам, наверне вуха да акоп, слухае. І калі Алеська загаварыў, як і ўсе мы: «мама», «жыжа», «баба», «дайдай»,— Халадзёнак расчараваўся: відаць, яму гэта не спадабалася, і ён, паціснуўшы плячыма, мармычучы сабе пад нос: «Глядзі ты, немец, а гаворыць, як мы», замыліўшы губу, паціху патэпаў дадому і пасля гэтага ніколі не прыходзіў ужо на Настаччыну лавачку.

Мне шкада было Немчыка. Калі нам, сіротам, давалі амерыканскую дапамогу, мне дасталася вельветавая курточка з бліскучым замочкам. Хоць яна і была ўжо амаль да дзірак працёртая на рукавах, хоць і замочак быў сапсаваны і сашморгваўся толькі ледзь-ледзь зверху, усё ж яна выглядала прыгожа. Немчыку ж, таксама сіраце, з гэтай дапамогі нічога не далі: я быў партызанскі сірата, а ён — сын немца. І таму позняю восенню, калі дзядзька Мікіта браў нас з сабою пасвіць коней і калі ад ветру і дажджу нам рабілася холадна, я знімаў гэту куртачку і даваў Немчыку пагрэцца. Надзеўшы яе праз галаву, ён з захапленнем шморгаў замок — уніз-уверх, уніз-уверх — і шкадаваў, што той пасоўваецца так мала...

У Настаччыных сенцах зноў зарыпелі дзверы. З іх выйшла Шаўковіха з чыгунком у абедзвюх руках і пачала маніць курэй:

— Ціп-ціп-ціп... Пыль-пыль-пыль...

Куры, як каршуны, ляцелі з усіх бакоў. Шаўковіха накідала ля ганка таўчонкі і зноў, зачыніўшы сенцы, заспяшалася ў хату.

«Во, дзівачка,— падумалася мне.— Спачатку выгнала ўсіх курэй, а пасля іх маніць...»

— Што ж ты, Ясічак, задумаўся? — спужнула маю ўвагу да Ступіных сенцаў Лена.— Паможы хутчэй фікус занесці ў хату.

Мы аберуч узяліся за мокры вазон і панеслі ў хату. На дарозе, ля самых дзвярэй, дзе ўжо было зусім цёмна, я, і сам таго не чакаючы, наступіў на хвост Варкоту — худому чорнаму кату, які, бліснуўшы ў цемнаце святлівымі, як фары, вачыма, прарэзліва ўскрыкнуў і, вырваўшыся з-пад нагі, фыркаючы, сігануў з сенцаў.

— Ага, а я сказу маме, сто вы і Варкота білі... Во...

Гэта зноў Волечка. Лепш бы займалася яна сваёю лялькаю і не лезла куды не трэба! Гэта ж добра, што Волечка

яшчэ сама не падлезла пад ногі, а то б, можа, не катоў хвост, а яе руку стаптаў...

Выйшаўшы са двара дзядзькі Мікіты, кіруюся да Настаччыных весніц, што вельмі ж ужо рупліва зачыніла Шаўковіха,— трэба аддаць газету «Гудок», якую пастаянна выпісвае Настачка. У гэтай газеце заўсёды гаварылася пра вагоны, рэйкі, свісткі паравозаў, пра перадавікоў у высокіх чорных шапках, і мне было незразумела, чым захапіла гэтая газета жанчыну, якая зацята, з году ў год, выпісвала яе. Дзядзька Мацвей, старэйшы Хадосьчын брат, той Мацвей, які сёння прыслаў пісьмо, калі яшчэ не хадзіў у прымы пад Оршу і жыў у адной бацькавай хаце са сваёй малодшаю сястрою, часта заходзіў да Настачкі пачытаць «Гудок». Ён калісьці працаваў на чыгунцы, і таму ўсё тое, пра што пісалася ў гэтай газеце, яму нагадвала гады далёкай маладосці.

Падняўшы ўверх пятлю з пута, якая, накінутая адразу на слуп і апошнюю дошку веснічак, не давала ім расчыняцца, я піхнуў варотцы. О, як яны зарыпелі! Адразу ж успомнілася, што з гэтых веснічак жартавалі ў вёсцы даўно. Ноччу, калі Настачка, выправіўшы чарговага кавалера, вярталася дадому, яны рыпелі ў цішыні яшчэ больш прарэзліва. І тады, калі хто са старэйшых прачынаўся ў вёсцы, пазяхаючы, сам сабе думаў: «Глядзі ты, ужо і Настачка дадому пайшла, значыць, уставаць скора трэба».

Ідучы па вузенькім правулачку, сам адчуваў, як дзогаюць аб утаптаную сцежку босыя ногі. Уяўляў, як аддаюцца мае гэтыя крокі там, у хаце.

Сцежка, прыціснутая Мікітавым гародам як не да самай хаты, была вузкая — толькі прайсці аднаму чалавеку. А калі ўдваіх, ды яшчэ з такою, як Гарлачыха, дык і размінуцца не будзе дзе. На коні па гэтай сцежачцы праехаць нельга, і таму, калі хто з мужчын вёз Настачцы дровы, даводзілася ад логу разгароджваць згароду.

У сенцах саладкавата і цёпла пахла маласольнымі агуркамі. Цяпер, увосень, гэты пах ужо нязвыклы, бо апошнія восеньскія агуркі звычайна кіславатыя, вадзяністыя і пахнуць, як жоўтыя семяннікі — троху нейкім холадам, троху ўжо самымі замаразкамі.

У хаце крычала Настачка: «Ой, паміраю! Ой, паміраю!» І таму я не спяшаўся заходзіць, паўмысля доўга шукаў клямку. І пакуль я тупаў у сенцах, дзверы вузенька прачыніла Шаўковіха і ў гэтую шчыліну (туды,

здаецца, і муха не ўляцела б — крыльцамі зачапілася б за вушак) сказала мне:

— Кінь газету ў сенцах!

І зноў зачыніла дзверы. Я паклаў «Гудок» на дзежачку, у якой Настачка спяліла хлеб, і выбег на вуліцу. У Сябрыні ўсе казалі — пра гэта ведалі нават мы, дзеці,— што Настачка дужа любіць цалавацца. Колькі разоў і мы, сцішыўшыся дзе-небудзь за кустамі ці за плотам, ля самай лавачкі, на якой сядзела Настачка са сваім кавалерам, нерухома ляжалі і, заціскаючы адзін аднаму раты, каб не пырснуць са смеху, слухалі, пра што яны гавораць.

З мінёрам яна была дужа ласкавая:

— Ты ж мяне, Коля, не любіш.

— Люблю, Настачка, вельмі люблю.

— А я, Коля, не веру. Вось паедзеш і ўсё забудзеш.

Тады Коля паварочваў яе галаву да сябе і надоўга прынікаў да вуснаў — так надоўга, што мы, не стрымаўшыся і зарагатаўшы, нечакана для закаханых успырхвалі з-пад кустоў ля лавачкі...

З нейкім раённым прадстаўніком, які прыязджаў да нас, здаецца, па сяўбе, Настачка гаварыла амаль пра тое ж самае.

— А вось вы ж мяне не любіце.

— Люблю, Наста, люблю,— хутка гаварыў прадстаўнік і, абдымаючы жанчыну, паўтараў яшчэ раз: — Вельмі люблю.

Відаць, ён і сам сябе хацеў упэўніць у гэтым.

— Не, не любіце,— трымалася свайго Настачка.— Вось паедзеце і забудзецеся пра мяне.

Потым яны доўга маўчалі. Так доўга, што нам ужо надакучыла ляжаць, ды і зябнуць мы пачалі на халоднай зямлі. І Настачка, нібыта разумеючы гэта, сама сабе сказала:

— Хоць бы пацалавалі ўжо, ці што, калі любіце...

І калі нясмелы прадстаўнік ужо нагнуўся над Настачкаю і гатовы быў пацалаваць яе, мы зарагаталі. Прадстаўнік спачатку ўступянеў, а потым, ачомаўшыся, раззлаваўся і гнаўся за намі аж за Туньцішыну зямлянку — як не да самага булінскага саду.

Бачыў я, як цалаваўся з Настачкаю і Лёня Гаціла — мой сусед і наша нейкая дужа далёкая радня — трэцяя вада на кісялі. Яго сёлета забяруць у армію — якраз я нясу яму позву. Ён ужо з самага лета ходзіць пастрыжаны пад нулёўку і таму нават у сваёй хаце не здымае з

галавы шапкі — саромеецца. Адпойчы мы, ведаючы, што Гаціла з Настачкаю абавязкова прыйдуць на Саўкаву лавачку, якая стаяла пад вербамі, ля логу, за агародамі — там як не пад самаю Вужыцаю пехта прыбіў шырокі апалак па два пянькі даўно зрэзаных вербаў,— прыбеглі туды раней, адарвалі дошку і наклалі яе на пянькі проста так. А каб яны селі з краю, насярод накідалі дзядоўніку. І самі залеглі побач.

Яны сапраўды прыйшлі. Стаялі ля лавачкі і цалаваліся стоячы — на лаўцы ж ляжалі дзяды. І калі, абняўшы Настачку, у пацалунку Гаціла рыўком пасадзіў яе на край дошкі — нават мы не паспелі заўважыць, як яны апынуліся на зямлі, а на іх яшчэ пляснулася зверху дошка. Зарагатаўшы, мы пабеглі логам пад лазню. Назаўтра Гаціла сваю шапку насунуў яшчэ ніжэй на вочы. Тыя, хто бачыў яго без шапкі, расказвалі, што на лобе ў хлопца ўскочыў ладны гузак — мусіць, ад дошкі. Хлопцы яму спачувалі, але Гаціла адно толькі ўсміхаўся: «Зажыве. Але ж, каб вы ведалі, як пасля гэтага Настачка сама мяне цалавала!» Кажуць, што хадзіў да Настачкі і Клёцкаў бацька, але мы іх разам ніколі не бачылі.

Цікава, чаму гэта дарослым так падабаецца цалавацца? Наслухаўшыся баек пра тое, як гэта прыемна — цалавацца,— неяк яшчэ раней, зімою, я на вуліцы знянацку згроб Ленку ў абдымкі і тут жа на марозе няўмела пацалаваў: паспешліва цмокнуў у яе халодныя і сухія ад ветру вусны, адчуўшы нават, што яны, абсеўраныя, пачалі шалушыцца. Ленка тады вельмі спалохалася і абадрала (праўда, меней, чым зараз) маю руку — здаецца, нават тую самую, што і ўчора. І калі Ленка заплакала і пабегла дадому — я, нібы той дурань, стаяў на вуліцы, аблізваў губы і ўсё чакаў, калі ж гэта будзе прыемна. Але так нічога і не дачакаўся. Адно толькі садпела абадраная рука, усё яшчэ было няхораша ад халодных вуснаў Лены, а на губах не праходзіла казытлівасць ад іх сеўранасці. «Дык што ж тут прыемнага, у гэтым пацалунку? — сам у сябе разгублена пытаўся я.— І што ў ім толькі знаходзяць дарослыя?»

Потым, трохі згадзя, калі Лена забылася і даравала мне той першы ў жыцці пацалунак, я спытаўся:

— Лена, толькі скажы праўду, табе тады прыемна было?

— Што ты — нават брыдка.

— І мне таксама,— шчыра прызнаўся я.

Лена памаўчала. Потым, насцярожана зірнуўшы на мяне, спытала:

— Ты нікому, Ясічак, не выдасі, калі я раскажу нешта?

— Не.

— Тады слухай. Прыйшла я раз дадому раней са школы — нейкага ўрока ў нас не было. Дзверы ціхенька адчыніла — нікога ў хаце няма. Я на печ — зірк! — а татка з мамкаю сядзяць там і цалуюцца. Аж няёмка стала. Такія старыя, а ўсё цалуюцца.

*З таго часу прайшло столькі год. Зараз, як тады ў дзяцінстве, зноў пачынаеш здзіўляцца і радавацца самаму, здавалася б, звычайнаму, абвыкламу. Дзіўная гэта рэч — чалавечае ўяўленне: нам, людзям, для каго ўжо даўно ці, можа, яшчэ не зусім даўно мінула маладосць, нашы маткі здаюцца толькі сівенькімі, згорбленымі бабулькамі. Мы ўжо неяк і ўявіць сабе не можам, што для большасці чалавецтва (я кажу тут толькі пра дзяцей) маткі — гэта зусім маладыя, дваццацігадовыя дзяўчаты, якім яшчэ не надакучыла і цалавацца, і танцаваць, і весяліцца, і любіць такога ж самага, як і яны, маладога, амаль хлапчука, віхрастага свайго абранніка — нашага бацьку. Там, у дзяцінстве, нашы наіўныя і не зусім практычныя яшчэ юныя мамы і таты здаюцца нам самымі разумнымі, самымі ўмудронымі і самымі моцнымі. Здаюцца настолькі мудрымі, што нават калі мы і трацім іх рана, у той дзіцячай пары, яны, амаль падлеткі, назаўсёды застаюцца для нас, пасівелых, узорам, да якога мы заўсёды вяртаемся, каб праверыць, ці правільна ідзём па жыццёвай дарозе...*

Пасля Настачкі ні пісем, ні газет не было нікому аж да Ядохі. Ёй прыйшло пісьмо з Ленінграда. Хоць ленінградскага адраса на ім і не было, я ведаў, што ліст прыслаў Віця: вельмі ж ужо старанным почыркам быў размаляваны канверт. У Ядохі ў Ленінградзе жыла да вайны сястра, а Віця — Ядошын пляменнік. Сястра памерла ў блакаду, Віця жыў тады ў сваёй прасторнай кватэры адзін. Зараз ён жыве з бацькам, які, на шчасце, вярнуўся з фронту.

Памятаю, як адразу пасля вайны прыехаў у Сябрынь гэты хлопчык — наш равеснік, які перажыў блакаду. Ён быў худы-худы, твару амаль няма — з нейкі там кулачок,— адны толькі вочы па-даросламу глядзелі на нас. Вялізныя-вялізныя (вочы заўсёды здаюцца вялікімі, калі ча-

лавек раптоўна схуднее) і нейкія вельмі ж ужо сумныя. Віцькавы вочы, якія столькі перабачылі, былі задужа дарослыя. Дзед Сянчыла, выпаўзшы з хаты, дзівіўся:

— Ну, дзядок жа, дый толькі. Ну, самі ж зірніце — выкапаны дзядок. І вочы такія разумненькія, і тварык такі зморшчаны.

А Халадзёнак нават прыслухоўваўся, калі Віця ішоў вуліцаю:

— І праўда косці грымляць. Не верыце — самі паслухайце: грымляць. Грымляць адна аб адну... Чуеце?

Віця прыехаў у Сябрынь напрадвесні. Ён неяк хутка пазнаёміўся з намі, і, калі троху падсох паверхуты да сонца буры ад леташняй травы і цёплы ад сёлетняга святла бок Саўкавай гары, дзе мы заўсёды ўвесну гулялі, хлопцы садзіліся ля куста, што рос пасярод гары, і слухалі, як Віця расказваў пра блакаду.

— А тады мамка памерла. А есці захочацца, дык я вазьму чайнік і пайду да Нявы. Зачэрпну вады — і назад. Назад даўжэй ідзеш, чым туды. Тады ў хаце налью ў міску вады, вазьму лыжку і сёрбаю. А сам усё хачу самога сябе ўгаварыць, што я булён ем. Падумаеш так, падумаеш — і напраўду здасца, што булён ясі. Нават мясам запахне. З'ясі міску вады — здаецца, і наеўся. А то мы хадзілі святло ў кватэрах тушыць. Гэта тады, як да нас у Ленінград электрычнасць з Волхава прарвалася. Людзі як паўключалі ўключальнікі, яшчэ калі жывыя былі, так тыя ўключанымі ўвесь час заставаліся. Святла ж не было! А як святло прарвалася з Волхава — гарыць! А тут светамаскіроўка. Немцы бамбяць па святлу. Вось мы і хадзілі тушыць яго ў кватэрах. Дзверы звычайна былі парасчыняныя. Прыйдзеш, а там у кватэры два, а то і тры мерцвякі ляжаць і святло гарыць. Вось цяпер дык мне жудасна, як вам расказваю, а тады нешта не страшна было.

Пасля таго Віця пачаў прыязджаць кожнае лета. Ён паправіўся, распаўнеў — нават растаўсцеў. Халадзёнак даў яму новую мянушку, якая спадабалася і нам,— Тоўсцік. Гэтае лета Віця паехаў у Ленінград позна — перад самаю вучобаю.

Я нерайшоў вуліцу — Ядоха жыве на тым баку, вунь там, за вербамі. Перайшоў якраз ля хаты дзеда Сянчылы.

Дзедава хата была старэнькаю, згорбленаю. Як дзіркі ў шчарбатым роце, віднеліся павыпаданыя вуглы. Яна стаяла на самай вуліцы — глухою сцяною без акон высоўвалася як не пад самыя каляіны ад калёс, так што на-

ват сцежцы, якая роўна ішла наўз хаты, тут даводзілася загінацца, каб неяк абысці яе. Раней, калі вуліца была вузенькаю, усе хаты стаялі так, як і Сянчылава — пры самай дарозе. Потым, хто перасыпаў хату ці будаваў новую, адносіў зруб далей ад вуліцы на агароды, пакідаючы перад вокнамі яшчэ шырокі палісаднічак, дзе садзіў кветкі, а то і вішні ці бярозы. І толькі, як я помню сябе, Сянчылава хата стаяла так, як і знаві,— яе ніхто не перасыпаў і нікуды не пераносіў.

Па старых пазах, адкуль павыпадаў ужо састарэлы мох, хата абмазаная глінаю. Ля яе, як ля іншых, няма ні хлявоў, ні камор, ні дрывотняў, ні круглага двара. Не было нават сенцаў — адразу з вуліцы адчыняеш дзверы і ты ўжо ў хаце: «Дзень добры вам!» Але да Сянчылы дужа ніхто не заходзіў. Сам ён таксама сядзеў больш за ўсё ў хаце і рэдка куды выбіраўся. Чым чалавек жыў, што еў — ніхто, відаць, ва ўсёй вёсцы не ведаў. Двор, як луг, зарос травою, і вясною на ім заўсёды аж жоўта ад дзьмухаўцоў. Нават тоненькая сцежачка, якая ледзь бруілася ад дзвярэй, у апошні час зусім зарасла, утравела, і ля яе падняліся нават дзяды.

Дзед Сянчыла нікуды не хадзіў: яму, бязногаму, было гэта цяжка. Калісьці даўней Сянчыла разам з Хадосчыным Мацвеем працаваў стрэлачнікам на чыгунцы, і там, троху па яго віне, троху па віне машыніста, адрэзала яму левую нагу. Правую ён страціў гэтай вайною ў часе апошняй блакады, калі немцы лютавалі і ў лясах, і ў вёсках. У той дзень гестапаўцы сустрэлі яго ў лесе, недзе аж за Гарэлым Балотам,— ці то ён ішоў ад партызан, ці то, наадварот, спяшаўся да іх, каб папярэдзіць, што эсэсаўцы будуць наступаць ад Лапысіцы, бо туды яны сцягнулі свае гарматы і танкі. Пераняўшы дзеда Сянчылу, фашысты не расстралялі яго, а доўга seклі з аўтаматаў па яго адзінай назе, пакуль яна, перасечаная, не адкацілася пад куст. З фашыстамі быў і Васяпок. Сянчыла клянецца і божыцца, што чуў, як гэты паліцай, засмяяўшыся і пабегшы за фашыстамі, супакойваў іх: «Не бойцеся, цяпер ён нікуды не дапаўзе. Хаця, можа, толькі да свае магілы». Але Сянчыла, адпоўзшыся да бліжэйшай яліны, накапаў маладых, тонкіх, як вяровачкі, пругкіх і гнуткіх каранёў і моцна, да болю (хоць болю, як ён казаў, тады ніякага не адчуваў), туга перацягнуў абрубак нагі, заматаў яго ў сарочку і папоўз з лесу — але не ў бок Сябрыні, а туды, пад Дваройцы, дзе адзінока жыла старая Маланя, якая яшчэ ў

маладосці, кажуць, любіла яго. Маланя і вылечыла Сянчылаву нагу, доўга прыкладаючы да яе нейкія гойныя прымочкі з траў. А Сянчыла пасля гэтага хваліўся:

— А на мне ўсё зажывае, як на сабаку.

Без абедзвюх ног Сянчыла, і так завельмі нізкі, зрабіўся зусім маленечкі — як дзіця.

Пасля вайны, вярнуўшыся ў Сябрынь, ён сам змайстраваў нейкія немудроныя калёскі, усе чатыры колы над якімі былі розныя: адно, з рубчыкам пасярэдзіне,— ад малатарні, другое, цяжкое чыгуннае,— ад тачкі, трэцяе, бліскучае,— ад дзіцячага веласіпеда, а чацвёртага наогул нідзе не знайшлі, таму Саўка адрэзаў каточак ад сухога дубовага бервяна, якое ляжала ў яго на шула. Тады Сянчыла, напіхваючыся рукамі, крыху ездзіў па вуліцы, але ў апошні час калёскі сіратліва стаялі ля сцяны, пад страхою, абы-якава падставіўшы пад капеж драўляны каток і каток з малатарні.

А зусім нядаўна, можа, тыдні са два таму, дзед Сянчыла нечакана і вельмі цяжка захварэў. І ўсе ўжо думалі, што ён памрэ, і ўжо гаварылі пра тое, як і дзе трэба будзе яго хаваць. Ён, накрыты лапленым кажухом, на які з адзінага акна падалі косыя промні ранішняга сонца, ляжаў на палку і, паклаўшы галаву на ражок сенніка, прыслоненага да печы, глядзеў некуды на столь ці нават за столь і маўчаў. На яго палыселай галаве, на шэрым земляным твары блішчалі кропелькі поту, і аднекуль з-пад патыліцы выбіваліся на сяннік злямчаныя валасы.

Мужчыны, што сабраліся тады ў Сянчылавай хаце, тут жа, пры ім, не баючыся вельмі, што хворы пачуе, размаўлялі між сабою:

— Не, не жывец ён ужо на гэтым свеце.

— І вочы вунь ужо абы-як глядзяць.

— І твар, зірніце, бы зямля стаў.

Дзед Сянчыла троху падняў галаву — ледзь адарваў яе, цяжкую, ад сенніка.

— Піць... Дайце... вады...— ледзь выціснуў ён з сябе.

Саўка пашукаў усюды і вылаяўся — у хаце не было ні кроплі вады. Ён з вялікаю, як вядзерца, квартаю, зробленаю з гільзы, пабег да сябе дадому — гэта ж будзе хутчэй, чым ісці ў калодзеж. Вярнуўся ён хутка, асцярожна, за скручаную з дроту ручку трымаючы перад сабою кварту.

Халадзёнак падняў галаву дзеда Сянчылы, а Саўка паднёс кварту да губ старога. І той хапатліва, паспешліва пачаў піць. Ён хапаў ваду так, як хапаеш паветра пасля

таго, калі ў рацэ поўна наглытаешся вады. Сянчыла задыхаўся. Вада лілася па злямчанай барадзе, па шыі, па Халадзёнкавых руках, збіралася ў зморшчынках чорнай далоні і адтуль ручаінкамі цурчала па лайно. Пад скураю хадзіў востры (здавалася, што зараз яе разрэжа) коўцік. Дзед піў з ёркапнем — кожны глыток гулка аддаваўся ў хаце.

— Я ж і кажу, што не жывец ён,— трымаючы галаву старога, паўтарыў Халадзёнак.— Так толькі перад смерцю глытаюць.

Напіўшыся, дзед зноў лёг і пачаў трызніць.

— Варка, пачакай, куды ты ад мяне ўцякаеш? Гэта ж я, Пётра. Што, ты мяне ўжо не пазнаеш? Куды ты, Варка? Пачакай мяне...

— Ну, слава табе божа, з жонкаю, нябожчыцай, ужо сустрэўся,— не адыходзячыся ад Сянчылы, гаварыў Халадзёнак.

— Мама, і ты ўцякаеш ад мяне? Чаго ты рукою ўсё толькі махаеш і нічога не гаворыш? Мама, а там вунь пайшоў чалавек спіною да мяне, гэта не мой тата? Я ж яго ўжо і не памятаю.

— Во і з маткаю ўжо размаўляе. Пацярпі, Пётра, пацярпі... Хутка ўжо будзеш з імі...

— А чаго ж вы ад мяне ўсе ўцякаеце? Ну ладна, ідзіце сабе, я вас потым даганю...

Дзед Сянчыла трызніў увесь дзень — пасля паўдня ён паўтараў толькі адно слова: «Жыць». Недзе надвечар расплюшчыў раптам вочы, зірнуў на мужчын і слабым голасам спытаўся:

— Скажыце, ці гэта вы ўжо мяне пахавалі ці яшчэ не? Можа, гэта я ўжо на тым свеце?

— Не, Пётра, значыць, яшчэ не на тым,— адказаў Саўка, які згадзіўся пабыць ля хворага і ноч.— Яшчэ, Пётра, на гэтым.

— А то я ўжо думаў, што памёр...

— Не, Пётра, значыць, мы яшчэ з табою пажывём.

А днём, калі мужчыны сядзелі і стаялі ля палка, дзе трызніў Сянчыла, хтосьці з іх, здаецца нават Дзямідзька, заўважыў:

— Гета, брат, во яно якое жыццё. Здаецца, увесь век чалавек бедаваў, гараваў, а як толькі, гета, прыйшла часіна, калі трэба развітвацца, бачыш, як, гета, загаварыў: «Жыць!» Адно слова паўдня паўтарае. А, здавалася б, што яму, гета, шкадаваць? Хату гетую дзіравую? Адзіноту

сваю? Гора сваё? Аж не, бачыш, як прыйшла, гета, да яго Кастуся з касою, дык і ён во як загаварыў: «Жыць!»

— І праўда, што яму, Сянчылу, ужо чапляцца за гэтае жыццё, можа, яму ўжо лепей і памерці было б,— нечакана ўлезла ў гаворку і Саўкава нявестка, цыбатая і худая Зінка, якая прыйшла клікаць свёкра папалуднаваць, а заадно і павячэраць — гэта ж трэба, да такой пары чалавек не еў!

— Апямейі ты лепей! Што ты знаеш! — злосна накінуўся на яе Халадзёнак.— Што ты знаеш, шалёўка ты гэткая! Памёр... Памёр... Памерці мы ўсе можам. А вось ты выжыць паспрабуй...

Мне ўспомнілася, як летам, трохі выпіўшы (не памятаю, з якой нагоды — ці не сёмуха была), дзед Сянчыла сядзеў на сваім зялёным, як луг, двары, усыпаным красками, і ўсё гаварыў Гарлачу:

— Глядзі-тку ты, малец, сюды... Ты ж разумны, памятлівы — аж да Берліна з вінтоўкаю дайшоў. Вось чаму гэта дзе якое ў свеце гора ёсць, усё да мяне ліпне, усё на мяне валіцца. От слухай сюды. Памятаеш, як майго жарабка ваўкі з'елі? Памятаеш. А вось чаго гэта так выйшла, што ў табуне было трыццаць коней, і ваўкі ніводнага з іх не зачапілі, а майго — задралі. У Халадзёнка жарабок — жывы, Саўкава кабыла нават і вушы не паспела наструніць. А майго няма. Чаго? Маўчыш. Не адказвай, я, можа, твайго адказу і не чакаю. Ну, а тады далей глядзі. У вёсцы, лічы, аж дзвесце хат. А пярун ударыў — усе стаяць, як і да навальніцы стаялі, толькі мокрыя, а мая ў полымі, нібы той мучанік, гарыць. Ядохіна хата цэлая, Дзямідзькава таксама, а мая — гарыць. Ну, ладна. Той раз патушылі. Замяніў я бёрны і зноў жыву. На табе, і другі раз: толькі ўдарыў пярун — усе стаяць, як загавораныя, а мая палае. Гарыць. А ў гэтай чужой — жыву. І пярун не б'е.

— Яно, дзядзька...— запярэчыў быў Гарлач.

— Ты мне не «дзядзькай». Ты лепш слухай. От зноў глядзі сюды. Дзеці... Іншыя ж адкуль ні валяцца, адкуль ні ляцяць — і ім хоць бы што. А мой Міша з вербіны, ды хай бы ўжо з вершаліны якой, а то з самых ніжніх сукоў, упаў — і на табе, насмерць. Твае ж вунь Гарлачыкі бегаюць абы-дзе, лазяць абы-дзе — ты, відаць, і сам не бачыш, як яны ў цябе гадуюцца,— але ж усе жывыя. Ты б, можа, і сам не далічыўся, каб каторы начаваць не прыйшоў, аж не, усе жывенькія, здаровенькія...

— Што ты, дзядзька, гаворыш!

— Зноў «дзядзька». Ты от памаўчы лепей. Слухай далей. Іншыя ж бабы гатовы на гаду (ды што на гаду — нават на дні!) па некалькі разоў радзіць — і хоць бы што ім. Вунь Мікітава колькі нашпурляла. Вунь Настачка зноў, відаць, хлопчыкам ходзіць. І так лёгка ў яе ўсё гэта бывае. Як курыцы яйцо ўсё роўна знесці. А мая Ганна адзін раз радзіла мне Мішу, а сама і памерла. Усе бабы раджаюць, нібы жартуючы, а мая — жыццём сваім за жыццё заплаціла... Цяпер вазьмі-тку ты нас з Мацвеем Хадосчыным. Разам жа былі на той чыгунцы. Ён, здаецца, яшчэ нават бліжэй да паравоза стаяў. Аж не. Мацвей, бачыш, цэлы і здаровы, а ў мяне нагі як і не было. Ды вось і ў гэту вайну... А ты ўсё «дзядзька», «дзядзька»... Што ты скажаш, калі гэты дзядзька, бы той громаадвод — усё гора, усю бяду, дзе якія ёсць, на сябе прыцягвае?..

Мне ўспомнілася тая размова Сянчылы з Гарлачом, калі я між мужчынамі стаяў ля палка, на якім паміраў дзед, і чуў, як ён трызніў адным толькі словам: «Жыць». І сапраўды ў думках я тады быў згодзен з Саўкавай нявесткаю і сам лічыў, што чалавеку, які ў жыцці пабачыў столькі гора, не так ужо цяжка будзе развітвацца з нашаю зямлёю. Цяпер разумею, што вельмі добра зрабіў: не ўлез тады ў размову і не выказаў сваёй паспешлівай думкі.

Паміраў дзед Сянчыла тыдні са два таму назад. А ўжо сёння яго дома не было: клямка на дзвярах заторкнута прутком, адламаным ад гальля, а да парога прыслонена новая дошка. На коліку, увагнаным за хатаю ў зямлю, вісіць уверх дном вядро — сушыцца. Ля хаты валяюцца падвагі, на якіх, як даўняя рана, паспела ўжо крыху абсохнуць нассунутая аж да дрэва кара — відаць, нехта з мужчын прынёс з дому сёе-тое са сваёй цяслярскай амуніцыі. Вунь там, ля вугла, ужо спрабавалі падважваць дзедаву хату. А па сцяне, якая выходзіць на ўтравелы двор, на кожным бервяне з'явілася па беленькай мятлушцы; на іх хімічным алоўкам выведзены лічбы — ад аднаго да дзевяці. Значыць, дзед Сянчыла сапраўды збіраецца перасыпаць хату!

Калёсак пад страхою таксама не было. Толькі па траве, з двору, цягнуліся няроўныя сляды ад каткоў. На вуліцы яны крута паварочвалі направа і ішлі туды, пад Ядошыну хату,— рубчык кола ад малатарні рэзаў зямлю, драўлянае кола шабалдыхала, а з двух бакоў у пыле

добра былі відаць сляды ад доўгіх дзедавых далоняў, усімі пяцццю пальцамі накіраванымі ўперад.

Дзед Сянчыла ўпершыню мо за апошнія паўгода выехаў са двара.

Ля Ядошынай хаты, па доўгай, як кладка, лавачцы (яна нават угіналася, спружыніла, бы кладка,— пасярод не было калочка), сёння завельмі гамапліва. Мусіць, быў ужо якраз той час, калі калгаснікі адчуваюць сябе вальней, калі можна і пасядзець ля хаты, асабліва не спяшаючыся,— збожына ўжо ўся ўбраная, а бульбу яшчэ ніхто не адважваецца капаць першы: і ў калгасе, і на сваіх сотках усе чакаюць — хай падрасце. Ды і вяселле ж сёння!

Здалёк я пачуў: «Вунь і сіротка йдзе», а падышоўшы бліжэй, пазнаў квяцістую, у дзве вялікія і чырвоныя ружы, хустку Матруны Векавухі — другая жонка Тупьціка, моцна трымаючыся, нібы баючыся зваліцца, за край дошкі, сядзела пасярод сагнутай лаўкі і, выставіўшы ногі, глядзела на пашарпаныя наскі сваіх вялікіх чаравікаў. Побач з ёю трымала на руках малога Міколку Дуня Цэшкава — нахіліўшы сваю галаву над сынам, яна казытала раскудланымі валасамі твар малога; той лавіў белыя, як лён, пасмы неслухмянымі рукамі і ўсё спрабаваў іх паднесці да рота. Сядзела, уважліва слухаючы ўсіх, паварочваючы галаву на кожны голас, Клёцчыха. Тут жа было яшчэ многа жанчын з двух канцоў вёскі — нават самой Ядосе месца на лавачцы ўжо не хапіла, і яна стаяла ля згароды, узяўшыся рукою за старую, пазелянелую ад часу, штыкеціну. У агародзе, навязаная над самымі вокнамі, бразгала ланцугом і заходзілася ад брэху Ядошына Найда — дужа злая сучка. За гэтую Найду на Ядоху крыўдавала Лысая Таццянка: яна лічыла самай вялікай несправядлівасцю, што яе Палюган так не падобны да Ядошынай Найды. Ды і многія ў вёсцы жартавалі з гэтай неадпаведнасці: у добрай, клапатлівай і ласкавай Ядохі была такая злая сучка, а ў злой і ўсё нечым не задаволенай Таццянкі — ласкавы і паслухмяны, як цяля, сабака. Палюган вельмі любіў нас, малых, і заўсёды качаўся з намі ў пыле, гуляў у хованкі — словам, дурэў не горш ад нас. Нават яго першая мянушка Хуліган, дадзеная некалі Халадзёнкам так неўпапад, ператварылася ў больш спакойную — Палюган. Халадзёнак нават бажыўся, што сабачка і брахаць зусім не ўмее. Таццянка, спрабуючы развярэдзіць яго злосць, навязвала

сабаку на вяроўку, на якой да гэтага падбрыкваў з вясны да восені бычок, але Палюган сядзеў, сумаваў сабе за загародаю, і толькі пачуўшы, як мы бяжым па вуліцы, забыўшыся, што навязаны, усёю сілаю таргаўся ўслед за намі, але, адчуўшы моцную вяроўку, супакойваўся, і зноў сумаваў сабе, і ажыўляўся толькі, калі побач гудліва пралятала муха ці пчала. Адвязаны, вольны, з прыгожым аброжкам, ён звыкла здароваўся з кожным ужо знаёмым пахам, не вельмі пужаўся і новых: Палюган нядоўга вывучаў іх, абнюхваў, а праз якую хвіліну і тыя рабіліся для яго звыклымі, сваімі — сябрамі...

Таццянка, усё ж спрабуючы навучыць яго злосці, падводзіла, здаралася, да пудзіла і загадвала: «Кусі яго, кусі!», але Палюган цёрся ля яе ног і не кусаў. Тады яна крычала другое: «Брашы, брашы, абібок!», але абібок наіўна, як дзіця, глядзеў ёй у вочы — нібы сціпла пытаўся: «А навошта?» Тады яна, можа, каб паказаць, як гэта робіцца, а можа, проста са злосці, пачынала гаўкаць сама: «Гаў, гаў, гаў». А ўбачыўшы, што Палюган усё роўна не брэша, біла яго выспяткам пад уздухі і рашуча вяла на пападворак — навязваць зноў. Таццянка навязвала сабаку ля старанна замкнёных дзвярэй, хоць і ведала, што Палюган — вельмі ж няпэўная дапамога яе замку. Ядоха, наадварот, ніколі не замыкала дзвярэй — яны заўсёды былі альбо расчынены напята, альбо заторкнутыя, як вунь сёння Сянчылавы, якою-небудзь знойдзенаю на двары трэскаю. Нават Найду яна не павязвала ля сенцаў — навошта, яшчэ каго напалохае, а то, можа, і ўкусіць.

Найда брахала, аж заходзілася пад акном — хоць яна і вырасла тут, у Ядохі, са шчаняці, але ніяк, відаць, не магла звыкнуцца, што на гэтай лавачцы заўсёды сядзіць столькі людзей.

— Уціхамір ты сваю ваўкарэзіну! — не вытрымала нарэшце Дуня Цэшкава.— А то вунь сына напалохае, дык спаць не будзе,— і ласкава ўшчыкнула свайго Міколку за кірпаты нос.

Ядоха пачала супакойваць Найду.

— Аддала б ты яе Таццянцы, а сабе — яе Палюгана вазьмі. Ён бы да нашай кумпаніі вунь як падышоў.

— А нашто тваёй Таццянцы злая сучка? У яе ж і ў самой у роце чорна,— адказала Ядоха і зноў прыгразіла Найдзе: «Змоўкні!»

Тая крыху прыцішыла голас, але брахаць не перастала.

Калі я падаў цётцы Ядосе пісьмо, яна аж рукамі пляснула:

— А мамулечкі ж вы мае! А я-то ўсё думаю — бачыла ж у сне, што ўсю ночачку малачко беленькае цадзіла (заліваюся ім, і ўсё!), таму, думаю, не можа ж быць, каб пісьма сёння не было. А вось і яно. Гэта ж Віцька прыслаў.

Нават не зірнуўшы на адрас, яна ведала, ад каго пісьмо.

Пакуль Ядоха разрывала канверт, усе на лавачцы і ля лавачкі маўчалі. Цётка прабегла вачыма першыя радкі.

— А дзіцятка ты маё! Пяцёрачку ж ужо во палучыў, дык і хваліцца.

Ядоха прачытала пісьмо, акуратненька ўклала лісток зноў у канверт і ўкінула ў кішэнь нейкага доўгага мужчынскага пінжака, лёгка ўскінутага на плечы.

— Акрыяў ужо. А намучылася, дзіцятка ты маё! Гэта ж нада табе столькі перажыць. Гэтую блакаду ўжо людзі век будуць помніць. Віцька расказваў, што паедзе ён, малеча гэта, на санячках па ваду, набярэ ў рацэ вядзерца і едзе назад. А мёртвых-мёртвых вакол сцежкі! Хто да вады не даехаў, замёрз, а хто з вадою едучы памёр. Ляжаць, аж жудасна. Не, гэтае я ўжо ад сябе кажу. А Віцька казаў, што папрывыклі ўжо, дык надта і не зважалі. І во, кажа, вязеш тую ваду, а мёртвы неяк сваёю мёрзлаю нагою падчэпіць санячкі і перакуліць іх. Вада і выльецца. Стаіш, кажа, і думаеш, што рабіць: і без вады ехаць дадому няма як, і назад варочацца сіл не хопіць — не даедзеш, далібог, не даедзеш, павалішся, як і гэтыя, што ўжо ляжаць...

Я даўно заўважыў: для Ядохі ва ўсім, што датычылася гэтай вайны, Віцька быў самы вялікі аўтарытэт — «а няўжо ж, дзіцятка ты маё, столькі адпакутаваць». Яна заўсёды гаварыла: «Віцька казаў», «Віцька бачыў», «Віцька ведае». І ніхто ў гэтым не павінен быў сумнявацца. Віцькава думка, думка хлапчука, які перажыў блакаду, была для яе вельмі важкаю, нібыта думка старога, які многа ўведаў на сваім веку.

— Пайшлі, дзеўкі, на вяселле.— Дуня Цэнкава ўстала і ўзяла з прыполу на рукі сына.— А то Ядоха ўжо

завяла сваё: «Віцька ды Віцька». Зараз заплача. Вунь ужо і слёзы на вачах...

— А і праўда поїдзем. Чуеце, як у тым канцы іграюць?

Жанчыны загаманілі:

— Зірнём хоць, як Люська раёўшчынская ў вэлюме сядзіць.

— Во Цыца дык Цыца. У Сябрыні сабе дзеўкі не знайшоў. Аж з Раёўшчыны прывёў.

Ядоха, прставалосая, дастала з той жа кішэні, куды паклала пісьмо, алюмініевы грабянец — іх яшчэ ў вайну палаўчыўся рабіць са збітых самалётаў Клёцка — і пачала механічна расчэсваць свае доўгія і, нягледзячы на гады, густыя яшчэ валасы.

Перад вайною ў цётчыны валасы ўкінуўся быў каўтун. Ды такі, што нават іголкі ўбіць нельга — бы камень. Спачатку цётка хацела адрэзаць валасы, але ёй адраілі — казалі, што тады наогул усё спляцецца, сцісне галаву і задушыць. Яна доўга лячыла яго, аж пакуль самі па сабе не пачалі раскручвацца валасінкі — Ядоха хадзіла тады, як завіваная. Але пасля гэтага (бо казалі — усё няшчасце прычынілася таму, што яна не любіла расчэсваць валасы) цётка ўжо не расставалася з грабянцом — дзе стаяла, там і часала свае пасівелыя пасмы.

— Пойдзем сабе, пойдзем,— нібы сама сабе гаварыла Ядоха.— А як жа, трэба ж паглядзець, які з Жэнькі малады. Вунь нават Сянчыла і той на вяселле паехаў. Паміраў чалавек, а тут на табе, на вяселле падняўся.

— Я дык яго і не пазнала: пагаліўся, бараду сваю садраў,— зноў заўважыла Цэшкава.— Гляджу, аж нейкі малады інвалід на Сянчылавых калёсках едзе, рукамі напіхаецца. «Ці ты гэта, дзед?» — пытаюся. «Я, дзеўка, я. Хто ж яшчэ так ездзіць, апроч мяне?» А сам увесь у ваўчках — пачапляліся, відаць, як па сваёй сцежачцы ехаў.

— А мамулечкі ж вы мае! Так на вяселле чалавек спяшаўся, што нават твар сабе абадраў,— усё расчэсваючы валасы, сказала Ядоха.— Клікаў ён, клікаў, крычаў у хаце, крычаў, каб хто памог яму, на калёскі ўссадзіў,— ніхто не чуе. Тады ён да дзвярэй падпоўз ды і выкуліўся на двор. Ганачка ж у яго няма, а парог высочанькі, дык ён лоб сабе троху і садраў.

— Цяпер ужо дошка да парога прыстаўлена,— перабіраючы парэпанымі пальцамі ражок сваёй квяцістай, завязанай пад бараду хусты і ўсё гледзячы на паскі

чаравікаў, азвалася нарэшце Матруна Векавуха, якая да гэтага сядзела моўчкі.

— Во, глядзі ты, і Матруна загаварыла,— узрадавалася Ядоха.— А то я гляджу, сядзіць нешта ціха, глядзіць сабе пад ногі і не гаворыць анічога.

— А дзе ж гэта, Матруна, сёння твой? — гушкаючы на руках сына, не гледзячы на Векавуху, нібыта абыякава, але я заўважыў іранічную ўсмешачку на яе твары, спыталася Цэшкава.

Цётка ж Матруна, відаць, убачыла ў гэтым штосьці большае.

— А табе што да майго? — узлавана адсекла яна.— Ты лепей свайго шукай.

— Мне-то нічога, але вунь людзі кажуць, што ён пайшоў да Туньціхі нейкае святое пісьмо чытаць.

— Я табе кажу, лепей глядзі, чые пісьмы твой чытае...

Я ведаў, пра што гаворыць Векавуха.

Дуня Цэшкава пасля вайны выйшла замуж за мінёра і, калі той дэмабілізаваўся, паехала з ім некуды аж пад Саратаў. Тады Цэшку, брыгадзіраву брату, часта ішлі пісьмы — відаць, Дуня ў іх расказвала, як жывецца на новым месцы. А летась я прынёс Цэшку тэлеграму: «Таточка, прыязджай хутчэй». Дзядзька прадаў цялятка, якое гадаваў на карову, адзеўся цяплей — была самая няпэўная восень: вецер і холад — і паехаў. Вярнуўся ён хутка, але ўжо не адзін — разам з ім прыехалі Дуня і малы Міколка. Людзі казалі, што ў мінёра знайшлася там першая жонка з вялікімі ўжо дзецьмі і ён перайшоў да яе. Сама ж Дуня ўсім гаварыла, што яе муж паехаў у доўгую камандзіроўку і будзе прысылаць грошы на пераводзе. Спачатку яна сама атрымлівала грошы «на «запатрабаванне», а потым штомесячна пераводы пайшлі на Сябрынь. Калі я прыносіў іх, Дуня глядзела на мяне насцярожана і гаварыла:

— Прыслаў, нарэшце, мой грошы. А я толькі чакала.

Гаварыла яна так, відаць, для мяне — каб я не здагадаўся, што муж яе кінуў, што яна атрымлівае аліменты, высуджаныя на судзе. Калі ж Цэшкава зразумела, што я ўсё ведаю, яна прасіла толькі мяне, каб нікому не расказваў. Я і не расказваў — надумаеш, што мне да таго, атрымлівае Цэшкава аліменты ці гэта ёй прысылае грошы сам муж!

З гэтае вясны Дуня жыла толькі з маткаю — стары Цэшка падвозіў сёлета ячмень да сеялкі і скінуў, прыхаваў сабе ў кустах мяшэчак збожжа. Увечары, калі, яшчэ не павячэраўшы і нават не памыўшыся, Цэшка нёс яго дадому, ля самай хаты натрапілі на яго брат Дзямідзька — брыгадзір — і Мікіта. Можа б, яны і паладзілі неяк, можа б, і не казалі пра гэта нікому, але ж, кажуць, размову пачула Лысая Таццянка і ўпікнула міліцыянеру, калі той забіраў у яе самагонку:

— Вось вы ў мяне дык усё бачыце, а людзі вунь мяшкамі ячмень крадуць — і ім нічога.

Словам, прыйшоў да Цэшкі міліцыянер, і давялося Дзямідзьку пісаць на Мікалая, свайго брата, дакладную. Пасля быў суд, і вось ужо колькі месяцаў Цэшка піша пісьмы аднекуль здалёку.

Сёння Дуні таксама былі пісьмо і перавод. Спачатку я вагаўся, аддаваць усё тут ці, каб не злаваць яе, занесці дадому. Але ж аддаў.

— Тут во і табе, Дуня, пісьмо і перавод,— падаў я ёй пошту.

Не ведаю чаму, але мы, дзеці, звалі Цэшкаву Дуняю, хоць яна была ўжо мамаю, намнога старэй за нас, а мы былі ў такім узросце, калі ўсе, хто перад намі — толькі дзядзькі і толькі цёткі... І якая розніца — семнаццаць ім год ці пяцьдзесят.

Дуня спачатку, відаць, зазлавала, а потым узяла ўсё-ткі сябе ў рукі, усміхнулася і нахілілася над Міколкам:

— Вось і нам ужо наш тата грошы прыслаў. Скора ён і сам да нас прыедзе,— гаварыла яна і глядзела на Векавуху.

Матруна маўчала. Яна толькі адвярнулася і, як мне здалося, ледзь прыкметна ўсміхнулася — адпымі куточкамі вуснаў.

Міколка таксама не слухаў, што гаварыла яму маці: ён праз штыкетнік цягнуў абедзве рукі свае ў агарод — туды, дзе ўсё яшчэ брахала Найда.

Усе троху памаўчалі.

— Ну, пайшлі, пайшлі ўжо, дзеўкі, на вяселле,— нарэшце, уторкнуўшы грабянец у валасы, рашуча сказала цётка Ядоха.

— Пачакайце, пачакайце,— угледзеўшыся ў канец вуліцы, заўважыла Цэшкава.— А ці не дзядзька Саўка

гэта ідзе дадому? І з гармонікам сваім. Ён! Вунь жа іграе...

— І праўда ён,— зірнула ў той бок Ядоха.—А што ж гэта за вяселле без музыкі? Во д'ябал, чаго ж ён прэцца дамоў?..

Ядоха трохі недалюблівала дзядзьку Саўку, хоць, пасля таго як яго Паўлік узяў Ядохіну Маню, яны зрабіліся блізкаю раднёю. Але якраз за гэта, відаць, і неўзлюбіла сваіго свата жанчына — гэта ж трэба, яго шалапут, жыгун, корч гэты ўзяў яе адзіную дачку і звёз некуды аж на Поўнач. Прыйшоўшы з партызанаў, Паўлік пахадзіў-пахадзіў трохху, змяніў некалькі работ, але так і не змог ужыцца ў мірнае жыццё і паехаў, як кажуць, у свет як у капейку. І яе Маню звёз. Во, хіба гэта не жыгун? Іншыя з партызанаў папрыйшлі, з арміі вярнуліся і ўзяліся па-новаму жыць, хаты сабе ставіць. А гэтаму ўсё не так, усё круціўся як уюн, усё не ведаў, за што яму ўзяцца. Усё ў разведку хацелася ісці ці рэйкі толам падрываць. А тут брыгадзір загадвае салому вазіць... Не ведаў, дзе сябе ў мірным часе падзець...

І паехаў на Поўнач — служыў там у ахове, штоназірала за нядаўнімі паліцэйскімі. Паўлік прыязджаў з Маняю ў водпуск і, выпіўшы выгнанай бацькам да яго прыезду самагонкі, расказваў:

— Там, брат, як на вайне. Тут, па гэты бок, мы, савецкая ўлада, а там — яны, паліцаі, бобікі, як мы іх у партызанах звалі. Там ворага я ў твар і зараз бачу. Гніды!

А другі раз Паўлік прыехаў у Сябрынь, і яго ніхто не пазнаў — чорныя як смоль валасы зрабіліся белыя-белыя: пасівеў да апошняга воласа.

— Што з табою, Паўлічак? — заплакала маці.

— Нічога, мама, жыць застаўся, во і добра.

І зноў выпіўшы бацькавай самагонкі за прыезд, ён расказаў, як усё было. А потым ужо па калгасным двары Саўка пераказваў мужчынам:

— Значыць, варылі гэтыя зэкі, гэтыя паліцаі прадажныя (а яны ж, вы самі знаеце, якія гады), значыць, варылі яны доўгую-доўгую трубу. Ну, а мой жа заўсёды шустры быў. Заманулася яму паглядзець, як яны зварылі. Вось ён і палез у тую трубу. Значыць, ён туды, а яны — жах! — ліст сталі прысланілі і дзірку ўсю заварылі. Ну, мой, значыць, і папоўз задам па гэтай трубе — у другі канец аж. Вярсту паўзе — канца няма, другую

паўзе — таксама няма. А ён жа паўзе і яшчэ думае: што рабіць, як яны пабеглі ды і той канец прыварылі? Задам паўзучы, іх не абгоніш. «Будзеш і паміраць у гэтай зялезнай трубе...» Але не — не заварылі чамусьці другі канец. Вылез ён — і не верыць, што вылез. Толькі што я вам, мужчыны, скажу — палез ён у тую трубу чорны, а з другога канца вылез белы-белы. Вы ж самі бачылі. Пасівеў са страху. А ён жа, значыць, не баязлівы. Шустры.

Дзядзька Саўка быў ужо блізка. Ішоў роўна, хоць і здалёк бачылася, што ён нападпітку. Ішоў і, не шкадуючы сваёй старэнькай, з працёртымі мяхамі, заклеенымі ў многіх месцах на згібах квяцістымі латкамі, хромкі, якую ён прывёз з вайны, ішоў і, аж заломваючы мяхі, іграў хуткую польку. Спрытна перабіраў лады здароваю праваю рукою, і нават скурчаныя пальцы левай рукі, прастрэленай акурат у далонь, падзіва лёгка і паслухмяна лёталі па гузіках.

— А мамулечкі мае! Што ты робіш, ірад,— ты ж гармонік разарвеш,— замамулькала Ядоха, калі дзядзька Саўка падышоў блізка.

— Не бойся, сваццця, не разарву,— адказаў Саўка і, неяк адразу сціснуўшы мяхі, па паўгуку абарваў музыку — ды так нечакана, што нават сучка, якая, пачуўшы гармонік, пачала была брахаць гучней, ад неспадзеўкі змоўкла.

— А што ж ты ідзеш па вуліцы і гармонік, як кацяня якое пісклявае, ціскаеш?

— Не разарву, сваццця,— гаварыў Саўка да Ядохі.— Я, сваццця, з гэтай хромкаю, значыць, усю вайну прайшоў. Во на гэтых плячах яе насіў. Нас з ёю ва ўсім палку, ды што ў палку — нават у дывізіі ведалі. Ледзь што, ледзь селі — «Дзе тут Хмыз?» — шукаюць. Сыграй ім, Хмыз, і Хмыз іграў, значыць. А як жа! Артылерыст-наводчык Хмыз іграе вальс «Амурскія хвалі»! Здорава, га?

Дзядзька Саўка быў у чыстай гімнасцёрцы, палінялӑй ад ваеннага ды ўжо і ад мірнага поту. Сёння для такога свята — Цыца жэніцца! — Хмыз пачапляў усе свае медалі і нават адзін ордэн Славы; усё гэта аж залацілася вось зараз, у апошніх промнях сонца, якое ўжо, здавалася, кацілася яркім катком па самым небакраі.

Я глядзеў на Хмызавы медалі і думаў, як гэта далікатней аддаць яму пісьмо, каб не пакрыўдзіць Ядохі, бо

на почырку ведаў, што пісьмо прыйшло ад Паўліка. Выручыў мяне сам дзядзька Саўка.

— А пошта палявая пісьма мне не прынесла? — прыжмурыўшыся, запытаўся ён.

— Ёсць,— нясмела адказаў я, падаў канверт і ўбачыў, як пакрыўджана замыліла губы Ядоха.

— Яму, гэтаму іраду, усё,— вылівала яна сваё гора Матруне.— І пісьмы яму пішуць, і ў госці прыедуць, дык усё ў яго і жывуць, а да мяне толькі ўжо гуляць ходзяць — быццам ужо я і не матка ім. Адабраў дачку ў мяне, ірад, адабраў... І вось цяпер мадзею адна — голая, як на пні стоячы...

— Ды кінь ты, сваццяя,— чытаючы пісьмо, напружана ўглядаючыся ў літары сваімі падслепаватымі вачыма, адмахнуўся ад Ядохі дзядзька Саўка.— Цэла ты будзеш і без дачкі.

— Цэла-то цэла, а сам вунь нявестку, не бойся, у сваю хату прывёў,— не сунімалася Ядоха.— Сам, нячысцік, не хочаш удваіх з Тацццянкаю (Хмызіху таксама звалі Таццянкаю) жыць. А маю звезлі, ірады. Выйшла б замуж тут за каго, была б заўсёды блізка — дык хоць бы вады калі хворай матцы падала, не трэба было б чужога чалавека прасіць. Гэта ж добра, што во хоць Лэся пакуль жыве са мною.

Лэся, прыгожая чорнавалосая дзяўчына, з чорнымі — аж сінімі ад глыбокай чарнаты — вачыма, ціхенька сядзела на самым краёчку лаўкі і ўважліва, паварочваючы, як і Клёцчыха, галаву то сюды, то туды — да таго, хто гаворыць,— слухала. У самы голад, калі па ўсёй Украіне безнадзейна ўглядаліся ўдалеч маўклівыя ветракі, не спадзеючыся ўбачыць хоць адну якую падводу, нагружаную мяхамі, якая б везла ім работу, у самы той голад ішлі праз нашу Сябрыню цэлыя сем'і ўкраінцаў, якія прасілі зусім няшмнога — толькі напалудпаваць ці павячэраць. Адну такую сям'ю ўзяла на час да сябе Ядоха, і ўкраінцы, пражыўшы такою дружнаю і тлумнаю камунаю ўсю вясну і ўсё лета, над восень паехалі дадому, а Лэся пакуль што засталася ў Сябрыні. «Ты ж адна, дык няхай, хіба, яна табе хоць бульбу капаць паможа, ды і нам там без лішняга рота, зразумела, будзе пакуль што лягчэй»,— ад'язджаючы, гаварылі ўкраінцы.

Спачатку Лэся троху паплакала, а потым супакоілася — прывыкла да Сябрыні і без бацькоў. Яна прыгожа танцавала, і таму старыя бабулькі нават хадзілі на ігрыш-

чы, каб паглядзець, як Лэся вальсіруе з Толікам — сціплым, белагаловым, высокім Мікітавым сынам, які рабіў у калгасе прыплужнікам і вучыўся на трактарыста.

— Дык што яны хоць пішуць? — бачачы, што Саўка прачытаў пісьмо, хавае яго ў кішэнь і нічога ёй не гаворыць, спытала Ядоха.

— Што яны пішуць?! Глупства яны пішуць! — раззлаваўся Саўка.— Пішуць, што сёлета ў водпуск у Сябрынь не прыедуць. Пішуць, што ў нейкую Ляваддзю паедуць, на мора захацелася...

— А чаго вы, дзядзька, прыперліся сюды? Вяселле без музыкі пакінулі? — каб перавесці гаворку на іншае, спытала Дуня.

— Цэла будзе тваё вяселле і без мяне! Яны там зноў за сталы паселі. Няхай п'юць, ядуць. А марш іграць я не спазнюся. Вось заганю карову, парсюку дам — і зноў паїду.

— А дзе ж твая нявестка? — не сцярпела Ядоха.— Магла б ужо і яна карову загнаць.

— Там яна, сваццця, усе там. Шумна там. П'юць, гуляюць...

— А ты сюды — ад пітва, ад гуляў?

— Сюды таксама трэба: скора і тут іграць будзем. Там вяселле — а тут радзіны. Ці радзіла ўжо Настачка?

— Хто яе ведае. Шаўковіха яшчэ назад не бегла.

Дзядзька Саўка, можна сказаць, нарадзіўся двойчы. У самым канцы вайны яго ціхмяная Таццянка, з якою ён дружна жыў да вайны, жыве і пасля вайны, атрымала раптам чужы канверт, адкуль выпаў невялічкі лісток: «Ваш муж Хмыз Савелій Пятровіч загінуў смерцю харобрых...» І, калі Таццянка адплакала ўжо яго, успомніла, перабраўшы па дню, усё іх светлае жыццё, калі адправілі ўжо і дзевяціны і шасціны, першым пасляваенным летам Саўка нечакана з'явіўся раптам на пыльнай дарозе ў Сябрынь. Яшчэ здалёк, кажуць, убачыў яго Халадзёнак і, паказваючы ўсім у той бок пальцам, казаў:

— Зірніце, людцы добрыя, Хмыз з таго свету ідзець.

Дзядзька Саўка вельмі любіў расказваць пра вайну. А каму з тых, хто перамераў нялёгкі шлях вайны і вярнуўся з гэтага пекла жывым, не хацелася ўспомніць і расказаць іншым, як гэта страшна, як жахліва! Расказвалі ўсе, але военныя ўспаміны дзядзькі Хмыза былі троху адметныя ад іншых, з нейкім ціхім, сваім жаданнем ра-

забрацца, што ж, урэшце, здарылася колькі год таму назад.

Пазалетась, калі Саўкаў Паўлік быў дома, яны, адпусціўшы жанчын у ягады, самі рэзалі на дровы тоўстае яловае бярвенне, якое Хмыз яшчэ з вясны папрывозіў да сябе на двор. Мы з Клёцкам круціліся побач. Стаміўшыся, бацька і сын селі адпачыць — сын усеўся на казла, дзе ўжо ляжала бервяно, а бацька паставіў шырокі, толькі што зрэзаны кругляк, сеў на гладкі і цёплы яшчэ ад пілы зрэз. Бацька і сын разгаварыліся. Я таксама сеў па бервяно, якое ляжала яшчэ ў груду, і сцішана слухаў. Спачатку Паўлік расказваў пра партызанства. Потым пачаў успамінаць стары Хмыз.

— А то як яшчэ на пачатку вайны мы адступалі, наш цэлы ўзвод адстаў ад часці. Ледзь у акружэнне не трапілі. Значыць, ідзём, а за намі, чуем,— немцы ляскочуць. І разумееш, уперліся мы ў сцяну густога-густога, буйнога-буйнога жыта. І ці паверыш, сталі і стаім перад гэтай сцяною: ніхто не асмельваецца першы ўвайсці ў жыта, пачаць таптаць хлеб. Ведаем, што ўсё гэта недарэчна — немцы ж недалёка,— а ўсё роўна стаім, як дурні, ля жыта і топчамся.

— Ну і сяляне! Ну і даёць бацька! Гэта ж вайна. Што значыць нейкае жыта, калі кулі свішчуць. Тут, бацька, або — або. Выбірай любое. А яны, дзівакі, жыта баяцца патаптаць...

— Яно, канечне, сынок, і мы патапталі тое жыта. Але вось некалькі хвілін усё ж асмеліцца не маглі. Цяжка чалавеку зняважыць тое, што ўсё сваё жыццё святым лічыў.

— На тое, бацька, і вайна.

— Вайна-то, сынок, вайною, але ці зразумеў ты, што чалавек на гэтай вайне неяк... па-дзіўнаму...

— Ненатуральна, ты хочаш сказаць...— падказаў сын.

— Хай сабе будзе і «ненатуральна», як ты кажаш... Дык вось дзіўна ён неяк паводзіць сябе. Разумееш, забівае чалавека і радуецца гэтаму. Кідае гранату і, калі нападзе,— зноў жа радуецца: смерці чужой радуецца. І што страшна, нават самы добры, самы ласкавы, самы шчыры чалавек — і той радуецца, што забіў другога. Вось да вайны, бывала, заб'е нехта чалавека, дык размоў на ўвесь раён. А цяпер жа, глядзі, колькі кожны дзень забівалася, і ніякага табе суда. Пук-пук! — з вінтоўкі,— тут табе і ўсё. Быццам ты і не чалавека забіў, а так сабе — казяў-

ку якую. І не перажывае забойца, не бядуе, што яго зловяць, а наадварот — радуецца.

— Ну, ты, бацька, тут развёў,— Паўлік не дагаварыў, што развёў стары Хмыз.— Гэта ж вайна: ты не заб'еш, цябе заб'юць.

— Я, сынок, ведаю, што вайна. І сам забіваў. Але ж я не пра тое. Страшна ўсё ж, калі чалавек чалавека забівае і радуецца яшчэ. Нешта звярынае вайна ў чалавеку будзіць.

— Якое там звярынае. Проста чалавек абараняецца, каб застацца жывым. А потым на нас жа фашыст напаў, яго і забіваць трэба было. А ты нейкую анцімонію разводзіш.

Але Саўка, нібы і не чуючы сынавых слоў, казаў далей:

— Толькі і на вайне часам душа чулліваю нейкаю стане. Памятаю, як нам загадалі аднойчы расстраляць палоннага фрыца. Зарадзілі мы вінтоўкі, а нас пяцёра было, прыцэліліся. «Палі!» — скамандаваў лейтэнант. Мы і пальнулі. З пяці стваловў. Пальнуць-то пальнулі, а чалавек стаіць. І лыпае ад нечаканасці сваімі бялёсымі вейкамі. Бо кожны з нас пяцёх схітраваў, як бачыш: страляў угору, вышэй галавы, спадзеючыся, што пехта іншы ў фрыца пацэліць.

— Хіба ж так можна, бацька! Гэта ж вораг быў перад вамі.

— І мы, сынок, разумелі, што вораг. Але ж калі ён наступае на цябе, цэліцца ў цябе, тады лягчэй яго расстрэльваць. А калі ён вось так, безабаронны, стаіць перад табою і не пагражае ўжо табе, дык ён бытта ўжо і не вораг, а чалавек звычайны. А звычайнага чалавека я ўжо не магу вось так узяць і забіць.

— Дык вы што, жывым яго, таго фашыста, так і пакінулі?!.

— Не, сынок, забілі. Другім залпам пехта з нас пацэліў у яго. Але, думаю, той, хто пацэліў, відаць, доўга таго немца ўспамінаць будзе... Хоць да гэтага ў баі ў многіх страляў...

— Не ведаў я, бацька, што ты ў мяне такі размазня. Ворага забітага шкадуеш. А колькі той вораг нашых наклаў...

Дзядзька Саўка зацягнуўся разы са тры запар, кінуў недакурак над плот, дастаў да яго наском бота — акуратна затаптаў дымок. Потым сказаў:

— Нейкі ты ў мяне жарсткаваты, сынок. Відаць, па маймy дзеду, па Васілю. Во той ужо быў злы! Ледзь што — вілы ўперад: не падыходзь, закалю! Баравік які ў лесе знойдзе і то з тапаром ля яго гатоў дзень стаяць — каб той падрос і каб ніхто іншы не зрэзаў.

— Ну, бацька, кінь ты — зноў пачынаеш сваіх дзядоў і прадзедаў успамінаць. Давай лепей рэзаць дровы.

Саўка моўчкі ўстаў, моўчкі ўзяў пілу, пашляваў на правую далонь і падаў другую ручку сыну. І, ужо рэжучы, зазначыў:

— А Радзіму ўсе ад фашыстаў абаранялі. Нават такія, як я, размазні...

Паспрабаваў тады падняцца і я, але не змог: сеў на дужа смаловае бервяно, і, пакуль слухаў, мае штаны зусім прыліплі да яго.

Зараз я, успомніўшы, памацаў тое месца — штаны ўсё яшчэ былі прасмоленыя, цвёрдыя і ломкія...

— Дык ці скора ўжо той Мікіта кароў прыгоніць? — спытаў дзядзька Саўка і павесіў на плячо гармонік.

— А мамулечкі ж мае, каровы яму паўме! Ідзі ты ўжо, ірад гэты, іграй лепей,— злосна зірнула на Саўку Ядоха.— А то кінуў-рынуў вяселле і прыпёрся сюды немаведама чаго. Ідзі. Карову ўжо тваю мы з Лэсяй загонім.

— Загоніш? — узрадавана перапытаўся Хмыз.— І свінням дасі? Ну, у мяне ж не сваццяя, а золата.

І дзядзька Хмыз палез быў цалавацца. Ядоха адпіхнула яго локцем: пінжак з'ехаў у яе з плячэй і зваліўся на траву ля плота.

— Не лезь, ірад. А то во адламаю дрын ды дрынам...

— Ну, не хочаш, як хочаш,— падымаючы пінжак і ўскідваючы яго на сваццівы плечы, згадзіўся Саўка.— Сапраўды пайду. А то там Сянчылу сумна, відаць, без маёй хромкі стала. Ён жа сядзіць на скрыні, есць ладкі ды ўсё крычыць: «Саўка, іграй, «Сербіянку»!»

Хмыз зняў з белага перламутравага гузіка заплічку, якая трымала сабраныя разам мяхі, і, падбіраючы на хаду мелодыю, звыкла знаходзячы пальцамі кнопкі, між якіх чарнеліся два вялікія, прыбітыя цвічкамі гузікі, адарваныя, відаць, ад сарочкі, заспяваў:

> Эх, Тац-цянка, Растац-цянка,
> Усе чатыры каляса-а-а...

— Бач ты яго, і Таццянку сваю ўспомніў,— гледзячы яму ўслед, ужо неяк зусім нязлосна сказала Ядоха.

Дзядзька мінуў сцежку, што вяла да яго хаты (сядзіба была зводдаль вуліцы, туды, пад самую Вужыцу, і стаяла высока на ўзгорку, які ў Сябрыні ўсе звалі Саўкавай гарою), і, спяваючы пра сваю Таццянку, сярэдзінаю вуліцы пайшоў па вяселле.

— Ідзіце, дзеўкі, і вы,— падагнала баб Ядоха.— Я вось заганю кароў, упарадчуся троху ды і сама прыбягу. І ты, Лэся, ідзі з імі. Я адна спраўлюся.

Жанчыны падняліся і гаманліваю чарадою пайшлі ў той канец, дзе весялілася вяселле. Лэся паклікала да сябе Дунінага малога, і той, выставіўшы ўперад рукі, праз матчына плячо палез да яе.

— На, нясі, калі табе так хочацца,— усміхнулася Дуня і аддала сына на Лэсіны рукі.— Збівай ахвоту, пакуль сваіх няма. А тады рукі адарвуць, дык будзеш рада, каб пехта паднёс.

Клёцчыха, якая ішла за Лэсяю, не ўтрымалася і ўшчыкнула Міколку за ружовенькую пухленькую шчочку, паказала яму язык. Той скрывіўся і заплакаў.

— Нашто ты дзяцёнка скрыўдзіла? — азірнулася Цэшкава.

— Во, румза гэтая, ужо і плачыць — не зачапі яго.

У самым канцы вёскі паказаліся каровы. Параўняўшыся з дзядзькам Саўкам, які ўсё яшчэ ішоў пасярод вуліцы і залівіста, на ўсе мяхі, ціскаў сваю хромку, яны здзіўлена саступалі яму дарогу і абміналі музыку з двух бакоў, а каторая вельмі ж ужо цікаўная, дык паварочвала галаву і, нічога не разумеючы, доўга глядзела ўслед: маўляў, што гэта з чалавекам стала — ідзе пасярод вуліцы і іграе. З Мікітам Хмыз трохі прыстояў і загаварыўся. Відаць, ён бы гаварыў з пастухом яшчэ доўга, але жанчыны, якія падышлі, узялі Саўку пад рукі і павялі на вяселле. Дзядзька Хмыз трасянуў чорнаю чупрынаю і зайграў яшчэ весялей:

А мая мілка дорда, дорда,
На насцелі позна спіць...

Мікіта пабег даганяць кароў, якія ўжо адышліся.

Насустрач статку ішоў і я — кіраваўся да хаты завуча. Андрэю Іванавічу было сёння аж некалькі газет — Чуеш заўсёды многа выпісваў іх.

Раптам аднекуль як з-пад зямлі перада мною ўзнік Клёцка.

— Ого,— здзівіўся ён,— чаго гэта ты ў Ленчыну шпадніцу руку ўматаў?

Зірнуў на руку, пра якую сам неяк і забыўся, звыкся з ёю, уматанаю,— мяне не раздражняў зялёны шматок крамніны, па якім ляталі невялічкія, як палінялыя матылі, белыя кветачкі.

— А табе што, Клёцка, да гэтага? — узлавана адказаў я.

— Яш у Ленчынай шпаднічы! Яш у Ленчынай шпадпічы! — дзяцінячыся, спяваў сваім амаль мужчынскім голасам Клёцка і кружыўся вакол мяне па вельмі шырокаму кругу — на ўсю вуліцу. Я ж адчуваў, як пачынае раздражняць мяне яго шапляватасць. І дзіва дзіўнае — звычайна не заўважаеш гэтае яго заганы, а як толькі раззлуе — адразу так і лезе ў вушы Клёцкава — «шпадніча».

Клёцка так нечакана знік, як і з'явіўся: пабег пад свой двор.

Я са злосцю разбінтоўваў руку, якую нядаўна так ласкава завязвала мне Лена. Нават не разбінтоўваў — проста зрываў каснічок. Не чуў нават болю і толькі пасля ўжо ўбачыў, што з раны, да якой прыліпла перавязка, зноў паказалася кроў. Я ішоў і злаваўся — і трэба ж гэтаму Клёцку памятаць, якую сукенку насіла некалі Лена! Гэта дык ён во помніць, а табліцу множання і зараз не ведае. Спытай знянацку — разгубіцца...

Скамячыўшы перавязку, я падышоў да куста бэзу, які шырока, амаль па самай вуліцы, рос перад Цэшкаваю хатаю, і толькі хацеў кінуць за яго крамніну, як адтуль нечакана выскачыў Клёцка і, нібы чарцяня, зноў заспяваў:

— Ленчына шпадніча! Ленчына шпадніча!

І пабег. Я кінуў у куст квяцісты шматок і сціснуў зубы: ну, пачакай жа ты ў мяне, Клёцка, пачакай, шэпель! Папросіш ты задачу спісаць. Паглядзім, як тады запяеш: «Ленчына шпадніча!»

Каровы ўжо былі зусім блізка. Я ж хацеў да іх падыходу паспець у завучаву хату: ведаў, што Андрэй Іванавіч меўся сёння даставаць верасовы мёд, і таму спадзяваўся, што ён мяне пачастуе. Калі ж Чуеш выйдзе непраймаць сваю зброддівую карову і мне давядзецца аддаць яму газеты на вуліцы — лічы, прапаў мой мёд.

Завуч сапраўды выйшаў на вуліцу раней — перад самымі каровамі.

— Вось вашы газеты, Андрэй Іванавіч,— падаў я пошту.

— Ого, колькі,— усміхнуўся ён і, убачыўшы мой кіславаты твар, відаць, усё зразумеў.— Пачакай, во заганю

карову, ды пойдзем, чуеш, да мяне — паможаш мне мёд з гарода ў сенцы прынесці.

Успомнілася, як летась я прынёс пошту, калі Андрэй Іванавіч таксама даставаў мёд. Зайшоўшы да яго дадому, я нікому не аддаў газеты, хоць у хаце былі дзеці настаўніка, а панёс іх у сад — што ж ты зробіш, калі так хацелася пакаштаваць мёду! У садзе нікога не было, і я, убачыўшы вялізную місу з мёдам, не ўтрымаўся ад спакусы і мазануў пальцам. І не паспеў гэты палец данесці да рота, як з-за хаты нечакана выйшаў Андрэй Іванавіч. Засаромеліся мы абодва: я не ведаў, што далей рабіць са сваім пальцам — несці ў рот ці абцерці аб траву, а настаўнік ад нечаканасці нават спыніўся — відаць, забыўся, чаго ён сюды спяшаўся...

Каровы ішлі спакойна, няспешна (навошта бегчы — авадпёў жа няма) і ўзнімалі па вуліцы захаладалы ўжо крыху пыл — не такі густы, як улетку, а рэдзенькі, восеньскі. Недзе з боку ад статка, трошку далей ад пылу, ішла адзіная авечка самога дзядзькі Мікіты, якая пасвілася цэлае лета з каровамі: яна была сытая, круглая — ці то так наелася, ці, можа, была ўжо котная.

— Чуеш, куды ты, зброд гэты! — крычаў Андрэй Іванавіч на сваю чырвоную карову, якую ён нядаўна купіў у Лапысіцы.— Куды двор пераходзіш — ніяк да правулка майго не прывыкнеш!

Забегшы наперад, Чуеш махаў прутком ля самых рагоў свайго «зброду», але не біў — шкадаваў: Чуеш наогул шкадуе ўсё жывое. Кажуць нават, калі яго ўкусіла, парваўшы калашыну, Ядошына Найда, падцікаваўшы ля дзіркі ў разламаным плоце, настаўнік падняў быў камень, што якраз трапіўся пад руку, але ў тую ж хвіліну, убачыўшы, як Найда, нібы зразумеўшы, нібы вінячыся, апусціла вочы долу і хадзіла ля згароды, кінуў яго на зямлю. «Дурная! Дурная! Найда дурная!» — толькі і змог ён вось так, не ўдарыўшы, накрычаць на сучку і пакульгаў да свае хаты.

Андрэй Іванавіч, былы камандзір партызанскага атрада,— дужа добры чалавек. Ён хаця ў школе і крычаў на нас, але мы яго не баяліся — ведалі, што завуч нічога благога не зробіць. Я веру, што Чуеш не крычаў бы на нас і за чубы, каб не Бусліха.

Ён быў блізарукі — насіў акуляры, якія вельмі ж часта забываўся дома: прыйдзе на ўрок — лап-лап! — па кішэнях — няма. Выклікаў ён неяк Клёцку да дошкі, у яко-

га па гісторыі былі толькі двойкі: нават ужо бацька хадзіў да дырэктаркі і скардзіўся, што Чуеш наўмысля ставіць яго сыну дрэнныя адзнакі. Рагатуноў Раман, які сядзеў тады на пярэдняй парце, паклаў падручнік на калена. А Клёцка, стоячы ля дошкі, чытаў усё спрытна. Чуеш слухаў яго, слухаў, а потым і пытаецца:

— Ты што, малец, на памяць усё вывучыў?

Тады Клёцка знарок пачаў словы прапускаць. А Чуеш усё роўна слухае, радасна ўсміхаецца так і гаворыць сабе:

— Вывучыў, абібок, на памяць вывучыў. А і праўда на памяць ведае. Сядай, пяць. Во, як, чуеш, вучыць пада...

— Здароў, Іванавіч! Здароў, зяцёк! — павітаўся Мікіта і падаў руку — спачатку завучу, а потым і мне.

Я засаромеўся, што дзядзька Мікіта пры настаўніку назваў мяне зяцем. Каб ён казаў так не пры Андрэю Іванавічу, то я на гэта б не зважаў. Такое было для мяне не навіна: дзядзька Мікіта зваў мяне зяцем даўно. Збярэ, бывала, нас на сваім двары і кажа: «Вось, хлопцы, нарэжце гэтыя елкі ўсе, тады закурыць дам». Мы і рэжам. Убачыць, што я стаміўся, і скажа: «Ну-тку, Клёцка, падмяні Яся. Няхай зяцёк адпачне»,— і, ведаючы, што ў мяне не атрымліваецца папяроска, сам скруціць тоўстую-тоўстую і, наслініўшы напаследак, прыклеіць газету збоку і падасць: «На, куры, зяцёк». А то насыпле на калоду цэлы груд цвікоў гнутых, іржавых і скажа: «Параўняйце мне, хлопцы. А ты, зяцёк, пакажы, як трэба рабіць».

— Што гэта вы, вучоныя, і ўдвух з караваю не справіцеся? — убачыўшы, што рагуля ніяк не ідзе дадому, усміхнуўся дзядзька Мікіта і, ляснуўшы пугаю, крыкнуў:— Куды пайшла, Пысіца?

Карова паслухмяна завярнулася ў правулак.

— Чуеш, гэта ж не Мікіта, а чорт нейкі,— паціскаючы плячыма, усміхнуўся настаўнік.— І карова, як Таццяннчын Палюган, яго слухаецца. І імя ёй нейкае сваё выдумаў.

— Як гэта выдумаў? — павярнуў галаву Мікіта, які перайшоў ужо хату Андрэя Іванавіча.— Ты ж яе адкуль прывёў? З Лапысіцы. Доўга дужа. Цяжка выгаворваць. А вось Пысіца — лёгка.

Пысіца важна ішла на правулку. З пруткам у руках за ёю, абыходзячы свежыя кароўіны бліны, ішоў Чуеш. За ім — я.

Успомнілася чамусьці зіма.

Тады былі самыя маразы. А ў нас на двары не засталося ніводнага палена дроў. Цётка раніцою ўнесла нейкіх

кончыкаў, кінула іх з грукатам у загнеце і, нібы сама сабе, пачала бурчаць:

— Вось на сёння яшчэ троху сабрала. Сёння яшчэ прапалю ў печы, а тады ўжо дык і бог святы ведае, што будзіць. Будзем і халодныя сядзець і галодныя.

Я разумеў, што цётка гаварыла гэта не толькі для сябе. І пакуль яна, клянучы чамусьці маразы, цярпліва падпальвала сырыя, сяк-так сабраныя дровы, я рашуча злез з печы, дзе спаў на прарасчаным для самагонкі жыце, якое, вусатае, сушылася на чарапе, злез у халодную пасля ночы хату і пачаў апранацца.

— Куды ты, Ясь? У школу ж яшчэ рана.

— Я сёння ў школу не пайду. У дровы паеду.

У хаце гарэла капцілка, і таму вокны, хоць за імі ляжаў белы снег, здаваліся цёмнымі.

Раніцы зімою, калі світае як не пад самы полудзень, заўсёды бываюць дужа доўгія — часам нават здаецца, што гэтая шэрая цемень ніколі не абадпеецца. Пакуль я шукаў брыгадзіра, аднаногага Дзямідзьку, якому ў партызанах у час блакады адарвала нагу; пакуль ён, топчучы мокраю ад нізу дзеравяшкаю снег, доўга думаючы перад гэтым — вырашаючы, якога каня мне даць,— дазволіў узяць нарэшце кульгавага Шнэля, адбітага ў немцаў жарабка, які вазіў потым салдацкую кухню і якога пасля ранення, калі наступалі, нашы салдаты пакінулі ў Сябрыні; пакуль я дачакаўся Халадзёнка, які загадваў усёю вупражжу; пакуль запрагаў; пакуль, пад'ехаўшы пад Рагатунову хату, чакаў Рамана, які хоць і неахвотна, але ўсё ж згадзіўся з'ездзіць са мною ў дровы,— раніца троху пасвятлела, але пакуль не саступіла дарогу дню: снег, хоць і белы, яшчэ цьмяна, нібы воблакі, нашатырыўшыся ад марозу, шарэў на вуліцы, на стрэхах...

Мы ішлі за санямі і ўсю дарогу разважалі, як гэта конь, які звычайна ўцякае ад пугі, не ведае, што зрабіць такое яму ніколі не ўдасца: уцякаючы ад драцянкі, конь вязе за сабою і таго, хто сцёбае,— бяжыць хутчэй, і той, хто б'е яго, таксама едзе хутчэй.

З лесу, нашастаўшы там цэлыя сані аднаго бярэзніку, мы вярталіся недзе пад абед. Ярка, аж рэзала ўваччу, свяціла сонца. Шнэль вельмі ж ужо марудна кульгаў па наезджанай дарозе: дарэчы, Дзямідзька заўсёды даваў мне гэтага каня — і спакойны, не ўпудзіцца, і можна спіхнуць такую кавялу на дзіцячыя рукі, бо іншыя яго, нядошлага, не бралі.

Мы, хоць ішлі і ціха, загаварыўшыся, незаўважна, здаралася, абганялі сані, што паволі рыпелі па палазне. Тады я вяртаўся назад, браў у рукі лейцы, тузаў за іх, нокаў і цукаў, але гэта зусім не памагала. Сонна рыпелі палазы, Шнэль ішоў сваёю кульгаваю і спакойнаю хадою і, здавалася, не думаў нават прыбаўляць кроку. Я ж баяўся, каб не ўбачыў нас ляснік, і таму, пад'язджаючы пад Раёўшчыну, якая стаіць толькі праз рэчку ад нашай Сябрыні, усё часцей і часцей шморгаў лейцамі. Але Раёўшчыну, па якой не трэба было нам ехаць, а толькі перарыпець праз вуліцу, і ўсё, мы мінулі спакойна. Нідзе не было відаць лесніка, калі мы па вымерзлай у лёд Вужыцы пераязджалі на свой бок. Цяпер да Сябрыні было ўжо зусім блізка — адно толькі падняцца з нізіны па раўку. І там ужо роўная вуліца, блізка і наша хата.

Але тут здарылася тое, чаго я баяўся: з-за раёўшчынскіх хат, на дарогу, па якой мы толькі што праехалі, выйшаў Мацуль з двухстволкаю за плячыма. Яго плячыстую постаць, яго доўгі кажух, над якім заўсёды пагрозліва ўзвышаліся два ствалы, ні з кім іншым не маглі зблытаць нават мы, дзеці. Ляснік прыстояў, агледзеўся і, убачыўшы нас, заспяшаўся ў Сябрынь.

Ногі мае падламаліся, я раз'юшана пачаў тузаць за лейцы і не сваім голасам, які раптоўна ахрып, бо ў горле стала суха і горка, бы пасля цяжкой працы, крычаў:

— Но, пайшоў! Но!

Шнэль прыбавіў трошку ў хадзе, але хіба намнога хутчэй можа пайсці кульгавы конь?! Дагоніць Мацуль нас, далібог, дагоніць!

Спалохаўся і Раман. Ён таксама нокаў, падстаўляў сваё плячо пад воз, памагаючы каню, але якая там помач ад дзіцячага пляча!

Мы набліжаліся да раўка. Мацуль падыходзіў да рэчкі.

Сяк-так Шнэль усцягнуў сані як не да палавіны раўка. Але потым дровы ўсё ж перацягнулі каня, і воз, які не змог утрымаць на дацягнутай вышыні Шнэль, пасунуўся з гары ўніз, валакучы за сабою і слабаватага везуна. Шнэль напінаўся, натужліва ўпіраўся ў слізкі лёд пярэднімі капытамі, прыпадаў на парапеную нагу, выцягваў шыю, стараючыся ўсё ж утрымаць воз, але той, нягледзячы на гэта, забіраў улева, сунуўся ўсё хутчэй і хутчэй уніз. Нарэшце, упёршыся полазам у вялікі камень, што ляжаў з боку палазні, воз спыніўся, так і не з'ехаўшы з пагорка.

Мацуль узыходзіў ужо на лёд Вужыцы.

Мы з Раманам яшчэ прарэзлівей пачалі нокаць на Шнэля. Той, непадкаваны, выбіраючы на лёдзе менш слізкае месца, ставячы капыты як не раброй, перабіраў дрыжачымі нагамі (нібыта яму перадалося наша хваляванне!), таптаўся, торгаўся то ўправа, то ўлева, адрываў полаз на нейкіх пару сантыметраў ад каменя, але добра скрануць сані яму не ўдавалася — полаз, як да магніта, зноў сяншаўся да каменя. Шнэль умакрэў, ад яго спіны валіла пара, бакі стамлёна і задушліва дыхалі, а мы ўсё нокалі і нокалі.

І раптам, сабраўшы, відаць, усе свае сілы, Шнэль натужыўся, настойліва ўпёрся ў ямінку, якую ўсё ж знайшлі ў лёдзе яго капыты, ірвануўся... і нечакана пайшоў лёгка, вольна, без натугі. Я, нокаючы, нават не пачуў, як штосьці трэснула, і разабраўся толькі тады, калі на лёд, тонка задрынчаўшы, выцягнуўшы з сядзёлкі церассядзёлак, зваліліся аглоблі: Шнэль распрогся.

Відаць, спяшаючыся, я абы-як сціснуў клешчы і дрэнна завязаў супоню — на роўную дарогу гэтага хапіла, а зараз хамут рассупоніўся. Дуга, падламаная ў самым версе, трымала не вельмі моцна, таму паслабленыя гужы лёгка ссунуліся з аглабель, і Шнэль, з выглядам пераможцы, з дугою, што ляжала на хамуце, спяшаўся ўверх, а за ім, за лейцамі, як дурань, ішоў і я.

Азірнуўшыся, убачыў, што Мацуль мінаў ужо Вужыцу...

Не помнячы сябе, я кінуў лейцы вобземлю, забег каню наперад і ў роспачы стукнуў Шнэля сціснутым да болю кулаком па цвёрдай, сухой і касцістай храпе. Шнэль спалохаўся і рэзка падаўся назад, зачапіў нагамі дрэнна ўвязаныя дровы, што вытыркаліся з воза, і бярэзіны з грукатам пакаціліся з саней. Тут я ўдарыў каня па храпе другі раз. Шнэль ашчэрыўся і, фыркнуўшы, ускінуў галаву ўгору. Я павіс на аброці. Раззлавана, раз'юшана біў я яго па шырока раздзьмутых ноздрах і ў злосці і роспачы не адчуваў болю. І адпусціў аброць толькі тады, калі нечакана ўбачыў вочы каня. Не, у іх не было злосці. У іх не было нянавісці. У вачах Шнэля былі толькі найвялікшая крыўда і роспач ад сваёй бездапаможнасці: ён не мог помсціць мне за здзек, але і не мог зрабіць тое, што я так настойліва патрабаваў,— не меў сілы, каб скрануць воз. І я зразумеў, што Шнэль плакаў.

Калі я зваліўся з аброці, да каня падышоў Раман і ласкава, нібы просячы прабачэння, пачаў гаварыць да яго:

— Косю мой... Косю...

Шпэль супакойваўся. Раман зноў завёў яго ў аглоблі і моўчкі пачаў запрагаць. Я зірнуў у бок ракі...

Мацуль перайшоў Вужыцу, але ўсё яшчэ стаяў на беразе, на тым самым месцы. І не адзін. Ля яго размахваў рукамі, відаць, расказваючы нешта вясёлае, Андрэй Івапавіч. І адкуль толькі яго бог панёс! Мацуль усё спрабаваў спаїсці, заварочваўся ў наш бок, спрабаваў абыходзіць завуча, а Андрэй Іванавіч, бліскаючы шкельцамі акуляраў, забягаў наперад — каб затрымаць яго.

Убачыўшы гэта, я кінуўся дапамагаць Раману. Зноў засупоньваў хамут, але ў вочы Шпэлю не глядзеў — сароміўся. Спяшаючыся, ніяк не мог трапіць супоняю за цвічок, які Халадзёнак убіў у клешчы замест зрэзанага вяроўкаю і вышчарбленага зарубкаю дрэва,— вяровачка ўсё абыходзілася, саскокваючы з выслізганага крайку. Калі патрапіў, клешчы сціснуліся лёгка — не трэба было нават памагаць каленам,— паламаная дуга трашчала, зусім не спружыніла, і хамут засупоніўся, так і не напяўшы як след гужоў.

Мы з Раманам заканчвалі перапрагаць каня.

У школе, якая стаяла над самым раўком, празвінеў званок — цётка пазваніла, відаць, з апошняга для першай змены ўрока.

Завуч усё трымаў за рукаў Мацуля: той глядзеў у наш бок і спрабаваў развітацца з Чуешам, які быў сёння надзіва гаваркі.

Мы толькі паспелі пакласці на воз адну бярэзіну, што ўпала з саней, як са школы выбег увесь наш клас.

— Гляньце, Ясь забуксаваў! — крыкнуў нехта з аднакласнікаў, і мы не паспелі апамятацца, як з гары хто як пасыпаліся да нас хлопцы, а за імі і дзяўчаты. Яны ўмомант абляпілі з усіх бакоў сані, учапіліся за аглоблі, цягнулі за капылы, за палазы, за бярэзіны, так галёкалі і крычалі, што Шпэль, здзіўлены такой раптоўнаю палёгкаю, весела пайшоў, падганяны камлямі, што стукалі яму ў ногі, а потым нават і пабег на гару. Аднакласнікі паскідалі ў кучу свае палатняныя торбачкі з кнігамі і так абляпілі воз, што не было відно ні саней, ні дроў, ні нават самога каня — збоку, пэўна, здавалася, што гэта вялікія мурашы цягнуць нейкую цяжкую, але пасільную для такой грамады іглiцу. Нехта нават у гэтай суматосе ўмудрыўся сесці

на дровы — сядзеў зверху і співаў песню,— але такога цяжару не адчувалі ні мы, ні тым больш конь. Тыя ж, хто не знайшоў, як падступіцца да нашага воза, па двое, а то і па трое пахапалі скінутыя з воза бярэзіны і, весела адолеўшы гару, беглі да нашага двара. Хлопцы аж да самай хаты санямі гналі перад сабою Шнэля трушком, які зноў распрогся і бег у аглоблях проста так, уцякаючы ад камлёў, якія даганялі яго, бег, пакульгваючы, спяшаючыся.

Хлопцы адарвалі прывязаныя да шула старою панчохаю варотцы, якія вясною я збіў з тонкіх колічкаў, прыставілі іх пад акно да сцяны і ўпіхнулі на двор сані разам з канём і дровамі — ды так імкліва, што Шнэль неспадзявана ўпёрся пысаю ў частакол, рассунуўшы згароду і прасунуўшы галаву аж на той бок, у агарод.

Усё рабілася хутка, нават імгненна, але мне хацелася, каб ішло гэта яшчэ хутчэй: адтуль жа, ад Вужыцы, відаць, надымаўся ўжо Мацуль...

Праз якую хвіліну ні на двары, ні на санях не заставалася ніводнай бярэзіны — хлопцы перанеслі ўсё ў прасторны хлеў, дзе раней, пры бацьку, стаяла карова, потым — трафейная Фура, а зараз раскашавалася адна нізкарослая каза. Залажылі ўвесь хлеў дровамі.

— Сюды і каза не ўшчэміцца,— міргнуў рыжымі вейкамі Клёцка.

— Не бойся, ушчэміцца,— адказаў Раман.— Ёй жа многа месца не трэба.

Хлопцы надабралі і таксама паўкідалі ў хлеў садраную бярозавую кару, сучкі, трэскі, што адламаліся ад няроўна пассяканых камлёў, замялі, разраўнялі снег на двары — няхай цяпер пазнае Мацуль! — і гэтак жа нечакана, як і з'явіліся, зніклі. Разам з імі пабег і Рагатупоў Раман.

Адчуваючы нейкую зацятую, шчымлівую няёмкасць перад канём, я ўзлез на хату, дзе ў кутку, далей ад коміна, ляжаў невялічкі запылены стажок, выскуб ахапак казінага сена, якое нават казе цётка давала з выдзелку, і вынес яго каню. Каб хоць неяк зменшыць сваю віну, наклаў сена на руку, што, набітая аб храпу, усё яшчэ тупа балела, і, не гледзячы ў вочы каню, паднёс яго пад самы Шнэлеў рот. Я гладзіў Шнэля рукою і ўсё прасіўся: «Косю, косю». Конь абыякава, шумна дыхаючы, узяў у губы травінкі і без асаблівага смаку пачаў жаваць іх — здавалася, ён не зважае ні на мяне, ні на маё сена. І я тады зразумеў, што ніякаю травою ніякага даравання ў Шнэля не выпрасіш.

Яшчэ раз лёгенька ўшлікнуў, запрог каня, абы толькі ён дацягнуў сані да калгаснага двара, і паехаў адпрагацца. На вуліцы ўбачыў, як у завучаву вулачку пайшлі двое: вузенькі вынашаны шынель Андрэя Іванавіча і побач з ім шырокі плячысты Мацулёў кажух, над якім узвышалася дубальтоўка.

Сустрэўшы назаўтра на школьным двары, завуч сарамаціў мяне:

— Мужчына, чуеш, называецца. Каня, чуеш, запрэгчы не ўмее,— калі настаўнік злаваўся, ён сваё «чуеш» паўтараў як не за кожным словам.— Каня, чуеш, б'е. А ты ведаеш, што той, хто паднімае на жывёліну руку, сам дужа слабы чалавек. Сабраў сілы, чуеш, на каня. Гэта ж добра, што мне ў Раёўшчыну трэба было ісці. Добра, што я Мацуля таго сустрэў. Ледзь адгаварыў яго. А яны, чуеш, бярэзніку нашпілялі і вязуць сабе як фон-бароны. А каб акт Мацуль склаў? А каб у суд, чуеш, падаў? Нам бы, думаеш, прыемна было, што нашага вучня судзяць... Гэта ж добра, што мне трэба было ў тую Раёўшчыну,— паўтарыў ён яшчэ раз.

Я слухаў яго моўчкі, апусціўшы вочы долу, гледзячы на снег пад нагамі, і адчуваў, што ні ў якую Раёўшчыну яму не трэба было: проста з акна настаўніцкай ён убачыў нас з возам дроў, Мацуля за Вужыцаю і паспяшаўся яму напярэймы.

Мне і самому было не па сабе. Я і сам не разумею, як гэта атрымалася, бо да таго такога асляплення злосцю, такога адчаю ад сваёй бездапаможнасці ў мяне не было. Наадварот, калі я аднойчы бачыў, як незнаёмыя мужчыны, што вазамі цягнулі праз нашу вёску бярвенне некаму на хату, білі каня — ён паваліўся ў аглоблях усё пад той жа самаю гарою,— то доўга ніяк не мог забыцца на той жах, у маіх грудзях гулка і балюча аддаваўся кожны ўдар — мужчыны білі яго пад бакі ботамі, ланцямі, дзеравяшкамі, а конь ляжаў у аглоблях і адно глуха стагнаў...

Зараз, ідучы за завучам на яго вулачцы, я разумеў, што мая дапамога яму не трэба — проста Чуеш хоча пачаставаць мяне мёдам і хоча зрабіць гэта тактоўна. У агародзе ён сам узяў, цяжка нагнуўшыся, вядро з мёдам, а мне падаў місачку з лыжкаю.

— Чуеш, на нясі і еш дарогаю...

Наеўшыся мёду, я выбег з прагончыка на вуліцу і заспяшаўся да Васішковай хаты, якая стаіць вунь там, за калгасным дваром, за ліпамі, што, высаджаныя на адным

баку, далёка, ледзь не да самага лесу, праводзяць кожнага ў дарогу. І сустракаюць таксама.

Васяпкова хата стаіць ля самай вуліцы і, калі глядзець на яе адсюль,— такая ж, як і ўсе: адна сцяна з двума шырокімі вокнамі, пад імі густа буяюць вяргіні. Калі ж ідзеш праўз хату да дзвярэй — яна заўсёды нагадвае нейкую дзіўную рэпку з казкі: за пярэднюю хату, пастаўленую вокнамі на вуліцу, трымаецца другая, за другую — сенцы, за сенцы — яшчэ адна хата, за гэтую хату — клець, за клець — хлеў, за хлеў — рубленая награбня... І вось гэтая доўгая-доўгая рэпка на адну сцяну цягнецца як не да самага ажно загумення. Усе дзверы заўсёды акуратна пазачыняныя — што нават прымкнута, што проста так заторкнута выструганымі якраз дзеля гэтага калочкамі. Сам дзядзька Васяпок адразу ж пасля вайны знік з Сябрыні, і ніхто не ведаў, дзе ён і што зараз робіць: пры немцах Васяпок быў у паліцыі, добра-такі шчыраваў на службе, хадзіў з немцамі ў аблавы на партызан, ставіў на партызан міны, насаліў не толькі сваім адпавяскоўцам, але і людзям навакольных сёл. Таму, баючыся, што сябрынцы навядуць следства і яго, засудзіўшы, пасадзяць у турму, ён з'ехаў, перахаваўся недзе, а яго крыклівая Марфа зрабілася такою ціхаю, спакойнаю і спагадліваю — яе нібыта хто падмяніў,— што жанчыны нават жартам калі спрачаліся: яна гэта, Марфа, ці не Марфа, жыве ў Васяпковай хаце.

Сёння таксама ўсе дзверы і ў хатах, і ў клеці, і ў награбні былі акуратна пазачыняныя, і толькі адны былі адчынены напята і чарнелі цёмнаю плямаю сенцаў. Ля гэтых дзвярэй, ля ганка, згорбіўшыся, сядзела бабка Хімця, маці Васяпка, накінуўшы на сівыя валасы старэнькі, падраны ўжо, з'едзены моллю рэдзель, які, пакуль быў новы і белы, насіла сама Марфа, а цяпер, калі падраўся, нявестка няўдала перафарбавала ў чорны колер — рэдзель узяўся плямамі — і аддала дапошваць свекрыві. Бабка сядзела на ганку і, абхапіўшы рукамі калені, якія востра вытыркаліся праз доўгую фалдзістую спадніцу, ківалася, нешта сама сабе ні то спявала, ні то гаварыла. Ля яе ляжаў стары, заржаўлены і, відаць, дрэнна назублены серп, паміж зубоў якога макрэла яшчэ свежае зяленіва. Насупраць, на згародзе, вісеў зялёны бульбоўнік — мусіць, бабка Хімця толькі што яго нажала.

Пісьмы ім ішлі не дужа рэдка, але не сказаць каб і часта. Яны былі старанна заклееныя, адрас заўсёды быў над-

пісаны няўмелаю, няўвыклаю да пісаніны, заўсёды адной і той жа рукою. Было відаць, што рука трымала аловак пасля нейкай цяжкой фізічнай працы — ці пасля сякеры, ці пасля молата: літары скакалі па канверце, ніяк не ўцэльваючыся, не патрапляючы на загадзя акуратна разлінаваныя хімічным алоўкам радкі. Я здагадваўся, хто прысылаў у гэтую хату пісьмы, але пра сваю здагадку нікому асабліва не гаварыў.

Заўсёды, калі заходзіў сюды, мне было крыху не па сабе. Некалі, як Хадосся папрасіла мяне аддаць на пошту тоўстае пісьмо без маркі, у якім пасылала нейкія дакументы дзядзьку Мацвею, я зрабіў нядобра. Мне шкада было, што дзядзька Мацвей, якога мы ўсе любілі і ў якога, я ведаў, не вельмі тых грошай, будзе плаціць за даплатное рубель. І яададраў акуратненька марку з Васянкова пісьма, а з бульбы выразаў пячатку і з дапамогаю люстэрка напісаў: «доплатить». За той рубель, што я атрымаў ад Васянчыхі, наклеіў маркі на Хадосчына пісьмо.

Вось гэта мяне заўсёды мучыла, калі я заходзіў на круглы, шырокі двор Васянка.

Бабка Хімця адказала мне на маё «дзень добры», але не перастала ківацца і спяваць. Падышоўшы бліжэй, я пачуў, што яна спявае сабе пад нос нейкую жніўную песню:

А ішлі жнейкі, ішлі...

І нават калі я падаў ёй пісьмо, бабка не сціхла. Спачатку яна абыякава паклала была пісьмо ў свой чорны картовы прыпол, умазаны крыху свежаю зямлёю, якая, прасыхаючы, паспела ўжо троху пабялець і асыпацца, а пасля, нібы зразумеўшы, што я падаў ёй пісьмо, якога яна доўга чакала, схамянулася, вельмі ўважліва паглядзела мне ў вочы і, усміхнуўшыся ласкава, сказала:

— Пачытай мне яго, Яська...

Канверт адкрыўся лёгка: відаць, быў заклеены мылам, якое трымае добра, але варта падчапіць за ражок — адклейвацца ўсё разам.

— «Здрастуйця, мама, жонка Марфа і дзеці! Пішыць вам гэта пісьмо ваш сын, муж і бацька Іосіф Пятроў Гаціла. Я даўно ўжо вам не пісаў — ізвіняюсь. Не было ўрэмя. Наш леспрамхоз, насеклі ўвесь лес там, дзе я быў раней, пераехаў у другое места. Тут лес яшчэ нечапаны. Пачынаем рэзаць і яго. Выражам гэты — паедзем дальш. Без работы сядзець не будзем — такіх лясоў у Карэліі

многа. На маю жысць хваціць. А што там новага ў нас у Сябрыні? Ці інцерасаваўся хто маёй лічнасцю, ці ўсё пакуль што ціха? Напішыця. Да, чуць не забыў. Нада было б табе, Марфа, прыехаць у Петразаводск. Напішы, калі прыедзеш,— я так жа адпрашуся з лесу. Там бы я табе аддаў грошы зарабленыя. Сама панімаеш, пасылаць не хачу, бо баюся выдаваць сябе. Скажы ў дзярэўні, што ты едзеш куды да брата за Воршу, ці прыдумай што якое яшчэ. А я ўстрэчу цябе ў Петразаводску. Да, чуць не забыў. Мяне троху прыстукнула дрэвам, і цяпер я акрывеў: кульгаю на адну нагу...»

Далей Васянок перадаваў прывітанні дзецям, гаварыў, як ён сумуе без іх, паведамляў свой новы адрас.

Калі я скончыў чытаць, бабка забрала ў мяне ліст, пасвойму, не так, як ён быў зложаны да гэтага, склала яго і, цяжка ўзняўшыся, пайшла ў хату.

Дык вось дзе схаваўся Васянок — аж у Карэліі! Думае, што там яго не знойдуць. Хвалюецца, ці «інцерасуюцца яго лічнасцю»!..

Наступны, да каго мне трэба забегчы,— Васянкоў пляменнік, дапрызыўнік Гаціла: яму сёння прыйшла позва тэрмінова з'явіцца ў ваенкамат — відаць, на гэты раз забяруць ужо яго ў армію. Хлопец паўмесяца ходзіць з «босаю» галавою. Падстрыжаны пад ваенкамацкую нулёўку, ён ужо нічога не робіць, адно толькі чакае гэтай позвы. Яго равеснікі даўно служаць — і Мікітавага Антона, і Рагатуповага Івана, і Хадосчынага Колю забралі яшчэ ўвесну.

Адсюль да Гацілаў ужо недалёчка — прабяжыш паўз нізенькую Дзямідзькаву старую хату, якая з усіх чатырох бакоў абсаджана лапушыстымі кустамі бэзу і ў якой ужо ніхто не жыве,— Дзямідзька крыху далей пабудаваў сабе новую; мінеш трухлявую хатку Тарасоўкі, бабулі, што як жыла адзінока, так адзінока і памерла гэтай зімою — дзверы і вокны ў той жа дзень Дзямідзька забіў крыж-накрыж абрэзкамі, якія засталіся ад труны; гулка пратупочаш босымі нагамі пад вокнамі прасторнай, але не вельмі дагледжанай хаты Клёцак, на якой ужо, мусіць, ссунуўшы з покатаў кроквы, зусім ападала страха, агаляючы пачарнелы на гарышчы комін; мінеш невялікую, але дагледжаную хату глухаватага дзеда Шэпкі, які, здаецца, усё жыццё адбыў па адной пасадзе — начным вартаўніком,— і вось там, за калодзежам, яна, старая, тоўстая (не абхапіць і ўдвух, а то і ўтрох) Гацілава вярба, на якую

часам адразу залазілі як не ўсе дзеці нашай вёскі — сукоў хапала на ўсіх.

Падышоўшы бліжэй, я адразу заўважыў, што сёння Гацілава хата выглядае крыху не так, як заўсёды: больш адкрыта — так часам няўвыкла бачыць, калі чалавек, які ўвесь час хадзіў у шапцы, раптам здыме яе. Хаце чагосьці не хапала. А чаго, я зразумеў адразу, як толькі ўбачыў, што наўскасяк вуліцы (амаль да самых Дзямідзькавых акон) ляжала паабсяканае сучча з яшчэ не прывялым лісцём — паабапал таго месца, дзе была вершаліна. Гаціла ўцягнуў ужо амаль усю вярбу ў свой двор. І толькі камель яшчэ ляжаў ля пня, а на ім, выставіўшы ўперад сваю драўляную нагу і трымаючыся дзвюма рукамі за сукі, сядзеў Дзямідзька. Побач, узяўшыся за рукі, стаялі Клёцкі — бацька і сын. Гаціла канчаў абсякаць ніжнія тоўстыя сукі.

— А вот, глядзі ты, і зрэзаў,— казаў Клёцку Дзямідзька.— А я, гета, ужо думаў, што гетай вербіне і рады ніхто не дасць. Тоўстая ж дужа, халера на яе, была.

— Пілы ж, дзядзька, не хапала,— адсекшы сук, сеў і Гаціла.

— А ён, глядзі ты, смякнуў,— зморшчыўшыся, ад чаго яго драбнаваты твар, які, нібы гаршчок расколінамі, аплецены маршчынамі, яшчэ больш здрабнеў, шырока ўсміхнуўся Клёцка.— Узяў паабсек кругом дрэва, а тады і пілы хапіла, каб сяк-так вадзіць.

— І пасля рэзалі, нібы мух ляніва адганяючы,— хваліўся Гаціла.— Дужа не разгонішся, калі костачкамі ў пень стукаешся.

Я аддаў Гацілу позву.

— Нарэшце прыйшла, дарагуша,— хлопец асцярожна ўзяў яе ў рукі, пальцы яго неяк задрыжалі.— Так што хутка: «Салдат Гаціла, у дзве шарэнгі стройся!..»

— Цяпер ты, брат, Лёня, самагонку гані хутчэй на праводзіны,— усміхнуўся брыгадзір.— Ды сам ты, відаць, і не справішся. Хіба вот, гета, Марку папрасі,— і пальцам паказаў на Клёцку.

— А што, было б з чаго, а выгнаць я змагу,— адказаў той.— У мяне якраз апарат гуляе. А я ўжо палаўчыўся. Яна ў мяне ідзе і не балбоча даўжка.

Гаціла, смешна так адставіўшы вялікі палец, уматаны ў нейкія анучы, зноў узяўся за сякеру — убачыў яшчэ адзін неабсечаны сучок.

— Ого, Лёня,— нібы толькі зараз заўважыўшы ўкру-

чаны палец, сказаў Дзямідзька.— Дык ты, гета, паспеў ужо сабе вунь якую ляльку зрабіць...

Я зірнуў на Гацілаву руку. Ну і Дзямідзька! Уматаны ў анучы палец сапраўды быў падобен на ляльку — якраз вунь тая мурза, з якою ў Мікітавых сенцах яшчэ і зараз, пэўна, гуляе Волечка, Ленчына сястра.

Па тым баку вуліцы шпарка, імкліва прайшоў Тунькін. Ён, ласкава прыціскаючы да сябе, нёс на руках свайго меншанькага сына, які прытуліўся да пяголенай бацькавай шчакі, радасна, амаль у самыя вочы, лапатаў адно толькі слова: «тата», «тата», «тата»,— ці то ён сапраўды хацеў нешта сказаць бацьку, ці то яму проста падабалася паўтараць і паўтараць гэтае слова, ад якога малы ўжо адвык пасля таго, як дзядзька Змітра пакінуў зямлянку і перайшоў у другі канец Сябрыні — у хату Матруны Векавухі.

Петрык, моцна абвіўшы бацькаву шыю сваімі тонепькімі ручкамі і закруціўшы брудныя, усе ў цыпках,ногі недзе за бацькавай спіною, глядзеў толькі па скуласты бацькаў твар і ўсё паўтараў: «тата», «тата», «тата»...

— Куды ты, Змітра, так спяшаешся? — паўздагон яму крыкнуў Клёцка.— Хадзі во пасядзі з намі.

Дзядзька Змітра нічога не адказаў.

Толькі неяк рашуча махнуў рукою і пайшоў яшчэ шпарчэй.

— Ты вот, гета, просіш чалавека пасядзець з табою,— хітравата ўсміхнуўшыся і, неяк знізу ўверх, схіліўшы галаву набок, паглядзеў на Клёцку Дзямідзька.— А вот не ведаеш, што яму, можа, і няма калі з табою расседжвацца. Чалавек, можа, будавацца ўздумаў. Ты вот, можа, гета не знаеш, а я знаю. Гета, прыходзіць ён з абеду да мяне ў двор, і знаеш, што ён мне кажыць? «Дай мне, Дзямідзька, каня»,— кажыць. «А нашто, гета, калі не сакрэт, знадабіўся табе конь?» — пытаюся. «Які там сакрэт! — адказвае.— Паеду ў лес па абсаду».— «Дык скажы мне, міл чалавек,— зноў пытаюся,— па якую, гета, ты абсаду паедзеш? У вас жа з Матрунай і дом харошы, і абсада ў ім уся ёсць...» — «Пры чым тут Матруна? — злуецца Змітра.— У мяне вунь свая хата няскончаная стаіць».— «Дык хіба ў цябе ўжо гарыць там, што якраз сёння ехаць пада? Не на пажар жа, гета. З'ездзіш і заўтра, прывязеш сваё дрэва на абсаду. Каня добрага возьмеш. А то сёння няма. Адзін толькі, гета, Шпэль, але ж хіба на яго ўзложыш!» — «Ну, глядзі, Дзямідзька, каб заўтра мне конь быў...» Ба-

чыш, у чалавека клопатаў колькі, а ты яму: «Пасядзі, пасядзі...»

Брыгадзір устаў, пашастаў, аж схіліўшыся пабок, у глыбокай кішэні, якая звісла да самай драўлянай нагі, дастаў капшук з самасадам, акуратна складзеную ў кніжачку газету, крэсіва. Умела згарнуў тоўстую цыгарку, рупна заслініўшы яе, зачэкаў крэсівам — яно аж схавалася ў кулакастай руцэ — аб крэмень, прыклаўшы да яго папярэдне трубачку ад школьнай ручкі з доўгім кнотам у ёй. Калі нарэшце іскра папала на кнот і той спачатку лёгенька, а потым густа задыміўся, Дзямідзька, цмокаючы цыгаркаю, прыкурыў — яна аж пыхнула полымем — і, уцягнуўшы кнот, каб той патух, зноў у трубачку, паклаў усё ў кішэню.

— Так што, калі ў цябе, гета, няма чым у печы паліць,— павярнуўся ён да Клёцкі,— дык пачынай, як Туньцік, паноў будавацца — усё будзе: і дровы, і трэскі на падтопу.

І зноў сеў на спілаваную вярбу, выставіўшы ўперад, як дула, драўляную нагу.

Я ж глядзеў на яго рукі — вялізныя, цяжкія, бы молаты (у іх маленькаю здавалася нават тоўстая цыгарка), рукі, перавітыя ўздутымі венамі, былі завельмі вялікія для такой маленькай Дзямідзькавай постаці — яны, здавалася, былі аддадзены яму выпадкова і належалі зусім іншаму чалавеку.

— Чалавек, гета, будавацца рашыў,— зацягнуўшыся цыгаркаю, вярнуўся да той гаворкі брыгадзір.— А ты: «Пасядзі, пасядзі...» Бачылі, як сын, гета, у бацьку ўпіўся — як п'яўка якая...

— Ты навошта, малец, вярбу спілаваў? — пачулася побач.

Ніхто не заўважыў, як падышоў Халадзёнак. А можа, іншыя і заўважылі, і толькі я, загледзеўшыся на Дзямідзькавы рукі, правароніў.

— Як нашто? — перапытаў Гаціла і кінуў сякеру пад ногі.— На дровы, дзядзька.

— А, на дровы. А я думаў — на калыску,— не сунімаўся Халадзёнак.

— На якую, дзядзька, калыску?

— Як — на якую? — у сваю чаргу перапытаў Халадзёнак і растапыранымі пальцамі, нібы грабянцом, провёў зверху ўніз на чорнай сваёй і доўгай барадзе.— Настачка ж сына раджае.

Гаціла зачырванеўся і без патрэбы пачаў ламаць на вярбе галінку, якая не ламалася.

— А не збірай ты, дзядзька, абы-чаго,— зазлаваў ён.— Пры чым тут я да вашай Настачкі?

— Як пры чым? І ты ж там, кажуць, бегаў. Дык, можа, гэта і твой сын раджаецца.

— Не, гэта мінёр раджаецца,— задаволена, шырока, усім тварам (якраз вось так пазяхаюць) усміхнуўся Клёцка.

Халадзёнак уважліва паглядзеў на яго.

— Хто яго ведае, які там мінёр. Яно ў нас і свае мінёры таксама неблагія ёсць.

Потым Халадзёнак неяк доўга глядзеў на Клёцак, з бацькі пераводзіў позірк на сына, затым — з сына на бацьку і нарэшце, усміхнуўшыся аднымі вачыма, сказаў да брыгадзіра:

— Паглядзі-тку ты, Дзямідзька, сюды. Во стаяць двое і як радня ўсё роўна: штаны ў абодвух ссунуліся, сарочкі павыязджалі, тырчаць. А яны абодва стаяць, грыбы адставіўшы...

— А табе ўжо якое да нас дзела, Халадзёнак? — пакрыўдзіўся Клёцка, але, выслабаніўшы руку з сынавай, усё ж падцягнуў свае пакамечаныя, нічым не падперазаныя штаны; яны ў той жа момант зноў з'ехалі і зноў былі ўжо на старым месцы — на худых клубах дзядзькі Маркі. Клёцка-сын, зморшчыўшыся, таксама пачаў убіраць сваю сарочку ў штаны. У гэтага работа ўдалася лепей — сарочка пакуль што не выязджала са штаноў.

— І сапраўды, што, гета, ты непадперазаны ходзіш? Хоць бы якою акраўкаю перацягнуўся, ці што,— падтрымаў старога і Дзямідзька.

— Ты вот, Халадзёнак, ідзеш, дык і ідзі сваёю дарогаю,— усё ніяк не мог супакоіцца ад такой абразы дзядзька Марка і, нібы не чуючы Дзямідзькавых слоў, усё гаварыў да Халадзёнка: — А то яго, бачыце, цікавіць, як хто стаіць.

— Ага, і праўда ж, Марка, пайду я сваёю дарогаю. Я ж на вяселле іду. Нада ж паглядзець, як Цыца жэніцца. Малец ён неблагі. Ды і жонка будзіць добрая. Няхай жывуць сабе на здароўе. Хіба пайшлі са мною, Дзямідзька?

— Я ўжо там, Ігнат, быў. І чарка-каточак, гета, укацілася ў раточак.

— Але і другі раз як брыгадзір прыйдзе, то не выганяць.

— Канечне, не выганяць. Пайшлі, гета, сходзім. Хоць «горка» крыкнем,— і, зірнуўшы на Гацілу, Дзямідзька сказаў: — А ты, гета, малец, мне упь той круглячок пакінь — я паспрабую з яго сабе нагу зрабіць. А то ў мяне вярбовай няма.

Брыгадзір лёгенька ўстаў, падкульгаў да Халадзёнка, і яны пайшлі побач. Іхняя хада была такая розная, што не толькі ісці ім разам, здавалася, было цяжка — яны перашкаджалі адзін аднаму,— але было цяжка таксама і глядзець на іх гэткую несуладнасць.

Дзямідзька цвёрда, рашуча станавіўся на адзіную, хоць і кароценькую нагу, затым неяк увесь — і плечы, і рукі, і ўсё тулава — прыўзнімаўся ўверх, нібыта збіраючыся залопаць крыллем і паляцець, а потым, нахіліўшыся ўлева, падпімаў сваю драўляную нагу і, зрабіўшы ёю мах, прачарціўшы на дарозе выгнутую лінію, ставіў яе ўперад. Яго крокі былі ўпэўненыя, наступальныя.

І побач, амаль не адрываючы ад дарогі сваіх старэчых, абутых у разношаныя шлапні, ног, ля якіх клубіўся шэры кусточак пылу — менавіта так робім мы, калі захочацца напыліць, каб нічога не было відаць,— спяшаўся Халадзёнак. А дзед робіць гэта не для забавы — у яго даўно ўжо хворыя ногі, і таму ён дробненька супе іх, амаль не прыўзнімаючы, па зямлі.

Калі яны крыху адышліся, Гаціла запытаўся ў Клёцкі:

— Чаго гэта, дзядзька, да вас Халадзёнак чапляецца? Вы ж, здаецца, з ім дружылі.

— Дружылі-то дружылі, а цяпер неўлагодні.

— Чаму?

— Ды я праўду яму пра сына ягонага сказаў. А то ўсё, дзівак, чакае... Ды і іншыя яго дзівацтвам падтакваюць. Як смяюцца ўсё роўна...

— А я і гляджу, што ён злы нейкі, усё яму не падабаецца, усё не так. А сам жа таксама нікому нічога добрага не зрабіў.

Я ўспомніў, як дзядзька Мікіта, калі нехта абгаворваў Халадзёнка, казаў:

— А што вам Халадзёнак?! Ён нікому добрага пакуль што не зрабіў, але і дрэннага таксама. Вайну гэту перажыў, і, калі многія паздурнелі, ён нікому вады не замуціў...

— І Дзямідзька яшчэ колецца,— не супімаўся Гаціла.

— О, гэты хлопец толькі. Што ты ад яго хочаш, калі ён брата роднага не пашкадаваў — у турму ўпёр,— падтрымаў яго Клёцка.

Калі прызнацца шчыра, і Клёцку, і Гацілу я крыху недалюбліваў, а дзядзькі Маркі нават пабойваўся. Яму не падабалася, што я добра вучуся, а яго сын — дрэнна, і таму часам, убачыўшы, як мне лёгка даецца і цяжкая задача, ён падміргваў сыну:

— Ану-тку, паціскай яго, падаві троху. А то ён дужа многа ведае. А то ён усё ўмее...

І тады, калі тоўсты і здаровы Клёцка лёгка клаў мяне на падлогу ці на траву, радаваўся — ага, усё ж мой сын хоць тут за цябе мацнейшы. А я, абражаны, пакрыўджаны, адбягаўся тады да свае хаты і, раззлаваны, дражніўся:

— Клёц-кі! Клёц-кі!

Тады Марка зноў піхаў свайго сына ў плечы:

— Дагані і яшчэ павалі яго!

Як мне хацелася ў гэты час крыкнуць Клёцку так, як заўсёды крычаў ён, калі яго перамагалі мацнейшыя: «А я татку скажу!»

Помню, яшчэ да вайны не любіў Клёцку мой бацька. Бывала, як толькі вып'е — бярэ ў рукі таўкач, кладзе на плечы і кажа:

— Пайду пуза рэзанае біць!

Тады якраз Клёцка хварэў на жывот, яму рабілі аперацыю, і таму бацька ў злосці зваў яго «пузам рэзаным».

Пасля таго як немцы забралі тату і маму, Клёцка не пускаў свайго сына нават да нас у хату. Але той усё ж прыбягаў — яму вельмі падабалася ў нас, асабліва зімою. У іхняй хаце былі падвойныя вокны, якія ніколі не замуроўваліся. А на нашых, адзіночных, заўсёды быў тоўсты снег, які раставаў адно пры добрым сонцы,— Валя, калі шкрабла шыбы, каб яны былі чыстыя, як у людзей, нашкрабала з кожнага акна як не па вядру снегу. А толькі сонца збочвала і не падала прама на шыбы, на шкле паспешна пачыналі бегчы ва ўсе бакі калючкі — вострыя, як іголкі лёду. Яны разгаліноўваліся, нібы дрэвы, загіналіся, упіраліся адна ў адну і тады ўжо далей не ішлі — тады ад іх адыходзілі новыя зімныя сучкі, нібыта нейкая невядомая сіла паспешна гнала на іх холад. І да вечара ўсё акно было ўжо ў гэтых галінах, якія аж згіналіся, здаецца, ад снегу. Увечары прыходзіў Клёцка. Яму было цікава, што ў нас руку можна прыкласці адразу да замураванага акна і трымаць яе, цёплую, на снезе, аж пакуль

не захаладае. Адымеш пасля — і на акне, як гусіная лапка, адбітак твае далоні з растапыранымі пальцамі. За вечар мы стаўлялі столькі гэтых гусіных лапак — спачатку на адно акно, потым на другое — што, гледзячы ў цёмную ноч праз гэтыя адталыя плямкі, можна было падумаць, што на шыбах нахадзілі нейкія гусі...

Асабліва я пеўзлюбіў старога Клёцку, калі адразу пасля вайны, упэўніўшыся, што бацька мой, як і маці, не вернецца, ён угледзеў неяк у нашай скрыні амаль што новы шавіётавы касцюм, у якім бацька жаніўся і сам пасля бярог яго, апранаў толькі на вялікія святы, хацеў узяць гэтую памяць сабе. Але цётка не дала.

— Дык каму ты, дурная, берагчы яго будзеш? Брат жа не вернецца, а гэты смаркач яшчэ малы, з пазногаць яшчэ.

— Няхай сабе,— стаяла на сваім цётка,— але ж я табе яго не аддам. Гэта ж памяць сыну. Пра бацьку, пра матку. Бацька ж у ім пад вянцом стаяў. Некалі вырасце — хай тады носіць.

— Дурная, калі ён яшчэ вырасце... Я яму тады новы куплю.

— Навошта табе, Марка, турбавацца пра новы. Няхай ужо лепей гэты паляжыць цэлы.

Пасля, дачуўшыся пра тое, што ў нас застаўся амаль што новы бацькаў касцюм, неяк увечары прыйшоў Гаціла.

— Цётка,— нясмела сказаў ён,— можа б, вы далі мне апрануць сёння дзядзькаў касцюм. А то вунь у тым канцы прашчальны, а мне надзець няма чаго.

Цётка, нічога не адказаўшы яму, дастала са скрыні цёмна-сіні касцюм, садзьмула з яго нябачныя пылінкі, не гледзячы, зразумела, шкадуючы, падала Гацілу, які даводзіўся нам яшчэ нейкаю далёкаю раднёю, і, нібы супакойваючы сама сябе, сказала:

— Адзень сабе раз. За раз не зносіцца.

Але Гаціла, які тады, хоць быў і намнога маладзейшы за сваю абранніцу, усё, так казаў Дзямідзька, падбіваў клінкі да сталай у сваёй ахвоце Насталкі, спяшаючыся адбіць ад яе наезджага мінёра, не прынёс бацькаў касцюм ні назаўтра, ні праз тыдзень, ні праз месяц. Неяк увечары, надаіўшы казу і забраўшы з сабою мяне, цётка сама пайшла да Гацілаў.

— Чаму ж ты касцюм не нясеш назад? — адразу, толькі сказаўшы «добры вечар у хату», спыталася цётка ў Гацілы, які якраз сядзеў на лаўцы за сталом, тварам да акна, і вячэраў.

— Чаго ты, цётка, крычыш? — наклаўшы лыжку, навярнуўся ён на хату.— Чаго? Што твайму касцюму станіць, калі я ў ім пару разоў на ігрышча схаджу? Хоць пыл з яго страсу...

І Гаціла, зняўшы з гладыша накрыўку, пачаў наліваць у кварту сыраквашу. Гладыш быў павернуты горлам у парог, і я бачыў, як адскочыла сыроватка, як адломваюцца кавалкі густой сыраквашы і, пырскаючы, абліваючы ручку, плюхаюцца ў кварту.

— Я не крычу. Касцюму, можа, нічога і не станіць. Але ж гэта памяць. Памяць вось гэтаму хлапцу пра бацьку. А ты ў ім ля Настачак трэшся. Давай сюды касцюм.

— Падумаеш, знайшла мне памяць! На, бяры сваю памяць.— Гаціла ўстаў, расчыніў старую шафу на адны дзверцы і са злосцю выкінуў з яе бацькаў касцюм: — На, бяры.

Цётка падабрала з падлогі касцюм, і хоць масніцы былі нядаўна памытыя,— я адчуваў падэшваю, што яны яшчэ не высахлі: былі волкія і шурпатыя, уздыбленыя гальнём,— страсянула яго, абадзьмула з усіх бакоў і, узяўшы мяне за руку, моўчкі выйшла з Гацілавай хаты.

Пасля гэтага, вясною, калі трэба было аглядаць прысядзібныя ўчасткі, Гаціла, колькі ні ўпрошвалі яго цётка і мая сястра Валя, пізавошта не згадзіўся ўзараць нам соткі пад ячмень і, усё яшчэ помнячы зло за касцюм, не памог нават запрэгчы каня, калі нам трэба было вывозіць гной. Я чуў, як ён гаварыў мужчынам пра маю цётку: «Няхай во сама ўсё робіць, калі яна такая вумная». Спаслаўшыся на тое, што з яго хворым жыватом вельмі цяжка насіць сявалку, не пайшоў сеяць нам і Клёцка. «Гэта ж, злыдзень, за касцюм помсціць»,— па-свойму зразумела яго адмову цётка.

Усё ж выцыганіўшы ў Дзямідзькі каня і без Халадзёнка сабраўшы збрую, цётка, ніддзе не знайшоўшы хоць якога ламанага плуга, за повад прывяла на нашы соткі кульгавага Шпэля і стала з ім насярод палоскі ў разоры: з хамутом на плячы, з лейцамі і повадам у адной руцэ і з ворчыкам — у другой. Яна стаяла, як ад холаду пацепваючы плячыма, ніякавата папраўляла хамут, які ўсё спаўзаў на руку, і толькі крычала на каня: «Стой, калі б на цябе, злыдзень!» Крычала на каня, які, дарэчы, і так стаяў вельмі ціха і не думаў крапацца з месца.

Спакойна, нібы нічога не бачыў, араў сваю палоску Гаціла. Крыху бліжэй да нашых сотак, таксама ў поў-

ным спакоі, сеяў сабе — нават чуваць было, як зерне шоргае аб сявалку,— Клёцка.

Прыйшла на соткі і Валя. Яна, убачыўшы, як гаротна, з хамутом на плячы стаіць у разоры цётка, упала ля мяжы, абняла зацвярдзелую зямлю шырока раскінутымі рукамі і загаласіла:

— А татачка ж мой родненькі! А мамачка ж мая дарагая! А дзе ж вы ляжыцё і не абзываецеся. А ўсе ж людцы даўно сеюць, і толькі наша палосачка стаіць гаротная, як сіраціначка...

Ні Гаціла, ні Клёцка, відаць, не чулі гэтага голасу. І толькі Туньцік, які з Туньціхаю ехаў па загуменнай дарозе — яна ўперак перасякае ўсе доўгія і вузкія сябрыньскія соткі, што цягнуцца як не да лесу,— спыніў каня і з жопкаю падышоў да нас.

— Вера,— адразу павярнуўся ён да Туньціхі,— давай мы возьмем у гэтай цёткі каня, справіком двух і сабе навыом і ёй таксама. Усё ж паркаю яны цягнуць будуць лепей.

І, яшчэ раз зірнуўшы на цётку, якая ўсё трымала ў руках ворчык, ужо ёй сказаў:

— Кідай ты яго, Лёкса. Ён тут не паможыць. Цяпер ужо нам стальвага нада. Бяжы на калгасны двор, прынясі,— папрасіў ён мяне.

Калі я прыбег са стальвагаю, якая звінела ланцужкамі, дзядзька Змітра, ужо выпрагшы свайго каня, адзеў і засупоніў хамуты, распайстрыў пастронкі, зняў з калёс і плуг, які вёз на сваё поле,— словам, усё падрыхтаваў і адно чакаў мяне.

Таму хутка і пасярод нашай палоскі — пасля разоры трэба ж араць у абугон — з'явіўся чорны грудок вільготнай яшчэ зямлі.

— Дзядзька, дайце паспрабаваць і мне,— ішоў я ўслед за Туньцікам і ўсё прасіў навучыць мяне араць.

Нарэшце, склаўшы абугон і роўна прайшоўшы яшчэ разы са тры з двух бакоў, ён даў мне ў рукі шорсткія, відаць, пядаўна набітыя на ручкі плуга, верацёнцы, якія паспеў ужо нагрэць. І я, ступаючы па халоднай ад вільгаці баразне, да таго лёгка пайшоў за плугам, што нават здзівіўся і сам. Плуг ішоў да дзіўнага роўна, не выскокваў з зямлі: можа, таму, што коні звыкла — адзін у баразне, другі побач — не збочваючы, паслухмяна тупалі наперад.

— Глядзі ты — арэ, шальмец! — здзівіўся і Туньцік.

— Арэ,— няўпэўнена сказала цётка і чамусьці заплакала.

Цяжка мне было на заваротах: плуг сам на сабе не лёгкі, ды і заглыбляць нарог у зямлю я яшчэ не ўмеў.

— Арэ ж хлопец,— яшчэ раз, нібы сумняваючыся, паўтарыў сам сабе Туньцік.— Зірні, арэ... Можа, мне тут і рабіць няма чаго? Можа, я паїду ўжо...

— Што вы, дзядзька,— занепакоіўся я.— Не ідзіце нікуды, дзядзька.

Я напраўду баяўся заставацца адзін з плугам і двума коньмі.

— Ну, тады я пакуль пасяджу на ўзмежку, пакуру.

Так мы наперамежку і дааралі нашы соткі, а потым я, адчуўшы смак у ворыве, паехаў з Туньцікам і на яго палосу, якую яму пазней дарэзалі землямеры ў нашым канцы, бо там, побач з зямлянкаю, свабоднай і добрай зямлі не знайшлося.

Пасля гэтага пры сустрэчы з дзядзькам Маркам мне часта ўспамінаўся той вясновы дзень, цётка ў разоры са Шнэлем, хамут у яе на плячы, гулкае чырканне ячменю аб Клёцкаву сявалку...

Клёцку ў Сябрыні не любіў не толькі мой бацька: ён быў вельмі зайздросны, абыякавы да чужога гора і да хваравітасці прагны.

Рагатун, выпіўшы калі і пачуўшы што-небудзь пра Клёцку, узнімаў сваю адзіную руку, пальцам ківаў пад носам у субяседніка:

— Які яму, Марку, чорт! О, гэтага Клёцку і ў мяшку не зловіш. Гэты, брат, дужа прыткі. Ён усё хоча злаўчыцца і адною рукою адразу два гарбузы ўзяць.

Калі Клёцка дачуўся, што за Двароўцамі немцы, адступаючы, выпусцілі цэлую цыстэрну спірту, ён даўжэй за ўсіх ездзіў туды, за блізкі свет, на калёсах, як не месяц вазіў тую зямлю да сябе ў двор, размешваў яе ў бочках з вадою і, заліўшы ў чыгуны, праз апарат, на якім заўсёды гнаў самагонку, атрымліваў дужа моцную гарэлку. Хоць сам ён цяпер піў мала, але гэта праца была прыбытковая — Клёцкаву «спіртаванку» ахвотна куплялі ў Сябрыні, бо яна была мацнейшая за самагонку. Пра той час і зараз напамінае суседзям гара чужой, перагнанай зямлі, якая ўзвышаецца за дварамі.

А як дзядзька Марка яшчэ піў, вайною, калі іншыя кралі ў немцаў пісталеты, патроны і гранаты, ён сцягнуў пеяк у іх біклагу са шнапсам. Яго злавілі і, зняўшы шта-

ны, добра нadaвaлi шомпаламi, пасля чаго ён доўга не мог сесцi — усё стаяў. Калi раны ў Клёцкi зажылi, Халадзёнак смяяўся з яго:

— Але ж i крэпкая ў цябе, Марка, задоўка — да яе шомпал i тoй не прыстае.

Цяпер Клёцка піў сапраўды малавата. Але ад дармовай гарэлкі адмаўляўся рэдка. Калі адыходзіў у армію Антон, большы малец дзядзькі Мікіты, Клёцка так нахапаўся самагонкі, што заспуў недзе ў Саўкавым агародзе. Доўга тады мужчыны жартавалі, расказваючы, як падслепаваты Саўка — яму сапсавала вочы нямецкая граната, што разарвалася ў яго акопчыку,— заараў Марку раніцою: не заўважыў п'янага ў баразне. Клёцка, казалі, перанёс гэты сорам лёгка, толькі ўсё злаваўся па Саўку, што той выпацкаў у зямлю яго новую кашулю.

Яшчэ ў час вайны дзядзька Марка пацягаў сабе ў двор алюмінію са збітых самалётаў і, каб матэрыял не прападаў, адкрыў нібыта кузню — рабіў алюмініевыя пярсцёнкі, грабянцы, кварты і міскі, за якія плацілі яму сябрынькі, цы хто чым мог: хто салам, хто яйкамі, хто збожжам. І да гэтага часу многія дзяўчаты нашы фарсілі Клёцкавымі пярсцёнкамі, якія добра блішчалі, калі іх патрэш, а ў валасах жанчын, скручаных ззаду ў гузы, тырчалі Клёцкавы алюмініевыя грабянцы.

Як казалі, у бацьку ўдаўся і сын — нібы і кропелькі ўсе падабраў. Вучыўся ён дрэнна, і вялікаму Клёцку штогод даводзілася прасіць настаўнікаў, каб усё ж не пакідалі яго сына на другі год, а як-небудзь перавялі ў наступны клас.

І Хведзю, як кажуць, закрыўшы вочы, ставілі тройкі, пераводзілі.

Цяжка давалася Клёцку нават чытанне. Бусліха, якая вучыла нас у першым класе, білася з ім, білася, але толку амаль ніякага ад гэтага не было. Пакажа яму «А» і пытае:

— Якая гэта, Хведзя, літара?

— Паграбня,— адказвае Клёцка.

Усе рагочуць, а Бусліха цярпліва дапытваецца:

— Чаму ты думаеш, што гэта паграбня?

— Паграбня, ды і ўшо,— скажа Клёцка і адвернецца да акна.— А не верыча, дык шамі жырніча — ж бакоў дзьве кроквы, на чым штраха трымаечча, а папарод — папярочынка.

Бусліха націсне-націсне плячыма і паказвае яму, скажам, «ч».

— А гэта, Хведзя, якая?
— Гэта шэм.
— Чаму ты думаеш, што гэта сем?
— Шэм, і ўшо.
— У сямёркі ж рыска пасярод ёсць. А тут няма.
— Ну і што, калі няма? Я не магу паштавіць,— непарушна стаяў на сваім Клёцка.

Бацька яго за такую вучобу дужа біў — браў за валасы і тоўк носам у кніжку, у тое месца, якога ён не ведаў.

Таму лісты Клёцкавых кніжак былі пакамечаныя, па іх шарэлі прасохлыя плямы — мусіць, ад слёз.

І рос малы Клёцка троху жарсткаваты. То ўставіць саломінку ў хвост авадню, то ні з таго ні з сяго папусціць каменем у кошку, а калі мы хадзілі ў чые-небудзь агуркі, дык ён лажыўся тады на граду і качаўся па агуročніку, пакуль пад бок не трапляўся агурок. Агурок — у кішэню і качаецца зноў.

Таму назаўтра той, у чые агуркі мы хадзілі, кляў на чым свет стаіць усіх і ўсё — і не столькі за выбраныя агуркі, колькі за пацёрты, паздратаваны агуročнік. За гэтую звычку білі малога Клёцку старэйшыя хлопцы, не любілі яго і мы, аднагодкі.

Яшчэ Клёцка быў дужа цікаўны. Аднойчы ён так шчыра лізнуў настылую на марозе бацькаву сякеру, што да ляза прымёрз увесь язык — ададраць яго ён і сам не змог і дарослыя таксама збаяліся: Клёцку з сякераю ўссадзілі на гарачую печ, наклалі лязо на чарэнь, і Хведзя сядзеў там доўга, пакуль не адагрэлася сякера.

І яшчэ Клёцка быў вельмі скнары. І тое, што бацька, навучаны ўжо гадамі і жыццём, стараўся трохі прыхаваць і не вельмі паказваў, у сына заўсёды было на самым відавоку...

Тады я прыгожа намаляваў вясну, стварыў столькі дрэў і травы і ўжо ўяўляў, як зелена зашуміць на маім малюнку ўсё гэта зялёным колерам, але Клёцка, у якога быў адзіны ва ўсім класе агрызак зялёнага алоўка, не даў мне яго:

— Ты ж спішаш увеш, а мне тады нічога не жаштанечча.

І мая зялёная вясна раптам назаўсёды стала шэраю, непрытульнаю, і, здаецца, паміж голых, праведзеных простым алоўкам сукоў, на якія так і не села зялёнае лісцё, зашумеў нудны і дажджлівы восеньскі вецер.

*З таго часу я дужа люблю ўсё зялёнае. Зялёны луг — да ачмурэння. Зялёныя дрэвы — да замілавання. Зялёнае неба — да слёз.*

*Цяпер мне нават снег хочацца маляваць зялёным алоўкам. І сонца — таксама толькі зялёным.*

*А ў вачах усё яшчэ стаяць, нібы на папялішчы, тыя чорныя, як абвугленыя, дрэвы з таго ці не першага яшчэ класа, што з-за скнарасці Клёцкі так і не сталі зялёнымі...*

Мяне абагналі Лена і Дзямідзькава Клава — яны беглі ў той канец.

— Што, і вы, цялушкі, на вяселле? — пачуў я, як наўздагон ім крыкнуў Гаціла, а Клёцка засмяяўся.

Ад зрэзанай вярбы, ля калодзежа, дзе на зямлі стаяла цяжкое акаванае вядро, якое нават прыўзняло нагружаны канец жураўля, перайшоў вуліцу і не вельмі ахвотна пайшоў да Хадосчынай хаты — усё ж непрыемна было ўспамінаць учарашняе здарэнне ў яе агародзе і тым больш думаць: «А што, калі яна пазнала?»

— Ленчына шпадніча! Ленчына шпадніча! — забегшы за мне наперад, выкручваючыся, ідучы задам, нечакана заспяваў Клёцка, але мяне гэтая яго песня зараз чамусьці зусім не зачапіла — відаць, так часта бывае, калі думаеш пра нешта іншае, больш вартае.

Хмары, якія надвечар імкліва былі наплылі з-за небасхілу, паспакайнелі і там, куды зайшло сонца, цёмнаю грамадаю станавіліся напач. Вецер прапамацеў недзе ўверсе, над вуліцаю, і раптоўна сціх — здалося нават, што ён, нібы вялізная птушка з адных толькі крылаў, упаў у разложысты, на ўвесь Хадосчын агародчык, куст язміну: аж пасярод куста, там, дзе ён упаў, загайдалася голле.

Ад Хадосчынай хаты нехта ішоў мне насустрач. Я прыгледзеўся і ўзрадаваўся — дык гэта ж сам дзядзька Мацвей! Прыгледзеўся яшчэ больш уважліва — не, не памыліўся: сапраўды ідзе ён, Мацвей, старэйшы Хадосчын брат, які прыслаў сёння пісьмо. Вось я і аддам пісьмо яму самому, не заходзячы ў хату.

— Здароў, анарал! — павітаўся ён і добра ўсміхнуўся.

Я адказаў на прывітанне і падаў яму канверт.

— Гэта ж, дзядзька, відаць, ваша пісьмо? Відаць, вы цётцы Хадоссі яго прыслалі?

— Я, я прыслаў... Бачыш, як твая пошта дрэнна ходзіць. Сам раней прыехаў, а пісьмо пасля ўжо даганяе. Во як... Пісаў Хадоссі, што скора прыеду. І, відаць, пап

наштальён у кухвайцы яго запасіў — бач, якое бруднае.

— А вы, мусіць, да Настачкі — «Гудок» чытаць? Сёння прыйшоў.

— Што ты, малец! Я, канечне б, схадзіў, але сёння Шаўковіха не пусціць туды. Сёння яна там за апарала. Яна апаралам ходзіць.

Аднекуль з-за вугла выбеглі хлопцы, якіх вёў Клёцка. Клёцка ўжо, відаць, паспеў збегаць дадому, схапіў у адну руку вялікую антонаўку, у другую — кавалак хлеба і зараз, па чарзе кусаючы то адно, то другое, са смакам еў.

Хлопцы меліся прабегчы ля нас не спыняючыся, але дзядзька Мацвей павітаўся з імі:

— Здаровы, апаралы!

Хто адказаў на прывітанне, а хто і прамоўчаў. Але ўсе спыніліся, падышлі бліжэй.

— Ну, дык як вы тут без мяне жывяце, апаралы? — спытаўся ён (дарэчы, дзядзька Мацвей часта і цікава расказваў нам пра сваю працу на чыгунцы, і таму мы сябравалі з ім).

Спытаў і, не чакаючы асабліва адказу, нібы між іншым дадаў:

— Пайшлі, можа, апаралы, мне згароду паможаце падняць. А то ўчора нейкія чэрці павалілі...

І мы, адчуваючы віну, але не паказваючы гэта, паслухмяна пайшлі за дзядзькам у агарод. Па дарозе я асцярожна спытаўся, ці дома цётка Хадосся — усё ж не вельмі хацелася з ёю сустракацца.

— Няма яе. Пабегла, назірка, на вяселле.

Зламаная згарода павалілася на наш бок — пад лясоўку (дык я, значыць, упаў у свой агарод!) — і ўся ляжала на нашай атаве. Ніжні бок справа быў крыху прыўзняты: ён ляжаў на вялізным гарбузе, які выспеў ужо ў нашым агародзе, вылезшы на гарбузоўніку праз згароду яшчэ пуплом ці, можа, нават кветам. Калі я касіў атаву, мне даводзілася яго абкошваць, бо назад, праз вузенькую шчыліну між колікаў, ён ужо не лез.

Згарода зламалася, вывернуўшы з аднаго боку тонкі, неглыбока ўкапаны слупок, які, добра падгнілы, мог бы хутка зламацца і сам, а з другога — з жыўцом адарваўшы перасохлыя жэрдкі, прыбітыя даўно да самага вугла хаты,— там засталіся толькі цвікі ды трэскі ад планак.

Дзядзька Мацвей узяў у рукі цяжкую, пачарнелую ад часу доўбню, якая, прыслоненая, стаяла ў іх пад сцяною (ёй білі свіней, ёй гахкалі па калуне ці па кліне, калі ка-

лолі тоўстыя круглякі, ёй забівалі і колле) — яна была як пажавапая, павыгрызеная ў тых месцах, якім больш за ўсё даставалася. У другую руку дзядзька Мацвей узяў загадзя зачасаны колік і, выбіраючы, каб не трапіць глыбокай шчарбінаю, што ішла праз усю доўбню і хавалася недзе ля цаўя, пад самымі далонямі дзядзькі Мацвея, разважна, не спяшаючыся, аж высунуўшы язык, пачаў заганяць новае апірышча ля таго месца, дзе ўчора вывернуўся слупок.

Мы хто як дапамагалі дзядзьку. Адны адрывалі жардзіны ад старога калка, другія выдзіралі з вугла цвікі і тут жа, на сцяне, раўнавалі іх, а я падняў згароду і з улежанай, як гняздзечка, ямінм ў атаве, якая ўбялела без сонца, асцярожна перанёс цяжкі гарбуз, стараючыся не адарваць яго ад светла-зялёнай пупавіны, перанёс на граду і паклаў ля грудка павыбіранай цыбулі.

І тут пачуў, як з двара Васяпка, які быў якраз павернуты пазачыпянымі дзвярыма да Хадосчынага агарода, данеслася галашэнне.

Паволі, не ўдарыўшы нават па калку, апусціў доўбню на зямлю дзядзька Мацвей, абапёрся на яе і прыслухаўся.

— Па-мойму, гэта Хімця плачыць,— счакаўшы, уголас надумаў ён.

Сапраўды, плакала бабка Хімця. Праз нейкі час там рыпнулі сенцы, і ў звечарэлай і ядранай цішыні пачуўся Марфін голас:

— Не смяшы ты, старая, людзей. Ідзі лепей, кажу табе, у хату.

— Сама ідзі ў тую хату,— галасіла бабка Хімця.

Мы стаялі ўсе і слухалі.

— Ужо зусім выжыла, дурніца гэтая,— села на ганак і румзае на чым свет стаіць. Людзі ж смяяцца будуць.

— Няхай смяюцца. А чаго ты мяне загрызаеш?

— Дык цябе ж не толькі грызці, але і набіць нават мала.

— А што я зрабіла табе? Мне ж Яська толькі пісьмо пачытаў...

— Кажуць жа, старое, як малое,— відаць, Марфа адзлавалася і зараз гаварыла нібыта і спакойна.— Нашто ты давала чытаць? Ты ж знала, ад каго пісьмо. А тоў дурань яшчэ новы адрас напісаў.

— Ну дык і што, калі Яська пачытаў...

— Што! Што! — перадражніла бабульку нявестка і, мусіць, там, на двары, замахнулася на яе.— А ён можа па ўсёй Сябрыні раззваніць, дзе твой Восіп зараз... Ідзі, дур-

ніца, у хату галасіць. А то во як мездрапу між крылля, дык тут і супенішся.

Старая загаласіла яшчэ гучней. Я стаяў, і мне было няёмка, што падслухаў гэтую размову. І праўда, па ліха я чытаў тое пісьмо?

— Ого, там Марфа Яся кляне,— схамянуўся дзядзька Мацвей і дадаў: — Нада было б гэтага паліцая неяк выкалупаць.

Ен высока ўзняў доўбню і некалькімі моцнымі ўдарамі ўвагнаў кол у зямлю — якраз да пазначанага.

Згароду мы падпялі хутка. Яшчэ хутчэй прымалацілі яе да новага слупка, які тонка спружыніў.

— А мамулечкі ж мае! Яй жа богу, гэта Мацвей прыехаў,— пачулася з вуліцы.

Зірнулі ў той бок і ўбачылі Ядоху, якая стаяла на сцежцы ля дзвюх адкінутых жардзін, што адгароджвалі нашу пожню ад вуліцы. Яна, відаць, парабіўшы і сваю работу, папарадчыўшы і Саўкаву жывёлу, бегла на вяселле.

— Прыехаў, прыехаў! — адказаў Мацвей, паставіў доўбню на старое месца і падышоў да Ядохі.

Клёцка расказваў, што некалі, калі яшчэ былі маладыя, дзядзька Мацвей з Ядохаю дужа моцна любіліся. Але пажаніцца не змаглі — яны абое былі такія бедныя, што баяліся збіраць разам і свой голад, і сваё рыззё. Ядоха потым выйшла замуж за багатага Аўхімку, але пажыла з ім нядоўга — той, вельмі скнары на працу, неяк у першую ж пасля вяселля вясну, выкідаючы віламі гной з хлявоў, падарваўся і памёр...

— Дык, можа, ты, Мацвейка, па мяне прыехаў ужо? — папраівіўшы ў валасах алюмініевы грабянец, неяк сумна пажартавала Ядоха.

— Куды мне цябе, дзеўка, везці? Бачыш, з дзвюма жонкамі я ўжо не ўпраўлюся.

— О, не кажы, ты і цяпер яшчэ атлёт!

— Які ўжо з мяне атлёт...

— Дык пайшлі во хоць са мною на вяселле сходзім.

— Не, я з хлопцамі лепей пасяджу. Я з імі даўно не гаварыў.

Па тым баку вуліцы ішлі дадому Пастаччыны дзеці — немцаў Алеська і мінёраў Генька. Немчык, у нейкім вялізным мужчынскім пінжаку з падкасанымі рукавамі, які быў яму завельмі доўгі — нібы паліто,— вёў за ручку Геньку — у адной палатнянай кашулькі, але ў вялікай шапцы, якая ўсё наязджала яму на вочы. Клёцка папус-

ціў у іх кароткім абломкам жэрдкі, і там, дзе абломак, даляцеўшы ледзь не да хлопцаў, упаў, узняўся слупок пылу.

— Нашто ты дзяцей пужаеш? — ухапіўшы нейкую трэску, пагналася за Клёцкам Ядоха.— Я табе зараз пакажу, статуі ты!

Клёцка адбегся. Спыніліся і хлопчыкі.

— Дзеці, хадзіце сюды! — паклікала іх Ядоха.

Алеська і Генька надышлі — акурат як слухмяныя казляняткі.

— Куды ж вы, дзеткі, ідзеце? — спыталася Ядоха і направіла Генькаву шапку, якая ўжо зусім наехала на вочы.

— Дадому,— адказаў большы Алеська.

— А ў вас жа дома пакуль нікога няма,— змяніла Ядоха.— Ваша мама пайшла ў краму. Вам брацікa купляць. І не вярнулася яшчэ.

Жанчына зняла са сваіх плячэй цёплую хусту і, укрыўшы ёю Геньку паверх палатнянай кашулькі, завязала ражком спераду — каб малому было цяплей. Потым разняла іхнія рукі, стала між хлопчыкамі — у правай яе далоні схаваўся малепечкі і шэранькі, як птушанятка, кулачок Алеські, у левай — яшчэ меншанькі Генькаў.

— Пойдзем на вяселле, дзеткі,— сказала яна ім.— Там хоць якую аладку з'ясцё... А то ж у вас, відаць, за цэлы дзень ні каліва яды ў роце не прыстояла.

І павяла малых у той бок, дзе іграла і спявала вяселле. Яна ўсё круціла галавою, паварочваючы яе то да Алеські, то да Генькі — ці то расказвала ім нешта, ці то сама слухала малых.

— Ясь, ідзі вячэраць хутчэй — бульба зварылася! — адчыніўшы нашы сенцы, з парога паклікала мяне Валя.

Гэта была ўжо наша хата. Выгнутаю сцяною, якая выходзіла на вуліцу, яна вельмі ж ужо выпіралася ў агародчык — так і здавалася, што нехта моцны, упёршыся рукамі ў прасценак між акон, піхае яго з хаты.

На двары, яшчэ не загнаная ў хлеў, хадзіла каза. Яна драла кару са свежай алешыны, якую ўторкнула цётка ў згароду замест зламанай. На пожні, над вялікаю лясоўкаю, на скурчаным, шорсткім і сухім лісці наш певень вадзіў курэй — яны дзяўблі пасохлую атаву. Гэтую лясоўку і колькі ўсохлых слівін, што вунь стаяць ля згароды, я ўжо даўно збіраюся пассякаць — лясоўка, без толку разросшыся як не на ўвесь агарод, не дае расці траве, а з сухіх слівін таксама паедку ніякага няма. Але я ніяк не збяруся

да дзядзькі Мікіты, каб навастрыць дужа зазубленую сякеру, на лязе якой цётка секла нават дрот на цвікі.

«Разнясу пасля тыя пісьмы і газеты, што засталіся»,— падумаў я і пабег дадому. Асталося ўжо нямнога — пісьмо і газеты Паўліне Рамапаўне, дырэктару школы, абласная газета Таццяпцы і піянерскі часопіс Туньціку, які я забыўся аддаць; дарэчы, я заўсёды не разумеў, навошта ён, дарослы чалавек, выпісвае дзіцячы часопіс «Бярозка»...

У нас на стале ўжо стаяла толькі што звараная ў грубцы бульба — ад яе прама ўверх, пад столь, сцялілася пара. У алюмініевай місе ляжалі кіслыя агуркі, стаяла ў розных кубках кіслае казінае малако. Валя ўжо сядзела на ўслопе, чакала мяне.

— Можа, мяціва будзеш есці? — спыталася цётка.— Яно ў печы стаіць і яшчэ цёплае.

Гэтае варыва з буракоўага націння, без заправы, я еў у абед і таму хуценька адмовіўся.

На стале ляжаў пахкі бохан з новага ячменю — перад гэтым у сенцах мы абабілі пранікамі колькі снапоў. Быў час хлеба. Мінуліся тыя галодныя дні вясны і лета, калі пра хлеб толькі ўспаміналі.

Сёння была восень.

Сёння на кожным стале ў Сябрыні ляжаў хлеб. Цёплы і пахкі.

— Чаго гэта цябе, Ясь, па ўсю Сябрынь Марфа кляла? — спыталася цётка, сядаючы да стала на табурэтку, што стаяла ля судніка,— каб было бліжэй, калі што спатрэбіцца, падаць з паліцы.

— А я пісьмо ад Васяпка пачытаў.

— На агонь табе трэба было чытаць тое пісьмо?

— Дык мяне ж бабка Хімця папрасіла.

— Адна дурная просіць, а другая дурная клянець,— сказала цётка і дадала: — Садзіся ўжо еш, чытака.

Я сеў на ўслоп. Мы з Валяю елі бульбу з агуркамі і кіслым малаком і гулялі ў нашу звыклую гульню за ядою.

Усе сцены ля стала, суднік, што вісіць на сцяне, і нават столь абклеены газетамі. Мінёры, якія стаялі і ў нас, смяяліся:

— Вось як добра, хазяйка. У вас, пакуль паясі, усе навіны і даведаешся. Не абед, а палітінфармацыя.

Таму, калі мы з Валяю збіраліся за сталом разам, пачыналася:

— А знайдзі — «Лўтамашыны за прададзены хлеб».

Гэта загаловак у газеце. І той, у каго пытаюцца, доўга пераводзіць позірк са сцяны на суднік, з судніка — на столь, пакуль нарэшце знойдзе. А калі не знойдзе, просіць хоць паказаць, у якім баку шукаць.

— А знайдзі мне — «Арганізаваць наўсяменны збор попелу».

Гэты загаловак мне прымільгаўся, калі я шукаў іншыя. Памятаю, ён быў надрукаваны доўгімі тонкімі літарамі і быў недзе на столі — якраз над сталом.

І хоць Валя ўважліва і шчыра глядзела на суднік, стараючыся мяне спадмануць — маўляў, тут гэты загаловак,— але я адразу падняў вочы ўверх і паказаў пальцам:

— Во ён.— І сам загадаў: — А знайдзі — «Калгасы Аршаншчыны рыхтуюцца да сяўбы».

Валя шукала вельмі доўга. Не знайшла.

— Здаешся? — спытаўся я.

— Здаюся.

Я паказаў ёй. Гэтыя словы былі на фіранцы, якую сама Валя маляўніча выразала нажнічкамі з газеты і прыклеіла зверху па акно.

— Ідзі,— зазлавала сястра,— мы на фіранцы не адгадваем.

Цётка запаліла канцілку. Зняла яе з прыкомінка і паставіла на стол. І акно, за якім прыцемак быў яшчэ не зусім густы, адразу пацямнела, і на цёмных шыбінах, нібыта на чорнай падкладцы, прыгожа забялеліся адмыслова выразаныя Валяю карункі фіранак.

Я еў і дыхаў вельмі асцярожна — каб не патушыць канцілку, што хліпала побач з місаю.

— Во павячэраеш, ды трэба жорны крыху паправіць — зусім ужо не мелюць,— хаваючы ў суднік гладыш з кіслым малаком, сказала да мяне цётка.— Я прынесла ад Мікіты стары дзіравы чыгунок, які ім ужо не трэба, ён ля ганка ляжыць.

Жорны ў нашай хаце заўсёды стаяць ля качарэжніка. Іх рэдка калі мы выносім у сенцы. Мы ўжо да іх прывыклі, і яны зрабіліся такою абавязковаю ў хаце рэччу, як, скажам, стол, лаўка, драўляны ложак, сама печ.

Гэтыя жорны на кароткіх ножках зрабіў я сам. Праўда, два цяжкія дубовыя кругляк і даў мне дзядзька Мацвей, калі яшчэ жыў у Сябрыні. Ён жа памог у верхняку прадзяўбаць круглую дзірку — каб было куды засыпаць зерне. А ўсё астатняе рабіў я сам: да бегуна прыбіў доўгую драўляную ручку ад гранаты, катыш-ляжак абабіў разагнутаю

і расклязпанаю палоскаю бляхі, выразанай са старога вядра. Доўга я ніяк не мог даць рады ножкам. І вымераю, і адрэжу роўненька, а як толькі пастаўлю — не стаяць на масніцах, ды і ўсё: хістаюцца. Я тады зноў кладу жорны набок, зноў мераю, зноў рэжу. Ужо і ножкі зусім кароценькія зрабіліся, а я ўсё рэжу. Не ведаю, колькі б я яшчэ рэзаў, каб не цётка.

— Дакуль ты, няўмека, рэзаць будзеш,— усміхнулася яна,— гэта ж не ногі вінаваты, а падлога. Бачыш, як масніцы няроўна ляжаць на лагах, а ты рэжаш...

Так і засталіся пасля мае жорны на кароценькіх ножках. А каб яны стаялі ўстойліва, кожны раз даводзілася шукаць ім роўнага месца, соваючы па масніцах ці падкладаючы якую трэску.

Павячэраўшы, выйшаў на двор. Чыгунок, які сапраўды ляжаў ля ганка, я пабіў каменем на маленькія друзачкі — якраз на такія, якія можна будзе загнаць у дрэва.

У хаце я зняў з жорнаў вярхняк-бягун. Ну, вядома ж — як такія жорны будуць малоць, калі многа ў якіх месцах асколкі чыгуну, забітыя ў кругляк раней, павывернуліся, павыпадалі, і там, дзе яны сядзелі, шчарбата цямнелі адно толькі шчыліны-ўмяціны.

Цётка мыла посуд. Валя памагала мне — яна падавала асколкі чыгунка, а я кляўцом загапяў іх у дрэва. Чыгун слаба паддаваўся ўдарам — у дуб дрэнна лезе нават і жалеза.

Калі мы засталіся без бацькоў, калі маму і тату забралі ў гестапа і там як партызан закатавалі, калі з дня ў дзень сябрыньцы чакалі, што як партызанскую сям'ю забяруць хутка і дзяцей, цётка перавяла нас да сябе ў хату. Яна ўсё плакала па сваім браце Сымоне, маім бацьку, па залоўцы Гапусі, маёй маме...

А тады, калі праз нейкія пару тыдняў пасля таго як забралі бацьку, гестапаўцы з чужымі паліцаямі (свае не пайшлі браць) прыехалі на маці, цётка якраз была ў нас.

— Сабірайся! — адразу ж загадалі яны ёй.

— А што мне збірацца? Бярыце і так. Я ўжо сабралася,— спакойна адказала цётка і, пацалаваўшы нас з Валяю, пайшла з хаты.

На двары, калі жанчыны запыталіся: «Куды гэта цябе, Лёкса, забіраюць?», паліцаі раптам спыніліся:

— Пастой, пастой... Дык а хто ты Сымону будзеш?

— Сястра.

— Не, тады ты нам не нада. Нам жонка нада.

І пайшлі шукаць маму. Калі яны забралі маму і калі яна не вярнулася ні праз тыдзень, ні праз месяц, я плакаў і казаў цётцы:

— А чаму ты не ішла з імі замест мамы?

— Дык яны ж мяне не ўзялі, дзіця маё ты мілае,— адказвала цётка, зусім не крыўдуючы на такое жахлівае патрабаванне: яна сама, не маючы нікога роднага, апроч майго бацькі, згодна была б пайсці ў гестапа, абы маці засталася з намі.

Цётка расказвала неяк Паўліне Раманаўне:

— Ясь дужа хацеў, каб я замест маткі з паліцаямі пайшла. Але ж што я зраблю, калі яны кажуць: «Нам не сястра, нам Сымонава жонка пада». А дзецям жа, вядома, лепей было б з маці, чым са мною. Во таму я і плачу. Бывае, як выйду з хаты, як пайду з голасам туды, пад лес. Іду і плачу, іду і слязьмі заліваюся — свету божага не бачу. Іду галосячы, аж пакуль у елку якую лбом не стукнуся. Тады толькі апамятаюся. Неяк школьнікі, ленькаўскія дзеці, відаць, у школу беглі, пытаюцца: «Чаго гэта цётка плача?» А адзін хлопчык, чую, ім за мяне і адказвае: «А я ведаю чаму — у гэтай цёткі немцы ўсю сям'ю расстралялі...»

Тая сустрэча са школьнікамі была, пэўна, даўней. Бо цяпер маю цётку ведаюць усе дзеці нашай школы. Паўліна Раманаўна, сама нядаўняя партызанка, якая вельмі ж старалася дапамагчы нам, партызанскай сям'і, акрамя таго, што мяне зрабіла паштальёнам, Валю залічыла тэхнічкаю ў школу. І таму, калі сястра была на занятках, на ўрокі і з урокаў званіла цётка. Яна, нібы спалохаўшыся, выбягала з настаўніцкай і, высока над галавою матляючы званком, падбягала як не пад кожны клас — займалася тады ў розных памяшканнях,— доўга і настойліва званіла. Цётка не навучылася вызначаць час па гадзіннiку, які спакойна чакаў у настаўніцкай, а званіла толькі па сонцы. І ніколі не памылялася. Настаўнікі здзіўляліся гэтай дакладнасці. Завуч неяк расказваў:

— Адзін раз я думаю, ага, нарэшце я злавіў тваю цётку — на пяць хвілін, чуеш, раней пазваніла з урока. Прыйшоў у настаўніцкую, праверыў свой гадзіннік: не, цётка не памылілася, а гэта мой гадзіннік, чуеш, адстаў — роўна, чуеш, на пяць мінут...

Я ўжо забіваў у вярхняк апошнія друзачкі старога чыгуна, як дзверы ціха, неяк завельмі спасцярожліва адчыніліся, і ў хату, няёмячыся, зайшла цётка Еўка. Яна

зачыніла дзверы, ціха сказала: «Добрага вам вечару» — і стала ў парозе, не праходзячы ўперад.

— Праходзь, Еўка, чаго ты стаіш? — запрасіла яе цётка.

— Не, Лёкса, я і тут во пастаю. Гэта ж я ненадоўга. Зараз во і пайду. То ж мне во Халадзёнак сілком укінуў у кішэнь два яблыкі, дык я і думаю: дай-тку я іх Ясю занясу. Свайго б чаго прынесла, але ў мяне ў гародзе ні слівіны тоі, ні яблычка.

Яна падышла да мяне, паклала на вярхняк спелыя антонаўкі і, гледзячы сабе пад ногі, яшчэ цішэй, чым «добры вечар», сказала:

— Ты ўжо даруй мне, сынок. Пакрыўдзіла я цябе, дурніца. Насварылася немаведама за што. Хоць дзіцё гэтае аніўчым не вінаватае.

І цётка Еўка, ласкава пагладзіўшы мяне па галаве, павярнулася да маёй цёткі:

— Гэта ж, Лёкса... гэта ж... гэта ж...— пачала яна, але не змагла дагаварыць, заплакала і ўжо праз слёзы казала далей: — Гэта ж, Лёкса, сёння вунь Цыца жэніцца... А ён жа майму Юрачку гадок быў. І яшчэ ж я ведала, што сынок мой Люську раёўшчынскую, маладую сённяшнюю, любіў. Бывала, бачу, ён у люстэрачка нейкае маленькае-маленькае, цьмянае-цьмянае глядзіцца. Я і пытаю: «Куды ты, сынок, збіраешся?» — «Пайду, кажыць, у Раёўшчыну да Хведзькі схаджу...» А я ўжо, Лёкса, ведаю, да якога ён Хведзькі пойдзіць.

Еўка села побач з цёткаю на лаву, і яны пачалі ўспамінаць даваеннае жыццё.

Я ўзняў вярхняк на жорны і доўга за ручку соваў па ніжняку, пакуль штыр нарэшце не патрапіў у перапліцу. Паспрабаваў круціць жорны — як задырчалі яны на ўсю хату! Аж балюча і шарготка стала зубам — здалося, што ўвесь рот забіты жарствою. Гэта скрыгаталі новыя, яшчэ не прыцёртыя зубчыкі чыгуну. Пакуль што на жорнах малоць нельга: іх абавязкова трэба абмалоць, абкруціць, бо з латка напачатку будзе сыпацца больш чыгуну, чым мукі.

Валя ўзялася за ручку і скрыгатліва пакруціла вярхняк.

— Во, во,— узрадаваўся я,— абмялі жорны, а я апошнюю пошту занясу.

І не чакаючы, калі яна будзе вярэчыць, схапіў газеты і пабег з хаты. Спяшаючыся да хаты Петрака і Петрачы-

хі, дзе жыве дырэктарка, я ўсё думаў пра такую нечаканую разгадку Еўчынай злосці, з якою яна прагнала мяне з хаты. Значыць, я тут быў ні пры чым: у яе на гэты час была адкрытая, як рана, душа і ёй было ўсё роўна, хто трапіцца на вочы. Душа цёткі Еўкі балела — сёння ж жаніўся гадок яе Юркі і браў сабе ў жонкі Юркаву каханую...

Яшчэ з вуліцы я заўважыў, што ў задняй Петраковай хаце, дзе жыла Паўліна Раманаўна, гарэла святло — значыць, яна была дома. «Вось і добра,— падумаў я.— Аддам ёй пісьмо ў рукі».

У сенцах пастукаўся ў дзверы, узяўся за клямку. У пярэдняй хаце было цёмна, а ў задняй гарэла лямпа. Я няcмела павітаўся:

— Добры вечар.

— Вечар добры,— адказаў мужчынскі голас.

Гэта быў той самы вясёлы і жартаўлівы лётчык, афіцэр ваеннага аэрадрома. Аэрадром выбудаваўся недалёка ад вёскі — у ціхі вечар, а то і раніцою, калі вецер дзьмуў у наш бок, былі чуваць бадзёрыя песні салдат і звонкая палкавая музыка.

Там, у выгараджаным каля аэрадрома кавалачку лесу, пад сасонкамі, амаль штодзень гудзеў хоць і невялічкі, але ўсё ж рынак, дзе жанчыны, якія не паспелі яшчэ займець у гарнізоне сваіх «знакомак», каб хадзіць да іх на кватэру, паставіўшы між карэння свае бітончыкі з малаком, місы з маслам, кошыкі з яйкамі, наперабой запрашалі да сябе лётчых. І мы, хлапчукі, калі наш лес багацеў на ягады і грыбы, насілі сюды, пад сосны, прадаваць нагэтыя ласункі, каб мець грошы на кніжкі і сшыткі. Насіў і я, але колькі разоў, убачыўшы, што прыгожа і чыста апранутыя лётчыхі не глядзяць на мяне і абыякава праходзяць ля маіх, высыпаных на газету пару якіх шклянак малін ці аж сініх чарніц з папрыліпанымі да іх ігліцамі, зялёнымі лісткамі — сярод іх дзе-нідзе зрэдзь калі чырвона бліене спелая сунічына,— ля якіх няcмела і сарамліва, а галоўнае — моўчкі, пераміналючыся на цынкаватых і запыленых нагах, стаяў сам гаспадар, я крыўдзіўся на рынак і аддаваў тады свой «тавар» амаль задарма. І асабліва пасля таго, як я хацеў прадаць літры са два казінага малака, якое цётка сабрала з ранішняга і вячэрняга ўдояў (уночы, каб не скіснуць, яно стаяла ў халоднай вадзе), пасля таго, як нейкая злая лётчыха, паспрабаваўшы маё малако, падняла на ўвесь базар такі

крык, што я, адцураўшыся са страху і ад малака, і ад бітончыка, не аглядаючыся бег да лесу,— пасля гэтага мне зусім не хацелася хадзіць над выгараджаныя сасонкі, і толькі калі ўжо была вельмі пільная патрэба, я, каб не пакрыўдзіць цётку, усё ж згаджаўся збегаць на той рынак...

Я абвёў вачыма пакой. Лётчык перахапіў мой позірк і, знарок сумна паківаўшы галавою, сказаў:

— Няма, брат, няма тваёй Паўліны Раманаўны. Я яе і сам, брат, чакаю. Яна ў школе педсавет праводзіць. А пісьмы і газеты, словам, усю карэспандэнцыю яна загадала забраць мне.

Я аддаў газеты, нерашуча ўзяўся за канверт, а потым апусціў руку — аддам заўтра сам Паўліне Раманаўне.

— Давай, брат, давай,— працягнуў руку лётчык.— Загад ёсць загад. Мы з табою павінны яго толькі выконваць.

I я аддаў яму пісьмо. Я ўжо казаў раней, што трохі недалюбліваў гэтага лётчыка. I сам не ведаю чаму. Недалюбліваў за тое, што ён хораша танцуе, што вельмі многа ведае і цікава расказвае, што цудоўна спявае, што на ім дужа ўжо добра ляжыць афіцэрская форма... Адным словам, я не любіў яго якраз за тое, што падабалася, відаць, Паўліне Раманаўне.

Лётчык сядзеў ля невялікага століка, засланага белым-белым настольнікам, на той самай невялічкай, закілым-белым настольнікам, на той самай невялічкай, закіпутай клятчатаю дзяружкаю канапцы, дзе яны заўсёды гаварылі ўдваіх з дырэктаркай.

Аднойчы — гэта было якраз перад першамайскімі святамі — у пярэдняй хаце, на стале, што прыстаўлены ўпрытык да акна, выстругаўшы з трэскі шырокае пяро, на нейкай лушчанай паперы чырвоным чарнілам я пісаў першамайскі лозунг, каб павесіць на школу. А ў задняй, якраз вось на гэтай самай канапцы, сядзела Паўліна Раманаўна з лётчыкам. Я чуў, як яны спакойна і гучна размаўлялі: можна сказаць, пра ўсё і ні пра што — жартавалі, смяяліся.

На сцяне, у кутку над мыцельнікам, вісела вялікае люстэрка, і калі я зусім выпадкова зірнуў у яго, адразу адвёў вочы ўбок. Дзверы ў заднюю хату былі адчынены, і ў люстэрку я добра бачыў тую канапку, на якой сядзелі дырэктарка з лётчыкам і, не падазраючы, што іх можна бачыць з пярэдняе хаты, цалаваліся.

Потым лётчык адхінуўся ад Паўліны Раманаўны, дакрануўся да яе шчакі сваім высокім ілбом, на які спадалі кудзеркі валасоў, і зноў гаварыў звычайна і нязмушана — пра ўсё і ні пра што.

Дык вось яно як! Яны цалуюцца, а каб я і дзядзька Пятрок, які ляжыць на печы, нават і не падумалі пра гэта, вядуць такія нязмушаныя і абыякавыя размовы.

Калі лётчык зноў нахіліўся над Паўлінаю Раманаўнаю і зноў шукаў яе вусны, тая адпіхнула яго і, прыклаўшы палец да рота, па мігі пачала паказваць у мой бок і ківаць галавою — маўляў, ты што, набачыць яшчэ ці пачуе, не дай бог. А сама весела гаварыла. Лётчык, таксама прыклаўшы палец да сваіх губ, махнуў у мой бок рукою, што, мусіць, значыла: ён, маўляў, піша, заняты сваім і на нас не глядзіць, а я пацалую цябе так, што ніхто і не заўважыць. Ведучы такую размову рукамі і вачыма, уголас ён расказваў пра нейкага свайго салдата, які дужа ж ужо лянуецца служыць. І ўсё ж ён пацалаваў яе яшчэ раз. Паўліна Раманаўна стрымана кашлянула, і зноў іхняя размова вярнулася да таго самага салдата, які так дрэнна служыць.

Заглядзеўшыся ў люстэрка, я неасцярожна пасунуў сваю левую руку і толькі пасля заўважыў, што разліў чарніла. У самым канцы палосы, якраз пасля слоў першага рада (я пісаў лозунг у два рады), з'явілася вялікая чырвоная пляма. І яе ўжо не сатрэш — лушчаная папера прамякла навылёт. Я ледзь не заплакаў ад крыўды. Маё шморганне носам пачула Паўліна Раманаўна і падышла да мяне.

— Тут нешта здарылася,— здалёк сказала яна і, убачыўшы вялізную пляму на паперы, пачала мяне супакойваць: — Нічога, Ясь, нічога. Не перажывай. Мы з табою нешта прыдумаем.

Падышоў і лётчык.

— А што тут думаць? Якраз дзе пляма, там будзе клічнік. А ўвесь тэкст падгонім пад яго.

З лётчыкам згадзілася і Паўліна Раманаўна. Таму ў святы на нашай школе доўга вісеў напісаны мною лозунг з вялікім-вялікім і тоўстым, як корань прыгожага баравіка, клічнікам у канцы.

І хоць лётчык памог мне выратаваць намаляваны ўжо лозунг — так бы давялося перапісваць,— я адносіўся да яго ўсё роўна з нейкім халадком. Не змянілася нічога і пасля канцэрта, дзе ён змог улюбіць у сябе ўсіх сяб-

рыньцаў, а таксама і тых раёўшчыкцаў, булінцаў, лепькаўцаў, якія прыйшлі паслухаць шэфаў з «ядрома».

Нашы шэфы — салдаты і афіцэры аэрадрома — аж на трох машынах прыехалі недзе надвечар, але афішы, расклееныя загадзя, паведамлялі ўжо колькі дзён, што яны дадуць сёння ў Сябрыні сіламі вайсковай часці канцэрт самадзейнасці.

Яшчэ засветла салдаты адкрылі заднія і бакавыя барты, саставілі разам дзве машыны — атрымалася прасторная сцэна,— а трэцяя, «студабекер», калі сцямнела, уключыла свае фары і так асвятляла сцэну да самага заканчэння канцэрта. Салдаты і афіцэры спявалі, танцавалі, чыталі вершы. Быў нават адзін салдат, які да слёз смяшыў людзей. Але сама больш спадабалася ўсім выступленне знаёмага Паўліны Раманаўны. Перад тым як яму выступаць, сцэну захінулі посцілкамі, якія трымалі за ражкі салдаты, а калі расхінулі — у кузавах стаяў ужо стол, а на ім сядзеў, выставіўшы ўперад ногі, дырэктарчын штурман. Каб вы толькі ведалі, які ён быў пацешны на гэтым стале. У сваёй блакітнай кашульцы — да палова тулава было нармальнае, усе пазнавалі лётчыка,— але ногі чамусьці пачыналіся недзе адразу ж пад грудзямі, амаль там, дзе звычайна згінаюцца ў локцях рукі. Таму чалавек здаваўся нейкім маленечкім-маленечкім — бы ліліпут. А калі ён пачаў спяваць вясёлыя прыпеўкі сваім грудным голасам і, седзячы так, танцаваць —малаціць вялізнымі ботамі па стале, ды так гулка — як усё роўна па барабане,— усе рагаталі, аж за жываты браліся. І калі салдаты ў канцы зноў завесілі лётчыка, а пасля гэтага ён выйшаў з-за посцілак, такі ж, як і ўсе — высокі і на сваіх нармальных нагах,— многія аж не хацелі верыць, што гэта той самы штурман, які во толькі выбіваў барыню, седзячы па стале.

А Халадзёнак дык той усё хадзіў за лётчыкам і дапытваўся:

— Не, ну а дзе ты ўсё-ткі, скажы, ногі тады дзяваў?

— На стале, баця, на стале яны ляжалі,— усміхнуўся штурман.

— Не, на стале ляжалі не твае. А твае ўсё-ткі дзе былі?

— Ну, а мае — пад сталом.

Але Халадзёнак не адставаў ад яго:

— Дык а чые ногі барыню тады выбівалі?

— А гэта былі, баця, мае рукі,— каб адчапіцца ад

старога, расказаў свой сакрэт лётчык.— На рукі я салдацкія боты адзеў і рукамі вашу барыню выбіваў.

Халадзёнак у гэта ўжо не верыў.

— Не, тут нешта не так,— незадаволена і няўпэўнена казаў ён, але ад штурмана, хоць і задумаўшыся, усё ж адыходзіў.

*Вось прайшло ўжо колькі часу, а я і зараз ніяк не магу зразумець, чаму я так неўзлюбіў гэтага вясёлага штурмана. Можа, таму, што, калі ён з'яўляўся ў задняй хаце Петрака і Петрачыхі, Паўліна Раманаўна, якая заўсёды была са мною вельмі ласкаваю і вясёлаю, многа гаварыла, пры ім зусім не глядзела ў мой бок і ўжо не чапала мяне — быццам Яся і не было. Можа, таму, што мне, без матчынай ласкі, хацелася адчуць на сваёй галаве цёплую жаночую руку. Можа, таму, што яго, гэтага лётчыка, любілі ўсе, хто сустракаўся з ім хоць адзін раз. А можа, яшчэ і таму, я баюся нават прызнацца сабе ў гэтым, што я, па-дзіцячаму шчыра і зусім не так, як Ленку, любіў Паўліну Раманаўну. Любоў гэта — малога да старэйшага — была вельмі блізкая любові да маці, а што ўсе мы любім сваіх матак — не дзіва...*

Паўліна Раманаўна многа мне расказвала пра сваё партызанства. Тады я сядзеў ціхутка-ціхутка і адно толькі слухаў. Каб сабраць збольшага яе ўспаміны, скажам, пра адну з цяжкіх блакад, то гэты расказ быў бы прыблізна такі:

— Уяві сабе, Ясь, наш партызанскі Рацаўскі лес. Немцы кожны дзень аблавы робяць. А мы, невялічкая група партызан, адарваліся ад брыгады. Там сябры змагаюцца, мы да іх прарываемся. Але пакуль ішлі — у тым баку, дзе стралялі, усё сціхла: значыць, прарваліся. А мы засталіся ў блакадзе. Бачым, што нашымі сіламі блакады не прарвеш. Вырашылі ісці да Чорнага балота, дзе ў нас была база, зямлянкі добрыя былі накапаны. Думаем, раз немцы пагналіся за прарывам, які брыгада зрабіла ў супрацьлеглым ад зямлянак баку, то, відаць, яны туды і пасцягвалі ўсё сваё войска.

Праўда, як яшчэ гэтыя зямлянкі толькі збіраліся капаць, мужчыны спрачаліся. Лаўрэн, Цыцаў бацька, усё настойваў, каб капаць іх ля самага балота — маўляў, карнікі дабяруцца да твані, убачаць, што далей ісці няма як,

і павернуць назад, так і не дайшоўшы да нашага жылля. І толькі Дзямідзька (тады ён яшчэ на дзвюх нагах бегаў) усё супраціўляўся: «Ты вот, гета, глядзі сюды. Я і сам не ведаю чаму, але мне штосьці не хочацца тут рабіць нашы зямлянкі. Адчуваю, а расказаць, гета, не магу». А Дзямідзька з Лаўрэнам лічыліся ў брыгадзе самымі лепшымі майстрамі па зямлянках. Яны ў нас нібы за інжынераў былі. І ўсё ж паслухаліся тады Лаўрэна — ля самага балота зрабілі зямлянкі, выхады пад карчы павыводзілі, лісцём іх зацерушыла — дык і не відаць.

Ідзём, значыць, мы да свае базы. А тут такі ўжо восеньскі дзень прыгожы — ціхі, цёплы, спакойны,— ну хоць ты кладзіся ў апалае лісцё ды любуйся глыбокім і бяздонным небам.

Недзе з абеду мы ўжо і да лагера амаль падышлі. Ідзём і бачым: на палянцы дзіцятка малое-малое сядзіць і, дурненькае, з ручкамі сваімі гуляе, сонечныя зайчыкі на лісці ловіць. І хто яго пакінуў у гэтым лесе глухім, дык мы і розуму не дабяром. І толькі я да яго ісці сабралася, каб забраць з сабою, а тут — як застракоча ўвесь лес. Усе — шух! — з палянкі. І я за імі.

Дабеглі мы, у зямлянкі папахаваліся, уваходы пазакладалі, табакаю іх абсыпалі — гэта каб сабакі следу не ўзялі. І сядзім сабе. Чакаем. А чаго чакаем, каб хто спытаўся. Чуем, выйшлі карнікі да балотца, сталі, гергечуць там на ўскрайку. Лаўрэн усміхаецца і моўчкі паднімае палец угору — маўляў, а што я вам казаў? Пагергеталі яны там, пагергеталі і да нашых зямлянак, чуем, ідуць. І трэба ж ім, гэтым сабакам, якраз тут атабарыцца. Акурат над намі, над зямлянкамі, паселі — а што, тут жа і сонца болей і відаць адсюль шырэй. Сядзяць, рагочуць амаль над нашымі галовамі, а то і стрэліць каторы — хто яго ведае па кім: ці то па якой птушцы, ці то так, для смеласці. А мы сядзім ціхенька-ціхенька і не дыхаем нават. Мне ж усё ў галаву лезе тое дзіця на сонечнай палянцы, якое з ручкамі сваімі забаўлялася. Цяпер ужо Дзямідзька — а злы-злы! — падпімае свой палец і з дакорам глядзіць на Лаўрэна — маўляў, ну што я табе казаў?

А немцы ходзяць паверсе, зямля на нас толькі сыплецца — вось-вось каторы праваліцца. Падняла я вочы ўгору, гляджу, аж абцас фашыста тырчыць нада мною — ушчаміўся між бёрнаў наката. Я гляджу на яго ды й думаю сабе: «Не дай бог, праваліцца. Хаплю яго тады за нагу. Хоць і нам будзе канец, але ж і яго, мусіць, разрыў сэрца не

міне». Ужо і прыладзілася. Ажно не, паторгаў-паторгаў ён нагу — і выцягнуў.

Сяджу, а сама і радуюся, што не паспела тое дзіця ўхапіць, якое на паляпцы з ручкамі забаўлялася,— што каб яно вось зараз вякнула: гэта ж дарослае ведае, што маўчаць трэба. А яно...

Немцы так пасядзелі, пасядзелі да вечара, а калі цямнець пачало — пайшлі. Вылезлі мы, з гадзіну счакаўшы, азіраемся. А мне ўсё карціць тое малое забраць. Пабегла я туды. Бегала, бегала, шукала, шукала — нідзе няма. Ужо і клікала паціхеньку — не абзываецца. Ды і само хоць бы вякнула дзе, хоць бы заплакала. Ведама, дзе ты яго ўночы знойдзеш. «Няхай, думаю, да раніцы ўжо — раніцою пры сонцы пашукаю».

Вярнулася, а нашы Шлёму, раёўшчынскага каваля, які пасвіў у гэты дзень нашых партызанскіх кароў, шукаюць. Пайшлі ў той бок, куды ён раніцою пагнаў. Ішлі, пакуль Паўлік Саўкаў у цемры ледзь не паваліўся, зачапіўшыся за нешта вялікае-вялікае. Памацаў ён рукою ды і гаворыць:

— Гэта ж нашы каровы.

Паглядзелі, памацалі рукамі і мы — сапраўды нашы каровы. Усе да адной пастраляныя ляжаць. Немцы пастралялі — фашысты наогул ні за каня, ні за карову ў лесе не браліся: думалі, што яны замініраваныя. Таму здалёк расстрэльвалі.

— Відаць, і Шлёма тут недзе ляжыць забіты,— забедаваў Паўлік.— Давайце пашукаем.

— О, гэты Павал,— пачулася раптам аднекуль зверху — як з неба.— О, гэты Павал. Як што — ужо і забіты. Як што — ужо і пашукаем. Навошта шукаць, я і сам знайдуся.

Уверсе затрашчала голле, і з аграмаднай і страшнаватай у цемры елкі гэпнуўся на зямлю Шлёма.

— Хто мяне тут хацеў шукаць?

Усе ціха і ўзрадавана засмяяліся. Выявілася, што немцы, вяртаючыся, наткнуліся на кароў. Добра, што Шлёма, пачуўшы яшчэ здалёк гергетанне, хуценька ўзлез на елку і захінуўся лапкамі —хто гэтым звечарэлым прыцемкам убачыць яго там, у гушчэці.

Упэўніўшыся, што немцаў блізка няма, і ведаючы, што ноччу яны ў лес не пойдуць, не памятаю ўжо хто (здаецца, ці не Дзямідзька) расклаў маленькае цяпельца. А я пайшла да самага балотца, каб крыху змыць тую

зямлю, што немцы нацерушылі за каўпер. Зняла я жакетку, стала да вады і толькі гэта нагнулася, зачэрпнула яе прыгаршчамі, як раптам — лоп, лоп, лоп! — у вогнішчы. Страляюць! Па цяпельцу, відаць, страляюць! Узняла асцярожна галаву, стаю, гляджу — ціха, нічога не чуваць. А як толькі нагнулася, зноў — лоп, лоп, лоп! Гляджу я, а з цяпла аж іскры і вуголле выскакваюць. Значыць, нехта па агні страляе. Я тады — ходу. Бачу, ля вогнішча ўжо нікога няма. Я бягом да рова, які быў злева балотца. Прыбягаю, а там ужо няма куды ўпліпічыцца. Але і я неяк ногі ўшчаміла. Гляджу, аж Дзямідзька побач сапе. Таксама толькі ногі ў траншэю паставіў, а сам увесь наверсе. Сядзіць і елку над галавою трымае. Маскіруецца. Быццам тую елку нехта ў цемені ўбачыць, быццам яго за тое дрэва прыме.

Пасядзелі мы так троху, цяпельца наша звяла, стрэлы сціхлі. Тады мы па адным, па два ў свае зямлянкі вярнуліся. І ўжо толькі раніцою разабраліся, хто па нас страляў. Ажно гэта Дзямідзька, калі распальваў агонь, нагінаўся над ім дужа нізка. А ў яго ва ўнутраных кішэнях патроны былі. Вось яны і высыпаліся ў цяпельца. Пакуль нагрэліся, ляжалі ціха, а тады і пачалі страчыць.

Раніцою ж я пабегла шукаць тое дзіця, што на палянцы з ручкамі гуляла. Знайшла ўсё ж. Яно ляжала на тым жа месцы, і я думала, што малое спіць. Ляжыць на спіне — тварам да неба, да жоўтых бяроз. Калі падышла бліжэй, убачыла шырока адкрытыя, нежывыя вочы і лужынку крыві пад галавою: забілі ўсё ж, звяры! Да шчочкі прыліп жоўты ліст, а ў раскрытай ручцы зноў дурэў той сонечны зайчык, які малое так і не злавіла ўчора. Тады я ішла назад і ўсё плакала, і ўсё шкадавала, што не забрала дзіця. А можа б, яно і ў зямлянцы не явкнула, а можа б, і мы і яно засталіся жывыя...

— Ну, дык што ты, брат, задумаўся? — вывеў мяне з маіх успамінаў лётчык.— Чакаць будзеш Паўліну Раманаўну?

— Не,— адказаў я і ўзяўся за клямку.

— Скора мы з тваёю Паўлінай Раманаўнай у Маскву паедзем.

— Маскву паглядзець? — насцярожана спытаўся я.

— Не, брат, жыць там будзем. Мяне пад Маскву пераводзяць.

Пытацца, чаго едзе з ім дырэктарка, мне не трэба бы-

ло: я і раней чуў, што яна выходзіць за лётчыка замуж, але пакуль не верыў у гэта.

Яшчэ з большай злосцю на лётчыка выбег я з Петраковай хаты.

Са святла пакоя вечаровы змрок на вуліцы здаўся яшчэ цямнейшы. Пакуль што поўні не было, а таму ў вечаровай цемрадзі вельмі ж ужо светлаю плямаю, якая, здаецца, аж рассоўвала ў бакі густую чарнату, свяцілася новая Дзямідзькава пяцісценка. Дзямідзька пакуль што не скончыў яе будаваць, і таму на вуліцы, пад вокнамі, расстаялі сталюгі, на якіх ляжала тоўстае, да палавіны распілаванае, бервяно — палавіна ўжо дошкі, а палавіна яшчэ кругляк. Ды і дошкі так шчыльна прылягалі адна да адной, што здавалася непілаванаю і другая частка. І толькі клін, забіты між дзвюх дошак (каб не заціскала пілу), нагадваў пра тое, што бервяно нядаўна пілавалі. Яшчэ пазаўчора я сам бачыў, як тут працавалі Дзямідзька з Мікітам: Дзямідзька на адной назе стаяў уверсе, на бервяне (і як ён толькі туды ўзлез!), і, прытупваючы дзеравяшкаю, узмахваючы, нібы крыллем, дзвюма рукамі перад сабою, лёгка падаваў пілу ўніз, дзе, прыжмурыўшы адно вока, уважліва, каб не збочыць са шнура, адбітага вугалем, сачыў за пілою дзядзька Мікіта. Якраз тады Мікіту папала ў вока пілавініна, і ён доўга бегаў вакол сталюгі і кляў усё спрытна́ — дошкі, пілу, Дзямідзьку, а заадно і яго новую хату.

Ля трэцяга ў вёсцы калодзежа нехта бразгаў вёдрамі. Калі я падышоў бліжэй і ўжо трохі агледзеўся пасля святла Петраковай хаты, пазнаў Лысую Таццянку, якая, не зважаючы на цемрадзь, насіла ваду: вяселле, што грымела як не насупраць яе хаты, быццам бы яе і не датычылася. Яна настолькі ўкруціла галаву ў хусты, што з усяго твару былі відаць толькі адны вочы ды нос, які ўвесь час прастуджана шморгаў.

Тое, што Таццянка сустрэлася ля калодзежа, было добра. Шчыра кажучы, я не дужа любіў заходзіць у яе прасторную хату. Асабліва пасля таго, як аднаго разу надумаўся купіць у яе сліў. Таццянка і да гэтага недалюблівала мяне. А тады яна са злосцю сказала, што нічога не прадае і не раздае. Хоць у садзе ў яе аж ламіліся галіны ад буйных і сініх у спеласці сліў. Я тады, разгублены, выйшаў ад Лысай Таццянкі, і тая са злосцю так бразнула дзвярыма, што аж зазвінела: гэта вываліўся ў хату слясак.

Тады ж я зайшоў да Туньціка. Той насыпаў цэлую шапку яшчэ буйнейшых і спялейшых сліў,— дзе правядзеш пальцам, там цямнее чорная палоса! — насыпаў без грошай. Я доўга торкаў яму ў кішэнь пакамечаныя рублі, аж пакуль ён не ўзлаваўся.

— Ты вот будзеш мне торкацца, пакуль я слівы назад з шапкі не вытрасу.

Лысая Таццянка жыла ў прасторнай хаце ўдваіх са сваім старым Нупрэем. Але Нупрэя нідзе не было відаць, нідзе не было чуваць — усё рабіла яна сама. У Сябрыні смяяліся, што Нупрэй дужа баіцца жонкі, і жартавалі, што Таццянка, калі дзед у чым-небудзь правінаваціцца, карае яго, як тое малое дзіця: ушчэміць галаву між каленяў, вышмаргне з дзедавых штаноў папружку і яго ж, Нупрэевай, папружкаю б'е — адно ляскат стаіць... А ён толькі круціць галавою, што ў каленях, ды просіцца: «А Таццяначка, не буду, а родненькая, не буду, а любенькая, не буду — толькі пусці жывым...» Нават казалі, што аднаго разу сам Нупрэй камусьці жаліўся: «Ведаеш, як толькі я азавуся, дык яна на хвасце становіцца, чортам глядзіць...»

Таму дзеда Нупрэя ніколі не бачылі ні на вяселлях, ні на радзінах — не бываў ён ні ў якіх бяседах. Ніхто не бачыў, каб ён смяяўся, каб узнімаў чарку, каб сядзеў дзе-небудзь на прызбе альбо на бярвенні, дзе нярэдка збіраюцца вечарамі і ў святочныя дні мужчыны.

Лысая Таццянка і сама рэдка калі хадзіла да людзей. Яна заўсёды была ў хусцінцы і не адхінала яе ніколі. Халадзёнак нават бажыўся, што Таццянка зусім лысая. Хоць усе ў Сябрыні гэта ведалі і так, але ж убачыць яе бяду на свае вочы нікому не ўдавалася.

Таццянка асабліва зазлавала на ўсю Сябрынь пасля таго, як яе адзінага сына, якога яна знайшла яшчэ ў дзеўках і з якім прыйшла ўжо да Нупрэя, ноччу падпялі з ложка партызаны і павялі з сабою: ён, пабыўшы ў партызанах, перабег у гестапа і, ведаючы партызанскія сакрэты, мог нарабіць вельмі многа паганага. Ды і да гэтага ўжо Таццянчын сын сёе-тое паспеў зрабіць — ён завёў карнікаў да тых зямлянак, дзе прыхоўваліся на выпадак блакады сякія-такія лішкі партызанскага харчу. Па яго прыходзілі незнаёмыя людзі, але Таццянка была ўпэўнена, што падаслаў іх нехта з сябрынцаў. Мяне яна не любіла таму, што і мой бацька, і мае дзядзькі таксама былі там, у партызанах...

Я сказаў «добры вечар» і падышоў да калодзежа. Тацця́нка нічога не адказала, дастала вядро і паставіла на дошку — па вядры, ад почапкі, глуха звонячы, папоўз вужакаю ў ваду цяжкаваты ланцужок і, мусіць, скруціўся там, на дне вядра. Гэтага я ў цемнаце не бачыў, але адчуваў — па гуку.

— Вазьміце вашу газету.

— Не мог у хату прынесці,— забубнела Таццянка,— дык ля калодзежа ловіць. А як я яе панясу?

Пасля склала газету ўшчэ ў дзве рэдзі, паклала за пазуху і, узяўшы вёдры, пайшла. Я ішоў следам. Ля Матрунчынай хаты прыстояў. Таццянка, відаць, таксама спынілася, паставіла вёдры — зноў звякнулі почапкі — і пачала клікаць Палюгана, які радасна айкаў недзе за вёскаю — дурэў там з хлопцамі. Палюган не абзываўся ёй.

Не даклікаўшыся яго, Таццянка ўзяла вёдры і пайшла ў хату.

А на выгане ўсё тоненька айкаў Палюган: «ай-аў-ай» — нібы смяяўся хто...

Ад Лаўрэнавай хаты вельмі ж ужо чулася вяселле. Чуваць было, як іграў дзядзька Саўка, як нехта спрабаваў заспяваць, як ля хаты, дзе гуло вяселле, нехта гучна гаварыў.

У хаце Матруны Векавухі таксама гаварылі гучна.

Дзядзька Змітра сядзеў на табурэце насярод хаты, а Матруна, усхліпваючы і шморгаючы носам, у тазіку, што стаяў на лаўцы, мыла посуд. Гэта лаўка і гэты табурэт, відаць, адны толькі і засталіся ў хаце: і сталы, і крэслы, якія былі, і ўслончыкі — усё перанеслі на вяселле, каб было дзе садзіць гасцей. Да таго ж, пэўна, хутка сюды прыйдзе моладзь танцаваць, каб не замінаць старым весці свае доўгія размовы над недапітымі шклянкамі.

Дзядзька Змітра галіўся. Маленькае люстэрка трымаў перад ім сын, а ён сам, закінуўшы руку над галавою, дастаўшы пальцамі шчаку, нацягваў яе ўверх і вадзіў брытваю, якая звыкла ляжала ў пальцах другой рукі. Відаць, галіўся ён наўздагад, бо і цёмна ў хаце было, і Петрык трымаў люстэрка так, што ў ім якраз нічога не было відно. Хіба толькі малое само бачыла ў ім бацьку.

— Дык нашто ты гэта пісала? Нашто? — допытваўся Тупіцік.

Матруна маўчала, толькі глуха грымела ў тазе драўлянымі лыжкамі і алюмініевымі міскамі.

— І што ты ад яе хочаш?

Матруна зноў шморгнула носам.

— Вось ваша, дзядзька Змітра, «Бярозка»,— перапыніў я іхнюю непрыемную размову.— Прыйшла вось...

Туньцік маўчаў — нібы і не заўважаў мяне.

— Тата, тата, а я «Бярозку» вазьму,— загаварыў малы Петрык і, адною рукою ўсё яшчэ трымаючы люстэрка, другою — узяў часопіс, навярнуўся да мяне і пахваліўся:

— А ў нас многа такіх. Тата іх мне ўсе аддае...

Дзядзька Змітра — мой татулька. Яшчэ пры немцах, калі ў самым пачатку акупацыі дайшлі чуткі, што фашысты будуць расстрэльваць усіх дзяцей, якіх дагэтуль не перахрысцілі бацькі, мама запрагла каня і завезла мяне, нехрысця, у Новыя Вербы, дзе была царква. За матульку надахвоцілася быць Ядоха, а вось мужчыны на той час не знайшлося. Пасля таго як нававербінскі поп выстрыг вялікі жмут маіх валасоў, памазаў стрыжанае нечым халодным, а потым папырскаў усяго мяне «святою» вадою і запісаў на пасведчанні аб нараджэнні, што я «охрещен в православное вероисповедывание», мяне, такога вялікага ўжо і цяжкога, перадалі Ядосе на рукі: матулька ледзь не ўпусціла хрэсніка — паспрабуй утрымай такога байбуса адна, без кума. А паколькі трэба было, каб нехта ўсё ж зваўся маім татулькам, запісалі на Туньціка. І той, калі прыйшоў з вайны і дазнаўся, якога хрэсніка ўсваталі яму без яго, заўсёды, дзе сустракаў мяне, ласкава ўсміхаўся:

— Ну, здароў быў, мой хрэснічак.

Кожны год на вялікдзень я абавязкова хадзіў да дзядзькі Змітры па яйка, а калі летась, пасаромеўшыся сваіх гадоў, не пайшоў ужо, дзядзька Змітра прынёс яйка сам і, дастаўшы з глыбокай кішэні світкі, паклаў яго на стол:

— А я паўдня чакаў хрэсніка — не ідзе. Дай, думаю, сам занясу, а то, можа, захварэў, думаю.

Цяпер жа мой татулька зусім не заўважаў мяне. Ды і, відаць, не заўважаў ён нікога. Туньцік глядзеў праз люстэрка некуды за печ і ўсё дапытваўся ў Матруны:

— Дык што ты, скажы, ад яе хочаш?

Векавуха маўчала і толькі хліпала носам.

Каб не замінаць гэтай непрыемнай, відаць, для абаіх размове, я выйшаў з хаты і, вольны ад пошты, пабег туды, дзе гуло вяселле.

## ВЯСЕЛЛЕ

Лаўрэн, Цыцаў бацька, вельмі ж ужо спяшаўся да гэтай радасці — сынавага вяселля — наспець перастрэсці сваю хату. Хоць хата была і прасторная, вялікая, але ж яе ставіў дужа даўно яшчэ Лаўрэнаў бацька, і таму ніжнія вянцы ў ёй нападгнілі, паструхлелі. Лаўрэн, сам добры цясляр — ён не забываўся на сваё ўмельства нават у партызанах, ставячы цёплыя і ўтульныя зямлянкі,— паклікаў у дапамогу мужчын, і яны за які месяц разабралі і, выкінуўшы гнілыя бёрны, склалі зноў Лаўрэнаву хату: нават вось зараз, у цемпаце, бялеюць новыя бёрны, якія пайшлі ў падруб, а на сценах белымі плямамі спускаюцца радком зверху ўніз счасаныя сякерамі сляды — нібы нехта ішоў па сцяне. Лічбаў на іх у цёмначы не разабраць, ды яны зараз ужо і не трэба, хаця яшчэ доўга на зачасаных плямках будзе відно: «А-8», «Г-5»...Ператрасаючы хату, Лаўрэн закідаў круглякамі адно акно, што выходзіла ў двор,— акон у хаце многа, няма нават дзе паставіць маладажонам ложак.

Усе вокны ў хаце парасчыняны, і адтуль, па халаднаваты ўжо вечар, клубіцца пара (надыхалі — столькі ж людзей сабралася разам!), вырываецца на вуліцу гаркаваты пах гарэлкі і ежы (так заўсёды пахне ля той хаты, дзе весяліцца любая бяседа), выламваецца гудлівы гул размовы (так бывае заўсёды, калі гавораць амаль усе разам, не вельмі слухаючы адзін аднаго).

Дзверы і ў сенцы, і ў хату таксама парасчыняны. У парозе тоўпіцца многа людзей. Дзядзька Лаўрэн якраз з-за вяселля не рабіў печы, каб яна не замінала гасцям, але ўсё роўна ў хаце цеснавата. Пакінутую ў падлозе дзірку для печы дзядзька Лаўрэн пакуль заклаў шалёўкамі, а на іх, у самы куточак, паставіў скрыню, дзе перахоўваецца ўся святочная вопратка і Лаўрэна, і Лаўрэніхі, і самога Цыцы. На скрыні вясёлы-вясёлы сядзіць дзед Сянчыла — яго нехта ля сенцаў зняў з калёскаў і ўнёс у хату. Твар у яго і праўда абадраны — дзве лямпы, якія вісяць над бэлькамі, асвятляюць і тую драпіну, якую ён займеў, кульнуўшыся са свайго парога, і другую, напалову заклеенную газетай, якую ён, відаць, вельмі спяшаючыся нагаліцца, зрабіў тупою брытвай.

Скрыня стаіць крыху зводдаль ад сталоў, а таму ён, варочаючы галаву то ў адзін бок — дзе гавораць, то ў другі — дзе спяваюць, наслухае-наслухае, што гавораць і што

співаюць, а потым, смешна так падзьмуўшы шчокі, выпусціць паветра і зацягне сваё:

Еў-па-ру-ры, руры,
Еў-па-ру-ры, руры...

Дзед Сяпчыла памагае сабе спяваць, водзячы перад тварам рукою, у якой моцна трымае аладку ў смятане, а калі яму пададуць шклянку — тады дзве рукі спяваюць услед за старым:

Еў-па-ру-ры, руры...

Цяпер Сяпчылу, відаць, надакучыла яго песня, і таму ён, круцячы галавою па баках, шукаў Саўку.

— Саўка! Дзе гэты Саўка дзеўся? Саўка! Іграй хутчэй мне «Сербіянку»! — І, не чакаючы музыкі, пачынаў іграць ротам і падскакваў, як мог, на сваёй скрыні — добра ўвесялелы Сяпчыла танцаваў «Сербіянку». Адразу ж, як толькі пачуў музыку, вылез з-за стала Рагатун і, крыкнуўшы: «Круг!», рассунуўшы людзей, што стаялі між сталоў, як заўсёды, узяўся сваёю адзінаю рукою за папругу і закруціўся на гэтым маленечкім пятачку — акурат гарлачык з ручкаю: нездарма ж людзі яго так празвалі!

— Убяры, Дзямідзька, сваю дзеравяшку,— усё круцячыся, усё шырачы круг, крычаў Гарлач брыгадзіру, які сядзеў за сталом бокам, сваёю драўлянаю нагою на самы праход — пад стол яе ж не ўсунеш — і замінаў усім, хто хацеў прайсці ўперад да маладых.

— Ты вот, гета, маю нагу не чапай,— адказваў Дзямідзька, усё ж пасоўваючы дзеравяшку па лаўцы і націскаючы туды, да стала, Мікіту, які сядзеў побач.— Мая нага цябе, гета, не чапаіць.

— Дзямідзька знарок для вяселля яе зрабіў,— усміхаецца дзядзька Мікіта,— а ты ганьбіш... Зірні, якая прыгожая — бы лялька. Ліповая, шклом вышараваная — аж блішчыць.

— А ты, гета, Мікіта, не курняўкай над вухам — і цябе ж ніхто не чапаіць.

Дзямідзька і праўда вельмі любіў рабіць сабе драўляныя ногі. У яго быў іх цэлы запас — дзядзька рабіў іх амаль з усіх парод дрэў, якія раслі ў нашым лесе; яны, гэтыя дзеравяшкі (і ўсе на адну левую нагу), стаялі ў яго ўсюды ля сцен: і ў хаце, і ў сенцах, і нават у хляве.

Драўляныя ногі можна было ўбачыць у самых нечаканых месцах: на стале, пад гарачаю патэльняю — яны за-

мянялі падстаўку; ля ганка, пакладзеныя ў гразь — яны ўжо ніббыта ходнік: па іх увосень ходзяць, як па кладцы; і нават у загнеце, разам з дровамі, валяліся ўсё тыя ж ногі — відаць, непатрэбныя ўжо, да якіх Дзямідзька зараз абыякі і якія ён сам кінуў у дровы, каб жонка спаліла. А паспрабавала б яна сама, без спросу, узяць хоць якую дзеравяшку, крыку было б — не прывядзі ты бог: ну і што, што многа, ну і што, што ўсюды стаяць, няхай сабе стаяць, але, гета, не ты іх паставіла — дык і не чапай!

Дзямідзька рабіў іх і суцэльныя, і састаўныя, разам з Саўкам у кузні змацоўваў вінтамі, скручваў дротам, абклёпваў жалезам.

Спачатку Дзямідзька паспрабаваў быў насіць штаны навыпуск па драўляную нагу — каб за калашынаю не відаць было калецтва,— але хутка ад гэтага адмовіўся.

— Ты вот, гета, зірні,— смеючыся, скардзіўся ён Халадзёнку.— Ты вот, гета, зірні, кажу, на мяне. Акурат чорт. І з-пад калашыны, як капыток, нага, гета, тырчыць. Толькі хваста, гета, і не хапаіць.

Для кожнага свята, для кожнай шырокай бяседы, якая спела ў Сябрыні, Дзямідзька рабіў сабе абнову — новую нагу. Праўду казаў Мікіта, што зрабіў ён абнову і для Цыцавага вяселля: яго новую нагу я заўважыў яшчэ ля зрэзанай Гацілавай вярбы. І вось зараз Дзямідзька сядзеў і ўсё бурчаў — злаваўся на Гарлача:

— Ты вот, гета, абскач маю нагу, калі яна табе замінае.

— Канешне — нашу яешня! «Абскач»,— смяяўся, усё круцячыся, Гарлач.— А ты вот, Дзямідзька, і сам хадзі разам са мною наскачы. Давай паможам Лаўрэну... Цвікі ж яму трэба ў новыя дошкі пазаганяць,— засмяяўся яшчэ весялей і заспяваў:

> Ці ж я яму копікі наспудзіў,
> Ці ж я яму Настульку спагудзіў.

Але Дзямідзька скакаць не ішоў. Ён усё бубнеў сабе пад нос пра нагу, якая замінае Гарлачу, але бубнеў ужо больш лагодна, нязлосна. Рагатун ухапіў сваю тоўстую Рагатуніху і навалок яе ў круг — здалося, у хаце адразу стала цясней.

І раптам Саўка, як і раней ля Ядохінай хаты, нечакана сцішыў гармонік. Усе адразу пачалі круціць галовамі — што здарылася? І тады ўбачылі ў парозе Шаўковіху. Яна стаяла і ўсміхалася.

— Ну і што? — спыталася ў яе аж некалькі галасоў адразу. — Каго Настачка радзіла?

— Дзеўку, дзеткі, дзеўку,— весела паведаміла Шаўковіха і дадала: — На мір, дзеткі. Дзеўкі ж на мір родзяцца.

— Саўка, іграй «Сербіянку»,— зноў крыкнуў са свае скрыні Сянчыла; ён, вымазаны ля рота ў смятану, усё яшчэ трымаў у руках надкусаную аладку.

— Сядзі ты ўжо, канькала гэтае, са сваёю «Сербіянкаю»,— зморшчылася Клёцчыха.

— Шаўковіху ў круг! — выгукнуў Халадзёнак.

Саўка, таксама як і спыніўся, нечакана зайграў: весела, задзірліва — нават прарэзліва, нібы адчайна. Рагатун падкруціўся да Шаўковіхі, адною рукою вельмі ж ужо далікатна запрасіў яе ў круг, і Шаўковіха, сагнутая, абапертая на кій Шаўковіха, удваіх з гэтым сваім пастаянным павадыром, апынулася сярод хаты.

Нейкую хвіліну яна пастаяла ў крузе, нібы ўспамінаючы танец («я ж ужо, уга, калі скакала!»), нарэшце ўспомніла («во і дзякуй богу»), узяла ў руку, вольную ад кійка, край сваёй доўгай спадніцы — і пайшла, і пайшла.

Спачатку Шаўковіха, здаецца, згорбіўшыся яшчэ болей, вельмі асцярожна перастаўляла ногі, не дужа высока паднімаючы іх, прытупвала неяк нясмела, нібы не верачы ім, а каб танец усё ж быў весялейшы, старалася як мага грамчэй грукнуць кіем аб масніцы. Круцілася яна вельмі асцярожна, павольна і ўсё крычала:

— Дзяржы мяне, Гарлач, а то ўпаду зараз — аж млосна ад тваіх скокаў стала.

Потым, смялей увайшоўшы ў танец і, відаць, адчуўшы, як палягчэлі яе ногі, падкруцілася да Ядохі і падала ёй свой кій:

— Патрымай, дзеўка, а то ён мне, халера, толькі замінае...

Нехта з жанчын (ці не Цэшкава — не ўбачыў) на хаду ўторкнуў у старэчыя рукі беленькую хусточку, і бабуля зараз махала ёй над галавою, а сама ўсё больш выпроставалася і выпроставалася. Твар Шаўковіхі расчырванеўся, вочы весела глядзелі на ўсіх, хто стаяў ля круга, рот радасна ўсміхаўся... Цяпер яна ўжо высока падымала ногі і круцілася хутка, прыгожа — па-маладому. І дзіва дзіўнае! Старая, гарбатая Шаўковіха, якая заўсёды абапіралася на кій — яна больш давярала яму, чым сваім пацежалелым, натомленым за жыццё нагам,— выпрасталася, змянілася ўся, павесялела, танцавала вольна і лёгка.

Гэта заўважыла нават Домна, Гарлачова цешча, якая пакінула сваё сталае месца на печы, за komінам, і, укруціўшыся, відаць, ва ўсе хусты, якія толькі былі ў хаце, прыйшла зваць з вяселля зяця:

— Ідзі ўжо, злодзеі, у двор — там карова перагародку да свіней разламала.

— Сціхні ты, Домна, са сваёю перагародкаю. Сядзь во пасядзі.

— Дзёўбам ты сядзь. Прыбіць вунь дошку няма каму.

— Сын прыб'е,— не спыняючыся, адказаў дзядзька Грышка, а сам круціўся яшчэ хутчэй і смяяўся яшчэ больш шчыра.

— І свінню пашукай ды ў хлеў загонь.

— Сын загоніць.

— А калі б цябе агонь не паліў! Сын твой не справіцца... Ідзі ўжо дадому, танцор,— бубнела баба Домна, а потым сціхла і доўга, нібы вывучаючы, нібы толькі што ўбачыла, пільна і здзіўлена глядзела на Шаўковіху:

— Гляньце-тку, гляньце, а чаго гэта Шаўковіха так умаладзела?

— Ты вот, гета, і сама паскінь свае хусты і ў круг стань ды, гета, паскач, бы Шаўковіха, тады ўбачыш, як і сама ўмаладзееш.

Мяне нехта моцна тузануў за рукаў. Я павярнуўся — побач шырока ўсміхаўся дзядзька Мікіта.

— А, зяцёк мой прыйшоў,— узрадавана загаварыў ён да мяне, адною рукою падцягваючы да лаўкі (нават балюча прыціснуў да Дзямідзькавай драўлянай нагі), а другою падаючы поўную шклянку сіняватай самагонкі, якая хоць была яшчэ і далёка ад майго рота, але вельмі ж брыдка пахла.— На во, зяцёк, і ты выпі за вяселле.

— А мамулечкі ж мае! Ці-та ты здурнеў, Мікіта? — пацягнула мяне за другую руку Ядоха.— Божа мой, божа! Ты ж ужо сам глытай гэтую поскудзь, але навошта дзяцёнка прысільваць?

— Ого, дзяцёнка знайшла,— адвярнуўшыся ад стала, апраўдваўся Мікіта.— Гэты дзяцёнак вунь ужо да мае Ленкі бегае. Сысунка мне знайшла.— І потым казаў ужо да мяне: — Не хочаш самагонкі? А можа, цыцы захацеў? Тады, сысунок, папрасі вунь Дуню Цэшкаву — тая падсуне, яна ж Міколку яшчэ не адняла.

Ядоха адцягнула мяне ў гурт да жанчын і загаварыла:

— Не пі, хрэснічак, гэтае дрэні. Мой бацька восемдзесят гадкоў пражыў і ў рот яе не браў. Бывала, возьме на

язык, пакаштуе, а тады зморшчыцца, выплюне ўсё і язык дайжа абатрэць.

— Ён пляваўся, а мы давай вып'ем,— засмяяўся Мікіта і чокнуўся з Дзямідзькам.

Саўка сцішыў свой гармонік, і да гурту жанчын далучылася Шаўковіха. Яна цяжка дыхала, але ўсміхалася весела.

— Відаць, гета, што Шаўковіха бліны пякла — усе вароты ў цесце,— усміхнуўся Дзямідзька і зняў з яе хусты невялічкую бубачку рошчыны, якая прысохла ўжо да махроў; ён, хоць музыкі ўжо і не было, усё яшчэ грукаў дзеравяшкаю па масніцах — адбіваў такт.

— Бліноў-то не пякла, а хлеб парадзісе ўчыніла. А то ж у яе ні скібачкі няма.

— Як там хоць Настачка сябе пачувае? — спыталася Цэшкава.

— Анішто сабе пачувае,— аддыхваючыся, адказала Шаўковіха.— Добра сябе пачувае. Паляжала яна, паляжала троху, а тады правяла рукою па валасах і, ці паверыце, кажыць мне: «Ну, а цяпер ужо, баба, і Настачцы на вяселле можна ісці».

— А што, хіба ёй прывыкаць — трэцяга ж родзіць,— усміхнулася Цэшкава і, зірнуўшы на Лэсю, якая ўсё трымала Міколку, сказала: — Упусціш, упусціш хлопца! Лепш на рукі вазьмі. Во так,— і, убачыўшы, як Лэся лаўчэй узяла малога, супакоілася.

— Самой дужа есці няма чаго, а ўсё раджае.

— І яна мучыцца, і бацька мучыўся. Бывала, ні семя ў яго, ні емя...

— Не,— запярэчыў Клёцка,— яе бацька быў серадняк: торбы з бакоў, а сам пасярэдзіне. Ідзе, бывала, жабраваць — кум каралю!

Сёй-той крыва ўсміхнуўся з жарту Клёцкі, а сёй-той прамоўчаў.

— Божа мой, божа, і што сабе дзеўка думае? — забожкала і Ядоха.— Я неяк і кажу ёй: «Наста, ты, Наста, што гэта ты дзелаеш? Няма каму цябе, Наста, біць». А яна зірнула на мяне невінавата так, засмяялася ды і кажыць: «Чаго ты на мяне, цётка, крычыш? Хіба яны ў мяне, гэтыя дзеці, частыя? Хай растуць здаровыя!»

Тут жа ў парозе таўкліся між дарослых і Настаччыны дзеці — большанькі Алеська і меншанькі Генька. Ля іх, нагнуўшыся, стаяў Рагатун, нешта гаварыў дзецям і па чарзе гладзіў па галоўках — то аднаго, то другога.

Дуня Цэшкава наклікала малых:

— Дзеці, ідзіце ўжо дадому. Ваша мама з магазіна вярнулася. Ляльку вам купіла — будзеце гуляць...

Нехта за сталом рагатнуў, нехта недалёка забубнеў:

— Свайго б лепей глядзела. Чаго яна да гэтых дзяцей чэпіцца!

Калі Алеська, падкасаўшы рукаў вялікага мужчынскага пінжака, які зноў тут жа і аб'ехаў, узяў за ручку Генька і ўзрадавана пацягнуў да дзвярэй, Шаўковіха, гледзячы на дзяцей, расказвала жанчынам:

— Уга, якая цярплівая гэта дзеўка. Самой ужо так дрэнна, так дрэнна, аж задыхаецца ўся, а яна яшчэ пра курэй думае. «Шаўковіха, крычыць, ідзі пакармі піскляг».— «Кінь ты, Наста, пра абы-што думаць. Давай я табе лепей што-кольвек памагу».— «Шаўковіха, крычыць, не злуй мяне лепей — ідзі пакармі піскляг, я табе кажу. Чыгунок з бульбаю ў загнеце стаіць». І змусіла пайсці. Пакуль не пакарміла тых пыляняг, да сябе і не падпусціла...

— А дайце-тку мне хоць на маладых зірнуць,— пачулася ад парога, і, глянуўшы туды, я ўбачыў, як нізка нагнуўшы галаву, сагнуўшыся ў тры пагібелі, у дзверы заходзіў Манах у Белых Штанах.

Ён лёгенька, абедзвюма рукамі рассоўваў жанчын у бакі — бы адграбаў ваду. І таму здавалася, што ён не ідзе, а быццам плыве.

Раптам я міжволі ўскрыкнуў — Манах у Белых Штанах стаў сваім цяжкім падкаваным ботам мне на нагу. Ён паволына павярнуў галаву ў мой бок і спакойна сказаў:

— А ты што, неабуцька, босы пад нагамі блытаешся!..

— Куды лезеш, зладзей? — злавалася на яго Домна, якая ўжо сапраўды адкруціла з сябе адну хусту і трымала яе наапашкі.— Тут і без цябе няма дзе стаць.

— Памесцімся, Домна, усе памесцімся,— супакойваў яе Манах у Белых Штанах, а сам усё пасоўваўся ўперад.

— Мама, чаго ты крычыш на чалавека — месца ж усім хопіць,— цыкнула на матку Рагатуніха.

Падаспела ветлівая Лаўрэніха:

— Малашок, ты ўжо во тут, ля Дзямідзькі, прысядзь. Ён трошкі пацясніцца, трошкі нагу пасуне.

Я зірнуў на Дзямідзьку і ўбачыў, што тоіі хацеў запла-
ваць — зноў успомнілі пра яго нагу! — але змоўчаў: ці то таму, што гаварыла гэта жанчына, гаспадыня хаты, ці таму, што побач з ім сеў вартаўнік, які вечарам абавязкова павінен быць у садзе. І таму ён, каб не краталь асабліва

нагу, навярнуў адну толькі галаву да Манаха і адразу сказаў свайму новаму суседу:

— Ты вот, гета, на вяселлі тут рассядзешся, а там, у садзе, яблыкі калгасныя паабтрасуць усе.

— Не бойся, не абтрасуць! — супакоіў яго вартаўнік.— Там жа Яўсей астаўся. Я яму і сваю качаргу пакінуў. Цяпер у яго дзве двухстволкі. Няхай толькі хто палезе — Яўсей адразу з чатырох ствалоў як бабахне!

Манах у Белых Штанах сядзеў, здаецца, вышэй за ўсіх у застоллі — нават вышэй за свайго брата. І тады, нібы прачнуўшыся, страсянуў галавою Мікіта і падтрымаў вартаўніка:

— Во будзе грому — як на Курскай дузе. Гэта ж не Яўсей будзе, а «кацюша» чатырохствольная. Перасоўная агнявая кропка... На дзвюх нагах...

Мікіта засмяяўся. Усміхнуліся і іншыя госці — тыя, хто сядзеў бліжэй.

І раптам гучна, адтуль, дзе быў на скрыні Сянчыла, пачулася:

— Гор-ка, го-о-р-ка!

Дзед крычаў і прыўзнімаўся на руках. Усе павярнулі галовы ў кут, дзе пад абразамі сядзелі маладыя, і падтрымалі Сянчылу.

— Горка! Горка! — бязладна пачулася з усіх бакоў.

Часцей за ўсё яно так і бывае. Людзі збяруцца з нейкай нагоды на бяседу, пасядуць за сталы, вып'юць па чарцы, а тады і забудуцца пра тую прычыну, якая сабрала іх разам і ўсадзіла ў застолле,— сядзяць сабе, падліваюць самагонку ў шклянкі, закусваюць і гавораць з тымі, хто бліжэй — побач з табою ці насупраць,— а то нават крычаць у далёкі кут, праз колькі сталоў, успамінаючы смешны выпадак, які толькі яны ўдвух і ведаюць.

Забыліся на маладых і ў Лаўрэнавай хаце. Жэнька Цыца і яго белавалосая, як русалка, Люська сарамліва сядзелі за сталом, шчыра і радасна глядзелі адно на аднаго і, здавалася, не маглі наглядзецца — нібыта ім вось зараз во трэба расставацца.

— А і праўда — го-о-рка! — сказаў і Дзямідзька і, павярнуўшыся да маладых, загарадзіў нагою праход.

Цяпер ужо дружна, адным голасам (нібы людзі знарок гэта развучвалі), усе госці крычалі:

— Гор-ка! Гор-ка!

Жаніх, саромеючыся, узняўся з лавы, зачапіўшыся галавою за набожнік, што вісеў на абразах, растапыранымі

пальцамі згроб валасы з ілба і зачасаў іх назад (дарэчы, гэта была яго заўсёдная прывычка— так ён рабіў і перад тым, як браць лыжку, і перад тым, як надзяваць шапку, і перад тым, як з кім здароўкацца) і падаў руку Люсьцы. Тая, таксама саромеючыся, узнялася і стаяла пад накрухмаленымі набожнікамі. Стаяла белая-белая як палатно — відаць, ад вэлюму,— так і не рашаючыся наблізіцца да Жэнькі, свайго мужа. Цыца сам нахінуўся да яе і сарамліва цмокнуў Люську ў шчаку. Дзед Сянчыла радасна ўжо засяваў сваё «еў-па-руры, еў-па-руры», але госці ўсё роўна пляскалі ў далоні і крычалі: «Горка!» — патрабавалі пацалавацца як след:

— Э, не, так не цалуюцца — не падсаладзіў нават. Гор-ка!

Жэнька зірнуў на Люську і развёў рукамі: маўляў — бачыш сама, нічога не зробіш. А потым ласкава прыгарнуў яе да сябе і не напаказ, а як трэба пацалаваў — відаць, так яны цалаваліся і адны, не пры людзях.

Усе сціхлі, «горка» пасля гэтага ніхто ўжо не крычаў — госці супакоіліся: сябрыньскі Жэнька і раёўшчынская Люська ўважылі іх, пацалаваліся, як яны і хацелі.

*І вось цяпер, у сваім сталым узросце, калі ўжо, здаецца, уведаў больш, чым засталося ўведаць, я ўсмешліва ўспамінаю тое цвёрдае маё дзіцячае рашэнне ніколі не жаніцца — рашэнне, якое выспела ў Лаўрэнавай хаце якраз тады, калі Жэнька і Люська цалаваліся. Я згодзен быў жыць з Ленкаю ў адной хаце, гадаваць нават сваіх дзяцей, спаць з ёю ў адным ложку, але каб вось так, на вяселлі, перад усімі, цалавацца?.. Цалавацца, каб на цябе глядзела ўся Сябрынь, Раёўшчына і нават булінскі Манах у Белых Штанах? Не! Навошта мне такая жаніцьба!*

Пасля таго як Жэнька і Люська пацалаваліся, да іх нясмела, глыбока ўсунуўшы ў кішэню руку, пачаў прабірацца між сталоў Клёцка. Зачапіўшыся за Дзямідзькаву нагу, ён спатыкнуўся і выхапіў з кішэні руку — каб абаперціся на яе. З рукі выпалі два алюмініевыя пярсцёнкі і пакаціліся па падлозе. Хто быў бліжэй, пасагіналіся, пачалі шукаць, а Клёцка разгублена стаяў і ўсё падцягваў штаны, якія не трымаліся без папругі. Чакаў, калі пярсцёнкі знойдуць. Нарэшце іх падалі: адзін, той, што закаціўся пад сталы, сагнуўшыся, дастаў Манах у Белых

Штанах, а другі ля Сянчылавай скрыні знайшла Хадосся. Сянчыла быў таксама нагнуўся і шпарыў па дошках рукою, аж пакуль не кульнуўся са скрыні.

— Куды ты лезеш, нячысцік? — крыкнула на яго Домна; яна разам з Шаўковіхаю падняла Сянчылу і зноў пасадзіла на ранейшае месца.

— Сядзеў бы ты ўжо, жыгун гэты,— ласкава ўшчувала Сянчылу і Шаўковіха, абіраючыся ад ваўчкоў і кідаючы іх у парог.— Чаго ты гоцаеш, неўвіруцце гэта?

Халадзёнак побач расказваў свайму брату:

— Ты чуў, як Сянчыла паміраў? Чуў? А як ажыў? Не? Дык паслухай. Адплюшчыў ён вочы, глядзіць на нас і не гаворыць нічога — нібы слухае. А пасля і кажыць: «Нехта касу клепіць». Мы слухаем, нічога не чуем. «Кінь ты, кажам, гэта ў цябе ў вушах звініць».— «Не, кажа, клепіць. І знаеце, хто клепіць? Туньцік».— «Кінь ты, кажам, навошта Туньціку ўвосень касу кляпаць?» — «Атаву, кажыць, будзе касіць». Выйшлі на вуліцу — і праўда, клепіць. Туньцік касу клепіць. Так далёка, а ён чуў. Першы гук, відаць, дужа чуваць.

А Дзямідзька, павярнуўшыся да Халадзёнка, казаў:

— Гета ж нада табе — такі дзед вясёлы сёння. Вот, гета, перабяруся я ў новую хату, а ён няхай у маю старую ўязджае — усё ж намнога цалей, чым яго... І сенцы ёсць... І ганак таксама.

— Ага, тады хоць вуліцу выпрамім,— усміхнуўся і Клёцка.

Ён падышоў ужо да маладых і, перагнуўшыся над сталом, падзяваў ім пярсцёнкі.

— А па якой жа руцэ, дзядзька, жанатыя посяць гэтыя пярсцёнкі? — спыталася маладая, і Клёцка спачатку быў разгубіўся, засаромеўся, неяк па-дзяцінаму ўсміхнуўся, пацісиуў плячыма і, шырока адкрыўшы рот, пачырванеў.

— Ды на... ды на...

— На правую, на правую руку, Марка, падзявай,— падказала Лаўрэніха.

Клёцка ўзрадаваўся, павесялеў і ўзяў за доўгія пальцы правую Люсьчыну руку. Пярсцёнак быў якраз, адзеўся лёгка. А Жэнькаў Клёцка доўга круціў на пальцы, а ён усё не мінаў костачку.

— Добра, дзядзька, я сам яго, можа, надзену пасля.

— Не, Лаўрэнавіч,— стаяў на сваім Клёцка.— Трэба зараз.

Ён стараўся — аж язык высалапіў — і нарэшце ўсё ж нейкім цудам уздзеў цесны пярсцёнак на тоўсты Жэнькаў палец.

— Дык я ж яго, дзядзька, цяпер не здзену.

— Саўку папросіш, той у кузні паможа,— пажартаваў нехта.

Але Клёцка нібыта і не чуў. Ён узяў маладых за рукі, злучыў іх у сваёй і пажадаў:

— Насіце іх доўга, а жывіце ў міры і дружбе яшчэ даўжэй...

— А мая ж ты дачушка,— нечакана заплакала раёўшчынская Аўдоля, матка маладой.— Ляліла ж я цябе, ляліла, а ты во і выпырхнула з нашага гняздзечка...

— Кінь ты, мама, не на той жа свет адпраўляеш,— супакойвала яе маладая.— Я ж буду часта прыходзіць да вас.

— Няхай сабе і часта, але ж ты не са мною ўжо жыць будзеш.

Убачыўшы, што заплакала і маладая, Лаўрэн пачаў супакойваць яе маці:

— Ну чаго ж ты, сваццbackground, плачаш? У нас жа ёй не горш, чым дома, будзе.— І сам крыкнуў: — Горка!

Пасля таго як маладыя пацалаваліся, Гарлач падсеў да стала, дзе гаварылі Мікіта, Дзямідзька і Манах у Белых Штанах. На краёк услона прысела і Ядоха. Мужчыны зноў загаварылі пра Настачку:

— Вы хоць бы, бабы, схадзілі праведалі парадзіху — можа, што памагчы ёй пада,— звярнуўся да жанчын Рагатун.

— А мы вось з вяселля і зойдзем,— адказала Ядоха.— Быццам без цябе, чорта гэтага, мы і не ведаем, што рабіць нада.

— Ты ўжо, Грышка, у наша бабскае дзела не лезь,— павярнуўшыся, падтрымала яе Мікіціха, расчырванелая цётка Юлька, якая сядзела аж перад самымі маладымі, спіною да размовы.

— А калі б цябе агонь не паліў! Такі ўжо загаваўіла. Ідзі ў двор! — аднекуль з'явілася побач Домна і зняла з сябе яшчэ адну хусту.— А то ўжо, бачу, цябе і Настачка зацікавіла.

— У мяне, Домна, з Настаю даўняя дружба: яшчэ з фронту,— адказаў Рагатун і павярнуўся да мужчын.— Асабліва пасля таго як пад Берлінам падаюць раптам мне кісет ад невядомай дзяўчыны, прыгожа так абмярэжаны,

а на ім і напісана: «Незнаёмаму салдату, які сама смела змагаецца за нашу Радзіму». Камандзіры палічылі, што самы смелы ў часці воін — гэта я. І аддалі мне кісет і табаку — у лісці яшчэ. Я глянуў на адрас і здзівіўся ад нечаканасці — нават цяжка было паверыць, што гэта так. Кісет вышыла і прыслала незнаёмаму салдату... хто вы думаеце? Наста, наша сябрынская Настачка. І хоць я не куру, але ж тут укруціў у газетку цэлы ліст і зацягнуўся. Добрая была табака. Відаць, Дзямідзька, твая лапушыстая, яшчэ даваенная. А дзе яе Наста знайшла — дык хто яе ведае.

Рагатун падчапіў лыжкаю зялёную памідорыну, укінуў яе ў рот і, жаваўшы, растлумачыў:

— Табаку тады хлопцы скурылі, а кісет і сёння на Украіне Грыцай беражэ — я, так і не навучыўшыся курыць, яму аддаў.

— А я табе кажу, што Дзямідзька спецыяльна для вяселля вось гэтую новую нагу зрабіў,— пачулася раптам з таго боку, дзе стаяла скрыня і дзе сядзеў дзед Сянчыла.

Сянчыла, прыхінуўшыся да сцяны, дзе высока на цвічку вісеў самаробны партызанскі пісталет, падораны Лаўрэну камандзірам брыгады, сядзеў і нібы спрачаўся з кім, хоць Шаўковіха, якая, здаецца, адна толькі слухала яго, і так згодна ківала галавою, падтаквала:

— Ой, ён, калі маладзейшы быў, любіў пафарсіць. Бывала, боты як нашмаруе...

Шаўковіха, у якой ужо, відаць, не было зусім зубоў, кусала нейкае цвёрдае любовае мяса, а Сянчыла ўсё падсоўваў ёй аладкі ў смятане, якія ў місе стаялі ля яго на скрыні, і ўсё крычаў:

— Шаўковіха, ты во ладкі еш — яны ж мякчэйшыя.

— А я і з мясам спраўлюся.

— Дык у цябе ж зубоў няма.

— Няхай сабе. А ў мяне ж дзясны заваёстрыліся і, як зубы, цяпер кусаюць.

У хату зайшоў Халадзёнак, які выходзіў, відаць, праветрыцца.

— Хадзі во сюды, Ігнатка, тут сядзеш,— ласкава паклікала яго Лаўрэніха.

— А не турбуйся, Хрысціна. Я знайду дзе прысесці. Табе і так сёння бегацьбы хапае.— І сеў на месца Мікіты, які на гэты час, зусім расшпіліўшы каўнер у кашулі, пайшоў з хаты. І, пагладжваючы рукою чорную бараду, адразу ж загаварыў да мужчын:

— Ну і ганяе, ну і ганяе...
— Хто ганяе? — спытаўся ў яго брат.
— Як хто? Хіба тут не чуваць? Туньцік Матруну сваю ганяе. Я доўга стаяў на вуліцы, слухаў. Крычаць, не прыведзі ты бог. А Векавуха — тая галосіць.
— Відаць, хлеб пячы вучыць яе,— хіхікнуў Клёцка, але Халадзёнак, нібы і не чуючы яго, казаў далей:
— Дык Туньцік жа спазнаў, што гэта яна «святое» пісьмо Веры напісала...
— І «сучка ты» ад сябе прыпісала,— перабіла яго Ядоха, скорагаворкаю пераказала мужчынам тое, што ведала сама, і дадала: — Таму і ганяе.
— Ну і цытра, слухайце, гэта Матруна,— азвалася Цэшкава.
— Сціхні ты, пляменніца. Гета, і Туньціха твая ладная цаца.
— Чаму ты, Дзямідзька, так думаеш?
— А ты вот, гета, Хадосся, глядзі сюды. Ну, падгульнула яна тут без Змітрака, ну, знайшла гетага бежанца. Ну, пагуляла — і ўсё. Дзяцей жа не прывяла, байструкоў, як тая Наста, таксама не нараджала. Знаку, гета, ніякага не відаць. Ну, дык што табе язык адсохніць сказаць, што, гета, нічога не было? І Змітраку б палягчэла — ён бы адразу супакоіўся. І самой бы лепей было.
Дзямідзька разгаварыўся. Браты Халадзёнкі сядзелі з двух бакоў, слухалі яго і толькі ківалі галовамі.
— Як вярнуўся Змітрок, усё да мяне заходзіў. Прыйдзіць, гета, пасядзім мы з ім, пагамонім. Ён і будзіць пытацца ў мяне: «Скажы мне, Дзямідзька, толькі чэсна скажы, ці гуляла тут мая Вера?..» Гета ж людзі такія, ледзь што — адразу ў вочы — цялёп! «А кінь ты, гета, пустое дзела,— кажу,— ні з кім яна не гуляла. Гета людзі во так во нагаворáць, наплявузгаюць. Не вер гетаму. А што пра таго дрыбінца брэшуць — не бяры ў галаву. Ну, памог ён зямлянку выкапаць, ну дык і што з таго? Твая ж Вера цябе аднаго любіць». Ну, ён і пойдзіць дадому — ідзець па вуліцы, як песні не пяець. Прыбяжыць у зямлянку і цалуе Верачку і мілуе, а тады і будзе пытаць: «Скажы мне, Верачка, нічога ў цябе з тым бежанцам, з тым дрыбінцам не было? Вунь і Дзямідзька кажыць, што не было». А яна, дурная, сваё — ціха так і гаворыць яму: «Было, Змітрачка, было...» І плачыць тады сама. А што б ёй, гета, язык адсох...
— Нешта ты, Дзямідзька, не тое гаворыш! — пераны-

піла яго Рагатуніха.— Дык што, ты хочаш, каб яна маніла Змітру? А што, калі яна не можа маніць?

— Можыць ці не можыць,— падтрымаў брыгадзіра Халадзёнак,— але калі нада — дык нада. Ну, а калі б і зманіла, дык гэта ж не на шкоду, а на добрае.

— Яно ж, гета, усё роўна Змітра нешта закапашыўся вельмі. Сёння вунь цэлы вянец новы на сваю хату наклаў. Ці не думае ён зноў у той канец перабірацца?

— Усё бывае ў чалавека. Бываюць і такія хвіліны, калі лішкі дабрыні робяць нас як сляпымі. Тады мы нават ворагу сваіму ўсё гатовы дараваць,— філасофстваваў Саўка.— Вораг нібы тваім сябрам робіцца тады... А тут жа сваё, роднае.

А Дзямідзька казаў далей:

— І пазаўтра каня ў мяне...

Дзямідзька не дагаварыў, асекся, сціх і, гледзячы ў парог, пачаў пра іншае:

— Дык ці знайшлі, Манах, тых злодзеяў, што ўчора на машынах у буліпскі сад прыязджалі?

Я зірнуў у парог. Там, ля дзвярэй, стаяў чыста паголены, святочна апрануты ў белую кашулю Тупіцік. Ён трымаў на руках Петрыка, туліў яго да сябе і нібы хацеў паказытаць ужо некалючай пасля галення шчакою. Зірнуў туды і Манах у Белых Штанах і, зразумеўшы, чаму брыгадзір так адразу перавёў размову на іншае, адказаў:

— Яно, Дзямідзька, якія там зладзеі. Дзеці пад яблыняю адною патапталіся, ды і ўсё...

— Праходзь, Змітра, праходзь бліжэй,— адразу заўважыла Тупіціка Лаўрэніха.— Во тут на покуце ёсць месца.

— І ты, Нупрэй, не саромейся — праходзь уперад,— запрасіў суседа Лаўрэн.

Тады ўсе заўважылі, што за рослым і плячыстым Тупіцікам сарамліва, ціха стаіць маленькі і шчуплепькі Нупрэй, Таццянчын муж,— яго амаль і не відаць.

— Сядай, Нупрэй, во сюды во,— адразу загаманілі з усіх бакоў госці, і многа ў якіх месцах пачалі адсоўвацца, цясніцца мужчыны, каб даць між сабою месца.

— Саўка, іграй «Сербіянку»,— крыкнуў са свае скрыні дзед Сянчыла і, згробшы абедзвюма рукамі Нупрэя, які праціснуўся ўжо да скрыні, пасадзіў яго побач з сабою.

Саўкі ж у хаце ўжо не было. Яго толькі што перад гэтым акружыла моладзь і павяла ў Матрунчыну хату, дзе сёння, відаць, да самай раніцы будзе грымець ігрышча.

— Ну і Нупрэй, ну і малец,— радаваўся Сянчыла і со-

ваў у руку Нупрэю падкусаную ўжо аладку — каб чалавек закусіў, бо яму адразу ж паднёс пехта самагонкі і той, выпіўшы яе, зморшчыўся.

— Гета ж, глядзі сюды, воўк у лесе здохніць: Анупрэй і на вяселле прыйшоў,— весела ўсміхнуўся Дзямідзька і праз увесь праход між сталамі падаў Нупрэю ў будучы запечак дзве дробныя зялёныя памідорыны ў лыжцы.

Шырока раскрыўшы свае тоўстыя губы, на ўвесь рот смяяўся Клёцка:

— Дык ты ўжо, Анупрэйка, як дамоў будзеш ісці, дык загадзя штаны распераражы і папружку, якою падперазаны, адразу падрыхтуй — каб Таццяпцы лягчэй цябе біць было.

— Не баюся я тваёй Таццяпкі. Няхай толькі паспрабуе, няхай зачэпіць,— храбрыцца дзядзька Нупрэй, і яго твар становіцца рашучы-рашучы — акурат як у Мапаха ў Белых Штапах, калі ён гаварыў мне: «А хадзі-тку ты, малец, сюды...»

— Глядзі, Нупрэй, дужа не храбрыся,— адвярнуўся ад стала Халадзёнак.— Твая Таццяпка лётае нешта сёння як укушаная.

— Як кошка, што сама сябе за хвост укусіць хоча,— зноў павярнуўшыся на праход, далучылася да мужчынскай гаворкі Мікіціха.

А Халадзёнак, нібы і не чуючы гэтага, казаў далей:

— То ні з таго ні з сяго схопіцца бялізну праць — прапік аж ляскоча ля Дзямідзькавага бохата. То раптам схопіцца ваду насіць — посіць і посіць, посіць і посіць. Цёмна, а яна ўсё роўна вёдрамі бразгоча. Ужо ўсе цабэркі, чыгункі, місы, нават кварты папалівала, ужо і наліваць няма куды, а яна ўсё посіць. Носіць, посіць, а тады ні з таго ні з сяго давай з бочак у копаўкі пераліваць, а пасля копаўкамі чыгункі даліваае...

— І ўсё на Лаўрэна брэшыць,— падказаў Клёцка.

— А чаго яна, дурная, брэшыць на мяне? — нібыта пытаючыся ў Нупрэя, загаварыў Лаўрэн.— Чаго брэшыць? Чаго на вяселле не прыйшла? Яна, можа, думае, што я ўкушу яе, ці што?

— Яна падазрае, што ты яе сына застрэліў,— растлумачыў дзядзька Нупрэй ісціну, якую і так ужо ўсе ў Сябрыні ведалі.

— Дык няхай не думае дужа многа. І чаго яна, сямігалоўка гэта, у разбіты лапаць звоніць? — апраўдваўся Лаўрэн.— Я ж цясляр і ў партызанах на зямлянках быў спец. Усе зямлянкі ў атрадзе ставіў я. Як зраблю, дык яна

і цёпленькая, і, хоць які лівень ільне, не цячэ, і, хоць які мароз, не прамярзае. А тут камандзір, праўда, пазваў быў мяне ў сваю зямлянку і кажа: «Збірайся, Лаўрэп, на заданне».— «Куды, калі не сакрэт?» — пытаюся. «У сваю вёску поўдзеш,— гаворыць.— Нада там аднаго гада забраць». Як даведаўся я, што гэта ваш, Нупрэй, сынок, я адразу ў хамут ударыў: я, маўляў, спец па зямлянках, суседа ўзяць не змагу. А хто прыходзіў — не ведаю. Толькі, відаць, усё ж свой, недалёкі...

— І па кім яна, Нупрэй, такая злая ўдалася, твая Тацццянка? Бацька ж, бывала, такі жартаўнік, такі вясёлы, такі бядак быў. Усё па кусках хадзіў. А яе, відаць, багацце сапсавала...

— Горка! — не гледзячы нават у той бок, дзе былі маладыя, крыкнуў дзед Сяпчыла, але яго ніхто не падтрымаў.

Калі ён і сам зірнуў на покут, зразумеў чаму — маладых за сталом ужо не было.

— Пайшлі яны, Пётра, у Змітракову хату — там жа ігрышча,— растлумачыла яму Лаўрэніха і, зірнуўшы на Туньціка, направілася: — У Матрунчыну хату пайшлі дзеці.

Чыясьці цёплая рука лёгка апусцілася на маё плячо — нібы нячутна скружыў жоўты асенні ліст. Я ўзняў галаву і ўбачыў над сабою твар Бусліхі — відаць, педсавет ужо скончыўся.

— А што на вяселлі робяць вучні? — раззлавана зашаптала яна як не ў самае маё вуха. Бусліха рабіла выгляд, што ласкава ўсміхаецца, і гаварыла вельмі ціха, каб не чуваць было падпітым гасцям.

Я таксама, каб не падпімаць сумятні, адразу сігануў у дзверы. Бег так хутка, што ў сенцах, у цемнаце, кагосьці ледзь не збіў з ног — той паспеў ухапіцца за вушак. Ля сенцаў нехта даказваў:

— А я табе кажу, ён знарок для вяселля новую нагу зрабіў...

На вуліцы, асабліва пасля святла дзвюх лямпаў, што гарэлі ў Лаўрэнавай хаце, было цёмна — поўня ж яшчэ пакуль не ўзышла.

У хаце Матруны Векавухі заліваўся гармонік і трохі нязладжана грукалі, нібы рассыпаючыся па падлозе, абцасы — гэта драбілі танцоры. Перад хатаю нехта гучна гаварыў — дзядзькі спрачаліся. Неўзабаве яны счапіліся, замацюкаліся. Калі я падбег, Мікіта сядзеў ужо верхам на Дзямідзьку, трымаў таго за рукі і не сваім голасам крычаў:

— Ратуйце, мяне Дзямідзька забівае!

Аднекуль з цемрадзі вырас Рагатун:

— Дзе тут хто каго забівае?

Убачыўшы седака на Дзямідзьку, ён адною рукою ўзяў Мікіту за каўнер, лёгенька, нібы пушынку, усхапіў яго і, зняўшы з брыгадзіра, пасадзіў побач з Дзямідзькам у пыл, зарагатаў:

— Канешне — напу яешпя: яго забіваюць. А сам сядзіць наверсе і Дзямідзьку за горла трымае.

— А чаго ён як дошкі рэзаць, дык мяне ўнізе ставіць? Вока толькі запілавіпіў...

— А найшоў бы ты, Мікіта, са сваім вокам,— абтрасаючы пыл, сказаў Дзямідзька.— Брата майго пасадзіў, а цяпер і мяне біць...

Дзямідзька не ведаў, хто данёс на яго брата. І, паколькі яны былі тады толькі ўдвух з Мікітам, недзе па дне душы разам з крыўдаю на брата засталася злосць і непрыязнь да Мікіты, які — так здавалася брыгадзіру — усё ж не вытрымаў і падаслаў міліцыянера. І, хоць Мікіта колькі ўжо даказваў, што перад братам яго ані ў чым не вінаваты, Дзямідзька, дзе толькі выпіваў з Мікітам, прыставаў: «Ну, скажы шчыра, усё ж ты міліцыянера да Мікалая падаслаў?»

Не слухаючы Дзямідзьку, Мікіта, у якога асаблівай злосці не было — пра зацярушанае вока ён забыўся хутка,— заспяваў:

> А пара ўжо, госцейкі, дадому,
> А паслі конікі салому...

Рагатун усміхнуўся:

— У цябе, Мікіта, як у таго хлапчука — пад носам сенакос, а ў галаве яшчэ і не арана...

Рагатун распраўляў сваёй адною рукою гімнасцёрку, зноў затыкаў яе пад шырокі афіцэрскі рэмень.

У цемнаце яго рука здавалася яшчэ большаю: яе, нібыта пальчатка, густа ахінала цемрыва — быццам сама ноч наматалася на кулак.

Моцная рука ў дзядзькі Грышкі — у аднарукіх яны заўсёды моцныя, бо з тою работаю, якая звычайна размяркоўваецца на дзве рукі, у іх павінна спраўляцца адна. І мне ўспомнілася, як у самы голад, калі нам зусім не было чаго есці і калі ў Раёўшчыне згарэў свіран з пшаніцаю, дзядзька Грышка вось гэтаю адною рукою прынёс нам адтуль ладную торбу чорнай, абгарэлай пшаніцы, з якой

і хлеб тады дужа ж ужо пах затхлым дымам. А яшчэ перад гэтым, калі размяркоўвалі нямецкіх трафейных кароў, ён з ласкаваю ўсмешкаю, таксама адною рукою моцна трымаючы повад, прывёў на наш двор вялізную чорную карову, хоць у яго самога не было на той час не толькі малака, але і хлеба. З-за яе велічыні мы празвалі карову Фураю, хоць яна давала малака вельмі мала — як каза. Фура неўзабаве здохла, праглынуўшы вялікі ржавы цвік...

У хаце Матруны Векавухі было ўжо душна, як і ў Лаўрэнавай.

Дзядзька Саўка, схіліўшы галаву на гармонік, прыклаўшы вуха як не да мяхоў — так і здаецца, што яны могуць ушчыкнуць самыя мочкі,— шырока разводзіў рукі: іграў вальс.

Весела кружыўся з Паўлінаю Раманаўнаю лётчык — страсянуўшы сваім кучаравым чубам, ён раптоўна, на поўным ходу, спыняўся, тупнуўшы гучна хромавым ботам, сціснутым у гармонік, ад чаго ён здаваўся намнога карацейшы, зноў, амаль не прыстояўшы, пачынаў круціцца ў другі бок — таксама весела і хутка.

Трохі павольней, больш плаўна, кружыліся ў вальсе Мікітаў Толік і Лэся. Яны не глядзелі адно аднаму ў вочы і, калі позіркі выпадкова сустракаліся, няёміліся, чырванелі і спяшаліся хутчэй адвесці іх убок. Але нягледзячы на гэтую сарамлівую цноту, танцавалі прыгожа, люба. Лэся нібы адчувала адразу, куды павядзе кавалер, і таму яна ішла якраз у лад — заўсёды туды, куды хацеў Толік.

Весела смеючыся, кружыліся хутчэй за ўсіх маладыя: Люсьчын вэлюм мільгаў то тут, то там — нават дзіўна было, што ніхто пакуль не наступіў на яго.

Дуня Цэшкава, пасадзіўшы Шаўковісе ў прыпол Міколку, узяла за руку раёўшчынскага Кольку і павяла яго ў круг. Там сама стала за «мальца» і круціла Кольку толькі ў адзін бок, бо ў другі не ўмела. Скокі ў іх не выходзілі, бо ў другі бок не ўмела яна, а ў гэты — не зусім умеў Колька.

Ядоха, якая таксама пакінула ўжо застолле, схапіла бабу Домну і, смеючыся, кружыла яе недзе недалёка ля Саўкі, не асмельваючыся ісці ў круг — бабульчыны хусты то размотваліся, то замотваліся, а сама баба Домна, заплюшчыўшы вочы, крычала на Ядоху:

— Пусці, я табе кажу, зладзейка! Пусці, галава кружыцца. Айё, і мне, як той Шаўковісе, стала млосна.

А ў самым крузе (і як ён толькі туды ўтачыўся), узяўшыся адною рукою за рэмень, адзін, без пары, заўзята кружыўся Рагатун.

Большыя хлопцы, якія тапталіся ў дзвярах, бо яшчэ не ўмелі танцаваць так, каб выйсці ў круг, стаялі і абгаворвалі іншых:

— Глядзіце, як Цэшкава Кольку раёўшчынскага ашчаперыла.

— Як і незамужняя ўсё роўна.

— А якая яна замужняя — той муж, відаць, Палюгану сена косіць.

— А яна ж ужо даўно на Кольку, як кот на тое сала, глядзіць.

— І аблізваецца толькі.

— Дык яна з ім і да замужжа хадзіла.

— А тады Кольку па баку.

— Ну, я з ёй зараз бы і скакаць не пайшоў.

— А зірніце, як Мікітаў Толік шаволіцца.

— Глыбока арэ гэты прыплужнік.

— А што, бачыце, як ён добра танцуе.

— Няхай дужа гэты Мікіцёнак не носіцца, а то я яму хутка яго хвалькі выб'ю.

Гэта, цыркнуўшы праз зубы і паправіўшы завязаны палец, сказаў Гаціла. Ён злуе на Толіка — той так добра танцуе, а ў Гацілы, колькі ні вучыўся,— нічога не атрымліваецца. Я і сам помню, як вучыла яго скакаць Цэшкава — толькі ў той бок, у які ўмее сама. Яна падыгрывала яму пад язык: «Тумба — баба, тумба — дзед», а Гаціла пяўмела нерастаўляў ногі, якія не згіналіся ў каленях і здаваліся нейкімі суцэльнымі, як слупы, і кружыўся дзіўна, рыўкамі. Адным словам, толькі «тумба-баба» і выходзіла. А Мікітаў Толік скакаў добра, і таму Гаціла не любіў хадзіць на ігрышчы — Лэся, чарнавокая ўкраінка Лэся, якая таксама танцавала лёгка, на дамскі вальс заўсёды запрашала «гэтага Мікіцёнка».

А Лэся яму, відаць, надабалася, бо Гаціла чапаў яе ўсюды, дзе толькі сустракаў, і ўсюды браўся з ёю гаварыць. Жартаваў Гаціла, жартавала з ім і Лэся, але вось так, як гэта бывае, калі сустракаюцца іх з Толікам позіркі, ніколі пры Гацілу не чырванела...

З кута, адтуль, дзе сядзіць Саўка, да дзвярэй праціскаецца Лена. Я ўжо даўно ўбачыў, што яна тут, на ігрышчы, круцілася з Алькаю — усё ж Чуеш не ўпільнаваў дачкі. Пакінуўшы Альку адну, Лена даросла прайшла побач і

нават не зірнула на мяне — толькі сукенка прашумела. Мне быццам нехта шапнуў: ідзі следам. І я праз якую хвіліну, каб асабліва не відно было, што бегаю за дзеўкаю, выйшаў з хаты, шмыгануў у сенцах каля Мікіты і Дзямідзькі, якія ўжо зноў, нібыта нічога і не здарылася, мірна размаўлялі і смяяліся. У сенцах, ля самых дзвярэй на вуліцу, мяне схапіў за руку Рагатун, які немаведама як выкруціўся з круга:

— Гэта ты, Ясь?

— Я, дзядзька Грышка.

— Вось ты мяне цяпер у вочы дзядзькам Грышкам завеш, а зачы, вядома ж, Гарлачом клічаш... Ці Рагатуном, можа?

Сапраўды ў дзядзькі Грышкі было дзве мянушкі, і як каму хацелася, так той і называў яго.

— Што вы, дзядзька, не,— няўпэўнена мапіў я, бо за вочы, як і ўсе, таксама зваў яго па мянушках.

Дзядзька Грышка быў на добрым падпітку і таму хацеў, усё не адпускаючы мяне, разабрацца ў гэтым, нібыта дужа важным для яго зараз пытанні. Я ж спяшаўся вырвацца ад яго. Калі Рагатун адпусціў мяне, адразу ж вылецеў з сенцаў.

На вуліцы стаяла насцярожаная сціш.

Нарэшце недзе за Булінам, з-за далёкага і шэрага сасонніку, на неба ўскацілася поўня. І ў яе святле неяк адразу па-іншаму засвяціліся дрэвы, хаты, сама вуліца.

Выбегшы, ледзь не стукнуўся ў Ленку — яна стаяла ля самага ганка і па-даросламу, нібы толькі што адскакала польку ў крузе, абмахвалася хустачкаю, ветрылася, адцягваючы кароткія, пышныя, сабраныя ў зборку ля гумкі, рукавы кофтачкі.

Лена, убачыўшы мяне, нічога не сказала, а паціху пайшла да вуліцы — туды, дзе рос вялікі клён, пад якім стаяла лавачка. Я моўчкі ішоў услед і сам сябе нечакана лавіў на думцы, што сёння мне чамусьці зноў захацелася пацалавацца. З Ленкаю. Нават здавалася, што сёння гэта будзе зусім не так, як тады, зімою.

Лена дайшла да клёна і спынілася. Пачакала, пакуль падыду я. Потым асцярожна ўзяла маю руку ў сваю і спыталася:

— Ці баліць, Ясічак? — і, зірнуўшы на мяне, дадала: — А ведаеш, Волечка такое маме наплявузгала.

— І што мама?

— Нічога.

Я стаяў зусім блізка — нават адчуваў, як пахне яе сушаная на ветры кофтачка, якую яна памыла, відаць, перад вяселлем, бачыў, як строга ў месячным святле бялее яе твар. Я паклаў руку Лене на плячо, і мае вочы самі сабою павалі пачалі набліжацца да яе вачэй...

Мне здалося, што і яе вочы спяшаліся насустрач маім...

Але тут на ганку весела засмяяліся маладыя. Я хуценька зняў руку, Лена выпусціла са сваёй далоні мае пальцы, і нашы вочы пачалі здаляцца — усё далей, далей і далей...

З вясёлым смехам прайшлі каля нас раёўшчынская Люська і сябрыньскі Жэнька. Убачыўшы нас, Жэнька шапнуў Люсьцы:

— Глядзі ты, новае вяселле завязваецца.

І весела засмяяўся. Люсьчын смех далучыўся да яго. Так бесклапотна, смеючыся, яны пайшлі па Таццянчынай сцежцы, па халоднай і буйной расе, якая, відаць, асыпалася на ногі.

Белая святочная сукенка маладой ужо злілася з асветленым поўняю наваколлем, і толькі чорны касцюм маладога доўга яшчэ, як прывід, як здань, чарнеўся ўдалечыні — нават здавалася, што ідзе Жэнька адзін, без нявесты.

Яны ішлі туды, дзе, выбегшы з лесу, стаяла на ўзлессі адзінокая рабініна...

Мусіць, надакучыла маладым сядзець за прапахлым гарэлкаю сталом, слухаць шумлівую гаворку захмялелых гасцей і адгукацца на іх настойлівыя «горка!», таўхацца ў цесным крузе Матрунчынай хаты — ім захацелася пабыць удваіх: можа, пагаварыць, а можа, проста памаўчаць разам.

Калі яны адышліся, я зноў, нясмела і сарамліва, хацеў паўтарыць тое, што ледзь не зблізіла нашы з Ленкаю вочы. Але зараз ужо ўсё было не так. І ўсё ж нашы вочы зноў наблізіліся, а калі я ўжо, здаецца, нават адчуў блізкую, не знаёмую яшчэ цеплыню Ленчыных вуснаў, ля нас, як выбух, пачулася:

— Што робіце?!

Я адхінуўся і ўбачыў, што, трошкі адбегшыся (каб я не дагнаў яго), стаіць на вуліцы Клёцка і спявае сваю старую песню:

— Ленчына шпадніча! Ленчына шпадніча!..

Там жа, побач з Клёцкам, рагочуць іншыя хлопцы. Ленка раптоўна з такой ціхай і ласкавай зноў зрабі-

лася злою, насмешлівою, калючаю, як рысь, кінулася на мяне, сарвала з галавы маю шапку і закінула яе ў агарод.

А потым адбеглася туды, дзе стаялі хлопцы, і пачала дражніцца:

— Лысега, лысега, лысега...

Я, прыкрыўшы рукамі галаву (мне здавалася, што ўсе бачаць, як месячнае святло пераліваецца на маёй учора пастрыжанай галаве), палез праз плот у Векавухін гародчык, які, шапаткі і асветлены поўняю, здаваўся нейкім страшнавата чужым і незнаёмым. І пакуль пад яблынямі, у пасохлым бульбоўніку, я шукаў шапку, Ленка ўсё яшчэ стаяла на вуліцы і дражнілася — нібыта маніла свайго быську, малое цяля, якое так смешна бадзецца тупым і бязрогім ілбом:

— Лыська, лыська, лыська... Ясюля, ясюля, ясюк...

Мне было да болю крыўдна, і я думаў сабе: «Ну, ладна, як толькі знайду шапку — дагоню і пацягаю, наругу, Мікітаву дачку, за касу». То ж трэба так дражніцца, ды яшчэ перад хлопцамі!

Але калі вылез з агарода, Ленкі на вуліцы не было — яе дагнала Чуешава Алька, і яны, расказваючы, як адна садрала шапку, а другая ўкусіла Клёцку за руку, пабеглі дадому. Не было на вуліцы і хлопцаў. Толькі за вёскаю чуваць быў сцішаны Клёцкаў голас — відаць, цікаўны і настырны Хведзя па Таццянчынай сцежцы пабег услед за маладымі: паглядзець, куды яны пойдуць. Пад клёнам, на тым месцы, дзе толькі што стаялі мы з Ленаю, быў ужо Рагатуноў Раман з Клаваю — яны глядзелі на мяне і, смеючыся, шапталіся.

— Што, уцякла Лена? — спыталася Клава і зарагатала.

Ля ганка, асветленыя плямкаю святла, якая з хаты праз цёмныя сенцы, праз парасчыняныя дзверы прабівалася на двор і нібы памагала свяціць поўні, стаялі Халадзёнак з братам. Да іх ужо сыходзіў з высокага Матрунчынага ганка Хадосчын Мацвей. Халадзёнак гаварыў ціха, але ж увечары і самая ціхая гаворка чуваць далёка.

— Не кажы, Малах, яно ж усякае можа быць. Хоць гэты дурны Клёцка і гаворыць абы-што...

— Можа-то можа, але ж...

— А я вот Сымонавага хлопца кожны дзень з газэткамі чакаю, ля хаты сваёй пераймаю. А можа, наш Лёшка недзе жывы, думаю. А можа, дзе ў палоне да гэтага быў, а можа, калі абзавецца, пісьмо напіша.

— Дык ты ж, Ігнат, пахавальную паперку атрымаў, там ясна напісана, што Лёшка загінуў смерцю харобрых.

— Няхай сабе... Вунь і Саўкава Таццяна такую палучыла. А Саўка вунь і прыйшоў. З таго свету, лічы, вярнуўся...

Дык вось чаму Халадзёнак не дае мне штодзень прахоху і заўсёды пераймае ля свае хаты! Я адчуваў, як той страх, што пачынаў халадаць недзе ля сэрца, калі я сустракаўся з дзядзькам Ігнатам, паступова мякчэў, і ўжо цяпер мне зусім не было боязна ні самога Халадзёнка, ні яго брата — хацелася нават падысці, пацягнуць дзядзьку, доўгага і худога, за рукаў і сказаць:

— Дзядзька, а я цяпер кожны дзень буду да вас заходзіць. Буду казаць, ці ёсць вам ад Лёшкі пісьмо...

Да братоў падышоў ужо Мацвей.

Пакруціўшыся ля ганка, я зноў пайшоў у хату, дзе, аж заходзячыся, аж якочучы ад задавальнення, весялілася Саўкава хромка.

Саўка іграў хуткую польку. У хаце нічога не змянілася.

Як і да гэтага, узяўшыся адзінаю рукою за рэмень, у крузе скакаў Гарлач — толькі цяпер ужо ён, праўда, кружыўся больш хутка: а як жа, полька не вальс!

Весела прыстукваў абцасамі лётчык — нібыта яны з Паўлінаю Раманаўнаю і не выходзілі з круга.

Таксама хораша скакалі Мікітаў Толік і Лэся.

Усё крыжыла Кольку ў адзін бок Цэшкава Дуня. Усё сядзеў у Шаўковіхі на каленях Дунін Міколка.

Усё яшчэ, папраўляючы завязаны палец, злаваўся на Мікіцёнка Гаціла, а хлопцы абгаворвалі тых, хто скача.

Мірна, як і раней, гаварылі ў сенцах Мікіта з Дзямідзькам.

Толькі зараз ужо ў крузе не хапала маладых. Падумалася, як бы мільгаў, нібы белае крыло цішыні, у гэтым хуткім танцы Люсьчын вэлюм! У крузе якраз не хапала іхняга вясёлага смеху...

Недзе за вёскаю грымнуў прыглушаны, як адыходзячы гром, выбух.

— Гэта, відаць, Яўсей са сваёй «кацюшы» чатырохствольнай бабахнуў,— засмяяўся Клёцка.

— Ды не, гэта нехта толам рыбу глушыць,— выказаў сваю здагадку Дзямідзька, які, грукаючы нагою, увайшоў у хату.

— А хто б гэта мог быць? — усумніўся Мікіта, які за

Дзямідзькам уціснуўся ў дзверы.— Усе ж, здаецца, сёння тут, на вяселлі.

— Можа, ленькаўцы ці з Лапысіцы хто...

Саўка пасля выбуху спыніўся на якую пару хвілін, даў крыху перадыхнуць гармоніку, а пасля зайграў з новаю сілаю. Ён іграў усё хутчэй і хутчэй, усё паскараючы і паскараючы танец. Усё хутчэй і хутчэй круціліся танцоры: некаторыя ўжо выбіліся з рытму, музыка іх абагнала, і яны неўпапад тупалі пасля яе, а некаторыя, здавалася, аж ляталі па крузе, ледзь-ледзь крапаючыся масніц,— абы не адстаць ад музыкі. Калі Саўка, як заўсёды, рэзка абарваў танец, амаль усе, узрадаваўшыся, што полька нарэшце скончылася, тармазілі на месцы і, баючыся ўпасці, пакуль што стаялі ў крузе і аддыхваліся — чакалі, калі перастануць кружыцца галовы...

Саўка махаў пальцамі прастрэленай рукі — каб хутчэй адыходзілі ад такой імклівай ігры...

І раптам у нязвыклую пасля танца цішыню з лямантам убег Клёцка і, спыніўшыся пасярод круга, плачучы, нешта хацеў сказаць:

— Там... там...

— Што — там? — збялеўшы, пачаў пабліжацца да хлопчыка Рагатун.

— Там... там...— усё ніяк не ўдавалася Клёцку праглынуць слёзы.— Там... маладыя... на міне...

У хаце стала зусім ціха.

— Ш-т-о-о-о?! — нема зароў у гэтай цішыні Саўка і, устаўшы з табурэткі, як сляпы, выставіўшы ўперад рукі, пайшоў на Клёцку, але ж невідушчымі, слепавата звужанымі вачыма глядзеў Саўка не на хлопца, а некуды глыбей, далей — за Клёцку: відаць, туды, дзе толькі што грымнуў выбух. Гармонік, што вісеў на адным плячы, расцягнуўся як не да самае падлогі і біў дзядзьку Саўку па нагах, але ён нібыта гэтага і не чуў. Выставіўшы ўперад рукі, павольна, натыкаючыся на людзей, ішоў, ледзь пераstaўляючы пацяжэлыя ногі — быццам ён праз сцены, праз хату, праз вуліцу, праз лес бачыў таго, хто паставіў гэтую жахлівую міну, і ішоў яго задушыць...

Загаласілі бабы. Заплакаў Дуньчын Міколка. Глуха загаманілі мужчыны. Яны, нібы спадзеючыся на нешта, настойліва распытвалі Хведзю:

— Можа, не падарваліся? Можа, іх толькі параніла? А можа, гэта табе здалося?

Ікаўка ў Клёцкі прайшла, і ён адказваў:

— Не, не здалося. Люсьцы захацелася рабіны наламаць. Жэнька падняў яе, а Люська ламала гронкі і смяялася. І як толькі Жэнька паставіў яе на зямлю, побач з Люськаю, там, дзе яны былі, толькі полымя ўверх шуганула. Выбуху я не чуў...

— А пад якой, гета, рабінаю? Пад той, што на самым узлеску стаіць? — дапытваўся Дзямідзька.

— Ага...

— Ва-ся-пок забіў дзяцей. Ва-ся-пок,— расцяжна і ўпэўнена закрычаў Мікіта.— Гэта ж яго міна, якую ён з немцамі некалі на партызанаў ставіў. Бо рабініна — такі добры назіральны пункт для партызан была. Выбежыш з лесу, перабяжыш да яе, і ўсё відаць кругом, дзе хто ідзе, дзе хто едзе.

— Во, крывапівец! — галасіла Шаўковіха.— І самога тут няма, а людзей усё забівае.

— Нічога, цётка, нічога. Мы гэтага клапа з яго шчыліны дастанем,— супакойваў яе дзядзька Грышка.— Знойдзем крывапіўца. І з Карэліі яго выкалупаем.

Хата апусцела. Усе — і бабы, галосячы, і мужчыны, гамонячы,— па цеснай Тацяпчынай сцежцы беглі туды, на ўзлесак, дзе, выйшаўшы з лесу, як прывід, у месячным святле ціха стаяла страшная, чорная рабініна і дзе ўжо, чуваць было, роспачна галасіла Лаўрэніха...

Прачнуўшыся і пачуўшы, што ў вёсцы пасля нейкага выбуху крычаць, плачуць і гучна гавораць, спахапіўся начны вартаўнік дзед Шэпка і наспешна, не прыпыняючыся, нібыта на пажар, забаўкаў па гільзе ад снарада, якая вісела на бярозе ля самай Шэпкавай хаты і замянята звон — баў! баў! баў! Гэты звон трывожна запаўняў наваколле, шырыўся і расціскаўся, як спружына, разыходзіўся кругамі, падмінаючы пад сябе і Раёўшчыну, і Буліна, і Новыя Вербы, і іншыя блізкія вёскі, дзе таксама, відаць, павыходзілі на вуліцы людзі, гаманілі там, спалохана пытаючыся адзін у аднаго:

— Што гарыць? Дзе гарыць?

На вуліцы мяне дагнала Лена. Спрасоння яна дрыжала, калацілася і ўсё спрабавала моцна сціснуць зубы, каб яны не ляскалі,— Лене было холадна, ці то ад золкага пасля цёплай хаты вечара, ці то ад страху.

— Што, Ясічак, тут было? — спыталася яна.

— Жэньку і Люську забіла...

Яе дрыжыкі перадаліся і мне. Зараз ужо закалаціла мяне, і я таксама да болю сціснуў зубы, але яны ўсё роўна гучна стукалі.

Лена ўчапілася за маю руку, мацней прыхінулася да майго пляча — нібыта, малеча, хацела абараніць мяне, засцерагчы, засланіць ад чагосьці вось такога страшнага і недарэчнага, як гэтая смерць маладых.

## ПАСЛОЎЕ

І вось, хоць прайшло ўжо столькі часу з таго пасляваеннага вяселля ў верасні, хоць я ўжо амаль і не помню таго хлапчука Яську, з кім на працягу ўсёй гэтай аповесці ішоў побач (яму быў не лішні сякі-такі мой вопыт, а мне так трэба была яго непасрэднасць, яшчэ не сапсаваная нічым),— дык вось, хоць прайшло столькі часу, мяне ўсё яшчэ, здараецца, будзіць вось гэты выбух, і я, прачнуўшыся, доўга ляжу і ўспамінаю вайну, вяселле, маладых, ляжу і думаю, ад чаго ж тады хацела мяне ўберагчы Лена? Ад страху? Ад міны? Ад выбуху? Ад смерці? А можа, ад самой вайны, якая звычайна не канчаецца ў Дзень Перамогі і не ўкладаецца нават у такія шырокія і здоўжаныя ад пакут берагі.

*1973 г.*

# УСЕ МЫ З ХАТ

## 1. ЖУРАВЫ НАД ЖЫЦЬКАВАМ,

***альбо знаёмства з вясковымі навінамі і некаторымі людзьмі — з Кагадзеем, Моцяй Прутнёвай, Шыбекавымі генераламі і іншымі***

Чатырнаццатага жніўня, чапляючыся крыллем за нізкія хмары, над самым Жыцькавам ляцелі ў вырай журавы.

Колькі дзён перад гэтым, не зважаючы на блізкую восень, так грэла і пякло паніжэлае ў небе сонца, што ў пыльнай і ломкай, высушанай да звону цішыні было чуваць, як шапоча вусатым коласам спалавелае ячменнае поле, якое спела і шорстка ваколіцца ля жыцькаўскіх хат. Потым з поўначы, аднекуль з-пад Азярычына, падзьмуў густы і стылы восеньскі вецер, неяк адразу напаўзлі кудзелістыя, брудныя, нізкія і хоць пакуль што яшчэ без дажджу, але цяжкія ўжо хмары — яны, як рыба на нераст, імкліва цягнулі самі сябе волакам з-за бору, аж раздзіраючы аб верхавіны свае набраклыя вільгаццю нехцяры.

Але дажджу пакуль не было. Толькі так зябка пахаладала, што жыцькаўскія госці, якія кожнае лета прыязджаюць сюды на свежае паветра, сонца і цішыню, паўсцягвалі на загарэлыя, карычневыя, як жалуды, спіны старыя падопранкі, падраныя ватоўкі, палапленыя світкі — словам, усё цёплае, што было ў хатах,— і, смешнаватыя ў гэтай сваёй няўвыклай і дзіўнай вопратцы, насцярожана ўглядаліся ў журботлівы жураўліны клін.

Над Жыцькавам ляцелі ў вырай журавы. Яны спакойна, не спяшаючыся, махалі ў воблаках крыллем, на якое, здавалася, як павуціна, намотвалася прадкое хмаравінне, махалі, нібы развітваючыся з усім, што бачылі зверху, і

нейк задумліва, нават крыху сумнавата, трубілі: яно і праўда, каму гэта лёгка, хоць і на нейкі час, развітвацца з радзімаю! За імі ўкрылілася ладная чародка нейкіх маленькіх птушачак, якія хапатліва, паспешліва, нібыта баючыся ўпасці на зямлю, трусілі крыльцамі, білі імі па пругкім паветры: так дзеці, якія не ўмеюць асабліва плаваць, спяшаюцца на глыбокім месцы і каламуцяць са страху рукамі і нагамі ваду — толькі пыркі ляцяць ва ўсе бакі. Але, нягледзячы на сваю хапатлівасць, якая, здавалася, замінала ім, птушачкі не адставалі ад жураваоў. Яны і самі, зразумела, слухаючыся свайго інстынкту, знайшлі б тую нялёгкую дарогу ў вырай, але з журавамі надзейней — бач, як упэўнена і спакойна махаюць яны крыллем...

Жураўліны ключ то крыху звужаўся, то, расшыраючыся, нават заломваўся даўжэйшым канцом, але птушкі, нібыта яны бачылі сябе з зямлі, адразу ж выпрамляліся, выроўнівалі яго, не перастройваючыся нават, і гэты першы вырай шастаў крыллем над хатамі, кустамі, ячменным полем увесь час прыгожа і настойліва — важаком наперад.

Расстанная жураўліная песня, як камячок тугі, качалася ў зашэрхлых ад доўгага лёту птушыных горлах: удавала нават, што яна перадаецца па ключу — з дзюбы ў дзюбу,— а потым з лёгкім пошумам крылаў, падобным на ціхі бязветраны лістапад, павольна і нячутна ападае на паднятыя ўгору твары.

— Глядзі ты, паляцелі,— апускалі галовы жыцькаўскія госці, нібыта, як лёгкі пыл, страсалі з твару, з вачэй, з валасоў і гэты пошум крылаў, і гэты тужлівы спеў жураўлёў.

— І чаго іх ухапіла,— падтрымлівалі гасцей і самі жыцькаўцы, усё яшчэ ўслухоўваючыся ў гэты ранні, а таму і нечаканы вырай.— Яшчэ ж лета... А цяпер, ліха на яго, і снегу чакай хутка, калі журавы паляцелі.

Мы сядзелі ля хаты на ўтравелым грудку зямлі, які некалі быў бруствeрам і застаўся яшчэ ад самае вайны. Сядзелі і маўкліва праводзілі вачыма жураўліны кліп, які паступова хаваўся за Прутнёвы бярозы.

Побач, недалёка — выцягні руку — дастанеш,— лапушыста буяў дзед.

Андрэй вынес вядро з вадою, каб спаласнуцца пасля сена, якое ён перакладаў на хаце, вызваляючы месца для атавы, але распранацца да пояса, як гэта было раней, у спякотныя дні, не адважыўся, не зняў нават фуфайкі, а

толькі шырока расшпіліў каўнер сарочкі, каб апроч твару спаласнуць яшчэ і шыю.

— Ну што, журавы паляцелі, хутка і вам у дарогу збірацца трэба? Можа, ужо таксама на ад'езд мыешся? — Загледзеўшыся на жураvoў, ніхто з нас не заўважыў, як з-за таполі на нашу сцежачку, якая з вясны, пакуль не з'едуцца госці, аж зелянее ад травы, а за лета ладна вытоптваецца, выйшаў Цімоха Кагадзей. Ён падышоў зусім блізка, стаў побач, але прысесці ля нас, колькі ні прасілі, не схацеў. Стаяў, расшпіліўшы паддзёўку, з-пад якой відаць была цёмна-зялёная, падпяразаная шырокім рэменем афіцэрская гімнасцёрка, што нізка закрывала цёмна-сіняе дыяганалевае галіфэ.

— Не, Цімафей Іванавіч, мы яшчэ не ад'язджаем,— адказаў Андрэй, ніжэй нагнуўшыся над травою і ўсё фыркаючы ад вады, якую ліў яму сын — на шыю, а больш на фуфайку, на валасы...

— Пабудзеце яшчэ? — перапытаў Цімоха.— А то вунь я нашага Маласая сустрэў. Той паехаў у Азярычына на вакзал — паглядзець, калі цягнік на яго Станіславаў ідзе. Ды вунь, па-моймму, і Шыбекавы генералы заварушыліся...

— А ты ўжо сам дзе быў? — пацікавілася мая цешча, Андрэева маці, якую і я ўжо колькі гадоў называю так, як і ён; маці тут жа, на ўслоніку, што стаяў пад акном і быў вынесены з хаты яшчэ ў самую спякоту, абірала на вячэру бульбу.— Цябе ж з тваіх кустоў і трактарам, бывае, не выцягнуць.

Маці нагнулася, каб узяць бульбіну, адслапілася ад сценкі і адкрыла надпіс: «Тут жывуць Петрусі» — яго намалявалі нашы хлапчукі між двух акон крэйдаю.

— У мяне цяпер, Надзёжа, ёсць куды хадзіць,— стрымана ўсміхнуўся Цімоха, не асабліва адкрываючы рот, дзе цямнелася ладная дзірка — зверху не хапала двух ці трох пярэдніх зубоў.— Вунь жа малая паехала ў блізкі свет, і ні слыху, ні почуту...

— Дык ты, можа, па сваю дзявулю ісці збіраешся пехатою? — пажартавала маці.

— Ісці-то не дойдзеш — далёка. Але вось у Грукава мы з Волькаю наперамену ходзім: паштальёнку чакаем ля магазіна.

Паштальёнка наяўлялася ў наша Жыцькава толькі адзін, пэўна, раз у месяц — калі старым была пенсія. А так яна прыносіла пошту ў Грукава, садзілася ля магазіна і чакала, хто прыйдзе ў краму па хлеб ці па соль.

Прыходзіў хто з Вархоў — аддавала ўсю вархоўскую пошту яму, надараўся хто з Весялёвак — ён нёс у сваю вёску пісьмы і газеты. За гэта ніхто не крыўдаваў, ніхто не папракаў паштальёнку — калі справа няспешная, чаго там хвалявацца: нехта ж прынясе газеты ці пісьмо.

Спакойна глядзеў на бяскрыўдную ляноту паштальёнкі і сам Кагадзей. Ён цэлыя дні праседжваў у кустах — драў там лазу, сек у калгас дровы, касіў сена сабе і на «ракорд» — так чамусьці тут называецца цвёрдае заданне, на якім павінны касіць нават пенсіянеры і пенсіянеркі,— перасвістваўся з птушкамі: яны вельмі ж ахвотна адказвалі на яго свіст, а здаралася, што ён так мог змусіць іх да сумеснай песні, што ўжо і сам ішоў куды-небудзь у іншае месца, а птушкі ўсё ніяк не маглі супакоіцца — спявалі як ашалелыя. Цімоха яшчэ да сонца знікаў са свайго двара — балазе кусты падыходзяць як не пад самыя яго сенцы; яму вельмі лёгка было, выйшаўшы на панадворак, нырнуць у іх незаўважна: толькі на тым месцы, куды сігануў, нейкую хвіліну пагайдаюцца галінкі, і ўсё тут жа сціхне, супакоіцца. Вяртаўся Кагадзей таксама незаўважна. Толькі што ў хаце яго не было, не відаць, каб дзе ішоў дадому, а зірнеш праз хвіліну ў акно — ён ужо, як нікуды і не хадзіў, сядзіць за сталом, пад лямпачкаю, і, адхінуўшыся галавою, каб цень не засланяў гладыш, налівае ў кварту малако альбо, павячэраўшы, ужо адсунуўся ад стала, прыладзіў адламаную дужку да акуляраў і чытае газету.

Звычайна Кагадзея ўдзень рэдка хто бачыў. Яго няўседлівай Вольцы гэта таксама не падабалася — калі ёй надакучыла скардзіцца на свайго гаспадара жыцькаўскім жанчынам, яна расказвала і весялёўскім, і грукаўскім, і нават млынароўскім:

— Агоў! Гэта ж у мяне толькі шчот, што ёсць мужчына. А я ж яго, дарагія мае, і не бачу. Усё сама — і скаціну дагледзь, і гарод упарадчы, і ў калгас збегай.

А Шыбекава Алена аднойчы, калі праз ручай дужа раненька бегла на аўтобус, кажуць, нос у нос сустрэлася з Кагадзеем — якраз тады, калі ён з сякераю і касою, выбегшы з сянец, спяшаўся незаўважна нырнуць у алехавае гусцё.

— Здароў, Цімоха! — прывіталася жанчына і, нібы нічога не ведаючы, спыталася: — Куды гэта ты ў такую рань сабраўся?

— А якое табе дзела! — нават не адказаў на прывітан-

не і зазлаваў Кагадзей — у Алешіным пытанні ён адчуў насмешку і ўжо хацеў абысці Шыбекаву, але тая загарадзіла яму сцежку.

— Цімоха, ты, Цімоха, чаго ты ў гэтыя кусты шыешся? Ты ж там во і згніеш, у гэтым алешніку. Скора ж ужо і паміраць. Дык выйшаў бы ты з кустоў, на сонца хоць паглядзеў, абсохнуў бы троху, нерасушыўся. А то ж вунь заплесневеў увесь, як стары грыб.

Кажуць, пасля гэтага Цімоха доўга злаваў на Шыбекаву, але з кустоў усё адно не вылазіў. А вось зараз ужо колькі дзён Кагадзей нават і не ўспамінае пра свае кусты і штодзённа, напераменку з Волькаю (ён — да абеду, яна — пасля ці наадварот), ходзіць у Грукава, каб сустрэць паштальёнку.

Сядзе там Цімоха на лавачцы ля магазіна, курыць, чакае. Дачакаўшыся паштальёнку, але не дачакаўшыся пісьма ад Светы, зноў паціху ідзе дадому — праз бор, праз кар'ер, дзе «Сельгастэхніка» даўно ўжо бярэ пясок, праз рэчку Дубоўку ля Весялёвак, над якою нехта з весялёўцаў паклаў дзве таўставатыя алешыны, змацаваўшы іх з аднаго, таўсцейшага, боку клямарам.

Сёння пісьма ад Светы таксама, відаць, не было. Цімоха таптаўся ля нас, лопаў скручанымі газетамі па боце — усё не мог рашыць, ці яму прысесці і пасядзець з намі, ці ўсё ж ісці дадому.

— А чаго ты ўжо, Цімоха, так баішся за сваю Свету? — спыталася ў яго маці, укінуўшы ў чыгунок абабраную бульбіну — тая толькі булькнула.— Што, ты думаеш, там, за Уралам, ужо і людзей няма?

— Яно-то, Надзёжа, і за Уралам людзі жывуць,— хмыкнуўшы, усміхнуўся ў свае рыжыя вусы Кагадзей — яны, гэтыя вусы, заўсёды збівалі з панталыку ўсіх, хто бачыў чалавека ўпершыню: сам Цімоха цёмны, валасы чорныя, як тое воранава крыло, а вусы рыжыя, іржавыя — здавалася нават, што іх, чужыя, хтосьці жартам торкнуў Кагадзею над нос.

— Яно па мне дык...— мяўся Цімоха.— Я ж ведаю, што яе і там не пакрыўдзяць. Ну, паехала... Ну, работу там атрымае... Агледзіцца, ажывецца, а тады і напіша... Але ж вунь хлопец... Ні дома, як кажуць, ні ў гасцях.

І праўда, мы прывыклі ўжо часта бачыць Раніка ў Жыцькаве, і таму ніхто не здзіўляўся, што ён бывае тут як не штодзень: хлопец стаў нібыта сваім, жыцькаўскім.

І зараз, без Светы, прыехаўшы да Кагадзея, ён нярэд-

ка заставаўся начаваць, а то і затрымліваўся на колькі дзён. Цімоха тады не ішоў у кусты, і яны з зяцем ці касілі сена, ці папраўлялі згароду, ці знаходзілі яшчэ якую сабе працу ля двара.

Вось і пазаўчора Ранік прыгнаў з Грукава каня, і яны з цесцем цэлы дзень стагавалі сена, якое Цімоха накасіў у кустах. Я якраз вяртаўся з грыбоў і бачыў, як завіхаўся ля стога Кагадзееў зяць. Доўгі, цыбаты, моцны, ён браў на вілы вялікі пласт сена — цэлую капу — і лёгка, амаль не чапляючыся за алешнік, выносіў яго да стога і, асабліва не насільваючыся, кідаў наверх.

Цімоха, якога гэта капа завальвала на стозе як не з галавою, выбіраўся з яе, абтаптваў сена і задаволена ўшчуваў зяця:

— Што ты, Толя, робіш? Ты ж паменей троху падавай...

А Ранік радасна рагатаў на ўсю паляну, трос сваім рыжым, аж агністым, нібы цесцевы вусы, чубам (таму некаторыя і жартавалі, што Цімоха носіць вусы з зяцевых валасоў), струшваў з галавы сяніны і зноў, высока падымаючы ногі, абутыя ў вялікія, падвязаныя белымі каснікамі, бахілы, ішоў на наступную капу — абутак быў прасторны, раскошны, не па назе, і таму было далёка чуваць, як ён шлопае.

Увечары, пакуль Цімоха распрагаў каня, Ранік, не зняўшы нават бахілаў і не вытрасшы з-за каўняра сена, сеў на свой рыплівы веласіпед, павесіў на руль сумку і наспешліва нарыпеў у Грукава — праца скончана, трэба гэта неяк ушанаваць, а магазін можа зачыніцца...

Спачатку, калі Света летась на канікулах пазнаёмілася з Ранікам і калі Толя пачаў прыязджаць у Жыцькава вельмі часта, усё гэта Кагадзею не спадабалася. Ён чмыхаў носам і толькі скоса глядзеў на хлопца — відаць, не такога мужа зычыў ён дачцэ:

— Падумаеш, знайшла нейкага Раніка. Быццам хлопцаў няма.

Але насля таго, як закаханыя пасварыліся, у Цімохі памянялася думка, і ён, ці то шкадуючы хлопца, ці то сапраўды ўпадабаўшы яго, пачаў адносіцца да Раніка зусім па-бацькоўску.

А пасварыліся маладыя гэтак. Аднаго разу на танцах у Млынарах малады і прыгожы лётчык у новай афіцэрскай форме, якую ён атрымаў, толькі што скончыўшы вучылішча, і да якой яшчэ не прывык і сам, запрасіў Свету

на польку, а пасля цэлы вечар нікому не аддаваў дзяўчыны — танцаваў толькі з ёю. Танцавалі яны разам і дамскі вальс — Раніку зразумець было цяжка, ці то лётчык, не зважаючы на такі далікатны танец, павёў дзяўчыну ў круг, ці ўсё ж Света змушана была запрасіць яго сама.

Яны танцавалі, а Ранік хадзіў з кута ў кут па клубе і не знаходзіў сабе месца: то падыдзе да гарманіста, пагаворыць, то да хлопцаў прыладзіцца, пастаіць, то з дзяўчатамі паспрабуе загаварыць. Але, зразумела, ідзе яму не стаялася, не сядзелася. Ранік і з танцаў пайшоў раней. Назаўтра ў Жыцькаве не чуваць было яго рыплівага веласіпеда. Не паказаўся хлопец ні праз дзень, ні праз два, ні праз тыдзень.

А лётчык пасля такога бурнага першага вечара чамусьці паводзіў сябе дзіўна: ён нібы і не заўважаў Светы — не падыходзіў да яе, не гаварыў. І ўсё рабіў выгляд, што яны з ёю незнаёмыя. Чаму ён так сябе паводзіў, ніхто не ўведаў: гэта так і засталося загадкаю. Калі адпачынак у лётчыка скончыўся і ён паехаў, Света села на веласіпед і сама падскочыла ў Аўдзейкава. А адтуль ужо на адным веласіпедзе яны вярнуліся ўдваіх — Ранік, відаць, дараваў каханай такія легкадумныя паводзіны...

Пасля гэтага Света і Толя, як і раней, ездзілі на адным веласіпедзе на танцы, вярталіся пад раніцу з песнямі, хадзілі па Жыцькаве абняўшыся, як маладажоны, і нават забіраліся днём, у гарачыню, на Цімохава гарышча, дзе Света зрабіла сабе полаг ад камароў. І цалаваліся там, не зважаючы на нашых хлапчукоў (толькі кідалі ў іх са смехам цукеркамі),— Петрусі, мой і Андрэеў падшыванцы, падглядалі і лічылі, відаць, перабольшваючы, іхнія пацалункі.

Сёлета Света скончыла медыцынскае вучылішча ў Ленінградзе, атрымала накіраванне некуды за Свярдлоўск (аж трое сутак трэба яшчэ за горад цягніком ехаць — казаў Цімоха). І яны з Ранікам рашылі пажаніцца. Але пакуль прыйшлі да такой згоды: спачатку Света паедзе туды адна, паглядзіць, што і да чаго, пацікавіцца, ці знойдзецца там якая праца для Толі, напіша адтуль пісьмо, і ён прыедзе ўслед за ёю. Ранік, які рабіў на заводзе пад Оршаю, разлічыўся там і прыехаў у свае Аўдзейкава — чакаць пісьма. Кожны вечар ён паяўляўся ў Жыцькава на сваім рыплівым, нязмазаным веласіпедзе — я нават і не разумеў, што там рыпела: ці то сядло, ці то педалі, ці то

яшчэ што якое,— і калі не заставаўся начаваць, зноў пры заходзе сонца рыпеў назад у Аўдзейкава.

— Дык вось жа, Надзёжа, малыца шкада,— зноў загаварыў да маці Цімоха, не гледзячы на яе, а пазіраючы ўдалячынь, туды, дзе за Прутнёвы бярозы наволына, як маленечкія воблачкі, заходзілі апошнія журавы.— А то неяк ходзіць хлопец не пры дзеле. А тая зялепуха маўчыць, не піша...

— Анічога, Цімоха,— маці зноў булькнула бульбіну ў чыгунок.— І зялепуха твая напіша, і Ранік яшчэ там, у Сібіры, нажывецца.

Цімоха хацеў, відаць, запярэчыць, але, убачыўшы, як ад бяроз, за якія толькі што зайшлі журавы, дробна бяжыць сюды Моця Прутнёва, на хаду выціраючы аб фартушок рукі, зноў кіславата ўсміхнуўся:

— Вунь і Моці не церпіцца хутчэй пісьмо атрымаць.

І праўда, яшчэ не дабегшы да нас, тая спыталася:

— А маё пісямко табе паштальёнка не аддавала?

І пільна ўгледзелася ў Цімохавы рукі, дзе бялелі скручаныя газеты.

— Не, не аддавала,— спакойна адказаў Кагадзей і, нібыта нічога не ведаючы, запытаўся: — А ад каго ж ты, Моця, усё пісьмо сочыш?

— Як гэта ад каго? — аж разгубілася Моця: ёй здавалася, што ўжо ў ваколіцы няма ніводнага чалавека, які не ведае, ад каго яна чакае пісямко. У Млынарах — ведаюць, у Аўдзейкаве — ведаюць, у Весялёўках — ведаюць, а ён, бачыце яго, у Жыцькаве пытаецца.

— Ад Зіны чакаю, Кагадзей ты няшчасны,— аж зазлавала Моця.

Цімоха і сам ведаў, што Моціна Зінка выйшла замуж і збіраецца хутка разам з мужам прыехаць да маці пагасцяваць. Але ў іх нешта ўсё гэта пакуль не выходзіла. Вось Моця і чакала пісямка — мо хоць напішуць, чаму не едуць.

Яшчэ неяк раней, гадоў пяць таму, раптам пайшлі чуткі, што Моціна Зіна выйшла замуж. Прутніха прадала тады цёлку — на залатыя пярсцёнкі маладым. Але неўзабаве ўсё зноў сціхла. Маўчала Зіна, як прыязджала сюды ўлетку, маўчала і сама Моця — а што ж яна зробіць, калі не склеілася ў дачкі тое вяселле. Хоць маці даўно падганяла ўжо Зінку замуж, бачачы, як бягуць, падходзяць яе гады, і баючыся, як бы дачка не засталася ў дзеўках,— а што такое жыць адной, яна цяпер добра ведала: маючы

столькі братоў і сясцёр, Моця даўно ўжо жыла адна — старэйшы Алісей працуе на пошце і жыве ў Азярычыне, меншы брат, Віцька, шафёр, таксама пабудаваўся ў Азярычыне і возіць старшыню калгаса Каранькевіча, сястра Маруся выйшла замуж у Грукава. І нават адзіная дачка жыве ў Віцебску — таксама не з ёю.

Сёлета Зінка зноў прыслала пісьмо: «Мама, трэба грошы на залатыя пярсцёнкі — я выходжу замуж». І хоць сёй-той з жанчын пасміхаўся — маўляў, Зінка ведае, як дурыць матку: спатрэбяцца ёй грошы, яна і піша, што выходзіць замуж,— Моця ўсё ж завезла ў райцэнтр на прыёмны пункт вялікага парсюка і тут жа, з раённай пошты, адаслала грошы дачцэ.

Пасля гэтага ўсур'ёз загаварылі пра Зініна вяселле — і Млынары, і Грукава, і Весялёўкі пацвердзілі: так, Моціна дачка нарэшце выходзіць замуж і Жыцькава чакае вяселля.

Але вяселля Жыцькава не дачакалася. Зіна з жаніхом сабралі невялічкі вечар у Віцебску, у рэстаране «Дзвіна», дзе за ссунутыя разам столікі селі бліжэйшыя яе сяброўкі і яго сябры. Сама Моця на вяселле не паспела, спазнілася: падвялі аўтобусы, якія то не бралі, то затрымліваліся, то ламаліся. І маці прыехала да маладых ужо тады, калі яны, развітаўшыся з гасцямі, шчаслівыя, што засталіся адны, цалаваліся ў цесным Зініным пакойчыку на прыватнай кватэры — недзе на ўскраіне Віцебска.

Моця, разжаліўшыся, вінавата расказвала ім свае прыгоды:

— А я хаджу ля таго рэстаранта — дайшла сама, балазе ён блізка ад вакзала,— а зайсці баюся. Потым адважылася,— не ўкусяць, думаю. «Ці ёсць тут якое вяселле?» — пытаюся ў дзяўчат. «Ёсць, кажуць, паглядзіце». Я прыглядаюся, прыглядаюся, а цябе, дачушка, няма сярод іх. Маладая-то ёсць, але, здаецца, не ты. Дый памыліцца ж баюся: я ж цябе, дачушка, у фаце не бачыла, можа, ты і не такая ў ёй. А цябе ж, зяцёк, дык я і спазнаць не магла — мы ж з табою яшчэ і не ўстрачаліся. Але ж, разгледзеўшыся, кажу: «Не, не маё гэта вяселле. А яшчэ ёсць?» — пытаюся. «Няма,— адказваюць.— Было адно, але пайшло ўжо». Я тады і здагадалася, што гэта вы пайшлі. Вось і прыехала.

Сёлета Зіна ўпершыню мелася прывезці ў Жыцькава свайго мужа. Моця, чакаючы зяця, павычысціла ў хаце і ў каморы, павышаравала закуродымленыя ў печы чыгун-

кі, патэльні і каструлі, падмяла-прыбрала панадворак, прынесла ад сястры Марусі з Грукава старую, ужо зусім паламаную радыёлу, з якої самы меншы, трэці, сястрын сын — дзве ж у яе дачушкі — павымаў начынне, абцерла з яе даўні пыл, які аж уеўся ў паліроўку, і, заслаўшы прыёмнік сурвэткаю, паставіла яго на покуце — маўляў, няхай зяць не падумае, што яна такая бедная: у яе вось і радзіва ёсць, толькі, ліха па яго, нядаўна нешта сапсулася, не гаворыць.

Але зяць усё не ехаў. Прыязджала яго сястра, Зініна залоўка, пабыла два тыдні, але сказала, што ёй тут сумна, няма чаго рабіць, і паехала зноў у Віцебск...

Моця, так і не дабегшы да нас, пачуўшы, што пісямко ёй яшчэ не прыйшло, павярнулася і, усё выціраючы аб фартух рукі, пайшла назад, да свае хаты.

Цімоха зірнуў ёй услед, паправіў шапку, якая была з таго ж дыяганалю, што і галіфэ, і зноў усміхнуўся ў свае рыжыя вусы, стараючыся трохі прыкрываць губою шчарбіну ў роце.

— А гэта ж яшчэ Цытнячыха не ўбачыла, што я з Грукава іду. Тая б таксама выбегла: «Ці ё маёй Люсі што?»

Цытнячышына Люся, высачанькая, але нейкая нескладная, худзенькая і цыбатая, як усе падлеткі, дзяўчынка, наступала сёлета ў Ленінградзе ў тое самае медыцынскае вучылішча, якое толькі што скончыла Кагадзеева Света. Нядаўна яна ездзіла здаваць экзамены і цяпер з дня на дзень чакала выкліку на вучобу. Люся, як усё роўна спадзеючыся, што ад гэтага пісьмо прыйдзе хутчэй, бегала як не штодзень у Грукава і сама — пасля абеду возьме ў рукі сумку і пайшла сабе: нібыта ёй трэба ў краму, нібыта яна па хлеб туды ідзе. Адтуль Люся нярэдка вярталася разам з Цімохам ці з яго Волькаю.

— А ты Люську ў Грукаве не бачыў? — маці падпялася з лаўкі і стрэсла з прыполу ў вядзерца лушпайкі.— Яна ж услед за табою пабегла.

— Не, ля магазіна яе не відаць было.

— А вунь і яна, лёгкая на ўспамін,— галавою паказаў Андрэй — ён усё яшчэ фыркаў пад квартаю, з якої паліваў яму сын.

— А і сапраўды Люся,— падслепавата ўгледзеўся і Цімоха, а калі дзяўчына падышла зусім блізка, спытаўся:

— Дзе гэта мы з табою, дзеўка, размінуліся?

Люся засаромелася, апусціла вочы долу:

— А я там у аднакласніцы загулялася. І не заўважыла, як наштальёнка прайшла. Гэта ж нада — праваронілa. Спынілася і, як Моця Прутнёва, угледзелася ў газеты, якія Цімоха трымаў у руцэ.

— А вам, дзядзька, нічога майго не аддавалі?

— Во як ты ўпэўнена чакаеш,— апярэдзіў Цімоху Андрэй.— Можа, ты яшчэ і не паступіла. Можа, табе дакументы назад прышлюць. А ты ўжо ехаць на вучобу сабралася...

— Не ведаю, дзеўка, паступіла ты ці не,— зноў усміхнуўся Кагадзей,— але ніякіх пісьмаў мне ніхто не аддаваў.

— Дык а ў вас жа газеты...— нясмела азвалася Люська.

— Газеты, дзеўка, старыя. А пісьмы твае няма каму аддаваць,— паглядзеў на ўсіх Цімоха і растлумачыў: — І насіць таксама няма каму.

Калі Люська пайшла дадому — яна ўсё азіралася і падазропа пaглядала на газеты,— маці спыталася:

— Як няма каму насіць? А дзе ж ужо Галька дзелася?

— Зноў, Надзёжа, з'ехала твая Галька.

Заўсёды, колькі ўжо я прыязджаю ў Жыцькава, хоць раз, хоць два на лета, мне ўсё ж удаецца ўбачыць наштальёнку Гальку — маладую, прыгожую жанчыну са светлым гордым тварам, з нейкаю невясковаю паставаю, з загарэлымі і стройнымі, нібы вытачанымі, нагамі. Яна ўсё лета ходзіць босая, ад чаго ступні яе крыху расплыліся, а пяты напарэпаліся, але Галька ўсё роўна ўмее так стаць, так паставіць нагу, так павярнуцца, што кожнаму адразу кінецца ў вочы ўсё лепшае, што мае яе маладое, туга абцягнутае простаю паркалёваю сукенкаю цела, і тады кожны, хто нават яе не ведае, можа беспамылкова сцвярджаць, што яна хоць год, хоць два, але ўсё ж пажыла ў нейкім вялікім горадзе.

Міша, грукаўскі хлопец, пазнаёміўся з ёю ў Ленінградзе, дзе працаваў на Кіраўскім заводзе, і ажаніўся яшчэ да арміі. Калі ж яму ў ваенкамаце ўручылі павестку, хлопец забраў Гальку, якая тады ўжо хадзіла з надзеяю, і завёз яе ў Грукава да маці, што самотна жыла ў гэткай жа старэнькай, як і сама, хаце. Усё ж, думаў ён, у Грукаве жонцы будзе спакайней, чымся ў горадзе. Бо хто яго ведае, як бы яно было там — Галька маладая, прыгожая, амаль дзяўчынка яшчэ, а мужчыны, гэтыя юрліўцы, вядома, будуць чапляцца, прыставаць. І невядома, ці зможа яна, нявопытная, устояць? Дый яму б там, у салдатах, толькі

думалася лішняе. А тут жа маці. Калі і радзіць прыйдзе час, яна, хоць і старая ўжо, усё ж нешта наможа, падкажа.

Значыць, прывёз Міша Гальку да маці, а сам пайшоў служыць на флот.

Тут, у Грукаве, Галька шчасліва нарадзіла дачку, якую, нараіўшыся з маці, назвала Святланаю, і два гады жыла ціха, непрыкметна — насіла пошту і цярпліва чакала Мішу з флоту. На трэцім годзе нечакана разнеслася чутка, што Галька раптоўна з'ехала ў Карэлію, на лесавал, з'ехала разам з Хокам, шафёрам з Дыдулёў, у якога, як жартавалі жанчыны, рот ніколі не закрываўся — такі чалавек лёгкі быў на язык. Галька з'ехала, пакінуўшы на руках у старой Мішавай маці малую сваю Святланку.

І тады людзі пачалі ўспамінаць (раней гэта нікому не да галавы было), што адны бачылі, як Галька, смеючыся, ехала ў кабіне з Хокам; другія — як у ляску, на паўдарозе між Азярычынам і Грукавам, стаяла з нарасчыненымі дзверцамі Хокава машына, а ля яе нікога не было відаць; трэція — як Хок і Галька апошнім часам неяк дужа насвойску, хоць і насцярожаныя ў сваёй ласкавасці, віталіся — так вітаюцца толькі тыя, хто мае між сабою нейкую тайну, пра якую не павінны ведаць іншыя.

Словам, яны з'ехалі ў карэльскія лясы, а падводнік Міша, вярнуўшыся з флоцкай службы і не заспеўшы дома жонкі (праўда, пра гэта ён ведаў і да вяртання — хоць маці і непісьменная, але суседзі напісалі пісьмо — ведаў, ды неяк усё не верылася, усё думалася: а можа, і няпраўда?), паехаў услед за імі. І хутка вярнуўся адтуль з Галькаю — усё ж, відаць, удалося яму ўгаварыць жонку вярнуцца да свае дачкі. Праўда, вярнулася яна не адна — Галька хадзіла яшчэ адною, на гэты раз ужо Хокаваю, надзеяю.

Шчасліва, як і першы раз, яна нарадзіла яшчэ адну дзяўчынку — такую ж прыгожанькую і светлую, як сама. Але, крыху пажыўшы з жонкаю, ужо знікае з Грукава сам Міша. Не з'яўляецца ён тут і па сёння — адны кажуць, што хлопец прызвычаіўся да гарэлкі і зусім спіўся, іншыя — што ён нібыта недзе жыве ў свае дзядзіны, але толкам ніхто не ведае, дзе чалавек падзеўся.

Галька зноў, як і раней, узялася насіць пошту.

Памятаю, як пра яе расказвала ля нашай хаты Цытнячыха:

— А тут ёй адзін удавец, п'яніца такі, трапіўся, пачаў

над яе клінкі надбіваць, а сам стары ўжо, стары, Гальцы той у бацькі толькі і гадзіцца. А яна, дурная, не прагнала яго, а так, не распісваючыся, і жывець. Чалавек гэты кароў у Грукаве пасвіў. Можа, вы яго і відзелі калі — ён жа на пажатае кароў прыганяў. Дык пастух гэты сваю хату кінуў, вокны ды дзверы забіў дошкамі і да Галькі перайшоў — балазе старая Яўланя, Мішава матка, намерла. Вось тут Галька і трэцюю дачушку знайшла. А прыгожанькая якая, каб вы толькі бачылі. Бывала, у магазін прыйдзем, а яна ў калясачцы, спакойненькая такая, ляжыць — ну, лялька табе — і ўсё: так бы, здаецца, і забрала яе сабе. А сам жа ён, пастух гэты, чорны такі, чорны, брыдкі-брыдкі — яй жа богу, сустрэнеш дзе-небудзь у лесе, дык спужаешся і вады ад спужання да Ручаліхі прасіць пабяжыш... А ён яшчэ, брыдота гэтая, Гальку і б'ець, казалі...

— Агату! Куды ж яна зноў уцякла? — Маці ўстала, узяла чорны, закураны чыгунок з бульбаю, настаяла з ім у руках — чакала, калі Цімоха адкажа. Але ён не спяшаўся. Памаўчаў, а потым сказаў:

— А яна, Надзёжа, чалавек вольны — куды захацела, туды і паехала: за тваю ж пенсію білет у любы бок дадуць.

— А чаму гэта за маю?

— А таму, Надзёжа, што яна вашы пенсіі наклала ў кішэнь ці за пазуху — і я вас не знаю, і вы мяне — таксама. Бывайце здаровы, шукайце ветру ў полі.

Маці аж рот раскрыла:

— Айё, што ты гаворыш?! А я-то гляджу, што грошы нада б было даўно прынесці ўжо, а яна ўсё не нясе.

— Ты чакаеш, а твае, значыць, грошы, можа, ужо дзе ў Карэліі ці ў якой Варэліі.

— І чаго гэтай Гальцы не хапае? — нібыта сама ў сябе спыталася маці і пайшла распальваць грубку.

— Ты вот, Надзёжа, гаворыш, чаго Гальцы не хапае? — наўздагон ёй гаварыў Цімоха.— А зірні вунь, чаго медычцы нашай, Тамары, не хапала? У гэтай, брат, любові толкам не разбярэшся. Глядзіш часам збоку, і здаецца — ну аніякага ж парадку няма.

Потым, калі заўважыў, што маці корпаецца ля грубкі і не асабліва слухае яго, дагаварваў ужо, што ведаў, нам:

— Вы ж во зірніце, жыла яна са сваім Ладзікам добра. Усяго хапала. І сама такая ўжо ціхмяная была. Ды і Сліндук, любоўнік яе, таксама такі ўжо цяльпук, такі

цялёнак. Але ж во, на табе — неяк згаварыліся: збегала яшчэ раз замуж.

Гісторыя гэта была даўно, ужо гады тры таму, была якраз пры мне, летам. Брыгадзір цесляроў Сліндук наехаў тады з медычкаю Тамарай некуды аж за Мінск — да замужняй Тамарынай сястры: ім трэба было недзе хоць прытуліцца перад тым, як пачынаць новае жыццё. Сястра, якая ведала Тамарынага Ладзіка, сустрэла іх насцярожана, з недаверам, але спаць паслала ўсё ж разам.

Маленькая Нінка, Тамарына дачка, якую яны забралі з сабою, убачыўшы, што дзядзька, які ехаў з імі і ў цягніку ўсё гуляў з ёю, застаецца з імі начаваць, узняла такі гвалт, што яе давялося супакойваць усім разам. Малая плакала і ўсё гаварыла:

— А чаго ён, Сліндук гэты, кладзецца спаць ля мае мамы. У мяне свой татка ёсць, лепшы за яго.

Нінка сціскала маленькія ручаняткі ў кулачкі і так настойліва кідалася на новага тату, што Сліндук, баючыся, каб малое не павыдзірала яму вочы, змушаны быў пайсці спаць на канапу ў другі пакойчык: давялося сястры ўсё ж слаць яшчэ адну пасцелю — малая плакала, крычала, адмаўлялася ісці ў ложак, пакуль адтуль не пойдзе «гэты Сліндук».

Можа, слёзы дачкі, а можа, што і іншае так уразіла і працверазіла Тамару, што яна, калі праз колькі тыдняў, дазнаўшыся, дзе яны, прыехалі сюды яе бацька, Ладзікава сястра і нават Сліндукова маці, не вельмі адмаўлялася і, вінавата гледзячы на Сліндука, які адно толькі маўчаў, згадзілася вярнуцца ў Млынары.

Тамара вярнулася да мужа, Сліндук — да жонкі. Сама больш, відаць, радавалася гэтаму Нінка. Яна, абвіўшы адною рукою бацькаву шыю, другою — матчыну, вісела між імі, путлявала ў паветры ножкамі і гаварыла нібы адно слова: «татамама». Бацька так рады быў даччынай любові, што купіў малой сапраўдны гадзіннік.

Яны пажылі колькі год у Млынарах, а потым Тамара, каб забыцца на сваё няўдалае каханне, падгаварыла Ладзіка з'ехаць куды-небудзь адсюль — і каб толькі далей: не магла глядзець у вочы аднавяскоўцам. Мужу хоць і не хацелася кідаць сваю хату, вёску, звыклую працу і ехаць хто ведае куды і шукаць хто ведае чаго на новым месцы, але ён мусіў пагадзіцца з Тамараю — вельмі любіў яе і таму нават тады, у дні свайго сораму, цярпліва чакаў, што яна вернецца, і нават калі яму гаварылі, каб ён адпомсціў

Тамары — ажаніўся,— Ладзік толькі задумліва круціў галавою, апускаў вочы долу і, нібыта пытаючыся ў каго, гаварыў: «А дзе ж я яшчэ такую, як Тамара, знайду?»

Яны пераехалі ў горад — Тамара пайшла ў паліклініку, а шафёру таксама работа знайшлася: Ладзік сеў на пасажырскі аўтобус — і з таго часу ў Млынарах яны не паказваліся. Тыя, хто быў у іх у Віцебску, казалі, што жывуць яны і зараз вельмі дружна — як і да таго чмуру: такія прымірэнні пасля вялікай узрушанасці і крыўды заўсёды збліжаюць людзей, і тады нават старыя сям'яне жывуць душа ў душу — нібы маладажоны...

Цімоха, убачыўшы, што і мы не вельмі слухаем яго, перасунуў шапку па вуха, пачухаў адным пальцам тое месца, што было пад шапкаю, і пайшоў да грубкі, дзе стаяла маці і дзе ўжо гудзеў агонь і полымя, вырываючыся з круглай дзіркі, з усіх бакоў лізала чорны, закураны чыгунок.

— Ты во, Надзёжа, пра любоў не гавары мне. Помніш, як сама была траха не здурнела — ледзь свайго Ласімовіча не кінула. А ўспомні, што ў тым агранome было такога — маленькі, плюгавенькі, ручкі нейкія кароценькія. Гэта ж не тое што твой Апанас — басам гаварыў. А вот жа ўлюбілася.

— А ідзі ты ўжо дамоў, балабон гэты,— зазлавала маці.— А то стаіць і збірае з дуба вецце...— Маці рассоўвала ў грубцы па баках дровы, каб не так палалі, і ўсё бубнела: — Пра мяне дык ты во поўніш, а пра сябе ўсё забыўся, усё табе выпетрыла. Не хочаш успамінаць, як сам у Стахванаўны Вольку маладзенькую ўкраў, як Стахванаўна за табою з качалкаю бегала па полі. Дзіця ж яшчэ было.

Мне падабалася яе вось гэтае «поўніш» замест «помніш». Маці глядзела ў грубку, варушыла там дровы, якія ўсё яшчэ палалі полымем, і не заўважыла, што Цімоха, які стаяў за яе спінаю, пацíху, перавальваючыся, як гусак, з нагі на нагу, пайшоў у бок свае хаты.

Калі яна разагнулася і ўбачыла, што Кагадзея ўжо няма, гледзячы яму ўслед, усё яшчэ злуючыся казала:

— Агату! Бачылі вы яго, разгаварыўся. Ды і як яшчэ разгаварыўся! Нібы малатарня — не спыніць. Выпіўшы, відаць, бо з цвярозага з яго і слова не выцягнеш. Сядзе дзе-небудзь, вочы ў зямлю ўперыць, будзе глядзець сабе пад ногі цэлы дзень і маўчаць. А то разгаворлівы дужа стаў: язык у роце не месціцца...

Калі Цімоха з лагчыны, што зарасла кустамі, узнімаўся на вышэйшае і надыходзіў да Шыбекавай хаты, з сянец, нібы вытурхнуты кім, вылецеў Павел — генерал, самы старэйшы Шыбекаў сын, які зараз гасцяваў у бацькі,— і, расхрыстаны, босы, з падкасаным калашынам, у світцы, ускінутай наапашкі, пабег у сад. Світка зачапілася за сук, звалілася ў баразну. Павел застаўся ў адной клятчатай сарочцы, але, не зважаючы на гэта, падбег да яблыні і паспешліва, каб не вельмі захаладаць на гэтым восеньскім ветры, нашчыпаў яблыкаў у прыпол сарочкі — ён папярэдне выцягнуў яе са штаноў,— схапіў на руку світку і бег ужо зноў да сянец, як яго спыніў Цімоха.

Яны стаялі, гаварылі — відаць, Кагадзей расказваў і яму, што іхні Маласай паехаў у Азярычына, каб даведацца, калі ідзе цягнік на Станіславаў, і пытаўся, відаць, калі паедзе і ён сам.

Павел зразумеў, што размова задоўжыцца, і адною рукою — другою трымаў падол — ускінуў світку на плечы: каб не дрыжаць на ветры...

Вецер паспрабаваў дзьмуць з усіх чатырох бакоў — і ўсё халодны.

Бульба ў чыгунку кіпела ўключ. Гасячы полымя, маці сказала:

— Андрэй! Юра! Клічце Веру, дзяцей, ды будзем вячэраць.

Прутнёвы бярозы, за якія паляцелі жураўы, шырока шумелі верхавінамі — здавалася, іх так разгайдала шухкае птушынае крылле, што яны ўсё яшчэ не могуць супакоіцца, суцішыцца.

Вечарэла... Там, дзе наша сцежка ўпіраецца ў аўдзейкаўскую дарогу, чуўся ўжо рып Рапікавага веласіпеда.

## 2. ЗНАЁМСТВА З ХАТАМІ,

***якія памерлі ў вайну,***
***з падмуркамі,***
***якія помняць іх,***
***з трыма пеўнямі, з чалавекам,***
***які надта хацеў пабыць за морам,***
***а таксама і пра іншае***

Сумнавата жыцькаўскім пеўням будзіць раніцу.

Прачнецца, да прыкладу, Цімохаў крычан — агністы, як пажар, удзень, пад сонцам, і шэры, непрыкметны ў ра-

пішняй цемры,— адкрые адно круглае вока, абвядзе ім паўзмрок цёмнага падстрэшша ў хлеўчуку, дзе не відно нават павучыны над страхою, і хутчэй адчуе, як убачыць, па два бакі ад сябе шэранькія купкі сваіх сябровак, што яшчэ сонна сядзяць на седале, а потым, як спартсмен, падыме сябе над жэрдкаю, заплюшчыць і гэтае вока — усё роўна нічога не відно — і лопне крыллем:

— Ку-ка-рэ-ку!

Закапошацца куры, закудахчуць і, лопаючы крыллем, пачнуць, патрывожаныя, лацвей умошчвацца на шастку, а ён, не зважаючы на іх кешканне, адно толькі будзе паварочваць у бакі галаву і доўга ўслухоўвацца ў цішыню — ці адказвае хто на яго прывітанне.

Недзе ў Вархах паспрабуюць адгукнуцца кволымі галасамі маладыя пеўні, але Жыцькава маўчыць. Наш певень на песню ляны — яму абы дзяўбацца: дзе толькі ўбачыць малога каго ці старога,— эх, крылле ў бокі, як каршун, ляціць насустрач. Горды Шыбекаў баец, які заўсёды высока, з гонарам носіць сваю прыгожую галаву з вялікім грэбнем, які аж заломваецца набок і, калі певень глядзіць суверх, заслапяе нават вока, не спяшаецца адгукацца суседу. Ён вельмі ж фарсісты — і ходзіць так, што пра яго можна гаварыць, як пра якога ганарыстага хлопца: «Ідзе, галаву задраўшы, і дзюбаю за неба чапляецца». Ён маўчыць доўга, прапусціць і адно, і другое, і трэцяе «кукарэку» Цімохавага крычана, а потым, мусіць, таксама шырока ўзмахне крыллем — ды так, што сам ледзь утрымаецца на жэрдцы,— і заспявае. Яго песня не такая адрывістая, як у Цімохавага пеўня,— яна доўгая, працяжная, з пералівамі: здаецца, нават цягне ён яе сам для сябе, цешачыся і голасам сваім, і яго сілаю. Запознена далучыцца да іх яшчэ і наш лайдак — таксама кукарэкне разы са два. Вось і ўсё. Больш памагчы ім у Жыцькаве няма каму.

Праўда, хацела выгадаваць свайго спеўня і Моця Прутнёва, але гэта ёй так і не ўдалося. Хата яе стаіць між Шыбекавай і Цімохавай, і таму, як толькі з-за веснічак выйдзе на вуліцу Моцін маладзён, адразу з двух бакоў (і як яны яго толькі ўбачаць між курэй) на пеўніка кідаюцца ганарысты Шыбекаў баец і агністы, як пажар, Цімохаў крычан. Пеўнік колькі дзён ходзіць як п'яны, з раздзяўбаным у кроў грэбнем, і Моця, каб не глядзець на яго пакуты, просіць ці Цімоху, ці Шыбеку зарэзаць яго — у яе самой не хапае адвагі. І адразу ж заводзіць новага. Але і з гэ-

тым здараецца тое ж — ён знікае, так і не пабыўшы спеўнасці.

Цытнячыха — дык тая наогул ніколі не заводзіла пеўня: яна кажа, што ад іх толькі таго і клопату, што дурацъ галаву. І таму маладых, не спеўных яшчэ пеўнікаў, якіх выседжвала курыца, яна сама ці Люся неслі ў Азярычына і прадавалі. Сёлета ў яе неспадзявана заспявала пеўнем курыца, і Цытнячыха сама паклала на калодку яе галаву — каб не здарылася ніякага няшчасця: Александрына і цяпер верыць у прыкметы. З сякімі-такімі прыкметамі яна спраўляецца сама, а з якімі прыходзіць да нас: «Ты ўжо, Надзёжа, даруй, але ж мне адной дык і абразіцца няма з кім, і няма куды выйсці, апроч цябе, каб вочы хоць прастудзіць».

Ладны певень быў яшчэ ў Стахванаўны, але апошні год яна нешта вельмі хварэе, амаль не выходзіць з хаты, і таму клопат пра ўсю матчыну гаспадарку ўзялі на сябе Волька і Цімоха. Курэй яны пераманілі,перавучылі хадзіць на свае седала, і той спраўны і смелы Гапкін певень, пабіўшыся, відаць, месяцы са два з Цімохавым, усё ж уступіў яму і зараз хадзіў ціхі, спакойны і няспеўны — як курыца.

Так і спяваюць толькі тры пеўні на ўсе шэсць жыцькаўскіх хат.

Хатам таксама тут, мусіць, самотна: яны стаяць далёка адна ад адной — амаль не відаць з-за кустоў.

А некалі, яшчэ да вайны, Жыцькава было вялікаю і мнагалюднаю — жывою вёскаю. Праўда, само Жыцькава зелянела якраз там, дзе зараз, амаль ля самай сцежкі да крыніцы, між мноства нарослых быльнікам падмуркаў, адзінока стаіць хата Стахванаўны — толькі яна адна і асталася ў ранейшай вёсцы.

Недзе задоўга яшчэ перад фінскаю вайною, калі Ананас Ласімовіч, мой цесць, быў старшынёю калгаса, жыцькаўцы на сваім праўленні рашылі жыць па-новаму і запісалі ў пратакол, копія якога і зараз ляжыць у нас за бацькавым партрэтам на покуце, што яны абавязуюцца «пабудаваць новую чырвоную вёску, з роўнаю зялёнаю вуліцаю, з прасторнымі хатамі, з новаю культураю».

Праз колькі год у новы пасёлак перавезлі свае хаты амаль усе жыцькаўцы. Не захацеў толькі пераязджаць адсюль Міхалка. «Мая ж хата старая,— апраўдваўся ён.— За яе толькі возьмешся, дык яна ў пыл і рассыплецца. Я ўжо адразу там, калі што якое, новую рубіць буду».

Але так і асталася Міхалкава хата на старым падмурку — яшчэ і сёння жыве ў ёй Стахванаўна, якая вось ужо гадоў на пятнаццаць перажыла свайго мужа.

Калі ўжо новы пасёлак дайшоў да ручая, які пачынаецца недзе на ўсход ад Весялёвак і, пятляючы, праз Жыцькава спяшаецца аж у Млынары, калі хаты пераступілі гэты ручай і весела пачалі падпімацца на пагорак, каб ісці далей, пад Дыдулі, раптоўна пасадзілі старшыню. Маці пра гэта расказвала так:

— Я ж, поўню, колькі разоў гаварыла бацьку: «Апанас, што ты сабе думаеш, не садзіся ты за старшыню. Хіба ж ты не ведаеш нашых людзей? Людзі ж у нас цяжкія, з імі табе не проста будзіць». Агату — не паслухаўся ён мяне, сеў. Ды яшчэ і бабы раздражнілі: «Станавіся, станавіся, Апанаска, не бойся, мы цяпер ужо свядомыя, мы ж ужо цяпер падраслі...» Ага, яны, бачыце, падраслі... Агату! А мне тады так ужо карцела ў іх спытацца: «Айё, дык вы ж скажыце хоць, на колькі санціметраў падраслі?..» Тады прасілі, а як стаў чалавек за старшыню, многім не ў нос зрабілася. Пачалі пісьмы на Апанаса пісаць. А тут яшчэ ў фінскую вайну маразы ўдарылі, вада ўся павымярзала, паіць кароў няма чым. Тады Ручаль, ён на МТФ працаваў, і кажыць: «Давай, Апанас, будзем кароў у Весялёўкі на вадапой ганяць». А бацька, не падумаўшы, і згоду даў. А мароз жа — сорак градусаў. Ну, што вы думаеце, пакуль каровы ў тыя Весялёўкі сходзяць — адны настуджваюцца, другія ногі паадмарожваюць. Ляжыць каторая, стогне — як чалавек. Хоць ты іх чаем з малінаю адпойвай. А пасля ўбачылі, што ніякая маліна не паможа. Агату,— пачалі рэзаць ды мяса ў Азярычына ў сталоўку здаваць. Тады, пакуль нашых кароў вазілі, поўню, усё там у сталоўцы рагу нейкае варылі — акурат наш кулеш. Бацька, як вярнуўся, казаў, што пісьмы на яго свае ж падавалі: «Ласімовіч Апанас прастудзіў кароў, каб нашкодзіць калгасу і лічна таварышу Сталіну. Ласімовіч — вораг народа, яго — к атвету». Во як пісалі...

Асцярожна ссунуўся з сена, намацаў босаю нагою прыступку лесвіцы — яна, рубежаватая, аж упівалася ў ступню — і злез долу.

Пасля цёплага сена раніца ўдавала яшчэ больш халоднаю — аж сцепанула ўсяго. Зайшоў у сенцы, з даёнкі напіўся цёплага малака — маці толькі што падаіла карову: звон малака аб даёнку і разбудзіў мяне,— і выйшаў на двор.

Пеўні яшчэ не спявалі — маўчаў нават Цімохаў крычан.

Там, за старым Жыцькавам, за крыніцаю, дзе зрабілі загарадзь для жывёлы, чуўся смех, гоман, бразгатанне вёдзер, бітонаў — там даяркі з Лах даілі калгасных кароў. Галасна размаўлялі і пастухі, чакаючы, калі можна будзе выганяць.

Кашляла ў агародзе маці — яна капала на снядание бульбу: раз-пораз вядро глуха бразгала, калі ў яго падалі бульбіны.

Я адчыніў вароты ў хляве, якія завішчалі, як нямазаныя калёсы, і Лысеха, без асаблівай ахвоты, спакойна падняўшыся, няспешна пайшла «ў поле» — адразу праз дарогу. Кароў у Жыцькаве ганяюць па радоўцы, і сёння чарга дайшла да нас.

Ускінуўшы на плечы фуфайку, услед за Лысехаю выйшаў «у поле» і я, сеў на вялікі камень, які да вайны ляжаў пад вуглом печае хаты. Пачакай, пачакай, дык чыя ж гэта была хата? Вось там, насупраць нас, паказвалі мне, жыў Дарахвей, вось тут, бліжэй — Цыган, а гэта ж падмурак Алелькавай хаты. Ага, правільна — тут жыў Алелька.

Калі ў Жыцькава ўпершыню трапляе чужы чалавек, на першы погляд яму здаецца, што тыя шэсць жыцькаўскіх хат, якія адрадзіліся з усёй вёскі пасля вайны, стаяць абы-як, абы-дзе. Ён нават не ўгледзіць той асноўнай і прасторнай некалі вуліцы, па абодва бакі ад якой стаялі хаты: былая вуліца, узараная бомбамі і снарадамі, акопамі і хадамі злучэнняў, зусім зарасла, а тыя пратаптаныя сцежкі і сам тоненькі ручаёк дарогі так круцяцца, абыходзячы яміны і акопы, што нават сам, пажыўшы тут, часам не ведаеш, да чые хаты яны прывядуць.

Калі нашы войскі наступалі, менавіта тут стаяў фронт. Позняю восенню два месяцы нашы не маглі выбіць немцаў з Млынароў і Мамонаў — фашысты загадзя ўмацаваліся там, дарогі — і чыгунка і шаша — былі ў іхніх руках, а нашы салдаты насілі снарады на сабе — праз балота, па восеньскай бездаражы, амаль галодныя, бо па такой раскіслай твані не маглі прабіцца сюды не толькі цяжкія машыны, але нават і лёгкія салдацкія кухні. Жыцькава стаяла высока, і адтуль, з-пад Млынароў, як на далоні была відаць нават і без бінокля кожная хата, а таму і ўся вёска, і хаты яе былі добрымі арыенцірамі для артылерыстаў: шырокая вілка, вузкая вілка, прамое пападанне...

Жыцькаўскія хаты паміралі то ад бомбы, то ад снара-

да, то ад трасірнай кулі, а тыя, што асталіся пакуль што цэлыя, усё роўна потым разбіралі салдаты — яны рабілі з іх зямлянкі, накаты. Вось так і асталіся паміж зямлянак і ямін ад бомбаў адны толькі падмуркі: Груздоў падмурак, Дарахвееў падмурак, Цыганоў падмурак... А гэтыя шэсць хат, што сёння стаяць у Жыцькаве, пабудаваліся пасля вайны ўжо...

Узняла галаву, зараўла Лысеха. Я зірнуў туды, куды глядзела і яна, і ўбачыў Гапкіну карову, якая, спутаная, паціху ішла сюды. А ля згароды, у ранішнім і таму доўгім і густым ценю ад хаты, з прутом у руцэ, стаяла Ліпа, Гапкіна дачка, і чакала, ці туды, куды трэба, пойдзе Рагуля.

Ліпа са сваёй малою дачкою ехала з поўдня, дзе яны адпачывалі ля мора, і ўсё ж вымеркавала колькі дзён, каб заехаць у Жыцькава,— маці ж, як ёй пісалі, дужа хворая і дужа хоча ўбачыць дачушку з унучкаю. Ліпа пабыла тут дні са тры і, убачыўшы, што маці яшчэ трохі ходзіць сама,— яна ж усё ёй гаварыла: «Не, дачушка, не, я яшчэ пералетую. Многа ўжо жыць не буду, а пералетую яшчэ раз»,— і, падвяселеная матчынымі словамі, дачка заспяшалася ў свой Станіславаў. Заадно яна ўгаварыла ехаць дадому і Маласая, свайго старэйшага брата, які збіраўся яшчэ крыху пабыць ля маткі: а раптам што якое... Але потым Маласай згадзіўся з сястрою: удваіх жа ў доўгай дарозе будзе ім лягчэй. І, відаць, сёння ці заўтра яны ад'язджаюць.

— Куды ты глядзіш? — прыкрыкнула Ліпа на Рагулю, якая стаяла і пазірала некуды ў другі бок — зусім не туды, дзе скубла Лысеха.— Ідзі да кароў, я табе кажу.

Ліпа працавала на фабрыцы і доўга не магла выйсці замуж: ёй мінула ўжо і тры дзесяткі год, а яна ўсё хадзіла ў дзеўках. Гапка, калі яшчэ была маладзейшая, апраўдвала дачку:

— А нашто ёй выходзіць толькі для прыліку? Каб адно лічылася, што пабыла замужам? І ўсё? Не, мая Ліпачка не такая. Не, мая дачушка за абы-каго не пойдзе.

І праўда, на чацвёртым дзесятку дачушка нарэшце выйшла замуж за сціплага і добрага хлопца, які быў за яе гадоў на дзесяць маладзейшы. Жылі яны пакуль што ў вялікай згадзе і любові. Летась, калі Ліпа з мужам былі тут як не ўсё лета, жыцькаўцы проста дзівіліся, як дружна яны жывуць: у грыбы — разам, на ваду — разам, у магазін — таксама разам.

Ліпа, захутаўшыся ў фуфайку, якую, спяшаючыся, на-

кінула, відаць, на начную сарочку — тая бела і доўга цякла з-пад фуфайкі як не да самаї травы,— усё яшчэ стаяла ля згароды. Потым, калі ўбачыла, што карова надыніла да нашаї, яна, прыціскаючы рукамі фуфайку, каб не расхінался, павярнулася і пайшла ў хату — высокая, худая. Дарэчы, яны ўсе, апрача, можа, Волькі, такія худыя — парода. Вунь Маласай таксама — худы-худы: адна скура ды косці. Калі летась у яго нечакана здарыўся прыступ апендыцыту і Маласай трапіў у Азярычынскую бальніцу, Гук, галоўны ўрач бальніцы, які рабіў яму аперацыю, здзівіўся:

— Што гэта ты такі худы, як здань? Што, у вас там хлеба няма, ці што?

Але і Гук і іншыя ведалі, што хлеб тут ні пры чым,— такога хоць ты і ў кубел з салам пасадзі, усё роўна не пакруглее: парода!

А Кагадзей, якому не падабалася, што Ліпа едзе сама ды яшчэ звозіць з сабою і Маласая, сварыўся на яе:

— І гэтая — акурат матка. Копія маткі. І крошачкі падабрала. І ёй, як Стахванаўне, ніколі не стаіцца і не сядзіцца. І не ўладзіш ніколі. Міхалка, бывала, прынясе поўныя вёдры вады, яна на яго такі крык падніме. Кляне: «Во, нячысцік, прынёс поўныя вёдры, напалівае зараз тут, дошкі ўсе пазгноіць...» Прынясе няпоўныя — зноў крык: «Во, нячысцік, прынёс вады, як украў усё роўна. Што ты там лыжкай чэрпаў, ці што? Не мог поўныя прынесці!.. Рукі табе б адсохлі, ці што? Баішся ты дужа ператашміцца. Прынёс, як кату,— у дне толькі».

Відаць, Кагадзей усё не мог даравацъ Стахванаўне сваю «падпольную жаньбу» — калі тая не хацела аддаваць за яго Волькі і калі яму, як у даўнейшыя часы, даводзілася яе выкрадаць.

Але і сам я, пажыўшы трохі ў Жыцькаве, бачыў, што Ганка чалавек своеасаблівы. Калі, да прыкладу, падыходзіла да яе хаты радоўка, дык яна не спяшалася выганяць кароў у поле, а калі пасвіў хто іншы, Стахванаўна адразу, як толькі надоіць, выганяла карову з двара, падганяла яе пад самыя вокны таго, хто той дзень у полі, і — хочаш не хочаш, а выганіш раней часу.

З-за бяроз, з-за Прутнёвых кустоў, ламаючы галавою галінкі — тыя, што не ламаліся, слізгалі па рагах,— выйшла Моціна карова, настаяла крыху, потым павярнула галаву назад, раўнула, нібыта гаворачы Моці, што знайшла нарэшце кароў. Сама Моця за ёю не ішла — яна ведала,

што яе Вялушка нікуды ў школу не палезе, нікуды не сыдзе. Гэта ж не яе ранейшы зброд, ад якой Моця і наплакалася, і набегалася і ў Весялёўкі, і ў Млынары, і ў Грукава. Без хлеба карову нельга было заманіць у двор. Цімоха нават жартаваў, што Моця ёй хлеб маслам мажа, каб угаварыць ісці дамоў.

Зарыпелі Цімохавы вароты, і з іх, бачу, выганяе пехта карову. Але хто ж гэта? Далекавата, не разабраць. Цімоха? Рапік? Не. Ага, гэта Слаўка, Цімохаў сярэдні сын, што крапаўшчыком у Ленінградзе працуе. Але калі ж гэта ён прыехаў? Учора не відно было. Відаць, вячэрнім, ленінградскім.

Я, мусіць, не памылюся, калі скажу, што ўсе нашы вёскі адчуваюць прыцягненне вялікіх гарадоў. Яго хапае на сотні кіламетраў, і людзі з вёсак і нават з невялікіх райцэнтраў, як усё роўна патрывожаныя магнітам, едуць туды і на заробкі, і ў госці, і на святы. Яно і не дзіва — там ужо сабралася многа аднавяскоўцаў, многа радні, што працуе і на заводах, і ў магазінах, і ў міліцыі, там ужо выпадкова на вуліцы можна сустрэць знаёмага і не здзівіцца гэтаму. З кіламетрамі, з адлегласцю гэтае прыцягненне слабне, і недзе, за нейкаю мяжою, перамагае прыцягненне іншага ўжо горада. Адсюль людзі едуць менавіта ў новы горад — зусім у іншы бок.

Жыцькава, хоць яно і знаходзіцца так далёка ад Ленінграда, моцна трымаецца ленінградскага прыцягнення. Там ужо сабралася многа жыцькаўцаў, якія кожнага новага аднавяскоўца прымаюць, быццам сваяка, дапамагаюць знайсці яму працу, даюць хоць часовы, але ўсё ж прытулак у сваіх не вельмі прасторных кватэрах і пакойчыках.

Сёй-той, праўда, едзе ў Віцебск, у Мінск, а то, як Андрэй, і ў Талін, але ўсё ж самы жыцькаўскі горад — Ленінград...

Вось і Слава ўчора быў у Ленінградзе, а сёння ўжо ў Жыцькаве...

Слава хутка ідзе за кароваю. Калі ён мінуў Шыбекаву хату, расчыніліся веснічкі, і з іх выйшаў спачатку Павел, а за ім — і карова. Генерал быў босы, у той жа клятчатай сарочцы, у той жа світцы, накінутай на плечы,— як і не распранаўся ўсё роўна. Ён іш0ў наперадзе, трымаў прут назад, і карова, як за вяроўкаю, ішла за гэтым прутом. Потым Павел спыніўся, прапусціў карову ўперад, пяшчотна пачаў сцябаць па яе круглых баках, і тая не-

ахвотна, але ўсё ж пабегла. Яны дагналі Славу, і генерал, парукаўшыся з ім, відаць, папрасіў: «Гані і маю»,— а сам спыніўся, высока ўзняў руку і памахаў ёю мне — вітаўся, бо думаў, што словы не пачую.

Слаўка, не дагнаўшы кароў з дзесятак метраў, пакінуў іх каля Дарахвеева падмурка (яны самі потым саб'юцца ў статак), абмінуў іх, падышоў да мяне, неяк парывіста падаў руку — нават не падаў, а ўсунуў яе ў маю — і прывітаўся:

— Здароў, стары!

— Здароў, малады!

— А дзе ж твая пуга?

Я паказаў доўгі лазовы прут.

— Не, гэта не паможа. Гэта табе не студэнты — разбягуцца. Іх экзаменам не запалохаеш. Схадзі ў майго бацькі вазьмі пугу. На прызбе ляжыць.

— Добра, добра, вазьму. А калі ж гэта ты з'явіўся?

— Вячэрнім прыехаў. І вячэрнім ад'язджаю. Сёння ж. Забяру Зойку з малым і — ту-ту! Будзь здарова, Жыцькава! Ну, ладна. Я пабег — дасыпаць сваё. А то, ведаеш, позна прыехаў, пакуль з бацькам пагаварыў, пакуль з сынам выпіў... Што?.. Тфу ты, чорт! Во бачыш, ужо загаварваюся ад недасыпу — пакуль з сынам пагаварыў, з бацькам выпіў... Ды ты, відаць, і сам зразумеў.

— А чаго ты ўскруціўся так рана?

— Я сам устаў. Не думай, што мае старыя не даюць госцю паспаць — карову выгнаць успаролі...

І пабег назад. Я толькі паспеў заўважыць, што Слава адпусціў белыя, пшанічныя вусы.

Цімоха, калі Слава прывёз першы раз у Жыцькава сваю невялікую ростам, але вельмі ж кругленькую, пухленькую і смелую на язык жонку, нешта не ўпадабаў Зойкі. Калі маці пыталася ў яго пра нявестку, моршчыўся і толькі махаў рукою:

— Ай, Надзёжа, якія яны цяпер нявесткі. Яна толькі тое і робіць, што рукі мые. Хлеба адрэжа — рукі мые, лыжку падасць — рукі мые, малака з гладыша нальё — зноў рукі мые. А рукі тыя дужа ж ужо танюсенькія. Калі бярэцца выкручваць якую анучу, аж боязна робіцца — вово пераломяцца.

Але гэта было толькі спачатку, цяпер ён ужо, здаецца, змірыўся з нявесткаю і так прывык да яе і да ўнука, што нават угаворваў Зойку пажыць яшчэ хоць тыдзень у Жыцькаве. Цяпер ён ужо ўсім хваліўся сваёю нявесткаю:

«О, яна, брат, у майго гаспадыня. Дужа ж вязаць любіць. Пакуль дзіцё нарадзілася, дык яна ўсяго яму напавязала — і шапачак, і шмапачак». У Цімохі заўсёды так — як з тым Ранікам.

Цімоха ўгаворваў нявестку пабыць яшчэ, а Волька маўчала: яна не вельмі гадавала сваіх дзяцей, не хацела няньчыцца і з унукамі. І раней, калі ёй бабы ў полі гаварылі: «Пачакай, пачакай, панапякла дзяцей, вось напавязуць табе яны ўнукаў, і ндзе не дзенешся — будзеш сядзець з імі, як на пенсію пойдзеш»,— яна аж злавала: «Не ўжо, гэтага яны не дажпдуцца. Я, можа, на пенсіі пагуляць хачу. Прыбяруся, губы начырваню і на танцы пайду. Ці хоць так на лавачцы ў шаўках пасяджу. Можа, і Цімоху з кустоў вымапю. Можа, свайго, а можа, і чужога».

Жанчыны таму не здзіўляліся. Яны без яе, праўда, толькі націскалі плячыма:

— А што ёй, Вольцы, абыходзіла. Яна ж толькі тое і ведала, што дзяцей раджаць. А сама ні пялёнак, ні калысак, ні сосак — нічога не знала. Усё Праскутка, Цімохава матка, пакуль жыла, рабіла. Ужо згорбілася была ўся, ваду тую носячы, а яны хоць бы вядро калі паднеслі...

У Цімохавым двары забразгалі вёдры — цётка Волька пайшла па ваду: як памерла Праскутка, гэтую работу робіць яна.

Я не разумеў, чаму цётка Волька не любіла гадаваць дзяцей. Яна ж заўсёды працавала цяжка, па-мужчынску спорна — як за трох. «Агонь яе ведае, гэтую Вольку,— раніцою неяк, ставячы на стол снеданне, гаварыла маці.— Во ўжо здарова дык здарова. Яна, вун, адразу ў печы паліць, атаву косіць і ў полі пасвіць». І праўда, толькі што, здаецца, яна была ў агародзе, а ўжо, глядзіш, з Азярычына едзе; толькі што была ў Славы ў Ленінградзе, а ўжо, глядзіш, з Грукава віно нясе...

За маёю спінаю пачулася шамканне. Яго не зблытаеш ні з чым — так шарсціць шаргатлівы, як наждак, каровін язык па роснай траве, якая скубецца блізка ля кораня. Азірнуўся. У табун ішла Галашкіна рабая, як вайсковая плашч-палатка, карова. А ля самага рога згароды, пад Мохам — зарослым алехавымі кустамі ручаём,— стаіць Мікалай, Галашкін сын. Ён, схаваўшы рукі глыбока ў кішэні штаноў, з-над шапкі, насунутай як не на самыя вочы, жмурачыся, глядзіць у мой бок і курыць — папяроска, відаць, прыклеілася да губы і дыміць аж у самы нос.

Глядзець, пэўна, яму пад сонца дрэнна, але рукі з кі-

нэні, каб засланіцца, ён не вымае — ляпуецца. Мікалай перагнаў карову праз Мох, пужнуў яе, дык яна сама і пабегла ў чараду.

Галашка са сваім сынам з'явілася ў Верхах, вёсцы, якая ўпрытык стаіць да Жыцькава, не так даўно. Спачатку, праўда, прыехала адна. Прачула, што стары адзінокі Дзяніс, не зважаючы на свае семдзесят год, зайшоў у прымы ў Лахі, прадае сваю хату, і прыехала таргавацца. Таргавацца асабліва не давялося, бо Дзяніс ужо колькі год жыў у сваёй новай жонкі ў Лахах, а хата стаяла пустая. Праўда, Дзянісаў агарод пакуль што засяваў сын Сашка. «А што яму, твайму Сашку,— як не лаяліся жыцькаўскія жанчыны.— Ён жа здароў як бык — можа не тое што два, а і пяць гародаў урабляць. Толькі дай. Ён жа і пасля вайны пасіўся як ашалелы па бабах ды па ўдовах. Так ужо яраваў — усюды яго хапала: і ў Весялёўках, і ў Грукаве». Сашка касіў таксама і пожню, але ў хату асабліва не заходзіў — не было патрэбы, і замок усё больш іржавеў і іржавеў. На згародзе вісела старэнькая прутня, якая, здавалася, нікому ўжо і не трэба была, але калі нашы дзеці знялі яе і занеслі ў ручай — спрабавалі лавіць рыбу: прутня разлазілася не толькі ад карчоў, але нават і ад травы,— Сашка, убачыўшы прапажу, не паленаваўся прыйсці да нас і прыгразіў Петрусям:

— Мальцы, занясіце прутню назад. А то будзе дрэнна. Не вы яе паклалі, не вам яе і здымаць.

— А самому ж, як толькі вып'е, абавязкова нада нешта ўкрасці,— калі ён пайшоў, бурчала маці.— Бітон на згародзе вісеў, і той зняў.

Хлопцы занеслі прутню назад і зноў павесілі на згароду. Вунь яна і сёння яшчэ вісіць там — падрапаная, паламаная,— але Сашка, відаць, і Галашонкам не дае яе здымаць: яна, прутня гэтая, нібыта ўсё яшчэ лучыць яго з прададзенаю бацькам хатаю, з колішняю бацькаваю спадчынаї...

На другі год да маткі, у Дзянісаву хату, прыехаў і сам Галашонак. Спачатку жыцькаўцы, а таксама верхоўцы здзівіліся і нават разгубіліся — яны не верылі сваім вачам:

— Як? Ён, гэты паліцай, не збаяўся да нас прыехаць? Як ён у вочы нам глядзець будзе?

І Галашонак, праўда, некалькі тыдняў хадзіў, гледзячы ў зямлю, а пасля нічога — падняў галаву, хоць стрымана і насцярожана, але ўсё ж пачаў здароўкацца.

Галашцы адной давалі малако і ў саміх Вархах, не адмаўлялі, калі прыходзіла з бітончыкам, і ў нашым Жыцькаве. А як прыехаў сын і сам пачаў хадзіць па сырадой — усе, бы згаварыўшыся, шукалі прычыну, каб адмовіць: то каровы пачалі малака менш даваць, то свае госці навыпівалі ўсё.

Пахадзіў, пахадзіў Галашонак з бітончыкам дый перастаў. А пасля яны з маткаю, відаць, зразумеўшы ўсё, купілі карову — вось гэтую пярэстую, як вайсковая плашчпалатка, вялізную, як стадола, і не маладую ўжо — ці не дзесятым целем — малачаўніцу.

Малачаўніца перайшла цераз дарогу і далучылася да кароў.

З нашага коміна прама, угору, ішоў дым. Уявілася, як горача палае ў печы, як шугае там агонь, як ён расцякаецца па паднябенні, як раздвойваецца, растройваецца, загінаецца і тоўстымі, мяккімі кончыкамі полымя далізваецца нават у комін — нібыта нехта нябачны жоўтым і шурпатым языком аблізвае чарэнь.

Цёплыя, шурпатыя ад вясковай працы рукі лёгка, не ціснучы асабліва, заслапілі мне вочы. Хоць я адразу па пальцах і далонях зразумеў, хто стаіць за маёй спіною і так стрымана, стоена дыхае, усё ж прытварыўся і пачаў гадаць:

— Пятрусь?

Маўчанне.

— Андрэй?

Маўчанне.

— Ну, тады гэта дзядзька Цімафей.

Вера засмяялася, адпусціла рукі і, узрадаваная, што не ўгадаў, села на камень побач са мною, прыхінулася і адразу ж утачылася пад маю фуфайку — я прыемна адчуў яе, абцягнутую лёгкаю летняю сукенкаю, захаладалую ад ранішняй ядранасці.

Павярнуўся, каб лепей села Вера, і ўбачыў, як ад нашае згароды за Мох шырока шыбаваў Галашонак — усё не вымаючы рук з кішэняў, усё пыхкаючы папяроскаю: рэдзенькі дымок то знікаў, то зноў віўся ў яго за вухам. Мой позірк перахапіла Вера і яшчэ бліжэй прыціснулася да мяне.

— Бачыў, як паліцай абгарадзіўся? Дроў вунь колькі наклаў, лазню будуе — відаць, доўга жыць збіраецца тут... Цімоха чуў, як мужчыны казалі яму: «Ты ж, Мікалай, рэж на дровы Дзянісавы хлявы і прыбудаванкі — бачыш, у

яго калькі». А ён: «Навошта? Дроў я і сам прывязу. А тут курачак развяду, парася куплю».

Вера глядзела некуды далёка за Мох — успамінала.

— А я ж як сёння помню, хоць і малая была... Сталі мы з мамаю ля крыніцы. Таты ж тады не было — тату ж вайна ў турме застала, ён яшчэ толькі ішоў дадому пехатою з Заходняй, дзе яны падземны аэрадром будавалі. Мы, значыць, чэрпаем ваду, а ідзе, як сёння помню, Ручаль. Спыніўся і гаворыць маме: «А ў нас жа, Надзёжа, сёння радасць вялікая. Сёння ж мой пляменнік Мікалай вінтоўку палучыў». Гэты во Мікалай, паліцай гэты. Людзі кажуць, што ён сам і не хацеў асабліва ў паліцыю тую, але дзядзька, Ручаль, выпер яго. Мама казала, што тады стаяла і думала: «У каго ж ты, Ручаль, з гэтай вінтоўкі страляць будзеш?» І я дрыжу — хоць і малая, але ведаю, што бацька ж наш старшынёю ў калгасе быў. Але Ручаль, нібы адчуўшы наш страх, супакоіў: «Вам, Надзёжа, асабліва няма чаго баяцца. Апанас жа за сваё прысідацельства ўжо ў турме адмучыўся...»

Галашонак схаваўся за алешнікам, а крыху згадзя адтуль, дзе стаяла Дзянісава хата, пачуліся глухія ўдары доўбні — Галашонак забіваў новае колле, абгароджваючыся яшчэ шчыльней.

Пасядзелі моўчкі, потым Вера зноў першая пачала:

— Пачакай, а па чыім жа гэта мы хацішчы сядзім?

Яна высунула з-пад фуфайкі палец, пералічыла падмуркі: Дарахвееў, Цыганоў, Алелькаў.

— Алелькава хата была,— сказала Вера і ўсміхнулася.

— Чаго ты смяешся? — спытаўся я, бо мне здалося, што яе смех быў недарэчы.

— Успомніла, як Алельку на самалёце каталі...

Алелька быў, як кажуць жыцькаўцы, вельмі злы на работу. Цімоха божыцца, што хату, на падмурку якой мы сядзім, ён прынёс на сваіх плячах з лесу — пойдзе, спусціць елку, абцярэбіць, узваліць на плячо і прывалачэ. Аддыхаецца — і зноў у лес. Так казалі адны. Другія ж сцвярджалі, што насіў ён толькі па адным бярну ў дзень, а па другое ўжо не ішоў — адпачываў.

У калгасе ён таксама працаваў шчыра. На праўленнях яго, стаханаўца, заўсёды хвалілі. І вось неяк у раёне да грамат, якімі ўшаноўвалі перадавікоў, прыдумалі яшчэ штосьці новае.

У адзін сонечны нядзельны летні дзень над Жыцькавам завуркатаў і пачаў раптам кружыцца двухкрылы, як

страказа, самалёт. Людзі павыбягалі з хат і як заварожаныя глядзелі на яго, а ён, пакружыўшыся, пакружыўшыся над вёскаю, узяў ды сеў на жыцькаўскім лузе. Лётчык прыляцеў са спісам — стаханаўцаў узнагародзілі палётам на самалёце. Так сказаць, кругам гонару. Быў у гэтым спісе і Алелька. Кажуць, калі яго ўгаварылі сесці, калі самалёт адарваўся ад зямлі і пачаў набіраць вышыню, Алелька збялеў, учапіўся ў нейкія рамяні і голасам, які нерасеў ад страху, крычаў, як шаптаў:

— Мальцы, мальцы, што вы робіце... Мальцы, мальцы, не зваліце... Мальцы, мальцы, не абярніце гэтыя калёсы...

Потым, як толькі самалёт прызямліўся, Алелька вываліўся з кабіны, надхапіўся і так ірвануў некуды ў кусты, што, як яго ні клікалі, як ні свісталі, не спыніўся. Цімоха і зараз, усміхаючыся на ўвесь свой шчарбаты рот, даводзіць, што Алелька бег тады шпарка гэтак да рэчкі, да Дубоўкі, да вады...

Сын яго, Аляксей, таксама, як і бацька, быў на работу завідлівы і ўсё стараўся, каб нікому не паддацца.

— Бывала, наш Іван, бацькаў брат, і Сліндукоў Аўсей,— расказвала маці,— маладыя яшчэ хлопцы, косы навядуць і як пойдуць касіць, аж раса ва ўсе бакі свішча. А ён усё іх абагнаць хацеў. І раней выйдзе, і абед скароціць, косіць-косіць, а брыгадзір прыйдзе, памерае — усё ў іх болей. А ён так ужо хацеў пераганаць, што кроўю па двор хадзіў...

З іх трохі пасмейваліся ў Жыцькаве, але і паважалі ўсе — вёска паважае чалавека, які любіць працу.

Няма ўжо Алелькі — трасірная куля ўвечары наспела яго ля самае хаты: ён, мёртвы ўжо, кажуць, ціха асеў на прызбу і так лёгенька, так далікатна прыслаціўся галавою да акна, што не толькі не выбілася, але нават і не зазвінела піводная шыба. Няма і сына — Аляксей загінуў на фронце. Няма і хаты — яе разабралі салдаты на бліндажы, а пасля жанчыны, хто будаваўся, расцягнулі па бервяну на свае пасляваенныя ўдовіны «святліцы». Можа, і ў нашай хаце ёсць Алелькавы бёрны, якія ён прынёс некалі з лесу — на сабе.

Каровы, скубучы, па ручаі адышліся далекавата — пад крыніцу. У статку была ўжо і Цытнячышына Чарнуля — мы не заўважылі, ці яе хто прыгнаў, ці яна, можа, прыйшла сама.

Перабраліся бліжэй да кароў. Селі на самы шырокі камень Груздова падмурка — халодны і яшчэ сыраваты з ночы.

Хата ў Грузда была невялікая, але стаяла высока. Яшчэ і цяпер, хоць прайшло столькі год, высока пакладзенае каменне, якое было пад ніжнім вянцом, не паспела ўтравець. Верхняе сям-там адвалілася, сям-там з падмуроўкі высыпаўся раствор — са шчылін імкліва, зелена ў бакі і ўверх вырывалася трава. На самім хацішчы, на пагорку, дзе стаяла, відаць, печ, лапушыста буяў дзядоўнік і цвіў фіялетава-чырвонымі чубкамі, якія вытыркаліся з сінявата-зялёных і круглых, як цыбуліна, карабочкаў.

Вера зноў утачылася пад маю фуфайку, абняла мяне абедзвюма цёплымі рукамі.

— Як толькі прыйшлі да нас першыя немцы,— нібы ўспамінаючы для сябе, пачала яна,— Грузд, які да вайны ўсё не ладзіў з калгасам, выйшаў іх сустракаць. Кажуць, шукаў хлеба і солі, але ў поспеху не знайшоў і таму выбег з голымі рукамі. «Спасіцелі вы нашы! — закрычаў ён і кінуўся да немцаў.— Ратаванцы дарагія!» А немцы не зразумелі, чаго ён да іх бяжыць і што крычыць,— падумалі, ласцца на іх — і так агрэлі Грузда плёткай — тою, якою коней паганялі,— што ён доўга стаяў, абціраў кроў з рассечанай шчакі і, як вар'ят, замест таго каб плакаць, смяяўся...

Мне расказвалі, як Грузд потым памагаў партызанам і як ён загінуў. Яго сын, падлетак, украў у немцаў пісталет, і яны прывялі яго на бацькаў падворак — расстрэльваць. Якраз перад тым, як затрашчала аўтаматная чарга, Грузд сам кінуўся пад кулі — думаў, заслоніць сына, але ўжо было позна: іх, бацьку і сына, так і пахавалі людзі разам, у адной магіле...

У Цыгановай падмуроўцы скубла траву Галашонкава малачаўніца.

— Во, і Цыганова каменне развальваецца. А як ён, гэты Цыган, будавацца нам не даваў...

Вера змоўкла і, не скончыўшы думкі, пільна ўглядзелася за Мох — туды, дзе былі Вархі.

— Зірні, зірні,— тарганула яна мяне за руку,— вунь Казятнік у поле пагнаў.

Я толькі паспеў убачыць, як Заморак, у бушлаце і ў зімовай шапцы, паспешна сігануў у кусты: козы не паспелі так хутка выбегчы са двара і ўсё яшчэ ішлі туды, дзе схаваўся гаспадар.

Казятнікам чалавека празвалі за тое, што ён трымаў каля двух дзесяткаў коз — сам іх пасвіў, сам даіў, сам рэзаў на мяса. Ён, маленечкі, дробненькі, даводзіўся майму цесцю нейкаю далёкаю раднёю, жыў разам са сваёю сястрою ў адной хаце і неяк пазбягаў людзей, стараўся не трапляць асабліва нікому на вочы. З дзецьмі, калі ўбачыць, што з імі няма дарослых, любіў і пагаварыць. Бывала, збярэ іх ля сябе і кажа:

— Чаму, вы думаеце, дзеці, мяне Заморкам завуць? А таму, што я за морам быў. Во чаму. А потым вярнуўся ў Вархі.

Гэта, відаць, было яго самаю вялікаю мараю — пабыць за морам: за свой немалады ўжо век Казятнік ніадкуль і ніколі не вяртаўся, бо ніколі і нікуды не сздзіў. Нават у бліжэйшыя вёскі ён не хадзіў — па хлеб і па цукар у Грукава хадзіла заўсёды сястра, маладзейшая крыху за яго.

За каровамі і мы з Вераю перабраліся яшчэ далей у кусты — туды, аж пад Цімохаву новую лазню, якую ён скончыў будаваць толькі летась і якую паставіў амаль на самым дворышчы Валачобіхі: сама Валачобіха гады тры таму назад пераехала ў Дыдулі, куды зайшла замуж адзіная яе дачка, а маленькую хатку зяць, трактарыст,— прыехаў неяк з прычэпам, упёрся трактарам у вугал, дык яна і рассыпалася,— забраў на дровы. Таму вясною, відаць, у самае акенца Цімохавай лазні густа ломіцца сіні бэз, а ўвосень да самых дзвярэй звісаюць цяжкія гронкі рабіны, што стаяла некалі пад вокнамі Валачобішынай хаты.

Лазня прасторная, паліцца па-чыстаму, і тут жа, непадалёк ад яе,— калодзеж. Праўда, з гэтага калодзежа жыцькаўцы ваду бяруць толькі скаціне, намыць што ці паліць грады, а па чыстую і смачную — пітную — усе ходзяць далёка, у старую крыніцу, якая, апраўленая ў невялічкі драўляны зруб, булькае ў ручаі. Летась, праўда, вада ў ёй крыху замуцілася, пасля таго, як побач, на вялікім узгорку, зрабілі загарадзь для калгасных кароў.

Але і на такія падможныя патрэбы Цімохавай крыніцы ў спякотныя дні не хапае нават і на маленькае Жыцькава. Ад яе добра-такі ўтаптаныя, абыходзячы кусты, спяшаюцца да хат тры сцежкі: адна ідзе ў наш бок — па ёй ходзім мы і Цытнячыха, другая прастуе да Цімохавай хаты, а трэцяя, тая, што шукае Шыбекаў двор, потым раздвойваецца і, ужо менш утаптаная, спяшаецца да Моцiных веснічак. Праўда, была яшчэ чацвёртая сцежка — да

Стахванаўны, але апошні год яна зусім, лічы, зарасла: ці многа трэба той вады старому і хвораму чалавеку, да таго ж да чыстай крыніцы ад Ганкінай хаты, здаецца, нават ці не бліжэй, чым да гэтай...

Заляскаталі калёсы. Па дарозе, ля самага ячменю, ехаў брыгадзір Гардзей і, не злазячы, звесіўшы праз драбіны ногі, нагнуўшыся да сцяны збожжа, хапаў на хаду каласы, смыкаў іх і вырываў разам з саломкаю — відаць, каб паглядзець, ці спелае ўжо зерне.

Конь — сівы, з чорнаю грываю. У кашале на ручкі накладзена зялёная атава — за дзень яна, відаць, так запыльваецца, што яе не бярэ ссці і конь.

Гардзей, тоўсценькі, кругленькі дзядзька, заўсёды ездзіць толькі так, толькі на калёсах — ён, здаецца, з іх ніколі і не злазіць. Таму я не ўяўляў, які ён ростам — высокі ці нізкі? Калі сустрэне каго, спыніць каня, пагаворыць, седзячы, і паехаў далей. Калі нават чалавек стаяў у такім месцы, куды лепей было б дайсці, ён усё роўна па любой сцяжынцы ехаў канём. І толькі калі ўжо даехаць было нельга, пад'язджаў як мага бліжэй, але ўсё роўна з калёс не злазіў — сядзеў і крычаў, высвятляючы, што трэба. Словам, я ніколі не бачыў яго без калёс і таму жартам зваў яго новым грукаўскім кентаўрам — Калёсачалавекам.

Яго, маладога і прыгожага мінёра, упершыню ўбачылі тут адразу пасля таго, як нашы выбілі немцаў з Млынароў: цэлы ўзвод салдат прыехаў сюды, каб размініраваць навакольныя палі, лугі і лясы. Прыехаў з імі і Гардзей, ды вось і застаўся тут, пакінуўшы недзе ў Расіі сваю даваенную жонку з дачкою.

— Каб ты бачыў, які ён прыгожы быў малады,— як усё роўна здагадаўшыся, пра што я думаю, сказала Вера,— жыцькаўскія жанчыны аж у Грукава на танцы хадзілі, каб толькі паглядзець на яго. Ды і мы, дзеці, таксама бегалі. Гардзей спачатку за Матрунаю Дзянісёнкавай хадзіў, а пасля, як убачыў Хвеньку, што ў канторы справаводам рабіла, дык адразу і за дзвюма бегаць пачаў. Вось мы і хадзілі ў Грукава, каб убачыць тую Хвеньку, якая мінёра ў Матруны адбіла. Пасля і на танцы — цікава ж, каго ён з танцаў праводзіць будзе. А яны адна перад адною як пойдуць дробі біць, дык што ў іх толькі і адкуль бярэцца.

Калёсы сціхлі: Гардзей заехаў у лагчыну, адкуль не чуваць было іхняга ляскату.

— Матруна з Хвенькаю нават біліся,— усё гаварыла Вера.— За валасы адна адну цягалі. Хвенька перамагла. Вунь як я тут у Азярычыне нарадзіла Петруся, дык з ёю, з Хвенькаю, у адной палаце ляжала: яна Гардзею пятую дзяўчынку падарыла...

Зноў заляскаталі калёсы — конь вывез Гардзея з лагчыны і ўзыходзіў на пагорак да Ганкінай хаты. Убачыўшы на двары Ліпу, якая з кварты палівала дачцэ — тая, відаць, сонная яшчэ, лянiва мылася,— нацягнуў лейцы, спыніў каня: стаяў і, не злазячы з калёс, гаварыў — ці то з Ліпаю, ці то з яе дачкою...

— Во, матка там іх чакае, а яны тут сядзяць ды абдымаюцца... Ідзіце снедаць. Правільна я гавару?

Гэта Андрэй. Голас не злосны, але насмешлівы — і калі ён толькі так незаўважна падышоў?

— Вы як Латушкі мае ўсё адно. Яна ўсё вярзе: я прыгожая, я гордая. Тады зойдзеш на кухню — а гэтая гордая ў яго на шыі вісіць. Усё гладзіла свайго афіцэра, пакуль машыну ёй не купіў.

Латушкі — талінскія суседзі Андрэя: ён жыве ў вялікай кватэры на тры сям'і з агульнаю кухняю.

— А і праўда, Юра. Я ж забылася, чаго прыходзіла,— спахапілася Вера.— Мама ж казала цябе снедаць паклікаць.

— Ідзіце, снедайце,— дазволіў Андрэй.— Я ля кароў пабуду.

Мы ўзняліся з нагрэтага каменя, які калісьці трымаў вугал Валачобішынай хаты. Сонца было ўжо высока і добра прыпякала. Раніца нацяплела. Я зняў фуфайку.

Насустрач нам, ціха размаўляючы пра нешта сваё, ішлі нашы хлапчукі: Той і Гэты. Андрэеў — Той, наш — Гэты. Так называлі іх мы, але часам і самі блыталіся і Таго называлі Гэтым, а Гэтага — Тым. Хлапчукі ж клікалі сябе па-свойму — Ра. Спачатку гэта было Брацік, затым — Брат, пасля — Рат, цяпер вось — Ра. Я ўжо жартаваў, што хутка гэты назоў стане яшчэ больш кароткі і жорсткі: р-р-р!

— Ра, пабеглі! — крыкнуў наш, і яны памчаліся да Андрэя — памагаць яму пасвіць чараду.

У загародцы ўсё яшчэ чуваць быў смех, гаворка, бразгатанне. Даяркі, на прыездзе і ад'ездзе якіх мы вызначаем час, падаілі кароў, адправілі малако, а зараз мылі вёдры і бітоны, спаласкваліся самі.

З боку Лах гудзела ўжо машына: яна забярэ дзяўчат і жанчын — тыя з песнямі ўсядуцца ў кузаве,— завязе іх дадому, і тут, да вечара, да другой дойкі, будзе ціха-ціха...

## 3. РАНІЦА, ЯКУЮ СПЯЦЬ ПТУШКІ

***і ў якую добра косіцца атава,***
***а мы на свежых пракосах успамінаем танкі,***
***Дарахвея, Валайкі і даведваемся,***
***чаму Шыбека вярнуў з паўдарогі свайго сына***

Выйшаў з сянец і аж зажмурыўся: у вочы балюча ўдарыла тугое ранішняе сонца. Нават праз заплюшчаныя павекі было відаць, як густа і радасна ходзяць навокал промні — вачам, быццам бы адкрытым пад неглыбокаю вадою, шчодра асветленаю сонцам, было светла і казытліва-ружова.

Я стаяў, прыслаціўшыся спіною да цёплых сенцаў, і пакрысе адплюшчваў вочы, паступова прывучаючы іх да святла.

Значыць, думалася само сабою, хоць і паляцелі так рана ў вырай жураўы, нічога асаблівага не здарылася: зноў вярнулася лета, зноў ласкава грэе сонца, зноў жыцькаўскія госці паскідаюць зараз старыя світкі ды падопранкі і падставяць пад шчодрыя сонечныя праменні свае карычневыя, як жалуды, спіны.

На блакітным, глыбокім і бязмежным небе стаяла адно толькі сонца — ад небасхілу да небасхілу не відно ніводнага воблачка. Сонечнымі ранiцамі неба заўсёды такое. Гэта пасля ўжо, недзе туды пад поўдзень, на небакраі ўзыдзе раптам, як маленечкі маладзічок, светлае невялічкае воблака, стане там і будзе доўга, нерашуча стаяць, пакуль, асмеліўшыся, не адважыцца ўрэшце рушыць наперад. А асмеліцца яно, і за ім ужо крануцца іншыя: яны, падсвечаныя сонцам, сабраўшыся ўжо ў статак, будуць плысці адразу па небе і па зямлі, чапляючыся за парыжэлыя восеньскія палі і лугі плямістымі, наспешлівымі ценямі.

Над нашым гародам, які атаваю спускаецца аж да Моху, над самім Мохам, нават у замошшы, бела, першародна святліўся туман — нібыта паводная рака, якая знайшла сабе новыя берагі, затапіла кусты, сцежкі і нават палавіну згароды і плыве праз усё гэта ціха-ціха, амаль

незаўважна. Вунь з туману, як усё роўна з вады, тырчыць колькі верхавінак маладзенькіх елачак — усяго нейкія дзве ці тры зялёныя нашатыраныя, нібы напалоханыя чым, лапкі, а самі елачкі — пад густымі, белымі хвалямі туману.

Сівая ад расы, бела-зялёная, ядраная, калі падыдзеш бліжэй, атава... Аж золка зрабілася нагам, аж страсянула ўсяго, як ад холаду, калі ўявіў, што па ёй трэба было б вось зараз ісці босаму.

Міжволі ўспомнілася, нібы зноў вярнулася да мяне ранішняя млявая цеплыня хаты, з якой толькі што выйшаў. Бачыў, нібы ўсё яшчэ быў там, як у чырванаватым прыцемку хаты, на саламяным сенніку, пасланым на падлозе, спакойна і соцна пасапваюць насамі нашы хлапчукі, як соладка і амаль нячутна спіць Вера, як вецер ледзь-ледзь адхінае краёк чырвонага старога Верчынага плашча, якім маці завесіла акно — каб сонца не разбудзіла нас рана,— і як тады густы і чырвоны паўзмрок крыху святлее. Успамінаў, як напорыста лезе ў вочы сонца з асветленых сенцаў, як аж ломіцца яно ў хату, калі маці нячутна, стараючыся не бразгаць клямкаю, адчыняе дзверы. Адчуваў, як паволі астывае і мае месца на сенніку, як занудліва гудзе (не адкрываючы вочы, чуеш — недзе над самым тварам) злая пад восень муха...

На босую нагу абуў цеснаватыя чаравікі, якія ссохліся ў сенцах, узяў касу, мянташку і — па расе, па расе — пашастаў да атавы, дзе Андрэй яшчэ ўчора прайшоў пракос, спрабуючы, ці добра косіць каса.

Касілася лёгка і спорна — такая раса, кажуць, сама касу вострыць. Каса не слізгала нават па высока зрэзаных, засохлых карэньчыках, якія засталіся ад першага ўкосу — яны адышлі ў расе і рэзаліся без натугі, амаль нячутна, амаль так, як і атава.

Дакучалі толькі мокрыя і, відаць, дужа халодныя ад таго (успаміналася, як халодзіць такая ступню, калі трапляе пад нагу) вялікія жабы і маленькія жабяняты, якія так і лезлі пад самую касу. Я касільнам выкідаў іх, аброшаных, з атавы на пракосы, а яны, як назло, зноў наспешліва шыліся ў някошанае. І калі каторае ўсё ж трапляла пад касу, ад яго балючага скатання, якое было падобна ці то на плач, ці то на стогн, аж сціскалася сэрца. Баючыся, каб выпадкова не разануць і каб зноў не ўчуць, як пачне плакаць і жаліцца жабянё, я касіў асцярожна, увесь час сочачы, ці не шаволіцца трава.

Адчуўшы гудлівую стому ў мускулах, дзе стаяў, там і сеў на пракос.

Не ведаю, ці гэта я ўжо старэю, ці гэта яшчэ што якое іншае, але ж мне чамусьці да слёз радасна і прыемна проста вось так сесці ў пракос толькі што скошанай травы і дыхаць, дыхаць, дыхаць гэтым непрывялым пакуль водарам, які яшчэ і не сена, але ўжо і не трава, дыхаць і глядзець на жоўтыя няскошаныя кветкі казяльцу, на чырвоныя папкі канюшыны, на сіненькія і невялічкія кветачкі дзікай вікі, глядзець і слухаць неўпя, які дзярэ горла недзе за туманам, за алешнікам — у Вархах...

Саладка і цкліва, аж прытарна пахне трава — нават не верыцца, што, як высахне, яна будзе пахнуць так суха, даўка і задушліва.

Туман, здаецца, адышоўся ад цябе далей — як усё роўна ты, махаючы касою, паразганяў яго,— але добра адчуваеш, як ён, нябачны, халодзіць тваё голае да пояса цела.

Нейкая мошка, нібы парушынка, перад самым маім носам даўно, як навязаная, вісіць у паветры — нават крылаў і то не відаць. Вісіць доўга, а потым, як яе ўсё роўна садзьме хто, ірванецца ўбок і там зноў вісіць, нібы вывучае мяне. І так ужо хочацца даведацца, чаго яна, малеча, вось так, без патрэбы, як мне думаецца, вісіць у паветры — можа, разглядае мяне, чалавека, а можа, у яе ёсць нейкі свой клопат, а я для яе такі ж звычайны, як сонца, паветра, зямля...

Да самае атавы спускаюцца зверху нашы грады.

На бліжэйшай ад мяне градзе ляжаць два грудкі цыбулі: у адным — залацістая, перабраная ўжо, гатовая для пляцёнкі, у другім — яшчэ ў зямлі, неабшалушаная. Маці нават учора напамінала сама сабе: «Нада б было ўжо цыбулю ў пляцёнку ўплесці, а то ў мяшку, хоць і на печы,— гніе».

Невялічкі кусток цыбулі на семя. На зялёных і тоўстых стрэлках — спелыя, светла-карычневыя, пухкія і круглыя, як мячыкі, клубкі, дзе ў светлых абгортках петрывала сядзяць чорныя семкі: хістані стрэлку — і яны сыплюцца, як мак.

Бурыя шырокія сукверці ўкропу — яны ўжо не пахнуць. Тры сланечнікі наапускалі долу галовы — чамусьці не да сонца, а наадварот — ад сонца. Хоць яшчэ раніца і пакуль не горача, паскручваліся лапушыстыя лісты агурочніку, адкрыўшы ўсе агуркі, што ляжаць на градзе,—

зялёныя пуплы, святлейшыя, крамяныя сінчавікі і жоўтыя, нераспелыя, семяннікі.

Далей, ля згароды,— памідоры. Не намаглі ім і падпоры — цяжкія, яны паскручваліся да самае зямлі, пааблісалі на рагулькі. Трэба будзе іх надзяць. І ўжо ад адной думкі, як буду гэта рабіць, стала хораша — з дзяцінства я вельмі люблю нязвычны пах зялёных памідораў.

Скажыце, а хто не любіць тыя пахі! Каму не да душы, як зелена, палахліва яшчэ пахне маладая трава і маладое лісцё; як, нізка прыціскаючыся да самай зямлі, цяжка ходзіць вясною густы пах свежай раллі; як кучарава віецца пах дымку ля агню — у лесе ці ў полі; як шаргатліва пахнуць цёплыя яшчэ стружкі; як суха і смаляна б'е ў нос пах толькі што расшчэпленага карча, над якім так давялося папрацаваць...

Тут жа, пад слівамі, прыўзнятая на калічках над зямлёю, наслана лежня: як было цяплей, на ёй спалі хлапчукі.

На доўгіх і настойлівых, як вужакі (толькі светлыя і лістатыя), гарбузніках паўзуць уніз, выпаўзаючы нават на атаву, гарбузы: вось яны ляжаць, круглыя, вялікія — нібы камяні.

Гарбузы маці садзіць толькі тут: у гэтым месцы яны вельмі ж ужо добра растуць.

Успомніў смешны выпадак і не ўстрымаўся, сам сабе ўсміхнуўся. Аж азірнуўся, ці бачыць хто. А то абгавораць: «Сядзіць адзін і, як дурань, смяецца».

...Тады гарбузы былі таксама на гэтым месцы. Хлапчукі амаль цэлымі днямі гулялі тут. Пасядзіць, пасядзіць на гарбузе адзін, тады злазіць, а яго месца хуценька займае другі. І так увесь дзень. Нават на абед і то іх было не даклікацца. За сталом яны спяшаліся. «Астыне?» — пытаў адзін. «Не, відаць,— адказваў другі,— сонца ж яго грэе».

Пасля абеду яны зноў сядзелі на тым жа самым гарбузе.

— Знайшлі сабе крэсла,— бурчала маці.— Сходзіце прагапіце: яны ж гарбуз раструшчаць.

Калі мы прыйшлі ў грады і Андрэй спытаў у хлапчукоў, што яны робяць, Тоїі адказаў:

— Грэем гарбуз.

— Навошта?

— Хочам, каб гарбузяняткі выведіся,— растлумачыў Гэты.

І як мы ні даводзілі ім, што, колькі ні грэй, ніякіх гарбузянятак яны не выседзяць, дзеці, слухаючыся хоць невялікага, але свайго вопыту (бачылі ж, курыца грэла яйкі і з іх навыводзіліся пісклятки), так і не паверылі нам і доўга думалі, што мы не далі ім вывесці гарбузянятак, бо пашкадавалі гарбуза...

На дарозе весела загула машына. Па гуку пазнаў: легкавая — грузавікі так лёгка не гудуць; можа, таму, што заўсёды нагружаныя, улегцы яны амаль не ходзяць.

Азірнуўся — Каранькевіч, сам за рулём, паехаў пад загародку, дзе працавалі ўжо і смяяліся даяркі...

— Э, ды ты, відаць, у стаханаўцы хочаш выбіцца? Хочаш, каб на самалёце, як Алельку, каталі... Правільна я гавару?

Андрэй сеў ля мяне на пракос — сонны яшчэ, вялы, з сянінамі ў валасах, ён увесь пах свежым і водарным сенам.

— А мне так спалася,— Андрэй пазяхнуў.— Нават суседзяў нешта сваіх сніў. Ідзе, здаецца, да мяне Міша, руку падае.

Міша і Валія, як і Латушкі, таксама талінскія суседзі Андрэя. Ён ужо расказваў і пра іх:

— Валія ўсё хваліцца: «Мой Міша ў парту працуе». А ён, і праўда, надзене сарочку нейлонавую, гальштук шырокі, кіцель, шапку з «капустаю» — і пайшоў раніцою. Увечары, выпіўшы ўжо, назад ідзе. Жанчыны тады Валіі і кажуць: «Ідзі сустракай, вунь твой з плавання ідзе».

Мошка цяпер ужо вісела перад самым Андрэевым носам. Андрэй махнуў рукою, адагнаў яе і, агледзеўшы скошанае, сказаў:

— О, ды ты адразу дзве работы робіш — і косіш, і растрасаеш. За табою і растрасаць не нада. Правільна я гавару?

І, убачыўшы, што мне гэтая яго заўвага не спадабалася (сапраўды, колькі я ні кашу, ніяк не навучуся, каб каса зграбала траву ў акуратны пракос), Андрэй узяўся за касавішча:

— Ну, ладна, ладна, давай-тку я крыху пакашу. А ты адпачні.

І ўжо быў падняўся з пракосу — вялікі, плячысты, моцны — і пачаў ужо быў шукаць мянташку, але раптам угледзеўся туды, пад Цімохаву хату, і паказаў мне:

— Глядзі, глядзі...

А потым, колькі было сілы, крыкнуў на ўсё Жыцька-

ва — так звычайна, заспеўшы каго ў градах, крычаць «Што робіш?!»:

— Цімафеій Іванавіч!

Кагадзеій, які ледзь не ныркуў ужо ў алехавае кусцё, нібы спатыкнуўся, спыніўся, секунду якую, можа, і паважаўся,— што ж яму рабіць, як быць: ці, можа, не зважаючы на крык, сігануць у кусты, ці ўсё ж адгукнуцца. Пастаяў так спіною да нас, а потым нехаця, павольна паклаў пад куст сякеру, касу, направіў іх там, павярнуўся і са словамі: «А, Андрэй, гэта ты, а я ўжо думаў, бог ведае хто» — па туману пайшоў да нас. Праз загароду пералазіць не стаў — павітаўся і абапёрся на верхнюю жардзіну.

— А ты, Цімафеій Іванавіч, ці не ў Грукава ў такую рань?

— Не, Андрэй. Грукава ж, каб ты ведаў, у другім баку. І я сёння ў тваё Грукава не пайду. Сёння Вольчына чарга. А я палезу ў кусты — ці кашану што, ці лазы нарэзу, калі яшчэ дзярэцца. Ці, можа, іншы які клопат знайду...

Мы ведалі, пра што думае Кагадзеій: ён, калі з Ранікам складалі сена ў кустах, згубіў недзе акуляры і зараз усё шукаў іх і ў стагах, і ля стагоў.

Пастаяў, паглядзеў на атаву і сказаў:

— Калі вы так шчыгульна касіць будзеце, то пудоў дваццаць накосіце, відаць.

— Сабяром, Цімафеій Іванавіч.

— А я дык свой гарод і касіць не буду: праўда, сена было б як чай, але ж атава рэдкая-рэдкая, што і на касу не зловіш.

Зноў памаўчалі.

— Ну, калі ўжо ты мяне пазваў, дык хоць закурыць дай.— І Цімоха выставіў пальцы, гатовыя прыняць папяроску.

Андрэй падышоў да загароды, дастаў пачак «Беламору», падаў яго Цімоху. А я спытаўся:

— Ну, а што, ад Светы пісьма яшчэ няма?

— Няма, мальцы, няма... Не піша, пакрутка.

Кагадзеій дастаў папяроску, памякчыў яе, пакруціўшы ў пальцах, прыкурыў і з асалодаю зацягнуўся. Прыемна запахла дымам. Менавіта тым, які смачна пахне ў полі, на лузе — калі курыць нехта іншы, а не ты сам.

— Мы ж ім з Волькаю гаварылі, раілі, як лепей. Святлана не захацела. Паехала аж за Урал. А мы ж казалі ім:

«Распісвайцеся ды едзьце туды пад Оршу, дзе Толя робіць. Тут жа недалёка — прыедзеце, сумкі накладзеце і зноў паехалі. Сала ж, дзякуй богу, ёсць, масла таксама...» Не паслухаліся.

Цімоха зацягнуўся і доўга не выпускаў дыму з рота. Выпусціў праз нос — два тугія, сівыя, дымныя, як туман, струменьчыкі.

— А я ж і сам колькі разоў у горад устройваўся. У Ленінград усё. Але вот неяк не пайшло ў мяне. Усё потым па Жыцькаве душа балела — аж плакаць хацелася. Чорт яго ведае, можа, гэта толькі першыя дні так бывае. Але ж мае першыя гарадскія дні і апошнімі былі: на многа мяне не хапала. Тады я і ўбачыў, што дзеравенская жызня мне больш да душы. Тут я ўсё знаю — і людзей, і траву, і кусты, і птушак, і мяне, я думаю, таксама ўсё ведае...

Мне ўспомнілася мая гарадская суседка — цётка Аніся. Яна была ў Мінску блізка ўжо каля трыццаці год, але і там, сярод гарадскіх камяніц, жыла вёскаю. То раптам пойдзе і прынясе аднекуль жывога пеўня, прывяжа яго за нагу на балконе, і той кожную раніцу кукарэкае, як у вёсцы, будзіць увесь дзевяціпавярховы дом. А ўдзень я чуў, як яна гаворыць з пеўнем, нібы з чалавекам: той схіліць толькі набок галаву і як усё роўна слухае яе гаворку — быццам нешта і разумее.

А то раптам папакупляе цэлую хату маленечкіх, пушыстых куранятак, хоць яны ёй і не трэба. Ціўкату поўная хата. «Навошта вы, цётка, іх папакуплялі?» — спытаюся я. «А як жа іх было не купіць, калі яны так жаласна і прыгожа ціўкалі»,— адкажа. Гадуе іх і пасміхаецца сама з сябе: «Занясу на рынак, прадам пісклят — куплю тэлевізар...»

Кагадзей маўчаў, а пасля хітравата ўсміхнуўся, абцёр далапёю вусы, хоць на іх нічога і не было, і, як чалавек, што ўсё ж ведае сваю перавагу над табою, спытаў, нібы сцвердзіў:

— А вот вы ж, мальцы, даддушы, не ведаеце ўжо, з якога боку дугу закладаць нада, каб каня запрэгчы!

Я пачаў быў пярэчыць — маўляў, пакуль яшчэ ўмеем, не забыліся, а Андрэй наогул тлумачыў, што нам гэта ў горадзе і не трэба, што ў нас іншыя там клопаты, што і ў вёсцы цяпер усё робяць трактарамі і дуга рэдка калі спадабляецца. Але Кагадзей, нават не слухаючы, усё з той жа перакананасцю сцвярджаў:

— А ўсё-ткі не знаеце, з якога боку дугу закладаць.

Хоць мне і не падабалася гэта, я ўсё ж нейкім сёмым пачуццём адчуваў, што Кагадзей гаворыць праўду. А ён усё разважаў:

— А вот вы думаеце — хамут адзеў, і ўсё? А хамут жа, мальцы, яшчэ трэба было некаму прыдумаць. Колькі, відаць, перад гэтым той даўнейшы чалавек папахадзіў ля каня, усё міргуючы, як бы яго, гэтага прыгажуна і асілка, запрэгчы. За ногі ж ці за грыву калёсы яму не прывяжаш. Вот і прыдумаў хамут...

Цімоха зноў змоўк. Стаялі, курылі.

— Не ведаю, як гэта вы, мальцы, у горадзе папрывыкалі? Хаця, хто яго ведае. Вунь і Сліндук, кажуць, Тамарынага адраса пытаў — відаць, таксама ў Віцебск паедзе.

— Ну і што, што пытаў? Хай едзе,— пацісnуў плячыма Андрэй.

А Кагадзей моўчкі доўга глядзеў на яго, а потым нібы здзівіўся:

— Слухай, малец, во я гляджу і ніяк не магу зразумець: ці гэта ты так папраўіўся тут у маткі, ці ад сну, можа, апох?

— Дзе ты, Цімафей Іванавіч, бачыў? Дасць табе матка наспаць. Яна ж усё на работу гоніць: «Во і ў горад паедзеш ужо, сыночак, скора, а яшчэ столькі работы не пароблена». А я сваю работу і сам ведаю. Кожны год адно і тое ж — сена касіць, згароду гарадзіць, хату крыць. Правільна я гавару?

Размова неяк не звязвалася — хапаліся і за тое, і за гэта, але тэмы, якая б зацікавіла ўсіх, не знаходзілі. Цімоха ўсё пазіраў за туман, дзе ў кустах ляжалі яго каса і сякера,— ён хоць і гаварыў крыху, але адно толькі шукаў прычыны, каб развітацца.

Здаецца, тая ж самая маленечкая мошка вісела зусім нячутна ўжо ля Цімохавых вачэй: Цімоха не звяртаў на яе аніякай увагі, а яна не баялася і не адлятала нават ад яго дыму.

У кустоўі, якое пачыналася адразу за нашай згародаю, спачатку ціха, невыразна, а потым усё гучней і гучней, чулася нібыта размова: нехта гаварыў, але як быццам гаварыў сам з сабою. Я прыслухаўся. Бачыў, што моўчкі слухаюць таксама Андрэй і Цімоха.

— Ну, чаго ты галаву ўзняла? Што ты там убачыла? Чаго ты глядзіш туды? Не, Кралечка, не глядзі на каровак, нагні галоўку і еш. Во так во нагні... Давай я табе памагу. Не матай, не матай рагамі. Да каровак табе, Кра-

лечка, нельга, бо цябе кароўкі забадуць. Скубі, скубі, Кралечка. Кароўкі ж таксама скубуць. А паглядзі-тку, якой я табе траўкі нарвала... Не адварочвайся, не адварочвайся — ты пакаштуй спярша... Ну во, ужо і злуешся... А навошта ж злавацца, Кралечка?

Мы ўсе ведалі, што гэта гаворыць — і гаворыць не сама з сабой, а са сваёю кароваю — Аксюта, Сахвеіна сястра з Ленінграда, якая даўно ўжо на пенсіі і жыве амаль увесь час у Вархах: з'ездзіць дадому, атрымае пенсію, за пакой свой у агульнай кватэры заплаціць — і зноў сюды, да свае Кралі.

І я ўявіў, як стаяць у кустах яны — карова і Аксюта...

Краля — прыгожая, сытая, з фарсіста загнутымі рагамі, з доўгім хвастом, белым і пушыстым на самым канцы. Яна добра ўкормленая, ступае заўсёды так асцярожна, нібыта на скошаным баіцца пакалоць капыты. Поўсць дагледжаная, выпешчаная, аж ільсніцца — так і хочацца, калі ідзеш блізка, ляснуць даланёю па яе бліскучастаму баку. І побач з ёю Аксюта — высокая, не згорбленая яшчэ, у даўгім зялёным плашчы і гумовых ботах.

— Як яна, гэтая Аксюта, і церпіць толькі? — уздыхнуў Цімоха і ўзваліўся на згароду — ды так, што аж колік пахіснуўся.— Гэта ж дзень у дзень у полі, з кароваю ўсё зюкае.

— І не адзін дзень, а ўжо ж гадоў дзесяць во так во карову па кустах водзіць,— падтрымаў яго Андрэй.

— Скажы ты, і не падакучыць жа ёй,— Цімоха зірнуў у кусты, дзе ўсё яшчэ гаварыла з Краляю Аксюта.— Выдумала сама, у галаву сабе ўбіла, што каровы яе Кралю забадуць. Тая, першая, таксама была харошая, малочная карова, дык яны з Сахвеяй усё казалі, што не ўмее хадзіць у статку. Збылі, прадалі цётцы ў Млынары, дык іх карова там і ў чарадзе ходзіць і малака дае, хоць ты заліся. А ў іх і гэта кароў баіцца. Закармілі, дык яна тоўстая, а малака не дае. Моця казала, што чатыры літры ў самы ўдойны дзень надойваюць.

Цімоха бязгучна засмяяўся і крадком зноў зірнуў у бок кустоў, дзе ляжала каса,— не забыўся! Ад кустоў перавёў позірк на сваю хату, пасля — на Шыбекаву, адтуль пайшоў па ўсёй вуліцы і, сустрэўшы на ёй Шыбекава генерала, праводзіў ужо яго вачыма, нібы падглядаў за ім, нібы разам з ім ішоў вуліцаю: нават на папяроску забыўся — яна без дыму вісела на губе.

Генерал, убачыўшы, што і мы глядзім у яго бок, віта-

ючыся, намахаў рукою. Ён зноў жа быў проставалосы — белы, выліпялы на сонцы, чуб яго рассыпаўся на ўсе бакі, і ад лёгкага нават ветру валасы аж падымаліся хвалямі: вось так во на дне ракі хвалююцца ў вадзе водарасці ці якія іншыя расліны. Ён ішоў расхрыстаны, у той самай клятчатай сарочцы. Відаць, быў таксама босы — адсюль, з нізіны, нам не відно, але па тым, як генерал лёгка падпімаў ногі, можна было меркаваць, што на іх нічога няма. Генерал весела размахваў сумкаю — ішоў, відаць, у Грукава, у магазін. Цімоха моўчкі правёў Паўліка аж за нашу хату. Калі ён схаваўся зусім, Кагадзей толькі цмокнуў сам сабе і пачаў раскурваць патухлую папяроску:

— А там жа Шыбека кароў пасе... Во будзе...

Зарыпелі нашы сенцы — здалёк іх рып здаецца не такі надакучлівы. Выйшла маці, з-пад рукі зірнула ў наш бок і пачала адчыняць веснічкі ў агарод. Цімоха, убачыўшы, што маці ідзе сюды, зразумеў — гэта добрая прычына развітацца.

— Бывайце здаровы, мальцы, я пайшоў. А то вунь Надзёжа ідзе. Яна дасць прачуханца і вам, і мне. Скажыць: «Стаў тут, загаваліла гэты, і сам нічога не робіць і мальцам касіць не даець...» — і пайшоў у бок сваіх кустоў.

Маці і праўда не сцярпела:

— Айё! Я ўжо думала, што вы ўсю атаву парэзалі, а яны яшчэ амаль і не пачыналі. Адзін, пэўне, абы-што збірае, цяўкае, а яны стаяць, вушы развесіўшы, і слухаюць. Агату! Таму ж Кагадзею, відаць, сёння моташна, галава баліць...

— А чаго яго галаве балець? — спытаўся Андрэй.

— А ты хіба не чуў, як яны гэтай ноччу Маласая і Ліну праводзілі? Кагадзей на вуліцы спяваў і крычаў, як у радзіве.

— Дык яны паехалі, а матку хворую адну пакінулі? — невядома ў каго спытаўся Андрэй і ўзяў у рукі касу.

— Чаго гэта адну? У яе ж тут дачка і зяць ёсць,— адказала маці і падала яму мянташку.

Хоць Андрэй і стараўся, але каса касіла не так, як у самую расу. Прайшоўшы пракос, ён убачыў, што сям-там у выбоінах стаяць чубы няскошанай травы. Тады павярнуўся і пачаў пяткаю касы збіваць гэтыя чубы. Маці ўсміхнулася:

— Ці помніш ты, сынок, Дарахвея, што побач з намі

жыў? Поўніш? Дык і ты нешта, як Дарахвей, косіш. Той жа, бывала, косіць, косіць у адзін бок, азірнецца — ага-ту! — аж трава за ім стаіць амаль такая, як і перад ім, як і някошаная. Ён тады развернецца і давай у другі бок касіць.

— Ага, Дарахвей, Дарахвей! — зазлаваў Андрэй.— Лёгка табе гаварыць... Дарахвей! А сама б пакасіла па гэтых ямках.

— Касіла і я, вунь у сваіх Валайках...

— А што твае Валайкі,— перапыніў яе Андрэй.— Табе ўжо здаецца, што ў тваіх Валайках рай быў і што людзі там не такія, як усюды. А бацька, помню, расказваў, як цябе на печы ў лахманах нейкіх знайшоў — адзець не было чаго,— Андрэй злаваўся за Дарахвея.— Вось табе і Валайкі...

Маці была дужа з беднай сям'і. І бацька, які маладым хлопцам хадзіў з машынаю па вёсках і шыў кажухі (мне нават, прызнаюся, здавалася, што ён быў падобны на таго краўца, які колькі дзён жыў у нас у фінскую вайну, пакуль пашыў мне з нейкага цёмнага сукна паддзёвачку — нават і яго кажухі, здавалася, пахлі, як тое грубае, нявырабленае сукно), пераходзіў з хаты ў хату, там і еў і начаваў, дзе шыў, убачыў неяк на печы дзяўчыну, упадабаў яе і прывёў у Жыцькава.

Маці часта ўспаміналa свае Валайкі, усё яшчэ помніла, як у дзяцінстве хадзіла ў арэхі, і, амаль не наведваючыся ў сваю вёску — і далёка ж вельмі, аж за Хвошна, і нікога там ужо з радні няма,— яна верыла, што ў Валайках усё асталося так, як было ў дзяцінстве: ідзі ў арэхі, патрасі ляшчыну, і яны, буйныя і спелыя, зашпокаюць па галлі, па табе, па зямлі...

— Валайкі, Валайкі,— усё яшчэ бубнеў Андрэй, але хутка сціх, супакоіўся, нешта ўсё толькі ўсміхаўся сам сабе.

Чамусьці вярнуўся і шпарка ішоў назад генерал — відаць, нешта забыўся.

Цімоха стаяў ля кустоў і не спяшаўся ныраць у іх: нават і касы сваёй пакуль не браў з зямлі. Стаяў, нібыта чакаў чагосьці, і, як мне здавалася здалёк, таямніча ўсміхаўся.

— Дык вось я і кажу табе, сынок, што ты трошачку на Дарахвея падобны,— ушчувала Андрэя маці.— Таму ж таксама ўсё замінала.

Маці нагнулася, правяла рукою па траве і, аброша-

пую, выцерла яе аб фартух — растрасаць у расу атаву не варта, хай якога паўдня пасохне ў пракосах.

— Бывала, Хрысціна,— маці ўсё не магла спыніцца,— будзіць, будзіць Дарахвея раніцою, а той усё просіцца: «Ну, Хрысціначка, ну, дарагая, ну, не чапай ты мяне. Хто ж гэта ноччу косіць? Вось узыдзе сонца, нацяплее, я як навяду касу, як пайду махаць, дык тваёй травы, сама ўбачыш, менталём не стане». І так ледзь не да абеду просіцца. А ўжо туды к абеду Дарахвей новую прычыну знаходзіць: «Ну, Хрысціначка, ну, дарагая, ну, пачакай жа ж ты. Які ж гэта дурань у такую спёку косіць? Вось спадзе крыху гарачыня, я навяду касу і вечарком, вечарком, у прахалоду, як стану касіць, як стану...» А надвечар новая бяда: «Ну, Хрысціначка, ну, дарагая, ты ж зірні, колькі камароў. Тут не столькі касіць будзеш, колькі ад іх бараніцца. Ды і навошта ж папач касіць — усё роўна ж яно ноччу не сохне. А я ўранні як устану, як навяду касу, як пачну махаць...» Так і ты.

Мяне, хоць я кашу горш за Андрэя, маці не чапала — усё ж на зяця яна не мае тых правоў, як на сына.

— Ага, Дарахвей,— бубнеў Андрэй.— На гэтых равах і сам чорт касіць не зможа, не тое што твой Дарахвей...

Агарод, і праўда, быў няроўны — у калдобінах, ямках. Такім яго зрабілі цяжкія танкі, калі фронт рыхтаваўся да вялікага наступлення, а па вуліцы, па агародах прахадзіла перадавая. Траншэі, хады злучэнняў, абваленыя зямлянкі і адзіночныя акопчыкі яшчэ і зараз, як на сённяшняе вока,— бязладна параскіданы па Жыцькаве. Бязладна, бо сёння ўжо цяжка ўявіць малюнак перадавой — сёе-тое заарана, сёе-тое закапалі жыцькаўцы самі, каб не замінала хадзіць і ездзіць, а іншае абсыпалася, зарасло і ўтравела так, што ўжо і не пазнаеш, што тут было ў вайну. Мы неяк з Цімохам хацелі разабрацца, хадзілі-хадзілі па полі, па вуліцы, але так нічога і не зразумелі...

— Не я ж, сынок, вінавата,— падабрэла неяк адразу маці.— Танкі, сынок, танкі...

— А ці помніш, як ты мяне ноччу сюды з Курдулек прывяла перад самым боем? Па ручаі, па ручаі і на свой агарод. Ты ў мяне, матка, трохі хітрая: дужа па ўзгорку не лезла, усё па лагчынах ды амшаніпчах вяла.

— Поўню, сынок, поўню. Есці ж не было чаго. А тут жа ў нас на агародзе былі закапаныя дзве скрыні з жытам.

— Ідзём, а танкі скрыгочуць, машыны равуць, снарады рвуцца. Пражэктары — аж сляпяць. А ты мяне над

хату ўсё вядзеш. Салдаты крычаць: «Назад! Куда! Ложись!» А мы ўперад бяжым.

— Дабеглі, а браць — айё! — няма чаго. Адну скрыню салдаты адкапалі — акурат жа ў яе траншэя ўперлася...

— Дык яны жыта тады і наварылі сабе — сюды, казалі, дні са два даставіць не маглі нічога.

— А ў другую — снарад трапіў. Развярнуў усё. Памятаеш, награблі мы з табою торбачку гэтага жыта, прынеслі, а там болей зямлі, чым збожжа. Вы ўсё на зярнятку навыбіралі з гэтай зямлі, і мы тады нейкую баўтуху зварылі...

Шыбека пусціў кароў у Мох. Яны скублі там, дзе толькі што ласкава, нібы з сяброўкаю, гаварыла з каровою Аксюта. Шыбека стаяў ля згароды, глядзеў на кароў. Ён і не заўважыў, як па вуліцу зноў выйшаў сын,— убачыў бацьку, які перагнаў кароў у другое месца, звярнуў з вуліцы і па сцежцы скіраваўся да яго.

Гэта ўжо ішоў не той генерал, як пядаўна,— зараз ён быў апрануты нібы на парад. Выпрасаваныя, з шырокімі чырвонымі палосамі штаны, якія ад самага прыезду, мусіць, віселі ў шафе, пінжак з залацістымі пагонамі і вялікаю бліскучаю выпуклаю зоркаю на іх, бялюткая сарочка пад гальштукам. Ён ішоў пакуль галалобы — прычасаныя, акуратна ўкладзеныя валасы неслухмяным крылом спадалі на лоб, а форменная фуражка была ў руках.

Генерал не дайшоў колькі метраў да бацькі, імкліва ўскінуў рукою ўверх крыло валасоў, прыціснуў яго фуражкаю, узяў пад казырок і страявым крокам прайшоў ля старога. Шыбека ўбачыў сына, калі той параўняўся ўжо з ім.

— Ну, ладна, ладна, Паўлік, не выдурняйся,— усміхнуўся бацька.— Адзеўся во як чалавек, дык і ідзі сабе ціхенька.

Сын мінуў бацьку, перайшоў на звычайны крок, павярнуўся — радасны, вясёлы, з добраю ўсмешкаю — і памахаў старому рукою: «Да сустрэчы, татуля».

Ля кустоў задаволена, на ўвесь рот — я, здаецца, і адсюль бачыў цёмную шчарбіну — смяяўся Цімоха: ён, відаць, адразу зразумеў, чаго вярнуўся генерал, і таму не спяшаўся лезці ў кусты. Цяпер ён паволі — спачатку касу на плячо, потым сякеру за пояс — узяў усе свае прычындалы і схаваўся ў алешніку.

Цімоха і сам згаджаўся тут з Шыбекам і абгаворваў часам Паўліка: «І праўда ж, яшчэ не хапала, каб генерал

світку бацькаву надзеў. А то б прыйшоў да мяне, дык я, яму б тыя бахілы пазычыў, у якіх Толя мне сена стагаваць памагаў. Падвязаў бы анучамі якімі — во б у Грукаве глядзелі!»

Паўлік выйшаў на грукаўскую дарогу. Павярнуўся і, відаць, упэўніўшыся, што бацька ўжо не бачыць яго, скінуў з сябе пінжак, склаў яго і ўзяў на руку, зняў фуражку, зняў гальштук і ўсё гэта паклаў у сумку і, расшпіліўшы сарочку, яшчэ весялей пашыбаваў пад бор. Па тым, як ён усё гэта рабіў, можна было меркаваць, што ў бары Паўлік здыме і чаравікі, якія, відаць, нязвыкла ціснулі ногі, што, босыя, прывыклі ўжо за лета да зямлі.

А Шыбека, які ўслед за каровамі падышоў зусім блізка, задаволена тлумачыў нам:

— Адзеўся во троху, дык як чалавек і ў краму во сходзіць. А то бегае тут абы-як, як шабадранец нейкі. Пелькі ўсе вон павыставіў. Каб надзеў свой кіцель, дык яго ж не прыбіць. «Ты ж, Паўлік, генерал, кажу я яму, а ходзіш, як пастух». А ён толькі рукою махне. Меншы, дык той, праўда, слухаецца...

Меншы, Генік, быў пакуль лейтэнант. Ды яшчэ і маладшы, але і яго, як і старэйшага брата, усе звалі генералам: братоў не раздзялялі — «вунь Шыбекавы генералы пайшлі». Бацьку гэта падабалася. Ён не пярэчыў — генералы, дык хай сабе будуць і генералы.

Ваяваў Шыбека з сынамі толькі за адно — за адзенне. Меншы, праўда, хутка паддаўся бацькавай настойлівасці і хоць напалову апранаўся ў сваю форму, а вось са старэйшым, з сапраўдным генералам, бацьку ваяваць было нялёгка.

— Кінь ты, татуля! — адмахваўся сын.— Я гляджу, ты мяне з маімі лампасамі і ў хлеў бы паслаў гной выкідаць...

— Гной не гной,— крыўдзіўся бацька,— але на людзі трэба хоць апранацца як след. А то, разумееш, Паўлік, людзі не поймуць нас. Скажуць: «Зірніце, вунь да чаго Шыбекаў генерал дажыўся — адзець ужо і то няма чаго».

— Няхай гавораць,— махаў рукою генерал, але ўсё ж тады-сяды, як во і сёння, слухаўся бацьку — каб не злаваць яго.

А стары Шыбека часам дзе сярод мужчын хваліўся сынам. Ды і Паўлу ён, нібы сам у гэтым спрабуючы разабрацца, казаў:

— А мне дык во неяк аж смешна бывае. Вот ты, Паў-

лік, генерал. Перад табою ўсе вайскоўцы — па стойцы «смірна» становяцца, рукі да шапкі прыкладаюць. Палкоўнікі і тыя дрыжаць: «Здравія жалаю, таварыш генерал!» А я табе скажу: «Паўлік, бяжы карову пераймі»,— і ты бяжыш. «Паўлік, ідзі вады прынясі»,— і ты нясеш. Босы, расхрыстаны... Як і не генерал усё роўна, а так сабе, нейкі наш жыцькаўскі хлопец. Нават «куды пайшла» на карову крычыш, як Цімоха ўсё адно.

Паўліка Шыбека любіў. Генераламі Шыбекава сям'я ганарылася.

Трохі няёмілася, нават саромелася яна самага малодшага свайго сем'яніна — Ігара. «Ага, не кажы ты, не пашанцавала мне з меншым сынам»,— прызнаваўся нават сам Шыбека.

Ігар скончыў вучылішча механізацыі і з таго часу не затрымліваўся ні на адным месцы болей як паўгода: усюды яму не падабалася, усюды яму здавалася, што праца не па ім. Да таго ж Ігар прызвычаіўся да гарэлкі і піў, здаралася, часцяком. Асабліва сварылася на яго за гэта сястра Дзіна, якая была на які год ці два старэйшая за Ігара і працавала ў Ленінградзе ў экскурсійным бюро. «Ты ж ужо алкаголік, ты ж ужо без гарэлкі не можаш. Ты ж спіўся»,— сыпала яна на Басцялу (так празвалі Ігара ў Жыцькаве), а той толькі сядзеў і ўсміхаўся.

— Яно, Юра, што яны ад гэтага Ігара хочуць, дык я і сам не прыдумаю,— разважаў Кагадзей.— Ён жа хлопец як хлопец. Ну і што, калі вып'е якую кроплю. Не б'еццa ж, не кідаецца тады, а ціхенька ідзе спаць.

І праўда, Басцяла тады ў чым стаіць — у чаравіках, у пінжаку, у гальштуку — зашываецца на хаце ў сена, а Шыбекава просіць нашых хлапчукоў: «Узлезце, дзеці, паслухайце, ці дыхае хоць».

Спрабуе часам заступіцца за брата генерал, але не так горача, як Кагадзей: Паўлік разумее, што паўшчуваць хлопца ўсё ж варта. Мне і самому, хоць я не гаварыў пра гэта нікому, нешта падабалася ў Басцялу. Ён быў не такі, як усе, у яго было штосьці такое, чаго не было ні ў мяне, ні ў Андрэя, ні ў Кагадзея. Падабраў ён нешта і ад Геніка, і ад генерала, нават і ад самога Шыбекі, але зусім быў непадобен да сястры, экскурсаводкі: Ігар не меў яе практычнай і цвярозай разважлівасці.

Таму Дзіна больш за ўсіх і лаяла Ігара. А здараецца, родзічы, саромеючыся, цярэбяць Басцялу з усіх бакоў. Калі сваякі аднадушна абгаворваюць свайго родзіча, усе

яны, мне здаецца, адчуваюць пейкую радасць, задаволенасць і адпачасова разгубленасць, сорам: задаволенасць ад таго, што ты не такі, як ён — лепшы, больш практычны і ўдачлівы; а сорам таму, што ты робіш нешта недазволепае, непрыемнае, абгаворваючы і ганьбуючы чалавека, дужа блізкага табе па крыві. Басцяла ж, мусіць, адчувае сябе тады зайцам, які выліняў не ў час: і снегу яшчэ няма, а поўсць ужо белая — усюды яго відаць, адусюль у яго страляюць.

Кагадзей верыў, што Ігар пасталее, ажэніцца і супакоіцца...

Сонца падпялося ўжо высока. Яно пякло, нібы ўлетку — промні, здавалася, джалілі, як мухі.

Рабілася душна, горача. Андрэй скінуў сарочку і не зважаў на стому — касіў: між лапатак на загарэлым целе каціліся кропелькі поту.

Маці ўспомніла, што трэба, каб не павялі зусім, паліць агуркі, пакуль яшчэ ў градах пад кропамі яблынь не зусім спякотна, і пайшла з агарода. Ішла яна паволі, нялёгка, і мне ўспомнілася, як Кагадзей, неяк праводзячы яе позіркам, гаварыў: «Зірніце, як ваша матка ўжо цяжка ходзіць». Гэтага я раней не заўважаў. Раней мне здавалася, што ходзіць яна проста марудна і спакойна, а цяпер зразумеў — цяжка...

Шыбека адышоўся ад згароды і там, далей, сеў на ўзгорак, павярнуўся да нас спіною. Сядзеў так, глядзеў, як скубуць каровы, і маўчаў. Калі ён паварочваў галаву ў наш бок, было відаць, што ён сам сабе задаволена ўсміхаецца.

З-за хаты, адтуль, дзе позні калгасны лён, даносіліся ўзбуджаныя галасы нашых хлапчукоў — Петрусі будавалі там нейкі будан, нешта крычалі, нешта даказвалі, не слухаючы, відаць, адзін аднаго.

У Лахі, узняўшы клубы пылу, паехала машына, на якой смяяліся і спявалі даяркі.

Сонечная раніца вырастала ў спякотны дзень.

## 4. ПРОДАЖ КАРОВЫ,

***альбо партрэты Кагадзеевых купцоў, сярод якіх — дзед Лерка, што расказвае, з чыіх бёрнаў ён сабраў нашу хату, у якой потым мы разумеем, што ў кожнага — свой клопат***

— Ого, колькі маліны! Дзень добры вам!

І сухенькі, невялічкі ростам, але вельмі рухавы дзед, босы, у картовай сарочцы, якая, непадпераная, свабодна спадала на шэрыя, таксама картовыя, штаны, жвава, нястомлена, бы малады, лёгка падышоў да нас і сеў побач на ўзгорачак, які астаўся ад колішняй зямлянкі.

— Дзе гэта вы яе столькі нашчыпалі?

— А вунь, Лерка, пад Сварыдаўкай яе колькі хочаш,— за нас адказала маці, якая ў маліну не хадзіла.— Хоць засцілай дол лайном ды трасі маліннік. На высечках жа заўсёды на трэці год маліна бярэцца.

У маліну мы схадзілі ўсім гуртам. Узялі чыстае вядро-даёнку, кварты, шклянкі, слоікі. Кожны браў у свой посуд, а потым высыпаў у вядро, якое стаяла ў малінніку.

Перад гэтым маці ўсё сарамаціла нас:

— Хоць бы ў маліну, гультаі, схадзілі. А то хутка і паедзеце — ягад нават не ад'ядзімся. Ды і маліну павыносяць адусюль неўзабаве.

І праўда, апошнія дні праз наша Жыцькава ў бок Сварыдаўкі ішло вельмі многа ягаднікаў — яны смяяліся і ад самай раніцы грымелі і звінелі вёдрамі, бітонамі, квартамі. Калі вярталіся назад, звону такога і галасу не было — і самі, стомленыя, больш маўчалі, і посуд поўны не так брынчаў. Асабліва шумным было гэтае нашэсце ўчора, у суботу: ягаднікі прыязджалі не толькі з Азярычына, але, як мы меркавалі па адзенні, мусіць, і з самога Віцебска. Нават сёння нейкія далёкія і незнаёмыя людзі ўсё пыталіся ў Моці Прутнёвай, ці далёка яшчэ да Жыцькава, а тая стаяла і нічога не магла зразумець — маўляў, ці не паздурнелі яны: стаяць на жыцькаўскай вуліцы і пытаюцца, ці далёка да Жыцькава...

Мы сядзелі ля хаты. Хлопцы, паразуўшыся, бегалі вакол нас — не нахадзіліся яшчэ, чэрці, у маліне. Андрэй ссунуў з ног бліскучыя гумовыя боты, разлёгся тут жа, на траве, шырока раскінуў рукі і ногі, папярэдне падгробшы пад галаву нейкі пласт сена, што дасушвалася на сцеж-

цы, а маці і Вера перабіралі ягады, напачатку кідаючы часцей не ў таз, а ў рот. Вера хутка, мусіць, здаволілася — яна ж наелася ягад яшчэ ў лесе і зараз глядзела на іх абыякава — толькі як на работу.

Жанчыны падсунулі дзеду Лерку поўны слоік з буйною малінаю, але ён не ўзяўся яе есці, адсунуў і растлумачыў:

— Мае ўжо зубы маліну і то не давяць.

Я сядзеў крыху воддаль. Побач, зусім недалёка, раскошна цешыўся сонцам высокі, угрэты бадзяк. Свярбелі рукі і ногі ад крапівы, якая, нягледзячы на тое, што і апрануўся так, каб не абстрыкала, знайшла ўсё ж дзіркі і здорава напякла. Не праходзіла ўсё яшчэ і тая задушлівая гарачыня, якая аж да гуду ў галаве густа акружае цябе ў перагрэтым малінніку, дзе салодкі дух пераспелай маліны, які поўна набіваецца ў рот, перасядае і не дае як след дыхаць. Лоб, здавалася, сцягвалі высахлыя пісягі ад поту, які ручаямі цёк там, у малінніку, дзе не было нават і лёгкага павеву ветру, а перад вачыма ўсё яшчэ стаялі аж чырвоныя ад маліны, перагнутыя, як вясёлкі, з куста на куст, абцяжараныя ягадамі вешкі з пажухлым ужо лісцём ды пазасохлыя на малінніку дробныя ягады і буйныя, сакаўныя на зямлі,— калі хочаш, падымай і бяры ў кварту — пераспелыя маліны, якія асыпаліся ад цяжару і зараз чырвана свяціліся на бурай падсцілцы з лістоў, сучкоў і ігліц.

Дзед Лерка абвёў усіх нас сваім не па-старэчаму чэпкім позіркам і спытаў:

— Як гэта вы, Надзёжа, усе намяшчаецеся тут? Вас жа вун колькі, а хата зусім маленькая, цесненькая.

І, нібы спрабуючы зразумець, дзе ж мы ў ёй спім, дзе сядзім, калі дождж, дзе абедаем, пачаў прыдзірліва вывучаць нашу хату: доўга глядзеў у акно, потым яго позірк зачапіўся за намаляваны крэйдаю надпіс хлапчукоў — «Тут жывуць Петрусі»,— нібы чытаючы яго, нібы разбіраючы кожную літару, потым вывучаў шчылыя вуглы, бёрны, абсаду. Маці яму не перашкаджала і, толькі калі дзед зірнуў на яе, ці то адказала, ці то спыталася:

— Якую, Лерка, ты мне хату паставіў, у такой і жыву...

Я зразумеў, што Лерка якраз і рубіў маці гэтую хату — разам з нархоўскім Дзянісам.

Пасля таго як бомба — ля ямы ад яе я сяджу — упала над самымі вокнамі і начыста выламіла цэлую сцяну,

салдаты разабралі хату па зямлянкі. І калі пасля вайны жыцькаўцы, абжываючыся, пачалі ставіць сабе хоць часовыя хаты — трэба ж было недзе жыць! — ім даводзілася даставаць бёрны, закапаныя ў зямлю.

— А ці помніш, Надзёжка,— усміхнуўся Лерка,— як пам Цыган не даваў тваю хату складаць? Прыйдзіць, сядзіць прынародня па бервяно і не дае яго на зруб класці. За тапары хапаецца, бервяно пад сваё хацішча адзін цягнуць спрабуе.

Перасталі бегаць і дзеці — селі каля дарослых, пачалі ўважліва слухаць.

— Поўню. Дык і яго ж хату разабралі,— нібыта зараз ужо, за даўнасцю апраўдваючы старога, гаварыла маці.— Ён жа свае бёрны пазнаваў.

— А хто іх там у зямлянках разбярэ, чые яны да вайны былі,— пасур'ёзнеў дзед Лерка.— А ён, помніш, мен-талём пазнаваў. «Во, глядзі во сюды,— паказвае, бывала,— во гэты крук відзіш? Я на яго аброць вешаў... А во тут палічка была — бачыш, яшчэ касячок не адарваўся... А гэтае во бярно ля печы ляжала...»

— З'ехаў тады ж некуды Цыган,— сказала маці.— Не змог папоў пабудавацца. І пасля ніхто яго ў Жыцькаве не бачыў...

Крук, на які некалі Цыган вешаў сваю аброць, у нашай хаце апынуўся не ўсярэдзіне, а знадворку. Яшчэ і зараз тырчаў ён у бярне ля акна. Якраз на гэтым Цыгановым бервяне хлопцы напісалі: «Тут жывуць Петрусі», а крук вытыркаўся цяпер пасярод слова «жывуць» і разбіваў яго на два склады: «жы» і «вуць» — хлапчукам давялося абмінаць перашкоду.

Значыць, і тое бервяно, з якога я аднойчы, шукаючы цвік, збіў касячок і якое ўсе лічылі Груздовым, было таксама з Цыгановай хаты.

Я глядзеў на нашу маленькую хатку, перабіраў позіркам вянцы і бачыў, з якіх розных бёрнаў яна сабрана — з кароценькіх і доўгіх, з тонкіх і тоўстых, з круглых і абпіленых — і мне падумалася, што каб вось зараз сабраліся ў вёску ўсе даваенныя жыцькаўцы і захацелі забраць кожны сваё бервяно, то наша хата зусім бы знікла: тут былі і Цыгановы, і Груздовы, і Дарахвеевы, і Алелькавы, і Шыбекавы бёрны — нават Кагадзей і той неяк зусім нядаўна пазнаў сваё бервяно з падваконня.

Побач з нашаю маленькаю і цеснаю хаткаю ўсё яшчэ нечапаны стаіць шырокі, прасторны падмурак старога ха-

ціпча. Пад адным колішнім акном, як і тады, цвіце густа разрослая шыпшына; пад другім — вымахала ў высокае дрэва таполька, якую прутком пасадзіў бацька; пасярод хацішча ўзышла і развесялілася сліва-самасейка — з буйнымі цёмна-сінімі і кісла-салодкімі пладамі; а вялікія камяні, што былі калісьці пад вугламі, усё яшчэ цярпліва чакалі, калі ж на іх, урэшце, ляжа першы смалісты, пахкі і светлы вянец новае хаты.

Гэтую хатку маці ставіла на час: пажывём нейкіх гады са тры, а потым на старым хацішчы паставім новую, дуса тры, а потым на старым хацішчы паставім новую, дужа мала япа. І вось прайшло ўжо не тры гады, а ўсе трыццаць, а гэтая часовая хатка стаіць сабе, як і стаяла дагэтуль, і дае летам прытулак такой вялікай сям'і. Спачатку было боязна нават думаць пра новую хату — тады ж есці і то не было чаго. Потым, калі з'явіўся хлеб, пачалі раз'язджацца дзеці. Так і асталася маці адна ў гэтай цеснай хаце, якая, колькі мы яе ні падымаем, усё роўна ўязджае і ўязджае ў зямлю.

— Навошта я тады, дурніца, блюла гэты падмурак? Каму? Хай бы хоць ты, Лерка, мне тады падказаў: «Стаў, баба, сваю новую хату на стары падмурак». А то во, бабаба, сваю новую хату на стары падмурак». А то во, бачыш, прыблюсці-то прыблюла, а хаты новай так і не займела.

— Што гэта ты, Надзёжа, гаворыш? Успомні, як ты да старога падмурка не падпускала нават. Ці помніш, як я быў узяў там камепьчык, дык ты ледзь біцца не кінулася: «Не чапай, ірад! А я што, праз два гады каменне збіраць на поле паеду?»

Маці неяк горка ўсміхнулася.

— Усё ж думала, што гэтай хаты нам мала будзіць. А трэба было б тады ставіць на стары падмурак. Нічога, што шырока — троху камяні падкацілі б, ды і ўсё.

Маці змоўкла, маўчаў і дзед Лерка. Зрабілася вельмі ціха — толькі чуваць было, як роўна дыхаў Андрэй: відаць, спаў.

За Цытпячышынаю хатаю глуха гуркатаў трактар, а з трактарыстам, не злазячы з калёс, ціха, не махаючы рукамі, гаварыў Гардзей — той, хто не ведае брыгадзіра, мог бы надумаць, што ён проста так, нічога не гаворачы, ківаецца на калёсах.

— Ці ёсць у цябе, Надзёжа, халоднае малако? — нечакана спытаўся дзед Лерка.— Піць нешта захацелася.

— Ёсць, ёсць,— адказала маці і папрасіла хлопцаў: — Петрусі, прынясіце дзеду малака.

Хлопцы пабеглі і праз якую хвіліну вярнуліся з вялікім белым кубкам малака. Дзед выпіў яго, але кубак не паставіў на зямлю — усё круціў яго ў руках.

— Во, бачыш,— зноў загаварыла маці,— начала ўспамінаць і забылася нават спытацца, як ты хоць жывеш.

— Як жыву? Патроху,— сярпа нехаця адказаў дзед Лерка, а пасля разгаварыўся.— Мне ж, Надзёжа, восемдзесят сем гадкоў, як лёду. Вось дажывеш маіго, а тады і скажаш, як такія старыя жывуць. Я ж яшчэ ў першую імперыялістычную вайну ваяваў, а ў гэту ўжо не ўзялі. Як жыву? Ганна мая чатыры зімы, як памерла, а мы ж з ёю пяцьдзесят восем гадоў пражылі разам. А хадзяйства ж нейкае асталося. У градах і то няма каму пакалупацца. Дзеці мае — і дочкі, і нявесткі таксама ўжо старыя — трохі памагалі, а тады кажуць: «Няма ў нас, бацька, у саміх сілы, мы табе работаць не будзем. Жаніся, бацька». А прыйшла неяк Хрысціна грады палоць. Моркву рвець, а пустазелле пакідае. Я ёй і кажу: «А Хрысціна мая дарагая, а што ж гэта ты робіш? Ты ж хоць моркву не рві, хоць на развод пакінь». А яна мне: «Што я, Лерка, дурная, ці што? Я ж морквы не чапаю. А калі якая і вырвецца, дык у градах радзей будзе...» І сама так ужо смяецца — аж рот распагодзіўся.

Памятаю, маці расказвала пра нейкую Хрысціну, якая пасля вайны хадзіла па хатах, жабравала, а жыла на ферме, у кармакухні, дзе цялятам варылі есці,— там жа і зімою цёпла. «Занясу туды чыгунок бульбы, пастаўлю варыцца пры агні,— успамінала маці,— і папрашу яе: «Ты ж, Хрысціна, крыкні, як закініць». А ў яе голас-голас. Крыкніць, дык я і ў хаце пачую».

— Ма, а гэта не тая Хрысціна, што на кармакухні жыла? — нечакана спытаўся Андрэй — значыць, ён не спаў, а толькі так ляжаў ціха.

— Тая, тая,— апярэдзіўшы маці, адказаў Лерка.

Зараўла карова — Лысеха стаяла ў цяньку ля таполі і лена адганяла хвастом мух.

— Чаго ты сцягваешся? — прыкрыкнула па яе маці, і тая, нібы зразумеўшы, што ёй гавораць, сціхла.

Кацяня падкралася да каровінага хваста і, водзячы ў паветры лапкаю, выбірала момант, калі можна будзе яго злавіць,— карова махала хвастом, а яму, дурному, здавалася, што яна, як і дзеці, з ім забаўляецца. Карове гэта не спадабалася, яна наставіла рогі і хацела ўжо капануць ма-

лечу нагою. Пятрусь — Той — падбег, узяў кацяня і аднёс далей ад каровы.

Але ж малому не сядзіцца. Кацяня ўбачыла за травою сваю маці і, угорбіўшы спіну, кінулася за ёю. Кошка, не спыняючыся, абмінула слуп электраліній, у час скочыла ўбок, а кацяня з усяго разгону ўдарылася ў яго лбом. І потым доўга стаяла, трэсла галавою — так атрасаюцца ад дажджу,— усё, відаць, хацела зразумець, што здарылася і дакуль будуць сыпацца з вачэй рознакаляровыя іскры.

Няхутка пазнае свет гэтае ўпешчанае хлапчукамі кацяня. То яно паблытае ката з маткаю, пачне тачыцца пад Максіма, шукаючы саскоў, аж пакуль той, доўга зважаючы, не зазлуе і не зробіць сваё, як кажуць Петрусі: «Кхі, кхі!» То забярэцца па дрэва, а злезці збаіцца: будзе сядзець там і жаласна мяўкаць — каб знялі...

— А што, Хрысціна, можа, яшчэ і сёння па хатах жабраваць ходзіць? — Андрэй хацеў дапытацца свайго.

— Не, цяпер баіцца старшыні сельсавета. Той ёй сказаў: «Калі будзеш жабраваць — пенсію адбяром, а цябе ў дом састарэлых здадзім». Дык не хоча. У яе і двор ёсць цяперака — Аўхім, сусед мой, паехаў да сына ў Казахстан, а ёй сваю хату пакінуў.

— Гэта ёй ад прывычкі па хатах хадзіць хочацца. Лічы, усё жыццё так хадзіла...

— Таму і грады палоць не ўмее... Тады я паціху, патроху ды з град неяк і вымапіў яе. А то б яна мне пустыню ў градах навяла. А дзеці прынародня ўсё кажуць: жаніся. Бяры вунь, кажуць, Анюту — яна ж за цябе маладзейшая намнога: ёй толькі семдзесят гадоў. Яна баба ціхая. Дык во ўжо тры гады, як мы жывём з ёй. Праўда, была ў Кошкіне яшчэ маладзейшая ўдава, але тая не захацела да мяне ў Лахі перабірацца — шкадавала пакінуць новы свой дом, які ёй дзеці паставілі. Усё мяне ўгаворвала ў прымы да яе ў Кошкіна перайсці. Але я ніяк не рашаўся. Хоць мая хата і не новая, ды ўсё ж шкода было мне яе пакідаць — сам рубіў. У Лахах я ўжо ўвесь свой век аджыў, у Лахах хачу і памерці — тут мне і зямля мякчэйшая. А ў Кошкіна вунь да гэтай бабы Дзяніс ваш вархоўскі зайшоў замуж. Жыве і не тужыць, што сваю хату аддаў чужым людзям.

— А чаго ты ў такую даль прыцягнуўся? — спытала маці і закрычала на хлопцаў: — Куды лезеце, вісусы, там жа кастрыва.

Хлопцы шухнулі адпекуль з-над згароды, якая ўся зарасла кранівою, а дзед Лерка адказаў маці:

— Карова, Надзёжа, нада. Анюта з хаты прагапяе — ідзі і ідзі купляй. Во я і дачуўся, што Цімоха ваш маткіну карову прадаець. А Цімоху я крыху знаю — ён жа ў пас на раз'ездзе працаваў. Бывала, сядзіць і цэлы дзень во так во моўчкі прасядзець можа. Ці разгаварыўся ён хоць на старасці?

— Зараз троху гаворыць,— адказала маці і ўсміхнулася.

— Здаецца ж, тады ён Міхалкаву дачку звёў — Вольку во гэтую. Вот я і прыйшоў у Жыцькава. Думаю, няхай сабе, знаёмы ж чалавек не так амманіць, як чужы. Не ведаю, як па жысць, а на ўстрэчу дык ён чалавек добры. Праўда, казалі, што і ў Віцькі Прутня ў Азярычыне ёсць карова на продаж. Мальцы там былі, кажуць, карова спраўная, малака дае многа, але ж яго не зловіш — Пруцень жа дырэктара возіць, а пара зараз такая тлумная: жніво. Прыйдзеш, пацалуеш у прабоі і назад...

— Надзёжа, ці не пісямко гэта маё ў вас? — раптам здалёку пачуўся жаночы голас.

Моця спяшалася да нас, выціраючы рукі аб фартух,— яна іх, відаць, выцірае нават сухія.

— Адкуль ты гэта ўзяла, што ў нас пісямко тваё?

— А во ў гэтага дзеда ў руках здалёку нешта белае відаць.

Маці ўсміхнулася, засмяяўся і дзед Лерка, узняў вышэй белы кубак і пакруціў яго перад вачыма.

— А каб цябе, каб! Гэта ж кубак, а я ўжо думала — пісямко мне нясуць,— расчараваная сумелася Прутніха і пайшла назад.

— Пасядзі во з намі,— запрасіла яе маці.

— Няма калі,— Моця, не азіраючыся, махнула рукою.

Дзед Лерка заспяшаўся таксама:

— Пайду і я, а то, можа, як кароў выганяць, дык і дома нікога не заспееш. А я тут рассеўся, раскавеліўся.

— А ці ўмееш ты хоць выбіраць карову?

— Мне абы ў вушах жоўта было. Анюта сказала, што ў такой каровы малако харошае.

Ён паставіў белы кубак на дошчачку і пайшоў следам за Моцяю.

Як толькі паехалі ў Станіславаў Маласаі і Ліпа з дачкою, Вольцы работы прыбавілася, бо ўся матчына гаспадарка апынулася на яе руках. Карову яна, праўда, у свой

хлеў не пераводзіла, але выганяла яе ў поле і пераймала вечарам, адпасвала за яе другую чаргу, даіла і вёдрамі насіла малако дадому: матка малака асабліва не ела, а калі і прасіла — дык колькі ёй трэба яго!

Волька, вось так займеўшы дзве каровы, напалівала малаком усе катлы, чыгункі, місы і нават, як жартаваў Кагадзей, начоўкі.

— У нас ужо і свінні малака не ядуць,— усміхаўся ён у свае вусы, гледзячы, як Волька спрабуе хоць троху даць рады малаку.

А тая, упраўляючыся з гэтаю малочнаю ракою, адно толькі насіла з Грукава, а то і з самога Азярычына вялікія чыгуны.

— Яна думае, што калі ў яе катлоў будзе многа, дык і малака меней стане,— жартаваў на вёсцы Цімоха.

І праўда, Волька пазастаўляла посудам з малаком абедзве хаты, сенцы, пакінуўшы толькі вузкі праход на пару якіх маснічын — каб праісці адно,— але малака ўсё большала і большала.

— Ты во каб добры гаспадар быў, то не смяяўся б з жонкі, а знайшоў бы купца хутчэй.

Купцоў, праўда, прыходзіла многа, больш за ўсё незнаёмых,— гэтае лета яны дужа зачасцілі ў Жыцькава. Купцы, як і ягаднікі, пыталіся спярша, ці Жыцькава гэта, а потым прасілі паказаць ім, дзе жыве Кагадзей, які прадае карову. Многія з іх аглядалі і абмацвалі карову, але купляць чамусьці не спяшаліся.

Учора надвечар да нас падышоў адзін з такіх прыдзірлівых купцоў з жонкаю. Ён ішоў наперадзе — высокі, жылісты, у саламяным капелюшы з адвіслымі палямі, без сарочкі, у адной блакітнай саколцы — нават здавалася, што ён рабіў нейкую працу ў двары, а тады надзеў на галаву капялюш і пайшоў у людзі. За ім слухмяна ішла невялічкая, кругленькая, як бочачка, жонка, сціпла хаваючыся за яго спіну. Яна, відаць, дужа добрая ў яго — усё неяк даверліва ўсміхалася, стульваючы, як Цімоха, вусны, мусіць, каб не паказваць, што пры чыстых і прыгожых пярэдніх зубах у яе няма кутнікаў.

Павітаўшыся, купец распытаў спачатку, чые гэта дзеці бегаюць, а матчын адказ: «Гэты — даччын, а тэй — сынаў», яго не задаволіў — ён доўга яшчэ дапытваўся, які ж гэта Той, а які Гэты, нібыта для яго яно было вельмі важна.

Хлапчукі, набегаўшыся, прыселі зводдаль, сядзелі,

слухалі, як пра іх вельмі ж падрабязна ўжо распытвае незнаёмы чалавек, шапталіся між сабою і рагаталі.

— Сціхніце, неслухі! — не дужа строга супакойвала іх бабуля, але Петрусі бачылі, што яна не злуецца, і хіхікалі, як і раней.

Хлапчукі не любілі, калі пра іх хто-небудзь так уважліва распытваў. Аднойчы нават яны вярнуліся з Грукава, куды хадзілі па хлеб, з пустымі рукамі.

— Што, можа, магазін зачынены? — спытала ў іх бабуля.

— Не, адчынены.

— Дык чаму ж вы не купілі нічога?

— А нас як абступілі грукаўскія бабы, як пачалі распытваць: «А ці не Надзёжыны вы ўнукі будзеце?», дык мы ходу...

— Во дзікуны,— адно толькі і змагла адказаць ім маці.

Зараз хлапчукі ўсё яшчэ сядзелі зводдаль і, не слухаючыся бабулі, рагаталі.

Прысеўшы з намі, купец прыдзірліва распытваў пра Кагадзея, пра яго сям'ю, як ходзіць карова ў статку, якую траву есць, якія ў яе рогі, які хвост, быццам бы, не бачыўшы ні Кагадзея, ні яго каровы, адразу быў упэўнены, што яго збіраюцца абдурыць і ўсурычыць замест каровы нікуды не вартую быдлю. Матчыны адказы таксама слухаў з недаверам — маўляў, хваліце, хваліце, сусед жа суседу абедню псаваць не будзе. Таму маці ў размовы асабліва не кідалася — толькі адказвала, пра што ён пытаўся.

Купец з Мамонаў — а гэта быў начальнік тамтэйшай невялікай чыгуначнай станцыі — сядзеў на былой траншэі, апусціўшы рукі да травы. Вялікія жылістыя рукі, сухарлявая фігура — усё выдавала ў ім селяніна, працаўніка, які ведае, што такое цяжкая праца земляроба. З-за яго спіны сарамліва выглядала жонка, якая і тут, падкурчыўшы пад плацце босыя ногі, села за мужам.

Купец, падазронаназіраючы на нас з Андрэем, на Веру — маўляў, ці няма тут Кагадзеевых,— усё распытваў пра карову:

— Слухайце, а ногі ў яе тоненькія ці не?

— А хто іх ведае, ці яны тонкія, ці тоўстыя,— адказвала маці.— Неяк не прыглядалася. А хіба гэта нада знаць?

— Э-э, не кажыце! Нада ды яшчэ як нада. Калі ножкі тоненькія, карова малочная, харошая.

За яго спіною сарамліва ўсміхалася адпымі вуснамі жонка.

— А хвост, не бачылі, у яе вышэй каленяў ці ніжэй?

— І гэта важна?

— А як жа! Ніжэй — карова малочная, і нада, каб пуп відаць быў, — і купец паказаў пальцамі, нібы прыстаўляючы сабе той пуп.— Не помпіце, відаць у яе ці не?

— Хто яго ведае,— паціснула плячыма маці.

— Ды як жа гэта вы так — не ведаеце? Як сабе карову выбіралі, пябось усё паагледзелі.

— Айё! А як я сабе выбірала? — ужо нібыта ўзлавалася маці.— Я пайшла во да дзеда ў Аўдзейкава, той мне кварту малака паліў, я выпіла, аддала грошы, повад у рукі — і павяла дадому.

— Э-э, не, я так з налопу каровы купляць не буду! Шах-мах! — і павёў. Прывядзеш дадому, а яна, да прыкладу, адну ваду дае. Рэдзенькую такую, сівенькую. А мне ж вада не нада. Вады я вунь і са свайго калодзежа магу выцягнуць. Мне малако нада.

Жонка ўсё, не раскрываючы рота, усміхалася. Муж нібы і не заўважаў яе.

— Э-э, не, так каровы ніхто не купляе,— усё не супімаўся ён, насцярожана пазіраючы на нас.— Я во пайду зараз туды, няхай гаспадыня пры мне падоіць яе, я малака сам пакушаю, а потым яшчэ і ў бутэлечку наллю,— купец дастаў з кішэні парожнюю чвэртку з-пад «Экстры» і адаткнуў яе, ні то каб паказаць нам, ні то каб упэўніцца самому, што яна не згубілася,— наллю і з сабою занясу дадому: няхай састоіцца. А тады мы і рашым — купляць яе ці не.

Потым заткнуў чвэртку, схаваў у кішэню і зноў пільна зірнуў на маці:

— А вы не ведаеце, тры пальцы паміж яе рэбраў не ляжа?

— Гледзячы чыіх, — усміхнулася маці.— Калі вунь дзяцінных, дык і ўсе пяць лягуць.

— Не, мне нада, каб маіх тры пальцы лягло,— і мужчына ўзняў з каленяў сваю цяжкую далонь і сам паглядзеў на тоўстыя рабочыя пальцы.— А віхор у яе на крыжы ёсць?

— Віхор, здаецца, ёсць,— няпэўна адказала маці.

— Тады добра. Бо віхор — гэта прыкмета добрай каровы.

Пасядзеў яшчэ трохі, распытаў пра нашу гаспадарку, пасарамаціў нават маці, што не трымае парсючка:

— Яно, калі ёсць карова, дык і свінчо нада. А то ж прападае столькі — што недаціае, што недаестае. А куды ты малако лішняе дзяеш? Можа, прадаеш каму?

— Карове зноў выліваю.

— Вось бачыш, якая ты не беражлівая. А было б свінчо — яно б усё за вамі падабрала, а к зіме, глядзіш, і сала...

Ён палапаў па кішэнях — відаць, каб упэўніцца, ці паклаў назад бутэлечку,— і сказаў, нават не паварочваючыся да жонкі:

— Ну што, поїдзем?

Тая слухмяна падпялася, зноў сарамліва ўсміхнулася, моўчкі кіўнула нам на развітанне галавою і паспяшалася за размашыстай хадою мужа — усё ззаду за ім, усё пакорліва. Калі яны адышліся, маці дала сабе волю:

— Во ўжо мазоль дык мазоль. Трасца яму трэба, а не карова.

Мазоль быў у Кагадзеяў доўга. Пайшоў ён дадому позна, як пачало цямнець. Сваім размашыстым крокам, у блакітнай саколцы, хоць к вечару і пахаладала, ён ішоў у бок ручая, на хаду акуратна затыкаючы заткалам чвэртку з малаком. За ім, выглядваючы з-за яго пляча, спяшалася жонка.

На другі дзень Волька на вуліцы гаварыла жанчынам:

— Агоў! А не, гэта не купец маёй карове. Такому ўжо каровы не купіць: ён хоча, каб і малака было многа, каб яно і тлустае было і каб танна ўзяць. А каму нада карова, той не глядзіць, што дорага,— купляюць. Нашай жа карове ніякай заганы няма. Яна ж, дай-тку ты, пятнаццаць літраў малака дае. А яна ж маладая яшчэ, трэцім целем усяго, а карова ж яшчэ да пятага целю малака прыбаўляе. У мяне вунь у самой да шостага прыбаўляла.

...А яшчэ раней Кагадзеі рашылі былі здаць маткіну карову на прыёмны пункт. На світанні ў Жыцькаве загуркала машына — Цімоха з Волькаю па дошках завялі ў кузаў карову і павезлі яе ў гарадок. Праз нейкі час Цімоха вярнуўся адзін — прыехаў аўтобусам,— збегаў па каня, запрог яго і, зазірнуўшы на хвіліну дадому, заспяшаўся некуды зноў.

— Куды ты, Цімафей Іванавіч? — спытаўся Андрэй, калі калёсы тарахцелі ля нас. Але той, нічога не адказаў-

іцы, толькі махнуў рукою і нецярплівей зашморгаў лейцамі, падганяючы каня.

Вярнуліся яны толькі к вечару. І калі Андрэй хацеў ісці да Цімохі кляпаць касу — у таго ж ёсць бабка і клявец,— маці не пусціла яго:

— Цябе яшчэ там не хапала. Кагадзей жа і так злы, як чорт: яны ж карову назад з гарадка прывялі.

А Цімоха, калі адышло троху яго зло, сам расказваў нам пра тое, як здаваў карову:

— Прывезлі мы яе ў раён, з кузава па дошках ля пункта здачы звялі на зямлю. І машыну адпусцілі — на чорта мы яе цэлы дзень ля сябе трымаць будзем. А карова наша скубець, дзе якую травіну ўбачыць,— аж повад торгае: як усё роўна яна да гэтага і травы не бачыла. Ну, як рабочы дзень пачаўся, людзі зашавяліліся, прыёмшчык прыйшоў. Абышоў ён спачатку ўсіх кароў, некаторым адразу сказаў: «Не прымем, вязіце назад». А нам — нічога... Зірнуў толькі на карову і прайшоў ціха... Ну, стаім мы з мужчынамі, жартуем. Адзін маленькі-маленькі такі дзядзька — вот вашы Петрусі і то за яго большыя — стаіць перад намі. Сам маленькі, значыць, а карову вялікуювялікую, як буда, прывёў — з тваю, Надзёжа, яй жа богу, не лгу, хату. Вот мужчыны і смяюцца з яго: «Ну, ты ж яе, канешне, калгасным усім выкарміў такую. Я, скажам, вялікі, дык мяне кожны ўбачыць, калі я красці пайду, а цябе — ніхто: ты малы, дык у любую дзірку ўшчэмішся». Смяяліся, смяяліся, а дзядзька як паставіў на вагі сваю карову — дык тая стаіць, што той мамант. Тысячу дзвесце нарублёў яму за карову далі — во тут і смейцеся з яго. А наша як на зямлі, дык яшчэ нічога была, а як паставілі яе на вагі, а яна, быдля, спужалася нешта, зморшчылася, усе свае маслы як папавыстаўляла ўперак, дрыжыць, дык прыёмшчык як закрычыць: «Здымайце хутчэй з вагаў гэтую здыхляціну, пакуль яна тут не паваліласяǃ» Мы з Волькаю параіліся, параіліся ды і рашылі забраць дамоў. Яно можна было б, Надзёжа, нейкую дзесятку прыёмшчыку сунуць, каб прыняў, але ж за дзесятку ён і рабіць нічога не будзіць. Нада болей. А аддай паўсотні, ды яшчэ карова пойдзе ніжэй сярэдняга, дык не стоіць будзе гэтая карова і той вазні ўсёй — як за казу, за яе палучыш. Дык мы з Волькаю пагаварылі, параіліся і рашылі: «Не, павядзём лепей дамоў». Тады Волька повад у рукі — і павяла карову, а я на аўтобус і дадому: нада ж было хоць каня запрэг-

чы — усё ж сорак кіламетраў, дык хоць едзе на калёсы ды пад'едзе крыху жонка...

Вось пасля гэтага і началі хадзіць да Кагадзеяў купцы...

Не паспелі нашы жанчыны яшчэ перабраць усю маліну, як і Лерка выйшаў ад Цімохі і таксама ручаём пайшоў пад Лахі. Ні па яго хадзе, ні тым больш па твары — Лерка ж ішоў далекавата ад нас — нельга было адгадаць, старгаваліся яны ці не.

Недзе перад самымі кустамі, перад высокім алешнікам, які засланяе Летуны, колішнюю зялёную вёску,— яна, падпаленая фашыстамі, таксама згарэла датла,— дзед Лерка сустрэў жанчыну з дзецьмі і, відаць, павітаўся — мы бачылі, як ён зняў сваю шапку і нават пакланіўся, здароваючыся. Яны стаялі і гаварылі. Лерка нешта махаў рукамі, паказваў пальцам у бок Жыцькава, а жанчына, трымаючы малога на руках, уважліва яго слухала.

— Відаць, яшчэ адна купчыха да Цімохі ідзе,— зірнуўшы ў тої бок, услых падумала маці.

І праўду, гэта была новая купчыха — даярка з Хвошна. Яна прыйшла сюды з двума дзецьмі: маленькі сынок ціха сядзеў у яе на руках, а большанькая дачушка трымалася за матчыну спадніцу — нібы баялася згубіцца ў незнаёмай вёсцы. Даярка схадзіла да Кагадзеяў, пасядзела там, а калі Волька пасля паўдня выгнала кароў у поле — была якраз іх чарга пасвіць,— разам з ёю ішла за каровамі і купчыха. Насупраць нас, па Дарахвеевым хацішчы, яны селі. Сядзелі, як даўнія знаёмыя, і даверліва, гучна размаўлялі: іхняя размова нам добра была чуваць.

— Па мне хоць і дзесяць літраў дае — нічога. Сядытады, вы ж ведаеце, і саўгаспага прынясеш. Днём, праўда, не прынясеш, а ўвечары можна. А то троху няёмка было. Хто ўбачыць, што дзеці малако ядуць, дык і скажа: «Каровы няма, а яны смятанку вунь як цмуголяць...»

Сын, якога матка спусціла ўжо з рук, асмялеў, не баючыся, хадзіў ля кароў і грыз надкушаную антонаўку. Падышоўшы зусім блізка да Рагулі, якую таргавала матка, ён выставіў, хоць і не вельмі смела, уперад руку з яблыкам, а калі карова падняла галаву і, выцягнуўшы шыю, спутаная, зрабіла колькі дробных крокаў, каб дастаць яблык, малы, відаць, збаяўшыся, хацеў схаваць руку і кінуцца наўцёкі, але, падбадзёраны маткаю, застаўся на месцы: яму і самому хоць было і страшнавата, але цікава ўбачыць, што будзе далей. Карова падышла бліжэй, неяк

вельмі асцярожна языком падабрала з малой далонькі яблык, стаяла і, глядзячы ні то на малога, ні то за яго, задумліва хрумстала.

Даярцы гэта вельмі спадабалася. Яна ўсміхалася, неяк замілавана глядзела на сына і на карову, між якімі нібыта ўзнікла нейкае разуменне, агульнасць, і казала да малога:

— Воўка, ты не бойся, не бойся яе, падыдзі і пагладзь...

Воўка нясмела, але ўсё ж падышоў і правёў даланёю па пысе — ад рота да вока. Карова нават і не плюснула — стаяла, як і раней, і задумліва жавала яблык.

— Ай якая кароўка смірненькая,— радавалася даярка.— Во ўжо добра: і дзеці яе баяцца не будуць, і яна іх — таксама.

Потым паднялася, падышла да каровы, паспрабавала даіць:

— І доіцца во як лёгенька.

Яна зноў узялася за вымя, цыркнула колькі разоў у траву.

— Яе ж і дачка падоіць, калі я, можа, дзе забаўлюся. Нінка, дзе ты, хадзі даіць нашу кароўку паспрабуй.

Дзяўчынка падышла і нясмела, не звыклымі яшчэ да гэтай работы рукамі, таксама пацягнула за вымя — і на траву пырснуў белы струменьчык, хоць і не такі тугі, як пасля матчыных пальцаў.

Карова стаяла ціха, спакойна — быццам бы яе і не чапалі.

— А цяпер пайшлі ў хату, пагаворым,— прапанавала даярка.

Волька таксама ўзнялася:

— Надзёжа, прыглядзь тут за каровамі,— і яны, гаворачы, пайшлі ў хату.

А надвечар даярка прыехала на кані: значыць, старгаваліся.

На калёсах зараз сядзела ўжо трое дзяцей — двое тых, што прыходзілі з маткаю, і трэці, старэйшы, зусім па-сталаму прасунуў праз драбіны ногі і, шморгаючы лейцамі, покаў на каня.

Карову прывязалі да калёс. Хлопчык усё покаў, кіруючы па дарозе, а даярка ішла ззаду, за кароваю, і паганяла яе прутом.

Карова ўпіралася, раўла, матала галавою, нібы спрабуючы скінуць вяроўку, накручаную на рогі, але ўсё ж ішла за калёсамі. Жаласліва раўла яна сама, перасталі

скубці траву і ўсе іншыя каровы — таксама паўзнімалі галовы, стаялі і трывожна раўлі.

— Нічога, прывыкне,— ласкава надганяючы прутом сваю ўжо карову, супакойвала сябе даярка.

Статак доўга і неспакойна глядзеў у той бок, куды павяла карову даярка,— аж пакуль не схаваліся за высокімі алешынамі і калёсы, і жанчына, і карова.

У Жыцькаве неяк стала ціха-ціха.

— Колькі ж яна табе дала? — спытала маці, калі Волька вярнулася да кароў.

— Я прасіла семсот, а яна аджалела шэсцьсот семдзесят пяць.

— А колькі Лерка даваў?

— Ён вышэй шасцісот пяцідзесяці не падымаўся...

— Ну во, цяпер яшчэ часцей чараду пасвіць давядзецца,— забедавала маці.— Гэта ж каб вунь тыя,— яна паказала ў бок Вархоў,— былі людзі як людзі, дык бы троху лягчэй было. А то ж адзін, як чалавека дзе ўбачыць, у кусты хаваецца, а другая дзесяць гадоў адну карову дзень у дзень пасвіць.

Мы разумелі, што яна гаворыць пра Казятніка і пра Аксюту.

Ну што ж — у кожнага свой клопат.

## 5. РАЗМОВЫ,

***з якіх мы даведваемся***
***яшчэ сёе-тое пра нашых герояў,***
***а таксама задумваемся над пытаннем,***
***ці з адных цвятоў сабраныя мы самі***

Фыр-фыр-фыр-фыр!

І лёгенькі, трапятлівы ветрык неяк вельмі ж ужо спешна прабегся па босых нагах, па руках, патрымцеў над самым тварам і, зачапіўшыся за валасы, хуценька павярнуўся назад — зноў твар, зноў рукі, зноў ногі: фыр-фыр-фыр-фыр!

Адкрыў вочы і ляжаў ціха, усё намагаючыся зразумець, што ж гэта мяне так ласкава разбудзіла.

Сена на хаце было накладзена як не да самага вільчыка. Я ляжаў у ямцы — сена свежае, не паспела яшчэ зляжацца і падмялася толькі пада мною.

Праз выскубленую ветрам дзірку ў страсе пругка біла

сонечная раніца — у слупку сонца, што падаў са страхі, як камары перад дажджом, таўкліся пылінкі. Было ціха-ціха. І толькі недзе на двары задаволена і прыглушана сакатала курыца.

Фыр-фыр-фыр-фыр!

Зноў той жа самы ветрык паўтарыў ранейшы шлях.

Ах, во яно што! Гэта ж ластавяняты, якія так прывыклі да гнязда, усё яшчэ па звычцы ныраюць з двара ў цемнаваты лаз, да якога прыстаўлена лесвіца, і настойліва пырхаюць ля таго месца, дзе яшчэ нядаўна на лаціне было іхняе гняздо.

Гняздо гэтае мы ўсе вельмі берaглі. Петрусі і то асабліва не дакучалі ластавянятам: узлезуць, паглядзяць і — назад. Нават маці не давала залежвацца на хаце. «Уставайце,— клікала яна,— а то ластаўкам ластавянят карміць нада». Калі мы складалі сена на хату, хлопцы, як на варце, стаялі ля гнязда, каб не зачапілі яго выпадкова віламі.

Нашы ластаўкі, відаць, запазніліся звіць сваё гняздо, і таму ластавяняты вывеліся ў іх запозчена. Іншыя ўжо даўно на сваіх крылах аблятаці Жыцькава, а нашы ўсё яшчэ сядзелі ў гняздзе і па-дзяціnаму прасілі ў бацькоў корму.

Час быў збірацца ў вырай, а яны ніяк не маглі акрылець. У Жыцькаве на правадах сядзела ўжо некалькі ластаўчыных сем'яў, дзе і моладзь лятала, як дарослыя.

Мы бачылі, што нашых ластавянят кормяць не толькі бацькі. Часам ля гнязда кружылася па пяць, а то і па шэсць ластавак, і ўсе яны неслі малым у дзюбах нейкую спажыву: суседзі, можа, і злуючыся, усё ж не кідалі нашых адных і, падкармліваючы, цярпліва чакалі, калі вылецяць на крыло малыя.

Аднаго разу ўдзень узлезшы на сена, каб схавацца ад гарачыні, я не ўбачыў гнязда на яго звычайным месцы. На лаціне толькі сіратліва шарэлі рэшткі сухой зямлі, а на сене пад лацінаю валяліся вялікія і маленькія камякі, пер'е, пух — усё, што асталося ад нядаўняга гнязда, а можа, і ад саміх ластавянят.

Раззлаваны, я ледзь не за вушы ўсцягнуў малых на сена — хто ж, акрамя іх, мог разбурыць? Але Петрусі, убачыўшы, што гнязда, якое яны так берaглі, няма, расплакаліся самі. Дзеці плакалі так шчыра, што я паверыў: яны гэтага не рабілі.

Ужо разам мы пайшлі шукаць ката Максіма. Той ля-

жаў у баразне, лопаў хвастом па бульбоўніку і зацікаўлена назіраў, як грабуцца ў пыле куры. Яго мы агледзелі ўважліва, але ніякіх слядоў разбою не знайшлі: ні на кіпцюрах, ні на зубах не было ні пушынкі, ні пярынкі. Кот Максім, нібы ўсміхаючыся, глядзеў на нас — маўляў, шукайце, шукайце, я нічога не рабіў,— і асабліва не супраціўляўся, калі мы даставалі кіпцюры і старанна іх аглядалі.

Зразумелі ўсё толькі тады, калі ўбачылі ластавянят, якія, моцна ўчапіўшыся лапкамі, побач з дарослымі сядзелі на провадзе, што нaціху гайдаўся ад ветру; здавалася, яны вось-вось зваляцца — ластавяняты ніяк не маглі патрапіць у рытм гайдання: дрот — наперад, яны — назад; дрот — назад, яны — наперад.

Ластаўкі самі разбурылі гняздо, каб дзеці хутчэй вылядалі на вецер, хутчэй аблётвалі свае крылы: калі не будзе ў іх гнязда, дзе вельмі ж хораша, спакойна і не боязна сядзець, чакаючы бацькоў з кормам, то хочаш ці не хочаш, а давядзецца паболей давяраць толькі сваім маладым рукам — крылам...

Прачнуўшыся, я ціха ляжаў на сене: хоць і ведаў, што нанова ўжо не засну, але і ўставаць таксама неяк не хацелася.

Пачуў, як па маіх нагах нехта асцярожна і моўчкі ходзіць — каб ноччу, далібог бы, спалохаўся. Падняў галаву і ўбачыў, што гэта чорная курыца — відаць, тая, што толькі сакатала на двары,— шукае гняздо, каб пакласціся. Я ўзяў яе за крылле — а нашы куры не баяцца людзей: хлопцы іх прывучылі — і пасадзіў у гняздо, якое было якраз за маёй галавою. Яна сядзела і ціхенька сакатала, як тады на двары — ко-о-о-ко-ко, ко-о-о-ко-ко...

Недзе на вуліцы завурчала машына. Яна пад'ехала ледзь не пад самую нашу хату. Залопалі барты, загрукалі боты, загаманілі жанчыны. Яны, пэўна, злазілі з машыны, весела смяяліся, нават рагаталі. Жанчыны, відаць, прыехалі браць позні лён, які пачынаўся адразу за нашаю хатаю.

Іхняя гаворка мне была добра чуваць.

— Яго, і лёну гэтага, адзін толькі лапік — браць няма чаго. Слоў болей было, чым работы. А то ўсё толькі і чулі: жыцькаўскі лён ды жыцькаўскі лён.

— Яго маглі б і самі жыцькаўцы вырваць.

— Што ты, Лена, смяешся, ці што? Хто табе тут у Жыцькаве лён браць будзе? Тут жа адны пенсіянеры па-

засталіся. Гэта ж вунь яшчэ Кагадзеева Волька толькі на працу ходзіць. І то таму, што пасля вайны падмаладзілася, ва ўсіх дакументах маладзейшай запісалася. Цяпер па гадах ёй ужо на пенсіі даўно трэба быць, а па дакументах — рана. Вот ёй зараз і моташна — хоць ты сябе за локаць кусай: і плача, і злуецца, але ж на працу ходзіць.

— Дык ёй жа, казалі, Віцька Пруцень узяўся памагчы.

— Гэты можа, возячы Каранькевіча, закінуць слова за Вольку.

— А Каранькевіч паслухаецца. Старшыня ў нас добры.

— Занадта ўжо добры. І мяккі нейкі... Вось Вобадаў...

— Што ўжо ты, Соня, па ранейшаму засумавала? Зноў Вобадава ўспомніла. Той, бывала...

— А што табе Вобадаў? Па крайняй меры старшыня быў. Хоць баяліся ўсе.

— Бывала, як толькі пачуюць, што яго машына гудзе, хто куды ў кусты хаваецца. Усе ўжо нават па гуку пазнавалі яго «казла» — ён і гурчаў неяк не так. Машыны яшчэ не відно, а ўсе ўжо ведаюць, што Вобадаў едзе.

— Нават п'яныя цверазелі. Азірнецца — і як дасць, дасць каторы ў кусты... «Хавайцеся,— крычалі,— Вобадаў едзе!»

— А той і сам, бывала, казаў: «Я толькі адзін раз па калгасе праеду і ўжо сабе на зарплату збяру».

— Ага, штрафаваў ён многа.

— А помніце, як ён Аксюту, Сахвеіну сястру, з мяшком сена злавіў? «Куды ты, старая, траву нясеш? — пытаецца.— Карове?» А тая ўжо так напалохалася, што і гаварыць не можа. Але ж выкруцілася. «Не, кажа, старшынька, гэта я ўзяла каня бульбу абагнаць, а горача, дык ён не ходзіць, вось я яму і нясу — хай у цяньку паесць, каб і мухі не кусалі».

— А я тваю Аксюту даўно б аштрафавала. Навошта ж яна дзесяць год сваю карову па калгасным пасе?

— Ага, пусціць карову, куды тая ідзе, туды і яна за ёю цягнецца: «Краля, Краля...» За дзень увесь свет сходзіць.

— Вунь летась аж заблудзілася была: карова яе далёка завяла. Аж з-за Гарэлага Моху — з-пад Луфёр, з-пад Піліпёнкава хутара яе разам з кароваю нейкі чалавек у Жыцькава прывёў.

— Не, не кажыце, Вобадаў дзелавы быў. Казалі, спаць

клаўся і компас ля сябе клаў — каб з дарогі не збіцца, калі ў сне куды пойдзе.

— А строгі які быў!

— Строгі-то строгі, але гэта, памятаеце, пры ім было, як Васілька малаціў Гальцы ячмень, а потым п'яны развярочваўся, зачапіў за вугал Гальчыну хату і ў груд яе склаў?

— Во табе і строгасць.

— Ці вунь, як Пamaзок п'яны араў на трактары. Курыў і сп'яну заснуў, відаць, бо папяроска выпала і ўсё сядзенне згарэла. Сам, праўда, паспеў выкуліцца з кабіны — толькі ватоўка задымілася і ватнікі ззаду аж да голага цела выгаралі...

— А гэты во і не штрафуе, і не крычыць, а яго ўсе слухаюцца.

— І парадку ў калгасе болей.

— Гэты, брат, чалавек добры, зычлівы, дабрахотлівы. Кніжак многа чытае — як Надзёжын зяць усё роўна.

Я ўсміхнуўся — бач, і пра мяне ўспомнілі.

— Каранькевіч і з чалавекам пагаворыць, і дапаможа, і шапку перад старым не пасаромеецца зняць. А мог бы закабызіцца: я старшыня, а ты хто?

— Яно і бацька яго таксама чалавек быў харошы. Во ўжо быў камуніст дык камуніст. Нешта дужа многа марак абяцалі за яго. Калі яго, партызанскага камандзіра, злавілі карнікі, віселыпо пабудавалі для аднаго. Яму пятлю на шыю адзяюць, а ён выказваецца: «Я іду на віселыпо, на якой будзеце павешаны вы».

— Цяпер старшыня картачку бацькаву вялікую зрабіў — ці бачылі вы ў яго дома, як не на ўсю сцяну вісіць? І за свае грошы на тым месцы, дзе бацьку павесілі, помнік паставіў. Аж з усёй вобласці экскурсіі прыязджаюць наглядзець.

— А ці помніце, як ён Глеўчыка прысарамаціў? На што ўжо ў таго скура тоўстая, а і то пачырванеў.

— Гэта ты, Аўдуля, пра тое пазалеташняе жніво, калі Каранькевіч толькі за старшыню стаў?

— Ага. Гэта ж паслухайце, хто не чуў. Недзе з абеду сказалі Каранькевічу, што ў Глеўчыка камбайн стаў. Што ні робяць, ніяк завесці не могуць. А тут жа самае жніво — па-мойму, гэта тады мы якраз па снапу якому, па бункеру ў дажджу праліўнога кралі зерне. Каранькевіч туды. Скінуў пінжак, рукавы закасаў: «Дайце-тку я нагляджу». А Глеўчык стаіць ля камбайна і ўсміхаецца. Накалупаў-

ся-накалунаўся старшыня ды і змікіціў. «У цябе там,— кажа да Глеўчыка,— выпадкам няма дзе лішняй свячы ў кішэнях? А то старая выпала». Глеўчык, і сапраўды, дастаў з кішэні свячу, а сам усё будзіць казаць: «Во, чорт, паламаўся камбайн». Каранькевіч слухаў, слухаў, а пасля не вытрымаў: «Я табе накажу, паламаўся! Ён паламаўся таму, што ў твайго дваюраднага брата вяселле сёння. Дык так бы і сказаў, а то выдумляе абы-што, каб на вяселле не спазніцца». Глеўчык і не ведаў, што Каранькевіч акадэмію скончыў і машыны ўсе знае лепей за яго. Старшыня асабліва і тады не сварыўся на камбайнера. «Ладна, кажыць, ідзі гуляй вяселле сваё. А я да вечара на тваім камбайне пажну. Толькі табе трэба было адразу сказаць, што і да чаго. А ты выдумаў — свячу хаваць...»

— Нашто бога гнявіць, харошага мы сабе старшыню выбралі.

— Ён во і пенсіянераў гэтых жыцькаўскіх зразумеў. Вобадаў тоя быў як узяўся, як разышоўся: «За месяц нассяляю ўсіх у Азярычына! — крычаў.— Што ж гэта палучаецца? Там у нас дамы каменныя, кватэры гарадскія, газ, асфальт усюды — старыя, калі захочуць, дык і ногі памачыць не змогуць,— а яны яшчэ ўпіраюцца, не хочуць ісці. Восенню ж у гэтым Жыцькаве гразь — не вылезці, зімою холадна ў хатах, а яны не ідуць. За месяц ссяліць!»

— Ён і электрычнасць у Жыцькава не хацеў праводзіць. Адно злаваўся: «Навошта слупы псаваць — усё роўна ссяляць будзем».

— А Каранькевіч па-другому разважыў. Тады на праўленні казаў: «Не, няхай ужо яны, нашы пенсіянеры, застаюцца там, дзе ўсё жыццё сваё пражылі. А то перавязём іх сюды, у наш новы пасёлак, а тут трэба пачынаць новае жыццё. Нашым маткам гэта будзе цяжка. Новае жыццё нада пачынаць, каб наноў жыць, ім жа — позна ўжо. Яны не прывыкнуць сядзець склаўшы рукі ў нашых камяніцах».

— А можа б, хто і захацеў?

— Дык няхай і пераязджае ў Азярычына. Каранькевіч жа казаў: кожнаму хоць зараз кватэру дадзім.

— Чаго яны туды паедуць, ім жа і тут добра.

— І праўда, што вунь тваёй Ручалісе абыходзіць? Дзяцінець пачынаюць ужо на старасці.

— Ды што гэта ты на яе так злуешся?

— А як жа, Ганна, не злавацца. Была баба як баба, а толькі памёр Ляксандра, яна адразу — трах! — валасы

свае перафарбавала, хустку на плечы спусціць і трасе патламі, як дзеўчанё якое семнаццацігадовае. І ні сораму, ні стыду. Хоць бы ўпукаў трохі вараваласяа — табе ж, баба, ужо шэсцьдзесят пяць гадоў.

— Дык яна жаніха хацела знайсці.

— І знайшла. Прыласіла Рупянька. Ды так ужо жалеіць яго. Палку дроў не дае адсекчы: «Пецечка, ты ж стаміўся, ты ж сядзь, ты ж адпачні».

— А сваййму Ручалю дык і прысесці не давала. Ледзь што — у крык: «Ты толькі і сядзіш, каб ты седнем сеў! Другія мужчыны працуюць, а ён толькі б і сядзеў...»

— Дык яна ж, кажуць, яго і забіла. Сядзеў за сталом, а яна яго нейкім матузом агрэла, дык ён і скаціўся з услона.

— Ну, не кажы — матузом не заб'еш. Відаць, яна ўжо яго мёртвага сцебанула. Мусіць, ад гарэлкі атохся.

— А гэтага новага беражэ.

— Яна вунь, кажуць, і Моці Прутнёвай знайшла жаніха.

— Ага, і я таксама чула, як сама Моця хвалілася: «Цяпер я ўжо ведаю, хто мяне два гады любіць».

— А дзе ж яе жаніх хоць жыве?

— Моця кажа, што другая дзярэўня ад гарадка. А як пачалі распытваць, па які бок ад гарадка, дык яна і сама не ведае.

— А ёй, можа б, і нада быў, Моці тваёй, які чалавек у хаце. А то яна адна, як воўк. Так і звіхнуцца можна.

— Дык вы ж, відаць, помніце, як яна гады са два нешта дужа лоўка загаворвацца пачала. Сядзіць тады на стозе сваім, што на ракорд касіла, медуніцу выбірае і скідае далаўкі. «Моця, што гэта ты робіш?» А яна: «Ай, вам лёгка гаварыць, у вас ужо стагі паабмералі, папрымалі. А мой жа ніхто не прыме, пакуль я медуніцу не выкіну».

— Хопіць вам ужо, дзеўкі, абгаворваць усіх. І мы ж самі не з адных цвятоў сабраныя.

Жанчыны змоўклі. Нейкі час было ціха. Але нядоўга — хто ж гэта ўцерпіць, хто ж гэта зможа маўчаць, калі працуеш такою талакою. І таму неўзабаве зноў загаварылі:

— А ці чулі вы, як наш Сліпдук хадзіў да Тамарынай маткі адрас Тамарын прасіць?

— Ну? — пачулася аж некалькі зацікаўленых галасоў, якія ўзрадаваліся, што размова пачынаецца зноў.

— Каб мне з гэтага месца не сысці, праўда. Кажуць,

што ледзь на калені не станавіўся — так прасіў не віцебскі адрас.

— Божачка, божачка, што гэта толькі робіцца,— забожкала не маладая ўжо — чуваць па голасе — жанчына.

Зноў нейкі час на полі было ціха.

— А ў Тамары ўжо двое дзетак — яшчэ радзіла...

— Ну, няхай і гадуюцца здаровенькія, без гэтага ж нельга жыць — жанчына павінна хоць адно дзіця радзіць.

— Ага, і праўда, Соня. Вунь помніце, як у Шыбекавай спачатку дзяцей не было. Яны ўжо збіраліся з дзетдома браць — Шыбекава, бывала, і на грудзі сабе наверціць чаго папала, і на жывот усе хусткі пазакручвае — каб людзі падумалі, што яна ў палажэнні.

— А як Юльцы Сёмачкінай дзіця хацелася? Помніце, як яна, бяздзетуха, вялікую-вялікую ляльку купіла сабе,— ну як твая, Марфа, Галя — плацця ёй папашыла, у хаце намыецъ, адзенець яе, насадзіць на ўслоне, валасы ёй будзіць расчэсваць і ўсё гаворыць, як з жывою. Спачатку думалі, здурнела баба. Аж не. Як толькі радзіла — так адразу і забылася на свае дзівацтвы.

— Яна, бабы, нараджалася, наспела. Другі хлопец то ўжо ад мужыка, а большы дык яна і сама, відаць, не ведае чыйі.

— Пра Сёмачкіну мы ўжо і забыліся. Калі тое было — ці варта ўжо і ўспамінаць. Вунь і Прутніха таксама дачку ў дзеўках знайшла. І бачыце, якую выгадавала — замуж выдала.

— І Соня вунь весялёўская адна хлопца свайго выгадавала.

— Што ты Соню раўняеш! Соня ж не проста так радзіла, каб ты ведала. Соня ж так любіла Сашку Дзяніsавага, так любіла. І цяпер яшчэ любіць.

— Казалі, яна і сёлета ўгаворвала Сашку нераїсці да яе.

— Што табе «казалі», калі я сама чула, як яна гаварыла: «Каб ён толькі са мною жыў, дык я яму б кожны дзень ногі мыла і тую б ваду піла...»

— А Сашка ж і сам ад сына не адказваецца. Дзе стрэне, дык і павітаецца: «Здароў, сын!» — «Здароў, бацька!» — адкажа тоїі.

— Ага, ён усюды так і гаворыць: «мой сын», «з маім сынам».

— А сваю Шуру вельмі ж ужо лоўка б'ець. Кажуць, што яна ўжо на адно вуха зусім не чуе.

— Ай, неяк у яго ўсё абы-як пайшло. І яму пад пяцьдзесят ужо, а яно ўсё ніяк не навядзецца.

— Глядзіце, сёлета ён нешта бацькавіну не касіў. Так жа кожнае лета і араў, і касіў — як сваё ўсё роўна.

— Тады і касіў, як з брыгадзірам у дружбе быў. Паставіць яму гарэлкі, а той пасля і не глядзіць у яго бок. А калі і глядзіць, дык нібыта нічога і не бачыць.

— А цяпер во пабіліся, дык ужо кукіш і выкасіш.

— А я гляджу, такая трава высокая, як траста, стаіць — аж пабялела, перастоеўшы,— Лізка вунь жала ды хату крыла.

— Дык ён жа цімафееўку па бацькавым гародзе падсяваў.

— Вельмі ўжо асмялеў твой Сашка.

— Я ж сама бачыла, як ён з Гардзеем біўся. Стаяла во так во, як да цябе, Ганна.

— Гэта ж пада, па брыгадзіра і то кідаецца.

— Сёлета ж Каранькевіч да дваццатага ліпеня забараніў сабе сена касіць. Кажа, у калгас накосім, а тады — сабе. Травы ж па нашых кустах на ўсіх хопіць. Каранькевіч забараніў, а ён, бачыце, вязе сабе. Нікому, бачыце, нельга, а яму — можна. Пан гэткі знайшоўся. Сустрэў яго Гардзей — я думала, і тут ён вочы адверніць. Не, чую, спыняе: «Ты куды гэта вязеш?» — «Як куды — дамоў».— «Скідай зараз жа». А той саскочыў з возу і біцца да Гардзея: усё пугаўём яго. пугаўём таўчэць. Ды такі ўжо ўчэпісты — ледзь адцягнулі ад брыгадзіра.

— Твой Гардзей і сам ладны, Хвеньку таксама б'ецць.

— Б'ець-то б'ець, але ж і любіць.

— А яго ж Матруна Дзенісёнкава вунь як любіла. А тады во як выйшла за млынароўскага Мікалая, як звёз ён яе ва Унукава пад Маскву, дык па ўсё і забылася.

— Ага, кажуць, цяпер яна там жывець і гора не бачыць. Мікалай на ядроме працуе, а яна ля хаты, ля агарода.

— Хто гэта расказваў — быў там у іх у гасцях, дык усе лётчыкі мужыку яе зайздросцяць: «Во ўжо ў Мікалая жонка дык жонка — і агурок пасадзіць, і памідорына ў яе саспее».

— А гэта во, бачыце, і пасадзіла Гардзея. Хвенька — не Матруна. Зачапіў ён яе, а яна ў сельсавет заявіла. Яго ж тады па яе заяве на два гады былі і пасадзілі.

— Хвенька сама расказвала, як ён у турму збіраўся.

Кажыць, падышоў да яе, пацалаваў і будзіць гаварыць: «Даруй, Феня, што так выйшла. Толькі чакай мяне».

— Як у кнізе ўсё роўна...

— Ага, другі дык бы яшчэ больш па хвост стаў — жартачкі ж, жонка ў турму пасадзіла! А гэты — як чалавек пайшоў.

— І работу ён знае — гадоў жа дваццаць ужо брыгадзірам.

— Канечне, ён жа не раўня маладым.

— Вунь у Млынарах шустры такі брыгадзір з'явіўся — з тэхнікума хлопец. І — эх! — адразу кіраваць. Прыбег на луг пасля абеду і крычыць на баб, чаму сена не калоцяць. А тыя смяяцца з яго пачалі — хто ж гэта сена панач трасе? Тады ён адразу назад — і як узяўся абмаўляць дзяўчат, што па яго ўжо загадзе растрасаць пачалі: «Што, вы сена згнаіць хочаце, ці што!..»

— Ай, бабы, вы ўжо як нагаворыце, дык палучаецца, што гэта цехнікум яго сапсаваў. Другая і матка вінаватая. Вунь як Арына наша. Толькі што, дык і вучыць малога: «Дай, сынок, дзядзьку ці цётцы кукіш». А то, паслухаўшы вас, можна падумаць, што і вучыцца нікому не нада.

— Не выдумляй ты, Маруся, абы-чаго! Так жа ніхто не гаворыць.

— То, можа, мне і здалося, бо мая старэйшая, што ў дзесяты клас сёлета пойдзе, таксама ўсё просіцца: «Мама, я так ужо хачу вучыцца, так ужо хачу». На настаўніцу, кажа, хачу вывучыцца.

— Дык хай у інстытут паступае. Папрасі Надзёжынага зяця. Ён жа там нейкі кандзідат. На ўрокі да студэнтаў ходзіць.

Жанчыны зноўку гаварылі пра мяне.

— А вы думаеце, ён мяне слухаць будзе?

— Паслухаіць, нідзе не дзенецца. Ты ж з яго Веркаю ў дзяцінстве дружыла — лялькі былі адны, пірагі з гліны разам пяклі.

— Калі не цябе, дык жонкі паслухаецца...

— Значыць, і ты, Маруся, сваю ў навуку пасылаеш. Вучы, вучы, але глядзі, каб яна потым маткі не саромелася.

— Як вунь Шыбекава экскурсаводка. Прыехала дадому дый будзіць казаць на Алену: «Нешта ты, матка, адзелася, як дзеравенская баба».

— Або, ці гэта яна здурнела, дзяўзно гэта? А якой жа яшчэ яе матцы быць? Канечне, дзеравенская...

— А можа, яна хацела, каб і Алена пазногці красіла, як яе турысты, якім яна горад паказвае?

— І за ўсё цалюткае лецечка рукі ні да чога не прыклала.

— Алена нешта зрабіць ёй загадала. А яна ні духа: «Я, мама, прыехала сюды не работаць, а адпачываць. Я цэлы год работала».

— Або, дык а што, Алена цэлы год гуляла?

— Нічога, затое яе сыны — мілыя мальцы. Хоць і генералы. Адзін вунь гной з хлява выкідаець, другі — свіпням храпу сячэць.

— А Дзіна ўсё Басцялу цярэбіць, усё патацыі чытае яму.

— А што той Басцяла, хлопец як хлопец. Толькі, праўда, на Шыбекаў неяк не падобны.

— Як гэта не падобны? Адзень вунь і яму генеральскую форму, дык чысты Паўлік будзіць.

— Во бабы дык бабы! Хоць бы ўжо троху памаўчалі. А то мелюць і мелюць языкамі! Лён лепей бярыце!

— Або, а мы што робім? Мы ж і бяром твой лён. Няхай нам Караньковіч і за гэта «дзякуй» скажа, што мы ў нядзельны дзень на працу выйшлі. З нас і так смяяцца будуць: «Глядзі ты на іх, як з голаду дохнуць — і ў выхадныя работаюць».

— Во бачыце, бабы, як мы папанелі. Даўнейі бы дык уся вёска смяялася, каб хто ў самае жніво сабе выхадны зрабіў, а сёння ўжо смяюцца, што нехта на работу ў нядзелю выйшаў.

— Даўней, даўней! Ты ж знаеш, якія мы дурныя даўней былі. Бывала, кабана заб'ём, сала ў вушацік складзём — не знаю, калі, можа, свежыны крошку якую паспытаем, а калі і не,— а тады старым, леташнім, душымся. А гэта да наступнага года блюдзём. Яно пагоркне, з'ялчае, пажаўцее — скваркі як смажым, дык хоць ты з хаты выходзь, так пахніць. І карову доім, а сыр і смятану ў бочку. Дыі масла туды. Усё ж пасты, скаромнае есці пельга...

— Кінь ты, Марфа! Якое там масла, якое сала! Баўтухі, бывала, якой паядзёмся ды і паляжам спаць на саломе, як цяляты.

— А цяпер і грошы некаторыя складаюць, не тое што сала.

— А і праўда, Антаніна. Вунь Гусіха папахавала абы-

дзе грошай — і за абразы напаклала, і за шпалеры напаторкала,— а мышы ўзялі ды і паслі.

— Яна ж у банк іх насіла — прынесла, кажуць, распехціла свае торбы... І ёй абмянялі.

— Абмянялі толькі тыя, дзе нумяры засталіся. А без нумяроў так і прапалі.

— А на чорта тваёй Гусісе тыя грошы? У яе ж і так іх столькі, што адной і на печ не ўскінуць.

— А яна ўсё калоціцца за работу — здаецца б, усё пад сябе заграбла. Вока такое дужа завідушчае.

— Вунь і цяпер па работу ўсёю сям'ёю ходзяць. І матку старую, і дзяцей малых прывядзе, а потым усё на сябе запісвае.

— Гэта яна перад пенсіяй. Хоча апошнія гады многа палучаць, каб пенсія большая была.

— Грашаваць баба любіць, а парадку ў хаце няма.

— Пылу, пылу... Як толькі хто ў хату зойдзе, яна хуценька галень у рукі і — эх! — пралысіць, пралысіць, пыл слупам падніма ючы, пасярод хаты, і садзіцца ўжо — бытта ў яе і парадак. І сукенку якую пранікам пацопае, пацопае — ды і ўсё...

— Усё ордэн хоча палучыць.

— Вобадаў бы ёй даўно прэмію даў — на работу яна дужа ўедная.

— А Караньк евіч не толькі на работу глядзіць. Кажа, нада, каб і чалавек быў сучасны, перадавы, без перажыткаў.

Жанчыны доўга гаварылі пра ўзнагароды — хто атрымаў, а хто не, каму трэба даць, а каму, на іх думку, можна было б і пачакаць.

— Хадзі-тку, Надзёжа, сюды, пасядзі каля нас,— паклікалі жанчыны, відаць, убачыўшы ля хаты маці.— А то ўжо нейкі дурань казаў, што ты памерла.

— Агату! Тады я доўга жыць, відаць, буду,— адказала маці і, мусіць, падышла да жанчын, якія, мусіць, прыселі адпачыць.

Я злез з гарышча.

Ластаўкі сядзелі на жэрдачцы-прывязцы, якая далёка вытыркалася са страхі, і нібы купаліся ў сонцы.

Падбег наш Пятрусь. Круцячы пальцам у вуху, сказаў:

— Тата, тата, а ты ведаеш, у маё вуха ўляцела пчала — думала, што гэта кветка. Праўда ж, яно на кветку падобна? Гудзела там, поўзала — мёду, відаць, шукала...

— Ага, мёд у яго ў вушах. Толькі што... Там адзін пя-

сок ды зямлю і зноїдзеш. Ідзі ўжо спаласні вадою сваю кветку.

Сын пабег у сенцы — мыцца. На льне ўсё яшчэ гаварылі жанчыны, але з-за хаты іх размова чулася глуха.

— Ціві!

І ўсе ластаўкі — і старыя і маладыя — як на загаду ўзняліся з прывязкі і, адны звыкла і лёгка, другія хапатліва, няўмела і баязліва, нібы тонячыся ў паветры, махалі крыллем, кружачыся над хатаю. Ластавяняты стамляліся рана і цэлілі, каб як найхутчэй зноў сесці на страху, але строгае «ціві!» не надпускала іх нават блізка і вяртала ў неба.

— Ціві!

І ўсе (старыя — абыякава, маладыя — стомлена і радасна) садзяцца на страху і дружна паварочваюць у адзін бок свае жоўтыя дзюбы — туды, дзе небяспека, дзе стаю я.

— Ціві!

І з розных канцоў страхі ластавяняты злятаюцца на прывязку, садзяцца адно ля аднаго і раскрываюць дзюбы: налятаалі, а цяпер не грэх і перакусіць, надсілкавацца. І нашы ластаўкі, і чужыя, што чакаюць іх, ловяць мушак і нясуць у шырока адкрытыя дзюбы. Па чарзе: першаму з краю, а затым — другому, трэцяму. І ўжо ранняя хітрасць: адно, буйнейшае за іншых, што сядзела з краю, атрымала сваю долю, а тады адсунула на сваё месца суседа, а само пераляцела на ягонае: каб яму далі яшчэ. І, атрымаўшы другую порцыю, сядзела задаволенае: маўляў, тут жа няма нічога дрэннага, усё па чарзе, усё па парадку. А адсунутае ластавяня, колькі ні разяўляла дзюбу, колькі ні крычала, так і засталося без сваёй мушкі — старыя ластаўкі добра ведалі, што гэтаму месцу яны ўжо далі, і не разумелі, чаго малое крычыць.

Падышоў бліжэй, узняў руку, каб перасадзіць пакрыўджанага на сваё месца — прывязка ж не зусім высока, і пры жаданні, стаўшы на дыбачкі, можна яе дастаць,— як раптам пачулася:

— Ціві!

І ўсе паспешна ўзляцелі ў неба. Акрамя аднаго — усё таго ж пакрыўджанага ластавяняці, якое, відаць, так уважліва чакаючы, што і яму дадуць ежу, не пачула нават строгага загаду.

Я дакрануўся пальцамі да прывязкі — ластавяня спакойна сядзела на месцы і вельмі ўважліва глядзела не на

мяне, а на старую ластаўку, якая прыляцела і села зводдаль.

— Ціві!

Гэты загад, відаць, азначаў: «Маўчы — побач небяспека!», і ластавяня сцішылася — быццам яго і няма, быццам яго і не бачаць. Я гладзіў пальцамі хвост — яно не ўзлятала, не пішчала. Быў жа загад «ціві!» — «маўчы», а само ластавяня яшчэ не навучылася, як сябе паводзіць у кожным новым выпадку. І я адчуваў, як яму не церпіцца, як хочацца ўзляцець, не зважаючы на загад.

Калі я адышоўся, зноў пачулася:

— Ціві!

І ластавяня хуценька ўзнялося ў неба. Тады падумалася: якое ж яно ўсемагутнае ў ластавак, гэтае кароткае слова «ціві»! І колькі ім можна пераказаць усяго, і колькі яно змяшчае ў сабе слоў, і колькі ўсялякіх адценняў, якія не ловіць нават наш чалавечы слых.

Нехта побач кашлянуў.

Я азірнуўся: на двары стаяў незнаёмы мужчына, глядзеў на мяне, на ластавак.

— А гэтыя, бач, і чакаюць, не ляцяць у вырай,— сказаў ён.— Дзе б гэта людзі так чакалі. Ужо даўно крык бы паднялі: во, не сабраліся, а іх чакай, а з-за іх і нас зіма заспець можа...

Потым пастаяў і сам сабе адказаў:

— Хаця і людзі, дзе нада, адзін аднаму памагаюць. Вунь у нас на вайне баец мёртвага ўжо таварыша на сабе з разведкі прынёс. Нёс, хоць і ведаў, хоць і разумеў, што той ужо мёртвы...

Мужчына прыйшоў прасіць, каб мы памаглі яму,— сагнулася рама ў ільноцерабілцы, і яны з трактарыстам нічога не могуць зрабіць.

На вуліцы ўжо стаяў трактар з ільноцерабілкаю. Ля яго сядзеў Андрэй і курыў, перакідваючыся словамі з трактарыстам.

Разам мы засадзілі жэрдзь і выпрамілі раму.

Трактар загуркатаў і зноў павёз ільноцерабілку на поле — браць лён.

З боку аўдзеўкаўскай дарогі пачуўся рып Ранікавага веласіпеда.

— Глядзі ты, нешта і Толя ў такую рань да Кагадзея едзе,— здзівіўся Андрэй і патушыў недакурак.— Пайшлі згароду гарадзіць — бачыш, каровы абярнулі. А то мацi зноў крычаць пачне: «Расселіся тут...»

Пахла сенам, шчодра свяціла сонца, узрадавапа пасля халаднаватай ночы гудзелі мухі.

Разышоўшыся па полі — кожная са сваё постаці,— перагукваліся жанчыны.

## 6. ЛОЎЛЯ РЫБЫ

***крыгаю, таптуном і рукамі,***
***калі мы зайшлі аж пад Мамоны,***
***а яшчэ пра тое, з кім і з чым мы сустракаліся***
***і дзе ўрэшце зніклі Той і Гэты***

Хораша вось так, стаміўшыся, глядзець, як плывуць каля сонца і імкліва наплываюць на яго белыя, светлыя і чыстыя хмаркі, калі нават здаецца, што бягуць не яны, а само сонца, спяшаючыся, коціцца ў другі бок па блакітным небе — яно ўсё вышэй і вышэй, небасхіл усё далей і далей,— хораша тады, зажмурыўшыся, ляжаць у траве пасля ўтомнай дарогі ці пасля цяжкой працы, ад якой нават сам адчуваеш, як наліваюцца мускулы і труцца аб сарочку,— хораша вось так, расслабіўшы ногі, якія аж гудуць, ляжаць на спіне ў атаве і думаць — ляніва і няспешна,— ці пра тое, што ў цябе незваротна прайшло, мінула і зараз дзесьці вельмі далёка-далёка; ці пра тое, што яшчэ будзе і што зманліва дражніцца наперадзе; ці нават пра тое, што здарылася менавіта сёння, толькі што; перабіраць у наспакайнелых і пацішэлых думках нейкі год, гадзіну ці, можа, усяго толькі невялічкую ўспышку часу. А можа, і наогул нічога не думаць, а проста вось так цешыцца, што ляжыш у гэтай ціхай і зялёнай траве, якая адскочыла пасля касьбы, проста дыхаць гэтым карагодам блізкіх да восені пахаў — прымятай травы, ціхага сонца, захаладалай вады і далёкага блакітнага неба — і ўсміхацца, што цябе не баіцца матыль, які сеў ледзь не пад самым тваім носам на травіну, спакойна разглядаць зблізку яго трапятлівае, далікатнае крыло і радавацца цішыні.

А што гэта такое, цішыня? Можа, яна — якраз вось гэты бязгучны супакоены шум трапяткіх матылёвых крылаў, якія лёгка і даверліва дакранаюцца паветра — нібыта і самі яны тое паветра? А можа, гэта якраз той зялёны трэск, з якім выпростваецца прымятая нашымі цяжкімі нагамі трава, ад якога, магчыма (а чаму не можа быць і такое!), глухнуць маленькія мурашы? А можа, цішыня

якраз і ёсць тое шухкае пазвоньванне, вельмі ж падобнае на пазвоньванне льдзінак у карытцы з бярозавікам, пазвоньванне, з якім вірус ў галінах незаўважны над карою напорысты сок.

Вось так во рынешся дзе-небудзь насярод лугу ці на беразе рэчкі ў шчыкатлівую траву, зарыешся ў яе носам ці надкладзеш рукі над галаву, будзеш ляжаць доўга, не варушачыся, не спрабуючы нават адхінуць травіну, якая казыча ля носа, неяк ляніва ўсведамляючы, што на гэты час усё: і машыны, і спрэчкі, і нарады, і штодзённая мітусня — асталіся недзе далёка-далёка, і ўжо вось тут, у траве, яны ўяўляюцца, як нешта нерэальнае і неакрэсленае; будзеш ляжаць і аж захлёбвацца ад замілавання да зямлі, да травы і нават да самога сябе, будзеш як заведзены паўтараць адно і тое — сваю даўнюю думку, якая ніны была і стала ўжо тваёю нейкаю праграмаю — маўляў, па зямлі трэба хадзіць толькі пехатою і басанож; будзеш ляжаць і як не спяваць ад усведамлення, што, нарэшце, не размінулася з табою шчасце і падпільнавала вось тут, на далёкім ад бойкіх дарог лузе.

А потым спахопішся — якое там шчасце! Проста табе прыемна — і ўсё. Бо шчасце — гэта заўсёды нешта недасягальнае. Яно — толькі наперадзе. І калі ты дасягнуў, дамогся таго, чаго так ужо да няўсцерпу чакаў,— табе робіцца вельмі ж ужо радасна, і ты, задаволены і зняможаны, лічыш, што гэта і ёсць шчасце. А пройдзе час, і зноў заўважаеш, што гэтае шчасце блякне, робіцца будзённым жыццём, а ты, нудзячыся ад яго, пачынаеш сумаваць і тужліва чакаць нечага такога, што яшчэ наперадзе, што непазнана, як музыка, турбуе цябе і прымушае шчымець сэрца. Шчасце — гэта не тое, чаго ты дасягнуў. Відаць, шчасце нельга ўзяць у рукі і разглядзець, бо шчасце — гэта заўсёды лінія гарызонта: а на яе не паступіш нагою.

А гэта проста радасць. Радасць чалавека, якому ўсё ж сяды-тады не шкодзіць набыць толькі сам-насам з сабою. І яшчэ — з цішынёю. Бо кажуць жа, што і звяры ў звярынцы, не прывыклыя да чалавечых вачэй, паміраюць ад уважлівых позіркаў. Толькі гэта, відаць, няпраўда: народжаныя вольнымі, звяры проста паміраюць у клетках ад свае звярынае крыўды і бездапаможнасці.

Але і пастаянна чалавек таксама не можа жыць у радасці, бо той, хто ніколі не ўведаў, што такое расчараванне, сум, боль, сумненне, мусіць, не можа быць ні радас-

ным, ні, тым больш, шчаслівым: адкуль яму будзе знаёма тая змена настрояў — ад балючага да прыемнага,— якая, можа, ужо сама па сабе і ёсць радасць.

Калі ўсё ідзе добра ў тваім жыцці, калі табе ўсё ўдаецца, калі ты ходзіш, як на свяце, вельмі ўрачысты, а над табою — музыка, музыка, музыка, ты і сам ужо, непакоячыся, пачынаеш бачыць, што тут нешта не так, што так доўга не можа быць; пачынаеш падазрона прыслухоўвацца — нешта ж павінна здарыцца. Нават міжволі чакаеш чагосьці невядомага — таго, што разбурыць гэтую аднастайную музыку насалоды. І калі здараецца гэтая непрыемнасць, ты прымаеш ужо яе, як і трэба,— маўляў, цяпер усё стала на месца, усё пайшло, як і мае быць у жыцці,— і пачынаеш чакаць новае радасці.

Кожны бачыў, як узыходзіць сонца,— а гэта ўжо радасць; кожны ведае, як пачынае варушыць зямлю расток,— гэта таксама радасць; кожны чуў, як шумліва перагаворваюцца паміж сабою дрэвы і перапеўваюцца птушкі,— і гэта таксама радасць. Ды яшчэ якая!

А я ж яшчэ бачыў вясёлку над лугам, напалоханым толькі што адшумелым ліўнем-навальніцаю. Бачыў, як лопаецца пупышка, чуў, як крэкча мурашка, напінаючыся над ігліцаю. І хто можа сказаць мне, што я не ведаў радасці?!

Да таго ж і чаканне радасці — само па сабе ўжо радасць...

Маё вялікае і даўняе жаданне — ва ўсім будзённым бачыць урачыстасць і радавацца ўжо нават аднаму таму, што мы, людзі, сварачыся і мірачыся, лаючыся і сябруючы, усё ж жывём на гэтай цудоўнай зямлі.

Відаць, не аднаму мне хацелася б нарадзіцца ў сям'і садоўніка ці лесніка — каб кожны дзень быць з дрэвамі і краскамі. Але ж бацькоў не выбіраюць...

Травіна казытала ля вуснаў. Я падзьмуў на яе — думаў, ададзьму. Але яна, як стальная, спружыніла, ад чаго было яшчэ больш казытліва.

Падумалася: «Відаць, вельмі хараша адчуваюць сябе ў гэтай прыродзе дзеці. У іх усё проста — «ты будзеш мятлушкай, а я цябе буду лавіць». І ловяць гэтую вялікую мятлушку на дзвюх нагах, якая махае рукамі, пераймаючы крылле...

У небе плаўна, спакойна ляталі птушкі. Іх лёт здаваўся нейкім бяздумным, бязмэтным: думалася, яны крыляюць проста так.

Садпела плячо. Спачатку я не думаў асабліва, ад чаго. Потым успомніў: ад крыгі, якую я нёс да ракі.

— Ну што, рыбакі, адпачылі? — нарэшце сказаў Андрэй і, узняўшыся, сеў.— Можа, далей пойдзем?

У рыбу, калі быць шчырым, ісці мне не хацелася. Але Андрэй прынёс ад некага з Весялёвак крыгу і настойліва ўгаворваў мяне аж да таго, пакуль я не згадзіўся. Але ж ля крыгі трэба абавязкова хадзіць траіх — двое з бакоў, а трэці ззаду, за «дзеда»,— і Андрэй падаўся да Шыбекаў.

— Паспрабую генералаў угаварыць. Яны ж таксама скора паедуць, а ў рыбе яшчэ не былі,— і, ужо адышоўшыся, павярнуўся і пашкадаваў: — Шкада, што Басцялы іхняга няма. Той бы адразу згадзіўся: «О, добра, добра, от гэта ідэя. Светлая твая, Андрэй, галава. Словам, пайшлі — вы наперадзе, а я, як менш вопытны,— за «дзеда».

Хутка Андрэй вярнуўся з Паўлікам, сапраўдным генералам. Другі Шыбекаў сын — малодшы лейтэнант — ісці ў рыбу адмовіўся, спасылаючыся на прастуду.

Павел прынёс з сабою стары таптун, які валяўся ў іх ля дрывотні, і мы, апрануўшыся цяплей, абуўшы гумовыя боты, сабраліся ісці. Я не хацеў апранаць фуфайку, але Андрэй змусіў:

— Ты не фарсі асабліва. У рацэ ж давядзецца аж па самую шыю стаяць. А вада, сам знаеш, халодная ўжо — Ілля ўкінуў гнілля,— яшчэ прастудзішся. На мяне тады і матка, і сястра накінуцца: «Звёў мальца». А фуфайка ўсё ж грэць будзе.

— Ага, так у вадзе нічога, а вось у грудзі непрыемна холадна бывае — аж закалоціць,— падтрымаў яго і Павел.

Больш за ўсіх радаваліся гэтаму паходу Петрусі. Той і Гэты ішлі ўперадзе нас і, перабіваючы адзін аднаго, размахваючы цэлафанавымі мяшэчкамі — іх яны панабралі з сабою,— спрачаліся, у які і якую рыбу будуць класці.

— А мы во сюды во самоў упусцім! — крычаў Той.

— Не, самы вялікія. Іх во ў гэты мяшэчак трэба: ён большы,— не згаджаўся Гэты.

— Ён хоць і большы, але дзіравы — самы павылазяць,— сумняваўся Той.

— Гэта шчупакі павылазяць, яны ж тонкія і вострыя, а самы́ — не, самы тоўстыя,— стаяў па сваім Гэты.

— А калі разам? — задумваўся Той.

— Дык яны ж паб'юцца, відаць,— не ведаў, ці падтрымаць брата, ці пярэчыць яму, Гэты.

Паслухаць іх — у хлапчукоў ужо былі поўныя мяшэчкі. Што там толькі не плавала: і карасі, і язі, і плоткі, і ментузы, і нават доўгія, як вужакі, уюны, якіх тут завуць піскунамі.

Няспешна кралася між кустоў вузенькая сцяжынка, сцярожка рассоўваючы ў бакі голле. Яна абыходзіла круглабокія, быццам шары, клубы лазнякоў — такія круглыя, што нават здавалася, нібыта гэтыя кусты нехта знарок, як на клумбе, падстрыгаў. Там, дзе ля сцяжынкі стаяць бярэзіны, кідаюцца ў вочы і вельмі ж свецяцца — і пад нагамі, і крыху воддаль — жоўтыя паскурчаныя лісткі — акурат лісічкі: аж хочацца нагнуцца і падняць.

Мы з Андрэем па чарзе нясём крыгу, а Павел — свой таптун. Дзеці бягуць наперадзе.

Сцяжынка віхлянула ўлева.

— Дзень добры, няцюрадны дзядзечка,— чуецца голас Гэтага.

— Здаровы, мальцы! — адразу ж адказвае яму мужчынскі.

Хоць з-за кустоў і не відно, з кім размаўляюць хлопцы, мы ведаем, што гэта Казятнік,— дзеці неяк пачулі, што ён даводзіцца ім далёкаю раднёю, і зараз пры сустрэчы ўспамінаюць пра гэтае сваяцтва.

Казятнік ужо вітаўся з хлопцамі за руку, гаварыў з імі, распытваў, куды яны ідуць, але як толькі ўбачыў нас з таптуном і крыгаю — адразу ж сігануў у кусты і недзе там стаіўся: быццам яго і не было. Толькі козы, якія ўсё яшчэ, не зважаючы на нас, пасвіліся непадалёку, напаміналі, што ён, відаць, яшчэ не патушыўшы ўсмешкі, якая загарэлася ад сустрэчы з хлопцамі, сядзіць недзе ў кустах і з-за галінак сочыць за намі.

— Сцяпан, хадзі закурым! — паклікаў яго Павел, але кусты не зварухнуліся.

— Дзівак чалавек,— пачакаўшы, сказаў генерал, і мы, зганяючы са сцяжынкі коз, якія нехаця, мэкаючы, уступалі дарогу, пайшлі да Дубоўкі — якраз на тое месца, дзе, як сцвярджаў Андрэй, раней было столькі рыбы, што хоць ты лаві яе рукамі.

— Ты ж помніш, Павел, як пасля вайны Кагадзей адсюль мяшкамі рыбу насіў? — узяўшы ў мяне крыгу і ўзваліўшы яе на плячо, пытаўся ў генерала Андрэй.

— А як жа, помню — Цімоха тады столькі рыбы налоўліваў, што Волька ў Хвошна прадаваць насіла.

— Яна сама казала, што там аж у чаргу станавіліся,

прасілі, каб не больш як на кілаграму давала,— нібы сёння ў чарзе па апельсіны, якія канчаюцца.

— Цімоха, помню, тады ўсміхаўся ў вусы: «Яно, Павел, усё Хвошна не падзеліш, каб я і хацеў»,— адхінаючы перад сабою галінку і адною рукою адводзячы яе ўбок, успамінаў Павел.

— А Міхалка, помніш, што пра свайго зяця гаварыў: «У іх з Волькаю поўная кофта грошай. Рукавы завязалі, каўнер таксама, як хахол у мяшку, сабралі і завязкай прыціснулі: качаюць гэты мяшок нагамі па печы — каб не замінаў».

— Дык гэта ж Ручаль тады выдумаў...

А я чуў ад маці: «У іх грошай была цэлая кофта, а мы тады так ужо былі абгалелі — без солі нават сядзелі. Дзеці з'ядуць несалёнай бульбы, а пасля іх так ужо ірвець, так ірвець, што глядзець страшна. Тады Лёшка, старшы сынок, той, што на міне падарваўся, поўню, зрабіў начовачкі, акуратненькія такія, прыгожанькія. Я на базар іх у Азярычына панесла. Прастаяла дзень — ніхто не купіў. А я іх за якую чарку солі аддала б. І цяпер гэтыя начовачкі ёсць — вунь у іх яйкі ляжаць».

— Які табе Ручаль? — пасля доўгага маўчання пе згадзіўся з генералам Андрэй.— Твой Ручаль сам хапуга быў — ого! Правільна я гавару? Помніш, як мы яго ледзь не застрэлілі!..

Андрэй крыху прыстояў, дачакаўся, калі я дагнаў яго, і, мяркуючы, што Павел усё гэта павінен ведаць, расказваў мне:

— Гэта ж мы, галодныя дзеці, узварушаныя рыбацкімі поспехамі Кагадзея, рашылі самі налавіць рыбы. Перагарадзілі напач раку, прутні паставілі. І ў першую раніцу столькі рыбы нацягалі — яна з азярычынскага возера акурат на нераст у нашу Дубоўку пішчом лезла. Падзялілі на ўсіх — памногу выйшла. І Ручалёву Вадзіку столькі ж, як і ўсім, рыбы далі, хоць ён прутні і не ставіў. Як прынёс Вадзік рыбу дамоў, як узгарэўся Ручаль і ледзь не бягом на раку — дзеці ж і то, бач, напалавілі, а што, хіба ён не зможа? Але ж як назло — нашы прутні поўныя, а яго — ну нібы хто зачараваў — парожняя. Ад сілы, можа, у ёй якія рыбіны са тры боўтаюцца. Што ён толькі не рабіў, што не выдумляў — і раку, бывала, метраў за колькі ад нашых прутняў пераб'ець, і прутню сваю наперадзе нашых наставіць, а яно ўсё роўна: у нас — поўна, а ў яго —

жменька якая. Паласаваліся мы трохі рыбаю, а тады нояк прыходзім — пуста.

Андрэй зачапіўся за тоўсты сук і ледзь не ўпаў — той быў пакручасты і так трымаўся за бот, што доўга давялося трэсці нагою, пакуль ён не зваліўся на сцежку...

— Прыходзім заўтра — няма рыбы, паслязаўтра — няма. Тады мы здагадаліся, што нехта ноччу яе з прутпяў вымае. Правільна я гавару? Ну, рашылі падпільнаваць. Зрабілі ля прутпяў буданчык, пачысцілі абрэз, які ў нас з вайны перахоўваўся. Знайшлі нейкую рагаціну, у зямлю ўбілі, ствол на яе паклалі, навялі на бераг — туды, дзе прутні. Сядзім, чакаем. Дожджык пачаўся — дробненькі такі, шапатлівы. Ён па лісці шапоча, а нам усё здаецца, што нехта ідзе. Нарэшце сапраўды адтуль, з-пад Вархоў, паказаўся чалавек. Ён цяжка дыхаў, ішоў хутка — злубянелы ад дажджу плашч лопаў крыссем, пад ботамі гулка ў пачной цішы чвякала зямля. Злодзей падышоў да берага, спыніўся, агледзеўся і, раскручваючы мяшок, пачаў спускацца да ракі. Вось тут мы і стрэлілі. Трасірная куля праляцела як не над самаю яго галавою. Злодзей са страху зваліўся ў кусты — аж было чуваць, як яны трашчаць, ламаючыся,— а потым берагам, берагам, спачатку паўзком, па чацвярэньках, потым, узняўшыся, хоць і прыгнуты, бег туды, адкуль і прыйшоў. Пакуль мы перазараджалі сваю «марціру», яго і след прастыў. Правільна я гавару?

Прайшлі трохі моўчкі. Потым Андрэй павярнуўся да Паўла:

— Цімоха божыцца, што тады па нашу рыбу прыходзіў Ручаль. Ды і я сам як успомню, вельмі ж шамацеў і лопаў плашч у злодзея — акурат Ручалёў, калі той чаго ў дождж у Жыцькава заходзіў. А тады ж, ці помніш, з намі яго сын быў. Усё мітусіўся, усё лепш наводзіў... От, чорт, не ведаў, што ў бацьку мог навесці!

Генерал нічога яму не адказаў — ён, відаць, так далёка быў у сваіх успамінах, у тых пасляваенных гадах, што нават і не чуў, пра што гаворыць Андрэй.

Выйшлі на змяінпік. Высокая пясчаная выспачка, дзе з пяску там-сям тырчаць рэдзенькія пажоўклыя травіны. Затое купкамі ярка і жоўта цвіце бяссмертнік. Ужо амаль сухі, ужо саспелы, ён доўга яшчэ будзе вось так гарэць на выспе.

Дзеці тут ідуць за намі, ступаюць баязліва, пільна ўглядаючыся сабе пад ногі,— яны адны наперадзе не пай-

шлі, начакалі нас і цяпер лучаць нападаць у нашы сляды. Ведама, змяіннік. Ім столькі нанарасказвалі, што сюды з блізкіх і далёкіх лагчын выпаўзаюць пагрэцца змеі: пагорак добра прграецца сонцам, пясок хораша ўтрымлівае цяпло, дык дзе ж яшчэ, як не тут, пагрэць ім сваю змяіную кроў!

За змяіннікам пясчанае бульбянное поле. Калі ідзеш па ім у спякоту, разагрэты пясок вельмі ж пячэ ў босыя ногі. Цяпер, у ботах, нават не адчуваеш, зямля халодная ці цёплая.

— Во бачыш, сёлета нехта разумны знайшоўся — бульбу пасадзіў,— заўважыў Андрэй, калі мы па барознах, напрасткі пераходзілі поле.— А то летась жыта было. А якое жыта на пяску вырасце? Каласочкі — як заморкі. А яны тры камбайны сюды прыгналі. Камбайны з паўгадзіны якой пакружыліся і ўсё пажалі. Віцька Пруцень казаў мне, што паўбункера ўсяго і нажалі...

Перайшлі бульбяное поле. Адсюль ужо блізка да рэчкі.

— Бачыце вун тыя кусты? — паказаў Андрэй рукою дзецям, якія таўкліся ў яго пад нагамі, і аддаў мне крыгу.— Вось там ёсць такі ўтульны бахаток, там мы і закінем свае невады.

Але лавіць там не давялося. Яшчэ здалёк мы заўважылі, што ля бахатка ўжо сядзяць рыбакі. Андрэй доўга ўглядаўся з-пад далоні, хоць сонца і не было — яно зайшло на гэты час за хмару,— а потым сказаў:

— Дык гэта ж раманцікі.

Так Андрэй назваў двух хлопцаў, якія пазаўчора на веласіпедах прыехалі ў Жыцькава з самога Ленінграда. Прыехалі да Кагадзеяў — Света, калі вучылася ў медыцынскім вучылішчы, напачатку жыла ў бацькоў аднаго з іх і таму як не ўсю радню запрасіла прыязджаць у Жыцькава. Вось хлопцы і адважыліся на такую дарогу. Яны былі вельмі ж ужо валасатыя (Андрэй жартаваў: «Як дзеўкі — і вушэй не відно»), галодныя (дзе там у дарозе пад'ясі як след!) і дужа стомленыя — яны ж ехалі нешта каля чатырох сутак. Пакуль Кагадзей паліў з такога выпадку лазню, рамантыкі паехалі на пошту: кожны дзень з дарогі хлопцы давалі ў Ленінград тэлеграмы.

Рамантыкі сядзелі на беразе і ўважліва сачылі за паплаўкамі, якія нават і не гайдаліся. Рыбы пакуль што не было, а ля кустоў ужо ляжаў хлеб, стаялі місачка, каструлька, блішчалі дзве лыжкі — на юшку.

Мы прайшлі паўз рамантыкаў, пажадалі ім добрага ўлову.

— А калі ў Ленінград зноў? — спытаў у хлопцаў генерал.

— Заўтра.

— І на веласіпедах? — сумняваючыся, паглядзеў на іх Андрэй.

— А як жа! — здзівіліся тыя; Андрэй толькі паківаў галавою.

— Пойдзем вун туды,— калі мы адышліся ад хлопцаў, паказаў сваёю доўгаю рукою ён.— У тым бохаце сам Кагадзей рыбу лавіў.

Бахаток быў не вельмі вялікі. Ён ужо забросneў: вада стаяла зялёная-зялёная ад раскі — маленькіх і кругленькіх, як канфецi, але не рознакаляровых, а адно толькі зялёных лісткоў-кружочкаў. Над бахатком амаль з усіх бакоў навісаў алешнік, лазняк, а вада, дзе не было раскі, выглядала цёмнаю і халоднаю — ці то ад гушчэці кустоў на беразе, ці таму, што блізкая восень ужо начыста змяніла яе колер.

Андрэй неяк адразу з берага ссунуўся ў глыбокае — толькі што быў сухі, а ўжо стаіць у вадзе як не па шыю. Павел ішоў асцярожна, трымаўся за галінку, што нізка вісела над вадою, але тая нечакана абламалася, і генерал, слізгануўшы па гліністым беразе, таксама як не з галавою боўтнуўся ў нейкую яміну.

Я не адважваўся так рашуча лезці ў раку, ішоў зусім павольна і, сцяўшыся, слухаў, як узнімаецца па мне вада. Спачатку адчуваеш, як у гумовыя боты, якія толькі што ніяк нельга было ўтапіць у ваду,— яна прыціскала іх да ног, боты выслізгвалі па наверхню — цурчыць вада, як яны цяжэюць; але якія гумовікі цяжкія з вадою, зразумееш толькі тады, калі вылезеш на бераг. Вада падымаецца па нагах, даходзіць да пояса — яшчэ нічога. Але вось калі яна холадам падыходзіць да грудзей, усё вышэй і вышэй мочыць фуфайку, робіцца вельмі непрыемна, і ты, не жадаючы гэтага, пачынаеш перасмыкацца, нібы ад марозу.

Петрусі параскрывалі мяшэчкі, чакалі рыбы і пасміхаліся з нас, асабліва з мяне — я ўваходзіў у ваду вельмі ж асцярожна.

Андрэй і Павел шырока ў бакі развялі крылле крыгі і потым, спяшаючыся, лопаючы па вадзе, пайшлі, як пабеглі, уперад, стараючыся болей запяць крыгаю ракі, а я стаяў на месцы, за «дзеда» і толькі з усяе сілы ціснуў на пал-

ку, каб яна не адрывалася ада дна. Падпялі крыгу — нічога, апрача зялёнай бросні. Высыпалі бросню і закінулі яшчэ раз. Зноў нічога — толькі чорны і слізкі корч вытыркнуўся з вады. Мы ішлі па раццэ, пераходзілі з бохата ў бохат, а рыбы не было.

Але, відаць, на дваццаты ці трыццаты раз на сетцы нешта бліснула, пляснула хвастом і стаілася.

— Шчупак! — не сваім голасам, на ўсю раку — па вадзе голас далёка пайшоў — закрычаў Андрэй і падняў крыгу: бліжэй да майго боку на ёй забілася рыбіна.

— Не, гэта не шчупак,— спакойна запярэчыў яму генерал.

— Як гэта не шчупак? — аж збянтэжыўся Андрэй.— Што я — шчупака ўжо не ведаю, ці што?

— Не, не шчупак,— не згаджаўся генерал.— Гэта ўсяго толькі шчупачок.

Рыбіна білася хвастом аб сетку, кідалася як шалёная ў бакі — там, дзе сетка правісала да самае вады.

— Усё роўна хапай, Юра, хутчэй! А то ўцячэ!

Я ўхапіў шчупака — слізкага, халоднага, пругкага,— але той так забіўся ў маёй руцэ, што я не ўтрымаў яго, і ён тут жа пляснуўся назад у раку. Мне потым ужо расказвалі, як я імгненна рвануўся за ім, пырнуў у ваду і, не паспелі яшчэ апасці ўзнятыя мною пырскі, вынырнуў, моцна трымаючы рыбіну ў абедзвюх руках. Як мне гэта ўдалося, я і сам не ведаю: шчупачок, відаць, нейкую долю секунды прамарудзіў ці разгубіўся ад такой нечаканай волі, і я тут жа чэпка ўхапіў яго зноў.

Гэта ўсё адбылося імгненна — Андрэй і Павел не паспелі разабрацца, што здарылася, чаго я нялёхаюся ў вадзе, і дружна грымнулі рогатам толькі пасля таго, як я, адфыркаўшыся ад вады, высока ўзняў шчупака над галавою і кінуў яго на бераг дзецям.

— Ну і Юра, ну і рыбалоў! Голымі рукамі рыбу лавіць лепей, чым крыгаю.

А Петрусі набралі вады ў два мяшэчкі і ніяк не маглі прыйсці да згоды, у які пакласці шчупачка: яны совалі яго то ў адзін, то ў другі, дружна радуючыся першай рыбіне.

Потым, колькі мы ні закідалі свой «невад», здавалася б, у такіх ціхіх і рыбных мясцінах, дзе рыба павінна была стаяць, як у густой юшцы,— выцягвалі яго парожнім. Са злосцю страсалі зялёную раску — і зноў і зноў раскрылялі крылле крыгі. Але ўсё марна. Апрача яшчэ аднаго

слізкага чорнага, як галавень, ментуза і дзвюх срабрыстых плотачак, якія, відаць, трапіліся нам зусім выпадкова, у рацэ, мусіць, нічога і не было.

— Ай, хопіць нам ваду цадзіць,— узлаваўся Андрэй і першы палез на бераг.— А то пераліваем з пустога ў парожняе. Правільна я гавару?

— Ага, хопіць раку мучыць,— згадзіўся з ім і генерал і таксама пайшоў да берага.

На бераг ніяк не ўзлезці. Боты, якія лёгка было падымаць у вадзе, тут зрабіліся цяжкія, свінцовыя: паўпютка налітыя вадою, яны цягнулі зноў у раку. Чапляючыся рукамі за траву, за зямлю, сяк-так вылез на бераг і, паваліўшыся на спіну ў траву, у атаву, каб лягчэй выліць ваду з ботаў (разувацца не хацелася — потым зноў закручвай мокрыя анучы), падняў угору ногі. І адчуў, як нагрэтая ў ботах рачная вада непрыемна палілася па нагах, як захаладала ад яе спіна, як мокрая фуфайка ўбірала ваду, нібы губка. У прымятай траве сабралася ладная лужына — нібыта нехта толькі што выліў тут цэлае вядро. Я перакаціўся ў другое, сушэйшае месца.

Дзеці ўсё забаўляліся з рыбаю. Мы, няўдалыя рыбакі, ляжалі моўчкі.

— Ну што, адпачылі? — Андрэй хутка і лёгка, быццам стомы і не было, ускочыў на ногі.— Пайшлі, можа, яшчэ пад Мамоны сходзім. Там меліярацыя была, рэчка мялейшая, і мы тваім, Павел, таптуном паспрабуем лавіць. Летась з дзецьмі во такіх во шчупакоў рукамі там бралі.

Пад Мамонамі я не быў. Але пра іх чуў зноў-такі ад маці. Тая расказвала, што ў вайну, калі яшчэ нашы адступалі, пад Мамонамі быў вялікі бой. Колькі дзён з таго боку ішлі нашы параненыя салдаты — тыя, што маглі яшчэ ісці самі.

— Адкуль ты, сынок? — пыталі жанчыны.

— Да из-под Мамонов, мамаша,— адказвалі салдаты.

— Дзе ж цябе так, сынок? — пыталіся жанчыны ў другога.

— Да под Мамонами, мамаша,— адказваў і гэты...

Павел адпекваўся, хацеў ужо ісці дадому — «ну, ты ж сам бачыш, якая гэта рыбалка»,— але Андрэй усё ўгаварваў яго: — Давай сходзім пад Мамоны. Вось ўбачыш, там наловім рыбы. Рукамі. А заадно і твой таптун намочым. А то ён рассохся, на дрывотні валяючыся. Правільна я гавару?

Нарэшце Павел згадзіўся, і мы пайшлі пад Мамоны.

Спачатку ішлі ля Дубоўкі, збіваючы нагамі цёмныя неі распелыя краскі капюшыны, потым рэзка павярнулі ўлева і выйшлі да весялёўскай дарогі. Перайшлі яе ўперак і па весялёўскім лузе, які быў увесь у стагах і кустах — увечары дык і не разабраў бы, дзе стагі, а дзе кусты,— пайшлі пад Мамоны.

Стагі, відаць, пастаўлены нядаўна, бо на высечаных тут жа, у кустах, алехавых жардзінах, якімі абгароджана сена, усё яшчэ зеляненюць абмінутыя галінкі, якія будуць жыць, пакуль хопіць у жардзіне вільгаці і сокаў.

Некаторыя стагі крыху дзіўнаватыя: шырокія, пухнатыя — на чалавечы рост, а вышэй — нейкія ўжо вельмі тоненькія, як перашчыкнутыя: падзьмі на іх, і ўвесь гэты высокі стаўбунок, здаецца, адразу ж паваліцца.

— Во як брыгадзіра абманьваюць,— паказаў на стагі Андрэй.— Бачыце, там, дзе абмерваюць, шырока кладуць, а вышэй — абы-як. Тут трэба паспець абмераць стог, пакуль ён не ўлежыцца, пакуль дыбаром стаіць.

Ля кустоў скублі траву бурая, як мядзведзь, карова, укормленая цёлка і бычок-сяголетка. Карова хадзіла простая, цёлка — спутаная, а бычок, дык той гарцаваў навязаны на калок. Калі падышлі да іх дзеці, старая карова не звярнула аніякай увагі, цёлка толькі ўзняла галаву і глядзела ў наш бок, а бычок кінуўся дзецям пад ногі — яму, бачыце, падурэць захацелася.

— Гэта, мусіць, Соні весялёўскай жывёла,— уголас падумаў генерал.

— Відаць,— падтрымаў яго і Андрэй.— У яе ж, кажуць, усяго па тры: тры каровы, тры свінні, тры каты...

— А вунь і сама цётка Соня ідзе,— заўважыў Той.

— Пэўна, бычка перавязваць,— падтрымаў яго Гэты.

Потым пайшлі густыя лазнякі. То тут, то там траплялібся белыя, абадраныя як не да самага верху, лазіны, якія аж святліліся ў кустах.

— Глядзі ты, Цімоха і сюды дапяў: усю лазу абадраў,— сказаў Павел, памяняў руку, пераклаўшы тантун у другую, а вызваленаю даланёю закінуў крыло валасоў, але тое зноў, як і да гэтага, неслухмяна звісла на лоб.

— А каб ты бачыў, як ён драць тую лазу павучыўся. Падчэпіць ля кораня, зоймe знізу,— шмаргель уверх! — і лазіна да самае макаўкі голая стаіць.

У празрыстых цэлафанавых мяшэчках, якія неслі хлапчукі, плавала рыба — не, не плавала, бо плаваць у такім посудзе не будзеш, а проста так стаяла ў вадзе і, відаць,

змірыўшыся ўжо з няволяю, стомлена варушыла хвастамі ды плаўнікамі.

За кустамі хтосьці гаварыў — ціха, прыглушана, ласкава. Другога голасу не было чуваць — здавалася, чалавек гаворыць сам з сабою. Слоў нельга было разабраць — яны зліваліся ў агульнае галубінае буркаванне, і толькі калі падышлі бліжэй, пачулі:

— Краля, Краля, сагні галоўку, еш траўку... І не шукай каровак. Кароўкі цябе забадуць. А я мушак ад цябе адганю...

Выйшлі з кустоў і ўбачылі на паляне Сахвеіну Аксюту, якая стаяла над кароваю, а тая, відаць, ужо пасўшыся, узняла галаву, адвярнула яе ад гаспадыні і глядзела некуды ўбок.

— Зноў, відаць, Аксюту пад Пілінёнкаў хутар карова вядзе. І не баіцца Сахвеішка, што зноў заблудзіцца? — і Андрэй узяў у мяне крыгу.

— Не, цяпер ужо яна не заблудзіцца. Гэтую дарогу Аксюта, пэўна, і з закрытымі вачыма знойдзе.— Павел спыніўся і прапусціў Андрэя з крыгаю наперад.

Каб не даваць кругаля і хутчэй выйсці на мамонаўскую дарогу, мы пайшлі сцяжынаю праз бор. Галлё чаплялася за крыгу, якую нёс Андрэй на плячы, пад нагамі трашчалі сучкі, а паўз сцежку — то там, то тут у рэдкай траве вялікімі яркімі гронкамі на шырокіх і доўгіх лістах згіналіся долу ягады ландышаў,— там, дзе вясною былі кветкі, зараз цяжка, як журавіны, віселі круглыя і чырвоныя пацеркі.

У бары ўсё яшчэ гарбаціліся апалыя і зарослыя травою зямлянкі — блізка ўжо Мамоны, дзе быў бой. Тут наогул куды ні ідзеш, усюды сустракаеш зямлянкі: ідзеш па грыбы — зямлянкі, па ягады — зямлянкі, па ваду — зямлянкі, у дровы — зямлянкі, у рыбу — таксама зямлянкі.

Сцежка бяжыць паўз траншэі, і ты міжволі заўважаеш то грыб, які так ужо дзіўна вылез з-пад сцяны зямлянкі, то цэлы ахапак жоўтага лісця, якое спакойны лясны вецярык зграб у куточку, то кавалак даўно прысыпанага зямлёю жалеза — ці то асколак, ці то рэшта разарванае каскі... Ідзеш, і неяк жудасна ўсведамляць, што вось тут, магчыма, сядзелі тыя, у каго той дзень ці тая ноч былі апошнія ў жыцці, а тыя, хто застаўся жывы, нават у сне, а можа, і наяву будуць да скону помніць і вось гэты бор, і вось гэтыя зямлянкі, і вось той засмужаны небасхіл, які ўжо свіціцца за дрэвамі і куды праз гадзіну, праз пяць

хвілін ісці ў атаку... І яшчэ больш не верыцца, што палова нашых людзей ужо нарадзілася пасля сорак пятага і зусім не ведае, што такое вайна...

Дзеці круцяцца каля генерала, забягаюць яму наперад, неўпапад трапляюць пад ногі, замінаюць ісці і ўсё, перабіваючы адзін аднаго, гавораць:

— Дзядзька Павел, дзядзька Павел!

Пачакай, пачакай, а пра што яны? Ага, расказваюць, як упершыню ехалі на кані. На кані, а не на машыне. Ты б, канечне, расказваў пра машыну...

— Дзядзька Павел, дзядзька Павел, а Кагадзей нас пасадзіў на каня ўдвух. І лейцы ў рукі даў,— гаворыць Той.

— Дзядзька Павел, а мы яго ў Жыцькава варочаем, а ён у Курдулькі ідзе,— смяецца і Гэты.

— А мы, ведаеце, не за той повад цягнулі.

— Думалі, што, калі ўлева пацягнем, правы аслабіцца і конь управа пойдзе — у Жыцькава,— хлапчукі абодва рагочуць. З імі смяецца і дзядзька Павел.

— А тады каню надакучыла кружыцца. Ён стаў, фыркнуў, сагнуў галаву, каб скубці...

— І повад у мяне з рук вырваў.

— Мы сядзім на кані без упраўлення і не ведаем, што рабіць.

— Конь жа з Марцінінак. А ён, Кагадзей казаў, некалі распрогся і без калёс у Марцінінкі з усёю збруяю па сабе ўцёк.

— Нам страшна — ён жа без упраўлення.

— Тады я саскочыў на зямлю...

— Саскочыў! Ты па пазе ссунуўся!

— А ты і ссунуцца баяўся: сядзеў на кані і не дыхаў. А я повад узяў у рукі — куды ні цягну, конь не ідзе.

— Ра, а ты помніш, як потым разгоніцся з повадам і як тарганеш каня, а ён толькі галаву ўскіне і стаіць на месцы.

— А ты сядзіш на ім, у грыву ўчапіўся і крычыш: «Ра, не разганяй каня на ўсю скорасць, а то я ўпаду!»

Хлапчукі рагочуць.

— Дзядзька Павел, дзядзька Павел,— зноў пачынае Гэты.— Ці расказаць вам, як я двух варанят злавіў.

— Ну, раскажы, раскажы,— усміхаецца генерал і прапускае яго ўперад. Пятрусь ідзе, замінаючы Паўлу, і, усё паварочваючыся да яго, расказвае:

— Каля нашай загароды, ля самага моху — Ра, праў-

да ж, цябе тут яшчэ не было тады? — бачу я, вароны нешта лятаюць. Прыбег, а яны мяне далей у мох адвесці хочуць. Я — назад. Ля самага вугла згароды ўбачыў двух варанятак — яны, відаць, з гнязда вываліліся. Дзюбы ў іх доўгія, доўгія. Крыллем сабе ісці пасабляюць. Я двух і злавіў. Адзін ухапіўся за мой палец і крычыць радасна: «Мама, я злавіў яго!» Ён думае, што мяне злавіў. А старыя вароны нада мною лятаюць, кружаць, крычаць. І малыя ім адгукаюцца. Калі прыйшоў дадому, бабуля спытала: «Чаго гэта там вароны так лоўка крычалі? Можа, гэта ўжо і ты, як Кагадзей, дражніць іх навучыўся?»

— Дык яны ж маглі цябе ўдзяўбнуць.

— Не ўдзяўбнулі. Я насля іх далей у мох занёс. А тое самае варанятка — во, відаць, задзірыстае — зноў мяне за палец ухапіла і зноў крычыць: «Тата, ляці сюды, я яго трымаю!»

Хлапчукі смяюцца — нястрымна і гарэзліва, як толькі могуць смяяцца дзеці.

Божа мой, як усё ж тут, між налітых салдацкай крывёю зямлянак, траншэй, хадоў злучэння, радасна слухаць вось гэты бесклапотны дзіцячы смех, які, здаецца, віруе ў палахлівых верхавінах асінніку!..

Адсюль да рэчкі — рукою падаць. Вунь яна відаць за кустамі — роўная, прамая: раку некалі спрамлялі меліяратары, і таму яна зараз не робіць тых заваротаў, якімі славілася раней; часам нават абабегшы, абкружыўшы ладны кавалак лугу, яна вярталася амаль на тое ж самае месца.

Рэчка перасохла — лета было гарачае, дажджоў мала, і вады ў ёй не хапіла да восені.

Мы ішлі па сухім дпішчы, пад нагамі — толькі пыл у бакі — траскалі пазасохлыя водарасці, рачная трава, якія, зліпшыся ў рачным іле, абцягнулі цінаю не толькі само дно, але і карчы, каменне. Мы шукалі рачных выбоін, колішніх віроў, дзе ўямінах павінна быць яшчэ вада, а ў ёй — рыба: рака ж перасыхала, а рыба ўвесь час шукала, дзе глыбей.

— Вада! — раптам у адзін голас закрычалі дзеці і, высока падпімаючы ногі, як усё роўна бегучы па хвалях, кінуліся наперад.

Падышлі і мы. Зблізку агледзелі чыстую ваду — нічога, здаецца, не відно.

— Зірніце, зірніце, а вун,— паказалі дзеці.

Пад самым берагам сапраўды, як цёмныя цені, насця-

рожана стаялі два шчупачкі. Андрэй памуціў ботам ваду і сказаў дзецям:

— Лавіце іх рукамі.

Па энергічным усплёску то ў адным баку яміны, то ў другім было відаць, як, спалоханыя раптоўнай муццю, устрывожана кідаюцца ў вадзе шчупакі.

— Во мітусяцца,— нібы спачуваючы ім, сказаў генерал.— Язь — той хітрэйшы. Самая хітрая рыба, Кагадзеей кажа. Ідзеш па рацэ, а ён ляжа на дно, уціснецца ў глей і ляжыць. Блізка твае ногі — ён узнімецца, адплыве трохі і зноў лёг. А то і наступіш на яго, бывае,— эх, як сігане з-пад нагі: нібы куля.

Шчупакі, як усё адно падслухаўшы словы Паўла, таксама сцішыліся і насцярожана недзе сталі. Мы ўсе, закасаўшы рукавы, мацалі ваду ля слізкіх камянёў. А калі ўсё ж дакрапаліся да рыбін пальцамі, шчупакі, пляснуўшы хвастамі, стрымгалоў уцякалі ў другі бок яміны...

Аднаго злавіў Андрэй. Другі, калі дзеці вельмі ж ужо шумна пачалі каламуціць ваду, пляскаць па ёй далонямі, бушаваць нагамі, сам выскачыў на каменне.

Наступная калдобіна была шырэйшая — на ўсю раку — і намнога даўжэйшая. Словам, сапраўдны бохат. Тут мы і замачылі генералаў таптун. Андрэй з Паўлам бралі таптун з двух бакоў, асцярожна падводзілі яго пад куст, клалі на дно і пачыналі заграбаць нагамі ваду, а потым, правёўшы таптуном па дне ўперад, хуценька вымалі яго. З гэтай яміны выцягнулі двух пляскатых і вельмі ж ужо слізкіх ментузоў, яшчэ аднаго насцярожанага, вастраносага і хуткага, як маланка, шчупака, пару невялікіх плотачак.

Далей калдобіна была меншая — такая ж, як і першая. І парожняя. Ля яе валяліся алюмініевыя відэльцы — відаць, калі яшчэ вады было болей, нехта лавіў імі шчупакоў, аж пакуль не ўпусціў гэтую сваю рыбацкую прыладу ў яміну.

Дзеці паспрабавалі рукамі выліваць з калдобіны ваду, але, убачыўшы, што выліваюцца разам з вадою і маленечкія маляўкі, паўкідалі іх назад у яміну, стаялі і выціралі аб штаны рукі.

— Шкада стала малькоў? — спытаў у дзяцей дзядзька Павел.— А яны ўсё роўна не выжывуць. Вось яшчэ з тыдзень дажджу не будзе, дык і гэта лужына высахне начыста.

Дзеці нічога не адказалі — яны толькі ўважліва гля-

дзелі на лужыну, на каменне, якое побач з ёю, аблітае вадою, было чорнае або плямістае.

— Ну, хопіць,— нарэшце рашыўся Андрэй і пачаў разувацца.— Пайшлі дамоў. На юшку налавілі, а болей нам і не трэба: у Хвошна ж мы прадаваць не панясём. Правільна я гавару?

Разуліся і мы, але, калі напрасткі, праз перасохлае глеістае поле, якое аж выварочвала ногі і абдзірала ступні, выходзілі на дарогу ў Жыцькава, пашкадавалі, што паспяшаліся зняць боты: у іх бы па гэтай грудзе было лягчэй.

Ішлі моўчкі, бо, відаць, асаблівага задавальнення ніхто з нас не меў: рыбы было мала, ды і тую, можна сказаць, безабаронную і бездапаможную, мы пабралі рукамі. Дык якая ж тут рыбацкая радасць можа быць! Ішлі і толькі адхукваліся ад белага пуху — лёгкіх, амаль невагомых парашуцікаў асоту, які паспеў ля кустоў: пух ліп да твару, да вуснаў, прыклейваўся да мокрай адзежы.

Рана, як усё роўна на ноч, закрываліся кветкі, акуратна складваючы пялёсткі — нібы заплюшчвалі вочы, каб спаць. Кветкі, відаць, адчувалі дождж: тое, што нам бачыцца, як пейкая іхняя прыхамаць, на самай справе было працаю: кветкі хавалі ад блізкага дажджу аплодненае насенне.

*

Дома, папалудпаваўшы, мы з Андрэем пайшлі спаць на сена, і невядома, колькі б яшчэ праспалі, каб не разбудзіла маці:

— Не ведаеце, дзе гэта дзеці? Як сышлі з абеду, дык і няма.

Ужо вечарэла. Сонца садзілася ў хмару — на дождж. Далёкі цягнік, які ішоў недзе над Мамонамі, татахкаў вельмі гулка — быццам ён бег вось тут, за кустамі. Гэта таксама на дождж. Бо на пагоду той жа цягнік ідзе ціхаціха, амаль нячутна.

— От гэтыя дзеці,— злазячы з сена, злаваўся Андрэй.— Вечна яны што-небудзь утвораць.

І праўда, хлапчукі не даюць нам засумаваць.

Аднаго разу яны ўдзень нананасілі ў карабках ад запалак поўную хату конікаў, і тыя, калі мы ўжо леглі спаць, грымнулі такую дружную песню, што хоць ты вушы затыкай. Спаць, вядома, ніхто не мог — давялося ўключыць святло, лавіць і выносіць з хаты гэтых няпрошаных му-

зык: хто знаходзіў іх пад коўдраю, хто ў запеччы, хто на акне.

Другі раз дзеці — праўда, гэта калі былі яшчэ меншыя — зрабілі рагатку і з яе настойліва хацелі збіць месяц. Яны вельмі доўга цэліліся, выхоплівалі адзін у аднаго рагатку («давай я, ты не ўмееш!»), аж пакуль упоцемку не выбілі акно ў хаце, так і не дастаўшы да месяца.

Потым яны як не пад самыя вокны прынеслі заржавелую супрацьтанкавую міну і ўжо круцілі нешта, шукаючы, як бы яе развінціць. Добра, што ўбачыў іх за гэтым заняткам Андрэй. Ён адагнаў хлапчукоў, а сам, узяўшы міну ў рукі, асцярожна панёс за кусты, дзе можна яе было ўзарваць. Андрэй расказваў пасля пра сваё адчуванне: хочацца бегчы з ёю, бо здаецца, што так будзе хутчэй і лепей, а тут трэба змушаць сябе ісці як мага цішэй; хочацца хутчэй кінуць яе з рук, каб не вісеў над табою гэты кругłы — аж да ліпкага поту! — страх, а тут трэба змушаць сябе пакласці міну на зямлю як мага спакайней і асцярожней.

Наступны... Ды хіба раскажаш пра ўсё, што дзеці толькі не наробяць за адно лета!..

Хлапчукоў убачыла маці, калі пачало ўжо цямнець. Яны ішлі з-пад Мамонаў, гучна гаварылі, а ў руках у кагосьці з іх брынчала вядро. Прыйшлі пад хату і стомлена селі на траншэю.

— Усю... — толькі і сказалі яны.

— Што ўсю?

— Перанеслі.

— Каго перанеслі?

— Рыбу...

Во яно што! Хлапчукі вельмі ж да сэрца прынялі генералавы словы пра ямíны, у якіх, калі яны высахнуць, задыхнецца рыба, і, папалудпаваўшы, ціха ўзялі вядро і кварту і пайшлі пад Мамоны. Там яны з калдобін перанеслі вядром, а дзе мялей — квартаю ваду разам з рыбаю ў большыя бохаты, якія да восені не высахнуць.

— Да малявачкі падабралі,— хваліліся хлапчукі, і ў іх словах была непрыхаваная радасць.

## 7. ПРАВОДЗІНЫ ГЕНЕРАЛАЎ

*дажджлівым адвячоркам,*
*калі ў Шыбекавай хаце*
*сабралася амаль усё Жыцькава*
*і дзе ў шчырым застоллі*
*мы пачуем нямала новага*

На дварэ быў дождж. Нават у хаце, калі ўсе неяк раптоўна і адразу сціхалі, было чуваць, як сеецца ён за расчыненым акном, як шапоча па зялёным і яшчэ крамяным лісці бэзу ў палісадніку.

Кагадзей прыйшоў, калі ўсе сядзелі ўжо за сталом. Ён яшчэ ў пярэднiй хаце зняў мокры плашч, патрос ім у парозе — той лубяна зашамацеў — і павесіў на цвічок, убіты ля самых дзвярэй, ля качарэжніку, а пасля ўжо ўвайшоў, пераральваючыся з нагі на нагу, у чыстую палавіну хаты.

— Садзіся во побач са мною,— запрасіла яго на вольнае месца каля адчыненага акна Моця Прутнёва і скрыгатнула, пасунуўшы крэсла.— А то нашы маладыя скразнякоў баяцца,— дадала яна, відаць, намякаючы на Шыбекавага лейтэнанта, які, трымаючыся абедзвюма рукамі за сярэдзіну, не схацеў сесці ля акна.

— А мне ўсё роўна, Надзёжа, дзе сядзець: мяне ў кустах і так скразнякі прадзьмулі,— адказаў ён.

— А калі б ты спруцянеў, чорт аблавухі,— усміхнулася Моця.— Якая я табе Надзёжа? Ты што ўжо, зусім адсырэў у сваіх кустах, што і не бачыш, хто з табою гаворыць?

Кагадзей сляпавата прыжмурыў вочы, прыгледзеўся і адказаў:

— Дык паспрабуй цябе пазнай, калі ты выфранцілася, як на вяселле якое, хоць на тэлевізары паказвай.

— А сам вунь які,— задаволена ўсміхнулася Моця: Кагадзеева пахвала ёй спадабалася.— Ты на сябе зірні.

Цімоха і праўда стаяў святочны. Ён быў чыста паголены, валасы прычасаныя. На ім — святочнае цёмна-сіняе галіфэ, цёмна-зялёная гімнасцёрка навыпуск, перахопленая шырокім рэменем.

— Табе, Цімоха, толькі партупеі ды Паўлікавых пагон і не хапае,— азваўся сам Шыбека і пасунуў сваё крэсла, каб даць Кагадзею праісці да акна.— А то чысты генерал!

Цімоха сеў на табурэт, дастаў з кішэні бутэльку гарэлкі, паставіў яе на стол — туды, бліжэй да Шыбекі.

— А я ўсё гляджу, чаго гэта ў Цімохі так кішэнь у галях аддудурылася,— заўважыў Андрэй, які сядзеў насупраць Кагадзея.

Цімоху палілі штрафную — як не поўную шклянку,— ён тут жа ўзняўся і, нібыта не чуючы свае Волькі, якая ўжо сядзела тут і крычала яму праз стол: «Не пі ўсю!» — надпяў перад сабою шклянку і, прыгаворваючы: «Значыць, ад'язджаеце? Ну, шчаслівай вам, дзеці, дарогі — і табе, Паўлік, і табе, Генік! Няхай вам і далей добра служыцца і яшчэ лепш жывецца. Толькі па Жыцькава не забывайцеся!» — выпіў усю гарэлку.

Паўлік і Генік сядзелі за сталом — святочныя, пры поўнай параднай форме.

Перад гэтым у Шыбекавай хаце была «вайна». Паўлік перад самым прыходам гасцей хацеў выпрасіць у бацькі дазволу сесці за стол хоць бы ў белай кашулі, без кіцеля:

— Тата, ну ўсе ж знаюць, што я генерал, усе ж бачылі, які я ў форме, а ў нас жа будуць толькі свае. Навошта мне сядзець такім урачыстым?

Але Шыбека быў незгаворлівы:

— Пасядзі ты хоць за сталом як чалавек. А то ўсё лета босы і голы па Жыцькаве прабегаў. Не зразумеюць нас, Паўлік.

Тады сын ужо і жартаваў:

— Тата, а фуражку мне хоць можна будзе за сталом зняць?

Шыбека моршчыўся і адказваў сыну:

— Не выдурняйся ты, Паўлік. Адзенься як чалавек ды і пагавары з людзьмі.

Таму Паўлік і меншы «генерал» аж свяціліся за сталом.

Калі Кагадзей закусіў, Моця загаварыла да яго:

— Мы во тут во, Цімоха, гаварылі пра тваю Свету. Волька ж казала, што ад яе пісьмо прыйшло...

Кагадзей паплямкаў губамі, потым ніжняю дастаў да вусоў, паторкаў у іх, нібы раўняючы — аж было казытліва,— і маўчаў.

— Піша ўжо, каб Ранік туды да яе не ехаў. І адзежу просіць на пошце прыслаць,— падказала мужу Волька.

— Нешта ў яе там закруцілася,— нібы ўпершыню задумаўся Цімоха, хоць было відаць, што думае ён пра гэта не першы дзень.— А я вот, як хлопец прыязджаў да нас, і кажу яму: «Не слухай ты, Толя, гэтай накруткі, збірайся сам, забяры яе цёплае паліто і едзь. А мы напішам, што пісьма ад яе не палучалі».

— Ты таксама, Цімоха, нешта, як маленькі ўсё адно. Раіш хлопцу тпруці з'ездзіць,— накінулася на Кагадзея Шыбекава.— А можа, пакуль Ранік даедзе, Света замуж ужо выскачыць.

— А што табе, Алена, шкода, ці што? — з далёкага вугла, перагнуўшыся над сталом, спытала Цыпнячыха і пачала заторкваць пад квяцістую хусту, завязаную над бараду, сівыя валасы.— А можа, там усё і добра будзе... Можа, Толя там і астанецца...

— Няхай едзе,— згадзіўся і Цімоха.— А то яна, накрутка, бач, як хлопца за нос водзіць.

— Ешце, госцейкі, ешце,— убачыўшы, што ўсе сядзяць і ўважліва слухаюць гаворку, пачала прымушаць да яды Шыбекава.

— Дык ты ж, Алена, і сама не ясі,— сказала маці.

— Ты, Надзёжа, на мяне не глядзі. Сама ж знаеш, што гаспадыня пад загнетам з голаду не памрэць,— адказала Шыбекава і ўзяла з талеркі скрылёчак каўбасы, круціла яго ў пальцах і патроху адкусвала.

— Нашто ты, мама, рукамі? — папракнула старую экскурсаводка.— Відэльцы ж ёсць.

Шыбекава пачырванела — дачка прысароміла яе пры ўсіх. Алена трымала ў руцэ надкусаны скрылёк і не ведала, што рабіць: ці то пакласці назад у талерку, а затым зноў узяць, падчапіць на відэлец, ці то, не зважаючы, трымаць у руках і далей.

Выручыў Паўлік.

— А так жа, Дзіна, смачней,— усміхнуўся ён сястры і сам таксама ўзяў рукою скрылёчак каўбасы і са смакам яго з'еў — Паўлік вельмі любіў сваю маці.

Шыбекава супакоілася, паспакайнела.

— Ага, смачней,— сказала яна і з непрыхаванай любасцю зірнула на сына.— Вы сабе ешце, хто чым хоча,— відэльцы ж ёсць перад кожным, а каму не хопіць — дададзём,— а мы ўжо з Паўлікам — праўда ж, сынок? — рукамі будзем...

— Праўда, мама, праўда,— падміргнуў ёй генерал.

Дзіна сядзела ля сцяны пад фотакарткамі, якія, быццам іканастас, займалі прасценак між вокнамі. Сабраныя ў розныя па велічыні і па форме рамкі, яны то ўсміхаліся, то сумавалі, то здзіўлена і спалохана, як тады перад фотаапаратам, глядзелі на хату. У рамках былі вялікія фотакарткі, дзе весялілася вяселле — з маладою ў фаце, з маладым, які ўрачыста глядзіць на маладую, папраўляю-

чы крыло валасоў, што спадае на лоб; з рассяванымі сваццямі: яны так і выйшлі з параскрыванымі ратамі. Быў і сумны, заплаканы здымак, на якім, здавалася, пераважаюць адны чорныя колеры: і труна была чорнаю, і кут, дзе яна стаяла,— таксама, і заплаканыя людзі — малыя і дарослыя — чорныя, і нават акно, нібы ноччу, чарнела за трунаю. Здымкі ў рамках былі розныя: і адкрыткі, і візіткі, а болей за ўсё малепькія картачкі з белым ражком, зробленыя для дакументаў.

Ніжнія рамкі са дзве Дзіна засланіла сваёю прыгожаю і высокаю, як капа сена, прычоскаю — такія прычоскі мяне заўсёды злавалі ў кінатэатры: круцішся-круцішся, а палову экрана ўсё роўна не відно. Я і зараз, як ні спрабаваў, усё ж не змог убачыць, хто там за Дзінінаю галавою на здымках. Адно толькі з-за яе прычоскі вытыркалася галава іхняй цёткі Мілі, якая жыве, здаецца, недзе пад Куйбышавам і таксама прыязджае ў Жыцькава. Але прыязджае яна звычайна ўжо недзе ў верасні. Цётка Міля, якая ніколі не была замужам, не мела сваіх дзяцей, жыла ўвесь свой век адна, вельмі ж ужо не любіць шуму і тлуму, які бывае ў Жыцькаве летам, і таму яна цаляе прыехаць сюды, калі ўжо ўсе госці параз'едуцца. Цётку Мілю звычайна ўсё злавала і выводзіла з сябе. Калі, здаралася, прыязджала вясною, яна злавалася на салаўёў: «Аглумілі ж яны маю галовачку», і з дручком хадзіла ў кусты ганяць іх. А то і сварылася на Кагадзея: «Чорт! Ідзі супакой іх! А то парастравіў — аж перапонкі лопаюць!» Кагадзей тады толькі ўсміхаўся ў вусы: «А што яны табе, Міля, замінаюць?» Пра сарок ужо і гаварыць няма чаго: яна не пераносіла іх чычычыкання і адразу ж, як толькі дзе ўбачыць, напускала ў птушак кіем. Выганяла з саду і дзятла: «Навошта ён дзяўбе? Ён жа ва ўсіх яблынях дзірак панаробіць!» За салаўёў і сарок яна злавалася толькі на Цімоху, бо Кагадзей умеў перасвістваца з птушкамі, і таму ў Жыцькаве, калі вельмі ж ужо салаўі браліся на спевы, многія лічылі, што заўсёды іх Цімоха.

Не любіла яна і гасцей. Калі бачыла, што на парозе мыецца кот, цётка Міля злавалася: «Во, чорт, расслюнявіўся на гасцей: нам тваё госці не нада», брала ката, як кажуць, за шкірку і, надаваўшы яму тумакоў, выкідала не толькі з хаты, але нават і з сянец — і гасцяваць, як і жыць, яна любіла адна. Цётка Міля прыязджала ў Жыцькава на які месяц, але за гэты час паспявала перасварыцца як не з усімі — той карову не так пасе, гэты сена не так

косіць. Шыбека ўжо часам і злаваўся: «Чаго ты ва ўсе дзіркі, баба, лезеш? Гасцюй сабе спакойна, а з гэтым мы і самі справімся». Цётка Міля злавалася на Шыбеку, хадзіла пару дзён надзьмуўшыся, а потым зноў пачыналася: той капя не туды пусціў, гэты ваду з крыніцы не так чэрпае...

Я разглядаў фотакарткі над Дзінінай галавою і чамусьці да дзіўнага выразна ўявіў сабе, як бы яна, вопытны ўжо экскурсавод, праводзіла вось тут, у бацькавай хаце, экскурсію. Нават убачыў, як стаіць Дзіна пасярод хаты з паказкаю ў руках, з усіх бакоў акружаная экскурсантамі, якія напахіліліся да яе і слухаюць, каб не прапусціць ніводнага слова...

«Дарагія таварышы, мы з вамі знаходзімся ў звычайнай вясковай хаце сярэдзіны, а дакладней — сямідзесятых гадоў дваццатага стагоддзя. Перад намі своеасаблівы вясковы іканастас — гэта значыць, набор разнастайных партрэтаў, якія адлюстроўваюць жыццё нашага роду, але не з далёкіх стагоддзяў, а толькі з таго часу, як чалавецтва адкрыла фотаапарат і мае родзічы займелі магчымасць ім карыстацца. Звярніце ўвагу, гэты іканастас адрозніваецца ад іншых тым, што тут сабраны не святыя — скажам, Дзева Марыя з сынам, Ілля Прарок ці Юры Пераможац,— а звычайныя людзі, якія ўсё сваё жыццё працавалі цяжка і шчыра. А што тут сабраны далёка не святыя, вы можаце пераканацца, назнаўшы на здымках хітравата-іранічны твар майго брата Ігара (па мянушцы — Басцяла), якога столькі ўжо лаялі, што зрабіць яго святым нават і пры вялікім жаданні ніхто не зможа. Звярніце ўвагу таксама на рамкі. Вось, скажам, перад вамі — бачыце самы верхні рад, ад акна першая злева — цікавы твор невядомага саматужніка, зроблены ў другой палове саракавых гадоў нашага стагоддзя, а дакладней — пасля Айчыннай вайны. Гэтым заняткам тады займаліся многія. Рабілі іх проста і лёгка: рэзалі шкло, на яго зялёнаю ці сінюю — у даным выпадку зялёнаю — фарбаю наносілі з усіх чатырох бакоў нешырокую хвалістую лінію, абводзілі яе чырвонаю, падкладалі фальгу з-пад шакаладу ці папярос і ўсё гэта заклейвалі, акуратна абгінаючы беражкі, папераю. У рамцы, бачыце, стаіць, моцна сціскаючы вусны, каб не рассмяяцца, маладая жанчына, лёгка апранутая, у кофце з закасанымі рукавамі, босая. Гэта мая маці. Калі сказалі, што па Жыцькаве ідзе фатограф, яна мыла бялізну. Мама, як стаяла, выбегла на вуліцу і папрасіла фатографа: «Зні-

мі і мяне, дзядзька, на тваю картачку». І стала вось так — босая, у летняй сукенцы, са сціснутымі ад смеху вуснамі... Пасля гэтага мама доўга хварэла — яна прастудзілася, бо была ўжо глыбокая восень: бачыце, вунь там, ля хаты і ля яе ног пракідаюцца белыя плямы — гэта ўжо снег... (Вось тут Дзіна, відаць, спынілася б, абцягнула, мне здаецца, кофтачку, усміхнулася б.) А зараз звярніце ўвагу на вялікую драўляную рамку, пафарбаваную ў бесклапотны блакітны колер. Яе вы лёгка знойдзеце — яна вялікая, амаль у цэнтры, крыху бліжэй да правага акна. Гэты твор зрабіў наш жыцькаўскі майстар Цімоха Іванавіч Кагадзей, наш сусед. Можа, вы захочаце з ім сустрэцца — калі ласка, я вас магу да яго завесці. Толькі ў другі дзень — сёння ён заняты праводзінамі... Цімафей Іванавіч мае, дарэчы, адну цікавую асаблівасць: калі яму загадваюць нешта рабіць, ён ніколі не паслухаецца, а вось сам, калі што яму захочацца, зробіць, хоць будзе сядзець тыдзень ці нават месяц. Гэтую рамку ён таксама прынёс сам — зрабіў па сваёй ахвоце. Бачыце ў ёй вялікую фотакартку — знізу, у левым кутку? Гэта вяселле Паўла, майго другога брата, генерала Савецкай Арміі, які зараз служыць на Далёкім Усходзе. Хоць шлюб гэты быў і нешчаслівы — Павел разышоўся з першаю жонкаю,— тата ўсё роўна не дае выкідаць з рамкі фотакартку... (Вось тут Дзіна, пэўна, папраўіла б пальцамі сваю высокую прычоску і задумалася — як пачынаць гаворку пра наступнае?) Цяпер звярніце ўвагу на паспарту, што вісіць у пярэднім радзе справа. Яго выразаў з картону і склеіў мой бацька. Правільна, ён не ведае, што яго праца так называецца, і калі я яму сказала, што ён зрабіў паспарту, бацька здзівіўся і адказаў: «А кінь ты, Дзіна, жартаваць: якія гэта паспарты — то ж звычайная рамка». Дык вось, у гэтым паспарту вы бачыце дзве фотакарткі — злева салдат царскай арміі, які загінуў у першы ж дзень той яшчэ вайны, справа — бачыце, з канём — селянін, які загінуў у апошнія дні другой вайны: ён з гэтым жа самым канём уз'ехаў на нямецкую міну. То мае дзяды: з бацькавага боку і з матчынага. Адзін працаваў у Піцеры на чыгунцы. Другі — толькі пад старасць упершыню ўбачыў цягнік. Кагадзей расказвае — не ведаю, ці праўда, ці выдумка,— як гэта было. Дзед прыехаў на чыгуначную станцыю, баязліва пад'ехаў да паравоза. А машыніст, чорны, мурзаты,— як чорт, бачыўся тады дзед — вытыркнуўся з паравоза і пажартаваў: «Куды ты, стары, едзеш?

Уцякай скарэй, а то я разварочвацца буду». Зірнуў дзед на цягнік — а ён доўгі, доўгі: яму ж — уга! — колькі месца трэба, каб развярнуцца,— ды як пачаў сцябаць каня, каб, разварочваючыся, цягнік на калёсы не паехаў. Сцябае і ўсё азіраецца, сцябае і ўсё азіраецца — ці хопіць месца цягніку. Кажуць, кіламетры са тры ад станцыі ад'ехаўся. Уехаў у лясок і толькі тады супакоіўся. Стаў і думае: «Ну, няпраўда, на такія елкі і гэта машына не павінна паехаць». А бабка, тая была смялейшая. Яна, кажуць, прасілася нават у цягніка, калі той грукатаў побач: «Пачакай, цягнічок, падвязі ты мяне, вясковую бабу, да Жыцькава». А калі цягнік з шумам прагрукатаў ля яе і не спыніўся, яна, кажуць, асабліва і не пакрыўдзілася: «Ай, няхай сабе едзе. Гэта машыніст дрэнны трапіўся — не хоча старую падвесці да Жыцькава...» (Тут Дзіна яшчэ раз агледзела б фотакарткі — ці не прапусціла каго,— потым бы звыкла, але незаўважна для іншых, перасмыкнула перасохлымі ад доўгай гаворкі вуснамі і павярнулася б да стала.) А гэта вы, таварышы, бачыце застолле: мы праводзім з адпачынку генерал-маёра Паўла Шыбеку і малодшага лейтэнанта Генадзя Шыбеку...»

Дзіна сядзела спіною да «іканастаса» і з непрыхаванай раздражнёнасцю глядзела на Басцялу, які трымаў у руках шклянку з самагонкаю: тое, што Ігар піў, яна перажывала, як сваю асабістую бяду. Маці ж вінілася сама: Алене думалася, што прывучыла сына да пітва яна — калі Ігар быў малы, каб ён, крыклівы, спаў, Шыбекава нярэдка торкала яму ў рот соску з хлебам, намочаным у гарэлку.

Мужчыны выпілі яшчэ па чарцы, жанчыны таксама падтрымалі іх — хто толькі губы намачыў, а хто троху і адпіў, пазначыўшы перад гэтым пальцамі, дакуль глынуць, і потым, зморшчыўшыся, падняўшы шклянку, правяраў, ці не выпіў лішняга.

Паўлік, убачыўшы, што бацька заняты гасцямі, паспрабаваў быў незаўважна паслабіць гальштук ці, можа, расшпіліць хоць які гузік, але Шыбека так строга зірнуў на сына, што Павел паслухмяна паклаў рукі на стол.

Застолле разбілася на групкі, дзе ішлі свае бяседы.

Цімоха, успёршыся локцямі на перабіранку і падаўшыся ўвесь уперад, цераз стол расказваў генералу:

— Ты вот, Паўлік, у мяне пытаеш, чаму я пчол не заводжу? А я табе, брат, скажу: заводзіў. І многа разоў заводзіў, але ж, разумееш,— не палучаецца. Ручалішыны

не даюць. Такія ўжо разбойнікі — нахрапам у вулей лезуць. Ці паверыш, Паўлік, адзін раз я цэлага паўдня з венікам ля сваіго вулля стаяў, усё сек іх, цэлае рэшата — яй жа богу, не лгу — насек, ды буйныя такія, як боб, рука аж у плячы забалела, а яны ўсё роўна ў вулей прабраліся і ўсіх маіх пароэзалі. І другі раз заводзіў, і трэці... І ўсё роўна акрэпнуць не даюць. У яе ж зладзеі нейкія, а не пчолы. Другі раз ля гарода ідзеш, дык аж здалёк чуваць, як яны там злосна гудуць.

Андрэй павярнуў галаву да Геніка і расказваў яму пра талінскіх суседзяў:

— Наташка, ледзь што, усё гаворыць мне: «Вунь Латушка, вунь Латушка». А што мне твой Латушка. Такі во, Генік, лейтэнант, як ты. Толькі ўжо старшы. А па-мойму, дык ты будзь хоць лейтэнантам, хоць пастухом, але чалавекам быць не забывайся. А то нос закапыліць, ідзе, як усё роўна на дарожцы чырвонай, што для касманаўтаў сцелюць. А яна мне — Латушка, Латушка! Збіраў, збіраў грошы на машыну, а як толькі купіў — у першы ж дзень на самай шырокай вуліцы ў багажнік нейкай «Волгі» цюкнуўся. Прывезлі машыну яго ў двор на прычэпе. Стаяць ля яе абое, плачуць. Вось табе і Латушка... А як на мой дурны розум, дык, перш чым машыну купляць, навучыся ездзіць. Правільна я гавару? І яна такая ж. Толькі і ведае: «Я прыгожая, я гордая...» Навядзе прычоску і пайшла.

— Дзядзька Андрэй, а што тут дрэннага, калі прычоску прыгожая жанчына навядзе? — не ўтрымалася Дзіна.

— І праўда ж,— падтрымала яе і Моця.— Я таксама куплю сабе стужку і во так, як Дзіна, свае валасы дзяржаць буду.

— Яно, Дзіна, прычоска тут ні пры чым,— адказаў Андрэй.— Галоўнае, каб пад прычоскай сёе-тое было. А то прычоску сваю дык яна і цэлы дзень будаваць будзе, а вось дзецям чаго гарачага згатаваць у яе часу не хапае. Правільна я гавару? — і Андрэй зноў павярнуўся да Геніка, паказваючы гэтым, што дыскусія з Дзінаю закончана.

Маці гаварыла з Цытнячыхаю. Яны адразу ж пасля вайны працавалі разам на ферме, якая была побач з Цытнячышыным дваром, і зараз, расчырванелыя ад бяседы, успаміналі:

— А ці помніш ты, як мы кароў глядзелі, па чарзе ў кароўніку начавалі? — пыталася Цытнячыха.— А там жа ні лямпы, ні ліхтара якога. Цёмна, акропна.

— Айё, не кажы ты,— азвалася маці.— Я, поўню, ляжу на саломе, а самой страшна, страшна. А тут яшчэ бык зароў. Ды так ужо лоўка, ды так ужо спалохана, аж захлёбваецца — на чалавека ж ён так не раве. Я ад варот, ад варот папаўзла на праходзе, прыціснулася да кароў і ляжу ні жывая ні мёртвая — паварушыцца баюся. Ваўкі ж тады так ужо асмялелі былі. У мяне ж самой вунь пад сцяну падкапаліся і свінчо выцягнулі. Ляжу, значыць, я і дрыжу, як ад холаду. А тут, чую, калёсы захляхаталі. А тады ж узялі ў моду малако ноччу вазіць, бо да раніцы вячэрняе скісала. Чую, калёсы да кароўніка едуць. У мяне ад сэрца і адлягло: гэта Ручаль па малако едзіць. Пакуль ён пагрузіўся, пакуль пагаварылі, дык, бачу, ужо і залачаць пачало...

— Краў тады Ручаль малако, ой, лоўка краў.

— А хто тады, Александрына, не краў? Жыць жа неяк нада было. Я вунь і сама, поўню, аскаромілася. Гэта ж мы архавалі тады льнянoе семя. А к вечару асталіся толькі трох: я, брыгадзірка і кладаўшчыца. Насыпалі яны мне самі поўны, як падняць, мяшок семя, паклалі на плечы. Нясі, кажуць, Надзёжа, а вечарам мы прыйдзем, падзелім. Лёгка ім сказаць — нясі. Я нясу, а ў мяне ногі падламваюцца: крый бог, хто стрэпіцца. Толькі я адышлася ад свірана, на дарогу выйшла, а тут мяшок — трэсь! — і парваўся. І семя, чую, па нагах пацякло. Айё, што рабіць? Я мяшок скінула і крычу: «Дзеўкі, хадзіце сюды!» Прыйшлі яны, мяшок троху завязалі, семя падабралі, зноў мне на спіну, а самі ліхтар вынеслі і доўга дарогу замяталі, каб семя не відно было. Я нясу, азіраюся, а ліхтар усё на дарозе мігціць. А пасля позна ўвечары прыйшлі яны да мяне, мы той мяшок і падзялілі... Нада ж было во неяк дзяцей гэтых карміць.

— А мы, бывала, з Міхалкам вязём сеяць ячмень,— дадаў Андрэй,— дык ён са свайго воза скіне мяшок, а тады — і з майго. «А то, кажа, калі з аднаго воза два скінуць, відаць будзе».

За Цытнячышынаю спіною, на падаконніку, выцягнуўшыся, ціха, не варушачыся, як усё роўна спала, ляжала белая, з плямаю па баку, кошка. Такое ж самае белае кацяня, з такой жа самаю плямаю, тачылася пыскаю пад яе жывот і цмуголіла малако, час ад часу толькі прыцмокваючы — цы-цы-цы...

На вуліцы загурчаў матацыкл, і пад самым акном — нават запахла дымам і бензінам — праехаў чалавек, які

руляваў адною рукою, а другою трымаў пад сабою цэлафанавую накідку ад дажджу.

— Моця, яй жа богу, гэта ваш Алісей паехаў,— зірнуўшы ў акно, сказала Шыбекава.

Моця, якая сядзела спіною да сцяны, зірнуўшы на вуліцу і нічога не ўбачыўшы, высунулася ў палісаднік як не да палавіны.

— Ага, гэта Алісей,— пазнала яна і пачала выбірацца з-за стала.— Пайду ж, а то ў яго там нешта беленькае мільганулася: можа, пісямко?.

— Якое табе пісямко! — усміхнуўся Кагадзей.— Гэта ж у яго на рулі бітончык вісеў. Алісей па смятану прыехаў.

— Толькі ж там не баўся, прыходзь назад хуценька і Алісея заві,— папрасіла Шыбекава.

А калі Прутніха, гучна клямкнуўшы дзвярыма, пад вокнамі пабегла да свае хаты, Цімоха ўсміхнуўся яшчэ больш — аж шчарбіну паказаў — і разгладзіў свае вусы:

— І выдумае ж гэта Моця — пісямко ёй беленькае нехта пад дажджом у руках павязе.

— А калі б ужо Алісей і прывёз што Моці,— азвалася Цытнячыха.— Хоць бы пісямко якое. Брат жа ўсё-ткі. А то толькі з яе цягне. У самога вунь, не бойся, пуза, а Моця — нібы выцекла ўся.

Жанчыны дружна падтрымалі яе:

— Ага, не лянуецца аж з Азярычына як не кожны дзень па малако ездзіць. Ці табе дождж, ці табе град.

— Усё ж ён у Моці забірае: і смятаніну, і масліну, і яйка якое, нават сывараткай і то не грэбуе. А гэта, дурная, усё аддае: «Алісейка, а заўтра ці прыедзеш?..»

— Твой Алісейка ў Азярычыне так умураваўся — як пан некалі. Двор зацэментаваў, сцежкі таксама, каб Зойка і ног не намачыла. Студні, лазні павыбудаваў... Грады з труб палівае.

— А я-то і глядзеў тады пасля вайны,— падтрымаў жанчын Кагадзей,— чаго гэта Пуйноў, як толькі за старшыню стаў, адразу Віцьку Прутня брыгадзірам зрабіў. А з таго Віцькі брыгадзір — як з мае Волькі міністр. Ён малы яшчэ быў — вы ж з ім, Андрэй, ці не з аднаго года?

— З аднаго,— адказаў Андрэй.

— Але Пуйноў яму ўсё параскажа, падкажа: гэтага пастаў сюды, гэтага пашлі туды, дык Віцька і брыгадзірыць. Аж пасля я ўжо зразумеў, чаму гэта тады Пуйноў да Прутнёў такі добры быў — во гэты во, Алісей, хадзіў

ужо да яго Зойкі. Дык Пуйноў усё стараўся, каб тойі замуж дзеўку ўзяў.

Кацяня, напіўшыся малака, скакала па падаконніку, па самой коншцы, якая толькі прыўзнімала галаву і, нібыта спрасоння, абыякава глядзела на малое. Кацяня вадзіла лапкаю па шыбіне, за якой цяжка махала адсырэлымі ад дажджу крылямі позняя восеньская мятлушка: яна, відаць, усё ж не траціла надзеі ўляцець праз шкло ў хату, дзе можна сагрэцца і перасушыцца. Ды і сытае кацяня не мела ахвоты лавіць мятлушку — па тым, як яно мякка дакраналася лапаю да шыбіны, было відаць, што яму адно толькі хочацца падурэць з ёю.

Я глядзеў на гэтую гульню, і мне было неяк цёпла і хораша ад думкі, што вось гэта мятлушка так і не здолее праз зачыненае акно ўляцець у хату, дзе яе можа напаткаць небяспека, і што кацяня так і не зможа ніколі злавіць праз шыбіну гэтую мятлушку, а здагадацца, што трэба выбегчы за дзверы, пад акном абабегчы вакол хаты,— яно не здагадаецца...

Госці закусвалі хто чым хацеў — адны па-маладому храбусцелі маласольнымі агуркамі, другія бяззуба ціскалі мяккі зярпісты сыр, трэція падчэплівалі на відэльцы шпроты з бляшанак і, падставіўшы пад «лёк» руку, кідалі, спяшаючыся, у рот.

— Прыходзіць гэта да мяне ўчора,— зноў гаварыла Цытнячыха да нашай маці,— чалавек і кажыць: «Паглядзі, Цытнякова, ці твая гэта роспіс у ведамасці стаіць». А я паглядзела і кажу: «Я ж непісьменная, а тут, зірні, як закручаста напісана».

— І да мяне прыходзіў.— Маці паклала відэлец на стол, а потым, зірнуўшы на Дзіну, узяла яго і пераклала на талерку.— Таксама кажыць: «Ці ты гэта распісвалася?» А я яму і адказваю: «Ты мне не роспісь, а пенсію нясі». А ён будзіць казаць: «Вернем табе, Ласімовіч, і пенсію...»

Андрэй расказваў Геніку, як ездзіў у Ленінград на прафсаюзную нараду: яго ж кантора — філіял ленінградскага ўпраўлення.

— Я хацеў проста так ехаць. А Наташка як прыстала: «Надзявайся — і ўсё». Як смала тая. Ну я і надзеўся. Чорны касцюм, белая сарочка, гальштук модны, капялюш. Адно толькі лясачкі і не хапае. Правільна я гавару? Прыйшоў на нараду, а там усё будзённа, будзённа. Людзі глядзяць на мяне, як на дзівака: куды выфранціўся? А тая —

падзявайся, падзявайся. Сам пачальнік упраўлення ў пакамечаным касцюмчыку, у чаравіках абношаных — я такія ў смеццеправод выкідаю. Сядзіць у прэзідыуме і спіць. Во-во захрапе, здаецца. Як нада гаварыць, яго — таўхель! — пад бок. Ён і кажа: «Так, таварышы, тут гаварылі пра недахопы, усё гэта правільна... Гаварылі тата-тататата... Мы будзем тата-тата-тата...» Глядзіш, і выступіў ужо. Ды і правільна.

Генерал, улучыўшы момант, калі бацька выйшаў у сенцы, расшпіліў верхнія гузікі ў сарочцы і спытаў у Кагадзея:

— Цімафей Іванавіч, а чаму гэта вы бабы Гапкі не прывялі сюды? Хай бы пасядзела з намі.

— Дзе ты, Паўлік, бачыў, яна ж ужо і па хаце нават перайсці не можа. Слабая стала. Памірае зусім наша Стахванаўна...

— Ага, яна ўжо даўно памірае,— азвалася са свайго кутка і Цытнячыха.— Гадоў дваццаць памірае. І ўсё хварэе. А Міхалка, той і не хварэў і не паміраў, а — раз! — і няма чалавека.

— А такая ж хуткая была,— вярнуўшыся, увайшоў у размову Шыбека.— Бывала, Міхалка прыедзе на абед, просіць-просіць есці, а яна, пакуль разоў са дваццаць вакол хаты без прычыны не аббяжыць, на стол нічога не паставіць. Я аднойчы зайшоў да іх — Міхалка сядзіць на лаве, абеду чакае, а яна вакол хаты бегае... Я ўжо і то не сцерпеў: «Гапка, ядры тваю качалку, ці чуеш, дай хутчэй чалавеку есці!» Эх, як забегала яшчэ хутчэй — акурат укушаная,— эх, як кіпецца сварыцца! Але есці ўсё ж паставіла.

Цімоха сядзеў прасторна, як не на двух крэслах: на сваім і на Моцiным. Ён глядзеў у акно і, нібы тлумачачы, чаго ён туды глядзіць, сказаў:

— Нешта і Моця доўга не вяртаецца.

— Агоў-агоў! Што, засумаваў без Моці? — нядобра зірнула на яго Кагадзеіха.— Сядзі ўжо, а то, можа, уелед, нюхаючы, пабяжыш.

Хоць жонка сказала і груба, Цімоха змоўчаў, а наша маці заступілася за яго:

— Чаго ты, Волька, да чалавека чэпішся? Ужо сёмы дзесятак, а ўсё раўнуеш свайго Цімоху. Каму ён нада такі стары?

— Сціхні ты, мама,— далучыўся да жаночых размоў і Андрэй.— А сама ты якая раўнівая была. Помніш, як

бацька аднекуль прыехаў на санях, а ты ўбачыла, што побач з ім яшчэ такое ж акуратненькае месца ўседжана. Во тады бегала: «Прызнавайся лепей, каго ля сябе вёз!» Правільна я гавару?

— Во ўспомніў,— усміхнулася маці.— Калі тое было. Ды вы ж і самі зыркія былі. Ледзь што — ужо, бывала, і бягуць з-пад малатарні: «Мама, мама, а наш бацька ў саломе з бабамі іграецъ...»

— І не толькі раўнівая,— зірнула на яе Волька.— Вунь аграном...

— А што той аграном,— аж зачырванелася маці.— Выдумалі самі, прыклалі таго агранома, ды і сёння забыцца не могуць.

Доўга яшчэ гаварылі вось так пра ўсё, пераскоквалі з аднаго на другое, пакуль, нарэшце, не зачапіліся за адну, вельмі важную і цікавую для ўсяго застолля тэму.

У нашых вёсках, якія перажылі гады акупацыі, гады партызанскай вайны, якія рабіліся то перадавымі пазіцыямі франтоў, то глыбокім тылам, такою тэмаю ў застоллях усё яшчэ бывае вайна. І мне здаецца, чым далей мы будзем жыць і аддаляцца ад жахлівых дзён вайны, тым больш нам будуць балець нашы раны — забітыя родзічы, разбураныя Жыцькавы, спаленыя Хатыні.

Першы зачапіўся за гэтую тэму Кагадзей. Ён успомніў, як Ручаль вымаў у дзяцей рыбу з прутняў.

— Гэта ж нада-нада, мужчына называецца, бацька, а ў гэтых дзяцей галодных рыбу забіраць не пасароме ўся. Во ўжо быў цмок.

І расказваў Шыбеку, нібыта спавядаўся перад ім:

— Я во цяпер, Піліп, аж сам на сябе злуюся. На чорта мне нада было чапаць таго Рупянька! Хто мяне за язык, скажы, цягнуў? Дык не ж, сустрэў яго ў кустах і разгаварыўся. І ўзяў ды, дурань, расказаў яму пра Ручаля — што той у вайну вытвараў. А Рупянёк — таксама баба бабаю... Узяў ды Ручалісе ўсё і выклаў. Тая мяне сустракае і злуецца: «Навошта ты, Кагадзей няшчасны, майго Ручаля майму Рупяньку абгаворваеш?» І цяпер, разумееш, удваіх беднага Цімоху кляпуць. Во як, Піліп, бывае... А ты кажаш, што вайна скончылася.

Ну, а калі ўжо ўспомнілі пра вайну за сталом, у бяседзе, такая бяседа не скора затухне — у кожнага ёсць многа таго, што ляжыць блізка і баліць цяжка...

Цяпер ужо гаварылі ўсе, гаварылі з розных канцоў

стала, але размова была стройная — як загадзя прадуманая.

— А ці помніце Наіна? — калі ўжо госці крыху паўспаміналі і пра тое, як ішлі салдаты на Мамоны, і пра тое, як стаяў фронт у Жыцькаве, і пра тое, як усё поле пад Высокім было ўслана мёртвымі салдатамі,— спыталася Кагадзеева Волька.

Усе ажывіліся, засоўгалі крэсламі, пачалі ўсміхацца: гэтая крыху неват рамантычная гісторыя — своеасаблівы набытак, памяць жыцькаўцаў, і немца Наіна, які ездзіў у навакольныя вёскі мяняць каралі і сахарын на яйкі, масла, курэй, тут усе добра ведалі.

— Бывала, едзе на сваім нізенькім кані, а сам доўгі-доўгі — аж ногі па траве валакуцца. Едзіць, як усё роўна ідзець. Повад недзе на грыве ляжыць, а ён на гуслях іграіць.

— Ага, усё іграў. І на каня ніколі не покаў, за повад не торгаў. Сядзе, ногі спусціць, і куды конь ідзе, туды ён і едзе.

— Дык конь жа ўжо ўсе дарогі ў вёскі ведаў. Сёння ў Жыцькава, заўтра — у Грукава, паслязаўтра — у Весялёўкі.

— Конь, бывае, стане на паўдарозе, пагне галаву, скубе, а ён сядзіць і дрэмле... Чакае, пакуль той наскубецца.

— Слухайце, а што ж ён у Млынарах рабіў?

— Хто яго ведае. Казалі, у нейкіх тылавых часцях служыў.

— Ну, вядома, не на хронце. Ён жа стары ўжо быў. Аднаўляў разам з такімі ж старымі масты, што партызаны ўзрывалі.

— І ўсё без вінтоўкі ездзіў.

— Агату — паабчапляецца торбамі...

— А ці бачылі вы ў яго торбе ляльку абгарэлую?

— Бачылі, ён яе, кажуць, недзе ў нас, у Беларусі, на папялішчы знайшоў. Ля дзіцячых касцей абгарэлых.

— Бывала, выйме з торбы, глядзіць на яе і плача.

— Гэта добра, калі чалавек не развучыўся яшчэ плакаць,— сказаў генерал, за спінамі Андрэя і Геніка павярнуўся да мяне і спытаў: — Памятаеш, «Таинственный остров»? «Ты плачаш, значыць, ты чалавек».

— І ў яго ж, казалі, дзеці і ўнукі пад бомбамі загінулі.

— От Гітлер. От вар'ят. От панарабіў дзялоў.

— А Наін жа сам, ці помніце, нічога не браў.

— Мы ўсе дзівіліся — чаму ён мяняе, а не адбірае. У іх жа тады ўсё было: і закон, і ўласць. І нікому не паскардзішся.

— Мы вось дзівіліся, а эсэсаўцы дык тыя яго і білі за гэта.

— Ага, я, Алена, і сам бачыў. Яны ўсё змушалі яго рабаваць, так, як самі, адбіраць апошняе. Яны яму ўсё гергечуць, гергечуць, а ён сядзіць на кані, слухае іх, а потым сваё: «Найн!» Тады яны яго прыкладамі... Зваляць з каня і ботамі яшчэ прытаўкуць. А ён усё роўна: «Найн!» Падымецца, абатрэцца ад крыві, сядзе на каня і паехаў — куды той яго павязе.

Я так многа чуў пра гэтага старога, якога самі немцы са злосцю звалі «думкопф», а нашы жыцькаўцы проста — Найн, што ўжо нават сам, здавалася, бачыў, як ён, пааб-чапляны торбамі, ездзіць па жыцькаўскіх дарогах, ён — наіўны і ўпарты Дон-Кіхот дваццатага стагоддзя — і хоць вось так змагаецца са злом.

Пачынала ўжо цямнець. Змрок, загусцелы на дажджы і хмарнасці, насоўваўся неяк вельмі ўжо хутка. Запалілі святло, і ў хаце адразу пацяплела, павесялела.

— Цімоха, табе там не холадна ля акна? — спытала Шыбекава.— А то, можа, зачыніць: цяпер жа вечары ўжо халодныя. Не лета ж.

Зачыняць акно Кагадзей не даў. А Андрэй спытаўся ў яго:

— Раскажы лепей, Цімафей Іванавіч, як ты каляровую металургію падымаў.

— А што, Андрэй, металургія? Некаму ж і гэта трэба было рабіць. Ты ж сам ведаеш, колькі тады ўсялякага жалеззя на нашых палёх ляжала,— аж зямлі не відно.

— А ты ж, Цімафей Іванавіч, жалеззе не вазіў. Жалеззе ты свайму цесцю, Міхалку, аддаваў. Яго на браню і дзюралюміній кідаў, а сам усё бронзу, латунь ды медзь шукаў.

— А і праўда, Міхалка, бывала, накладзе воз — аж пад неба, здаецца. Едзе здаваць — грыміць-звініць. А Цімоха толькі ў ручкі накладзе — на калёсах і не відаць. А здадуць — Цімоха тысячы вязе, а Міхалка — рублі ды дзесяткі за свой воз мае.

— Дык жа тона каляровага металалому тысяча рублёў тады была, а брані і дзюралюмінію — сто пяцьдзесят. Адзін матор з самалёта здасі — і ўжо кішэня грошай.

— Яно, Алена, нада яшчэ ўмець дастаць той матор. Ды ў мяне ж і рызыка была, а ў Міхалкі — ніякай. Вунь як я, да прыкладу, матор са збітага самалёта нямецкага даставаў з балота пад Мамонамі...

Цімоха не спяшаючыся прыкурыў папяроску, якую да гэтага круціў у руках, зацягнуўся і, павярнуўшыся да расчыненага акна, выпусціў дым у палісаднік — на дождж, на куст бэзу.

— Цяпер тое балота асушылі, кусты паанылілі, цяпер там пшаніца расцець, а тады ж гэта была твань тванню, а самалёт як удзяўбнуўся ў балота, дык метры на тры і ўвайшоў у дрыгву — адзін хвост тырчыць. Пахадзіў я, Юра, ля гэтага самалёта, паглядзеў — а самому так ужо карціць, так ужо хочацца матор дастаць: як усё роўна мёртваму ў зямлю легчы не церпіцца...

Цімоха зноў зацягнуўся і зноў, неяк дзіўна натрымаўшы ў роце дым, выпусціў за акно.

— Пахадзіў я, Юра, пахадзіў ля яго,— гаварыў Кагадзей чамусьці да мяне, хоць я сядзеў далёка, а спытаўся пра гэты самалёт Андрэй,— пасля прынёс лапату і пачаў падкапвацца. Дні са два работаў. Падкапаўся я пад яго і аж сеў у яміне са страху: а каб цябе воўк не еў — бомба! Ды вялікая такая — не раўнуючы, як свіння пудоў па дзесяць. Тут у мяне валасы і пачалі са страху падымацца — аж трашчаць, чую, выпростваючыся. Сяджу і пашавяльнуцца баюся: узарвецца ж! Аж не верыцца, што во толькі я так смела капаў... Чую, зверху нехта ходзіць — а гэта Волька прыйшла, абедаць прынесла. Падала мне руку, дык я ціхенька-ціхенька, па сценачцы і вылез са сваёй яміны. Як убачыла бомбу Волька — такі крык узняла, не прывядзі ты бог: «На агні табе гэты матор! Кідай усё — і пайшлі дадому». А я пахаджу-пахаджу вакол ямкі — шкода: столькі ж капаўся. Але Волька ўгаварыла — узяла за руку і павяла дадому, як малога. Нават лапату сама несла...

— Я яго вяду, а ён усё азіраецца назад...

— Прыйшлі мы дамоў, а я на тую бомбу ніяк не магу забыцца — што ні раблю, куды ні іду, а яна ўсё ў галаве, як скула якая... Не вытрымаў — лапату ў рукі і зноў пад Мамоны. Зрабіў лагі — матор жа акурат па бомбе цягнуць нада было,— калаўрот наставіў і...

— Добры вечар вам у хату!

Усе так слухалі Цімоху, што ніхто не пачуў, як адчыніліся дзверы, як зайшоў ён у хату. Галашонак стаяў у

дзвярах пярэдняй хаты, неяк няўпэўнена глядзеў на ўсіх. Высунуў з-пад мокрага плашча руку і зняў з галавы шапку — не за казырок, а адразу ўсёю жменяю зграб зверху, нібы хацеў зняць яе разам з валасамі.

Усе маўчалі, глядзелі хто куды, стараючыся не заўважаць чалавека. Павел хацеў быў нешта сказаць, ужо раскрыў рот і нават выцягнуў з-пад стала руку — як быццам збіраўся запрасіць Галашонка ў застолле,— але, убачыўшы, як строга, нічога не гаворачы, зірнуў на яго бацька, сумеўся і, паколькі ўзнятай руцэ трэба было ўсё роўна нешта рабіць, ён без патрэбы ўскінуў вышэй крыло валасоў, якое, як заўсёды, вісела па лбе: яно адразу звыкла ссунулася на сваё заўсёднае месца.

— Добры вечар, кажу,— няўпэўнена паўтарыў Галашонак і, імкліва ўзмахнуўшы, абтрос кепку — пырскі паляцелі аж у заднюю хату, дзе стаяў стол.

Але яму зноў ніхто не адказаў. Галашонак яшчэ прыглушана кашлянуў разы са два, каб звярнуць на сябе ўвагу — нібыта яго не бачаць,— а потым павярнуўся і ціха пайшоў назад.

Калі дзверы зачыніліся, Андрэй, быццам нічога і не здарылася, спытаўся:

— Ну дык што, Цімафей Іванавіч, было далей з тваёю бомбаю?

— А што было — падклаў лагі ды і выцягнуў калаўротам,— ужо без ахвоты, без падрабязнасцей, неяк абыякава закончыў свой расказ Цімоха і зацягнуўся папяросаю.

Памаўчалі. Адчувалася, што ўсе думаюць пра Галашонка.

— Неяк усё ж нядобра выйшла, — першы ўсумніўся Павел.

— Чаму гэта нядобра? — не згадзіўся з сынам Шыбека.— Яму, бачыш, добра было з нас здзекавацца ў вайну, а нам ужо нядобра і за стол яго не запрасіць...

На вуліцы загула машына. Пад акном яна спынілася і, пачыхаўшы-пачмыхаўшы, змоўкла. Усе ўзрадаваліся — ёсць прычына забыцца пра Галашонка.

— Відаць, Прутніха Алісейку вядзе,— падумала ўслых маці.

— Не, Надзёжа,— угледзеўшыся ў акно, у цемру, запярэчыў ёй Кагадзей,— прыехаў не матацыкл, а машына. Ці не Караенькевіч гэта? Здаецца, яго «казёл» стаіць.

І праўда, праз якую хвіліну дзверы шырока расчыніліся, і ў хату ўваліўся высокі, шырокі ў плячах Карань-

кевіч, а за ім гэткі ж, як і ён, плячысты і станісты,— сакратар райкома Багуцкі.

Яны прынеслі з сабою шум ветру і дрэў, пах дажджу і поля. У хаце адразу стала шумна і весела, яна нібыта зрабілася яснейшаю ад гэтае напорыстае і жыццядайнае сілы — быццам у хату да Шыбекаў аблаваю ўваліўся цэлы натоўп вясёлых узбуджаных людзей. І старшыня калгаса, і сакратар райкома былі людзьмі жыццялюбівымі, таварыскімі, і таму адразу ж уся бяседа закружылася вакол іх, завесялілася, заўсміхалася, загула.

Шыбека спачатку ўсё змушаў іх выпіць, успомніўшы як не ўсе наіўныя хітрасці вясковага прымусу («Ну, выпіце ж вы, мальцы, а то я абіджуся. Ну, глыніце хаця, мальцы, а то я падумаю, што вы і Паўлу Піліпавічу, і мамё хаце зла жадаеце»), не маўчала і Шыбекава («А вы прыгубце хоць, прыгубце»), але потым, убачыўшы, што тыя толькі жартуюць і ўсё роўна не п'юць, паступова ад іх адчапіліся і гаспадары, і госці.

Хаця сакратар і старшыня і не пілі, яны ўсё ж паводзілі сябе тут, у застоллі, вельмі натуральна, смяяліся, як і ўсе, падтрымлівалі, адразу ж падхоплівалі любую гаворку.

Караньскевіч, нібы не пазнаючы, доўга прыглядаўся да Паўла, а пасля ўсміхнуўся:

— Што гэта ты, таварыш генерал, блішчыш увесь, нібы выцацканы? Табе ж горача. Зімі парадную форму — хопіць фарсіць.

Павел падміргнуў яму і незаўважна, адным вачыма, паказаў на бацьку. Караньскевіч ведаў пра вялікую павагу Шыбекі да сынавай формы і таму павярнуўся да яго:

— Думаю, і Піліп Пятровіч не будзе супраць?

— Я што — няхай здымае,— згадзіўся і Шыбека, хоць у голасе і адчувалася, што яму гэта не падабаецца і што ён не згодзен з Караньскевічам, але пярэчыць старшыні не будзе.

Павел зняў кіцель, праз галаву, не развязваючы, здзеў гальштук і, памахаўшы каўняром, ветраючыся, задаволена ўздыхнуў.

Караньскевіч з Паўлам — даўнія сябры. Хоць яны і з розных вёсак, але ўсё роўна сябравалі і ў дзяцінстве, і пасля, калі вучыліся ў Азярычыне ў дзесяцігодцы. Таму і ім было што ўспамінаць.

— А ці помніш ты Алельку вашага жыцькаўскага? — пытаўся Караньскевіч у Паўла.— Тады ж усіх угаворвалі

быць трактарыстамі. А ўсе адмаўляліся. Алелька таксама ўсё адгаворваўся. Але неяк яго ўламалі...

— Як яго ўламалі? — усміхнуўся Кагадзей.— Трактар яму завядуць, пасадзяць — дык ён і паехаў. А як толькі трактар спыніўся, ён яго кідае — і дамоў.

— Ага,— згадзілася з ім і Волька, якая сядзела, падпёршы галаву рукою, і слухала.— Нічога ў гэтым трактары не знаў: ні як спыніць, ні як завесці.

— А які вам з таго Алелькі трактарыст, калі ён на веласіпедзе і то не навучыўся ездзіць,— падтрымаў суседзяў Шыбека.— Укручваў, укручваў штаны ў цэпку, падаў, падаў, а тады кіпуў веласіпед пасярод дарогі ды і кажа: «Апу яе пад Луфёры, гэту вашу тэхніку на двух колах...»

— І трактар ён, бывала, кіпе,— успомніў і Карапькевіч,— а мы, дзеці, калупаемся ў ім, калупаемся, а потым нечакана завядзём і паедзем...

— Лёгка сказаць — паедзем,— засмяялася Шыбекава.— Якая ўжо там язда была! Вы ж таксама нічога не петрылі ў тым трактары. Пусціць-то пусціце, а кіраваць не ўмееце, дык той трактар, як Наінаў конь,— ідзе, куды яму хочацца, пакуль сам не заглухне.

Андрэй, хоць і маладзейшы за Паўла і Карапькевіча, таксама разам з імі «асвойваў» трактар. Далучыўся да ўспамінаў і ён.

— А ці помніце, як Спіца брыгадзірам была? Нас, дзяцей, па «Універсал» пасодзіць — фары ў ім ёсць, а лямпачак няма — мы ўночы скародзім, а яна наперадзе з ліхтаром бегае і свеціць нам. Мы з Медзяком, тваім, Карапькевіч, шафёрам, на пару ездзілі.

— Ага, помню,— азваўся старшыня.— Яна свеціць, а вы на святло едзеце.

— Бывала, «Універсал» затрасе на ямінах — аралі ж абы-як,— дык і не пачуеш, як заснеш. Спіца свеціць, свеціць, азірнецца, а трактар зусім у другі бок пайшоў.

— А ты, Паўлік, так ужо трактар любіў,— усміхнуўся Шыбека.— Усе думалі ўжо, што трактарыстам будзеш.

— Так, тата, мы ўсе адсюль, з хат,— задумліва адказаў генерал.— Толькі разышліся ў розныя бакі — на поўнач і на поўдзень, на захад і на ўсход, абараняем нашы рубяжы, будуем новыя гарады, пускаем новыя заводы, перавыконваем пяцігодкі, але ж не забываемся, адкуль мы родам, і помнім, што хлеб, які ўсе ядзім кожны дзень, хлеб, які трэба нам як паветра, вырас на дабрыні клапат-

лівых нашых бацькоў. Тваёй, мама, тваёй, тата, вашай, цётка Надзёжа...

Павел змоўк, перадыхнуў і зірнуў на старых: ці не мудрона ён гаварыў?

— І калі б мы ні вярталіся дамоў, і якімі б сівымі і старымі, якімі б мудрымі і высокапаноўнымі ні ўваходзілі ў свае родныя хаты, у нашых бацькоў заўсёды адны словы: «А дзіцятка ты маё дарагое — прыехаў»,— надтрымаў яго Багуцкі.

— І хлеб, мама, таксама родам з хат. Не было б хат — не было б і хлеба,— Павел убачыў, што ўсе зразумелі яго шчырасць.

— З хат і яшчэ з поля,— удакладніў Каранькевіч.

Кагадзеіха зноў вярнула размову да трактара, сказаўшы:

— А тады ж, ці помніце, наш Маласай трактарыстам быў. А ён жа вам, дзеці, даваў па чарзе паараць троху,— і павярнулася да генерала.— От табе, Паўлік, у той дзень не спалася, калі твая чарга была. Прыбег аднаго разу, помню, ранелька і за шырмачку так падазрона глядзіць: «Цётка, а дзе гэта ваш Коля?» — «Паехаў ужо, сынку, паехаў»,— адказала Стахванаўна, а ты, Паўлік, усё за шырмачку глядзіш — не верыш.

— А пасля, бывала, усё бяжыш, руку да вачэй прыклаўшы, у поле, усё сочыш, дзе ж той Коля арэ,— дадала і Алена.

— Тады трактар навіна быў,— падміргнуў Паўлу Каранькевіч.

— Столькі конскіх сіл меў! — падтрымаў яго Багуцкі.

— А цяпер колькі ў нас і на нас гэтых конскіх сіл працуе. Цэлыя табуны! Уключыў у разетку — яны і пакапыцілі. Уключальнік павярнуў — іржаць. Ды якія коні!

— Нават каб нагаліцца, уключыш брытву ў сетку — і ўжо хоць нейкі маленькі конік, але ўсё ж пабег, заржаў ля шчакі.

— Цяпер на покуце часцей за ўсё лічыльнік замест абразоў вісіць на сцяне. Як вобраз новага святога — бога электрычнасці.

— Нават самыя набожныя бабулькі, якія не даюць знімаць абразы, дазваляюць вешаць побач са святымі і лічыльнік. Так і вісяць яны ў хаце часам побач — прыкметы старога і новага.

Пераішлі на калгас, зачапілі жніво.

— А чаму гэта вы ячмень каля Жыцькава дасюль не

жалі? — спытаўся я ў Каранькевіча.— Дажджоў, можа, чакалі?

— Не, Юра, гэты ячмень у нас на семя. Вось мы з Іванавічам,— і Каранькевіч кіўнуў у бок Багуцкага,— усё цягнулі і думалі: няхай пастаіць.

— Шкада, і лён ты не паспеў абмалаціць,— дадаў Багуцкі.

— Ну, лён нідзе не дзенецца. Семя нам не трэба, семя мы ўжо за тры гады ўперад здалі. А вось траста... — пачаў Каранькевіч, але сакратар перапыніў яго:

— І семя таксама трэба. Не вам, дык дзяржаве трэба,— і абняў старшыню за шырокія, мажныя плечы.

Хутка яны пачалі збірацца. Гаспадары прасілі застацца яшчэ на якую гадзіну, пасядзець разам.

— Няма калі,— адказаў Каранькевіч.— У Азярычыне ў клубе калгаснікі, пэўна, ужо сабраліся, нас чакаюць.

— Навошта вы ўвечары ім спатрэбіліся?

— Будзем ордэн «Знак Пашаны» ўручаць Марылі Паўлаўне Засціцкай. Ёй жа семдзесят гадоў, а яна ўсё на ферме...

— А хто гэта такая? — пацiснуў плячыма Кагадзей.

— Эх ты, Цімафей Іванавіч, што ж ты нават сваёй брыгадзіркі і то не пазнаеш, калі поўным імем яе называеш... Спіца, Спіца гэта ваша, пра якую тут во толькі што ўспаміналі.

Кагадзей сумеўся. Сядзеў і ўсё апраўдваўся:

— Вы ж так важна пра яе гаварылі. Як пра міністра якога.

— Кожны чалавек, Цімафей Іванавіч, міністр. Толькі па-свойму.

Яны, сакратар і старшыня, падняліся з-за стала — роўныя, як браты. І сядзелі яны таксама, як радня,— вясёлыя, гаманкія, свае.

Падзякавалі за вячэру, развіталіся. Ад парога Каранькевіч кінуў генералу:

— Ты, Павел, ранічкай пачакай мяне. Я завязу цябе на цягнік,— і, зірнуўшы на Багуцкага, які апранаў ужо плашч, сказаў: — Не кожны ж дзень у нас з Жыцькава генералы ад'язджаюць.

Калі яны выйшлі, калі, пачыхаўшы-пачмыхаўшы, завёўся «казёл», загуў, з уключанымі фарамі развярнуўся пад акном і паехаў, Кагадзей, усё яшчэ захоплены непасрэднасцю гасцей, хваліў іх:

— Ну і мальцы, ну і мальцы — агонь, а не мальцы.

Застолле гуло доўга. Крыху згадзя, выправіўшы Алісея дадому — той, непітушчы, не схацеў заісці да Шыбекаў,— вярнулася Моця.

Разыходзіліся ўжо недзе апоўначы. На вуліцы было цёмна. Па дрэвах і па плашчах шапацеў нудны, ужо, відаць, восеньскі (хоць яшчэ і цёплы) дождж. Але ён быў празрысты і не туманны — праз яго так добра відаць зыркія азярычынскія агні, якія, нібы яркія зоркі, мігцелі ўдалечыні, на цёплым і цёмным жнівеньскім небасхіле.

## 8. СУСТРЭЧА Ў КУСТАХ

***з дзядком-лесавічком,***
***які выходзіць насустрач,***
***а потым, успомніўшы Галашонка і вайну,***
***вядзе да Наінавай магілкі***

Сасна, што шумела пры самай дарозе, стаяла высока, нібы на пальцах, прыўзняўшыся на тоўстым карэнні: здавалася нават, што яна наважылася назаўсёды разлучыцца з зямлёю і паляцець у незнаёмы блакіт. Яна ва ўсе бакі выцягнула карэнне і яго, абсохлае ад зямлі і глыбіннай вільгаці, паклала на траву, на ігліцу, на заечую капусту — як стомлены чалавек ногі: няхай адпачнуць.

Карэнне, што перайшло праз дарогу, было пасадрана коламі калёс і конскімі капытамі. Яму, як жывому, відаць, саднела і балела, і таму неяк боязна было на яго станавіцца нават чаравікамі — каб не зрабіць дрэву балюча.

Ідучы ў Жыцькава, я пераступаў яго.

Колькі дзён мяне не было ў вёсцы. Кандыдацкая дысертацыя, якую я рыхтую да абароны, патрабавала сёе-тое праверыць, сёе-тое, пакуль ёсць час, дапоўніць. Вось я і сядзеў гэтыя дні ў абласным горадзе, працаваў у архівах, шукаў патрэбныя мне кнігі ў бібліятэцы...

Дзень ужо хіліўся к вечару. Паабапал дарогі акрамя сосен стаяў высокі і тоўсты алешнік — сапраўдныя алехавыя гаі! — а ў прагалах, на палянах, шумела высокая карычневая і ўжо зусім пераспелая трава.

Памятаю, як я, калі першы раз ішоў у Жыцькава, дзівіўся гэтым алехавым лясам і нерастоеным лугам. Убачыўшы вось такія тоўстыя алешыны — гонкія, прыгожыя,— зайздросціў жыцькаўцам:

— Вось бы нам такі алешнік. Не трэба было б за столькі кіламетраў у дровы ездзіць.

Зайздросціў, хоць сам не з нейкага там бязлеснага краю.

А Вера, якая прыйшла тады ў Азярычына сустрэць мяне, тлумачыла:

— У нас і на дровы не спрытна сякуць, у нас выбіраюць.

Бачачы ў кустах высокую і густую траву, якой бы нашы нарадаваліся, можа, і на сваім агародзе, а пераборлівыя жыцькаўцы не касілі і пакідалі старэць на корані, я таксама не вытрымліваў:

— Вось бы нам такую. Нашы б сярпамі яе пажалі, мяшкамі б павыносілі адсюль.

А Вера зноў паціскала плячыма:

— Навошта нам у кусты лезці? У нас і на лугах хапае...

Зараз дарога была ціхая, спакойная: дрэвы, відаць, не прывыклі яшчэ да глухой адзіноты ў лесе, сумавалі без птушак, без іх песень — яны адно толькі журботна шумелі лісцём, якое таксама хутка пачне ападаць...

А тады была вясна і лес быў зусім іншы. Хоць раніца ўжо недзе хілілася да поўдня, у кустах — дзіва! — усё роўна, аж захліпаючыся ад шчасця і радасці, спявалі салаўі. Я, не асабліва ўслухоўваючыся ў іх спевы, і то налічыў больш дзесятка розных спевакоў, якія вялі кожны сваю песню і ў той жа час адну — гэта быў гімн раніцы, вясне, сонцу, жыццю і сваёй каханай салаўісе, якая сядзіць вось тут, побач,— у гняздзе.

— І ў вёсцы ад іх аж нячуцца. Цётка Міля злуецца і кажа, што гэта Цімоха іх завёў: «Ён пераспеўваецца з птушкамі!»

Тады я не ведаў яшчэ ні цёткі Мілі, ні Цімохі, ні самога Жыцькава, а таму не мог ні запярэчыць, ні пагадзіцца.

Вёска мне напачатку не спадабалася — так заўсёды бывае, калі сам ужо створыш у сваім уяўленні нейкі куток, які, вядома, ніколі не зможа паўтарыцца наяве. А Верыну вёску па яе словах я ўяўляў зусім іншаю.

Стахванаўна, што якраз тады па радоўцы пасвіла кароў, убачыўшы мяне, адразу ж закасавала «Надзёжынага зяця».

— Гэта ж нада,— расказвала яна потым бабам,— Верка ж Надзёжына і дзеўка нічога сабе, і прыгожая, і стройная, і працалюбівая, а выйшла за нейкага крывенькага,

кульгавенькага. Ды лоўка ж, дзеўкі, кульгае: на абедзве нагі...

Я тады сапраўды кульгаў. Збіраючыся ў Жыцькава, дастаў са свайго студэнцкага куфэрка ссохлыя парусінавыя чаравікі, пабяліў іх крэйдаю і, пакуль дайшоў да вакзала (цягнік на Азярычына ішоў рана, транспарту ніякага не было), нацёр абедзве нагі. А калі яшчэ па кустах праз гразкія ручаі датэпаў у гэтых белых чаравіках да Жыцькава, крэйды на іх не засталося і следу, і я, такі святочны ў горадзе, зусім ужо не быў падобен на жаніха.

Пасля горада, пасля прасторнага студэнцкага інтэрната Верына хата здалася яшчэ больш цеснаю.

Чаравікі, вымытыя Вераю, сушыліся на згародзе побач з гладышамі, а мы сядзелі ў хаце. Маці пакінула нас дваіх і сама пайшла да Шыбскаў — відаць, пахваліцца, што і да яе прыехаў зяць.

Мы сядзелі на лаве каля стала і мілаваліся, нібыта пасля доўгай растані, хоць, пасля таго як Вера паехала з Мінска ў Жыцькава, прайшло ўсяго толькі нейкіх пару тыдняў: мы, студэнты-пяцікурснікі, былі ўжо ва універсітэце як госці і таму, не баючыся нават дэкана, паводзілі сябе вальней.

Раптам Вера адпіхнула мяне ад сябе і адсунулася сама:

— Нехта ідзе.

Я зірнуў у акно. І праўда, па вуліцы, сюды бліжэй да нашае хаты, прайшла жанчына з новым чыгунком.

— Гэта Волька Кагадзеева,— патлумачыла мне Вера.

— Як ты пазнала, што нехта ідзе? У акно ж не глядзела.

— А гусі, чуў, загагакалі? Яны так гагакаюць, калі чалавек ідзе.

Пасля гэтага мы ўжо абдымаліся не баючыся — ведалі, што гусі, якія спакойна скубуць траву пад акном, папярэдзяць, калі хто будзе ісці.

Успомніўшы пра тое, даўняе, я сам сабе ўсміхнуўся...

— Ого,— пачулася з кустоў.— А я во, Юра, гляджу ды і думаю: чаго гэта чалавек ідзе па лесе адзін і сам сабе смяецца.

Цімоха выйшаў з кустоў — у фуфайцы, у сваёй кепачцы, у бліскучых гумовых ботах, з сякераю — і падаў мне руку. Маленькі, навальны, нягоплены, ён быў акурат дзядок-лесавічок, які толькі што выйшаў з казкі. За яго рыжыя вусы зачапіўся такі ж рыжы, крыху цямнейшы, скур-

чаны сухі лісток — мне здавалася, што, калі Кагадзей гаворыць, ён аж шуршыць у вусах.

Мы адышліся ад дарогі — тут жа пыльна — і прыселі ўзбоч, куды гэты пыл, узняты калёсамі і конскімі капытамі, не даходзіў: я — пад елку, а Кагадзей, паклаўшы збоку сякеру, прытуліўся спіною да невялікага пянька, засланіўшы яго сабою. Такіх старых пянькоў тут было многа, і Кагадзей асабліва сярод іх не вылучаўся: каб пазней, дык у лёгкім цемрыве, можа б, і не спазнаў, дзе ён, а дзе сапраўдныя пянькі-лесавічкі.

Калі ўселіся, Цімоха загаварыў першы:

— А я во, Юра, сёння зранку Маласая нашага з Ліпаю правёў на цягнік, а потым думаю, дай-тку я схаджу ў свае кусты.

— Каго-каго? — нібы не дачуўшы, перапытаў я.

— Як каго? — цяпер ужо ён, нічога не разумеючы, глядзеў на мяне.— Маласая нашага, кажу. І Ліпу.

Я пацiснуў плячыма — маўляў, усё роўна не разумею.

— Яны ж даўно паехалі...

Кагадзей паглядзеў на мяне, а потым, нібы ўспомніўшы, што мяне гэтыя дні не было ў Жыцькаве, адказаў:

— Яны матку хаваць прыязджалі. Стахванаўна памерла. Толькі, кажуць, прыехалі, чамаданы разабралі, а тут тэлеграма...

Кагадзей сядзеў, глядзеў у зямлю і сучком калупаў вакол нейкага бледнага, зморшчанага грыбка, нібы выграбаючы яго з зямлі.

— Учора і занеслі яе туды, дзе неўні не пяюць і людзі не ўстаюць...

Ён зноў пасядзеў, памаўчаў, падняўшы галаву, зірнуў на верхавіны елак, што хісталіся ўгары, і дадаў:

— А так ужо Гапка не хацела адыходзіць. Нават карову не давала прадаваць: я яшчэ папраўлюся, крычала. Вось табе і паправілася. А як карову прадавалі, дык Цыцячыху, якая ў яе была якраз, прасіла, каб падняла яе і да акна давяла: «Я хоць у апошні раз на сваю кароўку зірну, пагляджу, як яна, бедненькая, у тое Хвошна пойдзе». А калі ўбачыла, што карова матае галавою, раве і не хоча ісці,— заплакала: «Навошта яны, ірады, прадалі яе».

Кагадзей прыслухаўся, агледзеўся навокал, зноў прыслухаўся і зноў агледзеўся. А потым зірнуў на мяне:

— Паслухай, Юра, ці гэта я здурнеў, можа, ці што, але мне здаецца — недзе ходзікі чакаюць. Паслухай...

Во... Чак-чак, чак-чак... Гадзіннік у лесе — нічога не разумею... Можа, міна якая?

Я засмяяўся і пачаў раскручваць плашч — дастаў будзільнік. Калі яшчэ я толькі збіраўся ў Віцебск, маці прасіла мяне купіць новы будзільнік, але каб абавязкова добра чакаў — з ім зімою, доўгімі вечарамі, як і з кацянём, якое вуркоча ля боку, весялей. Вось я і выбраў такі — з «чакам». Чакаў ён моцна, і таму нават у аўтобусе, якім я ехаў з Віцебска, усе, калі рабілася ціха, падазрона пачыналі азірацца па баках: дзе гэта і што так чакае? Калі я паказаў Кагадзею будзільнік, ён таксама ўсміхнуўся:

— Напалохаў ты мяне, Юра. А я ўжо думаў, дурнею, ці што.

Цімоха зняў шапку і паклаў яе на суседні пянёк — цяпер і той, як Кагадзей, быў падобны на дзядка-лесавічка.

— Яно, Юра, не падумай, што я ўжо такі палахлівы. Нішто мне, павер, не страшна, а калі ўжо чаго я і баюся, дык гэта адных, можа, толькі жаб. Мяне неяк адна жаба ў маленстве напалохала. Я малы быў, узяў саломінку і — кольк яе, кольк! А яна — такая ўжо рапуха — усё надзімаецца, надзімаецца, як гумовая. А я ўсё — кольк, кольк! Яна надзьмулася, як рэшата зрабілася, а тады — страхапудзіна гэткая — на мяне раптам як скокне. Дык я і паваліўся са страху. З таго часу рапух мне і не паказвай — за вярсту абыходжу. А так нічога не баюся.

Але баяўся Цімоха яшчэ і змей. Расказвалі, як ён ля Вархоў ледзь не пад нагамі ўбачыў змяю. Быў якраз з віламі — ішоў стагаваць сена. Наперадзе гаманілі вархоўскія жанчыны. Дык ён як закрычыць:

— Наце вам, бабы, хутчэй мае вілы ды каліце яе, а то ж я босы!

Жанчыны завярнуліся, прыбеглі, ухапілі ў яго вілы, лоўка накалолі змяю на рагі і толькі пасля агледзеліся, што яны ж і самі босыя...

Цімоха павярнуўся і зноў зірнуў на будзільнік.

На галаве ў Кагадзея, сюды бліжэй да левага вуха, няспынна пульсаваў, як цемя ў немаўля, невялікі лапік скуры. Цімоха перахапіў мой позірк, убачыў, што я гляджу на яго, і сказаў:

— Гэта, Юра, рана. Басмачоў я некалі малады ганяў. Вось адзін і секануў шабляю. Тут і зараз касці няма — храшч адзін.

Каля рота ў яго таксама вялікі шрам, які ідзе аж да шыі. Гэта ўжо конь, запрагаючы якога Кагадзей сагнуўся

за дугою, ударыў яго капытом. У Жыцькаве смяюцца, што тады конь пераліčыў Кагадзею зубы і, відаць, знайшоў лішнія, бо некалькі выбіў,— і зараз, калі Цімоха шчыра смяецца, у роце відна шчарбіна.

— Я і ў гэту вайну яшчэ ваяваў. Толькі вайна пачалася, мабілізавалі нас, уручылі мне пакет — вязі, Кагадзей. Кагадзей і павёз. Прыязджаю туды, а там ужо няма нікога. Я пахадзіў-пахадзіў, пакет — за пазуху, зашпіліў гімнасцёрку і назад. Прыходжу ў сваю часць, а там ужо таксама нікога няма. Салдаты і кажуць: «Вядзі нас, Кагадзей, мы ў акружэнні». А я ж старшы сяржант — трэба весці. І павёў. З двух акружэнняў вывеў, а потым усё ж у палон трапіў. З пакетам тым. Во панасіўся я з ім!

Я ведаў, калі маўклівы Кагадзей разгаворыцца, то ён, вядома, зачэпіць і міжнароднае становішча, і крыху пафіласофствуе. І праўда, хутка ён дайшоў да Чылі: відаць, гэтая трагедыя, што адбылася там, хвалявала і яго:

— Вот ты скажы мне, Юра, як гэта можна: народ выбраў сабе ўрад, народ паставіў, а яны вінтоўкі ў рукі — шах-бах! — і гатова дзела, страляюць: міністраў страляюць, прэзідэнта забіваюць. А гэты іхні генерал — дык наогул дурань нейкі. Ён жа кажыць, што калі нада будзіць з усім народам ваяваць, дык ён і ўсяму народу вайну абвесціць. А салдаты? Там жа ёсць і сыны тых, каго ў турмы піхаюць. Значыць, сыны з бацькамі ваююць?.. Хаця гэта ўжо і не нова — было і такое...

Пазней загаварыў пра Сусвет.

— Ты ведаеш, Юра,— філасофстваваў Кагадзей,— я вот ніяк не магу дадумацца, што нідзе канца свету няма. Не можа ж быць. Ну вот за гэтымі зоркамі — тыя, за тымі — яшчэ... І што, няўжо так бясконца? Не, недзе ж нейкая мяжа ёсць, дзе ўжо нічога няма. А што гэта такое — нічога? Паветра? Дык і яно ж дзесьці павінна кончыцца. Пустата? Але ж і на пустату канец павінен быць. Дык, Юра, во так як пачнеш, бывае, думаць, разбірацца, што свету канца няма,— аж галава забаліць. А як удумаешся яшчэ, што, можа, чалавека далей ніякага няма, толькі на зямлі жменька гэтых людзей,— аж холадна зробіцца, аж завыць, як таму ваўку, ад страху захочацца... Ці, зірні сюды, вось паветра. Ты разумееш, Юра, мы ж усе адным паветрам дыхаем. Скажам, яно толькі што ў Амерыцы было, а праз нейкі час — тое ж паветра ўжо над Жыцькавам. Ім пазаўчора нейкі мільянер дыхаў, а зараз я, Кагадзей. А калі во так во ўздумаеш, што тваім паветрам некалі

Піначэт дыхаў, дык аж выплюнуць той глыток хочацца і нават рот абцерці.

Калі Кагадзей разгаворыцца, яму толькі не трэба перашкаджаць. Ведаючы гэта, я сядзеў і адно падтакваў, не перабіваючы старога. Я не перабіваў яго думак, калі ён нават маўчаў. І Кагадзею гэта, відаць, падабалася.

Ён памаўчаў, а потым — мусіць, холадна зрабілася галаве — надзеў шапку, насунуў яе як не па самыя вочы і спытаў у мяне:

— А вось ты, Юра, ніколі не задумваўся, як гэта на зямлі зроблена так, што ўсё жывое само сябе есць? Чарвяка есць птушка, птушку — звер...

Сваёй думкі ён не закончыў, змоўк і пачаў закурваць. Цімоха шамацеў паперашо, скручваючы цыгарку. У маім плашчы гулка чакаў будзільнік. Па тым як Цімоха гаварыў са мною, я зразумеў, што яго нешта хвалюе і гэтае «нешта» ён беражэ напаследак. І вось, закурыўшы, Кагадзей нарэшце дайшоў, мусіць, і да яго:

— Прыкладам, Юра, вось зайшоў гэты чорт з балота да Шыбекаў, калі мы Піліпавых генералаў праводзілі. Ты недзе падумаў тады пра нас: «Во якія злыя, чэрці...» А думаеш, мы б яго за стол з сабою не пасадзілі, калі б ён, Галашонак гэты, чалавекам быў? А то ж яны з Ручалём панарабілі тут у вайну. Ды во і зараз ён асабліва, бачыш, не саромеецца. Пазаўчора прыбягае да мяне ранічкаю Моця і як не плачыць: «Цімоха, нехта ўсе мае памідоры абабраў. Яны ж ужо чырванабокія былі, я ж іх спяліла дачушцы маёй з зяцем». Пайшоў да яе ў агарод, паглядзеў, а і праўда — памідорнік зялёны стаіць, рагулькамі падпёрты, акуратненькі такі, а памідораў няма. А на зямлі вялікія сляды ад ботаў. Я тады Моці і кажу: «Яно, Моця, каму ж твае памідоры з жыцькаўцаў трэба? Толькі ж, відаць, адзін чалавек такі галадаючы ёсць, ды і той у Вархах жыве». А яна стаіць і плача. Ледзь супакоіў: «Кінь ты, кажу, Моця! А то ты па гэтай памідорыне бядуеш горш, чым Цытнячыха некалі па карове, якую няруп забіў».

Ён перадыхнуў і, павярнуўшыся, лепей умасціўся між карапёў.

Заўсёды, калі Кагадзей гаварыў пра Моцю, голас яго мяняўся. Казалі, у іх, маладзейшых, былі нейкія свае таіны — Волька бегала тады за імі з прутом, сварылася з Моцяю і сачыла, каб брыгадзір не пасылаў іх разам на работу. А яшчэ казалі, што Моціна Зіна — яго, Кагадзе-

ева, дачка. Але ён вёў сябе зараз вельмі роўна, аднолькава з усімі, не даваў ніякай прычыны для плётак, і таму нельга было зразумець, праўда гэта ці не.

— Мне ён, Юра, таксама нагідзіў душу, Галашонак гэты. Разам са сваім дзядзькам. Прыходзіць неяк да нас дадому паліцай адзін млынароўскі, зусім яшчэ пацаня,— з вінтоўкаю, у патранташах — і пытае ў Волькі: «Ці ў хаце Цімоха?» Бачыш, я яму ўжо як раўня, нібы мы з ім рэхву разам качалі — Цімоха... А я тады якраз быў з плену прышодшы. Ну, Волька і кажа: «У хаце».— «Пакліч яго сюды». Я выйшаў. А на двары Галашонак стаіць. «Дык што ты, Кагадзей, гаварыў па мяне?» — «Нічога, Мікалай»,— адказваю. А ля яго — Ручаль, дзядзька, значыць, ківаецца, ужо добра такі п'яны, у зямлю глядзіць і злосна бубніць: «Гаварыў».— «А што я, Ляксандра, скажы, гаварыў?» — «Ты гаварыў, што Мікалай злодзей, карманшчык, п'яніца...» А пацаня ля мяне стаіць, таксама лоўка п'яны, дулам вінтоўкі так во пад носам у мяне водзіць — я аж чую, якое халоднае жалеза, калі яно да маіх губ дакранаецца,— і палец на курку дзяржыць. І таксама гаворыць: «Будзеш знаць, як абгаворваць паліцэйскую сям'ю». А ў самога па сабаку з рота валіцца. Галашонак паходзіць, паходзіць каля нас, а тады падыдзе, во так во рукою ўдарыць па дулу — тое і апусціцца троху ніжэй. Бачу я, у каго вінтоўка — у таго і ўласць. Я і кажу: «Мікалай, усе ж мы людзі, давай спакойна разбяромся, каму я гаварыў гэта». Бачу, у яго, хоць таксама п'яны, але ў галаве нешта заварушылася. Паглядзеў ён на Ручаля ды і пытае: «А і праўда, дзядзька, каму ён гаварыў?» А пацаня зноў дулам ля майго носа круціць. «Марфе з Аўдзейкава гаварыў»,— адказвае Ручаль, а на шыі ад злосці аж жаўлак у яго ходзіць. «Паехалі туды, разбяромся»,— закамандаваў Галашонак. Яны былі на веласіпедах — селі і паехалі. А мы з Ручалём па кустах ідзём. «Дык што ты, Ляксандра, хочаш ад мяне, скажы? — пачынаю я, ведаючы, што час няроўны: захочуць — застрэляць, і ўсё тут табе — і суд і права.— Ну выгнаў я, прыкладам, гэтай самагонкі, ну не паклікаў цябе, дык мы ж маглі з табою разабрацца па-суседску. А навошта ж ты так?» — «Так табе, камісару, і нада». Ідзём далей. Бачу, агніво на паляцы гаворыць. І так ужо, ці паверыш, захацелася ля яго пасядзець, вугалькі паварушыць — адчуў, што, можа, і ў апошні раз яго бачу. А мы па кустах зыбаемся. Яно, Юра, можна было б і сігануць у тыя кусты і ўцякчы —

ніхто б мяне нідзе не знайшоў,— але ж нельга: разумею, калі збягу, сям'ю гэтыя злыдні выражуць. «Напомні мае слова, Ляксандра,— кажу яму,— жысць мая, бачу я, на валаску вісіць: застрэліце вы мяне сёння, але праз год ці праз дзесяць застрэляць і цябе. І сам будзеш ляжаць там, дзе і я,— дацяўкаешся і ты». А ён маўчыць толькі ды сапець...

На елку, пад якою сяджу я, прыляцела нейкая непаседлівая птушка. Яна нешта вельмі бузавала ў лапках — на мяне толькі сыпаліся сухія сучкі, ігліца ды пажоўклыя лісты.

— Прыходзім мы, значыць, у Аўдзейкава. А Марфа тая ўжо кідаецца, плачыць: «Я нічога не чула, я нічога не ведаю, Цімоха мне нічога не гаварыў — я і Цімохі вашага, як ён нераехаў у Жыцькава, не бачыла...» Галашонак хоць п'яны-п'яны, але нешта, відаць, змікіціў і павярнуўся да Ручаля: «Ты, дзядзька, ідзі спаць, а ты, Цімоха,— і зірнуў на мяне,— ідзі дадому і не бойся». Самі селі на веласіпеды і паехалі.

Цімоха зацягнуўся, неяк дзіўна праглынуў дым і казаў далей:

— Я вот, Юра, ненавіджу фашыстаў, але яшчэ больш не люблю сваіх здраднікаў. Няхай ужо тыя звяры, ім жа ўсё чужое, а ты ж, зладзюга, свой чалавек, у каго ты страляеш? Яно ж і фашысты расстрэльвалі іх. Казалі, што калі ты прадаў сваіх, то прадасі і іх, чужынцаў.

Цімоха некалькімі наспешлівымі зацяжкамі дакурыў, не вымаючы з рота, папяроску, кінуў недакурак у ямінку, вытаўчаную ботам.

— А Ручаль такі ўжо яхідны быў. Дужа любіў на людзей паказваць. Ён жа і на цесця твайго пісаў. Бывала ж, яшчэ да вайны, яшчэ да таго, як Ласімовіч сам стаў старшынём, яны з Ручалём разам працавалі. Ручаль старшынём, а твой цесць — рахункаводам. Ну і злаваўся ж тады Ручаль: усе да Ананаса са справамі ідуць, а не да яго, хоць ён і старшыня, галоўны. Во ён і раззлаваўся на твайго цесця. Думае, пасаджу гэтага разумніка і самому лягчэй будзе. Тады і напісаў заяву. Мяне да сябе паклікаў, паўлітэрку паставіў. Выпілі мы, а тады ён ужо і заяву нясе. Але я не надпісаў. Ён і да Заморка яшчэ хадзіў, але і той, дурны-дурны, але розуму сабраў, каб не надпісваць. А Ручаль такі ўжо слізкі быў. У вочы дык, здаецца, без масла куды хочаш залезе, а зачы — як змяя. Цесцю

тваймү казаў: «Ты ўжо, Ананаска, садзіся на маё месца і праў маёй імперыяй». А тады, бачыш, што зрабіў.

Цімоха падняўся — спачатку павярнуўся на бок, потым абапёрся на шыпульнік рукамі і пасля ўжо ўстаў,— сплюнуў на недакурак, які ўсё яшчэ дыміўся ў ямінцы, і ўгледзеўся некуды ўдалячынь — туды, за елкі, за алешнік, за пагоркі. Сухі скурчаны лісток выпаў з вусоў і, кружачыся, ціха сеў ля яго ног.

— Ён і на Наіна, на немца гэтага, даносіў фашыстам: «Як гэта, я ніяк не пайму, ён просіць у людзей, нібы жабрак, а не забірае». І самога Наіна вучыў: «Ты адбірай». А той: «Наін» — і ўсё.

Кагадзей узяў сякеру, заткнуў яе за рэмень, якім была перацягнута фуфайка.

— А ты ці ведаеш, дзе Наінава магілка? — зірнуў ён на мяне.

— Не.

— Я табе пакажу.

І Цімоха павалюхаўся, па-качынаму пераварваючыся з нагі на нагу. Я, цаляючы як не след у след, пайшоў за ім.

— На тым месцы, куды мы з табою ідзём, да вайны стаяла вёска Высокае. Была яна, Юра, невялікая — двароў, можа, з дзесяць усяго, стаяла на грудку, амаль у лесе. Ну, партызаны ў ёй часта бывалі. Вось аднойчы ўвесну і прыехалі фашысты караць Высокае смерцю. Сонца свеціць, салаўі пяюць, а людзі галосяць. Жудасна! Я-то сам не чуў — гэта мне потым расказвалі. Але як і расказваюць, усё роўна валасы дыбам падымаюцца.

Ён адхінуў галінку, патрымаў яе, пакуль прайду я — каб не ўдарыла.

— Эсэсаўцы хаты паляць, людзей у адрыну сілком запіраюць. А тут якраз з лесу на высокаўскую вуліцу Наін выехаў — сахарын мяняць ехаў у Высокае. Едзе і на гуслях іграе. Так заняўся сваёю ігрою, што нічога вакол сябе не бачыць. І раптам узняў галаву і аж аслупянеў на сваім коніку — не зразумела было, ці то ён сядзіць, ці то стаіць. Упершыню, відаць, повад пацягнуў, каня спыніў. Стаіць і глядзіць: во тут ён, відаць, і крыкі пачуў, і стрэлы і, як нават хаты сухія ў агні трашчаць, пачуў. Злез ён і да адрыны бягом. Дзяцей там пахапаў, адпіхнуў ад адрыны, накапаўся ў торбе, сваю абгарэлую ляльку выняў— без валасоў, без брывоў: акурат з пажару выхапленая,— у рукі малым яе совае, а тыя, дурненькія, і сціхлі, і гуля-

юць. А эсэсаўцы рагочуць — няхай пазабаўляецца «думконф». А пасля, калі яны пачалі дзяцей зноў у адрыну заганяць, Наін упёрся і не аддае іх. А каго вырвуць эсэсаўцы, дык ён за рукаў схопіць і зноў у свой гурт цягне. Тыя сабе дзяцей ірвуць, а ён сабе. «Наін!» — адно толькі нетым голасам крычыць. Валтузіліся, валтузіліся з ім эсэсаўцы, а тады адзін як загергеча са злосці, адпіхнуў ад сябе і дзяцей і Наіна, адбегся і як паласне па іх з аўтамата...

Мы прыйшлі ў былое Высокае. Тут раслі яшчэ вішні, якія некалі стаялі пад вокнамі хат, шумелі яблыні, якія калісьці раслі ў садах.

На тым месцы, дзе была адрына, узвышаўся голы і шэры, як комін, абеліск. А побач — дагледжаная магілка са звычайным сялянскім крыжам, які трэснуў якраз там, дзе былі збіты два абчасаныя бярвенцы. Да крыжа прыбіта пафарбаваная дошчачка, на якой нехта не зусім роўнымі літарамі напісаў адно такое вядомае ў гэтых мясцінах слова — «Наін».

Мы знялі шапкі і стаялі моўчкі. У гэтай цішыні вельмі ж ужо гулка і сапраўды трывожна ціктакаў будзільнік...

Калі я ішоў дадому, сонца ўжо заходзіла: яно бегла па самаму небасхілу, далёка за дрэвамі, перабягаючы ад хвойкі да бярозкі, ад бярозкі да алешыны, ад алешыны — да новае хвойкі.

Ля Мамонаў ціха-ціха шумеў цягнік — на добрае надвор'е.

## 9. СЦЕЖКА ДА КРЫНІЦЫ,

***якая ніколі — з вадою і без вады —***
***не здоўжвалася,***
***бо на ёй заўсёды хораша думалася***
***і лёгка ішлося***

Камбайны ўжо другі дзень жалі ля Жыцькава ячмень.

Яшчэ з самай раніцы было чуваць, як фыркаюць яны, нібыта коні, на ўзмежках, як ляпаюць ля іх ключамі камбайнеры — усё даводзяць, направуляюць, каб не спыняцца потым удзень,— але жаць пакуль што не пачынаюць: жнівеньскія ж раніцы вельмі росныя — калі наспяшаешся, дык і намалоціш сырога.

Сёння таксама па-рабочаму загуркаталі яны толькі тады, калі спала раса і каласы, падсушаныя сонцам, хілячыся то ў адзін, то ў другі бок, спела зашурхацелі пад лёгкім ветрам.

Першы камбайн, які пераехаў з далёкага, зжатага поля, заняў палосу ля самай дарогі ў старое Жыцькава, не спяшаючыся, але неяк хутка, ішоў гэтаю акрайкаю, міжвольна паўтараючы ўсе звівы і завароты дарогі, і вельмі ж ужо пыліў — здавалася нават, што яго знарок наслалі сюды, каб ён шырокімі лопасцямі павыбіваў з ячменю пыл, які цэлае лета асядаў на каласы.

Камбайны, што жалі далей ад дарогі, такога пылу не рабілі — за імі паволі ішло, крыху адстаючы ад іх, невялічкае шэрае воблака, якое заўсёды бывае там, дзе малоцяць.

Па зжатаму жвава насіліся сюды-туды блакітныя «Беларусы» з начэпленымі на іх стагакідамі, бегалі як ашалелыя ад прастору і, мусіць, ад радасці, што вось зараз па ржышчы можна ехаць куды захочаш. Адны і задам і передам сунулі да стога акуратныя копкі саломы, што асталіся пасля камбайна, а другія,— яны стаялі ля стога,— бралі салому доўгімі ўчэпістымі пальцамі і, узняўшы высока над сабою, падавалі на стог — людзям, што гаварылі наверсе, не было нават чаго рабіць: яны адно толькі выбіралі сабе цішэйшае месца і глядзелі, каб салома не закідала іх саміх.

Уз'ехаўшы на ржышча з канём, сядзеў на калёсах брыгадзір і, задзіраючы галаву ўгору, спакойна глядзеў, як стагакід лёгка падае на стог цэлую сцірту саломы.

— Прывітанне інтэлігенцыі!

Віцька Пруцень, ці Мядзяк, як яго называе Андрэй, падаў мне руку, але, вітаючыся, глядзеў не ў мой бок, а на камбайн — быццам бы мяне і не бачыць. Побач лёгенька, нібыта жывая, уздрыгвала і ледзь чутна татахкала незаглушаная грузавая машына.

Я, каб прывітацца, узяў вёдры за почапкі ў адну руку — яны, стукнуўшыся бакамі, глуха забрынчалі.

— На ваду, га? — усё яшчэ гледзячы на камбайн, пытаўся Пруцень.

— Што я іду па ваду, то гэта не дзіва,— крыніца ж у тым баку. А вось чаму тут ты, ды яшчэ з грузавою машынаю? А хто ж Каранькевіча возіць?

— Каранькевіч і сам сябе добра возіць, га. Паклікаў, брат, мяне і кажа — сядай, Віцька, на грузавую, будзеш

ад камбайнаў зерне адвозіць, а я і сам паезджу. Цяпер жа жніво.

— І на ўсё жніво?

— На ўсё, брат, га. Ды я і не крыўдую — тут жа капейчыну лішнюю заробіш. У нас жа ў канцы жніва Караньневіч яшчэ пажніўныя плаціць. Па сто пяцьдзесят — дзвесце рублёў хлопцы палучаюць.

З яго слоў я і не зразумеў — ці Караньневіч паслаў яго на грузавую машыну таму, што ў жніво не хапае шафёраў, ці таму, каб і яго шафёр троху зарабіў пажніўных.

— А мы, брат,— хваліўся мне Мядзяк,— бывала, тут з Андрэем на «Універсал» сядзем, гэтае поле — шахшах! — і ўзаром, га. О, брат, мы тады з ім рабілі! А як я брыгадзірам быў, дык, брат, бывала, і сонца зойдзе, а мы ўсё гэтае поле аром.

Пра тое, як яны з Андрэем урабнялі вось гэтае поле, я прамаўчаў — ведаў, што яго разаралі толькі недзе гады са тры назад: прыйшоў бульдозер і пазасыпаў траншэі, ямкі ад бомбаў, зямлянкі, якія абваліліся яшчэ тады, калі з іх падаставалі бёрны. А да гэтага яны травелі, горбіліся на колішнім полі, і глядзець на іх было неяк нязвыкла, страшнавата, нібыта і да сёння ў іх перагуквалася хрыплымі галасамі салдат вайна.

— А потым яшчэ ноччу мы з Андрэем вось гэтую хату дарублівалі. Лерка што — хату склаў, мяшок жыта на плечы і пайшоў сабе ў Лахі. А мы з Андрэем даводзім, абсаду робім, дошкі габлюем.

Матор, які працаваў на малых абаротах, на халастым ходзе, раптам скалануўся, што аж забрынчаў капот, і сціх — нібы памёр.

— О, чорт рагаты,— узлаваўся Мядзяк і палез у кабіну...

Гэтую дарогу да крыніцы я палюбіў даўно і таму штодзень, не пытаючыся ў маці, ці трэба вада, спаражняю вёдры, разліваючы, што было ў іх, па катлах, і выходзіў на сцежку ў старое Жыцькава.

Далёка-далёка, аж пад самыя Млынары і потым — далей і далей ад іх,— гарбацяцца, узнімаючца адзін з-за аднаго пагоркі, парослыя кустамі, а то і сапраўдным алешавым лесам. Да вайны — пра гэта гаварылі і маці, і Андрэй, і іншыя — аж да самых Млынароў былі лугі і чыстыя, разараныя палі — ні кусточка на іх,— і толькі за Млынарамі сінеў вялікі лес, які недзе ўсярэдзіне схаваў у сабе балота, куды жыцькаўцы хадзілі ўвосень па жура-

віны. Пасля наступлення — пра гэта тут усе помняць — палі былі ўсланыя мёртвымі салдатамі. «Адзін на адным ляжалі,— успамінаў Кагадзей.— А што над Высокім ужо было нанабівана, дык не прайсці...»

Справа на ўзмежку, у траве, зырка вырачыўшыся, глядзяць на сонца позпія, запыленыя рамонкі і пабляклыя васількі, над якімі на зямлі ажно сіне ад апалых пялёсткаў. Сям-там яны, нізенькія, сінеюць і ў іржышчы — камбайн пратарахцеў недзе над самымі іхнімі галоўкамі.

А леваруч — траншэі, ямкі ад снарадаў, акопы. Можа, менавіта вось тут, у гэтым акопчыку ля дарогі, пехта, слухаючы нашу артпадрыхтоўку перад боем, жыў, дыхаў апошнім сваім днём, апошняю сваёю гадзінаю, а то і хвілінаю. А калі той, хто сядзеў вось тут, чакаючы атакі, застаўся жывы, то ён, вядома ж, і наяве, і ў сне вельмі часта бачыць тое восеньскае Жыцькава, бачыць свой, можа, вось гэты, акопчык, адчувае над самым сэрцам той снарад, які ўзарваўся тады ж ля акопа (вось тая яміна), помніць гэтыя пагоркі да Млынароў — відаць, толькі да Млынароў,— бо менавіта Млынары іх батальён і павінен быў браць...

Побач гудуць правады, што на слупах цягнуцца да Ганкінай хаты. Ім ужо чагосьці не стае: гляджу і не магу зразумець чаго.

Вось і ручай. Ён блізка падыходзіць да Дубоўкі, і таму дзіўна робіцца, што не ўпадае ў яе, а раптоўна кідаецца ўбок і зноў цячэ, толькі ўжо зараз — ад ракі.

У Жыцькаве стала сумнавата. Паехаў ужо ў Талін Андрэй — туды, дзе ў яго ёсць свой звыклы свет, свае штодзённыя знаёмыя: Латушка, які купіў машыну і паспеў ужо цюкнуцца ёю ў печы багажнік; Латушкава жонка, якая ўсё хваліцца: «Я прыгожая, я гордая»; Міша і Валія, якія абое радуюцца, што Ён працуе ў порце.

Сумна зрабілася без Андрэя. Я хадзіў і па двары, і па кустах, але ніяк не мог знайсці сабе занятак. Так заўсёды бывае, калі нейкая суполка рассыпаецца. Пакуль звыкнешся з новым станам, пакуль забудзешся, што амаль усюды хадзілі разам.

Сумна мне, а як тады самому Жыцькаву, дзе ўсё лета столькі гасцей, гаманы, смеху, як яму тады, калі параз'язджаюцца адсюль дарослыя і дзеці і калі ў хатах стане да жудасці ціха — сваіх жа малых дзяцей Жыцькава не мае...

Я ўявіў сабе Жыцькава цёмнай глыбокай восенню, ка-

лі раніца і вечар амаль сыходзяцца разам, да непазнавальнасці сціскаючы такі доўгі ўлетку дзень; калі раншні, нудны і халодны, восеньскі дождж, што аднастайна шапаціць над нагалелым полем, незаўважна пераходзіць у вячэрні,— словам, уявіў Жыцькава такім, якім я ніколі яго не бачыў, уявіў маці, адну, сцішаную, з вядром у руках, вось на гэтай самай, толькі ўжо па-восеньску раскіслай, раствапелай сцежцы, і мне неяк само сабою падумалася: а можа, і не варта было маці адмаўляць таму прыстойнаму дзеду з Хукалаў, які сёлета неўспадзеў прыходзіў да яе сватацца...

Дзед быў няспешлівы, паважны, спакойны. Відаць, гэтае сватанне меў ён за звычайны жыццёвы клопат, бо асабліва і не прыбіраўся, не выфранчваўся, не прыгладжваўся — хіба толькі крыху вышэй, па-маладому, падкруціў свае доўгія, сівыя вусы, што такія белыя бываюць, мусіць, адно ў некурцоў.

Андрэй, каб не замінаць размове, узяў сякеру і пайшоў у алешнік — па жардзё. Хлапчукі ж наадварот пераселі бліжэй — сядзелі і ўважліва слухалі старога, які можа стаць іхнім дзедам.

— У мяне ж і хата большая, харошая, і карова, дзве авечкі ёсць. Мне нада, каб баба была ў хаце. Хай бы ўжо яна мне толькі ў печы прапаліла, карову падаіла ды, не сакрэт, прысцірнула што якое. А так жа я ўсё сам раблю. Толькі мне ўжо, не сакрэт, надакучыла.

— А ты думаеш, мне не надакучыла есці варыць? — усміхнулася маці.— Я, можа б, і сама рада была, каб хто ў печы прапаліў...

— У мяне ж тры гады другая жонка хварэла. Дык я і гаспадарку глядзеў, і яе. І ўсё адзін...

Дзед уважліва паглядзеў на маці.

— Як памерла першая жонка, дык я вось гэтую, яе сястру, узяў. А цяпер дык ужо, не сакрэт, і сясцёр больш няма. Во я і прыйшоў да цябе...

— А як гэта ты мяне знайшоў?

— А мне Лерка з Лах нараіў цябе.

Андрэй прынёс тым часам з кустоў жардзіну.

— Я ж нічога, калі і дзеці прыедуць,— знарок гучна, каб чуў Андрэй, казаў дзед.— Няхай прыязджаюць і на лета, і так сабе, калі хто захоча. У мяне ж, не сакрэт, нікога няма.

Калі маці адмовіла дзеду, Андрэй паспрабаваў пажартаваць:

— А я ўжо думаў, мы і заноіны тут згулясм...

У лагчыне зарыпела вялікая старая бяроза. Неяк ранейй я не зважаў на тое, як яна рыпіць. А тут раптам выразна пачуў — рыпіць, як птушка, як крук: к-р-р-у, к-р-р-у...

За лагчынаю — старое Жыцькава. Дзедава селішча. Камяні, што ляжалі пад вугламі. Камяні вялікія, а хата, па падмурку відаць, была маленькая. «Як прыйшла я ў тую хату, дык усім і ссці разам не было як — па чарзе палуднавалі»,— успаміпала маці. А гэты падмурак — першая бацькава хата: яе ён ставіў, як аддзяліўся. Таксама невялічкая, але ўжо не на камянях, а на штандарах: калоды пагнілі, пашчапаліся і стаялі зараз па вуглах былой хаты — як пні. Вішні, што раслі, мабыць, пад вокнамі, хоць іх ніхто цяпер і не даглядае, не перарадзіліся і спелякць хоць няшнога, але ўсё ж колькі жменяў вішань. Вішняк наабламаны знізу — Стахванаўна ламала вішанне і заварвала ім у чыгунку «чай».

А вунь злева, у Гапкіпым агародчыку, сумна буяюць жоўтыя вяргіні. Вяргіні заўсёды наводзяць на мяне нейкі сум — яны ж цвітуць позна і таму напамінаюць пра восень, пра адцвітанне. Яны ж, пэўна, і апошнія кветкі ў агародчыках...

Хата Стахванаўны. Трошкі ніякавата, што ўваход на двор закладзены жардзінаю, што ніхто яе не ссуне, не патрывожыць — як паклалі тады, калі вынеслі старую, так яна і ляжыць. Ніякавата, што ля хаты няма нікога — ні кураня, ні парася. А яшчэ ж нядаўна, хоць Гапка і хварэла, у яе былі і карова, і свінка, і куры.

Памятаю, ідучы, як і сёння з вёдрамі па ваду, я стрэў бабку Гапку ля гэтае самае — тады яна была адсунутая — жардзіны. Стахванаўна, праставалосая, з нейкаю хусцінкаю на маршчыністай шыі, у блакітнай кофце ў белую дробненькую кветачку, у даўгім і лёгкім андараку, з-пад якога толькі і відаць былі ступні босых ног, узіралася з-пад рукі туды, дзе паміж Млынарамі і могільнікам заходзіла сонца.

— Зірні,— паказала і мне,— які кароткі дзень стаў. Сонца ўжо, бачыш, бліжэй да могільніка заходзіць. А летам жа — уга! — як далёка ад яго садзіцца.

Сівыя валасы, не сабраныя разам, вольна веяліся на ветры, і мне чамусьці зусім недарэчы прыйшло ў галаву, што гэтыя валасы бабкі Гапкі зараз вельмі ж ужо нагад-

ваюць валасы караля Ліра — расхрыстанага, растрапанага, у хвіліну сваёй найвялікшай крыўды і бездапаможнасці.

Стахванаўна расказала мне, што яна дужа захварэла — «во тут во, у грудзёх, усё нешта сядзіць: памру, відаць». Я пачаў яе супакойваць, суцяшаць, што яна яшчэ паправіцца, і старая спачатку, як мне здалося, з надзеяю ўхапілася за мае словы:

— А што, няўжо, сынок, думаеш, папраўлюся?

Але гэта, відаць, здалося. Бабка Ганка, мусіць, усё разумела тады і таму ўпэўнена адказала — і мне, і сабе самой:

— Не ўжо, дзетка, не папраўлюся. Мне ж ужо восемдзесят гадкоў...

І, трымаючыся за плот, павольна, асцярожна сунучы па траве ногі, пайшла да сенцаў...

Хата накрыта толем. На стыках, дзе сустракаюцца дзве палосы — акуратненькія рэечкі: іх летась прыбіваў Малашай. Пасярод ляжаць два лісты шыферу — відаць, там добра цякло. Дзіркі ў франтоне пазабіваны дашчэчкамі ад пасылак — адрасы павыліналі, зацяклі і расплыліся ад дажджу. Каля хаты ціха-ціха. А раней жа ідзеш — дык усё чуваць, што ў хаце ёсць жывы, хоць і хворы, чалавек — Ганка то з катом сварыцца, то сама з сабою размаўляе, то лаўкі соўгае.

За хатаю — агарод. І неяк крыху ніякавата, што гаспадыні ўжо няма, а яе агарод усё яшчэ жыве.

Прайшоў уперад і ўбачыў Вольку — яна за хатаю жала невялікі лапік ячменю, які ўжо і сеяла не Стахванаўна, а Кагадзей.

Хата стаіць на самым высокім у старым Жыцькаве месцы. Адсюль трэба звярнуць управа, збочыць на сцяжынку, якая ідзе па ржышчы, і — уніз, уніз, стрымліваючы сябе, каб не пабегчы, дайсці да ручая, што, абагнуўшы былую вёску, вяртаецца сюды, пад крыніцу.

Падумалася, што з поўным зараз будзе лягчэй ісці — ячмень тут зжалі, і таму не трэба, як гіры, падымаць уверх на выцягнутых руках цяжкія вёдры: каб не нападала ў ваду асцюкоў. Раней жа, як высока ні падымаў, усё роўна іх хапала ў абодвух вёдрах — ці ветрам нанасіла, ці ўсё ж вядро дакраналася да каласоў.

Тут, у гэтым ручаі, калі пачалося наша наступленне, бацька і маці рашылі перасядзець бой. Андрэй расказваў пра гэта:

— Як толькі нашы выбілі немца з Жыцькава, ну, усе

ў адступленне, у тыл паехалі. А нашы ж разумныя — куды мы паедзем, ноч якую перасядзім у ручаі, а тады немца далей напруць. Правільна я гавару? Вось сядзім мы ў гэтым ручаі — так сказаць, у нейтральнай паласе. Цераз нас нашы лупяць з усіх гармат, і немцы ім адказваюць. Страшна сядзець, нічога не чуваць — толькі агонь зверху ляціць. А яшчэ бацька бліжэй, у Цыганку, хацеў хавацца. Там пазмясіла ўсё на свеце. Сядзім мы ўнізе ў кустах, дрыжым. Раптам мама павярнулася, толькі «айё!» паспела сказаць і асунулася ад страху. Мы падпялі галовы — аж высока над намі па беражку немцы — чалавек з дзесяць — бягуць. Сталі яны, аўтаматы на нас панавялі, пагергеталі нешта, пагергеталі і далей пабеглі. А што ім было, скажы, на нас паласнуць? Правільна я гавару? Позна ноччу нашы разведчыкі да нас прыходзяць. «Ну як вы тут,— смяюцца,— на перадавых пазіцыях?..» А мы ж у ручаі з кароваю. Каня ў нас не было, дык мы на Цытнячышыным прывезлі сюды сёе-тое. Ну, мама карову падаіла, малака салдатам наліла, а яны нам увесь свой шакалад аддалі. І пайшлі далей. А мы пасядзелі-пасядзелі ў гэтым пекле ды ноччу рашылі ў тыл выбірацца. Толькі на гарушку выехалі, а наш конік (не, не наш — Цытнячышын) — хоп! — і паваліўся ў аглоблях. Снайпер, відаць. Мы свае хатулі на плечы — ды ходу. Аж у Марчанкі адступілі. Там у нейкі нямецкі бункер усяліліся. У ім бацька і намёр — ці то ад спужання, ці то ад хваробы: у яго ж нешта з пячонкаю было... А так ужо быў высах — я, хлапчук, яго, як малога, на руках насіў... Разумееш, можа, таму я і па ваду сюды не люблю хадзіць: як толькі прыйду — адразу ўсё ўспамінаецца. Глядзіш і разумееш, колькі разоў перажыў сваю смерць. Правільна я гавару? Вось, скажам, паласні тыя немцы па нас. Ці тая куля, што Цытнячышынага каня забіла... Ды колькі яшчэ такога было за вайну...

Я ступаў па ўтаптанай сцежцы між іржэўніку, зверху глядзеў у лагчыну і таксама, як і Андрэй, амаль фізічна адчуваў, як страшна было ім сядзець тут — між двух агнёў.

Акурат на самой сцежцы — копка саломы, настаўленая камбайнам. Я абыходжу яе не першы — ужо колькі ног, лёгка ідучы па ваду і цяжкой — з вадою, абыходзілі яе вось тут, злева: з краю паспела ўжо ўтаптацца ў зямлю пацярушаная, паплюшчаная салома.

Светлае, як паламаныя і паскіданыя ў стажок промні, свячэнне свежай саломы. Цёплы пах яе, у якім сабраліся разам пахі зерня і сонца, ветру і зямлі. Ласкавае, шчыкатлівае дакрананне пацёртых саломінак да голых, крыху агрубелых за лета ступнёў: нават адчуваеш, як, слізкія, яны ўгінаюцца пад нагамі.

І так ужо захацелася паваліцца ў салому, разварушыць гэты акуратненькі, чысценькі стажок, а потым сцішыцца, супакоіцца і ляжаць ціха-ціха, не здуваючы нават саломіны, якая казыча губы.

Але ля камбайна вунь гавораць людзі, Мядзяк стаіць ля машыны і глядзіць у мой бок, у загародцы ходзіць жанчына (усе астатнія паехалі ўжо ў Лахі) і вешае на згароду памытыя бітоны, у матчыным агародзе ўзмахвае жменямі ячменю Волька: самой яе не відно, але калі на той час разагнецца — убачыць. І потым будуць смяяцца: «Зірніце, Надзёжын заяц паваліўся ў салому і адзін, як конь па раллі, качаецца».

Крыніца была рубленая. Да дошкі, прыбітай да апошняга вянца зруба і мокрай ад вады, папаліпалі белыя парашуцікі з цёмна-карычневымі крапінкамі зярнятак — цяпер самае вялікае рассяленне розных дзікіх траў: насенне павыспявала і зараз спяшаецца як мага далей адляцець, там прызямліцца, зачапіцца за што-небудзь, а потым прарасці, пачынаючы па новым месцы сваю, новую калонію асоту, дзядоўніку, малачаю. Тыя, якім усё ж удалося вырвацца на сушэйшае, ляжаць на дошцы і, бы заземленыя зярнятамі, толькі пухам пераваьваюцца з боку на бок і чакаюць мацнейшага ветру, які змог бы іх падняць і, не зважаючы на цяжар насення, панесці высока і далёка.

У крыніцу ўжо нападала пажоўклае лісце. Густа ўслана ім вада — на цёмным фоне яно глядзіцца вельмі ж хораша. Крыніца нізкая, вада ў ёй недалёка, а таму даставаць яе лёгка: абагнуўся цераз зруб, расхінуў у бакі лісце, зачэрпнуў вядром, каб яно аж па самыя вушкі схавалася ў вадзе, і вось ён, той чысты крышталь, ад якога, бывае, у летнюю спёку не адарвацца: зубы заходзяцца, рукі млеюць трымаць навыцяжку цяжкое вядро, а ты, здаецца, усё піў бы і піў, ніяк не наталяючы смагі.

У крыніцы вельмі смачная вада — таму ўсё Жыцькава ходзіць сюды, у такую далеч, не шукаючы новай пітной вады дзе-небудзь бліжэй да сваіх хат. А калі Вобадаў ля крыніцы загадаў рабіць летнюю выгарадку для калгас-

ных кароў, жыцькаўскія жанчыны падпялі гвалт і пабеглі да мужчын, якія абгароджвалі летні лагер.

— Што гэта, вы паасляплі, ці што? — сварыліся яны там.— Пад самаю нашаю крыніцаю хлеў робіце. Гэта ж увесь гной у нашу ваду пацячэ. Што вам, поля не хапае, ці што?

— А чаго вы на нас крычыцё? — апраўдваліся мужчыны.— Нам паказалі, дзе колікі забіваць,— мы і гародзім.

— Дык вы ж хоць пасуньце сваю згароду туды, пад ростані.

— Не можам — старшыня сам загадаў перавезці сюды жэрдзе.

Але ўсё ж выгарадку перасунулі — прыйшоў у калгас Караньkевіч і распарадзіўся па-свойму.

Сёлета мы ўдваіх з Цімохавай Волькай чысцілі гэтую крыніцу. Кагадзеіха, папярэдне наламаўшы галінак на венік, паклала іх ля зруба і, сказаўшы: «Потым мне падасі»,— палезла ў калодзеж, у халодную крынічную ваду. Я памкнуўся быў лезці сам, але яна лёгка так адпіхнула мяне ад зруба:

— Ты ж не ўмееш. Лепей я сама,— і шухнула, нібы ўвалілася, у крыніцу.

Стоячы як не па самую шыю ў вадзе, Волька чэрпала вядром і падавала яго мне. Я толькі выліваў ваду: адыходзіў далей ад крыніцы і зліваў яе ў ніжэйшае месца, каб вада зноў не плыла ў калодзеж. Па меры таго як крыніца вычэрпвалася і з кожным вылітым вядром усё мялела і мялела, цётка Волька ў мокрым і цёмным ад таго пінжачку ўсё ўзнімалася і ўзнімалася над вадою — нібы вырастала з яе. Па яе пінжачку, па цёмным і роўным рубежыку, які рэзка, бы дзень і ноч, раздзяляў зруб (праўда, потым зруб запляскаўся і ўвесь зрабіўся мокры і цёмны), можна было бачыць, дакуль у ім была вада спачатку.

Вада ж у вёдрах, што падавала мне Кагадзеіха, спярша была чыстая, потым памутнела, а пасля ўжо ў вядры каламуцілася нешта вязкае, глеістае. Вядро пацяжэла, і ўвесь гэты глей не так скора выліваўся з яго — ён паволі сунуўся па сценцы вядра, спаўзаў на самы рубежык і тады толькі плёхаўся на траву.

Дабраўшыся да пяску, вычарпаўшы аж да дна гэты іл, цётка Волька папрасіла падаць ёй у зруб паламаныя галінкі і доўга шаравала імі сцены. Потым, пачакаўшы, пакуль пад нагамі збярэцца вада, зноў, паліваючы, церла

зруб. Калі Кагадзеіха вычарпала і гэтую брудную ваду, падала мне руку і, мокрая, няспрытна выбралася з калодзежа, на дне светла бліШчаў пясочак, а сцены зруба, мокрыя і чыстыя, пачалі ўжо нават высыхаць і дыміцца — як летам толькі што памытая, вышараваная да белізны падлога ў хаце.

Цётка Волька стаяла ля крыніцы і разам са мною моўчкі глядзела, як сочыцца між пясчынак вада і як у адным кутку, пад тоненькім слоем плытнай яшчэ вады, пульсуе і торгае, быццам нечаканая жылка на твары, маленькая завязь ручайка, як павольна, але настойліва надымаецца на зрубе вада.

Чысцілі мы з цёткаю Волькаю крыніцу пядаўна, а таму шчыра здзівіліся, калі перад ад'ездам Шыбекавых генералаў Кагадзей з вядром на руцэ, з якога густа тырчаў хвост веніка, пайшоў пад ручай, абыякава адказаўшы на наша пытанне: «Пайду крыніцу чысціць». Мяне гэта нават пакрыўдзіла — значыць, Кагадзей лічыць, што мы з Волькаю дрэнна пачысцілі яе, і ідзе папраўляць па-свойму... А Павел, калі Цімоха ўжо схаваўся за гарушкаю, на якой стаіць Стахванішына хата, падняўся і пайшоў быў за Цімохам:

— Трэба ж яму памагчы. А то крыўдаваць будзе. Скажа: «Столькі лбоў сядзела ля Надзёжы, а ніводзін не падняўся. Давялося мне, старому чалавеку, аднаму вёдры тыя цягаць».

Але Паўла перастрэла на дарозе Волька, якая ішла ад маткі:

— Агоў-агоў! Не ідзі ты, Паўлічак, за ім. Яму, злыдню гэтаму, памагаць не нада. Не крыніцу чысціць ён пайшоў — дужа б ты яго на гэта выпхнуў! То ж ён укінуў у ваду акуляры — толькі і пачуў, як яны боўтнулі. Дык во пайшоў даставаць. Вычарпае ваду, дастане акуляры — і ўся табе работа. А ты ўжо бяжыш...

Пакуль аднёс ад крыніцы поўнае вядро, лісты зноў сплыліся на сярэдзіну і зацягнулі ваду. Зноў давялося рассоўваць іх у бакі, каб набраць чыстае вады і ў другое вядро.

Аднёс вёдры крыху далей, пад іржышча, а сам вярнуўся да крыніцы і сеў на вялізны камень, што ляжаў зводдаль зруба: тут мне заўсёды добра і спакойна думалася.

З каменем гэтым мяне падружыла Вера. Яна, яшчэ зусім малая, пасля вайны пасвіла тут сваіх авечак.

— Зірнула я аднаго разу ў бок каменю і анямела са

страху: воўк! Паставіў, як сабака, пярэднюю лапу на камень і глядзіць на мяне. Хоць я і далёка была, а ўсё ж страшна зрабілася. Аж закрычала. Крычу, а голасу свайго не чую. Нарэшце, адчуваю, прарэзаўся голас. А воўк спакойна на мяне глядзіць — і ні з месца. Бачыць, што малое, і не баіцца. А тут маці пачула мой крык — яна якраз па ваду ішла,— вёдрамі забразгала, сама «ату!» пачала крычаць. Воўк яшчэ пастаяў, пастаяў, нехаця апусціў на зямлю нагу і спакойна так, як сабака, пайшоў у кусты.

Маці дадавала:

— Ён лоўка ж ужо стары быў. Зубоў у яго саўсім у роце не было. А авечак усё роўна душыў. Зловіць, задушыць, пастаіць над ёю — есці ж без зубоў не можа! — ды так, віхляючыся, галодны, і пойдзе назад у кусты...

Я сядзеў, абапёршыся ззаду рукамі на камень — можа, якраз там, дзе стаяла воўчая лапа.

Недзе недалёка ў кустах гаварыла са сваёю каровай Сахвеіна Аксюта: «Краля, Краля...»

Цікаўна — як чалавек — глядзела на мяне краска: яе ўважлівае, нібы жывое, вока было зусім блізка.

Побач раскошна ласкавеў у цёплым і мяккім перадасеннім сонцы, буяў, шчодра раскрыўшы свае кветкі, бадзяк. Цёмна-зялёныя, парэпаныя, нібы старэчыя рукі, лісты. Светла-зялёны клубочак — акурат вожык,— толькі не калючы. Мяккія (іх можна нават пакратаць рукою, пальцам — яны толькі трапчаць і чапляюцца за слізкія далоні) іголкі, абматаныя нейкім белым, нібы павучынкі, прадзівам. А над клубочкам — як усё роўна знарок выразаны ярка-чырвоны, з крапінкамі, чубок. Чорныя ножкі, з якіх тырчаць бледна-ружовыя, раздвоеныя на канцы песцікі...

Я доўга круціўся і ўсё азіраўся, адкуль струменіць такі тонкі, амаль няўлоўны і неспазнаны водар. І нарэшце здагадаўся: гэта ж пахне ён, бадзяк!

Мы шукаем кветкі, шукаем і паважаем іх за пах, але нават і падумаць баімся, што бадзяк — таксама кветка. І што ён таксама прыемна пахне. Але яго пах іншы, прытоены. Ён не падобен на тое густое шаленства пахаў, ад якога аж задыхаешся ў агародзе ці ў палісадніку — нібы ў гарадской цырульні.

Вось так, пражыўшы амаль да трыццаці год, я не заўважаў, што прыгожа цвіце бульба і што прыемна пахнуць яе кветкі. І толькі летась, акучваючы, адкрыў гэта для сябе. Праўда, і да таго трапляліся на вочы бела-ружовыя, сіняватыя агеньчыкі на бульбоўніку, і да таго лёгка ды-

халася, калі ішоў па ўзмежку ля бульбы, але неяк не думалася, што вось гэтыя пахкія агеньчыкі на бульбоўніку — такія ж кветкі, як і ружы.

Мы, напэўна ж, ведаем, як яра і жоўта, прыемна і поўнагалоса пахне зацвілы асот. Але для нас гэта — пустазелле.

Мы бачылі, як красуе колас — увесь у лёгкіх і светлых, бы смуга, маленькіх кветачках! Але гэта таксама не кветкі — для нас.

Нам трэба кветкі, якія вяжуць у букеты...

На маю далонь прысела пушынка з зернеткам — такая лёгкая і такая трапяткая: яе, як нешта жывое, нельга ўтрымаць у руках. Маленечкі павеў ветру — і ўжо выпырхнула з далоні гэтая амаль неваговая, нібы само паветра, пушынка. Як тая мятлушка, якая, злоўленая, ціха сядзела ў кулаку і, здавалася, ужо назусім змірылася з лёсам, але ж у адно нейкае імгненне, як толькі крыху прачыніўся кулак, устрывожылася, страпянулася — я нават і не заўважыў — калі, і толькі інстынктыўна сціснуў пальцы,— пасля таго ўжо, як мятлушка, знайшоўшы маленечкую волю ў кулаку, дзірачку, да якой яна і сядзела, здавалася, бокам, умомант пырхнула туды і ўзрадавана зашамацела нада мною вольнымі крыльцамі.

Пушынка з зернеткам таксама, узнятая высока ветрам, паляцела сяліцца на новае месца — далей ад бацькоў...

Дарога назад з поўнымі вёдрамі была крыху цяжэйшая, але тая ж.

У матчыным агародзе, усё яшчэ высока ўзмахваючы кожнаю жменяю ячменю, перад тым як пакласці яе на вязьмо, жала Волька.

У Ганкіным палісаднічку буялі вяргіні.

Камбайны абышлі поле ўжо не адзін раз: яны ўвайшлі ў работу, і ў наваколлі быў чуваць толькі іх раўнамерны рабочы гул.

Мядзяк з напоўненым ужо кузавам паспрабаваў быў скрануць машыну, але зноў спыніўся і чакаў мяне — відаць, захацелася напіцца. І праўда, як я падышоў да яго, ён вылез з кабіны, узяў аберуч вядро і, падняўшы высока — нават вышэй галавы,— нагнуў, пусціў тоненькі струмень, а сам лавіў яго ротам. Вада цякла па твары, лілася і за каўнер расшпіленай сарочкі, але Віцька не зважаў на гэта і піў доўга.

— Ці не сыраватае? — усунуўшы ў зерне руку, спытаўся я.

— Нічога,— аддаючы мне вядро, адказаў Мядзяк.— У Грукаве ў нас добрая сушылка ёсць.— І, падумаўшы, дадаў: — Я другога баюся. Там, на пляцоўцы, панассыналі грудкоў з розных палёў — паспрабуй разбярыся, якое на семя...

Сеў і адразу ж газануў — як на легкавой.

Новыя дошкі, якімі Андрэй яшчэ да ад'езду забіў дзірку ў счарнелым ад дажджу і сонца франтоне, у якую мы лазілі на хату, насілі сена, светла кідаліся яшчэ здалёку ў вочы. Франтон быў якраз на вуліцу, перад ім пад самым акном стаяла лесвіца, але ўсё роўна лазіць на хату было дрэнна: перашкаджала напярочынка. Трэба было спачатку наставіць у дзірку абедзве нагі — на адной, а потым самому, сагнуўшыся ў тры пагібелі, ныриуць пад гэтую напярочынку.

Калі Кагадзей убачыў нейк маці, якая, высунуўшы галаву з дзіркі, спрасоння яшчэ гаварыла з намі, засмяяўся:

— Зірніце, зірніце... Ты, Надзёжа, акурат баба-яга — галаву з хаткі на курыных ножках высунула і глядзіць зверху.

А потым падумаў-падумаў і паправіўся:

— Выбачай, Надзёжа,— ты, нібы царыца якая, галаву з церама высунула і кіруеш дзецьмі.

Паправіўся ён так хутка, што маці, мне здаецца, не паспела нават пакрыўдзіцца. Яна толькі махнула са свае дзіркі рукою:

— Агату! Во зраўняў. Ідзі ўжо куды ідзеш, балабон гэты...

Ад Кагадзея ехаў Ранік. На багажніку ў яго ляжаў вялізны, як гара, скрутак — амаль уроўні з ім самім: відаць, Толя, нягледзячы на дзіўнае пісьмо, усё ж адважыўся ехаць да Светы і прызджаў забраць яе цёплую зімовую адзежу.

Перада мною ён нават прытармазіў — так ужо хацелася яму, каб перайшоў з поўным. Я пайшоў шпарчэй і як не перад самым яго веласіпедам перайшоў вуліцу — няхай хлопцу ўдаецца!

Маці ўжо стаяла ля хаты і, абапёршыся рукою на сцяну, акурат на надпіс: «Тут жылі Петрусі» (Той і Гэты перад ад'ездам направілі «жывуць» на «жылі»), чакала вады.

Яна глядзела на правады, нібы нечага шукала на іх. Зірнуў і я і вось тут зразумеў, чаго ім не стае.

— Ластаўкі паляцелі,— сказала маці.

Было ўсё яшчэ па-летняму цёпла, хоць даўно ўжо і так рана — яшчэ да ластавак — паляцелі ў вырай жураўы.

## 10. З КАРАНЬКЕВІЧАМ

*едзем у Азярычына,*
*па дарозе туды і назад думаем*
*пра чалавека і зямлю,*
*а пад канец зноў згаджаемся,*
*што ўсе мы з хат*

Праехалі каля ціхай, нерухомай даяркі — у хусцінцы, якая прыгожа сабрала валасы, з вядром у правай руцэ, у лёгкай сукенцы, з-пад якой выпіраюць маладыя грудзі, яна стаяла ў самым пачатку вуліцы. Здавалася, што даярка збіраецца саступіць з невысокага п'едэстала на зялёную траву — каб з поўным перайсці дарогу кожнаму, хто ідзе ці едзе ў Азярычына, цэнтр калгаса.

Каранькевіч вядзе машыну лёгка, плаўна — нібы зліўся з ёю. І нават я, пасажыр, трэці тут і лішні, адчуваю сябе таксама непадзельнай часткаю вось гэтай супольнасці чалавека і машыны.

Перад тым як завезці нас на аўтобусную станцыю, Каранькевіч падахвоціўся паказаць новы клуб.

— А то знікнеш у свой Мінск і нашага Палаца не паглядзіш. Паедзем. А Вера тут няхай з маці пагаворыць пакуль.

Едзем шырокаю вуліцаю. Паабапал яе — двухпавярховыя дамы на чатыры сям'і: з балконамі, са стромымі дахамі; і шматкватэрныя камяніцы з сучаснымі, прасторнымі лоджыямі.

Колькі я папахадзіў раней гэтаю зялёнаю вуліцаю! Любаваўся дамамі, дзе ёсць усе гарадскія выгоды, думаў, што вось гэта вёска нічым ужо не адрозніваецца ад горада, але, бачачы, як пад вокнамі там-сям хадзілі і шчыпалі траву куры, гусі, як часаліся аб бетонныя слупы парсюкі, як стаялі ля пад'ездаў прывязаныя лейцамі за ажурныя металічныя ўпрыгожванні ля ўваходаў запрэжаныя коні, сам сябе папраўляў: не, усё ж гэта вёска — каменная, цагляная, сучасная, але вёска.

Мінулі двухпавярховую прасторную амбулаторыю. Уваход у яе прыгожа аздоблены, светлы.

А вось і кантора — таксама двухпавярховая, прасторная.

Каранькевіч на хвіліну забег, узяў ключы ад клуба і неўзабаве вярнуўся. Калі зноў садзіўся ў машыну, на сонцы бліснуў чырвона-зялёны сцяжок дэпутата Вярхоўнага Савета рэспублікі.

Клуб быў і праўда прыгожы. Высокі, светлы, з фарсіста заламанаю бетоннаю страхою, якая ў гэтай сваёй форме здавалася зусім лёгкаю, ён чымсьці — вельмі далёка — нагадваў наш мінскі Палац спорту. У самой архітэктуры калгаснага клуба было ўжо закладзена нейкае хваляванне, якое не дае праїсці паўз яго раўнадушна і як магніт цягне зірнуць, а што ж там, усярэдзіне...

Каранькевіч, як экскурсавод, вадзіў мяне сам.

— А вось гэта наша бібліятэка. А вось гэта глядзельная зала. А вось гэта наш мастацкі музей.

Я недаверліва зірнуў на яго.

— Не сумнявайся, Юра, не сумнявайся — мастацкі музей. Разумееш, я ўжо з'ездзіў у вобласць, і там мне наабяцалі хутка з запаснікаў музея падабраць экспазіцыю. Так што, бачыш, у нас свая карцінная галерэя будзе. А там набагацеем, самі карціны купляць пачнём. І сённяя ж шэдэўры ёсць. Але пра тое, што гэта шэдэўры, мы зразумеем толькі год праз сто,— ён усміхнуўся.— На шэдэўры час трэба.

Па дарозе ў Жыцькава я ўсё хваліў клуб. Пасля разгаварыліся пра зямлю, пра людзей, пра вёску, пра яе адносіны з горадам.

— Вельмі ж ужо моцна ў нас у Беларусі горад з вёскаю звязаны — не разарвеш,— задумаўся Каранькевіч.

— Ага. У нас жа амаль усюды: сын ці дачка працуюць у горадзе, на заводзе ці фабрыцы, а бацькі — у вёсцы жывуць.

— Вось дзеці прыедуць на выхадны, хатулі навяжуць — і зноў у горад.

— У панядзелак, калі ідзеш ля рабочых інтэрнатаў, за вокнамі вісяць авоські, цэлафанавыя мяшэчкі, вузялкі. А ў іх, вядома, сала, каўбаса, масла. Недзе туды к пятніцы гэтыя мяшэчкі патанеюць ужо — нібы схуднелі. У суботу рэдка дзе што ўбачыш — толькі ў клапатлівых дзяўчат, можа. А прыйдзе новы панядзелак — зноў за вокнамі вузялкі і мяшэчкі: значыць, з'ездзілі ўжо дадому дзеці, адведалі сваіх старых.

— А вунь на аўтамабільным заводзе ў Жодзіне пала-

віна рабочых адразу з цэхаў на абед дадому ў вёску ходзіць. А хто жыве трохі далей — таго аўтобусамі возяць.

Каранькевіч задумаўся.

— Мы ўсе, Юра, з хат,— пераключаючы хуткасць перад узгоркам, сказаў Каранькевіч.— Памятаеш, як генерал Шыбекаў гаварыў? Мы ўсе разбегліся ў розныя бакі, але помнім, адкуль мы родам, бо хлеб, што мы ядзім, спекяць для нас нашы бацькі. Вёска выгадавала нас і, шчодрая, Паўліка аддала арміі, Андрэя — рабочым, цябе — навуцы, а мяне пакінула на зямлі, ля сябе. Але яна ўважліва, Юра, як клапатлівая маці, сочыць за намі, кім мы становімся, куды ідзём, як расцём. І калі мы не спраўджваем яе надзей, яна смяецца з нас, кпіць — а ты ж ведаеш, у нашых вёсках гэта рабіць умеюць. Але ж умеюць тут любіць і шанаваць сваіх дзяцей, якія развіталіся з вёскаю, каб множыць яе славу, дзе хто можа.

Уз'ехалі на ўзгорак. Уперадзе ўжо відаць былі наша і Цытнячышына хаты — яны стаяць якраз з гэтага краю.

— Вось і Жыцькава,— Каранькевіч зноў пераключыў хуткасць — «казёл» пабег шпарчэй — і павярнуўся да мяне: — Ты ведаеш, у Жыцькаве запланавана пабудаваць вялікі жывёлагадоўчы комплекс.— Крыху падумаў і дадаў: — Вось прыедзеш недзе гадоў праз дзесяць і не пазнаеш Жыцькава. Яно будзе такое ж цаглянае і сучаснае, як і Азярычына.

І я ўявіў сабе, як тут, на месцы жыцькаўскіх саламяных хат, вырасце, выгадуецца новая вёска з прыгожымі шматпавярховымі дамамі і як ад вёскі, у якой столькі было свайго і гора і радасці, дзе кожны чалавек жыў сваім, не падобным на іншых жыццём, астанецца хіба толькі адно імя, адно толькі слова — прыгожае, святое і вечнае слова, якім спрадвеку называлася гэтая ціхая і далёкая ад буйных дарог зямля,— вёска Жыцькава.

Маці, Вера, Пятрусь ужо вынеслі чамаданы і стаялі на вуліцы — чакалі нас. Вера хвалявалася — баялася спазніцца на аўтобус.

Мы развіталіся з маці, паставілі чамаданы і селі ў машыну. Каранькевіч лёгка скрануў яе з месца. Калі «казёл» павярнуў на дарогу да аўтобуснай станцыі, я ўбачыў, што маці ўсё яшчэ ідзе за машынаю і неяк стрымана махае нам рукою — такая стрыманасць бывае, калі праводзіш знаёмага, які ляціць самалётам, махаеш яму рукою, ня-

ўпэўнены, бачыць ён цябе ці не, не ведаючы нават, ля якога кругленькага акенца ён сядзіць, і махаеш проста так, для прыліку, махаеш усяму самалёту, як нейкай жывой істоце.

Маці дайшла да таго ўзгорка, да якога заўсёды праводзіла нас, калі мы ішлі на аўтобус пешкі, спынілася, усё гэтак жа няўпэўнена махала машыне рукою і, мусіць, плакала — паспрабуй не плакаць, калі пасля такой вялізнай улетку сям'і, якая ледзь мясцілася ў цеснай хаціне, астаешся адзін: адзін і на хату, якая зараз стала непраўдзіва прасторнаю, і на двор, і на агарод, дзе было столькі смеху ўпукаў,— таксама адзін.

Па дарозе мы падабралі Цытнячышыну Люсю — тая таксама з чамаданам ішла на аўтобус.

Калі дзяўчынка ўселася, Караньkевіч спытаў:

— Ну што, Люся, паступіла?

— Ага.

— Едзь, вучыся,— уважліва сочачы за дарогаю, сказаў ёй Караньkевіч.— А то вунь бачыла, якая ў нас бальніца добрая? Нам медыкі трэба.

Люся толькі няпэўна пацiснула плячыма і нічога не адказала: а што яна, дзяўчо, пэўнага можа сказаць зараз, калі ў яе ўсё яшчэ наперадзе — і вучоба, і выбар месца, дзе працаваць.

Ля самотнае альтанкі, што стаяла на ростанях, Караньkевіч спыніўся, памог дастаць чамаданы і паспешліва развітаўся, вінавата разводзячы рукамі: маўляў, пастаяў бы, але няма часу — жніво.

Калі машына схавалася за паваротам, стала ціха-ціха. Было нават чуваць, як ад невялікага ветру шкрабецца, шаргаціць аб дрэва бляшаны ліст, на якім напісаны расклад руху аўтобусаў.

Пад нагамі шуршавілася, збіваючыся ў чародкі, сухое і лёгкае апалае лісцё.

Каля альтанкі гамапілі дзве жанчыны. Адна з іх, тая, што стаяла, абапёршыся спіною на слупок альтанкі, і трымала за руку дзяўчынку, падышла да нас.

— Што ж ты, Вера, і не прызнаешся ўжо,— сказала яна і падала руку.

— Дык я ж, Маруся, яшчэ і агледзецца не паспела,— апраўдвалася Вера.

— Добра, калі так. А то я магла б падумаць, што ты зазналася,— усміхнулася Маруся.— Ну што, ужо дадому

едзеце? Бабу сваю адну пакінулі? — і пагладзіла Петруся па галаве.— Хто іх ведае, гэтыя аўтобусы. Ці спыніцца каторы, ці не. Учора вунь хвашнянскі нікога не ўзяў. І руднянскі таксама, калі поўны, не спыняецца.

— А ты ж куды едзеш? — спытала ў яе Вера.

— Я? Нікуды. Гэта ж наша пanенка, Зіна, дала тэлеграму, што прыедзе са сваім мужам, дык я во і ўстрачаю іх. Гэткі клопат — і сама магла цераз лес перайсці...

Дзяўчынцы надакучыла стаяць ля незнаёмых людзей, і яна цягнула маці ад нас.

— Сціхні ты, дзяўзно! — прыкрыкнула на яе Маруся.— І вялікая ўжо, а з людзьмі не дае пагаварыць. Як з бацькам, дык яна смелая. Ці паверыце, неяк ён надумаўся яе за невашта прыструніць, дык яна заплакала ды і кажа: «Біў ты мяне, бацька, малую, пачынай ужо і вялікую біць». Во табе і малая.

Дзяўчынцы, відаць, не спадабалася, што маці расказвае чужым людзям такое пра яе,— яна зморшчылася і адышлася.

— Дык у цябе ж, Маруся, большая ўжо дачка павінна быць,— адсюль, здалёк, паглядзела на дзяўчынку Вера.

— А гэта ж меншая мая, яна і ў школу яшчэ не ходзіць. А большая — тая ўжо вялікая, сёлета ў дзесяты пойдзе.

Маруся нібыта ўзрадавалася, што Вера зачапіла гэтую тэму.

— Такая ўжо дзяўчынка харошая,— спяшалася выгаварыцца жанчына.— Усё кажа: «Мамачка, я дужа ж ужо на настаўніцу вывучыцца хачу». Яшчэ і ў дзяцінстве, калі іх, малых, пыталі, кім яны хочуць быць, дык іншыя дзяўчаткі казалі — артысткамі, дактарамі, інжынерамі, а мая — не і не: толькі настаўніцаю.

Маруся зірнула на мяне, кіўнула галавою ў мой бок, але гаварыла да Веры:

— Дык хай бы во Юра памог ёй у які інстытут паступіць.

— А як яна вучыцца? — спытаўся я.

— На адненькія пяцёрачкі.

Ну, дык ёй баяцца няма чаго. Яна і сама паступіць.

— Не, сама не паступіць. Там жа, кажуць, па блату прымаюць...

— А во Люся ажно ў Ленінград сама паступіла,—

падтрымала мяне Вера і паказала на Цытнячышыну дачку.

— Люська байчэйшая...

Успомніў, як на льнішчы за нашаю хатаю Маруся тое ж самае расказвала жанчынам — як хоча яе дачка вучыцца на настаўніцу,— і супакоіў яе:

— Няхай прыязджае — паступіць.

Маруся перавяла размову на іншае:

— Ці сустрэлі вы хлопца якога, як сюды ехалі?

Сапраўды, нейкі хлопец ішоў лесам, збочыў і, засланіўшыся рукою ад пылу, даў нам праехаць.

— Ага, ішоў нейкі,— адказала Вера.

— Дык гэта ж Цыганёнак. У мяне дарогу на Жыцькава ўсё пытаў. Я яму расказала, як прайсці прамей, праз лес сцежынаю, але ён збаяўся. Кажа: «Яшчэ заблуджуся. Я дарогаю лепей пайду».

— А чаго ён прыехаў?

— Ды, кажа, бацька як прыстаў — з'ездзі ды з'ездзі. Я, кажа, стары ўжо, хворы на ногі, я не дайду, а ты з'ездзі і мне потым раскажаш, як яны там жывуць.

Памаўчаўшы, Маруся спахапілася — нібы ўспомніла, што не дагаварыла чагосьці важнага:

— А яны ў Малдавіі зараз жывуць. Вінаград там глядзяць.

Жанчына азірнулася, убачыла, што дачка калупаецца далёка пад елкаю, паклікала яе да сябе:

— Ірка, хадзі сюды!

Тая не абзывалася. Тады Маруся схадзіла і прывяла яе за руку. А Веры сказала:

— Во пастаяла тут са мною, дык, бачыш, колькі ўсяго пачула. А я ж табе яшчэ не ўсё расказала.— І спыталася: — Ці помніш ты Сліндука? Ну таго, што з медычкаю, з Тамараю, некалі з Млынароў аж за Мінск уцякаў? Дык ён ужо ў Віцебск паехаў: працаваць, кажа, там будзе.

Маруся паглядзела на мяне і, відаць, думаючы, што пра Сліндука і Тамару я нічога не чуў, усміхнулася:

— Ведаем мы гэту працу! Абы бліжэй да Тамары.

— Дык маці ж яму Тамарынага адраса не дала.

— Віцебск не такі ўжо вялікі горад. Як захоча — дык знойдзе не толькі адрас, а і саму Тамару.

Падышоў аўтобус з Віцебска. Маруся заспяшалася да дзвярэй, з якіх, і праўда, першаю выйшла Зіна, а за ёю —

яе муж: апошнія сёлета жыцькаўскія госці. Зіна трымала толькі рыдыкюльчык, а чамаданы і сеткі ў дзвюх руках цягнуў з аўтобуса муж. Маруся падбегла, сказала: «Давайце я памагу» — і пачала адбіраць хоць што-небудзь з рук у пасестрыма, але той нічога не аддаў.

Не паспеў яшчэ ад'ехацца гэты аўтобус, як да прыпынку падрулііў і наш.

Аўтобус ішоў з Хвошна і ўжо быў поўны, як кажуць, бітком набіты — ён толькі стомлена, бы чалавек, соп і чмыхаў. Пасажыры злаваліся на шафёра, навошта расчыніў нам дзверцы, злаваліся і на нас — маўляў, куды лезеце, тут і без вас няма як стаяць. Усё ж мы неяк уплішчыліся. Я стаяў, сціснуты амаль з усіх бакоў, засланяючы сабою адно толькі Петруся. Пакуль аўтобус яшчэ не крануўся, я, прыціснуты людзьмі да шкла, якое аддзяляе шафёра ад салона, бачыў, як Маруся, Зіна і яе муж сышлі на бакавую сцежку і як ад грукаўскай дарогі, напярэймы ім, выйшаў з кустоў Кагадзей — чысты дзядок-лесавічок,— як павітаўся ён з усімі за руку і, узяўшы ў хлопца нейкую сетку, пайшоў з гасцямі назад у Жыцькава.

У цеснаце ехалі да райцэнтра. Там хвашнянскія павыходзілі — яны ехалі па справах у раён. Вызваліліся нават месцы.

Я ўмасціўся ля вясёлага, гаваркога дзядзькі. Калі аўтобус ад'ехаўся, ён пачаў знаёміцца.

— А я на вяселле з бабаю еду. Баба вунь ззаду сядзіць.

— Хто ж у вас жэніцца? — спытаў я.

— Гармонік! Я музыкант, і мяне ўсе на вяселлі просяць.

— А дзе ж гармонік?

— А мая музыка ўжо там, на вяселлі — учора завезлі.

— Дык нешта ж вы рана едзеце — сёння ж яшчэ чацвер.

— А ў мяне, сынок, прагулу не будзе — я ж на пенсіі. І баба мая на пенсіі. Толькі во хату не было на каго кінуць. Прасілі-прасілі — ніхто не хоча. Раней жа ў дзярэўні і малых, і старых было. А цяпер аж з другой дзярэўні бабу нейкую глухую прывялі. Усё ж хоць курэй накорміць і карову падоіць.

На прыпынку зайшла расчырванелая маладзіца. Абедзве рукі ў яе былі занятыя. Яна расстаўляла свае вёдры

і каструлькі ў авоськах па праходзе, і калі крануўся аўтобус, пахіснулася і борздзенька ўхапілася за нікеляваную ручку на сядзенні.

— А куды ж ты, маладзіца, едзеш з такім посудам? — спытаў мой сусед.

— На вяселле, дзядзька,— адказала жанчына.— Пляменнік мой у Віцебску ў гэтую суботу жаніцца будзе.

— А я і гляджу, што столькі ў цябе ўсяго — аж рук мала.

— Аняго ж, мала: сабрала во смятанкі, сыру зрабіла — там усё знадобіцца.

— Дзіва што знадобіцца! А каго ж бярэць твой пляменнік?

— Ды на ўкраінцы жэніцца. Дзе ў арміі служыў, адтуль і вязець. Бацька ў яе капітан. Дык я во, дурная, і думаю, няўжо б, каб захацеў, бацька ёй якога ахвіцэра не знайшоў? Дык не ж, за радавога аддаець. Праўда, наш Валік хлопец бравы. Кучаравы ўвесь.

Мой сусед аж засмяяўся.

— Бачыш, маладзіца, адным падабаюцца ахвіцэры, а другім — кучаравыя.

— Ездзіць во толькі, дзядзька, далёка. Раней дык добра было — у адной вёсцы і радзіліся і жаніліся, а цяпер едзь за блізкі свет. Як таму во капітану — сёння ж мы яго ўстрачаць будзем. Бацька-то з маткаю прыедуць, а радня дык і на вяселлі не пабудзе, са сваёю новаю раднёю не пазнаёміцца...

Аўтобус лёгка імчаў па шашы. У ім, як у хаце, весела і дружна гаварылі незнаёмыя да гэтага людзі — добрыя і шчырыя, працавітыя і клапатлівыя. Я глядзеў на іх і, нібы падтакваючы Паўлу, Карапькевічу, думаў, што, і праўда, усе мы з хат: і вось гэты мой сусед — гаваркі дзядзька, які спяшаецца на вяселле; і вось гэтая цётка, якая едзе ў Віцебск жаніць пляменніка на дачцэ капітана; і вось той паважны мужчына ў капелюшы, які глядзіць у акно і, здаецца, не прымае ніякага ўдзелу ў гаворцы, хоць слухае ўсё вельмі ўважліва — гэта добра відаць па вуснах, што ахвотна абзываюцца і на ўдалы жарт, і на трапнае слова; і вось гэтая модная, расфарбаваная не па гадах жанчына, якая сядзіць побач з музыкавай жонкаю і ўсё адсоўваецца ад бабулі — ці то баіцца выпацкацца аб яе святочныя ўборы, якія так доўга ляжалі ў куфры, ці то проста палохаецца яе чорнай парэпанай рукі, якою старая трымаецца за поручань; і вось гэтая Цытнячыны-

на Люська, што, як напалоханы верабейка, ціхенька прыклеілася на крайку сядзення — на часе яна стане добрым спецыялістам і, магчыма, вернецца назад у азярычынскую бальніцу,— усе яны таксама з хат.

Усе мы, сябры, з хат. І такое бяды, што нашы вёскі называліся па-рознаму — Зялёны Бор альбо Дабрэвічы, Светлае альбо Жыцькава! У кожнай з іх яшчэ і да сёння стаіць хата, якая цярпліва выгадавала нас, паставіла на крыло, велікадушна і без папрокаў расчыніла нам дзверы — нібы шырока раскрыла рукі, дзе на далонях стоена сцішыліся мятлушкі: ляціце!

Ляціце, куды хочаце, ад свае хаты — на поўдзень ці на поўнач, на захад ці на ўсход...

*1974 г.*

## ДАВЕДКА

*Лірычная проза*

«Акно, расчыненае ў зіму». Напісана ў 1968 г. Упершыню надрукавана ў часопісе «Полымя» (1969, № 6). Перакладзена на рускую мову. Змешчана ў часопісе «Дружба народов» (1969, № 11).

«Па зялёную маланку». Эсэ з'явілася пасля творчай камандзіроўкі ў Сібір. Напісана летам 1969 г. Упершыню надрукавана ў часопісе «Полымя» (1970, №№ 9, 10). Перакладзена на рускую мову.

«Там, дзе Сібір». Нарыс, прысвечаны Шушанскаму, дзе ў свой час адбываў ссылку У. І. Ленін. Напісаны ў 1969 г. Надрукаваны ў часопісе «Полымя» (1970, № 4). Перакладзены на рускую мову.

*Аповесці*

«Крыло цішыні». Напісана ў 1973 г. Упершыню надрукавана ў часопісе «Маладосць» (1974, №№ 11, 12). Перакладзена на рускую, грузінскую, эстонскую, балгарскую мовы. Па аповесці пастаўлены тэлеспектакль, які на Усесаюзным фестывалі тэлевізійных спектакляў у г. Кемерава (1978 г.) атрымаў галоўны прыз, а ў 1982 г. адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР.

«Усе мы з хат». Аповесць напісана ў 1974 г. Упершыню надрукавана ў часопісе «Полымя» (1975, № 4). Перакладзена на рускую і эстонскую мовы.

## ЗМЕСТ

*Серафім Андраюк.* Даверлівы талент . . 5

*Лірычная проза*

Акно, расчыненае ў зіму . . . . . . . 17
На зялёную маланку . . . . . . . . . 93
Там, дзе Сібір... . . . . . . . . . . . 195

*Аповесці*

Крыло цішыні . . . . . . . . . . . . 229
Усе мы з хат . . . . . . . . . . . . . 360

Даведка . . . . . . . . . . . . . . . 509

Сіпакоў Я.
С 39 Сад людзей: Выбр. творы. У 2-х т. Т. 1. Лірычная проза. Аповесць/[Аўт. прадм. С. Андраюк]. — Мн.: Маст. літ., 1985.— 510 с., 1 л. партр.
У пер.: 2 р. 20 к.
У першы том выбраных твораў вядомага беларускага пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР Янкі Сіпакова ўвайшла лірычная проза «Акно, расчыненае ў зіму», «Па зялёную маланку», а таксама аповесці «Крыло цішыні», «Усе мы з хат».

С $\frac{4702120200-127}{М 302(05)-85}$ 126—85

ББК 84Бел7
Бел 2

8 БЕЛ

*Иван Данилович Сипаков*

**Сад людей**

ИЗБРАННЫЕ ПРОИЗВЕДЕНИЯ
В ДВУХ ТОМАХ

ТОМ ПЕРВЫЙ

Лирическая проза
Повести

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»

На белорусском языке

Рэдактар *С. Р. Прыгодзіч*. Мастак *Ю. М. Цюрын*. Мастацкі рэдактар *Л. Я. Прагін*. Тэхнічны рэдактар *Г. П. Тарасевіч*. Карэктар *Л. Т. Калюжная*.

ІБ № 2204

Здадзена ў набор 11.01.85. Падп. да друку 12.07.85. АТ 12262. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 26,88+0,11 укл. Ум. фарб.-адб. 26,99. Ул.-выд. арк. 29,64. Тыраж 9600 экз. Зак. 1045. Цана 2 р. 20 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.